БЕЛАРУСКІЯ ПІСЬМЕННІКІ

БІЯБІБЛІЯГРАФІЧНЫ СЛОЎНІК

БЕЛАРУСКІЯ ПІСЬМЕННІКІ

БІЯБІБЛІЯГРАФІЧНЫ СЛОЎНІК

ІНСТЫТУТ ЛІТАРАТУРЫ ІМЯ ЯНКІ КУПАЛЫ АКАДЭМІІ НАВУК
РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

БЕЛАРУСКАЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ

БІЯБІБЛІЯГРАФІЧНЫ СЛОЎНІК

У 6 ТАМАХ

МІНСК,
«БЕЛАРУСКАЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ»
ІМЯ ПЕТРУСЯ БРОЎКІ
1995

ІНСТЫТУТ ЛІТАРАТУРЫ ІМЯ ЯНКІ КУПАЛЫ АКАДЭМІІ НАВУК
РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

БЕЛАРУСКАЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ

БЕЛАРУСКІЯ ПІСЬМЕННІКІ

БІЯБІБЛІЯГРАФІЧНЫ СЛОЎНІК

ТОМ 6

ПАД РЭДАКЦЫЯЙ ПРАФЕСАРА А.В. МАЛЬДЗІСА

ТАЛАЛАЙ—ЯФІМАЎ

ДАДАТАК

МІНСК,
«БЕЛАРУСКАЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ»
ІМЯ ПЕТРУСЯ БРОЎКІ
1995

ББК 91.9: 83. 3Бел
Б 43
УДК 016:882.6(092)

ГАЛОЎНАЯ РЭДАКЦЫЯ «БЕЛАРУСКАЙ ЭНЦЫКЛАПЕДЫІ»

Б. І. САЧАНКА (галоўны рэдактар), М. М. КУРЛОВІЧ,
Я. В. МАЛАШЭВІЧ, С. П. САМУЭЛЬ, І. П. ХАЎРАТОВІЧ.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ:

І. Э. БАГДАНОВІЧ, М. П. БАРТАШЭВІЧ, А. Л. ВЕРАБЕЙ,
П. К. ДЗЮБАЙЛА, В. А. КАВАЛЕНКА, А. В. МАЛЬДЗІС,
У. І. МАРХЕЛЬ, І. Я. НАВУМЕНКА, Л. С. САВІК,
В. У. СКАЛАБАН.

ČAMIFR—ÑAPAPAT

ЖАТАДАД

This edition is a table reference book for all those who have an interest and concern in the Byelorussian culture. The book comprises more than 1100 articles containing full, manysided and systematized information on the Byelorussian literature representatives who created their works in Old Slavonic, Byelorussian, Russian, Latin, Polish and other literary languages of Belarus. The bibliographic references represent more than 600 thousand various publications.

0160000000—015
Б——————— 32—95
М 318(03)—95

5-85700-190-0 (т. 6)
5-85700-060-2

© Выдавецтва «Беларуская Энцыклапедыя» імя Петруся Броўкі, 1995

ТАЛАЛАЙ ЛЕЎ

Талалай Леў Барысавіч (1906, Магілёўская губ.— 1942), паэт. Пісаў на яўрэйскай і беларускай мовах.

Біяграфічныя звесткі пра Л. Талалая вельмі скупыя. Вядома толькі, што ў 1925—26 працаваў настаўнікам Вендаражскай пачатковай школы Магілёўскага р-на, у 1926—28 вучыўся ў Віцебскім педагагічным тэхнікуме, у 1928—32 служыў у Чырвонай Арміі (па іншых звестках, служыў звыштэрміновa да 1937), у 1932—36 быў супрацоўнікам яўрэйскай газеты «Юнгер Арбайтэр» («Малады рабочы»). Пасля працаваў настаўнікам рускай мовы і літаратуры ў сярэдніх школах Мінска. На пачатку Вялікай Айчыннай вайны прызваны ў армію, загінуў на фронце ў 1942.

Першы верш Л. Талалай апублікаваў у 1924 на рускай мове (публікацыя не выяўлена). З 1929 друкаваўся ў часопісе «Штэрн» («Зорка»). Да вайны ў Мінску на яўрэйскай мове выдадзены дзве яго паэтычныя кнігі «Мой першы сноп» і «У паходзе». Тэматыка вершаў Л. Талалая — жыццё вёскі, сацыялістычныя змены ў ёй, гатоўнасць воіна адстаяць сваю Радзіму. У вершах «У палявым штабе», «Каля кузні два матросы...» і інш. у паэта праявілася схільнасць да апавядальнага верша.

Я. І. Клімуць.

Бібліяграфія

1.2.

Мой першы сноп: Зборнік вершаў (1926—1931). Мн., 1932 / Яўр.

У паходзе: [Вершы]. Мн., 1940 / Яўр. Рэц.: Левін Н. Вершы аб Чырвонай Арміі // ЛіМ. 1940. 17 жн.

1.3.

1929. Пра сястру; Твая віна...: [Вершы] // Штэрн. № 8—9 / Яўр.

1930. Сёння і заўтра: [Верш] // Штэрн. № 9 / Яўр.

1931. Калі ідуць малаціць...; Сход; Хто сказаў, што гэта мая старасць: [Вершы] // Штэрн. № 1 / Яўр.; Стары мастак; Песня Будзённага: [Вершы] // Там жа. № 8—9 / Яўр.

1932. Той цудоўнай восенню: [Верш] // Штэрн. № 6 / Яўр.; Адважны агітатар: [Верш] // Там жа. № 10—11 / Яўр.

1933. Маё жыццё шырокае; Цяжкі шлях; «Дзяўчына,

сябра, ты строгая, як я...»: [Вершы] // Штэрн. № 12 / Яўр.

1935. На дзевятыя суткі: [Вершы] // Штэрн. № 3 / Яўр.

1936. [Верш] // Штэрн. № 5 / Яўр.; [Цыкл вершаў] // Там жа. № 9 / Яўр.

1937. Дзяцінства: [Вершы] // Штэрн. № 3 / Яўр.

1938. Чырвонаармеец Пятро: [Паэма] // Штэрн. № 2 / Яўр.; Каля кузні два матросы; На маршы; На лузе: [Вершы] // Там жа. № 11 / Яўр.

1939. Бацька: [Верш] // Ардэнаносная Беларусь. Мн. / Яўр.; Хлопчык Мотл; Тэв'е-малочнік: [Вершы] // Штэрн. № 3—4 / Яўр.; Дзядуля Давід: [Верш] // Там жа. № 6 / Яўр.

1940. [Вершы] // Штэрн. № 7—8 / Яўр.; Напярэдадні іспытаў // Піянер Бел. 11 мая; Сустрэча: [Апавяданне] // Чырв. змена. 4 кастр.

1941. Да нарады па дзіцячай літаратуры // Чырв. змена. 14 сак. / У сааўт.

1.4.

Каваль В. Ілька: [Апавяданне] / З бел. М.; Харкаў; Мн., 1931 / Яўр.

1.5.

На беларускую мову. Каля кузні два матросы...: [Верш] / Пер. А. Бялевіч // ЛіМ. 1939. 11 чэрв.; Камсамолка Ганэлэ: [Верш] / Пер. А. Бялевіч // Іскры Ільіча. 1940. № 2; У палявым штабе / Пер. Р. Няхай; Каля кузні два матросы... / Пер. А. Бялевіч: [Вершы] // Мы іх не забудзем. Мн., 1949.

2.3.

На беларускай мове. Леў Талалай // Радзіме — радок і жыццё. Мн., 1986; Пісьменнікі Савецкай Беларусі: Кароткі даведнік. Мн., 1981; Рэлес Р. Леў Талалай // Мы іх не забудзем. Мн., 1949. *Т. М. Махнач.*

ТАМАШОВА ЛІЛІЯ

Тамашова Лілія Фёдараўна (н. 25.6.1924, в. Цеплякі Сенненскага р-на Віцебскай вобл.), літаратуразнавец, педагог-метадыст.

Нарадзілася ў сям'і рабочага-чыгуначніка. Бацька, Фёдар Анісімавіч, беззямельны селянін, у пошуках заробку разам з сям'ёй выехаў на Кольскі паўвостраў, дзе і прайшлі дзіцячыя гады Л. Тамашовай. У 1935 сям'я вярнулася на радзіму, жыла на чыгуначным перагоне каля ст. Багушэўск Віцебскай вобл. У час Вялікай Айчыннай вайны бацька эвакуіравацца не змог, працаваў на чыгунцы і ў гады акупацыі, за што ў 1944 асуджаны да 10 гадоў пазбаўлення волі, высланы ў лагер у Горкаўскую вобл., дзе і памёр. Маці, Фядора Сямёнаўна, прысвяціла жыццё выхаванню траіх дзяцей. Яна, маючы пачатковую адукацыю, многа чытала, хораша спявала, малявала. Першыя тры гады (1933—35) Л. Тамашова вучылася ў рускай пачатковай школе на ст. Палярны Круг Карэльскай АССР, пасля — у беларускай Багушэўскай сярэдняй школе, дзе да вайны скончыла 8 класаў. У гады эвакуацыі сям'я Тамашовых жыла ў п. Ашчэбутак Дамбараўскага р-на Чкалаўскай вобл. Летам усёй сям'ёй працавалі ў калгасе, зімой 1941 Л. Тамашова пайшла на працу ў МТС, спачатку сакратаром, затым рахункаводам. Вярнуўшыся на радзіму, Л. Тамашова ў верасні 1944 пайшла ў 10 клас Багушэўскай школы, аднак правучылася нядоўга, бо клас быў ліквідаваны. Паехала ў Мінск, дзе паступіла (без экзаменаў) на толькі што арганізаванае аддзяленне журналістыкі. Адначасова працавала ў рэдакцыі газеты «Чырвоная змена», сакратаром факультэта журналістыкі, тэхнічным сакратаром Упраўлення прапаганды ЦК КП(б)Б. На другім курсе перайшла на філфак. Пасля заканчэння універсітэта (1949) накіравана ў Віцебскі пединстытут, дзе выкладала рускую літаратуру. Пасля ліквідацыі філалагічнага факультэта Віцебскага пединстытута ў 1953—54

працавала ў Ялцінскім педвучылішчы. У 1954 пераехала ў Мінск. Звыш 25 гадоў займалася методыкай выкладання беларускай літаратуры ў школе. З 1954 старшы навуковы супрацоўнік, з 1959 загадчык сектара методыкі мовы і літаратуры Інстытута педагогікі. У 1967—78 інспектар-метадыст аддзела падручнікаў і метадычнай літаратуры Міністэрства асветы БССР.

Друкуецца Л. Тамашова з 1956. Першыя яе публікацыі звязаны з тэмай «Якуб Колас у школе». Распрацоўвала таксама методыку вывучэння апавяданняў К. Чорнага, Э. Самуйлёнка, рамана І. Шамякіна «Крыніцы», паэзіі П. Панчанкі. Аўтар метадычных дапаможнікаў «Вывучэнне трылогіі Якуба Коласа «На ростанях» у школе», «Вывучэнне паэмы Якуба Коласа «Новая зямля» ў школе», «Вывучэнне беларускай літаратуры ў 8 класе» (у сааўт.). Разам з Л. Царанковым выдала падручнікі-хрэстаматыі «Родная літаратура» для сёмага і восьмага (апошняе выданне разам з А. Рагулем) класаў.

Жыве ў Мінску.

Л. М. Гарэлік.

Бібліяграфія

1.2.

Вывучэнне трылогіі Якуба Коласа «На ростанях» у школе. Мн., 1957; 2 выд. Мн., 1969; 3 выд. Мн., 1976. Рэц.: Карпачоў М. Дапаможнік па вывучэнню ў школе трылогіі Я. Коласа «На ростанях» // Сав. школа. 1958. № 2; Разанаў І. Цікавы і змястоўны дапаможнік // Наст. газ. 1958. 28 сак.

Вывучэнне паэмы Я. Коласа «Новая зямля» ў школе. Мн., 1959; 2 выд. Мн., 1974. Рэц.: Пяткевіч А. Дапаможнік толькі выйграе // Наст. газ. 1960. 20 жн.

Вывучэнне беларускай літаратуры ў 8 класе. Мн., 1965 / Сааўт. Л. Царанкоў. Рэц.: Гусак С. Аўтары хрэстаматыі — у дапамогу настаўніку // Нар. асвета. 1965. № 10; Няхай М. Больш творчых пошукаў // Наст. газ. 1966. 24 жн.

1.3.

1956. Метадычная распрацоўка тэмы «Беларускі народ у трылогіі Якуба Коласа «На ростанях» // У дапамогу настаўніку. № 4.

1957. Выкрыццё антынароднай сутнасці царскіх чыноўнікаў і духавенства ў трылогіі Я. Коласа «На ростанях» // Сав. школа. № 1.

1962. Развіваць мову вучняў на кожным уроку // Нар. асвета. № 3; Метадычныя парады да вывучэння беларускай літаратуры ў 8 класе па новай хрэстаматыі // Там жа. № 7 / Сааўт. Л. Царанкоў; Урокі жыцця // Наст. газ. 13 кастр.

1963. О связи преподавания литературы с жизнью // Из опыта преподавания литературы в школе. Мн.; Вывучэнне рамана І. Шамякіна «Крыніцы» // Нар. асвета. № 3; Вывучэнне «Апавядання пра гуманізм» Э. Самуйлёнка // Там жа. № 11; Паэзія вялікіх пачуццяў: Вершы П. Панчанкі ў VII класе // Наст. газ. 24 крас.

1965. Вывучэнне верша Якуба Коласа «Першы снег» у 5-м класе // Нар. асвета. № 11; След у сэрцы: Вывучэнне творчасці К. Чорнага. З вопыту настаўніцы 54-й мінскай сярэд. школы М. М. Няхай // Наст. газ. 6 лют.

1966. Вывучэнне ў шостым класе ўрыўкаў з паэмы Якуба Коласа «Новая зямля» // Нар. асвета. № 6; Вывучэнне апавядання [Я. Коласа] «Васіль Чурыла» ў шостым класе // Там жа. № 9.

1967. Вывучэнне аповесці Якуба Коласа «На прасторах жыцця» // Нар. асвета. № 10.

1970. Апавяданне «У старых дубах» Я. Коласа // Нар. асвета. № 8.

1.6.

Родная літаратура: Хрэстаматыя для 8 класа васьмігадовай школы. Мн., 1962; 2 выд. Мн., 1963; 3 выд. Мн., 1964; 4 выд. Мн., 1965; 5 выд. Мн., 1966; 6 выд. Мн., 1967 / Скл. з Л. Царанковым.

Вачамі дзяцей: Зборнік дзіцячай творчасці. Мн., 1968 / Скл.

Родная літаратура: Падручнік-хрэстаматыя для 7-га класа. Мн., 1969; 2 выд. Мн., 1970; 3 выд. Мн., 1971; 4 выд. Мн., 1972; 5 выд. Мн., 1973; 6 выд. Мн., 1974; 7 выд. Мн., 1975; 8 выд. Мн., 1976; 9 выд. Мн., 1977; 10 выд. Мн., 1978; 11 выд. Мн., 1979 / Скл. з Л. Царанковым.

Родная літаратура: Падручнік-хрэстаматыя для 7-га кл. Мн., 1980; 2 выд. Мн., 1981; 3 выд. Мн., 1983; 4 выд. Мн., 1985 / Скл. з Л. Царанковым.

Родная літаратура: Падручнік-хрэстаматыя для 8-га кл. Мн., 1989; 2 выд. Мн., 1991; 3 выд. Мн., 1993. / Скл. з А. Рагулем.

М. П. Барташэвіч.

ТАНК МАКСІМ

Танк Максім [сапр. Скурко Яўген Іванавіч; інш. псеўд. Аўгень Бура, Віктар, А. Граніт, Жэнька, А. Сівер; 4(17).9.1912, в. Пількаўшчына Вілейскага пав. Віленскай губ., цяпер Мядзельскі р-н Мінскай вобл., паэт, грамадскі дзеяч. Народны паэт Беларусі (1968). Акадэмік АН Беларусі (1972). Герой Сацыялістычнай Працы (1974). Ганаровы грамадзянін г. Мінска (1987), г. п. Радашковічы (1992). Лаўрэат Ленінскай прэміі (1978, за кнігу паэзіі «Нарачанскія сосны»), Дзяржаўнай прэміі СССР (1948, за зборнік «Каб ведалі»), літаратурнай прэміі імя Я. Купалы (1959, за зборнік «След бліскавіцы»), Дзяржаўнай прэміі Беларусі імя Я. Купалы (1966, за зборнік «Мой хлеб надзённы»), літаратурнай прэміі імя А. Фадзеева (1980, за кнігу «Прайсці праз вернасць»). Член СП Беларусі з 1940.

Бацька паэта, Іван Хведаравіч, і маці, Домна Іванаўна (да замужжа Хвалько), працавалі на сялянскай гаспадарцы. У час першай сусветнай вайны бацьку прызвалі ў армію, ён служыў салдатам у чыгуначным батальёне, потым — у вайсковай шавецкай майстэрні ў Маскве. У Маскве апынулася і бежанка Домна Іванаўна разам з чатырохгадовым сынам Жэнем, якія ратаваліся ад нямецкай акупацыі. Тут сям'ю Скурко застала Кастрычніцкая рэвалюцыя. У Маскве будучы паэт пайшоў у школу, з захапленнем самастойна прачытаў першыя творы — «Вечары на хутары ля Дзіканькі» М. Гогаля, вершы А. Пушкіна, М. Някрасава, М. Лермантава, Т. Шаўчэнкі. Рыжскі мірны дагавор (1921) перапалавініў Беларусь. У той частцы, што адышла да Польшчы, аказалася і родная вёска паэта. Здавалася, пра вяртанне на бацькаўшчыну не магло быць і гаворкі. Але страшэнны голад, які ў 1921—22 ахапіў велізарныя абшары Расіі, вымусіў эмігрантаў шукаць дарогі дадому. Восенню 1922 сям'я Скурко вярнулася ў Пількаўшчыну. У 1923 Жэня Скурко пайшоў у 1-ы клас польскай пачатковай школы (скончыў праз тры гады); вучыўся ў вёсках Шкленікава і Сваткі. Потым паступіў у 3-і клас Вілейскай рускай прыватнай гімназіі. Але праз 2 гады яе закрылі польскія ўлады, і Я. Скурко перавёўся ў Радашковіцкую беларускую гімназію, тут ён уступіў у члены падпольнай камсамольскай арганізацыі і пачаў актыўна ўдзельнічаць у грамадскім жыцці. За ўдзел у забастоўцы ў пачатку 1929 быў выключаны з гімназіі. Нейкі час вучыўся ў Віленскай беларускай гімназіі, з якой таксама яго выключылі як вальнадумца і непаслушэнца. Удалося ўладкавацца ў Віленскую рускую гімназію імя А. Пушкіна. Тут разам з аднакашнікам, паэтам і мастаком Я. Гарохам выпусціў у 1931 рукапісны часопіс «Пралом», дзе пад псеўданімам А. Граніт змясціў свае першыя вершы. Адзін з экземпляраў часопіса трапіў у Мінск, з яго творы маладога паэта ўзялі для «Хрэстаматыі заходнебеларускай літаратуры». У 1932 Я. Скурко даволі актыўна супрацоўнічаў у нелегальным друку: у тым жа «Праломе», у камуністычным «Часопісе для ўсіх», у газетах-аднадзёнках «На пераломе» і «Беларускае жыццё». У апошняй (выйшла 7.4.1932 у Львове) упершыню пад вершам «Заштрайкавалі гіганты-коміны» з'явіўся псеўданім Максім Танк. У сакавіку 1932 за ўдзел у падпольнай камсамольскай рабоце паэт быў арыштаваны і трапіў у віленскую турму Лукішкі. Праз месяц удалося вырвацца на волю. Восенню 1932 у надзеі прадоўжыць вучобу М. Танк нелегальна перайшоў польска-савецкую граніцу і трапіў у Мінск. Неўзабаве вярнуўся назад на падпольную работу. Працаваў інструктарам ЦК камсамола Заходняй Беларусі (1932—33), вёў рэвалюцыйную дзейнасць на Віленшчыне і Навагрудчыне. Неаднойчы быў арыштаваны і прыгавораны да розных тэрмінаў турэмнага зняволення. З перапынкамі прасядзеў у турмах каля двух гадоў. У канцы 1933 у турме пры падтрымцы палітвязняў выдаваў рукапісны часопіс «Краты» (выйшла 6 нумароў), у якім змяшчаў і свае вершы, і творы іншых зняволеных паэтаў (П. Пестрака, В. Таўлая і інш.). У 1936 М. Танк прыняты ў КПЗБ. У другой палове 30-х гадоў як член інструктарскай групы ЦК КПЗБ па рабоце ў дэмакратычных арганізацыях, сярод інтэлігенцыі і моладзі ён накіраваны на працу ў легальныя выданні, што выяўлялі ідэі антыфашысцкага Народнага фронту. Вёў «Беларускую калонку» ў польскім перыядычным выданні «Poprostu» («Папростаму»), узначальваў літаратурны аддзел у газеце «Наша воля», супрацоўнічаў у «Беларускім летапісе», які выдаваў Р. Шырма, у часопісе «Калоссе». У гэтых і іншых выданнях друкаваў вершы, апавяданні, літаратурна-крытычныя і публіцыстычныя артыкулы, у якіх адстойваў ідэі агульнанароднага супраціўлення фашызму, класавага змагання, нацыянальнага вызвалення. З дапамогай КПЗБ выйшлі кнігі паэта «На этапах» (1936, з прадмовай Р. Шырмы), «Журавінавы цвет» і паэма «Нарач» (абедзве ў 1937),

«Пад мачтай» (1938). Кнігі «На этапах» і «Нарач» былі канфіскаваны польскімі ўладамі. Пасля ўз'яднання Заходняй Беларусі з БССР (1939) працаваў у сельскім камітэце, у «Віленскай праўдзе», вілейскай абласной «Сялянскай газеце». У 1940 у Дзяржаўным выдавецтве БССР выйшлі «Выбраныя творы» М. Танка, а ў Маскве — «Стихотворения». У пачатку Вялікай Айчыннай вайны паэт эвакуіраваўся ў Саратаў, там уступіў у народнае апалчэнне. Затым быў накіраваны на Бранскі фронт, у газету «За Савецкую Беларусь», якую рэдагаваў М. Лынькоў. Працаваў у рэдакцыі газеты-плаката «Раздавім фашысцкую гадзіну». Патрыятычныя творы ваенных гадоў склалі кнігі «Вастрыце зброю» і «Праз вогненны небасхіл» (1945).

Пасля вайны М. Танк працаваў у часопісе «Вожык», у 1948—67 галоўным рэдактарам часопіса «Полымя». У 1967—90 ён — старшыня праўлення Саюза пісьменнікаў Беларусі. Сакратар праўлення Саюза пісьменнікаў СССР (1966—86), старшыня Рэспубліканскага камітэта савецка-польскай дружбы (1958—91), Таварыства «Беларусь — Польшча» (з 1991). Член Рады СП Беларусі (з 1990). Кандыдат у члены ЦК КПБ (1961—66) і член ЦК КПБ (1966—90), дэпутат Вярхоўнага Савета СССР (1969—89) і БССР (1947—71). У 1963—1971 старшыня Вярхоўнага Савета БССР. Узнагароджаны 4 ордэнамі Леніна, ордэнам Кастрычніцкай Рэвалюцыі, залатым медалём «Барацьбіту за мір», медалём Францішка Скарыны, іншымі ордэнамі і медалямі.

За 6 дзесяцігоддзяў багатая і разнастайная паэзія М. Танка прайшла пэўную ідэйна-мастацкую эвалюцыю. Ранняя ідэйна-палітычная сталасць, шырыня светапогляду абумовілі хуткае станаўленне паэта як мастака слова. Грунтоўнае веданне фальклору, творчая вучоба ў класікаў беларускай, рускай, украінскай і польскай літаратур, шырокае знаёмства з еўрапейскай культурай паскорылі фарміраванне ўласнага паэтычнага стылю М. Танка. Ад вучнёўскага пераймання, вобразнай ускладненасці, моўнай каструбаватасці паасобных вершаў паэт даволі хутка перайшоў да самастойнага мастацкага мыслення, глыбокага асэнсавання з'яў рэчаіснасці. Лёс і духоўны свет заходнебеларускіх працоўных выяўлены ім у разнастайных паэтычных відах і жанрах: лірыцы грамадзянскай, філасофскай, пейзажнай і інтымнай, вершах гумарыстычных і сатырычных, казках, баладах, песнях, гераіка-рамантычных паэмах («Нарач», «Каліноўскі», «Журавінавы цвет», «Сказ пра Вяля»). Пасля вызвалення Заходняй Беларусі паэт імкнуўся адразу падключыцца да грамадскіх і культурных працэсаў, што адбываліся ў савецкай краіне. Аднак рэвалюцыйны пафас яго творчасці прыйшоў у пэўную супярэчнасць з тэорыяй бесканфліктнасці, якая панавала тады ў савецкім мастацтве. Адчувалася і слабое веданне новай рэальнасці. Адсюль — многія вершы — аднадзёнкі, творы «да выпадку», якія паэт змяшчаў у абласным і рэспубліканскім друку. У час Айчыннай вайны ў творчасці М. Танка пачынаюць пераважаць жанры сатырычна-выкрывальныя і публіцыстычна-пафасныя. Заклікі паўставаць на змаганне супраць фашыстаў, нічога не шкадаваць дзеля перамогі над ворагам, цвёрдая вера ў гэту перамогу, паэтызацыя подзвігу савецкага воіна, услаўленне неўміручасці роднага краю, народа, культуры і мовы — асноўныя матывы ваеннай лірыкі паэта («Падымайся, Беларусь», «Не шкадуйце, хлопцы, пораху», «Гастэла», «Родная мова»). У паэме «Янук Сяліба» (1943) на шырокім эпічным матэрыяле імкнуўся паказаць гераіку партызанскага руху на Беларусі. Гордасць народа-пераможцы, радасць працы, сум па цяжкіх стратах прадвызначылі агульную тональнасць лепшых пасляваенных кніг паэта «Каб ведалі», «На камні, жалезе і золаце», «У дарозе», «След бліскавіцы». У пасляваеннай творчасці паэт звяртаецца да гісторыі Беларусі, фальклорных сюжэтаў, славіць працу рабочых, хлебаробаў, дружбу народаў. Паглыбленне гуманістычнага пачатку, узмацненне філасафічнасці лірыкі, павелічэнне і ўдасканаленне сродкаў паэтычнага выяўлення становяцца вядучымі стылёвымі дамінантамі ўсёй творчасці М. Танка 60—80-х гадоў, што знайшло ўвасабленне ў зборніках «Мой хлеб надзённы», «Перапіска з Зямлёй», «Нарачанскія сосны», «Прайсці праз вернасць», «За маім сталом» і інш. Паэзія М. Танка паводле свайго духу сучасная, глыбока народная і нацыянальная. Паэт моцна звязаны з жыццём народа, востра рэагуе на праявы бесчалавечнасці, славіць мір. Разуменне ім маралі, дабра і зла, прыгожага і непрыгожага трывала грунтуецца на этычных і эстэтычных поглядах селяніна-працаўніка, беларускага хлебароба. Разам з тым яго паэзіі ўласцівы арганічны інтэлектуалізм, шырокамаштабнасць, найноўшыя мастацкія формы і сродкі. Канкрэтна-рэалістычная і рамантычна-ўмоўная плыні ў лірыцы М. Танка ўзаемадзейнічаюць і ўзаемадапаўняюць адна адну, абумоўліваюць багацце вобразнай, рытміка-меладычнай (верш сілаба-танічны, танічны, дольнік, верлібр), страфічнай (тэрцэт, катрэн, санет і інш.) арганізацыі верша. Рэвалюцыйны пафас творчасці паэта прадвызначыў бесперапыннае абнаўленне паэтычнай формы, наватарскія творчыя пошукі. З канца 50-х гадоў у паэзіі М. Танка пачаў адраджацца сатырычны жанр, узмацніўся палемічны запал (зб. «Селядцы з вершамі»). Паэт звяртаецца да жанру гераічнай паэмы («Мікалай Дворнікаў»). Моцная сувязь з беларускай народнапесеннай творчасцю, характэрная для ўсёй лірыкі М. Танка, непасрэдна выяўляецца ў творах для дзяцей (кнігі «Галінка і верабей», «Казкі лірніка», «Светлячок», «Ехаў казачнік Бай» і інш.). Многія вершы паэта пакладзены на музыку. Песні, кантаты, араторыі на словы М. Танка пісалі Л. Абеліёвіч (Дзве паэмы. Мн., 1958), М. Аладаў, В. Алоўнікаў, А. Багатыроў (Пяць вакальных дуэтаў. Мн., 1976), Р. Бойка, Г. Вагнер («Памяць»), Т. Дзядзюля («Каб ведалі»), К. Кавяцкас, Э. Калманоўскі, А. Кос-Анатольскі (хоры), І. Кузняцоў, А. Ленскі (хоры), Д. Лукас, І. Лучанок, Э. Манавелян, І. Мацін («Вясельная»), У. Мулявін («Завушніцы»), П. Падкавыраў (Свяці, зара; Добрай раніцы. Мн., 1957), А. Пахмутава, П. Падкавыраў, Р. Пукст, Ю. Семяняка, Г. Смірнова (Скаўронак. Л., 1956), Д. Смольскі, Э. Тамберг, А. Туранкоў, Э. Тырманд (Рамансы. Мн., 1969), А. Фляркоўскі, К. Цесакоў, М. Чуркін, В. Шабалін (хоры) і інш. Выступае М. Танк і як празаік-дакументаліст (кніга-дзённік «Лісткі календара»). Ён пераклаў на беларускую мову многія творы А. Пушкіна, У. Маякоўскага, А. Міцкевіча, Ю. Славацкага, П. Тычыны, М. Рыльскага, У. Бранеўскага, А. Венцлавы, Я. Судрабкална і інш. За пераклады польскай паэзіі атрымаў літаратурную прэмію Таварыства польска-савецкай дружбы

(1958) і Таварыства аўтараў (ZAIKS. 1969). Творы М. Танка перакладзены на многія мовы народаў свету. Творчасць М. Танка з'яўляецца сучаснай беларускай літаратурнай класікай, а сам ён уваходзіць у лік вядомых еўрапейскіх паэтаў. Жыве ў Мінску.

В. П. Рагойша.

Бібліяграфія

1.1.

Зб. тв.: У 2 т. Мн., 1958. Т. 1. Вершы і паэмы. Т. 2. Вершы і паэмы. Рэц.: Кудраўцаў І. Мужная, баявая песня // Беларусь. 1959. № 2; Михайлова В. Поэзия борьбы и правды // Сов. Бел. 1959. 13 окт.

Зб. тв.: У 4 т. Мн., 1966—1967. Т. 1. На этапах; Журавінавы цвет; Нарач; Пад мачтай; Праз вогненны небасхіл; Янук Сяліба: Вершы і паэмы. Мн., 1966. Т. 2. Каб ведалі; На камні, жалезе і золаце; У дарозе: Вершы. Мн., 1966. Т. 3. След бліскавіцы; Мой хлеб надзённы; Глыток вады: Вершы. Мн., 1967. Т. 4. Перапіска з Зямлёй; Лісткі календара; Шляхамі дружбы: (Вершы, дзённік, пераклады). Мн., 1967. Рэц.: Кудраўцаў І. Гартаючы лісткі календара... // Мін. праўда. 1967. 13 мая; Ліс А. Зрокам мастака і грамадзяніна // ЛіМ. 1967. 14 ліп.; Мальдис А. Дневник поэта // Неман. 1967. № 8; Рагойша В. // Дружба народов. 1968. № 7.

Зб. тв.: У 6 т. Мн., 1978—81. Т. 1. Вершы, паэмы. 1930—1945. Мн., 1978. Т. 2. Вершы, паэмы. 1945—1954. Мн., 1978. Т. 3. Вершы. 1954—1964. Мн., 1979. Т. 4. Вершы. 1964—1976. Мн., 1979. Т. 5. Вершы; Паэмы; Пераклады. 1976—1978. Мн., 1980. Т. 6. Дзённікі; Літаратурна-крытычныя артыкулы. Мн., 1981. Рэц.: Бугаёў Д. Выдатны паэт славянскага свету // ЛіМ. 1982. 17 вер.; Вішнеўскі А. Збор твораў Максіма Танка // Там жа. 1975. 5 крас.; Кабаковіч А. Паэзіі хлеб надзённы // Звязда. 1981. 18 снеж.

Выбр. вершы. Мн., 1940. Рэц.: Астапенка А., Коршак А. Зборнік вершаў Максіма Танка // Звязда. 1940. 24 кастр.; Бярозкін Р. Вачыма маладосці // ЛіМ. 1940. 7 ліст.; Краўчанка У. Выбраныя вершы М. Танка // Бальш. Пал. 1940. 17 снеж.; Лясовіч Т. Песні надзей і гневу // Вольная праца. 1940. 20 кастр.; Шкраба Р. Освобожденная песня // Сталин. молодежь. 1940. 16 нояб.

Выбр. вершы. Мн., 1947 (Выбраныя творы бел. сав. літ. 1917—1947). Рэц.: Агіевіч У. «Выбраныя вершы» Максіма Танка // Полымя. 1948. № 5; Панчанка П. Лаўрэат Сталінскай прэміі Максім Танк // Звязда. 1948. 4 крас.

Выбр. тв. Мн., 1952. Рэц.: Вераб'ёў П. Паэзія палымянага патрыятызма // За Радзіму. 1953. 29 сак.; Засім М. Паэт — барацьбіт // Зара. 1953. 29 крас.; Крышталь В. Паэт — барацьбіт // Мін. праўда. 1953. 4 лют.; Марцінавіч А. Паэзія працы і барацьбы // Калг. праўда. 1952. 14 вер.; Шчарбакоў Г. Творы аб шчасці народа // Сав. Радзіма. 1953. 25 студз.

Выбр. тв.: Вершы і паэмы. Мн., 1954. (Школьная б-ка).

Лірыка. Мн., 1982. (Б-ка бел. паэзіі).

Выбранае: Вершы. Мн., 1993.

1.2.

На этапах: Вершы. Вільня, 1936.

Журавінавы цвет. Вільня, 1937.

Нарач: Паэма. Вільня, 1937. Рэц.: В. Пясняр Нарачы // Бел. летапіс. 1937. № 10—11; Putrament J. Piewca Naroczy // Sygnały. 1937. Nr 33.

Пад мачтай: Паэзія. Вільня, 1938. Рэц.: Putrament J. Nowa książka Maksyma Tanka // Sygnały. 1938. Nr 50.

Янук Сяліба: Паэма. М., 1943. Рэц.: Деев А. Поэма о воле народа // Огонек. 1943. № 28—29; Іліна Р. «Янук Сяліба» // Сав. селянін. 1945. 15 ліст.; Карпачоў М. Паэма «Янук Сяліба» М. Танка // Гомел. праўда. 1945. 21 лют.; Ларчанка М. Гераічны эпас нашых дзён // Беларусь. 1944. № 2.

Вастрыце зброю: Вершы і паэмы. Мн., 1945. Рэц.: Хрушч У. Вастрыце зброю // Беларусь. 1946. № 2.

Праз вогненны небасхіл: Вершы. Мн., 1945. Рэц.: Агиевич В. Максим Танк // Сов. Бел. 1945. 23 дек.; Карпачоў М. Сярод кніг // Гомел. праўда. 1946. 4 мая.; Кніжныя навінкі // Піянер Бел. 1946. 22 студз.

Галінка і верабей: Верш. Мн., 1946.

Вершы. Мн., 1947. Рэц.: Новыя кнігі // Сав. селянін. 1948. 6 чэрв.

Казка пра мядзведзя. Мн., 1947. 2 выд. Мн., 1959.

Нарач: Паэма. Мн., 1947.

Вершы. Мн., 1948. (Школьная б-ка).

Каб ведалі: Вершы. Мн., 1948. Рэц.: Куляшоў А. Беларуская савецкая паэзія за 1947 год // ЛіМ. 1948. 28 лют.; Яго ж. Опережая время // ЛГ. 1948. 3 апр.; Кучар А. Шырокія гарызонты // ЛіМ. 1948. 17 крас.; Яго ж. Лауреат Сталинской премии Максим Танк // Сов. Бел. 1948. 4 апр.; Панчанка П. Каб ведалі // ЛіМ. 1948. 20 сак.; Яго ж. Лаўрэат Сталінскай прэміі Максім Танк // Звязда. 1948. 4 крас.; Рассошник Н. Каб ведали // Сталин. молодежь. 1948. 19 нояб.; Фядотаў В. Каб ведалі // Бальш. сцяг. 1949. 27 ліст.

Казкі лірніка. Мн., 1948. Рэц.: Замерфельд Е., Дубовік П. Творы Максіма Танка для дзяцей // Наст. газ. 1950. 30 сак.

Урачыстае абяцанне: Вершы. Мн., 1949.

На камні, жалезе і золаце: Вершы. Мн., 1951. Рэц.: Бур'ян Б. Паэзія стваральнай працы // Беларусь. 1952. № 1; Вайткевіч К. Хвалюючыя песні пра нашу сучаснасць // Бальш. сцяг. 1952. 26 кастр.; Гарэлік А. Паэзія мірнай стваральнай працы // Сав. Радзіма. 1952. 24 лют.; Зарыцкі А. Новыя вершы Максіма Танка // Звязда. 1952. 11 сак.; Каваленя Н. Вобраз новага савецкага чалавека // Бальш. Пал. 1952. 9 мая; Капец У. Паэзія аб нашай рэчаіснасці // Віцеб. рабочы. 1952. 23 мая.; Коржаль Е. «На камні, жалезе і золаце» // Гомел. праўда. 1952. 2 жн.; Марцінавіч А. На камні, жалезе і золаце // Калг. праўда. 1952. 20 лют.; Сурский О. // Сов. Отчизна. 1952. № 3; Шчарбатаў Г. Кніга аб пафасе мірнай працы // Мін. праўда. 1952. 3 лют.; Юревич В. Сердечное слово дружбы // Славяне. 1956. № 10.

Сярод лясоў наднёманскіх: Вершы. Мн., 1951.

У дарозе: Вершы. Мн., 1954. Рэц.: Калеснік В. Паэтычныя падарожжы // Зара. 1955. 20 сак.; Кірэенка К. Новая кніга Максіма Танка // Звязда. 1955. 20 студз.; Марцінавіч А. Паэзія жыцця // Калг. праўда. 1954. 14 снеж.; Мисько П. Заметки о стихах // Сов. Отчизна. 1955. № 1; Пётух А. На крылах паэзіі // Чырв. змена. 1955. 28 чэрв.; Шарахоўскі Я. Песня баявая // Беларусь. 1955. № 3; Шкраба Р. Заўсёды ў дарозе // ЛіМ. 1955. 22 студз.; Юревич В. Сердечное слово дружбы // Славяне. 1956. № 10.

Ехаў казачнік Бай: Казкі. Мн., 1955.

Конь і леў: Нар. казка. Мн., 1955.

Галінка і верабей: Вершы для дзяцей. Мн., 1957.

След бліскавіцы: Вершы. Мн., 1957. Рэц.: Адамчык В. «След бліскавіцы» // За вярт. на Радзіму. 1959. № 23; Астапенка А. // Мін. праўда. 1957. 13 снеж.; Вераб'ёў П. На шляху служэння народу // Маг. праўда. 1958. 1 жн.; Колесник В. Пафос человечности // Сов. Отчизна. 1958. № 1; Кудраўцаў І. На ўзбраенні чытача // Беларусь. 1957. № 11; Праскураў В. Заўжды атакуючая паэзія // Зара. 1957. 22 ліст.; След бліскавіцы // Маладосць. 1958. № 3; Тарубараў В. Новыя вершы Максіма Танка // Віцеб. рабочы. 1957. 3 снеж.; Ярмаловіч М. Лірыка Максіма Танка // Чырв. сцяг. 1958. 16 лют.

Янук Сяліба: Паэма. Мн., 1957. (Школьная б-ка).

Казкі; Легенды. Мн., 1960.

Мой хлеб надзённы: Вершы. Мн., 1962. Рэц.: Барсток М. Гімн сонцу і хлебу // Работніца і сялянка. 1962. № 6; Бойка У. Аблічча сучасніка // Калг. праўда. 1962. 30 мая; Бугаёў Д. Творчы неспакой паэта // ЛіМ. 1962. 2 сак.; Кажамякін В. Высокае майстэрства паэта // Гомел. праўда. 1965. 20 студз.; Ралько І. Ветразі паэзіі жывой // ЛіМ. 1965. 16 лют.; Салавей Л. У баявым страі // Беларусь. 1962. № 4; Ягорава Б. За чалавека! // Маг. праўда. 1965. 6 лют.

Лірыка. Мн., 1963. Рэц.: Бур'ян Б. Прачытай і перадай другому! // ЛіМ. 1963. 7 мая; Кіслік Н. Лірыка Максіма Танка // Беларусь. 1963. № 11; Соловей Л. Песни сердца // Сел. газ. 1963. 19 окт.

Глыток вады: Вершы. Мн., 1964. Рэц.: Бур'ян Б. На скрыжаванні вятроў і дарог... // ЛіМ. 1964. 10 ліп.; Ільніцький М. Веселкові мости до серця // Жовтень. 1964. № 9; Колас Н. Паэзіі вясёлкавы мост // Мін. праўда. 1964. 24 крас.; Няхай Р. Крыніцы чыстыя натхнення // Чырв. змена. 1965. 13 лют.

Селядцы з вершамі: Вершы. Мн., 1966. (Б-ка «Вожыка»). Рэц.: Рагойша В. Смехатэрапія Максіма Танка // ЛіМ. 1966. 26 ліп.

Вершы. Мн., 1967. (Школьная б-ка).

Лісткі календара: Фрагменты дзённіка. Мн., 1970.

Светлячок: Вершы. Мн., 1970.

Ключ жураўліны. Лірыка. Мн., 1972. Рэц.: Буслаў К. Логіка паэзіі // Полымя. 1973. № 8; Скобелев Э. Чистым сердцем Отчизну любя... // Сов. Бел. 1972. 31 авг.

Хай будзе святло: Вершы. Мн., 1972. Рэц.: Арочка М. Святло паэзіі // Голас Радзімы. 1973. № 23; Звязда. 1973. 27 лют.; Березкин Г. Единство и цельность // Сел. газ. 1973. 23 марта; Гамолка М. Яркае святло // Наст. газ. 1973. 23 мая; Гніламёдаў У. Дзень сённяшні // ЛіМ. 1973. 9 лют.; Смольянова Л. Пусть будет свет // Заря. 1973. 11 апр.

Дарога, закалыханая жытам: Вершы. Мн., 1976. Рэц.: Бечик В. Нить материнской песни // Лит. обозрение. 1978. № 3; Ягож. «У бязмежнай жыцця глыбіні...» // Звязда. 1977. 11 мая; Бярозкін Р. Адзінства... // Беларусь. 1977. № 5; Гамолка М. // Наст. газ. 1977. 20 крас.; Загорская Н. Нібы залатыя ніткі роздуму // Чырв. змена. 1977. 29 сак.; Марціновіч А. Вынашана сэрцам // Мін. праўда. 1977. 29 чэрв.; Панченко П. Верность родной земле // Известия. 1978. 10 марта; Рагойша В. Паміж сэрцам і сонцам // Полымя. 1977. № 7; Шестинский О. Летопись народной жизни // ЛГ. 1978. 8 марта; Шпаковский Я. Переписка с Землей // Дружба народов. 1977. № 12; Ягож. «Рукі... зноў апусціў на плуг...» // ЛіМ. 1977. 22 крас.

Быліна пра касмічнае падарожжа Мураша Бадзіні. Мн., 1979. Рэц.: Літвінаў Р. Сучасная адысея Мураша Бадзіні // Наст. газ. 1981. 26 вер.; Хорсун С. Прыгоды Мураша Бадзіні // ЛіМ. 1980. 28 сак.

Вершы. Мн., 1979. (Школьная б-ка).

Прайсці праз вернасць: Вершы і паэма. Мн., 1979. Рэц.: Аврамчик М. Верность гражданскому долгу // Сел. газ. 1979. 23 окт.; Арочка М. Дарога праз вернасць // Полымя. 1979. № 9; Арочко М., Найдич М. В гости к светилам // Лит. обозрение. 1981. № 2; Гниломедов В. Героизм и повседневность // Неман. 1980. № 1; Загорская Н. // Чырв. змена. 1980. 17 лют.; Марціновіч А. Строгая мудрасць // Беларусь. 1979. № 9; Прыходзька П. Вернасць прызванню // Звязда. 1979. 21 ліп.; Реймерис В. Проверяется сердцем // ЛГ. 1980. 17 сент.; Тычына М. Важкасць слова // ЛіМ. 1979. 27 ліп.; Reimeris V. // Soviet Literature. 1982. N 7.

Ave Maria: Лірыка. Мн., 1980.

На этапах: Вершы. Мн., 1983. Рэц.: Вішнеўскі А. // ЛіМ. 1984. 16 сак.; Канэ Ю. Сустрэча з мінулым // Маладосць. 1984. № 12.

Ехаў казачнік Бай: Вершы і казкі. Мн., 1984. Рэц.: Хорсун С. Урокі дабраты // Наст. газ. 1984. 22 жн.; Шаранговіч Н. Добры казачнік Бай // ЛіМ. 1984. 25 мая.

За маім сталом: Вершы. Мн., 1984. Рэц.: Баравікова Р. Планета праўдзівага сэрца // ЛіМ. 1985. 23 жн.; Гніламёдаў У. Голас паэта — голас жыцця // Звязда. 1984. 22 снеж.; Мікуліч М. З клопатам пра будучыню // Чырв. змена. 1985. 27 чэрв.; Чабан Т. У рытме сэрца, зямлі і падзей // Полымя. 1985. № 12.

Лірыка. Мн., 1987.

Сярод лясоў наднёманскіх: Вершы і казкі. М., 1987. (Мая першая кніжка).

Дарога і хлеб: Лірыка. Мн., 1988. (Паэтычная б-ка).

Збор калосся: Вершы: (1983—1988). Мн., 1989.

Паслухайце, вясна ідзе: Вершы, балады, паэмы. Мн., 1990.

Ехаў казачнік Бай: Вершы і казкі. Мн., 1991; Мн., 1992.

Лемантар: Вершы. Мн., 1993.

1.3.

1932. «Гэй, у каго кроў не застыла...»: [Верш] // Малады камуніст. № 5; У дарозе; Дзе ўчора стаяў безработны; Новы год: [Вершы]; Гаротнікі прачнуліся: [Нарыс] // Пралом. № 2 / Пад псеўд. А. Граніт; Заштрайкавалі гіганты-коміны: [Верш] // Бел. жыццё. 7 крас.

1933. Безработны; Гэй, рвецеся песні!..: [Вершы] / Пад крыпт. Д. С.; У дарозе; Новы год: [Вершы]; Гаротнікі прачнуліся; У нашы дні; Штандар: [Апавяданні] / Пад псеўд. А. Граніт; Аўт. спрэчнае; Забаставалі гіганты-коміны: [Верш] // Хрэстаматыя рэвалюцыйнай літаратуры Заходняй Беларусі. Мн.; Гэй, рвіцеся песні...: [Верш] / Пад крыпт. Д. С.; У дарозе: [Верш] // Полымя рэвалюцыі. № 5 / Пад псеўд. А. Граніт.

1934. Там, дзе шуміць каласістае гора: [Верш] // Літ. стар. 25 студз.

1935. Свінкс; Першы снег; Этап: [Вершы] // Крыгалом. № 1.

1936. Вулей старога Мацея: [Верш] // Бел. борць. № 4—5; Восень: [Верш] // Бел. летапіс. № 1; Бель: [Абразок]; Жаўранак; Вясной; Дарогай: [Вершы] // Калоссе. № 2; Нарач: [Паэма] // Там жа. № 2—5; Веялі ветры...: [Абразок]; Ой, не гніце, ветры...: [Верш] // Там жа. № 3; Прайдуць гады: [Верш]; Па дарогах і вёсках: [Апавяданне] // Там жа. № 4; Тры песні: [Верш] // Там жа. № 5; Бор: [Верш] // Летапіс ТБШ. № 1—3; З далёкіх пералётаў: Замалёўка; «Ужо папеў...»; Восенню: [Вершы] // Там жа. № 4—8; На шляху: [Апавяданне]; На шляху дзікіх гусей; Зазімак; Сэзановец; П'яны баян; З каласамі; Над Нараччу; У непагоду: [Вершы] // Маладая Бел. № 1; Чорныя скібы; Я ў кожным пажары: [Вершы] // Poprostu. Nr 12; Etapy: (Notatka autobiograficzna) // Poprostu. Nr 14; У маршы: [Верш] // Там жа. № 14; У завею; Песні; Снег: [Вершы з цыкла «З шэрай цэглы»] // Шлях моладзі. № 1; «Сонца спаткаю пэўна...»; «Сілы шмат ў руках мазольных...»: [Вершы] // Там жа. № 2; А ўсё ж вярнуся...: [Верш] // Там жа. № 3; «І песні і сонца...»: [Верш] // Там жа. № 4; «Ясна зоры гарэлі...»: [Верш]; У дарозе: (Шкіцы з Навагрудчыны: Лірычныя нататкі прозай) // Там жа. № 7—8; Восенню: [Верш] // Там жа. № 9; З вясенніх напеваў: [Верш] // Там жа. № 10; Пісьмо: [Верш] // Там жа. № 11, 12; «Хай нас пагоняць па каляінах тых дарог...»: [Верш] // За бел. шк. 16 чэрв.; На прадмесці: [Апавяданне] // Наша воля. 4 лют.; Два: [Верш]; Дыскусія над праграмай нацаў: Абразок з натуры; Пад вастрожнай сцяной; Байка пра Кліма: [Вершы]; Там, дзе вазёры: Летні нарыс з над Нарачы // Наша воля. 29 лют.; Спатканне: [Верш] // Там жа. 20 сак.; Попярак загонаў: [Апавяданне] // Там жа. 20 сак., 12 крас., 2 мая; «Падарожжа і бездарожжа»: [Рэц. на: Машара М. Падарожжа // Калоссе. 1936. № 1]; Зара на плоце; Прадспеў да паэмы «Нарач» // Там жа. 12 крас.; Вянок; Крытык: [Вершы] // Там жа. 2 мая; Досыць бездарожжа // Там жа. 16 чэрв.; «Працы шмат дзірванее...»; Над паласой; Да дня; Палавічнік; Да штурму...: [Вершы] // Там жа. 16, 19 чэрв.; Люблю цябе, краіна: [Верш] // Там жа. 7 ліп.; Світазь: [Верш]; «Ёсць на прадвесні чароўныя раніцы...»: (З паэмы «Нарач», частка III, 4); На новы шлях //

Там жа. 4 жн.; Па Наваградчыне: [Нарыс] // Там жа. 23 жн.

1937. Нашы дарогі; Эпілог: [Вершы] // Бел. летапіс. № 2–3; Журавінавы цвет: [Паэма] // Там жа. № 4—7; «Як задрэмлюць хлопцы ў полі»: [Верш]; Міхась Васілёк Там жа. № 5; Як зялянее зямля: [Верш] Там жа. № 6—7; Стрэхі за гасцінцам // Там жа. № 8; Сказ пра Вяля: Народная быліна // Там жа. № 8, 9; «Думаў сёння прайду сабе так...»; «Скіну з плеч шырокіх...»: [Вершы]; На дапамогу моладзі // Там жа. № 9; Выраі над курганамі; Казка пра мядзведзя: [Вершы] // Там жа. № 10—11; Нарач; Паэма (ч. V); Нашы шляхі; Песня кулікоў: [Вершы] // Калоссе. № 1; У туманах вішнёвых: [Верш]; Нарач: (Паэма, ч. VI) // Там жа. № 2; Нарач: (Паэма, ч. VII); У лесе: [Верш] // Там жа. № 3; З паднятай галавой; На новы год лісце — каштанаў; У худых руках; Бярозе; Дзед і шчупак; Павязлі цягнікі; Уздымаецца лісце; Пачатак оды; У Панарах: [Вершы] // Там жа. № 4; Вулей старога Мацея: [Верш]; Вясной: (Урывак з паэмы «Нарач», ч. III, 5); Сем радкоў: [Верш] // Снапок. № 1; Верабейчык: (Казка); Даўно гэта было: (Уступ да казак); Матыль і дзіця: [Верш] // Там жа. № 2; Мухамор: [Верш] Там жа. № 3; Пра старога дзеда і шчупака: [Верш] Там жа. № 4; Казка пра мядзведзя: [Верш] // Там жа. № 5; Казка пра музыку // Там жа. № 7, 8; 1938. № 2; Снег: [Верш] // Там жа. № 8; Сем радкоў: [Верш] // Хрысціянская думка. № 6; Імглой: [Верш]; Адказ на артыкул быццам аб паэзіі, змешчаны ў «Бел. фронце» № 1 (10) п. н. «Мэты паэзіі» Шлях моладзі. № 1; Ноччу: [Верш] // Там жа. № 2; Моладзі: [Верш] // Там жа. № 3; Арліны: [Верш] // Там жа. № 4; На акопах: [Верш] // Там жа. № 5; З тых дзён: [Верш] // Там жа. № 6; Шумяць калёсы: [Верш] // Там жа. № 7; Калі на полі: [Верш] Там жа. № 10; Цішыня дарог: [Верш] // Там жа. № 14; Разам... Глядзі, не марудзь... Пасля з дарогі ў гушчары...: З паэмы «Нарач. Арыштаваныя сяляне» Бюлетэнь «Хаўрусу» бел. рабочых у Францыі. 15 ліп.; Спатканне: [Верш] // Там жа. 1 снеж.

1938. На новы год: [Верш] // Беларускі сялянскі каляндар на 1938 год. Вільня; «Межы, дзе глянеш, усё межы»: [Верш] // Бел. летапіс. № 1; Кожны піша: [Верш]; Крыніцы нашай творчасці // Там жа. № 2; Ціха ў порце; Шаіры: [Вершы]; У дарогу: Урывак з паэмы; Літаратурны маладняк: Крытыка // Там жа. № 4—5; З ветрам: [Верш] // Зорка. № 1; Каліноўскі: Паэма; Есць варажбітныя травы: [Верш] // Калоссе. № 1; Казка пра музыку: [Верш] // Там жа. № 2.

1939. Сягоння: Р. Шырме; Забейдзе-Суміцкаму: [Вершы] // Бел. летапіс. № 1; Казка пра мядзведзя / Іскры Ільіча. № 11; Абразы з паэмы «Сілаш Істома»; Перад ад'ездам; Дума; Пад восень. Марозна, белы вецер; Скрыпка; Перагледзяць, памацаюць слова; Вясной; Зіма: [Вершы] // Калоссе. № 1; Вільня; Груган; Дома: Урыўкі з паэмы «Сілаш Істома»; Да справы перакладаў мастацкай літаратуры // Там жа. № 2; Чакаем сонца; У зялёным лугу: [Вершы] // Там жа. № 3; Дзе ні пойдзеш; На плошчы Леніна; Дзе жыта зашуміць; Сягоння: [Вершы] // Полымя рэвалюцыі. № 11—12; На новы год: [Верш] // Вілейская праўда. 1 студз.; Зоры над нашай запаліў зямлёй: [Верш] // Там жа. 10 студз.; Спатканне: [Верш] // Там жа. 24 ліст.; На шляхах народнай творчасці // Там жа. 27 ліст.; Дзе ні пойдзеш: [Верш] // Там жа. 4 снеж.; Хай шумяць твае годы баявымі сцягамі: [Верш] // Там жа. 21 снеж.; Маім таварышам: [Верш] // Там жа. 27 снеж.; Дарогі да маткі Масквы: [Верш] // Там жа. 29 снеж.; Свабодная песня: [Верш] // ЛіМ. 5 ліст.

1940. Мухамор: [Верш] // Іскры Ільіча. № 1; Дзед і шчупак // Там жа. № 9; Матыль; Песня кулікоў; Эпілог: (З паэмы «Нарач») // Полымя рэвалюцыі. № 1; Вянок: [Верш] // Там жа. № 2; Над калыскай; Дзед і Шчупак: [Вершы] // Там жа. № 3; З тваім імем у сэрцы: [Верш] // Там жа. № 9—10; Вольная праца. 3 снеж.; Зара. 7 снеж.; Звязда. 29 ліст.; ЛіМ. 30 ліст.; Палес. праўда. 5 снеж.; Сялян. газ. 1 снеж. / У сааўт.; Таварышу Сталіну: [Паэма] // Бальш. Пал. 4 снеж.; Віцеб. рабочы. 3 снеж.; Палес. праўда. 5 снеж.; Чырв. звязда. 4 снеж. / У сааўт.; Зоры над нашай запаліў зямлёй: [Верш] // Вольная праца. 16 студз.; Спекулянт: [Верш] // Там жа. 5 кастр.; Сялян. газ. 24 жн.; Над магілай М. Багдановіча: [Верш] // Вольная праца. 12 кастр.; ЛіМ. 12 кастр.; Янку Купале: [Верш] // Вольная праца. 8 снеж.; Звязда. 11 снеж.; На грані: [Верш] // Вольная праца. 18 снеж.; Дарога: [Верш] // Там жа. 25 снеж.; Радасныя песні загучалі над вызваленай зямлёй: [Нарыс] // Зара. 24 лют.; Звязда. 11 лют.; На плошчы Леніна: [Верш] // ЛіМ. 3 лют.; Зіма: Урывак з паэмы «Сілаш» // Там жа. 11 лют.; «Бура над Нараччу»: Пісьмо пра творчыя планы // Там жа. 17 жн.; Таварышам літоўцам: [Верш] // Там жа. 7 вер.; Правадыру: [Верш] // Там жа. 14 вер.; Вечар: [Верш] // Там жа. 2 ліст.; Свобода! // ЛГ. 7 нояб.; Іграй, гармонік, весела: [Верш] // Сялян. газ. 21 лют.; На свабоднай зямлі // Там жа. 23 лют.; Сустрэча з кандыдатам у дэпутаты Савета Саюза Вярхоўнага Савета СССР // Там жа. 1 сак.; Сустрэнем дзень выбараў новымі вытворчымі перамогамі // Там жа. 3 сак.; Кацярына Лукічна Рабіза // Там жа. 8 сак.; Над магілай Францішка Багушэвіча // Там жа. 13 крас.; Савецкай радзімы я грамадзянін: [Верш] // Там жа. 24 крас.; Чырвоны май вітай, свабодная радзіма: [Верш] // Там жа. 1 мая; Балет «Салавей» // Там жа. 16 чэрв.; Сям'і працоўнай моладзь: [Верш] // Там жа. 17 чэрв.; Без свечак ладана, ілжы — відней, лягчэй нам будзе жыць: [Верш]; Пачынаючым паэтам — сістэматычную дапамогу // Там жа. 22 чэрв.; У новым Мядзеле // Там жа. 3 жн.; Дарога ў шчаслівае жыццё // Там жа. 1 ліст.; Хай шумяць твае гады баявымі сцягамі: [Верш] // Чырв. змена. 6 лют.; Na warcie // Szt. Wolności. 5 lut.

1941. Янку Купалу: [Верш] // Полымя № 1; Дарога: [Верш] // Там жа. № 2; Лесарубам: [Верш] // Вольная праца. 1 сак.; Сялян. газ. 23 сак.; Кок-сагыз: [Верш] // Вольная праца. 7 сак.; ЛіМ. 19 крас.; Сялян. газ. 9 сак.; Маскве: [Верш] // Вольная праца. 30 сак.; За высату 429: [Верш] // Там жа. 8 крас.; ЛіМ. 7 чэрв.; На балатах: [Верш] // Вольная праца. 24 крас.; ЛіМ. 29 крас.; Ткачам: [Верш] // Вольная праца. 1 мая; ЛіМ. 10 мая; Нарач: (Урыўкі з паэмы) // Вольная праца. 18 мая; Мы рэалізуем пазыку: [Верш] // Там жа. 3 чэрв.; Восенню: [Верш] // ЛіМ. 18 студз.

1942. «Хай згіне гад...»: [Верш] // Раздавім фашысцкую гадзіну. № 40; Ты не будзеш сіратой: [Верш] // Там жа. № 45 / У сааўт.; «Сабралася вось гэтая арава...»: [Верш]; Фашысцкая кукушка // Там жа. № 47; Не чакалі: [Верш]; Праз лясы, балаты і паляны: Партызанская песня // Там жа. № 48; Даб'е народ шакалаў азвярэлых // Там жа. № 51; Народжаны поўзаць, лятаць не можа; Аднойчы Швейк у бутэльцы розум знайшоў; Год мінуў — і кат шалёны: [Вершы]; «З нажом кат рынуўся на нас...» // Там жа. № 52; «Каб каты нам хлеб і здабытак...»: [Верш] // Там жа. № 53; Небяспечныя гульні: [Верш]; Асвета па-нямецку // Там жа. № 54; Стрэлачнік — салдат; ...йся, ...Беларусь: [Вершы] // Там жа. № 55; Адпомсці: [Верш] // Там жа. № 56; Адпомсцім: [Верш] // Там жа. № 59; «Ехалі фрыцы...» // Там жа. № 60; Парады вучонага жывёлавода: [Верш] // Там жа. № 61; Будзе і на нашай вуліцы свята // Там жа. № 68; Малая партызанская энцыклапедыя // Там жа. № 71—72 / У сааўт.; Падымайся, Беларусь!: [Верш] // Віцеб. рабочы. 10 вер.; «Мы пранясем сцягоў зару...»: [Урывак з верша] // За сваб. Бел. 9 крас.; Гастэла: [Верш] // Там жа. 28 чэрв.; Мы зноў на месцы тым: [Верш] // Там жа. 31 мая; Вастрыце і куйце зброю: [Верш] // Сав. Бел. 12 лют.; Ты будзеш жыць, Радзіма!: [Верш] // Там жа. 7 ліст.

1943. Легенда: (З паэмы «Янук Сяліба») // Беларусь. М.; Гастэла; Не шкадуйце, хлопцы, пораху!: [Вершы] // Моладзь Беларусі ў баях за Радзіму. М.; Польскія халуі Гітлера; Чырвоны пляц: Урывак з паэмы // Раздавім фашысцкую гадзіну. № 75; Па ворагу лютым, агонь!: [Верш] // Там жа. № 76; Сталінград: [Верш] // Там жа. № 78; На дне возера Нарач; Ідзі, баец, цябе чакае Беларусь // Там жа. № 79; Маці // Там жа. № 82; Адпомсці кату за разбой: [Верш]

// Там жа. № 83; Пан Студніцкі марыць: [Верш] // Там жа. № 89; Апошні загад // Там жа. № 90; «Я вольным жыў, не знаў бяды, нядолі»: [Верш] // Там жа. № 91; «Мы нашу зброю і сцягі»: [Верш]; Татальныя рызманы і анучы // Там жа. № 92; Не да прамоў // Там жа. № 93; Воўк у капкане: [Верш] // Там жа. № 94; Курская дуга // Там жа. № 98; Гусі і качкі: [Байка] // Там жа. № 101 / Пад. псеўд. Штык; Нагрэў // Там жа. № 104; Салют // Там жа. № 105; Спавітая агнём і дымам: [Верш]; Трыумфальная арка // Там жа. № 106; Заквітнее Беларусь ізноў!: [Верш]; Сымон і яго стрэльба // Там жа. № 107; Сабачы лёс // Там жа. № 108; Вядзе нас помста: [Верш] // Там жа. № 110; «Гебіткамісар склікаў з'езд...»: [Верш] // Там жа. № 112; Гомелю: [Верш] // Там жа. № 113; Навагодняя ёлка; Партызанскія запаветы на новы год // Там жа. № 114; Янук Сяліба: (Урывак з паэмы) // Сав. Бел. 20 сак.

1944. На радзіме: [Верш] // Беларусь. № 1; Родная мова: [Верш] // Там жа. № 2; Ты сёння далёка: [Верш] // Там жа. № 3; Канец кар'еры обер-лейтэнанта // Раздавім фашысцкую гадзіну. № 115; На лясной паляне: Казка // Там жа. № 116; Фрыц у пастцы // Там жа. № 117; Пра Гітлера ката і пра яго халуя Цата // Там жа. № 118; «Надлегласць» на ланцужку // Там жа. № 122; Пра фрыца // Там жа. № 123; Варожыць пакуль галавы не зложыць: [Верш] / Пад псеўд. С. Рыбак; На граніцы // Там жа. № 124—125; Гэтым памятным дням: [Верш] // Звязда. 18 ліп.; Партыя: [Верш] // Там жа. 7 ліст.; Пісьмо з Беларусі: [Верш] // Лит. и искусство. 1 янв.; Клінок казака: [Верш] // Сав. Бел. 23 мая; Партызан Мяцеліца: [Урыўкі з паэмы] // Чырв. змена. 22 мая; Салюты Масквы: [Верш] // Там жа. 17 ліп.

1945. Ты будзеш жыць, Радзіма!; Вечная слава; На дарозе; Ластаўкі; Пралескі; Развітанне; Мы берагам Нёмана ішлі; Калі сустрэў цябе я: [Вершы] // Альманах-2. Мн.; Легенда: (З паэмы «Янук Сяліба»); Гастэла; Родная мова; Маці; Не шкадуйце, хлопцы, пораха; Беларусь; У мяцель: [Вершы] // За шчасце Беларусі. М.; Л.; Дарогай: [Верш] // Беларусь. № 1; Адыходзячы з хаты: [Верш] // Там жа. № 2; На брацкай зямлі: [Верш] // Там жа. № 3; Пасылае маці думы: [Верш] // Там жа. № 4; У гэтыя дні: [Верш] // Там жа. № 5; Іван-ды-Мар'я: Легенда // Там жа. № 7—8; Заўсёды поўначчу: [Верш] // Там жа. № 9; Галінка і верабей: [Верш] // Бярозка. № 1; ЛіМ. 20 мая; Журавель і чапля: [Верш] // Бярозка. № 2—3; ЛіМ. 10 чэрв.; Піянер Бел. 4 кастр.; Глухата Патэна: [Верш] // Вожык. № 1; Беларусь; Рэквіем; Яна хату бяліла; Я майстэрню скульптара люблю: [Вершы] // Полымя. № 1; У дзень свята: [Верш] // Там жа. № 5—6; ЛіМ. 10 мая; Сустракаючы Новы год // Раздавім фашысцкую гадзіну. № 138; Мары ад цяжкай галавы // Там жа. № 139; Перад апошнім актам // Там жа. № 140; На Карпатах: [Верш] // ЛіМ. 10 крас.; Шлях жыцця // Там жа. 2 жн.; 1 чэрв.; Крыніца: [Верш] // Там жа. 2 жн.; Каб ведалі: З Умшлягпляцу; Сон над Нёманам: [Вершы] // Там жа. 22 кастр.; Паэту; Шапэн; Свята ў Таліне: [Вершы] // Там жа. 22 снеж.; Гастэла: [Верш] // Піянер Бел. 12 крас.; Родная мова: [Верш] // Там жа. 19 крас.; Праздник Родины // Сов. Бел. 3 июля; На Мядельских озёрах // Там жа. 29 июля / Сааўт. М. Лужанін; Літаратура перамогі / Сааўт. М. Лужанін; Гэтыя дні; Мы ў свой горад прыйшлі: [Вершы] // Сялян. газ. 8 ліп.

1946. З тваім імем у сэрцы: [Верш] / У сааўт.; Песня кулікоў; Вільня; А сёння ідзіце...; Матыль; «Паслухайце, вясна ідзе...»; Павязлі цягнікі...; Раманс; Пачатак оды; Над калыскай; «Зноў загарэліся сосны...»; Здарова, сябры; На плошчы Леніна; Сягоння...; Прадыру: [Вершы] // Семнаццатага верасня. Мн.; Вільнюс: [Верш] // Беларусь. № 1; Зіма на бацькаўшчыне; Камяні; Рубікон: [Вершы] // Там жа. № 2; Трасцянец; Сільніцкі; Вясной; Сасна: [Вершы] // Там жа. № 3; Раніца над Мінскам; Кропля дажджу; Ян Райніс; Я не ведаў — хто ты: [Вершы] // Там жа. № 4; Якубу Коласу; Добра было б; Н. А.: [Вершы] // Там жа. № 5—6; Песня Яносіка; Ацала зорка; Голуб; Другу: [Вершы] // Там жа. № 7; Балада пра партызана Дубягу // Там жа. № 8; Люцыян Таполя: Паэма // Там жа. № 9; У Брэсце; Мінулі завеі: [Вершы] // Там жа. № 10; Рэйкавая вайна; На Наваградскай гары; Эпітафія; На Мядзельшчыне: [Вершы] // Там жа. № 11—12; Ленін і Сталін: [Верш] // Бярозка. № 10; ЛіМ. 9 мая; Незвычайная справаздача: Апавяданне // Вожык. № 1—2; «Баявыя заслугі» генерала Андэрса: Апавяданне // Там жа. № 9—10; Гэта было вясной; Гета; У садавода; «Здаецца, чэрвень быў тады...»; Калыханка; Дарога: [Вершы] // Полымя. № 6; Нарач; У Вільні; Міны: [Вершы] // Там жа. № 8—9; Яна хату бяліла: [Верш] // Работніца і сялянка. № 3; Слова служыць народу: [Выступление на 6 з'ездзе пісьменнікаў СССР] // Звязда. 24 чэрв.; Елка: [Верш] // ЛіМ. 1 студз.; Рэпатрыянты; Манах: [Вершы] // Там жа. 9 сак.; Вырай: [Верш] // Там жа. 3 крас.; У дзень свята: [Верш] // Піянер Бел. 8 мая; Я, можа, сотню раз прайшоў...: [Верш] // Чырв. змена. 17 вер.

1947. Масква: [Верш]; На чырвоным пляцу: [Урывак з паэмы «Янук Сяліба»] // Роднай Маскве. Мн.; Мы у свой горад прышлі; У мяцель; Пасылае маці думы; Ластаўкі: [Вершы] // Эстрада. Мн.; Дэпутат; Наваселле; Партыя; Новаму году; Элеватар: [Вершы] // Беларусь. № 1. У Віцебску; Дома: [Вершы] // Там жа. № 2; Дзіцячы дом; Ляжаць пакошаныя травы; Вось дарога дальняя; Восень; Камсамолу Беларусі: [Вершы] // Там жа. № 3; Масква; Два лісты: [Вершы] // Там жа. № 4; Лён; Мой новы горад; Майскі дождж: [Вершы] // Там жа. № 5; Янку Купалу: [Верш] // Там жа. № 6; Граніца; Белгрэс; Джульета: [Вершы] // Там жа. № 8; У гарадскім садзе; Свята: [Вершы] // Там жа. № 9; Так; На стадыёне: [Вершы] // Там жа. № 10; Наша восень; У партызанскім лесе; Пні каля дарогі: [Вершы] // Там жа. № 11; У калгасным клубе: [Верш] // Вожык. № 1; Здарэнне на Алімпе: [Верш] // Там жа. № 5 / Пад псеўд. Ахрэм Цыбуля; Ленін і Сталін: [Верш] // Полымя. № 1; Гастэла: [Верш] // Віцеб. рабочы. 3 жн.; Пасланне за мяжу: [Верш] // Звязда. 5 кастр.; ЛіМ. 4 кастр.; Камсамолу Беларусі: [Верш] // Комс. правда. 2 марта; Ленінград: [Верш] // ЛіМ. 6 ліст.; Разліў; У шторм; Гэта было, камісар...; Праўдзівае слова; Снег; Памяці таварыша Таўлая: [Вершы] // Там жа. 13 снеж.; На плошчы Леніна: [Верш] // Піянер Бел. 22 студз.; Здарова, сябры!: [Верш] // Сав. сел. 4 вер.; Добра было б...: [Верш] // Чырв. звязда. 26 студз.

1948. Дружба; Добрай раніцы; Над Прыпяццю; Забастоўка ў Марселі; Жаўрук: [Вершы] // Беларусь. № 1; На даўгінаўскім гасцінцы: [Верш] // Там жа. № 2; Салют; Ля аэрадрома; На начлезе; У чыстым полі: [Вершы] // Там жа. № 3; Мандарыны; Сябрам; Братам на чужыне: [Вершы] // Там жа. № 4; Грай, гарніст!: [Верш] // Бярозка. № 6; Здарова, таварышы!: [Верш] // Там жа. № 9; Урачыстае абяцанне: [Верш] // Там жа. № 11; Агні Мінска: [Верш] // Полымя. № 4; Гродзен. праўда. 24 кастр.; Звязда. 17 сак.; Памяці таварыша Жданава: [Верш] // Полымя. № 8; Грэцыя, Грэцыя: [Верш] // Звязда. 29 лют.; На начлезе; Дружба; Добрай раніцы; Сябрам: [Вершы] // Там жа. 6 крас.; Пісьмо Сталіну: [Верш] // Там жа. 29 жн.; Велічныя і натхняльныя тэмы: Слова пісьменніка // ЛіМ. 1 студз.; 17 верасня: [Верш] // ЛіМ. 17 вер.; Сав. сел. 16 вер.; На Эгейскім моры; Песня пра партызана Адынца; Перад зімовым сном палёў; На шырокім шляху; На камні, жалезе і золаце: [Вершы] // ЛіМ. 4 снеж.; Адам Міцкевіч // Там жа. 25 снеж.; Партыя: [Верш] // Сав. сел. 4 крас.; Великий польский поэт: К 150-летию со дня рождения А. Мицкевича // Сов. Бел. 24 дек.; Беларусь; Элеватар; Пісьмо Сталіну; Гастэла; На Мядзельшчыне; Лён: [Вершы] // Сялян. газ. 11 крас.

Нарадзіўся ў сям'і рабочага. У 1932 скончыў у Янакіеве сямігодку і пайшоў на металургічны завод. Працаваў у заводскай газеце «За металл», раённай газеце «Знамя коммунизма» (1932—36). У 1936 пераехаў у Ленінград, паступіў у Інстытут інжынераў камунальнай гаспадаркі, але з-за цяжкіх матэрыяльных умоў скончыць яго не давялося. Працаваў у газеце «Ленинское знамя» (г. Тосна Ленінградскай вобл.) літсупрацоўнікам, загадчыкам аддзела, адказным сакратаром (1936—41). У час Вялікай Айчыннай вайны, калі немцы наблізіліся да Ленінграда, добраахвотна пайшоў у партызанскі атрад. Ваяваў радавым байцом, пасля — адказны сакратар газеты «Ленинградский партизан» (1941—44). У 1943 уступіў у партыю. Быў рэдактарам газет «Ленинское знамя», «Звезда» ў Ноўгарадзе (1944), адказным сакратаром абласной газеты «Новгородская правда» (1944—45). У 1945 накіраваны на вучобу ў Маскву — на Цэнтральныя газетныя курсы пры ЦК ВКП(б). Пасля заканчэння Вышэйшай партыйнай школы пры ЦК ВКП(б) (1948) накіраваны ў Беларусь: рэдактар абласной газеты «Чырвоная звязда» (Баранавічы, да 1952), рэдактар (1952—57), загадчык рэдакцыі (1957—59) газеты «Советская Белоруссия», загадчык рэдакцыі Дзяржвыдавецтва БССР (1959—64), дырэктар выдавецтва «Навука і тэхніка» (1964—68), адказны сакратар бюлетэня «Служба быту Беларусі» (1968—75). З 1975 на пенсіі. Узнагароджаны медалямі.

Літаратурнай працай Дз. Уксусаў пачаў займацца ў даваенны час (першыя публікацыі не выяўлены). У рэспубліканскім друку Беларусі выступаў з 1952. Першую аповесць апублікаваў у 1957, першая кніга «Ранні ветрык» выйшла ў 1959. Аўтар аповесці «Я — твой сябра», нарысаў, апавяданняў, радыёп'есы («Першае лета»), кнігі публіцыстыкі «Агітпункт, які пастаянна дзейнічае». Пісьменніка цікавілі жыццё вёскі, рабочага і маладзёжнага асяроддзя, вытворчыя і асабістыя адносіны людзей. Пісаў крытычныя артыкулы, рэцэнзіі, агляды.

Л. С. Савік.

Бібліяграфія

1.2.

Ранний ветерок: Повесть и рассказы. Мн., 1959. Рэц.: Буран В. Без скідак на першую кнігу // ЛіМ. 1960. 21 чэрв.; Самойлов В. «Ранний ветерок» // Знамя юности. 1959. 12 нояб.

Постоянно действующий агитпункт: [Публіцыстыка]. М., 1961.

Я — твой друг: Повесть. Мн., 1962. Рэц.: Пашкевіч Н. Замардаваныя пацалункамі // ЛіМ. 1962. 10 жн.

Я — твой друг: Повесть. Мн., 1965.

1.3.

1952. «Навстречу жизни» // Сов. Бел. 13 сент.

1953. За высокі ідэйны ўзровень і мастацкае май-

стэрства // Камуніст Бел. № 5; Неудача писателя // Сов. Бел. 14 июля.

1957. Ранний ветерок: Повесть // Сов. Отчизна. № 3. Рэц.: Б о й к а У. Тэма і яе ўвасабленне // ЛіМ. 7 жн.; В рабочей семье: Очерк // Сов. Отчизна. № 5; Ранний ветерок: [Урыўкі з аповесці] // Знамя юности. 30, 31 мая, 4 июня; Первые цветы: Рассказ // Сов. Бел. 1 мая; Вечный огонь: Рассказ // Там жа. 29 сент.; На передовой линии: [Нарыс] // Там жа. 12 нояб.

1959. За волю: Нарыс // Маладосць. № 2; В городе над Неманом: [Рэц. на: Д а д и о м о в В. Над Неманом: Роман / Пер. А. Белов, П. Кобзаревский // Звезда. 1959. № 1, 2] // Сов. Отчизна. № 5; Она не отступит: [Нарыс] // Сов. Бел. 24 апр.

1960. Яблоки: Рассказ // Неман. № 2; Апрель: Рассказ // Там жа. № 4.

1961. Я — твой друг: Повесть // Неман. № 5; Кніга выйшла з друку... // Звязда. 27 снеж.

1962. Без прыкметных змен // Камуніст Бел. № 3; Высокая вода: Рассказ // Неман. № 6.

1963. Находка: Рассказ // Заря. 7 апр.; В поисках будущего: [Урывак з аднаім. рамана] // Сел. газ. 25 авг.

1964. В поисках будущего: [Урывак з аднаім. рамана] // Гродн. правда. 29 мая; Весна: Из цикла «Невыдуманные рассказы» // Знамя юности. 4 июня; Незвычайныя кнігі / ЛіМ. 21 крас.; Удачы табе, Валя!: [Нарыс] // Наст. газ. 29 крас.; Приписка: Из цикла «Невыдуманные рассказы» // Сел. газ. 31 марта.

1968. Кнігі беларускіх вучоных // ЛіМ. 26 студз. 1.5.

На беларускую мову. Знаходка: Апавяданне // ЛіМ. 1958. 27 снеж.; Яблыкі: Апавяданне // Гомел. праўда. 1960. 5 студз.; Ззянне зямлі: Апавяданне // Наст. газ. 1961. 25 ліст.; У пошуках будучыні: Урывак з рамана // Сел. газ. 1963. 25 авг.; У пошуках будучыні: [Урывак з рамана] // Віцеб. рабочы. 1964. 30 чэрв.; У дарозе: Дзядзя Міша; Парадак!: Нявыдуманыя апавяданні // ЛіМ. 1964. 7 студз.; Верасень: Урывак з рамана «У пошуках будучыні» // Там жа. 1965. 28 мая; На допыце: Урывак з аповесці «Нанава знаёмыя» // Наст. газ. 1977. 24 снеж. 2.3.

На беларускай мове. П і с ь м е н н і к і Савецкай Беларусі: Кароткі даведнік. Мн., 1981.

На рускай мове. Г е р ц о в и ч Я. Поговорим об очерке // Неман. 1961. № 3. *У. М. Ларчанка.*

УЛАСАЎ АЛЯКСАНДР



Уласаў Аляксандр Мікітавіч [крыпт. А. У., А. Ў., А. У л а - ў; 16(28).8.1874, г. Вілейка Віленскай губ., цяпер Мінскай вобл.— 11.3.1941, ст. Марыінск Новасібірскай, цяпер Кемераўскай вобл., паводле іншых звестак г. Арол], выдавец, публіцыст, мемуарыст, грамадскі дзеяч.

Бацька А. Уласава быў паштовым чыноўнікам, служыў павятовым паштмайстрам у Вілейцы, быў нават губернскім паштмайстрам у Вільні, але за недагляд па службе яго панізілі з пераводам у павятовы Пінск; апошні чын бацькі — калежскі саветнік. Першыя жыццёвыя ўражанні малога Алеся звязаны з паездкамі ў вёску Рэчкі да дзеда-святара, у невялікі бацькаўскі фальварак Мігаўка пад Радашковічамі, з жыццём у Вільні і Пінску. Адным з віленскіх знаёмых сям'і быў стары літаратар і цэнзар П. Кукальнік. У Пінску А. Уласаў пачаў вучобу ў духоўным вучылішчы — бурсе, якой быў абавязаны добрым веданнем грэчаскай мовы. Потым перайшоў у мясцовае рэальнае вучылішча. Пасля смерці бацькі сям'я пераехала ў Мінск. А. Уласаў працягваў там вучобу ў рэальным вучылішчы. Пад уплывам «Минского листка», календароў Слупскага, дзейнасці мясцовай інтэлігенцыі зацікавіўся пытаннямі беларускай культуры. Сяроднюю адукацыю завяршыў у Лібаўскім рэальным вучылішчы; у 1899—1905 вучыўся ў Рыжскім політэхнічным інстытуце. Яшчэ ў студэнцкія гады далучыўся да беларускага нацыянальна-культурнага руху. Знаходзячыся на паслядоўна-дэмакратычных пазіцыях, стаў адным з арганізатараў Беларускай рэвалюцыйнай грамады (1902), якая перарасла ў хуткім часе ў Беларускую сацыялістычную грамаду. Напярэдадні і ў перыяд рэвалюцыі 1905—07 актыўна ўдзельнічаў у студэнцкім дэмакратычным руху, палітычных выступленнях на радзіме. Быў на падпольнай рабоце ў Мінску, разам з А. Бурбісам арганізаваў тут забастоўку шаўцоў, музыкантаў, цырульнікаў. У 1906 на нелегальным настаўніцкім з'ездзе ў Мінску пазнаёміўся з Я. Коласам, адразу ацаніў і падтрымаў яго талент. Пасля наведваў паэта ў мінскай турме, клапаціўся пра выданне яго твораў, мяркуюць, што ён быў укладальнікам яго першага зборніка «Песні-

жальбы» (1910). З канца 1906 на працягу 7 з лішнім гадоў рэдактар-выдавец «Нашай нівы». Надзвычай многа зрабіў для кансалідацыі культурных сіл Беларусі, выпрацоўкі літаратурнай мовы, выяўлення народных талентаў (прыцягнуў да работы ў рэдакцыі Я. Коласа, Я. Купалу, Ядвігіна Ш., З. Бядулю, перапісваўся з М. Багдановічам, Я. Карскім), наладжвання кантактаў з дэмакратычнымі дзеячамі суседніх народаў (сярод яго карэспандэнтаў і дзелавых знаёмстваў — М. Горкі, А. Пагодзін, І. Свянціцкі, М. Федароўскі, кітаіст В. Аляксееў і інш.). З 1908 выступаў у «Нашай ніве» як публіцыст і эканаміст (многія яго матэрыялы друкаваліся без подпісу і таму не выяўлены). У адным з перадавых артыкулаў пісаў: «Усе, хто прывык шанаваць кожную нацыю і кожнага чалавека, ведаюць, што ў роднай мове сваёй беларус усё лепш разумее, што тая мова — гэта яго душа, сэрца, усё, што ёсць самае блізкае і дарагое чалавеку. І беларусам, беручы культуру ад рускіх і ад палякаў, няма ніякай патрэбы забываць, што яны беларусы, адракацца ад сваёй нацыі і перакідацца к чужой» (Наша ніва. 1908. 25 крас.). Аптымістычна глядзеў на перспектывы развіцця беларускай гаспадаркі. У 1908 выступіў з дакладам аб арганізацыі беларусазнаўчых даследаванняў у Віленскім універсітэце (даклад атрымаў прызнанне і падтрымку вядомага філолага акадэміка А. Шахматава). Як выдавец «Нашай нівы» і адзін з арганізатараў выдавецтва «Наша хата» (Вільня, 1908—11) прычыніўся да развіцця нацыянальнага кнігадрукавання. Пры яго ўдзеле было наладжана выданне беларускіх календароў, «Зборнікаў «Нашай нівы», кніг Я. Коласа, М. Багдановіча, Ядвігіна Ш., Э. Ажэшкі і інш. За публікацыю ў «Нашай ніве» смелых антыцарысцкіх матэрыялаў як рэдактар не раз прыцягваўся да судовай адказнасці, у 1910 адседзеў некалькі месяцаў у турме. У 1912 арганізаваў у Вільні выданне папулярнага сельскагаспадарчага часопіса «Саха», у наступным годзе перанёс гэта выданне ў Мінск, перадаўшы рэдагаванне «Нашай нівы» Я. Купалу (афіцыйная перадача рэдактарства адбылася ў лютым—сакавіку, функцый выдаўца ў красавіку—маі 1914). Уласаўская «Саха» з'явілася першым беларускамоўным перыядычным выданнем у Мінску. У 1914 наладзіў тут выданне дзіцячага часопіса «Лучынка». Вакол рэдакцый «Сахі» і «Лучынкі» ў Мінску ўтварыўся гурток беларускай інтэлігенцыі: Цётка (літаратурны рэдактар «Лучынкі»), Ядвігін Ш., А. Паўловіч, У. Галубок і інш. Сваяцкія сувязі звязвалі Уласава з гісторыкам А. Сніткам, філолагам і грамадскім дзеячам Б. Тарашкевічам. З удзелам Уласава адбываліся многія важныя культурныя пачынанні і захады, у прыватнасці пастаноўка камедыі Я. Купалы «Паўлінка» ў Радашковічах (1913), што стала значнай культурнай падзеяй. У 1916 дапамог М. Багдановічу ўладкавацца на працу сакратаром губернскага харчовага камітэта. У гады рэвалюцыі і грамадзянскай вайны ўваходзіў у т. зв. «Мінскае народнае прадстаўніцтва» (аб'яднанне розных беларускіх палітычных партый) і Раду Беларускай Народнай Рэспублікі. Актыўна ўдзельнічаў у рабоце Усебеларускага Кангрэса (1917). У 1918 увайшоў у склад прэзідыума Рады БНР. Апублікаваў у газеце «Экономическая жизнь» даследаванне з гісторыі аграрнага пытання і аб саматужнай прамысловасці на Беларусі.

Рыжскі мір заспеў яго ў Радашковічах. Шмат зрабіў для асветы працоўных Заходняй Беларусі ва ўмовах санацыйнага рэжыму. У 1921 за спробу адкрыць беларускую гімназію ў Радашковічах адсядзеў некалькі месяцаў у канцлагеры Стшалкова на польска-германскай мяжы. У 1922 гімназія ўсё ж была адкрыта. У 1926 арганізаваў у Радашковічах курсы настаўнікаў пачатковых школ, якія зрабілі важкі ўклад у беларускі нацыянальна-грамадскі рух называлі «курсамі сакратароў «Грамады». У 1928—29 рэдагаваў адноўлены ў Вільні часопіс «Саха». Абраны ў 1922 у сенат польскага сейма, абараняў інтарэсы свайго краю, уваходзіў у Беларускі пасольскі клуб, прымаў актыўны ўдзел у рабоце Таварыства беларускай школы, іншых культурна-асветных і грамадскіх нацыянальных арганізацый. Яго дом у Мігаўцы выкарыстоўваўся падпольшчыкамі для пераходу польска-савецкай мяжы. У 1939 вітаў вызваленне Заходняй Беларусі Чырвонай Арміяй. Мясцовы батрацкі камітэт з павагай і даверам ставіўся да А. Уласава, пакінуў яму як народнаму інтэлігенту пяць гектараў зямлі ў Мігаўцы. Але больш высокія ўлады меркавалі інакш. 6.10.1939 па даносу свайго арандатара ён быў арыштаваны ў Маладзечне, адсядзеў 13 месяцаў у вілейскай турме. Я. Колас, Я. Купала, З. Бядуля звярнуліся са спецыяльным лістом да першага сакратара ЦК КПБ(б) П. Панамарэнкі, у якім далі высокую характарыстыку былому рэдактару «Нашай нівы». Але нішто не дапамагло. 29.11.1940 А. Уласаў быў асуджаны на 5 гадоў зняволення ў папраўча-працоўных лагерах. Памёр на ст. Марыінск Навасібірскай вобл. ад «параліча сэрца», як сказана ў даведцы, паводле іншых звестак — на этапе ў Арле ці Марыйскай АССР. Магіла яго невядомая. Рэабілітаваны 6.1.1961. Да 1946 знаходзілася ў высылцы і яго жонка Аляксандра Паўлаўна, якая зберагла некаторыя матэрыялы мужа і клапацілася, каб яго імя захавалася для гісторыі.

Дзейнасць і асоба А. Уласава неаддзельныя ад гісторыі беларускай культуры і літаратуры, нацыянальнага руху першых дзесяцігоддзяў нашага стагоддзя. Пісьменніцкі дар Уласава выявіўся ў яго надзвычай каларытных мемуарах. Гісторыя працы над мемуарамі не высветлена. Да нас дайшлі толькі асобныя раздзелы. У 1936, у сувязі з юбілеем Я. Коласа, па просьбе рэдакцыі часопіса «Калоссе» быў напісаны раздзел «Якуб Колас і «Наша ніва». Два іншыя вялікія раздзелы (пра дзяцінства і пра мінскі перыяд жыцця напярэдадні першай сусветнай вайны) упершыню надрукаваны ў зборніку «Шляхам гадоў». Іх аўтографы разам з некаторымі іншымі матэрыяламі асабістага архіва А. Уласава захоўваюцца ў ЦНБ АН Беларусі. Вобраз А. Уласава створаны ў трылогіі Я. Коласа «На ростанях», дзе ён выведзены пад прозвішчам Уласюка.

Г. В. Кісялёў.

Бібліяграфія

1.2.

Аб гаспадарцы на хутары і шнурах. Вільня. 1909.
Ab haspadarcy na chutary i šnurach. Wilnia, 1909.

1.3.

1908. «Покуль беларус спаў векавечным сном...» // Н. н. 25 крас. / Пад сваім прозв.

1909. Аб гарадах // Н. н. 1, 9, 15 студз.; 5 сак. / Пад крыпт. А. У.; Аб ткацтве на Беларусі // Там жа. 27 лют. / Пад крыпт. А. У.; Караблі для лятання ў паветры (аэрастаты) // Там жа. 14 мая / Пад крыпт. А. У.

1910. Што трэба мець, каб сесці на хутар // Першы беларускі каляндар «Нашай нівы» на 1910 г. Вільня; Хаўрусныя балячкі // Н. н. 20 студз. / Пад крыпт. А. У.; Аб эканамічным палажэнні нашага краю // Там жа. 8 крас. / Пад крыпт. А. У.; Абарот капіталаў у Беларусі // Там жа. 17 чэрв. / Пад крыпт. А. У.

1911. Эміграцыя ў Амерыку // Н. н. 20 студз.; Пасляслоўе да артыкула А. Бульбы «Якой цаной купляюцца «Амерыканскія грошы» на Беларусі» // Там жа. 3 лют.; Валасное земства і жыды // Там жа. 7 крас. / Пад крыпт. А. У.; Аб стацці пана С у «Новом Времени» і аб беларускіх «Солоневічах» // Там жа. 9 чэрв. / Пад крыпт. А. У.; Якая палітыка патрэбна для Беларусі? // Там жа. 17 ліст. / Пад крыпт. А. У.

1912. Што думае народ аб школах // Н. н. 13 студз. / Пад крыпт. А. У.; Дарагоўля харчовых прадуктаў і вываз іх за граніцу // Там жа. 23 лют. / Пад крыпт. А. У.; Край з пяццю нацыямі // Там жа. 14 чэрв. / Пад крыпт. А. Ў.; Думкі падчас выбараў // Там жа. 20 вер. / Пад крыпт. А. У.; Допіс ад 22 лістапада. Вільня // Там жа. 23 ліст. / Пад крыпт. А. У.; Міністэрская папраўка // Там жа. 29 ліст. / Пад крыпт. А. У.; Аб вясковай хуліганшчыне // Там жа. 21 снеж. / Пад крыпт. А. У.

1913. Апекуны і дарослае дзіця // Н. н. 15 лют. / Пад крыпт. А. У.; [Артыкул] // Там жа. 22 сак. / Пад крыпт. А. У.; Аб дарогах у Беларусі // Там жа. 7 чэрв. / Пад крыпт. А. У.; Эміграцыя і танны павер // Там жа. 20 чэрв. / Пад крыпт. А. У.; Колькі слоў з дарогі па Беларусі // Там жа. 19, 28 вер. / Пад крыпт. А. У.; Аб выездзе ў Амерыку // Там жа. 17 кастр. / Пад крыпт. А. У.

1914. Вялікі бацька украінцаў // Лучынка. № 3 / Пад крыпт. А. У.

1917. Белоруссия и Литва: Очерк // Бел. рада. 16, 17 дек.; Беларусь, Літва: Эканамічны нарыс // Вольная Беларусь. 19, 30 кастр., 14 ліст.

1918. Я буду чыноўнікам // Бел. шлях. 8 сак. / Пад крыпт. А. У.; Пасля вайны // Там жа. 25, 26 сак. / Пад крыпт. А. У.; Чорнае золата // Там жа. 30 сак. / Пад крыпт. А. Ула-ў; Валасная і мястэчковая палітыка // Там жа. 27 крас. / Пад крыпт. А. У.; К. Кастравіцкі і Г. Татур: [Успаміны] // Там жа. 26 мая; Палітычныя перспектывы // Там жа. 27 чэрв. / Пад крыпт. А. У.; Трэба «тягучей» інтэлігенцыі // Там жа. 28 чэрв. / Пад крыпт. А. У.; Матэрыял для Дзяржавы // Там жа. 29 чэрв. / Пад крыпт. А. У.; Новы хлеб // Там жа. 3 ліп. / Пад крыпт. А. У.; Басціа «Гармонія» // Там жа. 6 ліп. / Пад крыпт. А. У.; Менск 7/VII // Там жа. 7 ліп. / Пад крыпт. А. У.; Зямля блізка // Там жа. 11 ліп. / Пад крыпт. А. У.; Прасвета Беларусі // Там жа. 14 ліп. / Пад крыпт. А. У.; Каланіяльная вайна // Там жа. 16 ліп. / Пад крыпт. А. У.; Зямля // Там жа. 17 ліп.; Новы хлеб — адраджэнне // Там жа. 18 жн.; Беларуская Рада — прадстаўніца Беларусі // Там жа. 21 жн.; Менск 22/VIII // Там жа. 22 жн. / Пад крыпт. А. У.

1920. Хатнія промыслы ў Беларусі // Зборнік «Наша ніва». Вільня; Кароль Русецкі сын Вільгельма // Саха. № 1; Яшчэ аб дзяліцьбе Беларусі // Н. н. 16 ліст. / Пад крыпт. А. У.

1925. Выдатны стары цэнтр ткацтва на Беларусі — гэта Слуцак... // Беларускі Гаспадарскі Каляндар на 1926 год. Вільня.

1932. Уступнае слова на акадэміі ў чэсць Я. Купалы і Я. Коласа // Бел. крыніца. 4 снеж.

1936. Якуб Колас і «Наша Ніва» // Калоссе. № 5.

1990. Дні жыцця: [Успаміны] // Шляхам гадоў. Мн.

2.3.

На беларускай мове. Баршчэўскі А. Якуб Колас // Беларускі каляндар. Беласток, 1982. С. 42—43; Белы С. Першы рэдактар Коласа // ЛіМ. 1987. 18 снеж.; Гарэцкі М. Уласаў Аляксандар Мікітавіч // Гарэцкі М. Гісторыя беларускае літаратуры. Вільня, 1920. С. 205; Каўко А. Прыязнае слова рускага вучонага // Голас Радзімы. 1988. 21 студз.; Кахаючы Вас чытач «Сахі» // Саха. 1929. № 3; Колас Я. [Ліст] // Зб. тв.: У 14 т. Мн., 1977. Т. 13. С. 14; Нашы паслы ў Сойм і Сенат: Уласаў Аляксандр // Беларускі каляндар. Вільня, 1923. С. 30; Свянціцкі І. А. М. Уласаву: [Ліст] // Александровіч С., Александровіч В. Беларуская літаратура XIX — пачатку XX ст. Мн., 1978. С. 124—125; Суд над рэдактарам «Нашай Нівы» // Н. н. 1910. 28 студз.; Шарахоўскі Я. Пясняр народных дум. Мн., 1970. С. 29—31, 131—134.

На польскай мове. Baranowski W. Ruch białoruski // Tyg. il. 1912. Nr 38.

На ўкраінскай мове. Дорошенко Д. Відроджене Білоруси // Руслан. 1909. 30 ліп.

2.4.

На беларускай мове. Арол М. Кліч: (Ахвяруецца А. Уласаву): [Верш] // Бел. думка. 1919. 2 чэрв.

3.1.

ЦБ АН Літвы, аддз. рукап., ф. 21, адз. зах. 715, 2200; ЦНБ АН Беларусі, аддз. рукап., ф. 5, воп. 1, адз. зах. 1, с. 306.

У. М. Ларчанка.

УЛАШЧЫК МІКАЛАЙ

Улашчык Мікалай Мікалаевіч [1(14).2.1906, в. Віцкаўшчына Мінскага пав., цяпер Дзяржынскі р-н Мінскай вобл.— 14.11.1986, Масква; крэміраваны, прах пахаваны на Чыжоўскіх могілках у Мінску], гісторык, археограф, празаік, перакладчык. Доктар гістарычных навук (1964). Пісаў на рускай і беларускай мовах.

Паходзіў з заможных сялян. Продкі яго па бацьку перасяліліся ў Віцкаўшчыну з-пад Навагрудка. Яшчэ ў час вучобы ў школе захапіўся беларускай гісторыяй. Гэта прывяло яго на сацыяльна-гістарычнае аддзяленне педфака БДУ, куды ён паступіў у 1924, скончыўшы Мінскую вячэрнюю школу. Актыўна ўдзельнічаў у краязнаўчым жыцці рэспублікі, археалагічных экспедыцыях. Адначасова працаваў сакратаром (бібліёграфам) Кніжнай палаты БССР, рыхтаваў выпускі Летапісу беларускага друку. Найбольшы ўплыў на фарміраванне М. Улашчыка як беларускага гісторыка зрабілі М. Доўнар-Запольскі і У. Пічэта. Паспяхова скончыўшы ў 1929 універсітэт, працягваў рыхтаваць сябе да сур'ёзнай даследчыцкай працы ў галіне беларускай гісторыі. Аднак яго планам не суджана было ажыццявіцца. У 1930 разам з іншымі беларускімі вучонымі і пісьменнікамі быў беспадстаўна рэпрэсіраваны і высланы за межы Беларусі. Спачатку адбываў зняволенне ў Налінску, што недалёка ад Вяткі, куды быў сасланы М. Гарэцкі; адзін час выкладаў матэматыку ў мясцовай школе. У верасні 1930 М. Улашчык быў пераведзены ў Марыінск (Навасібірская вобл.), дзе працаваў справаводам у лагеры, затым у размешчанае побач Суслава. Вызвалены ў пачатку 1935, падаўся ў Ташкент, бо вяртацца ў Беларусь было небяспечна, але не змог працаўладкавацца. У пошуках працы пабываў у Вятцы, Горкім і спыніўся ў Іванаве, куды прыбыў летам таго ж года. Там працаваў выкладчыкам гісторыі ў тэхнікумах сувязі і медыцынскім. Праз год звольніўся. Лета 1936 правёў у Быхаве ў свайго сябра, археолага С. Шутава, затым падаўся ва Ульянаўск, дзе год выкладаў геаграфію на рабфаку. Наступныя два гады настаўнічаў у Дзергачах (Саратаўскай вобл.) і Чарапаўцы. Часта пераязджаць з месца на месца М. Улашчыка вымушалі абставіны: былыя палітвязні і ссыльныя лічыліся нядобранадзейнымі, знаходзіліся пад асобым наглядам органаў і нярэдка паўторна траплялі пад машыну рэпрэсій. Летам 1939 прыбыў у Ленінград, дзе ў Інстытуце фізіялогіі імя Паўлава працавала яго жонка Наталля Шамарына, з якой ажаніўся ў 1938. Настаўнічаў, паглыбляў веды па роднай і расійскай гісторыі. У чэрвені 1941 М. Улашчыка зноў арыштавалі і выслалі ў Златавуст. У снежні 1942 быў выпушчаны з турмы як безнадзейна хворы, зусім знямоглы, з сухотамі лёгкіх і правай рукі. Падаўся ў Азнакаева (Татарстан) да старшага брата Івана. Крыху аджыўшы, вясною 1943, паехаў у Казань, дзе знаходзілася жонка і куды быў эвакуіраваны з Ленінграда Інстытут фізіялогіі. Яго дырэктар акадэмік Арбелі дапамог М. Улашчыку здабыць пашпарт і паспрыяў паступіць у канцы таго ж года ў аспірантуру пры Інстытуце гісторыі АН СССР (Масква). Спецыялізаваўся па аграрнай гісторыі Беларусі і Літвы 19 ст. У 1947 абараніў кандыдацкую дысертацыю. У 1948—49 — старшы выкладчык Маскоўскага ун-та. У 1950 у трэці раз быў рэпрэсіраваны. Пяць гадоў правёў у Марыінскім лагеры. Вясною 1955 вярнуўся ў Маскву і да выхаду на пенсію (1982) працаваў навуковым супрацоўнікам у Інстытуце гісторыі АН СССР.

Друкавацца пачаў у 1927. М. Улашчык з'яўляўся высокакваліфікаваным спецыялістам з міжнародным аўтарытэтам у галіне грамадзянскай гісторыі, археаграфіі і крыніцазнаўства Беларусі і Літвы эпохі феадалізму. Вылучаўся энцыклапедычнымі ведамі, глыбокай павагай да гістарычных фактаў, навуковай сумленнасцю і аб'ектыўнасцю. За сухімі лічбамі і фактамі гістарычных дакументаў умеў бачыць жывыя галасы і лёсы людзей далёкіх і блізкіх эпох, адчуваць подых часу, сапраўдную паэзію ў роднай мінуўшчыне. Адкрываючы і спасцігаючы багацці беларускай гісторыі, М. Улашчык не толькі выкладаў вынікі сваіх доследаў у грунтоўных навуковых працах, але імкнуўся данесці гэтыя багацці шырокаму чытачу, пісаў рэцэнзіі і навукова-папулярныя артыкулы для беларускіх газет і часопісаў. Асабліва ярка выявіўся яго талент пісьменніка, цікавага і назіральнага апавядальніка ў нарысе пра родную Віцкаўшчыну — «Была такая вёска».

Вялікі ўклад зрабіў М. Улашчык у даследаванне і папулярызацыю беларускага летапісання. Упер-

шыню пераклаў на рускую мову і апублікаваў «Хроніку Быхаўца», падрыхтаваў 2-томнае выданне беларускіх летапісаў і хронік у акадэмічнай серыі «Поўны збор рускіх летапісаў», напісаў цікавае і каштоўнае гісторыка-літаратуразнаўчае даследаванне «Уводзіны ў вывучэнне беларуска-літоўскага летапісання».

Быў вялікі патрыёт Беларусі, меў высокае пачуццё нацыянальнай годнасці. Нягледзячы на тое, што больш як паўвека пражыў за межамі роднай зямлі, выдатна валодаў жывой сакавітай беларускай мовай. Меў добры мастацкі густ, пільна сачыў за навінамі беларускай літаратуры, радаваўся з'яўленню кожнага маладога таленту, перапісваўся і сябраваў з Я. Брылём, І. Мележам, У. Караткевічам. У апошнія гады часта наведваў бацькаўшчыну.

В. А. Чамярыцкі.

Бібліяграфія

1.2.

Сельское хозяйство Литвы и Западной Белоруссии в первой половине XIX в. (Предпосылки крестьянской реформы 1861 г.): Автореф. дис. ... доктора ист. н. М., 1963.

Предпосылки крестьянской реформы 1861 г. в Литве и Западной Белоруссии. М., 1965. Рэц.: Капыскі З. На стыку дзвюх эпох // Полымя. 1965. № 10; Мараш Я. Полезное исследование // Гродн. правда. 1965. 14 дек.; Строд Х. Книга по истории сельского хозяйства Литвы и Западной Белоруссии // Известия АН ЛССР. 1968. № 4; Bender R. // Kwart. Historyczny. 1966. Nr 3; Ochmański J. // Roczniki dziejów społecznych i gospodarczych (Poznań). 1967. T. 28.

Очерки по археографии и источниковедению Белоруссии феодального периода. М., 1973. Рэц.: Автократов В., Шорохов Е. // История СССР. 1974. № 4; Гросман Ю. // Укр. ист. журн. 1974. № 12; Копысский З. // Вопр. ист. 1974. № 1; Тумялис Ю. // Летувос историйос мятраштис 1975. Вильнюс, 1976; Bardach J. // Studia Źródłoznawcze. 1974. T. 19; Kosman M. // Archeion. 1975. T. 62; Sielicki F. // Sl. Orient. 1974. Nr 2; Stc. // Slovanský Přehled. 1974. Nr 1; Żytkowicz L. // Kwart. Historyczny. 1974. Nr 2.

Введение в изучение белорусско-литовского летописания. М., 1985. Рэц.: Грыцкевіч В., Думін С. Старонка гісторыі народа // Голас Радзімы. 1985. 28 ліст.; Наваселец М. // ЛіМ. 1985. 11 кастр.

1.3.

1927. Беларускі друк за першую палову 1927 г. (Паводле матар'ялаў Беларускае кніжнае палаты): [Агляд] // Звязда. 25 вер.; Краязнаўчая праца студэнтаў БДУ // Сав. Бел. 14 студз. / Сааўт. А. Аміхноўскі.

1930. У вырай: Апавяданне // Іскры Ілыча. № 9; Жабка: Нарыс // Там жа. № 10.

1948. Крепостная деревня Литвы и Западной Белоруссии накануне реформы 1861 года // Вопр. ист. № 12.

1949. Из истории рескрипта 20 ноября 1857 года: (К истории крестьянской реформы 1861 г. в Белоруссии и Литве) // Ист. зап. Т. 28.

1950. Подготовка крестьянской реформы 1861 г. в Литве и Западной Белоруссии // Ист. зап. Т. 33.

1957. Кобринская экономия после проведения волочной померы // Уч. зап. Ин-та славяноведения. Т. 15.

1958. Заметки о черной металлургии Белоруссии в начале XIX в. // Из истории рабочего класса и революционного движения. М.

1959. Введение обязательных инвентарей в Белоруссии и Литве [1846—1848 гг.] // Ежегодник по аграрной истории Восточной Европы. 1958. Таллин; Минские губернские ведомости как исторический источник // Проблемы источниковедения. М. Т. 7; О крестьянских волнениях в Литве в первой половине XIX в. // История СССР. № 1.

1960. Скотоводство в Литве и в Западной Белоруссии (1811—1861 гг.) // Материалы по истории сельского хозяйства и крестьянства СССР. М. Сб. 4; Обезземеливание крестьян Литвы и Западной Белоруссии накануне отмены крепостного права // Революционная ситуация в России в 1859—1861 гг. М.; [О книге Д. Л. Похилевича «Крестьяне Белоруссии и Литвы в XVI—XVIII вв.». Львов, 1957] // Вопр. ист. № 3; Сборник о крестьянском движении в Белоруссии // Ист. архив. № 3; Літаратурная спадчына Івана Грыгаровіча // ЛіМ. 2 крас.

1961. Орудия производства и системы земледелия в помещичьем хозяйстве Литвы и Западной Белоруссии в период разложения феодально-крепостнического строя // Ежегодник по аграрной истории Восточной Европы 1959. М.; Отчеты губернаторов Литвы и Западной Белоруссии как исторический источник (1804—1861) // Проблемы источниковедения. М. Т. 9; Предпосылки крестьянской реформы 1861 г. в Литве и Западной Белоруссии // Четвертая сессия симпозиума по аграрной истории Восточной Европы в г. Риге. Рига; О количестве земли, полученной крестьянами Белоруссии и Литвы при отмене крепостного права // История СССР. № 6. Рэц.: Яцунский В. // История СССР. 1962. № 1.

1962. Изменения в хозяйстве крепостной Литвы и Западной Белоруссии в связи с введением новых культур (картофель) // Материалы по истории сельского хозяйства и крестьянства СССР. М., Инвентари помещичьих имений Западной Белоруссии и Литвы 40-х годов XIX века как исторический источник // Проблемы источниковедения. Т. 10.

1963. Изображение белорусских крестьян и их орудий труда середины XVIII в. // Проблемы источниковедения. Т. 11; Опубликованные материалы шестой и седьмой ревизий как источник по истории населения Литвы и Западной Белоруссии // Проблемы общественно-политической истории России и славянских стран. М.; Предпосылки крестьянской реформы 1861 г. в Литве и Западной Белоруссии // Четвертая сессия Симпозиума по аграрной истории Восточной Европы в г. Риге. Рига.

1964. [Рэц. на кн.: Якунина Л. Слуцкие пояса. Мн., 1960] // Сов. этнография. № 5.

1965. [Рэц. на кн.: Смирнов А. Восстание 1863 г. в Литве и Белоруссии. М., 1963] // История СССР. № 4.

1966. [Прадмова] // Хроника Быховца. М. Рэц.: Чамярыцкі В. Голас гісторыі // Маладосць. 1967. № 4; Sielicki F. // Sl. Orient. 1968. № 1; Кніга пра «Кроніку» Мацея Стрыйкоўскага: [Рэц. на кн.: Рогов А. Русско-польские культурные связи в эпоху Возрождения. М., 1966] // Полымя. № 7.

1967. Новая манаграфія па аграрнай гісторыі Беларусі // Весці АН БССР. Серыя грамад. н. № 2; Кніга пра полацкую зямлю: [Рэц. на кн.: Алексеев Л. Полоцкая земля: Очерки истории северной Белоруссии. М., 1966] // Полымя. № 4; В те далекие времена // Сов. Бел. 19 сент.

1968. «Литовская и Жмоитская хроника» и ее отношение к хроникам Быховца и М. Стрыйковского // Славяне и Русь. М.; Грамотность в дореволюционной Белоруссии // История СССР. № 1.

1970. Пра беларуска-літоўскія летапісы: [Рэц. на кн.: Чамярыцкі В. Беларускія летапісы як помнікі літаратуры. Мн., 1969] // Полымя. № 7.

1971. Віленская археалагічная камісія // Полымя. № 5.

1972. Бясонаў і Віленская археаграфічная камісія // Полымя. № 2; Прыклад, варты пераймання // Помнікі гіст. і культ. Бел. № 4.

1973. С. С. Шутаў — археолаг і доктар // Помнік гіст. і культ. Бел. № 3.
1974. Подготовка к печати и издание тома XVII «Полного собрания русских летописей» // Летописи и хроники. 1973. М.
1975. Предисловие // Полное собрание русских летописей. Т. 32. М.
1976. Невядомыя рукапісы // Помнікі гіст. і культ. Бел. № 4.
1979. [Рэц. на кн.: Ткачоў М. Замкі Беларусі (XII—XVII ст.). Мн., 1977] // Вопр. ист. № 11.
1980. [Прадмова] // Полное собрание русских летописей. М. Т. 35; Скарбніца беларускай гісторыі // ЛіМ. 22 жн. / Сааўт. Э. Ялугін.
1982. Белая и Черная Русь в «Кронике» Матвея Стрыйковского// Исследования по истории и историографии феодализма. М.; Прыгоды Радзівілаўскага летапісу // ЛіМ. 21 мая.
1983. История с... «Историей»: [Рэц. на кн.: История БССР. Ч. 1. С древнейших времен до Великой Октябрьской социалистической революции. Мн., 1981] // Неман. № 3.
1984. Белорусско-литовское летописание // Вопр. ист. № 12.
1987. Из истории деревни Вицковщина // Сов. славяноведение. № 6.
1988. Вёска Віцкаўшчына (1883—1917 гг.): Гісторыка-этнаграфічны нарыс // Полымя. № 7—9.
1990. З мінулага Беларускай дзяржаўнай бібліятэкі і кніжнай палаты // Полымя. № 1.
1.4.
Нізавы П. У палярную ноч / З рус. Мн., 1930.
Талстой А. Жаўтухін / З рус. Мн., 1930.
1930. За акіян; Сяброўства: [Апавяданні] / З рус. // Дзеці Захаду. Мн., Вып. 1.
1.5.
На беларускую мову. Была такая вёска: (Віцкаўшчына Дзяржынскага р-на): Гістарычна-этнаграфічны нарыс / Пер. з рус. У. Арлоў. Мн., 1989.
1.6.
Полное собрание русских летописей. М., 1975. Т. 32 / Скл. Рэц.: Ермаловіч М. Перачытваючы летапісы // Полымя. 1976. № 11.
Полное собрание русских летописей. М., 1980. Т. 35 /Скл. Рэц.: Ермалович М. Раскрытие свидетельства истории // Неман. 1982. № 1;
2.3.
На беларускай мове. Гаўрон А. Спадчына // Голас Радзімы. 1975. № 40; Грыцкевіч В. Напрамак жыцця // Маладосць. 1988. № 3; Каханоўскі Г. Нястомнасць даследчыка // Звязда. 1981. 17 лют.; Ліс А. Прызванне — гісторыя // ЛіМ. 1981. 27 сак.; Чамярыцкі В. Шматгранасць вучонага // Там жа. 1976. 14 лют.; Ягож. Летапісец роднай гісторыі // Голас Радзімы. 1981. 19 сак.
На рускай мове. Буганов В. Н. Улащик — источниковед и археограф //Источниковедение отечественной истории. 1975. М., 1976; Литвак Б. К 70-летию Николая Николаевича Улащика // История СССР. 1976. № 3; Ялугин Э. «Паходзечы з цэху гісторыков...» //Неман. 1981. № 4; Яцунский В. Несколько замечаний в связи со статьей Н. Н. Улащика // История СССР. 1962. № 1.

Г. І. Рэут.

УМЯСТОЎСКІ ФРАНЦ

Умястоўскі Франц Іванавіч [псеўд. Пранук, Д. Пранук, Дзядзька Пранук; крыпт. Ф. У., Фр. Ум-скі, К.; 29.1(10.2).1882, Вільня — 1940, Катынь (?)], празаік, паэт, публіцыст.

Біяграфічныя звесткі пра Ф. Умястоўскага вельмі скупыя. Паходзіў з шляхты. Стрыечны брат Ф. Аляхновіча, яго сябра. Вядома, што вучыўся ў Пецярбургскім тэхналагічным інстытуце, увахо-дзіў у падпольную арганізацыю студэнцкай моладзі «Круг беларускай народнай прасветы і культуры» (1902—04). Прымаў удзел у выданні газеты «Наша доля» (1906). У 1908 жыў у в. Існаўда Віцебскай губ. Быў удзельнікам першай сусветнай вайны, на матэрыяле якой напісаў апавяданне «Стася» (1921). У 1927—28 выдаваў у Вільні газету «Беларускі дзень». У 1939 служыў у польскім войску, 18 верасня трапіў у савецкі палон. Інтэрнаваны ў Казельску. У кастрычніку 1940 ліквідаваны ў Катыні.

Першы твор (верш «Вецер») надрукаваў у «Калядной пісанцы на 1904 год» (Пецярбург, 1903). У 1908—14 друкаваўся ў «Нашай ніве» — пераважна як празаік. Апавяданні Ф. Умястоўскага («Страх», «У лесе», «Доктар ад калтуна», «Не мужыцкі розум») напісаны пад відавочным уплывам беларускага фальклору, але ў іх праяўляецца і творчая самастойнасць пісьменніка. Ён спрабаваў стварыць характары персанажаў, паказаў селяніна сумленным, працавітым і дасціпным, асуджаў зняважлівыя адносіны паноў да народа, высмейваў забабоны, паэтызаваў прыроду роднага краю. Пасля рэвалюцыі найчасцей выступаў у друку як публіцыст; напісаў артыкул пра гісторыю выдання газеты «Наша доля» (1919). У сваёй публіцыстычнай і палітычнай дзейнасці стаяў на згодніцкіх, паланафільскіх пазіцыях. Пасля 1928 адышоў ад літаратурнай працы і грамадскай дзейнасці.

У. А. Лебедзеў.

Бібліяграфія

1.2.
Стася: Апавяданне. Вільня. [1921] / Пад псеўд. Дзядзька Пранук.
1.3.
1903. Вецер: [Верш] // Калядная пісанка на 1904 год. Пб. / Пад псеўд. Дзядзька Пранук.
1906. Вецер: [Верш] // Наша доля. 15 вер. / Пад псеўд. Дзядзька Пранук.
1908. Не мужыцкі розум: Апавяданне // Н. н. 20 ліст. / Пад псеўд. Дзядзька Пранук.
1909. Страх: (З праўдзівага здарэння): Апавяданне // Н. н. 9 студз. / Пад псеўд. Дзядзька Пранук; У лесе: Апавяданне // Там жа. 18 чэрв. / Пад псеўд. Дзядзька Пранук.
1910. Доктар ад калтуна: Апавяданне // Н. н. 29 ліп. / Пад псеўд. Дзядзька Пранук.

1919. Аб «Нашай долі» (1906) // Беларусь. 17, 18 снеж. / Пад псеўд. Дзядзька Пранук.

1921. Аб «Нашай долі» // Зборнік «Беларускіх ведамасцей». № 1. Вільня; Бел. вед. 23 вер. / Пад псеўд. Дзядзька Пранук; Стася: [Апавяданне] // Бел. звон. 11, 18 ліст. 16, 23 снеж. / Пад. псеўд. Дзядзька Пранук.

1922. Шчорсаўскія абразкі; Чорт наблутаў...: [Апавяданне] // Родная страха. 31 сак. / Пад псеўд. Дзядзька Пранук.

1927. Не мужыцкі розум; У Мэнджылі: [Апавяданні] // Дварчанін У. Хрэстаматыя новай беларускай літаратуры. Вільня / Пад псеўд. Дзядзька Пранук; Праўда аб «Нашай долі» (1906) // Бел. дзень. 13 сак. / Пад крыпт. К.; Праўда аб рэдагаванні «Нашай долі» (1906): Адказ на пісьмо Саўкі Барывоя [Р. Зямкевіча], апублікаванае ў газ. «Права працы» (Вільня, 1927. 14 снеж.) пад загалоўкам «Справа рэдактарства «Нашай долі» // Там жа. 24 снеж.

1928. Яшчэ аб «Нашай долі» (1906): Адказ С. Барывою [Р. Зямкевічу] // Бел. дзень. 10 лют.

1965. Не мужыцкі розум: [Апавяданне] // Беларуская дакастрычніцкая проза. Мн. / Пад псеўд. Дзядзька Пранук.

1967. Не мужыцкі розум: [Апавяданне] // Анталогія беларускага апавядання: У 2 т. Мн. Т. 1. / Пад псеўд. Дзядзька Пранук; Вецер: [Верш] // Беларуская дакастрычніцкая паэзія. Мн. / Пад псеўд. Дзядзька Пранук.

1.4.

1909. У а й л ь д А. Малады каралевіч: (Казка) / З англ. // Н. н. 29 студз. / Пер. пад псеўд. Дзядзька Пранук; Г о г а л ь М. Зачараванае мейсца / З рус. // Там жа. 27 лют. / Пер. пад псеўд. Дзядзька Пранук.

2.3.

На беларускай мове. З я м к е в і ч Р. Воўчы білет самазванцу рэдактару-выдаўцу «Нашай долі» (1906) — яснавяльможнаму «пану графу» Францішку Умястоўскаму // Думка працы. 1928. 28 студз. / Пад псеўд. Саўка Барывой; Я г о ж. Пісьмо ў рэдакцыю // Воля працы. 1928. 28 сак.; [Уступная нататка] // Анталогія беларускага апавядання: У 2 т. Мн., 1967. Т. 1. С. 104.

У. М. Ларчанка.

УСІКАЎ ЯКУБ

Усікаў Якуб (Якаў) Кірылавіч (псеўд. Я. Кірылаў, Я. Саблін, Я. Усік, Якуб Усік; н. 20.9. 1919, в. Кадзіна Магілёўскага р-на), літаратуразнавец, крытык. Член СП Беларусі з 1951. Кандыдат філалагічных навук (1950). Дацэнт (1957).

З сялянскай сям'і. Маці, Алімпіяда Фядосаўна, бацька, Кірыл Аўрамавіч — калгаснікі. Скончыўшы Бароўскую сямігодку (1934), Я. Усікаў паступіў на масавае аддзяленне Магілёўскага палітасветтэхнікума. Пасля першага курса (1935) стаў студэнтам літаратурна-лінгвістычнага факультэта Мінскага педінстытута. З трэцяга курса перавёўся на завочнае аддзяленне; працаваў дырэктарам сярэдняй школы ў в. Вялікае Сяло Дзяржынскага р-на (1937—39), выкладчыкам беларускай і рускай мовы і літаратуры Мар'інагорскага сельскагаспадарчага тэхнікума (1939—40). Адначасова займаўся на завочным аддзяленні Мінскага педінстытута, пасля заканчэння якога (1940) паступіў у аспірантуру пры АН БССР. Скончыць яе перашкодзіла вайна. Трапіў у акупацыю. У 1942 стаў партызанам атрада Грышына. У чэрвені 1944 мабілізаваны на фронт, ваяваў у складзе войск 2-га Беларускага фронту. Быў паранены. Дэмабілізаваны ў снежні 1945. Працягваў вучобу ў аспірантуры (закончыў у 1947). Адначасова працаваў у газеце «Чырвоная змена». З 1948 да 1975 загадчык кафедры беларускай літаратуры, потым дацэнт Магілёўскага педінстытута. Абараніў кандыдацкую дысертацыю «Вобраз станоўчага героя ў драматургіі Кандрата Крапівы».

Узнагароджаны ордэнамі Вялікай Айчыннай вайны 2-й ступені, Чырвонай Зоркі, медалямі, Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР.

З артыкуламі і рэцэнзіямі Я. Усікаў пачаў выступаць у 1946. Аўтар шасці літаратуразнаўчых кніг. Асноўны кірунак яго творчых інтарэсаў — станаўленне і развіццё беларускай драматургіі, асабліва камедыі — ад старажытнасці да нашых дзён, а таксама развіццё прозы і паэзіі («Драматургія Кандрата Крапівы; Нарысы аб станоўчым героі», «Беларуская камедыя», «Андрэй Мачакаёнак: Нарыс жыцця і творчасці» і інш.). Пра шырокі дыяпазон творчых інтарэсаў Я. Усікава сведчыць яго цікавасць да развіцця вуснай народ-

най творчасці, яе ўзаемадзеянні з мастацкай літаратурай, да дзіцячай літаратуры, тэатра. Сааўтар дапаможнікаў і падручнікаў для студэнтаў ВНУ: «Беларуская дзіцячая літаратура», «Беларуская вуснапаэтычная творчасць», «Гісторыя беларускай літаратуры. XIX — пачатак XX ст.», «Гісторыя беларускага тэатра». Аўтар зборніка літаратурна-крытычных артыкулаў «Грамадскае сумленне мастака».

Жыве ў Магілёве. *В. І. Атрашкевіч.*

Бібліяграфія

1.2.

Образ положительного героя в драматургии Кондрата Крапивы: Автореф. дис. ... канд. филол. н. Мн., 1950.

Драматургія Кандрата Крапівы: Нарысы аб станоўчым героі. Мн., 1953. Рэц.: Вольскі В. // Звязда. 1953. 9 кастр.; Есакоў А. Кніга аб драматургіі Крапівы // Полымя. 1953. № 9; Лазарюк М. Книга о драматургии К. Крапивы // Сталин. молодежь. 1953. 18 окт.; Нікалаеў К. Нарысы аб станоўчым героі // Беларусь. 1953. № 9.

Беларуская камедыя: (Ля вытокаў жанру). Мн., 1964. Рэц.: Бугаёў Д. Аб гісторыі па-сучаснаму // Звязда. 1964. 23 чэрв.; Прашковіч М. Па-новаму пра старажытнасць // Полымя. 1964. № 9; Царанкоў Л. Ля вытокаў беларускай камедыі // ЛіМ. 1964. 11 жн.

Беларуская вуснапаэтычная творчасць. Мн., 1966 / Сааўт. П. Ахрыменка, В. Бандарчык, М. Ларчанка, А. Макарэвіч. Рэц.: Царанкоў Л. Творчасць народа// Беларусь. 1967. № 3.

Беларуская камедыя. Мн., 1973. Рэц.: Зубкоўскі Б. Праблемы жанру // Беларусь. 1974. № 3; Ліякумовіч Ц. Пра здабыткі лірычнай камедыі // Маг. праўда. 1974. 22 ліст.; Пшыркоў Ю. Даследуецца беларуская камедыя // Звязда. 1974. 10 студз.; Шаўлоўская М. Сур'ёзна пра камедыю // ЛіМ. 1974. 12 крас.

Грамадзянскае сумленне мастака: Крытыч. артыкулы, літ. партрэты, Мн., 1976. Рэц.: Абабурка М. Пазіцыя крытыка // Маг. праўда. 1977. 9 ліп.; Ісачанка А., Зубкоўскі Б. Партыйная і грамадзянская пазіцыя пісьменніка // Чырв. змена. 1977. 2 кастр.; Кабржыцкая Т. Грамадзянская сталасць даследчыка // Полымя. 1977. № 6; Лазарук М. Грамадзянская пазіцыя крытыка // Звязда. 1977. 26 кастр.; Няхай М. Пастаянства і паслядоўнасць // ЛіМ. 1977. 18 ліст.

Беларуская камедыя: Літ.-крытыч. нарысы. Мн., 1979. Рэц.: Зубковский Б. // Неман. 1981. № 5; Лаўшук С. Вяртаючыся да вытокаў // Полымя. 1980. № 9.

Андрэй Макаёнак: Нарыс жыцця і творчасці. Мн., 1984.

1.3.

1946. «Будучыня» Эдуарда Самуйлёнка // Беларусь. № 4 / Пад псеўд. Я. Усік.

1947. Гімн жыццю і працы: [Рэц. на кн.: Броўка П. У роднай хаце. Мн., 1946] // Беларусь. № 10; «На родных палетках»: [Рэц. на кн.: Русак А. На родных палетках. Мн., 1946] // Чырв. змена. 24 крас.; Пясняр мужнасці і творчай працы // Там жа. 14 чэрв.; Купала і моладзь // Там жа. 28 чэрв.; Падарожжа вакол свету: [Рэц. на кн.: Маўр Я. Вакол свету. Мн., 1947] // Там жа. 27 вер.; Нізкапробны твор Алеся Стаховіча: [Рэц. на: Стаховіч А. Пад мірным небам // Полымя. 1947. № 7] // Чырв. змена. 25 ліст. / Сааўт. А. Барушка; Аповесць аб нашых сучасніках: [Рэц. на: Паслядовіч М. «Цёплае дыханне» // Беларусь. 1947. № 4—6, 8—10] // Чырв. змена. 2 снеж.

1948. Разам з народам: [Рэц. на кн.: Засім М. Ад шчырага сэрца. Мн., 1947] // Беларусь. № 2; «Добры дзень» Анатоля Астрэйкі: [Рэц. на кн.: Астрэйка А. Добры дзень. Мн., 1948] // Там жа. № 10; Шлях творчага росту // ЛіМ. 26 чэрв.; Новая паэма Эдзі Агняцвет // Там жа. 18 снеж.; «Жыццё і цытадэлі» // Чырв. змена. 5 лют.; Рыцар навукі, патрыёт Радзімы // Там жа. 15 лют.

1949. З прыступак на рыштаванні: [Рэц. на кн.: Кулакоўскі А. Гартаванне. Мн., 1949] // Беларусь. № 9; «Рыбакова хата» // За Радзіму. 20 мая; Пушкін і беларускія паэты // Там жа. 1 чэрв.; Патрыятычная п'еса // Там жа. 26 ліп.

1950. Паэмы Антона Бялевіча: [Рэц. на кн.: Бялевіч А. Паэмы. Мн., 1949] // Беларусь. № 1; Дарогаю росту // Там жа. № 5; Горкі і дарэвалюцыйная беларуская літаратура // Там жа. № 6; Вобраз станоўчага героя ў драматургіі Кандрата Крапівы // Полымя. № 8; Паэмы аб простых людзях // За Радзіму. 15 студз.; Горкі і беларуская літаратура // Там жа. 28 сак.; Шлях народнага паэта // Там жа. 9 крас.; У нагу з жыццём // Там жа. 4 чэрв.; Вялікі пясняр: Да 8-ай гадавіны з дня смерці Я. Купалы // Там жа. 28 чэрв.; Удасканальваць акторскае майстэрства: Да вынікаў гастроляў рэсп. тэатра імя Ленінскага камсамола Беларусі ў г. Магілёве // Там жа. 18 ліп.; Кніга аб барацьбе і творчасці народных мсціўцаў // Там жа. 23 вер.; Беларускія пісьменнікі ў барацьбе за мір // Там жа. 18 ліст.

1951. Пад сцягам барацьбы за высокае майстэрства // Беларусь. № 6; За Радзіму. 20 мая; Вобраз Леніна ў беларускай паэзіі // За Радзіму. 24 студз.; «Дырэктар» // Там жа. 9 чэрв.; Змагар за шчасце народа // Там жа. 29 чэрв.; «Дарога шчасця» // Там жа. 17 кастр.; Змітрок Бядуля: Да дзесятай гадавіны з дня смерці // Там жа. 3 ліст.

1952. Новае перамагае // Полымя. № 8; Паэзія шчасця і міру // За Радзіму. 16 студз.; Н. В. Гогаль і беларуская літаратура // Там жа. 1 сак.; Нястомны паэт-рэвалюцыянер // Там жа. 6 ліп.; Апавяданне ў часопісе // ЛіМ. 19 крас.; «Па шляху сталасці»: [Рэц. на кн.: Карпаў У. Па шляху сталасці. Мн., 1952] // Звязда. 30 вер.

1953. Моўная характарыстыка вобраза-персанажа ў п'есах Кандрата Крапівы // Полымя. № 4; Патрыятычная кніга: [Рэц. на кн.: Кірэенка К. Родны свет. Мн., 1952] // Звязда. 7 крас.

1954. Позірк у будучыню // Беларусь. № 8; Тэма, якая чакае свайго вырашэння // Звязда. 13 студз.; Апавяданні аб нашых сучасніках: [Рэц. на кн.: Дуброўскі І. Радня. Мн., 1954] // Там жа. 16 снеж.

1955. Нястомны паэт-рэвалюцыянер // Янка Купала. Мн.; Аб сатырычным у беларускай камедыяграфіі // Полымя. № 9; Толькі ўперад // За Радзіму. 4 студз.; Паэзія працы і барацьбы: Да 50-годдзя з дня нараджэння П. Броўкі // Звязда. 25 чэрв.

1956. «Моваю сэрца»: [Рэц. на кн.: Лужанін М. Моваю сэрца. Мн., 1956] // Беларусь. № 4; Змітрок Бядуля // Там жа. № 5; Манаграфія пра В. І. Дуніна-Марцінкевіча: [Рэц. на кн.: Майхровіч С. В. І. Дунін-Марцінкевіч. Мн., 1956] // Полымя. № 1; Цікавы зборнік // За Радзіму. 20 мая; Важная падзея ў культурным жыцці рэспублікі: Да выхаду ў свет Збору твораў Кандрата Крапівы // Звязда. 20 кастр.

1957. Кніга пра Цётку: [Рэц. на кн.: Арабей Л. Цётка (Алаіза Пашкевіч). Мн., 1956] // Беларусь. № 2; За стварэнне навуковай гісторыі беларускай літаратуры // Камуніст Бел. № 7 / Сааўт. А. Макарэвіч; Каштоўная праца: [Рэц. на кн.: Майхровіч С. Нарысы беларускай літаратуры XIX стагоддзя. Мн., 1957] // Полымя. № 7; Палымяны патрыёт // Маг. праўда. 7 ліп.; В. І. Дунін-Марцінкевіч // Там жа. 24 снеж.

1958. Беларуская батлейка // Беларусь. № 4; Новая літаратуразнаўчая праца: [Рэц. на кн.: Ларчанка М. На шляхах да рэалізма. Мн., 1958] // Полымя. № 11; Навуковай рабоце студэнтаў — належную ўвагу // Наст. газ. 28 лют.

1959. Сваім голасам: [Рэц. на кн.: Непачаловіч Я. Мера любві. Мн., 1958] // Звязда. 5 ліп.; Гогаль і беларуская літаратура // ЛіМ. 1 крас.; Каш-

тоўнае даследаванне: [Рэц. на кн.: Ларчанка М. На шляхах да рэалізма. Мн., 1958] // Маг. праўда. 10 лют.; Кастрычніцкія зоры // Там жа. 6 ліст.; Сцежкамі нашых песняроў: [Рэц. на кн.: Александровіч С. Незабыўнымі сцежкамі. Мн., 1959] // Там жа. 8 снеж.

1960. Пабольш бы такіх кніг: [Рэц. на кн.: Александровіч С. Незабыўнымі сцежкамі. Мн., 1959] // Беларусь. № 1; Цікавае даследаванне: [Рэц. на кн.: Ярош М. Драматургія Янкі Купалы. Мн., 1959] // Там жа. № 2; «Пахне чабор»: [Рэц. на кн.: Броўка П. Пахне чабор. Мн., 1959] // Там жа. № 4; Маг. праўда. 18 сак.; Магілёў літаратурны // Голас Радзімы. № 31; ЛіМ. 16 крас.; На грэбні светлай хвалі: [Рэц. на кн.: Кірэенка К. Светлая хваля. Мн., 1959] // Звязда. 13 сак.; Добрым традыцыям жыць // Маг. праўда. 6 крас.; Паэт-барацьбіт: Да 120-годдзя з дня нараджэння Ф. Багушэвіча // Там жа. 22 крас.

1961. Аб выхаванні дзяцей: [Рэц. на кн.: Кавалёў П. Лёнька Гром. Мн., 1961] // Беларусь. № 7; Маг. праўда. 12 мая; Ніжэй магчымасцей аўтара: [Рэц. на кн.: Герцовіч Я. Літаратура і жыццё народа. Мн., 1960] // Полымя. № 2; Жывое слова і сухія даведкі: [Рэц. на кн.: Хведаровіч М. Памятныя сустрэчы. Мн., 1960] // Там жа. № 4; Маг. праўда. 1 крас.; Адкрытае і паўторанае: [Рэц. на кн.: Семяновіч А. Беларуская драматургія (дакастрычніцкі перыяд). Мн., 1961] // Полымя. № 11; Крытык — мастак // ЛіМ. 13 чэрв.; На подступах да вырашэння праблемы // Там жа. 22 снеж.; П'еса яшчэ не напісана // Маг. праўда. 2 чэрв.; Мастацтва і выхаванне чалавека будучыні // Там жа. 5 ліп.; Паэтэса-рэвалюцыянерка: Да 85-годдзя з дня нараджэння Цёткі (Алаізы Пашкевіч) // Там жа. 16 ліп.; Натхнёнае слова паэта // Там жа. 3 вер. / Сааўт. А. Макарэвіч; Сучаснік — герой літаратуры // Там жа. 27 снеж.

1962. За маштабнасць сатырычных характараў // Полымя. № 5; Жыццё для народа: [Рэц. на кн.: Жыццё для народа: Зборнік матэрыялаў аб жыцці і дзейнасці Якуба Коласа. Мн., 1962] // Полымя. № 11; Густаўшчына ў крытыцы — дрэнны павадыр: [Рэц. на кн.: Бярозкін Р. Спадарожніца часу. Мн., 1965] // Звязда. 4 жн.; Палымяны патрыёт // ЛіМ. 3 ліп.; Добрым традыцыям жыць // Там жа. 14 снеж.; Голас сэрца: [Рэц. на кн.: Броўка П. А дні ідуць... Мн., 1962] // Маг. праўда. 21 сак.; З народам і для народа // Там жа. 13 кастр.; Журналіст, пісьменнік: Да 50-годдзя з дня нараджэння П. Н. Кавалёва // Там жа. 24 ліст.

1963. У адзінстве зместу і формы: [Рэц. на кн.: Бугаёў Д. Шчодрасць сэрца пісьменніка. Мн., 1963] // Полымя. № 8; Пафас лірыка: [Рэц. на кн.: Кірэенка К. Смага. Мн., 1962] // ЛіМ. 5 сак.; Палітычная сумленнасць мастака // Там жа. 29 сак.; Хай рамантыка з бытам сябруе... // Маг. праўда. 23 студз.; Таленавіты празаік і літаратуразнаўца // Там жа. 19 лют.; Самая гуманная // Там жа. 23 лют.; Шчодрае сэрца // Там жа. 4 жн.; Сіла смеху // Там жа. 3 ліст.; Чаму «Лявоніха» знята з Арбіты // Там жа. 20 ліст.

1964. З верай у чалавека: [Рэц. на кн.: Лось Е. Людзі добрыя. Мн., 1963] // Беларусь. № 3; Творческая индивидуальность писателя: [Рэц. на кн.: Бугаёў Д. Паэзія Максіма Танка. Мн., 1964] // Вопр. лит. № 12; Сталасць драматурга: [Рэц. на кн.: Губарэвіч К. П'есы. Мн., 1963] // Полымя. № 6; Пра сучасніка ў жыцці і на сцэне: [Рэц. на кн.: Колос Г. Современник в гриме и без грима. Мн., 1964] // Там жа. № 11; Маг. праўда. 10 мая; Старадаўняя п'еса // ЛіМ. 3 студз.; Каб рамантыка з бытам дружыла // Там жа. 4 лют.; Магілёў: Сезон 1963—64 гг. // Там жа. 24 сак.; Паэзія барацьбы і міру: Да 50-годдзя з дня нараджэння Аркадзя Куляшова // Маг. праўда. 5 лют.; Героіка і пафас. Кнігі нашых землякоў // Там жа. 10 мая; Школа паэта: Лермантаўскія традыцыі ў беларускай літаратуры // Там жа. 16 кастр.

1965. У цэнтры ўвагі — праблемы майстэрства: [Рэц. на кн.: Куляшоў Ф. Эцюды аб прозе. Мн., 1964] // Полымя. № 10; Не толькі для дарослых // ЛіМ. 27 крас.; На сцэне — купалаўская камедыя // Маг. праўда. 17 ліп.

1966. Змітрок Бядуля // Беларуская дзіцячая літаратура. Мн.

1967. Сталасць: Да 50-годдзя з дня нараджэння Янкі Непачаловіча // Маг. праўда. 27 мая.

1968. З палемічным запалам: [Рэц. на кн.: Кавалёнка В. Давер. Мн., 1967] // Полымя. № 8; Скарбы душы // Маг. праўда. 8 сак.

1969. Дапаможнік па літаратуры: [Рэц. на кн.: Ахрыменка П., Ларчанка М. Старажытная беларуская літаратура. Мн., 1968] // Полымя. № 7; Кніга пра майстэрства: [Рэц. на кн.: Шкраба Р. Літаратура і мова: Кніга пра майстэрства. Мн., 1969] // Звязда. 12 вер.; Заўсёды ў дарозе: П. Шасцерыкову — 50 год // Маг. праўда. 2 мая; Для студэнтаў і настаўнікаў: [Рэц. на кн.: Ахрыменка П., Ларчанка М. Старажытная беларуская літаратура. Мн., 1968] // Там жа. 16 жн.

1970. Пафас лірычнай камедыі // Полымя. № 10.

1971. Народны пісьменнік // Нар. асвета. № 3; Людзям працы прысвячаецца: [Рэц. на кн.: Романов А. Янтарь. Мн., 1970] // Звязда. 24 сак.; Дзейснае слова крытыка: [Рэц. на кн.: Бугаёў Д. Шматграннасць. Мн., 1970] // Там жа. 4 жн.; Всегда с народом // Сел. газ. 4 марта.

1972. О времени, о жизни, о себе: [Рэц. на кн.: Кірэенка К. Кніга ста песень. Мн., 1971] // Неман. № 10; Свежым вокам: [Рэц. на кн.: Бугаёў Д. Зброяй сатыры, зброяй праўды. Мн., 1971] // Полымя. № 7; Пошук вядзе да адкрыццяў // Там жа. № 8; Праўда камедыйных характараў // Звязда. 30 мая; Змястоўна пра таленавітае // Там жа. 30 ліст.

1973. Заўсёды ў пошуку // На высокай хвалі. Мн.; Сэрца на далоні // Полымя. № 11; Зброяй смеху: Творчы партрэт // ЛіМ. 7 снеж.

1975. Талент пісьменніка-парадыста: [Рэц. на кн.: Юрчанка Г. Немеладычныя мелодыі. Мн., 1974] // Беларусь. № 4; Змагар за мужыцкую праўду: (Пра светапогляд Дуніна-Марцінкевіча і яго «Сялянку») // Полымя. № 7; Майстар пародыі: [Рэц. на кн.: Юрчанка Г. Немеладычныя мелодыі. Мн., 1974] // Маг. праўда. 23 жн.

1976. З думай аб шчасці народа: Да 100-годдзя з дня нараджэння Цёткі // Беларусь. № 7; Хроника деревни Арабиновки: [Рэц. на кн.: Кулаковский А. Тропы хоженые и нехоженые. М., 1975] // Неман. № 8; Класічны вадэвіль // Полымя. № 12; Разам з народам // Звязда. 5 сак.; Сіла вялікага ўздзеяння // Там жа. 23 ліст.; Маштабнасць сатырычных характараў // ЛіМ. 15 кастр.

1977. Невядомы твор Дуніна-Марцінкевіча // Беларусь. № 4; Слова пра вялікага песняра: [Рэц. на кн.: Шарахоўскі Я. Пясняр народных дум. Мн., 1976] // Полымя. № 1; З пазіцый грамадзянскасці: [Рэц. на кн.: Гніламёдаў У. Упоравень з векам. Мн., 1976] // Звязда. 13 мая; Бабруйшчына — яго радзіма: Да 170-годдзя з дня нараджэння В. Дуніна-Марцінкевіча // Маг. праўда. 27 снеж.

1978. Педагог, крытык і даследчык // Беларусь. № 8; Шматгранны талент: Да 100-годдзя з дня нараджэння Еўсцігнея Міровіча // Полымя. № 8; Новае аб крытыцы: [Рэц. на кн.: Кавалёнка В. Праблемы сучаснай беларускай крытыкі. Мн., 1977] // Там жа. № 9; Сталасць даследчыцкай думкі: [Рэц. на кн.: История белорусской дооктябрьской литературы. Мн., 1977; История белорусской советской литературы. Мн., 1977] // Звязда. 2 чэрв.; Літаратурнае Прыдняпроўе // ЛіМ. 22 вер.

1979. У дэфіцытным жанры: [Рэц. на кн.: Міско П. Чэрці ў коміне. Мн., 1978] // Полымя. № 4; Пошукі і здзяйсненні: Да 50-годдзя А. Кандрусевіча // Маг. праўда. 8 вер.

1981. Ва ўмовах паскоранага развіцця // Гісторыя беларускай літаратуры XIX — пачатак XX ст. Мн.; На ўздыме // Полымя. № 8; Народны пісьменнік // Маг. праўда. 4 лют.

1982. Паэзія жыцця: А. Русецкаму — 70 // Маг. праўда. 18 снеж.

1983. Тэатральная дзейнасць Сімяона Полацкага; Беларускія інтэрмедыі і інтэрлюдыі; Драматургі Забельскага школьнага тэатра // Гісторыя беларускага

тэатра; У 3 т. Мн. Т. 1; Янка Купала — пясняр рэвалюцыі // Неўміручая спадчына. Мн.
1.6.
Асаблівасці развіцця літаратурнага працэсу ў Беларусі на сучасным этапе. Мн., 1979 / Рэдкал.
2.3.
На беларускай мове. Васільеў А. Ад хваляў дняпроўскіх // ЛіМ. 1977. 18 сак.; Ліякумовіч Ц. Пра здабыткі лірычнай камедыі // Маг. праўда. 1974. 22 ліст.; Луфераў М. Твой сонечны поўдзень: Якубу Усікаву 50 год // Там жа. 1969. 20 вер.; Няхай М. Вернасць запаветнай тэме: Я. Усікаву — 60 гадоў // Звязда. 1979. 20 вер.; Палітыка Д. Агнём сатыры // ЛіМ. 1953. 14 лют.; Пісьменнікі Савецкай Беларусі: Кароткі даведнік. Мн., 1981; Санько В. Сейбіт добрага // Звязда. 1969. 20 вер.; Шарахоўскі Я. Заўвагі аб крытыцы // ЛіМ. 1951. 21 крас.; Ярош М. У творчым паходзе // Там жа. 1979. 21 вер.

У. М. Ларчанка.

УШАКОЎ АНДРЭЙ

Ушакоў Андрэй Фёдаравіч (псеўд. Бязьмежны, А. Бязмежны, Андрэй Бязьмежны; крыпт. А. У-коў, А. У.; 16.10.1912, в. Рабяткі Чавускага пав. Магілёўскай губ., цяпер Чавускі р-н — 1941), паэт.

Паходзіў з сялянскай сям'і. Пасля заканчэння сямігодкі скончыў прафшколу металістаў. Працаваў слесарам Віцебскага дэпо і майстэрняў авіяпарка. Скончыўшы падрыхтоўчыя курсы (1930), вучыўся на крытыка-творчым аддзяленні Вышэйшага педагагічнага інстытута ў Мінску (1930—31). Потым працаваў слесарам на швейнай фабрыцы «Сцяг індустрыялізацыі» ў Віцебску. Уваходзіў у Віцебскую філію БелАППа (пазней Віцебская Асацыяцыя пралетарскіх пісьменнікаў). Вучыўся ў Віцебскім кінатэхнікуме на сцэнарным аддзяленні (1932—33), Усесаюзным дзяржаўным інстытуце кінематаграфіі ў Маскве; адначасова працаваў там слесарам на будаўніцтве метро (1933—34). Пасля ліквідацыі сцэнарнага факультэта ў Інстытуце кінематаграфіі перайшоў на тэатразнаўчае аддзяленне філалагічнага факультэта Маскоўскага інстытута гісторыі, філасофіі і літаратуры імя М. Чарнышэўскага (скончыў у 1939). Працаваў інспектарам Галоўрэперткома ва Упраўленні па справах мастацтва пры СНК БССР (жнівень—кастрычнік 1939). З кастрычніка 1939 у Чырвонай Арміі, быў сакратаром дывізійнай газеты «За Советскую Родину» (Гомель). З пачатку Вялікай Айчыннай вайны прымаў удзел у баях на Магілёўшчыне і Гомельшчыне (чэрвень — ліпень 1941). Загінуў пры пераправе цераз Сож.

Першы верш А. Ушакова надрукаваны ў 1928 у газеце «Чырвоная змена» (пад псеўд. А. Бязьмежны). У далейшым друкаваўся ў перыядычных выданнях і літаратурных альманахах. Выйшлі з друку яго паэма «Говар машын», кнігі вершаў «Рабочы пульс» (у сааўт. з П. Ананьевым), «Зарыва вагранак», «Праца і маладосць», «Голас Радзімы». Паэзіі А. Ушакова пачатку 30-х гадоў уласцівы тэматыка, рытмы і інтанацыі так званай «ударніцкай» паэзіі. Паэтычнымі рэаліямі ў яго вершах з'яўляліся завод, варштат, ліцейны цэх, вагранкі. Аўтара перапаўняла натхненне і вера ў тое, што сённяшняя ўдарная праца — гэта падмурак заўтрашняга шчаслівага дня. Плён паэзіі А. Ушакова быў дастаткова значны як па аб'ёме напісанага (тры паэтычныя кнігі ў 1932—33), так і ў мастацкіх адносінах: талент дапамог яму ўзняцца над звычайнай ва «ўдарніцкай» паэзіі рыторыкай. У вершах больш позняга часу (зборнік «Голас Радзімы») ён адышоў ад «фабрычнай» тэматыкі. У яго з'яўляюцца тыповыя на той час вершы аб грамадзянскай вайне ў Іспаніі, аб Чырвонай Арміі і савецкіх пагранічніках. Разам з тым паглыбляецца лірычны струмень творчасці (вершы аб каханні і сяброўстве), многія лірычныя матывы фальклярызуюцца. Выступаў і як драматург. У сааўтарстве з А. Жаўруком напісаў лібрэта першай беларускай аперэты «Зарэчны барок» (музыка М. Чуркіна). Плённа працаваў А. Ушакоў у жанры дзіцячай літаратуры. Разам з паэтам А. Жаўруком выдаў творы для дзяцей «Пра слаўных папанінцаў нашага

дзетсада» і іншыя. Перакладаў з рускай і ўкраінскай моў (творы М. Горкага, У. Маякоўскага, П. Тычыны). Вершы А. Ушакова перакладаліся на армянскую, балгарскую, польскую, рускую мовы.

Асобныя вершы А. Ушакова пакладзены на музыку І. Любанам («Дзе ж ты, чарнавокая»), М. Чуркіным («Калгасны марш», «Чараўніца», «Серэнада»).

І. Э. Багдановіч, М. Р. Міхайлаў

Бібліяграфія

1.1.

Наша маладосць: Выбр. вершы. Мн., 1962.

1.2.

Рабочы пульс: Вершы. Мн., 1932 / Сааўт. П. Ананьеў.

Зарава вагранак: Вершы. Мн., 1933. Рэц. // Крытыка-бібл. зборнік. Мн., 1934. С. 57—58; П. С. Заўвагі да зборніка вершаў А. Ушакова «Зарава вагранак» // ЛіМ. 1933. 28 ліп.

Праца і маладосць: Вершы. Віцебск, 1933. (Аргкамітэт віцебскага саюза савецкіх пісьменнікаў). Рэц.: Галубок Э. Старонка літаратурнага Віцебска // ЛіМ. 1933. 31 снеж.; Ларчанка М. Паэзія бальшавіцкай маладосці // Крытыка-бібл. бюл. 1934. № 1—2.

Голас Радзімы: Вершы. Мн., 1938. Рэц.: Гейнэ А. Халодныя вершы // ЛіМ. 1939. 3 ліп.

Пра майго таварыша: Паэма для дзяцей. Мн., 1939 / Сааўт. А. Жаўрук.

Пра слаўных папанінцаў нашага дзетсада: Паэма. Мн., 1939 / Сааўт. А. Жаўрук.

Пра майго катка: Вершы. Мн., 1950 / Сааўт. А. Жаўрук.

1.3.

1924. Мазаіка жыцця: [Нарыс] // Сав. Бел. 25, 26 кастр. / Пад псеўд. Бязьмежны. Аўт. спрэчнае.

1928. Загуменнем раніцай: [Верш] // Чырв. змена. 12 вер. / Пад псеўд. А. Бязьмежны.

1929. Заводу: [Верш] // Віцеб. пралетарый. 11 кастр. / Пад псеўд. Андрэй Бязьмежны.

1930. Говар машын: [Паэма] // Рытмы будавання. Віцебск / Пад псеўд. Андрэй Бязьмежны; Зімою ў ліцейным; Чорная дошка: Вершы з нізкі «Зарыва вагранак» // Узвышша. № 9—10; Першае мая: [Верш] // Віцеб. пралетарый. 1 мая / Пад псеўд. Андрэй Бязьмежны; Рытмы працы: [Верш] / Пад псеўд. Андрэй Бязьмежны; Шуміць хвоя: (Паэма ў прозе) // Там жа. 11 ліп.; З цыкла «Зарыва вагранак»: [Верш] / Пад псеўд. Андрэй Бязьмежны; Шырокая радасць: (Урывак з аповесці «Зялёная вада») // Там жа. 23 жн.; Рытмы сэрца: [Верш] // Там жа. 26 вер. / Пад псеўд. Андрэй Бязьмежны; Табельная марка: [Верш] // Там жа. 21 кастр. / Пад псеўд. Андрэй Бязьмежны; Гарыць агнём Чырвоная звязда: [Верш] // Там жа. 8 ліст. / Пад псеўд. Андрэй Бязьмежны; Дэпо: Урывак з паэмы «Говар машын» // На Беларусі. 13 лют. / Пад псеўд. Андрэй Бязьмежны.

1931. Людзі вялікіх спраў: [Верш] // Маладняк. № 9; «Белатвары, сухотны месяц...»: [Верш] // Полымя. № 5; Пераробка людзей: [Верш] // Там жа. № 10; Пераходны сцяг: [Верш] // Узвышша. № 1; Мой станок зацвярджае выклік; Брак: [Вершы] // Там жа. № 2; Выстаўка браку: [Верш] // Там жа. № 3; Кастрычніцкі падарунак; На ліквідацыі прарыву: [Вершы]: З цыкла «Рабочы штурм» // Там жа. № 9; Апавяданне брыгадзіра; У вайсковым гуртку: [Вершы] // Там жа. № 10; У вайсковым гуртку: [Верш] // Штурм. № 1; Адзін з «518»: [Нарыс] // Віцеб. пралетарый. 6 ліст.; Вайсковая беларуская літаратура // Там жа. 12 снеж.; Клуб металістаў: [Верш] // Там жа. 29 снеж.; Радасць: Урывак з аповесці «Зялёная вада» / Пад псеўд. Андрэй Бязьмежны; Рабочая вясна: [Верш] // Чырв. змена. 14 крас.

1932. Чырвоны Май: [Верш] // Партыя, слухай. Мн. Пад псеўд. Андрэй Бязьмежны; Клуб металістаў: [Верш] // Маладняк. № 5—6; Пагранічная песня: [Верш] // Напагатове. № 2; Брыгада Норкінай: Нарыс // Работніца і калгасніца Бел. № 31; Віцеб. пралетарый. 24 кастр.; Працоўны дзень міліцыянера Няміры: Нарыс // Чырв. Бел. № 23—24; Віцеб. пралетарый. 10 ліст.; За незалежнасць: [Нарыс] // Віцеб. пралетарый. 14 лют.; Апавяданне брыгадзіра: [Верш] // Там жа. 7 сак.; Аўладаць тэхнікай: Да канферэнцыі Віцебскай АПП // Там жа. 14 сак.; За працу над гісторыяй заводаў // Там жа. 18 сак.; Аплаціць сацыялістычны рахунак // Там жа. 19 сак.; Абмен камсамольскіх білетаў: [Верш]; «Беларусь калгасная» № 1: [Рэц. на часоп.] // Там жа. 18 крас.; І ўзроствае ў мускулах гарт...: [Верш] // Там жа. 11 мая; Песня замежнага рабочага: [Верш]; За вучобу, за штодзённую творчую работу: Пра творчасць Шыракова // Там жа. 21 ліп.; Спакуса: Урывак з гукавага сцэнарыя «ЭУ 7» / Сааўт. Р. Жалязняк; Юбіляру М. Горкаму: [Верш] // Там жа. 24 вер.; Дзве песні: Дапрызыўная; Пагранічная: [Вершы] // Там жа. 11 кастр.; Настаўнік Брандбург: [Нарыс] // Там жа. 15 кастр.; Будні лётнай школы: Нарыс // Там жа. 1 ліст.; Супраць тэхнічнай непісьменнасці // ЛіМ. 5 чэрв.; У Віцебску агляд маладзёжнай літаратуры не разгорнуты // Там жа. 10 ліп. / Сааўт. Р. Жалязняк; За шчыльнае супрацоўніцтва з камсамолам // Там жа. 5 жн.; Песня ўдарнікаў: [Верш] // Чырв. змена. 18 сак.

1933. Пачатак маладосці: [Верш] // Работніца і калгасніца Бел. № 7; Ганна Барвянкова: [Нарыс] // Там жа. № 26; Ворагі: [Апавяданне] // Віцеб. пралетарый. 4 крас.; Машыніст паравозу С-30: [Нарыс] // Там жа. 29 крас.; За савецкі Мінск!: Кавалак гісторыі 27-й Омскай чырвонаштандарнай дывізіі: [Верш] // Там жа. 11 ліп.; Вера Холадава: Нарыс // Там жа. 18 жн.; Нам 15 год: [Верш] // Там жа. 24 снеж.; Чырв. змена. 16 снеж.; Пра сяброўства: [Верш] // ЛіМ. 28 ліп.; «Эпічныя фрагменты» // Там жа. 13 жн.; Працу з маладымі пісьменнікамі паставіць на бальшавіцкія рэйкі // Там жа. 16 кастр.; За савецкі Мінск: [Верш] // Чырвонаарм. праўда. 1 жн.

1934. Пра сяброўства; Мы гатовы; Дапрызыўная; Пагранічная: [Вершы] // Бальшавіцкая моладзь. Мн.; Песня замежных рабочых: [Верш] // Вясна пераможная. Мн.; Дапрызыўная: [Верш] // Віцеб. пралетарый. 15 вер.; «Аманал» А. Куляшова: [Рэц. на кн.: Куляшоў А. Аманал: Паэма. Мн., 1933] // ЛіМ. 12 студз. / Сааўт. А. Зарыцкі; «Шуміць бярэзінка» Сташэўскага: [Рэц. на кн.: Сташэўскі В. Шуміць бярэзінка. Мн., 1933] // Там жа. 6 сак. / Сааўт. С. Брахман; Рэплікі некаторым крытыкам // Там жа. 26 ліп.; Пра сюжэт у паэзіі // Там жа. 25 жн.; Кніга вялікай мастацкай сілы: [Рэц. на кн.: Лынькоў М. На вялікай хвалі: Апавяданні. Мн., 1934] // Там жа. 18 снеж.; 1920 год: Урывак з паэмы // Чырв. змена. 11 ліп.; Провады прызыўніка: [Верш] // Там жа. 20 кастр.; Радасць: [Верш] // Там жа. 18 ліст.

1935. Радасць: [Верш] // Віцеб. пралетарый. 1 крас.; Студэнтка: [Верш] // Там жа. 15 чэрв.; Чырв. змена. 24 мая; Апавяданне партызана: [Верш] // Віцеб. пралетарый. 11 ліп.; Кулацкія недабіткі // Там жа. 10 жн. / Сааўт. П. Быкоўскі; Буду лётчыкам: [Верш] // Там жа. 18 жн.; Дружба: Нарыс / Пад псеўд. А. Бязьмежны; На прывале: [Верш] // Там жа. 29 жн.; Рамантыка ў творчасці А. Куляшова // ЛіМ. 16 крас.; Кніжка пра Жэньку-шафёра: [Рэц. на кн.: Багун М. Жэнька. Мн., 1934] // Там жа. 26 крас. / Пад крыпт. А. У-коў.

1936. Вярнуўся: [Апавяданне] // Работніца і калгасніца Бел. № 11; Песня пра пагранічніка; Мужнасць: [Вершы] // Віцеб. пралетарый. 11 ліп.; Абкрадзенае жыццё: Апавяданне / Пад псеўд. Андрэй Бязмежны; Парашутыстка: [Верш] // Там жа. 28 ліп.; Братанне: [Верш] // Там жа. 1 жн.; Начальнік лётнай школы: [Верш] // Там жа. 18 жн.; Наша маладосць: [Верш] // Там жа. 1 вер.; Провады прызыўніка: [Верш] // Там жа. 10 вер.: [Рэц. на кн.: Дудар А. Слуцак. Мн., 1936] // ЛіМ. 31 сак.; Парашутыстка: [Верш] // Чырв. змена. 11 сак.; Песня пра пагранічніка: [Верш] // Там жа. 16 жн.

1937. Радаслоўная: [Верш] // Полымя рэвалюцыі.

№ 3; Мужнасць; Калыханка: [Вершы] Там жа. № 4; Прысяга: [Верш] // Там жа. № 6; Блізкасць: [Верш] // Там жа. № 7; Калыханка: [Верш] // Віцеб. пралетарый. 18 ліп.; Недапрацаваны спектакль: («Барыс Гатаруноў» у пастаноўцы Кіеўскага дзярж. абласнога тэатра рускай драмы) // Там жа. 30 ліп.; «Клятва»: [Рэц. на фільм] // Там жа. 18 жн.; «Банкір»: [Рэц. на спектакль] // Там жа. 25 жн.; «На Далёкім Усходзе»: [Рэц. на фільм] // Там жа. 30 жн.; Мітынг ля помніка А. С. Пушкіна // ЛіМ. 16 лют. / Сааўт. А. Сінічкін; Шаўчэнкаўскі вечар у маскоўскім Доме пісьменніка // Там жа. 23 сак. / Сааўт. А. Сінічкін; Вершы Алеся Жаўрука // Там жа. 28 мая; Праўленне Саюза пісьменнікаў адарвана ад перыфірыі // Там жа. 30 жн. / Сааўт. Р. Жалязняк; Творчы поспех // Там жа. 22 кастр.; Вучоба маладых паэтаў і празаікаў не арганізавана // Чырв. змена. 24 крас. / Сааўт. А. Жаўрук; Пагранічнік: [Верш] // Там жа. 21 мая.

1938. Песня пра майго таварыша // Іскры Ільіча. № 4 / Сааўт. А. Жаўрук. Рэц.: Карпачоў М. Дзве паэмы для дзяцей // ЛіМ. 1939. 23 ліп.; Пра слаўных папанінцаў з нашага саду: [Паэма] // Іскры Ільіча. № 8; Полымя рэвалюцыі. № 12 / Сааўт. А. Жаўрук. Рэц.: Карпачоў М. Дзве паэмы для дзяцей // ЛіМ. 1939. 23 ліп.; Шпакі: [Верш] // Іскры Ільіча. № 9 / Сааўт. А. Жаўрук; Песні: Пісьмо; Песня маці; Песня пра дукорскіх партызан // Полымя рэвалюцыі. № 2; Песня пра нашага дэпутата: [Верш] // ЛіМ. 26 чэрв.; «Нашы дні» Якуба Коласа // Там жа. 10 жн.; Добрае пачынанне: (Альманах рускай секцыі ССП БССР) // Там жа. 6 вер.; «Літаратура і мастацтва» // ЛГ. 26 сент.; Цудоўныя госці: [Верш] // Піянер Бел. 9 сак. / Сааўт. А. Жаўрук.

1939. Мае браты!: [Верш] // Вызваленым братам. Мн.; Пра муху Буркуху і дзяўчынку Гразнуху: Казка / Іскры Ільіча. № 8 / Сааўт. А. Жаўрук; Песня заходніх беларусаў: [Верш] // Звязда. 26 вер.; Да чаго прыводзіць няведанне жыцця: [Рэц. на кн.: Агняцвет Э. Вершы. Мн., 1938] // ЛіМ. 3 сак.; Заходнім беларусам: [Верш] // Там жа. 21 вер.; Аб п'есе «Хто смяецца апошнім» // Там жа. 23 кастр.

1940. Пра блазнівага катка: [Верш] // Іскры Ільіча. № 2 / Сааўт. А. Жаўрук; Цудоўны горад: [Верш] // Там жа. № 6—7 / Сааўт. А. Жаўрук; Песня: [Верш] / Віцеб. рабочы. 12 крас.; «Партызаны»: (Першы Беларускі Дзяржаўны драматычны тэатр) // Гомел. праўда. 29 жн. / Сааўт. Т. Падабедава; «Хто смяецца апошнім»: (Першы Беларускі Дзяржаўны драматычны тэатр) // Там жа. 4 вер. / Сааўт. Т. Падабедава; Малады баец: [Верш] // Там жа. 27 кастр.; Аб некаторых «дробязях» паэзіі // ЛіМ. 23 мая; Песні: На шаўковыя травы пала раса; З душнай хаты ў сад я выйшла // Там жа. 3 ліп.; З «Літоўскага дзённіка»: [Верш] // Там жа. 3 жн.; Развітанне з лагерам: [Верш] // Чырв. змена. 20 ліст.

1941. Пераход: [Верш] // ЛіМ. 20 лют.

1945. Шпакі: [Верш] // Бярозка. № 4 / Сааўт. А. Жаўрук.

1947. Многаму ім ты ў жыцці абавязан: [Верш] // Полымя. № 2.

1948. Пераход; Развітанне з лагерам; Начлег: [Вершы] // Полымя. № 9.

1949. Урачыстасць; Мужнасць; Сустрэча парахода; Пагранічнік; Парашутыстка; Карагодная; Многаму ім ты ў жыцці абавязан; Пераход; Развітанне з лагерам; Начлег: [Вершы] // Мы іх не забудзем. Мн.

1958. Песня пра дукорскіх партызан: [Верш] // Юным дэкламатарам. Мн. / Сааўт. А. Жаўрук.

1960. Пра майго катка: [Верш] // Дзецям. Мн. / Сааўт. А. Жаўрук.

1961. Многаму ім ты ў жыцці абавязан; Пераход: [Вершы] // Анталогія беларускай паэзіі: У 3 т. Мн. Т. 3; Песня пра дукорскіх партызан: [Верш] // Вершы, аднаактовыя п'есы. Мн. / Сааўт. А. Жаўрук.

1962. «Як шмат лёгкіх і суровых...»; А можа быць; Дождж; Па дарозе ў часць; Разведчык; Ранак; «У вагонным акне...»; «Дзень мінуў, і сонца круг патух...»: [Вершы] // Полымя. № 5.

1967. Многаму ім ты ў жыцці абавязан; На імперыялістычнай вайне; Радаслоўная; «Дзе ты, чарнавокая...»; Мужнасць; Развітанне з лагерам; Калыханка; «Як шмат лёгкіх і суровых...»; Разведчык; Ранак; «Дзень мінуў, і сонца круг патух...»: [Вершы] // Крывёю сэрца. Мн.

1969. Многаму ім ты ў жыцці абавязан; Развітанне з лагерам; «Дзе ты, чарнавокая...»: [Вершы] // Вяч. Мінск. 2 кастр.

1972. «Дзе ты, чарнавокая...»: [Верш] // Зорка Венера. Мн.

1973. Біяграфія // Вытокі песні: Аўтабіяграфіі беларускіх пісьменнікаў. Мн.

1978. Машыніст Брук: [Балада] // Беларуская балада. Мн.

1982. Многаму ім ты ў жыцці абавязан: [Верш] // На сцягу і ў сэрцы. Мн.

1983. Пра майго катка: [Верш] // Вяснянка. Мн. / Сааўт. А. Жаўрук.

1984. «Дзень мінуў, і сонца круг патух...»: [Верш] // За цябе, радзіма! Мн.; Многаму ім ты ў жыцці абавязан: [Верш] // Вясёлка. № 7.

1989. Пісьмы да сябра: З перапіскі А. Ушакова і Э. Самуйлёнка з П. Глебкам // Полымя. № 11.

1.4.

1931. Фрумкін Л. Ударнік: [Верш] / З рус. // Штурм. № 1.

1936. Горкі М. Размова птушак: Першая частка твораў «Вясновыя мелодыі» / З рус. // Віцеб. пралетарый. 28 ліп.

1937. Маякоўскі У. Дамоў: Урывак / З рус. // ЛіМ. 18 крас. / Сааўт. пер. А. Жаўрук; Руставелі Ш. Сказ Гарыэла Аўтандылу аб сваіх ліхіх прыгодах; Ліст Нестан-Дарэджаны, пасланы свайму каханаму: Урыўкі з паэмы «Віцязь у тыгравай скуры» / З груз. // Там жа. 27 кастр. / Сааўт. пер. А. Зарыцкі; Яго ж. Віцязь у тыгравай скуры: Раздзел 35. Адказнае пасланне Аўтандыла Фацьме / З груз. // Там жа. 20 снеж. / Сааўт. пер. А. Зарыцкі, А. Жаўрук; Яго ж. Віцязь у тыгравай скуры: XXXVII. Сказ Фацьмы аб Нестан-Дарэджане / З груз. // Там жа. 24 снеж. / Сааўт. пер. А. Зарыцкі, А. Жаўрук; Маякоўскі У. Сакрэт маладосці: [Верш] / З рус. // Чырв. змена. 15 крас. / Сааўт. пер. А. Жаўрук.

1938. Джамбул Д. Песня сонцу; Вялікі Сталінскі закон: [Вершы] / З каз. // ЛіМ. 22 мая; Яго ж. Песня пра друга Сталіна: [Верш] / З каз. // Там жа. 26 чэрв. / Пер. пад крыпт. А. У.

1939. Джамбул Д. Вялікі Сталінскі закон; Песня аб другу Сталіну; Савецкі Саюз; Песня сонцу; Аб сонечным Горкім; Развітальная песня; Песня аб Орынборы; Песня пры атрыманні Ордэна / Сааўт. пер. А. Жаўрук; Масква мая / Сааўт. пер. А. Жаўрук; З Новым годам / Сааўт. пер. А. Жаўрук; Закон шчасця / Сааўт. пер. А. Жаўрук; Я песню пяю ў прамяністым Крамлі / Сааўт. пер. А. Жаўрук; Тарас / Сааўт. пер. А. Жаўрук; Батырам полюса / Сааўт. пер. А. Жаўрук; З'езду пераможцаў / Сааўт. пер. А. Жаўрук; Сураншы-батыр / Сааўт. пер. А. Жаўрук: [Песні]; Артыгенбатыр: [Паэма] / Сааўт. пер. А. Жаўрук / З каз. // Джамбул. Песні і паэмы. Мн.; Лермантаў М. «Распусту досыць выбачаць!..»: [Верш] / З рус. // Бальш. Пал. 15 кастр.; Яго ж. К***: [Верш] / З рус. // ЛіМ. 11 кастр.

1941. Лермантаў М. Прадраканне: [Верш] / С рус. // ЛіМ. 24 мая.

1942. Колас Я. Отомстим!: Партизанская песня / С бел. // Славяне. № 3.

1.5.

На армянскую мову. Развітанне з лагерам / Пер. А. Туманян; У маёй воінскай часці / Пер. А. Варданян: [Вершы] // Анталогія беларускай літаратуры. Ерэван, 1957.

На балгарскую мову. Лектор; Пазител на чистотата; Нечисто обръщение; Хипноз: [Гумарэскі] / Прев. Л. Стефанов // Хумористичен сборник. София, 1940.

На рускую мову. Два стихотворения: Переход; Прощание с лагерем / Пер. А. Кленов // Сов. воин. 1949. № 19; По дороге в часть; Прощанье с лагерем: [Вершы] / Пер. А. Кленов // Антология белорусской поэзии. М., 1952; Сорванцы: [Верш] // Во славу Родины. 1965. 21 нояб.; Песня над дорогой: [Верш] // Там жа. 1966. 20 авг.; Ночлег: [Верш] / Пер. Н. Кислик // Чтоб всегда было солнце. Мн., 1968; Мужество; На империалистической войне: [Вершы] / Пер. Д. Ковалев

// Неман. 1969. № 5; Ночлег: [Верш] / Пер. Н. Кислик // Кислик Н. Спелый бор. Мн., 1982; Мужество: [Верш] / Пер. Д. Ковалев // Ковалев Д. Кому что дорого: Лирика. Мн., 1982; Наша молодость: Многим в жизни ты им обязан; Наша молодость; По дороге в часть; Переход; «Как много светлых и суровых...»; Прощание с лагерем; Разведчик; «День прошел и гаснет солнца круг...»: [Вершы] / Пер. И. Бурсов // Возвращение. Мн., 1985; Ты им обязан... / Пер. А. Дракохруст; На империалистической войне; Мужество / Пер. Д. Ковалев; Родословная; «Где ты, черноокая...»; Утро; Разведчик; Прощание с лагерем; «Их много — близких и далёких...»; «День прошел...» / Пер. А. Дракохруст; Ночлег / Пер. Н. Кислик: [Вершы] // Кровью сердца. Мн., 1985; Родословная: [Верш] / Пер. А. Дракохруст // Неман. 1985. № 5.

2.3.

На беларускай мове. Аношкін І. Сустрэча з паэтам: Да 70-годдзя з дня нараджэння А. Ушакова // Маг. праўда. 1982. 14 жн.; Барсток М. Прысяга ў акопах // Вобраз-85. Мн., 1985; Вольская А. «Радкі, абарваныя куляй...» // ЛіМ. 1977. 6 мая; Гніламёдаў У. «Ляжыць ён, як віцязь...» // Звязда. 1985. 17 мая; Жорава К. Яны ў нашых сэрцах // ЛіМ. 1975. 9 мая; Зарыцкі А. Андрэй Ушакоў // Зарыцкі А. За словам-падарункам. Мн., 1985; І. Ш. Аўладаць марксісцка-ленінскай тэорыяй // Віцеб. пралетарый. 1932. 19 сак.; Яго ж. Заўвагі пра творчасць Ушакова // ЛіМ. 1932. 5 жн.; Мазуркевіч Я. Пралетарская літаратура ў Віцебску // Віцеб. пралетарый. 1930. 8 ліст.; Песня баявой маладосці // ЛіМ. 1962. 25 вер.; Пісьменнікі Савецкай Беларусі: Кароткі даведнік. Мн., 1981; Пятроў І. Сэрцам вечна малады // Вяч. Мінск. 1969. 2 кастр.; Сядура У. Камсамол у беларускай паэзіі // Маладняк. 1932. № 1; Хадарэнка П. Заметкі аб творчасці А. Ушакова // Чырв. змена. 1939. 24 жн.; Шарахоўскі Я. Пра якасць паэтычнай мовы // ЛіМ. 1934. 26 крас.

3.1.

БДАМЛіМ, ф. 27, воп. 1. спр. 1—8. *У. М. Ларчанка.*

Ф

ФАКТАРОВІЧ ДАВІД

Фактаровіч Давід Яўсеевіч (23.9.1917, г. Саратаў — 28.2.1993, Масква, пахаваны ў Маскве на Дамадзедаўскіх могілках), літаратуразнавец. Член Саюза журналістаў СССР з 1960.

Нарадзіўся ў сям'і лекараў. Быў адзіным сынам. Рана асірацеў. Бацька, Яўсей Маркавіч, памёр у 1931. Маці, Яўгенія Рыгораўна Серман-Фактаровіч, выпускніца медыцынскага факультэта Бернскага універсітэта (Швейцарыя), загінула на пасту ў 1933 у час эпідэміі тыфу ў Саратаўскай губерні. Пасля смерці бацькоў пераехаў да дальняй радні ў Казань, дзе закончыў сярэднюю школу № 15. У выпускным класе быў адказным рэдактарам літаратурна-мастацкага часопіса «Наш РоСТ». У 1934 паступіў на літаратурны факультэт 2-га Маскоўскага дзяржаўнага універсітэта, сумяшчаў вучобу з працай у сярэдняй школе № 636 г. Масквы, быў атэставаны як настаўнік. Пасля заканчэння універсітэта (1938) паступіў у аспірантуру кафедры ўсеагульнай літаратуры, якую паспяхова закончыў, абараніўшы ў 1941 кандыдацкую дысертацыю. Дасканала валодаў нямецкай мовай, а таксама іспанскай, італьянскай, французскай, і таму на другі дзень

вайны даў згоду аб накіраванні на лінію фронту. Аднак з-за дрэннага стану здароўя атрымаў іншае прызначэнне і, пасля кароткатэрміновай службы ў маскоўскім апалчэнні, да 1944 працаваў дацэнтам у Свярдлоўскім педагагічным інстытуце. З 1944 Д. Фактаровіч у БДУ: дэкан факультэта журналістыкі (1945—47), загадчык кафедры замежнай літаратуры, дацэнт (1947—65). У 1965 Д. Фактаровіч пераехаў у Маскву. Працаваў у Інфармацыйным цэнтры Вышэйшай школы МВА СССР (1968—73), у НДІ праблем вышэйшай школы (1973—75), у праектным інстытуце «Гіправуз» (1976—89).

Д. Фактаровіч аўтар шматлікіх навуковых манаграфій, падручнікаў, артыкулаў. Сярод іх — кнігі «Беларуская савецкая літаратура за мяжой», «Сусветная вядомасць беларускай літаратуры», «Чэшска-беларускія літаратурныя сувязі», «Замежная літаратура ў перакладах на беларускую мову», «Зарубежныя литературы (сярэднія вякі, Адраджэнне, XVII век)». У гэтых і іншых працах ім даследаваны праблемы гісторыі, узаемадзеяння літаратур, тэорыі мастацкага перакладу. Вынікам мэтанакіраваных і глыбокіх даследаванняў у галіне ўзаемадзеяння літаратур і мастацкага перакладу з'явілася напісанне доктарскай дысертацыі, якая была падрыхтавана да выдання асобнай кнігай «Асновы тэорыі мастацкага перакладу» (не пабачыла свету).

В. У. Смольская.

Бібліяграфія

1.2.

Беларуская літаратура за мяжой. Мн., 1958 / Сааўт. В. Цімафеева, Н. Лапідус. Рэц.: Каліновіч А. Беларуская літаратура за мяжой // Полымя. 1959. № 1.

Зарубежные литературы. Древняя Индия, Китай, Античность, средние века, Возрождение, литературы XVII века: Учеб. пособие. Мн., 1959 / Сааўт. Н. Лапідус.

История печати зарубежных коммунистических и рабочих партий: Учеб. пособие. Мн., 1960 / Сааўт. Б. Міцкевіч.

Беларўская савецкая літаратура за мяжой. Мн., 1961. Рэц.: Александровіч С. Даследаванне ці інфармацыйны даведнік? // Полымя. 1961. № 10; Базарэвіч М. Чуецца голас нам далёка // ЛіМ. 1961. 9 чэрв.; Бурносаў В. І чуцен голас наш далёка за мяжой // Звязда. 1961. 14 мая.

Зарубежные литературы. Античность, средние века. Возрождение, литература XVII—XVIII вв.: Учеб. пособие. Мн., 1963 / Сааўт. Н. Лапідус, Б. Міцкевіч.

Зарубежные литературы XIX—XX веков (до 1917 года): Учеб. пособие. Мн., 1964 / Сааўт. Н. Лапідус, Б. Міцкевіч, В. Цімафеева.

1.3.

1941. М. Сервантес // Что читать. № 4.

1946. «Рамэо і Джульета» на падмостках тэатра Янкі Купалы // ЛіМ. 20 студз.

1947. Вялікі паэт азербайджанскага народа: [Да 800-годдзя з дня нарадж. Нізамі Гянджэві] // Звязда. 21 кастр.; Воля да аднаўлення // ЛіМ. 15 сак.; Кніга пра веліч рускай літаратуры // Там жа. 12 крас.; Мігель Сервантэс Сааведра: [Да 400-годдзя з дня нараджэння] // Там жа. 26 крас.; Геніі Рэнесанса: [Да 330-годдзя з дня смерці В. Шэкспіра і М. Сервантэса] // Там жа. 30 крас.; Слова неўміручасці: [Рэц. на кн.: Фучык Ю. Слова перад пакараннем смерцю (Рэпартаж з пятлёй на шыі)] // Там жа. 17 мая; Сусветная значэнне творчасці М. Горкага // Там жа. 14 чэрв.; Коратка аб кнігах // Там жа. 9 жн.; Пад знакам заняпаду і палітычнай істэрыі // Там жа. 20 вер.; Слова антыбуржуазнай сатыры: [Рэц. на кн.: Петров Е. Остров мира // Новый мир. 1947. № 6] // Там жа. 27 вер.; Апавяданні пра савецкага чалавека // Там жа. 4 кастр.; Па старонках замежнай прэсы // Там жа. 18 кастр.; Чэрчыль супраць Прыстлі // Там жа. 1 ліст.; Востраў Фарысеяў // Там жа. 29 ліст.; «Гамлет» на сцене театра им. Якуба Коласа // Сов. Бел. 27 июня; Ошибочная трактовка образа Георгия Скарины // Там жа. 21 дек.

1948. Пра літаратурнае вяшчанне рэспубліканскага радыёкамітэта // Звязда. 1 лют.; Пра гандляроў духоўнымі наркотыкамі // Там жа. 24 сак.; Раман І. Эрэнбурга «Бура» // Там жа. 18 крас.; Палымяны змагар за камунізм: (Да 12-й гадавіны з дня смерці А. М. Горкага) // Там жа. 18 чэрв.; Кнігі, якія выкрываюць амерыканскі расізм // Чырв. змена. 26 жн.

1952. Пясняр свабоды і міру: [Да 150-годдзя з дня нараджэння Віктара Гюго] // ЛіМ. 25 лют.; Сусветнае значэнне Гогаля // Там жа. 1 сак.; Францыя змагаецца // Там жа. 31 мая; Ваенная справа: Пісьмы ў рэдакцыю // Там жа. 6 вер.; «Глыбокія барозны» // Там жа. 13 вер.

1953. Пясняр міру // Полымя. № 4; «Людзі, я любіў вас! Будзьце пільнымі!» // ЛіМ. 21 лют.; Сведчанне вялікай дружбы // Там жа. 27 чэрв.; Дружба народов: [Об укреплении культ. связей советского и китайского народов] // Сов. Бел. 14 июня; «Шакалы» // Сталин. молодёжь. 21 янв.

1954. Вместе с народом: Заметки о развитии новодемократической литературы за рубежом // Сов. Отчизна. № 3; Говард Фаст // ЛіМ. 30 студз.; «Нора» // Сов. Бел. 9 февр.; Выдающийся французский писатель: К 10-летию со дня смерти Р. Роллана // Там жа. 30 дек.; Паэт працоўнай моладзі // Чырв. змена. 13 крас.

1955. Каляндар Беранжэ // Беларусь. № 8; Вялікая, бессмяротная кніга // Полымя. № 1; Першыя нумары новага часопіса // Звязда. 29 вер.; Голас сумленнага пісьменніка: (Да 10-годдзя з дня смерці Т. Драйзера) // Там жа. 28 снеж.; Песняр свабоды і міру // ЛіМ. 8 студз.; Вялікі польскі паэт // Наст. газ. 24 ліст.; Великое произведение: К 350-летию романа Мигеля де Сервантеса Сааведра «Дон Кихот Ламанчский» // Сов. Бел. 18 марта; Великий художник слова: (К выходу первого тома собрания сочинений Рабиндраната Тагора) // Там жа. 7 авг.; Солдат мира: К 20-летию со дня смерти А. Барбюса // Там жа. 30 авг.; Один из величайших мировых поэтов // Там жа. 24 нояб.

1956. К творческой истории романа Сервантеса «Дон Кихот» // Ученые записки [Белорус. ун-т]. вып. XXVII, сер. филологическая; Трибуна прогрессивной литературы мира: По страницам журнала «Иностранная литература» // Сов. Отчизна. № 2; Чэшская анталогія беларускай паэзіі // Звязда. 4 сак. / Сааўт. А. Мажэйка; Дзённік Рамэна Ралана // ЛіМ. 28 студз.; Вялікі кітайскі пісьменнік // Там жа. 22 вер.; Генрик Ибсен // Сов. Бел. 23 мая.

1957. Пасляслоўе // Венгерскія апавяданні. Мн.; З гісторыі чэшска-беларускіх літаратурных сувязяў // Полымя. № 1 // Сааўт. А. Мажэйка; Вільям Блейк: Да 200-годдзя з дня нараджэння // Звязда. 28 ліст.; Наш вялікі друг // ЛіМ. 11 снеж.

1958. Ён жыў будучыняй: Да 15-годдзя з дня смерці Юліуса Фучыка // За вяртанне на Радзіму. № 69; Сусветнае гучанне беларускай літаратуры // Маладосць. № 12; Яраслаў Гашэк і яго сатырычная эпапея // Полымя. № 4; Літаратура мільёнаў натхняецца Маніфестам міру // Звязда. 14 студз.; Цудоўная сатыра: [Да 75-годдзя Яраслава Гашэка] // Там жа. 29 крас.; І чуцен голас наш далёка за мяжой... // Там жа. 24 чэрв.; Арабская рэчаіснасць у рамане Д. Олдрыджа [«Герои пустынных горизонтов». М., 1958] // Там жа. 23 ліп.; Ён жыў будучыняй: Да 15-годдзя з дня смерці Юліуса Фучыка // Там жа. 7 вер.; Літаратура абуджаных народаў: Да канферэнцыі пісьменнікаў краін Азіі і Афрыкі ў Ташкенце // Там жа. 30 вер.;

Джон Галсуорсі // ЛіМ. 5 лют.; Каштоўны дапаможнік для літаратараў // Наст. газ. 29 жн.

1959. [Уступны артыкул] // Гейне Г. Выбраныя творы. Мн., 1959; Ад Парыжа да Пекіна: Некаторыя заўвагі да французскай літаратурнай энцыклапедыі // Звязда. 21 сак.; Вялікая праўда рэаліста: Да 160-годдзя з дня нараджэння А. дэ Бальзака // Там жа. 20 мая; Дружба народаў — дружба літаратур // Там жа. 3 кастр.; Глыбей асвятляць узаемасувязі літаратур // ЛіМ. 18 сак.; Юліуш Славацкі: [Да 150-годдзя з дня нараджэння] // Мін. праўда. 4 вер.; Сусветнае значэнне рускай і савецкай культуры // Чырв. змена. 12 крас.

1960. [Уступны артыкул] // Беранжэ П. Выбраныя песні. Мн., 1960; І чуцен голас наш далёка за мяжою // За вяртанне на Радзіму. № 2; Сусветнай культуры яна нясе свой дар // Полымя. № 6; Чэхаў ідзе па свеце // Звязда. 29 студз.; Анры Барбюс — салдат міру: [25 год з дня смерці франц. пісьменніка-камуніста] // Там жа. 30 жн.; Марк Твэн — выкрывальнік Амерыкі «тоўстых» // Там жа. 1 снеж.; Паэт-дэмакрат // ЛіМ. 27 крас.; Аўтар «Рабінзона Крузо»: Да 300-годдзя з дня нараджэння Даніэля Дэфо // Наст. газ. 1 кастр.

1961. Изучение взаимосвязей белорусской и зарубежных литератур // Взаимосвязи и взаимодействие национальных литератур: Материалы дискуссии 11—15 янв. 1961 г. М.; [Уступ] // Твен М. Жанна Д'Арк. Мн.; Голас, сугучны з эпохай // Звязда. 7 мая; Голос острова свободы // Знамя юности. 24 нояб.; Гартаючы даўнія выданні // ЛіМ. 24 сак.; Ставіцца пытанне аб шчасці // Там жа. 28 ліст.

1962. Цудоўны Лопэ /// Маладосць. № 11; Грунтоўнае даследаванне: [Рэц. на кн.: Лиходиевский С. Анатоль Франс. Мн., 1962] // Полымя. № 10; Раман аб носьбітах Праметэева агню // Звязда. 13 студз.; Друк мільёнаў супраць прэсы мільянераў // Там жа. 5 кастр.; Абуджаць волю мільёнаў // ЛіМ. 16 ліст.; Вялікага гарэння! // Там жа. 28 снеж.

1963. Голос Кубы // Неман. № 2; Слова пра венгерскую літаратуру // Звязда. 17 кастр.; Паўпрэд камуны і верша // ЛіМ. 19 ліп.; Новае пра пераклады з Міцкевіча // Там жа. 10 вер.; «Рэбусы» абстракцыянізму // Чырв. змена. 16 мая; «Цуды» боскія і смех чалавечы // Там жа. 19 снеж.

1964. [О кн. И. Н. Голенищева-Кутузова «Гуманизм у восточных славян (Украина и Белоруссия)». М., 1963] // Вопр. лит. № 5; Час Шэкспіра // Полымя. № 4; Вяршыні жыцця // Звязда. 29 лют.; Шэкспір у савецкай школе // Наст. газ. 25 крас.

1965. Уступны артыкул // Замежная літаратура ў перакладзе на беларускую мову. 1917—1963: Бібліяграфія. Мн., 1965; Радужныя масты // Беларусь. № 10; Цудоўнейшая з жанчын: [Рэц. кн кн.: Винаградская П. Жэні Маркс. М., 1964] // Маладосць. № 3; Изучение гуманизма: [Рэц. на кн.: Голенищев-Кутузов И. Гуманизм у восточных славян (Украина и Белоруссия). М., 1964] // Неман. № 5; Пераклады ўзбагачаюць літаратуру // Полымя. № 8; У беларускую Шэкспіріяну: [Рэц. на кн.: Барысава П. Шэкспір на беларускай сцэне. Мн., 1964] // ЛіМ. 12 сак.; Дантэ ў стагоддзях // ЛіМ. 18 мая; Ад Скарыны да нашых дзён // ЛіМ. 16 ліст.

1966. Цікавая знаходка // Маладосць. № 3; Англічане чытаюць беларусаў // Там жа. № 4; Автор «Дон Кихота» // Сев. правда. 25 окт.

1967. Неутомимый путник // Сев. правда. 10 янв.; Литература дней, которые потрясли мир // Там жа. 21 февр.; Слышен голос наш далеко // Там жа. 28 марта.

1.6.

Тимофеева В. А. Мицкевич — великий польский поэт. Мн., 1955 / Рэд.

Библиографический указатель диссертаций БГУ им. Ленина. Мн., 1955 / Рэд.

Мицкевич Б. Шарль де Костер. Мн., 1960 / Рэд.

Бобкова Л. Зарубежная литература в белорусских переводах. Мн., 1965 / Рэд.

2.3.

На беларускай мове. Паседжанне камісіі па крытыцы // ЛіМ. 1948. 1 студз.

На чэшскай мове. Ck. Ctyri pozoruhodni běloruske publikace // Slovansky prehled. 1959. Č 5.

М. П. Барташэвіч.

ФАМІН СЯРГЕЙ

Фамін Сяргей Уладзіміравіч (29.4. 1906, в. Пепелеўка Мсціслаўскага пав. Магілёўскай губ., цяпер Манастыршчынскі р-н Смаленскай вобл.— 4. 12.1941, г. Ярэга, Рэспубліка Комі), паэт.

Паходзіў з сям'і вясковага настаўніка. Скончыў Мсціслаўскую сямігодку, Магілёўскі педтэхнікум (1925). Два гады працаваў настаўнікам на Барысаўшчыне, затым паступіў на літаратурна-лінгвістычнае аддзяленне педфака БДУ. Пасля яго заканчэння (1930) выкладаў беларускую і рускую мову і літаратуру ў Горацкай сельскагаспадарчай акадэміі. Стаў ахвярай сталінскіх рэпрэсій: 4.1.1935 С. Фаміна арыштавалі, праз 4 месяцы прыгаварылі спачатку да расстрэлу, а потым да 10 гадоў пазбаўлення волі. Адбываў пакаранне ў Комі АССР, у Ухтпячлагу НКУС, працаваў у тапаграфічнай партыі. Афармляў там насценгазету, для якой пісаў вершы. Вывучаў італьянскую мову, завучваў на памяць вершы А. Дантэ ў арыгінале. Паўторна арыштаваны ў 1941 у лагеры як удзельнік «дыверсійнай групы», 29 верасня — 2 кастрычніка 1941 над ім адбыўся чарговы суд, і праз 2 месяцы С. Фаміна расстралялі.

Літаратурныя здольнасці С. Фаміна выявіліся даволі рана: яшчэ школьнікам ён дасылаў свае карэспандэнцыі ў мясцовыя газеты (публікацыі не выяўлены). Першыя вершы апублікаваны ў 1924 у газеце «Соха и молот» (на рускай мове). З 1925 пісаў па-беларуску. Тады ж быў прыняты ў «Маладняк», а яго вершы заўважаны крытыкай. Станоўчую ацэнку даў ім у 1926 М. Аляхновіч. Не абмінуў увагай вершы паэта і М. Гарэцкі, які адзначаў іх тэхнічную дасканаласць, дакладную інструментоўку, густ. С. Фамін прыйшоў у беларускую літаратуру на хвалі маладнякоўскай паэзіі, якая несла ў сабе адчуванне рэвалюцыйнага пераўтварэння жыцця і мела свае асаблівасці стылю. У яго вершах гэта бадзёрыя жыццесцвярджальныя рытмы, бурныя пачуцці, шчырае прыняцце і вітанне новых рэалій жыцця, новых ідэалаў і адначасова тонкае адчуванне прыроды, юнакоўская летуценнасць, закаханасць. У 1927 асобным выданнем выйшла паэма С. Фаміна «Балота». Сюжэт яе звязаны з перайначваннем побыту беларускай вёскі на сацыялістычны лад. Паэма напісана ў духу наіўнага «сацыялістычнага рамантызму», калі рытарычна супастаўлялася «старое» і «новае» («балота» і «ружовыя дні»), дэкларацыйна ўслаўляўся новы чалавек — камуніст, арганізатар перамен. Пасля расколу «Маладняка» С. Фамін уваходзіў у пралетарска-сялянскую беларускую літаратурную суполку «Пробліск» (ліпень 1927— студзень 1928). У 1929 ім падрыхтавана і здадзена ў выдавецтва кніга вершаў «Дымнае жыта», але яна тады не выйшла. З 1930 творчая актыўнасць С. Фаміна рэзка знізілася. У друку з'явілася некалькі разгромных публікацый пра яго паэзію. Ён амаль перастаў пісаць і друкавацца. Ёсць звесткі, што паэт тварыў у месцах пазбаўлення волі, некаторыя яго паэтычныя радкі дайшлі адтуль у лістах да родных, былі перададзены з лагера на волю, а пасля вайны дайшлі да сястры паэта. Перакладаў з украінскай мовы вершы У. Сасюры. Уласныя вершы С. Фаміна перакладзены на рускую і ўкраінскую мовы. *І. Э. Багдановіч, Г. Ф. Юрчанка.*

Бібліяграфія

1.2.

Балота: Паэма. Мн., 1927. Рэц.: Глыбоцкі Т. З літаратурных краёў // Чырв. змена. 1927. 13 вер.

Дымнае жыта: Вершы, паэмы, пераклады. Мн., 1991.

1.3.

1924. Седьмой Октябрь; Заключенным братьям: [Вершы] // Соха и молот. 7 нояб.

1925. Вясновае: [Верш] // Маг. селянін. 25 лют.; З паэмы «Родная даль» // Там жа. 21 мая; Смена: [Верш] // Соха и молот. 14 марта.

1926. «А ты, восень, дзіўная восень!..» // Сталёвы ўзлёт. Мн.; «Растапталіся цяжкія боты...»: [Верш] // Маладняк. № 5; «Калыхнулася месяца сінь...»: [Верш] // Там жа. № 7—8; Ноч (Сястры Раі); «Я бачыў вас даўно. І многа праляцела...»: [Вершы] // Маладняк Барысаўшчыны. № 1; Далёкай вясной; «Ой, звіні ў палях, жалейка...»: [Вершы] // Малады араты. № 12; «Растлумач, дарагая загадку...»; «Як твае — яе русыя косы...»: [Вершы] // Чырв. сейбіт. № 5; «Зноў я пабачу сялянскія хаты...»: [Верш] // Сав. Бел. 28 лют.; «Пакаціліся ў гай адгалоскі...»: [Верш] // Там жа. 30 мая; Вясна адыходзіла садам: [Верш] // Там жа. 20 чэрв.; «Восень зноў...»: [Верш] // Там жа. 5 вер.; «Разлілася рэчка, зазванілі хвалі...»: [Верш] // Чырв. змена. 3 снеж.

1927. «Да цябе я сягоння прыду...»: [Верш] // Чырв. сейбіт. № 6—7; Ліст да хлопцаў: [Верш] // Там жа. № 18—19; Шлях студэнцтва. № 2—3; Вясна: [Верш] // Шлях студэнцтва. № 6—7; «Ціха дзед на печы моліцца...»: [Верш] // Звязда. 11 вер.; Восень: [Верш] // Там жа. 18 вер.; Кастрычнік: [Верш] // Там жа. 30 кастр.; «...У душы маёвыя агні і навальніцы...»: [Верш] // Там жа. 13 ліст.; «...За вакном задыхаецца вецер...»: [Верш] // Там жа. 4 снеж.; Ноч: [Верш] // Сав. Бел. 25 снеж.; «Сёння ночка ласкава...»: [Верш] // Чырв. змена. 15 мая; «Перазвонамі стазвоннымі...»: [Верш] // Там жа. 10 ліст.; «Раніцы добрай, пасёлак...»: [Верш] // Там жа. 1 снеж.

1928. Ростань: [Верш] // Літ. дад. да газ. «Сав. Бел.». № 2; Красавік: [Верш] // Там жа. № 4; «Быў стары маёнтак, а цяпер камуна...»: [Верш] // Там жа. № 8; «Гэта так было...»; «Я прыехаў на працу настаўнікам...»: [Вершы] // Там жа. № 16; «Пагубляла рубіны рабіна...»: [Верш] // Там жа. № 17; З нізкі вершаў «Дымнае жыта» // Там жа. № 19; «Адцвітаў заход па-над вадою...»; «Сіняй ноччу, у месячную замяць...»: [Вершы] // Маладняк. № 3; Агні зараніц: [Верш] // Там жа. № 4; Зашумела шоўкам лісце шолах-гліца...: [Верш] // Там жа. № 5; «Пад звон сярпоў...»: [Верш] // Там жа. № 6; Хадок: [Верш] // Працаўнік асветы. № 1; Развітанне: [Верш] // Чырв. сейбіт. № 11; Прыяцель: [Верш] // Звязда. 25 ліст.; Чырвоны ордэн: [Верш] // Сав. Бел. 23 лют.; «Закруцілася замяць начою...»: [Верш] // Там жа. 17 чэрв.; «Палі, палі...»: [Верш] // Чырв. змена. 25 ліст.

1929. На першай парошы: [Верш] // Паляўнічы Бел. № 1; У калгасе: [Верш] // Полымя. № 10; «Месяц плыў і раптоўна згас...»: [Верш] // Там жа. № 11—12; Нашы дні: [Верш] // Прафрух Бел. № 8; За новыя дні: Урывак з паэмы // Сав. Бел. 13 кастр.; Дарогу вялікай машыне: [Верш] // Чырв. змена. 18 ліст.

1930. «Туманамі залачонымі...»: [Верш] // Полымя. № 5—6.

1932. Мінск: [Верш] // Беларусь калгасная. № 8; Наш крок: [Верш] // Маладняк. № 1.

1934. Красавік: [Верш] // ЛіМ. 28 сак.

1961. Развітанне: [Верш] // Анталогія беларускай паэзіі: у 3 т. Мн. Т. 2.

1971. Развітанне: [Верш] // Універсітэт паэтычны. Мн.

1.4.

1928. Сасюра У. З паэмы «Сягоння» / З укр. // Літ. дад. да газ. «Сав. Бел.». № 8; Яго ж. «Гаманіць у час апошні — не стану...» [Верш] / З укр. // Там жа. № 9; Яго ж. Сягоння: Паэма / З укр. // Там жа. № 11; Яго ж. Ізноў: [Верш] / З укр. // Сав. Бел. 8 крас.

1.5.

На рускую мову. «Мы помним все двадцатый и пожары...»: Из поэмы «Страна ударная» / Пер. М. В — а // Рабочий. 1930. 10 июля; На выставке: [Верш] / Пер. М. В—а // Там жа. 10 авг.

На ўкраінскую мову. Болота: (Фрагменти з поеми) / Пер. У. Кулик // Нова Білорусь. К., 1929.

2.3.

На беларускай мове. Аляхновіч М. Маладняк // Маладняк Барысаўшчыны. 1926. № 1; Яго ж. На аванпостах пралетарскай літаратуры (1920—1930) // Маладняк. 1930. № 6—7; Бука. У нагу з жыццём // Сав. Бел. 1930. 9 лют.; Гарэцкі М. «Маладняк» за пяць гадоў. 1923—1928 // Максім Гарэцкі: Успаміны, артыкулы, дакументы. Мн., 1984. С. 292—293; Палын. Беларускія паэты ў вёсцы // Маг. селянін. 1925. 5 мая; Пісьменнікі Савецкай Беларусі: Кароткі даведнік. Мн., 1981.

На рускай мове. Наши пролетарские писатели в Смоленске // Рабочий. 1930. 14 янв.

2.4.

На беларускай мове. Падабед Я. Сяргею Фаміну: [Верш] // Звязда. 1927. 20 ліст.

На рускай мове. Скрыган Я. Сергей Фомин и еще некто: Рассказ / Пер. И. Кононец // Неман. 1981. № 12.

У. М. Ларчанка.

ФАРБОТКА ЮЗЮК

Фарботка Юзюк [Язэп Аўгусцінавіч; крыпт.: Ф. І., І. Ф., Ю. Ф., Ю. Ф-ко, Ф. Ю., F. J.; 23. 8(4.9).1893, в. Налібакі Мінскага пав. Мінскай губ., цяпер Стаўбцоўскі р-н Мінскай вобл.— 1945 (?)], паэт, літаратуразнавец, перакладчык, удзельнік грамадска-культурнага руху Беларусі пачатку XX ст.

Біяграфічныя звесткі пра Ю. Фарботку даволі скупыя. Вядома, што ён, закончыўшы ў 1914 Мінскую гімназію, працягваў навучанне на фізіка-матэматычным факультэце Кіеўскага універсітэта (1914—18). У гады першай сусветнай вайны на фронце загінуў яго родны брат. Знаходзячыся на Украіне, паэт не губляў сувязяў з Радзімай — рэгулярна наведваў Мінск, перапісваўся і сустракаўся з вядомымі беларускімі культурна-грамадскімі дзеячамі Ядвігіным Ш., А. Бурбісам, З. Верас, З. Бядулем, А. Паўловічам (стаў яго зяцем) і інш. У 1916 актыўна ўключыўся ў работу мінскага культурна-патрыятычнага згуртавання «Беларуская хатка». У складзе акцёрскага калектыву выступаў на сцэне «Беларускага савецкага тэатра» (1919), працаваў адміністратарам Беларускага тэатра ў Мінску (1920). Нейкі час быў супрацоўнікам літаратурна-выдавецкага аддзела Народнага камісарыята асветы Літоўска-Беларускай ССР (Мінск, Бабруйск). У міжваенныя гады Ю. Фарботка, паводле ўскосных звестак, жыў у Польшчы, займаўся навуковай дзейнасцю. Месца і дакладная дата яго смерці не ўстаноўлены.

Першы верш Ю. Фарботкі «Зраўнаваў...» быў надрукаваны ў газеце «Наша ніва» ў 1912. Асудзіў антынародны характар першай сусветнай вайны у вершах «Цёмна ноч», «Санет», «Зноў вясна...». Творчасць Ю. Фарботкі прасякнута болем за цяжкі лёс роднай краіны, верай ў лепшую будучыню беларускага народа («Роднаму краю», «Малітва»). Паэт арыентаваўся пераважна на вопыт М. Багдановіча, з якім, па некаторых звестках, быў асабіста знаёмы: паспяхова авалодваў яго версіфікатарскай сістэмай, стварыў шэраг санетаў і трыялетаў. На заўчасную смерць свайго літаратурнага настаўніка адгукнуўся глыбокаэмацыянальным вершам-санетам «Памяці Максіма Багдановіча» (1918). У паслякастрычніцкі час выступаў у перыёдыцы з матэрыяламі пра ўнармаванне беларускага правапісу; у літаратурна-крытычным артыкуле «Згукі сусветнай вайны 1914—1918 гадоў у беларускай паэзіі» падкрэсліў антываенны характар многіх лепшых твораў беларускай паэзіі. У 1920 апублікаваў літаратурна-гістарычны нарыс «Беларусь у песнях», дзе паспрабваў даследаваць узаемасувязі беларускай паэзіі з нацыянальна-вызваленчай барацьбой народа.

М. А. Варвашэвіч.

Бібліяграфія

1.2.

Беларусь у песнях: Літаратурна-гістарычны нарыс. Мн., 1920. Рэц.: С. // Бел. жыццё. 1920. 11 сак.

1.3.

1912. Зраўнаваў...: [Верш] // Н. н. 30 жн. / Пад крыпт. І. Ф.

1914. «Баліць душа мая і сэрца цяжка б'ецца...»: [Верш] // Лучынка. № 4 / Пад крыпт. Ю. Ф.; Май: [Верш] // Там жа. № 5 / Пад крыпт. Ю. Ф.; Малітва: [Верш] // Беларус. 13 жн. / Пад крыпт. Ф. І.; Ад паветра, голаду, агню і вайны...: [Верш] // Там жа. 21 жн. / Пад крыпт. Ф. І.; «Падаўжэў ужо дзень і настала

цяпло...»: [Верш] // Н. н. 27 сак. / Пад крыпт. Ю. Ф.

1915. Памяці забітага брата: Санет // Беларус. 5 сак. / Пад крыпт. І. Ф.; Цёмна ноч: (Ахвярам вайны): [Верш] // Там жа. 4 чэрв. / Пад крыпт. І. Ф.; «Зноў вясна... Зноў зялёны бярозавы гай!..»: [Верш]; Гадаўшчына літоўскай пісьменніцы Жыгмонт // Н. н. 12 чэрв. / Пад крыпт. Ю. Ф.; У маёвую ноч: [Верш] // Там жа. 25 чэрв. / Пад крыпт. Ю. Ф.

1916. Санет: А. Зязюлю: [Верш] // Светач. 31 снеж. / Пад крыпт. І. Ф.

1917. Варта падумаць // Вольная Беларусь. 11 чэрв. / Пад крыпт. Ю. Ф.

1918. «Ці задумалась ты, хоць парой...»: [Верш] // Бел. шлях. 25 крас. / Пад крыпт. Ю. Ф.; «У маёвую ноч...»: [Верш] // Там жа. 11 мая / Пад крыпт. Ю. Ф.; «Рокат грому навальніцы...»: [Верш] // Там жа. 6 чэрв. / Пад крыпт. Ю. Ф.; «Каб я вольным арлом цяпер быў...»: [Верш] // Там жа. 9 чэрв. / Пад крыпт. Ю. Ф.; «Ось здаецца зноў я бачу родны гоні...»; «Я хацеў бы застыць...»; «Быццам восенню краскі ў полі...»; «Ой, далёка вы, родныя нівы, лугі...»; «Рокат грому навальніцы...»; Усход сонца; Памяці Максіма Багдановіча: [Вершы] // Бел. эхо. № 4; Беларусь у песнях // Там жа. 30 вер. / Пад крыпт. Ю. Ф-ко.

1919. Згукі сусветнай вайны 1914—1918 гадоў у беларускай паэзіі // Шк. и культура Сов. Бел. № 1 (Бел. аддзел) / Пад крыпт. Ф-ко Ю; Сумна неяк: [Верш] // Бел. жыццё. 25 ліст.; «Летня ночка. Шлях між лесу...»: [Верш] // Там жа. 12 снеж. / Пад крыпт. Ю. Ф.; Звон: [Верш] // Звон. 27 жн. / Пад крыпт. Ю. Ф.; Роднаму краю: [Верш] // Там жа. 1 вер. / Пад крыпт. Ю. Ф.

1927. Звон; Роднаму краю; Сумна неяк; «Падаўжэў ужо дзень і настала цяпло...»: [Вершы] // Дварчанін І. Хрэстаматыя новай беларускай літаратуры (ад 1905 года). Вільня.

1.4.

1912. Зацменне (Вольны пераклад з Бенедзіктава): [Верш] / З рус. // Н. н. 19 крас. / Пад крыпт. І. Ф.

2.3.

На беларускай мове. Гарэцкі М. Фарботка Я. // Гарэцкі М. Гісторыя беларускае літаратуры. Вільня, 1920.

3.1.

ЦНБ АН Беларусі, аддз. рукап., ф. 5, воп. 1, адз. зах. 1, с. 309. *У. М. Ларчанка.*

ФАТНЕЎ ЮРЫЙ



Фатнеў Юрый Сяргеевіч (н. 10.2.1938, с. Акімаўка Краснашчокаўскага р-на Алтайскага краю), паэт, празаік. Член СП Беларусі з 1967. Піша на рускай мове.

Нарадзіўся ў сям'і ваеннага. Бацьку часта пераводзілі па службе, з ім пераязджала і сям'я. У 1941 бацьку перавялі ў Беларусь. У час вайны сям'я Фатневых жыла ў в. Старыя Дзятлавічы Гомельскага р-на. У 1944 Ю. Фатнеў знаходзіўся ў вайсковай часці, дзе служыў яго бацька (г. Роўна). Цяжка хварэў. Больш як дзесяць гадоў праляжаў у бальніцах Беларусі, Казахстана. Жыў на пчэльніку ў гарах Алатау. У школе вучыўся ўрыўкамі, калі выходзіў з бальніцы. У 1967 пераехаў у Гомель, потым жыў у Бранску (1970—85), у Гатчыне пад Ленінградам (1985—90). Цяпер жыве ў Гомелі.

У 1955 у друку з'явіўся першы верш Ю. Фатнева «Расія», апублікаваны ў Стаўбцоўскай раённай газеце «Голас селяніна». Яго вершы пачалі друкавацца ў часопісе «Советская Отчизна», газетах «Зорька», «Гомельская праўда», «Знамя юности» і інш. Ю. Фатневу часта пасылаў лісты С. Маршак, які падтрымліваў пачынаючага аўтара. Выдаў зборнікі вершаў (першыя з іх выйшлі ў Алма-Аце) «Любімае», «Агульны вагон», «Вочы не ўмеюць маўчаць», «Спявае ражок каля Сожа», «Лірыка», «Дзень прасвятлення», «Месячны час», «Вогнішча на прыстані». Вершы Ю. Фатнева перакладаліся на беларускую мову, некаторыя пакладзены на музыку, сталі песнямі. *Л. С. Савік.*

1.2.
Любимое: Стихи. Алма-Ата, 1962.
Общий вагон: Стихи. Алма-Ата, 1964.
Глаза не умеют молчать: Стихи. Алма-Ата, 1966.
Поет рожок у Сожа: Стихи. Мн., 1967. Рэц.: Г а ў р ы л к і н Л. Добры падарунак паэта // Гомел. праўда. 1967. 15 кастр.
Лирика. М., 1970.
День прозрения: Стихи и поэмы. М., 1978.
Костер на пристани: Стихи. М., 1983.
Лунный час: Стихи. Тула, 1983.
1.3.
1959. «Сухие мётлы камыша...»; На пасеке: [Вершы] // Сов. Отчизна. № 2.
1960. Камешки: Сказка // Зорька. 2 июля.
1962. Подснежник: [Верш] // Гомел. праўда. 31 кастр.
1965. Здравствуй, день мой!: [Верш] // Гомел. праўда. 17 ліст.
1966. Мартовский снежок: [Верш] // Гомел. праўда. 20 сак.; Дятловичи Старые мои; Зоренька; Дорога: [Вершы] // Там жа. 22 кастр.; Душа природы: [Верш] // Там жа. 12 ліст.; Как много на свете друзей: [Вершы] // Знамя юности. 13 янв.; Человек; Ласточка; Кукушка: [Вершы] // Там жа. 6 февр.; Мне двадцать семь: [Верш] // Там жа. 1 июня; Из поэтической тетради: «До всего мне в мире этом дело...»; Шофер // Там жа. 7 июня; Вьетнамскому другу; Пределы: [Вершы] // Там жа. 4 окт.; Дали: [Верш] // Там жа. 2 нояб.; Берестяной рожок: Сказка // Зорька. 22 янв.; Сельские откосы; Поет рожок у Сожа: [Вершы] // Сел. газ. 27 апр.; Ветер Беларуси: [Верш] // Там жа. 3 июля.
1967. «Хотел писать о зареве пожара...»; Общий вагон; Осенние стога: [Вершы] // Неман. № 6; Мальчишки смотрят на закат; «Сжимает век планету в кулаке...»; «Постучалась. В комнату скользнула...»: [Вершы] // Знамя юности. 28 марта; Гонец; Русская печь: [Вершы] // Там жа. 29 нояб.; «Вновь сосны стали розоватыми...»; «Дубы, высоких сосен рать...»; «Хотел писать о зареве пожара...»: [Вершы] // Сов. Бел. 15 июля.
1968. В старых Дятловичах; Костер у Сожа; «Плывут в ромашках городишки...»: [Вершы] // Гомел. праўда. 12 кастр.; Пятьдесят этажей: [Верш] // Там жа. 28 снеж.; «Уходили солдаты...»; «Где бродит лось с лосихою...»: [Вершы] // Знамя юности. 18 дек.
1969. Ленин в ссылке: [Верш] // Гомел. праўда. 25 студз.; З той памятнай ночы...: [Рэц. на кн.: К о в а л е в Д. Озимь. М., 1968] // Там жа. 1 сак.; Тропинка в Белорусь: [Верш] // Там жа. 29 мая; Кораблик: [Верш] // Там жа. 31 мая; «Край партизанский, дорогой...»; Общий вагон: [Вершы] // Знамя юности. 17 июля; Тревога: [Верш] // Там жа. 2 сент.; Это Родиной зову; Поет рожок у Сожа: [Вершы] // Там жа. 3 окт.; Стадо: [Верш] // Сел. газ. 14 марта.
1970. С Новым годом!: [Верш] // Гомел. праўда. 1 студз.; На родине: [Верш] // Там жа. 19 вер.
1971. Новогоднее: [Верш] // Гомел. праўда. 9 студз.; Клятва: [Верш] // Там жа. 3 ліп.; Николай Островский: [Верш] // Знамя юности. 12 марта; Добруш; «Снова белится Ново-Белица...»: [Вершы] // Там жа. 23 апр.; «Дрожат сердечною дрожью...»: [Верш] // Там жа. 1 мая; Аисты: [Верш] // Там жа. 8 окт.
1972. Буровики: [Верш] // Гомел. праўда. 9 вер.; Мой мир: [Верш] // Знамя юности. 24 нояб.
1973. Горит костер...: [Верш] // Гомел. праўда. 17 лют.; Кино: [Верш] // Там жа. 28 ліп.; Как закалялась сталь: [Верш] // Знамя юности. 23 мая.
1974. «Над Беларусью аисты...»: [Верш] // Гомел. праўда. 12 студз.; Далекий вечер: [Верш] // Там жа. 30 сак.; Шорс: [Верш] // Там жа. 10 жн.
1975. Лукошко солнечных зайчиков: [Апавяданне] // Зорька. 25 июля.
1.5.
На беларускую мову. Маё прывітанне; «Я жыву на Зямлі...»: [Вершы] / Пер. М. Мятліцкі // ЛіМ. 1978. 28 ліп.
2.3.
На беларускай мове. Зберажоныя фарбы // ЛіМ. 1984. 5 кастр.

В. М. Грышкевіч.

ФЕДАРОЎСКІ МІХАЛ



Федароўскі Міхал Адольфавіч [псеўд. Bohusz, M. Bohusz, Boruta, Kaszuba, Kaszubiak, O. Michał, Michał z Kosina, Ojciec Michał, Michał Poleski, Żegota; крыпт. M. F., M. I. F., M. W. F.; 23.8(1.9).1853, Варшава — 10.6. 1923, Варшава; пахаваны на Павонзкаўскіх могілках], збіральнік і даследчык духоўнай і матэрыяльнай культуры беларускага і польскага народаў, фальклярыст, археолаг, этнограф.

Фіглоўская Любоў Іванаўна (30.9.1908, м. Пятровічы Клімавіцкага пав. Магілёўскай губ., цяпер Шумяцкі р-н Смаленскай вобл.— 13.10.1979, г. Мінск; пахавана на Паўночных могілках), літаратуразнавец. Доктар філалагічных навук (1957). Прафесар (1960).

Нарадзілася ў сялянскай сям'і. Бацька, Іван Іларыёнавіч, займаўся цяслярнымі работамі. У 1922 Л. Фіглоўская паступіла ў Мсціслаўскі педтэхнікум (у 1924 тэхнікум перавялі ў Магілёў), які скончыла ў 1925. У 1925—27 працавала ў пачатковай школе в. Каплічы Мазырскай акругі. У 1927—30 студэнтка літаратурна-лінгвістычнага аддзялення БДУ. У 1930—33 аспірантка Інстытута мовы, літаратуры і мастацтвазнаўства АН БССР. Пасля заканчэння аспірантуры — старшы навуковы супрацоўнік гэтага інстытута (1933—41), у 1941—42 дырэктар і выкладчыца рускай мовы і літаратуры сярэдняй школы на станцыі Васільева Татарскай АССР. У 1942—44 і ў 1946—48 зноў старшы навуковы супрацоўнік Інстытута мовы, літаратуры і мастацтвазнаўства АН БССР; у 1944—46 яго вучоны сакратар. У 1948—51 дактарант Інстытута сусветнай літаратуры АН СССР. У 1952—54 загадвала сектарам беларускай савецкай літаратуры Інстытута мовы, літаратуры і мастацтвазнаўства АН БССР. Акрамя таго, з 1933 працавала па сумяшчальніцтве дацэнтам кафедры рускай літаратуры Мінскага педінстытута. З 1957 прафесар літаратуры, з 1959 загадчык кафедры літаратуры ў Мінскім Інстытуце замежных моў, з 1960 — кафедры рускай літаратуры БДУ. Выбіралася дэпутатам Мінскага гарадскога Савета. Узнагароджана ордэнамі «Знак Пашаны», Працоўнага Чырвонага Сцяга, медалём, Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР.

Друкавацца пачала ў 1931. Увага даследчыцы была засяроджана на розных пытаннях гісторыі літаратуры, творчасці Я. Купалы, Я. Коласа, К. Чорнага, К. Каганца, М. Шолахава, Л. Сейфулі-

най. Аўтар манаграфіі «Творчасць Якуба Коласа», адзін з аўтараў падручнікаў для 8-га класа і для 9—10-га класаў «Беларуская літаратура», «Нарысы гісторыі беларускай савецкай літаратуры» і інш. Распрацоўвала спецкурсы для студэнтаў універсітэта «Руская сучасная проза», «Руская савецкая проза на сучасным этапе» (з І. Лушчыцкай). Падрыхтавала рукапіс семінарыя «Якуб Колас» (1973).

Л. М. Гарэлік.

Бібліяграфія

1.2.

Беларуская літаратура: Для 8 класа. Выд. 1—10. Мн., 1949—58 / У сааўт.

Беларуская літаратура: Для 9—10 класаў. Выд. 1—9. Мн., 1949—58 / У сааўт.

Творчество Якуба Коласа: Автореф. дис. ... докт. филол. н. М., 1956.

Творчасць Якуба Коласа. Мн., 1959. Рэц. А. Д. // Рад. літ.-знавство. 1960. № 4; Андрыенка В. Грунтоўнае даследаванне // Наст. газ. 1960. 5 студз.; Куляшоў Ф. Каштоўная і патрэбная манаграфія // Полымя. 1960. № 1; Маслоўскі А. Вывучаючы творчасць Коласа... // ЛіМ. 1959. 11 ліст.; Міхалап Я. З любоўю да народнага паэта // Гомел. праўда. 1959. 17 ліст.; Пятровіч М. Кніга народнага песняра // Звязда. 1959. 2 кастр.; Шкраба Р. Калі гаварыць шчыра // Полымя. 1960. № 1.

Вялікі беларускі пісьменнік — Якуб Колас: (Да 90-годдзя з дня нараджэння). Мн., 1972.

Выдающийся писатель современности: (К 70-летию со дня рождения М. А. Шолохова). Мн., 1975 / Сааўт. Н. Рамашка.

1.3.

1931. [Рэц. на кн.: Броўка П. Цэхавыя будні. Мн., 1931; Ягож. Гады як шторм. Мн., 1930] // Маладняк. № 10.

1934. На шляху да рэалізма // ЛіМ. 18 жн.

1935. [Рэц. на кн.: Вольскі В. Сучасныя праблемы беларускай савецкай драматургіі. Мн., 1934] // Зап. Бел. АН. № 4.

1937. Паэзія дарэвалюцыйнай «Правды» // Полымя рэвалюцыі. № 5.

1938. Бессмяротны геній // Звязда. 18 чэрв.; Вялікі паэт сацыялізма // Там жа. 18 ліп.; Народны пісьменнік // Там жа. 22 снеж.; А. С. Серафімовіч: Да 75-годдзя з дня нараджэння // ЛіМ. 27 студз.

1939. Новыя матэрыялы аб беларускай літаратуры XIX ст. // Калоссе. № 3; ЛіМ. 9 сак. / Сааўт. М. Ларчанка.

1940. Пятрусь Броўка // Броўка П. Вершы і паэмы. Мн.; Женщина в советской литературе // Уч. зап. каф. лит-ры и языка Мин. гос. пед. ин-та. Мн. Вып. 1; Змітрок Бядуля // Звязда. 5 кастр.; Писатель-большевик: (К 4-й годовщине со дня смерти Н. А. Островского) // Сов. Бел. 22 дек.

1941. Сборник хороших рассказов // Сов. Бел. 11 марта.

1944. Кузьма Чорны // Беларусь. № 3.

1945. Вялікі паэт-патрыёт // Беларусь. № 6; Змітрок Бядуля // Там жа. № 7—8; Радзіма і народ у творчасці Янкі Купалы // Полымя. № 7—8.

1946. Карусь Каганец // Беларусь. № 1; Творчасць Якуба Коласа ў дні вайны і перамогі // Полымя. № 4; Пясняр народа // Работніца і сялянка. № 4—5; Якуб Колас — лауреат Сталинской премии // Сов. Бел. 10 июля.

1947. Змітрок Бядуля (1886—1941) // Бядуля Зм. Паэмы. Мн.

1948. Творчасць Якуба Коласа ў гады Вялікай Айчыннай вайны // Матэрыялы сесіі Акадэміі навук БССР па аддзяленню грамадскіх навук. Мн.; Основоположник советской литературы // Сов. Бел. 28 марта / Сааўт. К. Казлова.

1950. Неапублікаваныя творы Якуба Коласа // ЛіМ. 22 крас. / Сааўт. А. Семяновіч.

1952. Якуб Колас: К 70-летию со дня рождения // Лит. в школе. № 5; Якуб Колас — основоположник белорусской художественной прозы // Известия АН БССР. № 6; Народны паэт // Наст. газ. 13 ліст.

1954. Якуб Колас; Кондрат Крапива // Очерк истории белорусской советской литературы. М.

1956. Вялікі сын беларускага народа — Якуб Колас // Камуніст Бел. № 6; Змітрок Бядуля // Наст. газ. 1 ліст.

1957. Особенности реализма Я. Коласа // Сов. Бел. 19 нояб.

1958. Паэма Якуба Коласа «Сымон-музыка» // Беларуская літаратура. Мн. Вып. 1; Каштоўнае даследаванне // Звязда. 15 чэрв. / Сааўт. П. Глебка.

1959. Выдатны твор беларускай савецкай прозы // Беларуская літаратура. Мн. Вып. 2.

1967. Проблема положительного героя в творчестве Сейфуллиной 20-х годов // Материалы межвузовской научной конференции по проблемам теории и истории белорусской и русской литератур. Мн. / Сааўт. В. Андрыенка.

1968. Автобиографическая трилогия М. Горького и роман Я. Коласа «На ростанях» // Доклады межвузовской научной конференции, посвящ. 100-летию со дня рождения А. М. Горького. Мн.; М. Горький и Я. Колас // М. Горький и вопросы литературы. Мн.; Проблема характера нового человека в творчестве Л. Н. Сейфуллиной 20-х годов // Октябрь и художественная литература. Мн. / Сааўт. В. Андрыенка.

1971. По законам Ленинской дружбы: (Белорусская тема в русской советской литературе) // В. И. Ленин и художественная литература. Мн. / Сааўт. В. Андрыенка.

1972. Аўтабіяграфічная трылогія М. Горкага і трылогія Я. Коласа «На ростанях». Мн.; Содружество советских народов, содружество братских литератур // Веснік БДУ. Сер. 4. № 3 / Сааўт. В. Андрыенка; Брацкая дружба навекі з'яднала // Вяч. Мінск. 3 ліст.; Магутны талент // Наст. газ. 1 ліст.

1975. Могучий народный талант // Веснік БДУ. Сер. 4. № 2 / Сааўт. Н. Мажэйка; Уладар народных дум / Наст. газ. 24 мая / Сааўт. Н. Рамашка, Н. Мажэйка.

1977. Содружество советских народов, содружество братских литератур // Великий Октябрь и художественная литература. Мн. / Сааўт. В. Андрыенка; Михаил Шолохов и Иван Мележ // Тыпалогія славянскіх моў і ўзаемадзеянне славянскіх літаратур. Мн.

1978. Проблема народного характера в советской прозе о деревне 60—70-х годов // Методологические проблемы истории и теории литературы. Вильнюс.

1980. Народный характер: (Тетралогия Ф. Абрамова, «Ивушка неплакучая» М. Алексеева) // Современные проблемы советской литературы. Мн.

1.5

На балгарскую мову. Максим Горки и Якуб Колас // Език и литература. 1970. № 3.

На польскую мову. Mikołaj Ostrowski // Orka. 1937. 7 marca.

1.6.

Беларуская літаратура XIX ст. Мн., 1940 / Скл. з В. Барысенкам і М. Ларчанкам.

Беларуская літаратура XIX стагоддзя: Зборнік тэкстаў. Мн., 1950 / Скл. з В. Барысенкам і М. Ларчанкам.

Литература и время: Сборник статей. Мн., 1970 / Рэд. з інш.

В. И. Ленин и художественная литература: Сборник статей. Мн., 1971 / Рэд. з інш.

Великий Октябрь и художественная литература. Мн., 1977 / Рэд. з інш.

Современные проблемы советской литературы. Мн., 1980 / Рэд. з Н. Рамашка.

2.3.

На беларускай мове. Барысенка В. Ідэйныя скажэнні ў асобных артыкулах крытыкаў і літаратуразнаўцаў // ЛіМ. 1948. 17 студз.; Віцьбіч Ю. Коўзанне па паверхні гісторыі // Там жа. 1939. 23 мая; Грэмка М. У дапамогу настаўніку // Там жа. 1946.

22 чэрв.; З а п р ы н ц ы п о в у ю і дзейсную крытыку // Там жа. 1946. 20 ліп.; З а х а р а в а В. Л. І. Фіглоўская: (Да 60-годдзя з дня нараджэння) // Веснік БДУ. Сер. 4. 1969. № 1; К у д р а ў ц а ў І. «А воз і сёння там...» // ЛіМ. 1947. 17 снеж.; Л у п а ч Д. Прафесар Любоў Іванаўна // Чырв. змена. 1971. 30 кастр.; М у ш ы н с к і М. Беларуская крытыка і літаратуразнаўства: 40-я — першая палавіна 60-х гадоў. Мн., 1985. С. 256—257; Н я х а й Р. Некаторыя заўвагі да падручніка па беларускай савецкай літаратуры // ЛіМ. 1949. 19 ліст.; С а д о ў с к і Я. Савецкі вучоны: Навуковы работнік АН БССР Л. І. Фіглоўская // Работніца і калгасніца Бел. 1939. № 4; С а м у с е н к а в а Р. Самая звычайная // Работніца і сялянка. 1967. № 5; С і н е н к а Г. Шчодрае сэрца // Наст. газ. 1978. 1 ліст.

Г. І. Рэут.

ФІЛІМОНАВА ЛЮБОЎ

Філімонава Любоў Аляксандраўна (н. 12.10.1948, Мінск), паэтэса, празаік, перакладчык. Член СП Беларусі з 1982. Піша на беларускай і рускай мовах.

Нарадзілася ў сям'і служачых. Бацька яе, Аляксандр Андрэевіч, гісторык, Герой Савецкага Саюза. У час вучобы ў 10-м класе Л. Філімонава наведвала літаб'яднанне пры СП Беларусі. Пасля заканчэння аддзялення мастацкага перакладу Літаратурнага інстытута ў Маскве (1971) была рэдактарам на тэлебачанні ў Омску (1971—72). У 1972 вярнулася ў Мінск. Працавала рэдактарам выдавецтва «Мастацкая літаратура» (1972—81). З 1981 літкансультант часопіса «Неман». З 1985 на творчай працы.

Першыя вершы Л. Філімонавай з'явіліся ў друку ў 1967 (на рускай мове). З 1972 піша па-беларуску. Выйшлі яе зборнікі паэзіі «Стазвоны», «Гучныя фарбы», «Імправізацыя». Спрабуе сілы ў эпіцы (паэма «Саната Чурлёніса»). Піша апавяданні (кніга «Пад шолах ветразяў»), дзе арганічна спалучаюцца лірызм і гумар. Героі твораў Л. Філімонавай — нашы сучаснікі: пераважна гараджане, людзі нялёгкага жыццёвага і творчага лёсу. Яны захапляюцца мастацтвам, шукаюць сваё месца ў жыцці, багатыя інтэлектам. Л. Філімонава перакладае на беларускую і рускую мовы творы англійскіх, грузінскіх, польскіх, туркменскіх, французскіх пісьменнікаў. Яе вершы і апавяданні перакладзены на літоўскую і рускую мовы.

Жыве ў Мінску.

Л. С. Савік.

Бібліяграфія

1.2.

Стазвоны: [Вершы і паэма]. Мн., 1974. (Першая кніга паэта).

Гучныя фарбы: Вершы. Мн., 1978. Рэц.: Ч а б а н Т. Насустрач сабе // Маладосць. 1979. № 10.

Пад шолах ветразяў: Апавяданні. Мн., 1981. Рэц.: В а с ю ч э н к а П. Насустрач свайму караблю // ЛіМ. 1982. 25 чэрв.

Імправізацыя: Вершы, паэма. Мн., 1988.

1.3.

1967. «Босиком пойду за клюквой...» [Верш] // Сельская молодежь. № 9.

1968. «Меня задумали летящей...»: [Верш] // Знамя юности. 13 июня.

1969. «В молчанье начало...»: [Верш] // Дзень паэзіі — 69. Мн.; Первые стихи: «Вольный ветер, горный ветер...»; «Босиком пойду за клюквой...» // Неман. № 3; «Не в награду...»; «Играй, мой скрипач...»: [Вершы] // Авиатор Тюмени. 23 июля; «От моей оседлости...»: [Верш] // Красный Север. 19 июля. [г. Саляхард].

1970. В пути: «Я улетаю снова...»; «Нет меня на белом свете...»; «Я жду: войдешь...»: [Вершы] // Неман. № 7; Камень: Рассказ // Там жа. № 9; «Счастье цвета счастливого...» // Там жа. № 11.

1972. «Трапяткія бярозы...»; «Надзея да паэта...»: [Вершы] // Чырв. змена. 3 вер.

1973. «Стаміўся дом...»; «Здрада — чорная пляма...»: [Вершы] // Дзень паэзіі — 73. Мн.; Творчы пошук: Гумарэска // ЛіМ. 16 ліст.

1974. «Птушкі поўначы...»; Чалавек: [Вершы] // Дзень паэзіі — 74. Мн.; Жыццё маё — гэта Чурлёніяна...: [Верш] // Беларусь. № 4; З адзнакаю лірычнасці: [Рэц. на кн.: С к у р к о І. Бацькоўскі парог. Мн., 1973] // Там жа. № 7; Паралельная прамая: Апавяданне //

Маладосць. № 3; Споведзь; «Далёка ўжо...»; «Чырвоны сон, чырвоны сон...»: [Вершы] // Полымя. № 8; Саната Чурлёніса: Урывак з муз. паэмы // Работніца і сялянка. № 9; Чалавек: [Верш] // Чырв. змена. 12 сак.

1975. Снягурка; Восеньскі вырай: [Вершы] // Дзень паэзіі — 75. Мн.; Надзея (Памяці М. Багдановіча): [Верш] // Беларусь. № 3; «Тут рэчка іншая успомніць пра мяне...»; «Валодае ветразем вецер...»: [Вершы] // Вяч. Мінск. 17 снеж.; «Я сэрца аддала б за песню...»: [Верш] // ЛіМ. 14 ліст.

1976. «Дзяўчынцы з кардэбалету...»: [Верш] // Люблю будзённы дзень... Мн.; Гошка: Апавяданне // Беларусь. № 8; Валерава купанне: Апавяданне // Вясёлка. № 7; Пад шолах ветразяў: Апавяданне // Маладосць. № 1; «Туманка-рэчка сёння ўспомніць пра мяне...»; «Нераты, нераты...»; «Ты ў маёй крыві...»: [Вершы] // Полымя. № 8.

1977. «Дыміцца ў палях праталіна...»; «Тут вецер бярэзнік густы...»: [Вершы] // Беларусь. № 3; «Гэты вечны палёт...»; «Што адбылося...»; «Я ў дарозе-знямозе...»; «Бяру твой твар абедзвюма рукамі...»: [Вершы] // Маладосць. № 12; Верш; «Што адбылося?..»: [Вершы] // Полымя. № 12; Снягурачка; «Мужчынам патрэбны жанчыны...»: [Вершы] // Работніца і сялянка. № 1.

1980. «Далёка ўжо...»: [Верш] // Чырв. змена. 8 сак.

1981. Адліга; Пакуль глядзяць вочы; Важная справа Агнэсы Пятроўны: [Апавяданні] // Маладосць. № 4; «Дзень паэзіі» — дзень сённяшні: [Рэц. на кн.: Дзень паэзіі — 80. Мн., 1980] // Полымя. № 10; «Не вечны на свеце...»; Вясна; «Рукі — ў кішэні...»: [Вершы] // Там жа. № 12.

1982. Хай ярыць слова: [Рэц. на кн.: Рудкоўскі М. Трыгор'е. Мн., 1981] // Беларусь. № 5.

1983. «Усё цяжэй падымаюцца крылы...»: [Верш] // Дзень паэзіі — 83. Мн.; Узлётная паласа: [Рэц. на кн.: Скарынкін У. Вугал атакі. Мн., 1983] // Беларусь. № 8; ...І кожны раз у свой прыходзяць клас // Маг. праўда. 25 кастр.

1984. Аазіс туркменскай паэзіі // Братэрства. Мн.; Дзве паловы жыцця: [Верш] // Дзень паэзіі — 84. Мн.; «Які б ні выпаў лёс...»; «Паэт шукае паэта...»; «Ты забыты, мой любы...»; Працяг формы: [Вершы] // Маладосць. № 3; «Тише, Элла идёт!»: Обзор поэтической почты «Немана» // Неман. № 6; «Ты забыты, мой любы...»: [Верш] // Голас Радзімы. 12 крас.

1985. Гошка: Апавяданне // Буслы над хатай. Мн.; [Біяграфічная даведка пра К.— К. Бачыньскага] // Далягляды — 85. Мн.; «Ты знянацку трапляеш...»; «На плячах яго ляжаў адчай...»: [Вершы] // Полымя. № 3; «На паэтах час не адбіваецца...»: [Верш] // Чырв. змена. 21 ліст.

1.4.

Чаліеў К. Чароўнае шкельца: Вершы / З турк. Мн., 1983.

1972. Хамгушкеева М. «О счастливое детство степное!..»; Вьетнам: [Вершы] / С бур. // Неман. № 10.

1973. Черня Ф. Целина; На Дальнем Востоке; Байкал; «Ушло. Забыто...»: [Вершы] / С бел. // Неман. № 10.

1974. Боровикова Р. «Я вышла на крыльцо...»; «Мы хотели встретиться летом...»; Веселый листопад; Мгновение; «Сбежать от споров и тревоги...»: [Вершы] / С бел. // Неман. № 6.

1975. Гарай А. Плошча цырыманіялаў; Сімановіч Д. Агонь / З рус.; Ковальчук А. Жажда; Рудковский М. Камни цитадели / З бел.; Олейник Б. Когда можно просить замену...; Мах П. Воспоминания о Бресте; Вецыня Э. Герои Бреста / З укр.: [Вершы] // Рэха ў граніце. Мн.

1977. Джанмурадаў А. Песня маці; Пасечнік, пчала і кветка; «Як часта ў жыцці сярод розных падзей...»: [Вершы] / З турк. // Далягляды. Мн.; Шульцайтэ В. Возера Германтас; Цішыня; «Вежы стагоддзяў...»; «Патрэбны друг...»; Элегія; З цыкла «Хатынь»: [Вершы] / З літ. // Літоўская савецкая паэзія. Мн. Т. 2.

1978. Перс С.-Ж. Абразкі з Круза: [Празаіч. замалёўкі] / З фр. // Далягляды. Мн.

1979. Нікіціна Т. Бацька; Рывіна А. Статуі ў Летнім садзе; Пачынаюцца белыя ночы: [Вершы] / З рус. // Прызнанне. Мн.

1982. Чаліеў К. Дутар; Лямцавая юрта; Ручны млын; Хор перамог?: [Вершы] / З турк. // Бярозка. № 11.

1983. Курдаў А. Мелодыі Мылыагі; Пра патрэбныя рэчы; Зарыпава Г. Стэп: [Вершы] / З турк. // Маладосць. № 12.

1984. Ураеў С. «Калі гучыць імя тваё, Туркменія...»; «І дыні, нібы мёд...»; «Сівы саксаул каракумскай пустыні...»; «З сэрца ў сэрца, вершы мае, вандруйце...»; У тыле; Араздурдыева Б. Зіма; Семнаццацігадовая...; Курбанепесаў А. Рака любві; Шлях; Амарава А. Ці не ўсё роўна; Размова з сонцам; Плоў: [Вершы] / З турк. // Братэрства. Мн.; Курдаў А. Эцюд стомленасці; Ранішні эцюд; Вершы ўслед коням на скачках; Зарыпава Г. Ідзе дождж; «Восені журботная эпоха...»; «Не буду дакараць цябе зусім...»: [Вершы] / З турк. // ЛіМ. 20 ліп.

1985. Бачыньскі К.— К. Пакаленне; Miserere; Гэтыя людзі; Зімовыя караблі; «Калі ў руках астыне зброя...»; «Жывём на самым дне...»; Спеў на вясну; Легенда; Снежная песенька салдата; Адкрыццё перамен: [Вершы] / З пол. // Далягляды. Мн.

1.5.

На літоўскую мову. «Mano būtis — čiurli oniapa...» / Vert. V. Marcinkevičius // Lit. ir menas. 1975. Kovo 22.

На рускую мову. Важное дело Агнессы Петровны: Рассказ / Пер. А. Асташонок // Неман. 1982. № 8.

1.6.

Кветкі Каракумаў: Анталогія. Мн., 1990. (Б-ка дзіцячай літаратуры народаў СССР) / Скл.

Мая Туркменія: Вершы, паэмы. Мн., 1992 / Скл.

2.3.

На беларускай мове. Кабаковіч А. Пасеянае ўзыдзе // Маладосць. 1979. № 4; Марчанка С. Не астравок у моры... // ЛіМ. 1978. 10 лют.; Нікіфаровіч В. Пачатак ёсць... Што далей? // Там жа. 1975. 4 ліп.; Прыняты ў Саюз пісьменнікаў // Там жа. 1982. 28 мая; Скрыган Я. Культура творчасці і мы // Скрыган Я. Выбр. тв.: У 2 т. Мн., 1985. Т. 2; Чабан Т. Насустрач сабе // Маладосць. 1979. № 10.

У. М. Ларчанка.

ФІЛІПОВІЧ МАРЫЯ

Філіповіч Марыя Канстанцінаўна (дзявочае прозвішча Шыдлоўская; н. 1.1.1947, в. Смётанка Аршанскага р-на Віцебскай вобл.), празаік. Член СП Беларусі з 1987.

Нарадзілася ў сялянскай сям'і. У Смётанцы скончыла 7 класаў, вучылася ў Дубровенскай вячэрняй СШ № 1 (закончыла ў 1964). Вучылася ў Магілёўскім медыцынскім вучылішчы (1965—68). Атрыманая спецыяльнасць не задавальняла яе. Цікавіла літаратура, цягнула пісаць. Завочна вучылася ў Літаратурным інстытуце ў Маскве (1974—80). Працавала фельчарам спачатку ў Віцебскай, потым у Мінскай вобл. (1968—82). Некаторы час была выхавацелькай у Мінскім тэхнічным вучылішчы № 11 (1982—83), бібліятэкарам у Оршы (1983—84). З 1984 да 1985 супрацоўніца рэдакцыі шматтыражнай газеты «Трыбуна навататара» (Орша). У 1985—90 на творчай рабоце. З 1991 спецкарэспандэнт газеты «Набат», з 1992 — газеты «Рэспубліка».

Літаратурны шлях М. Філіповіч пачаўся ў 1974 з напісання 4 апавяданняў на творчы конкурс пры паступленні ў Літаратурны інстытут. Першыя публікацыі ў рэспубліканскім друку з'явіліся ў 1978 (апавяданне «Сустрэча» ў «Немане» і «Дванаццаць месяцаў» пад Новы год» у «Бярозцы»). Пісьменніца імкнецца асэнсаваць маральна-этычныя і сацыяльныя праблемы. У яе творах адчуваецца добрае веданне штодзённага жыцця. Піша таксама для дзяцей.

Жыве ў Мінску.

Л. А. Бялевіч.

Бібліяграфія

1.2.

Мадонна з Выселкаў: Апавяданні. Мн., 1984. (Першая кніга празаіка). Рэц.: Васілевіч А. Адметна, па-свойму // ЛіМ. 1985. 9 жн.; Кузьміч М. Надзея на будучае // Віцеб. рабочы. 1985. 2 жн.

Пра Алеся і яго сяброў: Апавяданні. Мн., 1988.

1.3.

1978. «Дванаццаць месяцаў» пад Новы год: Апавяданне // Бярозка. № 12; Встреча: [Апавяданне] // Неман. № 12.

1979. Мадонна з Выселкаў: Апавяданне // Маладосць. № 4.

1980. Сустрэча з маленствам: Апавяданне // Бярозка. № 12.

1981. На злосць дзеду; Песня: [Апавяданні] // Беларусь. № 3; Вялікая сям'я: (Апавяданне) // Вясёлка. № 10; Апошняе слова: Апавяданне // Маладосць. № 7; Восеньскай ноччу: Апавяданне // ЛіМ. 13 ліст.; Здарэнне: (Апавяданне) // Чырв. змена. 22 снеж.

1983. Начное дзяжурства: Апавяданне // ЛіМ. 7 студз.; На аўтобусным прыпынку...; Заступілася...; Горкая чаромха: Абразкі // Чырв. змена. 31 жн.; Падарунак сыну: Апавяданне // Там жа. 3 ліст.

1984. Софійка-Зоська: Апавяданне // Маладосць. № 3; Абразкі // ЛіМ. 9 сак.

1985. Букет для жанчыны: Апавяданне // Работніца і сялянка. № 1; Жылі-былі: Апавяданне // ЛіМ. 19 ліп.

1.5.

На рускую мову. Осенней ночью: [Апавяданне] / Пер. В. Жиженко // Неман. 1982. № 8.

2.3.

Скрыган Я. На кроквы шыферу не кладуць // Скрыган Я. Выбр. тв.: У 2 т. Мн., 1985. Т. 2.

З. У. Драздова.

ФІНКЕЛЬ УРЫ



Фінкель Уры Гіршавіч [25.9(8.10).1896, мяст. Ракаў Мінскага пав. Мінскай губ., цяпер в. Ракаў, Валожынскі р-н Мінскай вобл.— 5.12. 1957, Мінск], крытык, літаратуразнавец. Пісаў на яўрэйскай і беларускай мовах.

Нарадзіўся ў небагатай сям'і местачковых яўрэяў. Юнаком вандраваў у пошуках заробку па гарадах і мястэчках Беларусі і Украіны. У 1918 паступіў у Маскоўскі універсітэт на эстэтыка-філасофскае аддзяленне філалагічнага факультэта. Вучобу прыпыніла грамадзянская вайна: малады студэнт добраахвотнікам запісаўся ў Чырвоную Армію. Служыў у Палітупраўленні арміі, затым перайшоў у Палітупраўленне Заходняга фронту. Пасля дэмабілізацыі (1921) накіраваны на працу ў Народны камісарыят асветы РСФСР, потым — у Народны камісарыят нацыянальнасцей. Пераехаўшы ў 1922 у Беларусь, займаўся пытаннямі адукацыі ў Наркамасветы БССР. У 1926 здаў экстэрнам экзамены за педфак БДУ. У 1931 закончыў аспірантуру пры АН БССР, выкладаў у Мінскім педагагічным інстытуце (1930—38). Пасля нападу фашысцкіх захопнікаў у эвакуацыі. За гады вайны страціў 2 дачок, бацьку, брата, сясцёр. У 1949—53 жыў у Ракаве, выкладаў рускую літаратуру ў мясцовай дзесяцігодцы, пісаў даследаванні па яўрэйскай, беларускай і рускай літаратурах. Займаўся зборам матэрыялаў пра рэвалюцыю 1905 на тэрыторыі Беларусі для свайго рамана «Пяцьдзесят год таму назад» (не закончаны). У апошнія гады жыцця знаходзіўся ў Мінску.

Друкавацца У. Фінкель пачаў у 1918 (першыя публікацыі не выяўлены). У 1926 апублікаваў біяграфічны нарыс «А. Гольдфадэн» (у сааўтарстве з Н. Ойслендэрам). У 1937 выйшла ў свет яго кніга «Мендэле Мойхер-Сфорым» (перакладзена на беларускую мову ў 1940), у 1938 даследаванне «Шолам-Алейхем» (на беларускай мове, 1939). Напісаў мастацкую біяграфію З. Бядулі, артыкул пра збіральніцкую дзейнасць фальклярыста і этнографа П. Шэйна. Памяці Я. Купалы прысвяціў апавяданне «У пошуках Івана Купалы». Аўтар шэрага артыкулаў пра творчую дзейнасць М. Гогаля, М. Горкага, Я. Купалы, Я. Коласа і інш. Пераклаў з рускай мовы апавяданне В. Лідзіна «Магіла невядомага салдата». Сябраваў з З. Бядулем, добра ведаў К. Чорнага, пра што той пісаў у сваім «Дзённіку». Распачаў працу па стварэнні пры Ракаўскай дзесяцігодцы краязнаўчага музея.

М. А. Варвашэвіч.

Бібліяграфія

1.2.

А. Гольдфадэн. Мн., 1926 / Сааўт. Н. Ойслендэр / Яўр.

Мендэле Мойхер-Сфорым. Ч. 1. Дзяцінства і юнацтва. Мн., 1937; 2 выд., выпр. Мн., 1939; М., 1948 / Яўр.

Шолам-Алейхем: 1859—1939. М., 1939. Рэц.: Л і н Н. Біяграфіі класікаў // ЛіМ. 1940. 11 студз.; Варшава, 1959 / Яўр.

1.3.

1926. Сацыяльныя тыпы ў першых творах А. Гольдфадэна // Цайтшрыфт. № 1 / Яўр.

1931. Мястэчка Смілавічы: [Нарыс] // Штэрн. № 8—9 / Яўр.

1935. Песня абуджэння і аднаўлення // Штэрн. № 3 / Яўр.; Шкодная бяздзейнасць // ЛіМ. 31 мая.

1936. Бывай здароў, Капыль!: [Нарыс] // Штэрн. № 1; Пад Камянецкай гарой: (З кнігі «Мендэле Мойхер-Сфорым») // Там жа. № 4 / Яўр.; Мендэле Мойхер-Сфорым // ЛіМ. 12 студз.

1937. Лейбмедык князя: (З кнігі «Мендэле Мойхер-Сфорым») // Штэрн. № 2; Нарадзіўся: [Раздзел з кнігі «Шолам-Алейхем] // Там жа. № 5 / Яўр.

1939. Цімафей Васільевіч Калінічаў // Ардэнаносная Беларусь. Мн. / Яўр.; Пісьмо дамоў // Выносная Беларусь. Мн., ЛіМ. 21 вер.; У асяроддзі кізваленым братам. Мн., ЛіМ. 21 вер.; У асяроддзі кіеўскіх яўрэйскіх пісьменнікаў: (З кнігі «Шолам-Алейхем») // Штэрн. № 3—4 / Яўр.; Гірш Камянецкі // ЛіМ. 3 кастр.; Юность писателя // Сталин. молодежь. 15 апр.

1941. Кніга аб яўрэйскім тэатры: [Рэц. на кн.: Н. Ойслендэр. Яўрэйскі тэатр 1887—1917. М., 1940] // Штэрн. № 2; Мендэле і яго час: [Рэц. на кн.: Літаратурна-гістарычны зборнік. М., 1940] // Там жа. № 3 / Яўр.

1945. У пошуках Івана Купалы: Апавяданне //

Полымя. № 2—3; Змітрок Бядуля // Там жа. № 10; Павел Васільевіч Шэйн: 45 год з дня смерці // ЛіМ. 22 жн.

1946. Малады Шолам-Алейхем: Да 30-годдзя з дня смерці // Полымя. № 5; ЛіМ. 18 мая.

1952. Шчаслівае маленства // ЛіМ. 6 вер.

1955. Мара М. В. Гогаля аб сцэне // Беларусь. № 5; Сустрэча са Змітраком Бядулем // Там жа. № 12.

1956. Змітрок Бядуля: Да 70-годдзя з дня нараджэння // Бярозка. № 5; Перад бурай: Урывак з аповесці «Паўвека таму назад» // ЛіМ. 16 чэрв.

1.4.

Лідзін В. Магіла невядомага салдата / З рус. Мн., 1935 / Яўр.

1.5.

На беларускую мову. Шолам-Алейхем / Пер. В. Вольскі. Мн., 1939.

Мендэле Мойхер-Сфорым: (Дзіцячыя і юнацкія гады) / Пер. В. Вольскі. Мн., 1940.

Шолам-Алейхем / Пер. В. Вольскі. Мн., 1958.

Пажар: Гістарычная навела / Пер. З. Бядуля // Полымя рэвалюцыі. 1938. № 1; Шолам-Алейхем. З Пераяслаўя ў Варонку: Аповесць / Пер. В. Вольскі // Там жа. 1938. № 7—8; У атэлі «Імперыяль»: Урывак з кнігі «Шолам-Алейхем» / Пер. В. Вольскі // ЛіМ. 1938. 27 студз.; Апавяданні пра Шолам-Алейхема: Госць; У Бердычаве на «Пясках»; Леў сярод звяроў / Пер. А. Стаховіч // Полымя рэвалюцыі. 1939. № 2; Мендэле Мойхер-Сфорым: Біяграфічная аповесць / Пер. В. Вольскі // Там жа. 1939. № 10.

2.3.

На беларускай мове. Вольскі В. Уры Фінкель // ЛіМ. 1939. 3 снеж.; Пісьменнікі Савецкай Беларусі: Кароткі даведнік. Мн., 1981; Рагойша В. Варты вялікай пашаны: Да 70-годдзя з дня нараджэння Уры Фінкеля // ЛіМ. 1966. 27 вер.; Уры Фінкель: [Некралог] // ЛіМ. 1957. 7 снеж.

У. М. Ларчанка.

ФЯДОСІК АНАТОЛЬ

Фядосік Анатоль Сямёнавіч (псеўд. А. Сямёнаў; н. 7.2.1926, в. Кашэвічы Петрыкаўскага р-на Гомельскай вобл.), фальклярыст, крытык. Заслужаны дзеяч навукі Беларусі (1990). Доктар філалагічных навук (1973), прафесар (1981). Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі (1986; за ўдзел у выпуску шматтомнага зводу «Беларуская народная творчасць» — БНТ).

Нарадзіўся ў сялянскай сям'і. Бацька, Сямён Пятровіч, у 1941 загінуў на фронце, маці, Ганна Іванаўна, працавала ў калгасе. А. Фядосік вучыўся ў Кашэвіцкай СШ (1932—41). У 1942 уступіў у партызанскі атрад Міхайлоўскага (пасля Жыгара) Палескага аб'яднання. Быў разведчыкам спецыяльнага разведузвода пры штабе брыгады (Капаткевіцкі і Петрыкаўскі раёны). Пасля ўз'яднання партызан з арміяй (1944) ваяваў на 3-м Беларускім фронце камандзірам аддзялення разведкі 265-га стралковага палка (Польшча, Прыбалтыка, Усходняя Прусія). У красавіку 1945 быў накіраваны ў Арлоўскае танкавае вучылішча імя М. Фрунзе (г. Балашоў Саратаўскай вобл., вучыўся да красавіка 1946). Дэмабілізаваўся ў 1946. Працаваў настаўнікам, завучам Кашэвіцкай сямігодкі (1946—49), дырэктарам Сінкевіцкай СШ Ленінскага р-на Пінскай вобл. (1949—55), Мікашэвіцкай СШ (1955—58). Завочна скончыў філфак БДУ (1953). Вучыўся ў аспірантуры Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору АН БССР (1958—61). Абараніў кандыдацкую дысертацыю (1962). З 1961 малодшы навуковы супрацоўнік, з 1962 вучоны сакратар, з 1967 загадчык сектара фальклору, адначасова (з 1969) намеснік дырэктара Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору АН Беларусі. Абараніў доктарскую дысертацыю «Беларуская народная сатыра».

А. Фядосік — член міжнароднай камісіі славянскага фальклору пры Міжнародным камітэце славістаў, член Беларускага камітэта славістаў. Як прадстаўнік БССР удзельнічаў у рабоце камітэта экспертаў пры ЮНЕСКА па пытаннях захавання фальклору (Парыж, 1982, 1985). Узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны 2-й ступені, медалямі, Ганаровай Граматай Вярхоўнага Савета БССР.

Першыя публікацыі А. Фядосіка ў перыёдыцы датуюцца 1960. Асноўны кірунак яго навуковай дзейнасці — беларускі фальклор. Даследуе фальклорныя сатырычныя жанры, сямейна-абрадавую паэзію, народную творчасць перыяду Вялікай Ай-

чыннай вайны, літаратурна-фальклорныя сувязі («Беларуская народная сатырычная проза», «Трапным народным словам», «Сацыяльна-бытавыя казкі», «Развіццё беларускай савецкай фальклярыстыкі», «Праблемы беларускай народнай сатыры», «Народная паэзія барацьбы», «Фальклор і масавая культура», «Беларуская савецкая фальклярыстыка» і інш.). Аўтар больш як 200 навуковых прац, у тым ліку 20 манаграфій і брашур. Пад кіраўніцтвам і рэдакцыяй А. Фядосіка выдадзены шматтомны Збор беларускага фальклору, распрацоўваюцца актуальныя праблемы гісторыі фальклярыстыкі. Удзельнік навуковых экспедыцый па збіранні вуснапаэтычных твораў. Прымаў удзел у напісанні калектыўнай манаграфіі «Беларуская вуснапаэтычная творчасць. Гісторыка-тэарэтычнае даследаванне», кнігі «А. К. Сержпутоўскі». Адзін з аўтараў вучэбнага дапаможніка «Беларуская вуснапаэтычная творчасць», хрэстаматыі па беларускім фальклоры, праграмы па курсе фальклору для філалагічных факультэтаў ВНУ. Складальнік тамоў БНТ «Сацыяльна-бытавыя казкі», «Жарты, анекдоты, гумарэскі», шматлікіх іншых зборнікаў вуснай паэзіі.

Жыве ў Мінску.

Л. С. Савік.

Бібліяграфія

1.2.

Беларускі народ аб рэлігіі. Мн., 1960 / Сааўт. К. Кабашнікаў.

Крытыка рэлігіі і духавенства ў беларускім савецкім фальклоры: (Матэрыял у дапамогу лектару). Мн., 1960.

Антирелигиозные мотивы в белорусском народном творчестве: Автореф. дис. ... канд. филол. н. Мн., 1962.

Антырэлігійныя матывы ў беларускім фальклоры. Мн., 1963. Рэц.: Бурносаў В. // Звязда. 1964. 19 лют.; Макарэвіч А. // Беларусь. 1964. № 3; Міско С. // ЛіМ. 1964. 3 студз.; Надольскі Р. // Мін. праўда. 1964. 26 студз.

А. К. Сержпутовский. Мн., 1966 / Сааўт. В. Бандарчык. Рэц.: Бараг Л. Выдатная старонка беларускай фальклярыстыкі // Полымя. 1967. № 7; Ботвинник М. // Сов. Бел. 1967. 25 сент.; Надольскі Р. // ЛіМ. 1967. 28 ліп.

Беларуская вуснапаэтычная творчасць: Гісторыка-тэарэтычнае даследаванне. Мн., 1967.

Беларуская народная сатырычная проза. Мн., 1969. Рэц.: Галчанаў А. // Звязда. 1969. 19 чэрв.; Іваноў У., Мялешка А. // Мін. праўда. 1969. 11 чэрв.; Мелешко А. // Заря. 1969. 23 июля; Міско С. Зброяй сатыры // Вяч. Мінск. 1969. 24 кастр.; Янкоўскі М. Пад агонь сатыры // Наст. газ. 1970. 18 лют.

Трапным народным словам: Сатыра і гумар у беларускай вуснай паэзіі і народнай драме. Мн., 1971. Рэц.: Ставер А. Вечна жывое, народнае // Вяч. Мінск. 1973. 3 жн.; Янкоўскі М. Даследуецца сатыра // Полымя. 1972. № 11.

Белорусская народная сатира: Автореф. дис. ... д-ра филол. н. Киев, 1972.

Развіццё беларускай савецкай фальклярыстыкі. Мн., 1977. Рэц.: Гуркоў У. Мовай спадчыны бацькоўскай // Чырв. змена. 1977. 31 ліп.

Праблемы беларускай народнай сатыры. Мн., 1978. Рэц.: Касько У. Смех — грозная сіла // Звязда. 1979. 9 студз.; Коўтун В. На крылах народнага гумару // ЛіМ. 1978. 23 сак.; Прыгодзіч З. Гісторыя народнага смеху // Полымя. 1979. № 10; Пятроўская Г. З крыніц жыватворных // Чырв. змена. 1979. 17 студз.; Янковский Н. Из родословной народной сатиры // Неман. 1979. № 5.

Народная паэзія барацьбы. Мн., 1981. Рэц.: Касько У. Паэзія народнай барацьбы // Звязда. 1982. 22 студз.

Прынцыпы класіфікацыі і выдання фальклорных твораў у шматтомным зводзе беларускай творчасці. Мн., 1983.

Фальклор і «масавая культура». Мн., 1986.

Беларуская савецкая фальклярыстыка. Мн., 1987.

Беларуская вуснапаэтычная творчасць. Мн., 1988.

Каляндарна-песенныя, абрадавыя і гульнявыя традыцыі славян у мінулым і сучасным. Мн., 1988 / Сааўт. З. Мажэйка.

Партизанская быль не забыта. Мн., 1990.

Ілюзорнасць і сапраўднасць: «Белыя плямы» ў гісторыі фальклярыстыкі 20—30-х гадоў. Мн., 1991.

1.3.

1960. Атеизм в белорусском фольклоре // Католицизм без маски. Мн.; Антырэлігійныя матывы ў беларускім фальклоры // Пытанні рэлігіі і атэізму. Мн. / Сааўт. К. Кабашнікаў; «Нам і без бога светлая дарога» // Калг. праўда. 11 сак.

1962. Скарбніца народнай мудрасці // Наст. газ. 3 лют.

1965. Выдатны беларускі этнограф і фальклярыст // Казкі і апавяданні беларускага Палесся: Са зборнікаў А. Сержпутоўскага. Мн. / Сааўт. В. Бандарчык; Современная белорусская народная сатира и юмор в борьбе с реакционными пережитками прошлого в быту и сознании советских людей // Материалы сессии, посвященной итогам археологических и этнографических исследований 1964 г. в СССР. Баку; Гісторыя беларускай этнаграфіі // Наст. газ. 27 лют.

1966. Па шляху творчых пошукаў // Весці АН БССР. Сер. грамад. н. № 2 / Сааўт. С. Майхровіч.

1967. Некаторыя асаблівасці беларускай народнай сатырычнай казкі // Пытанні беларускай этнаграфіі, фальклярыстыкі і тапанімікі. Мн.

1968. [Рэц. на кн.: Прибыль Х. В поиск уходит разведка... Мн., 1967] // Сел. газ. 10 янв.; В думах народных // Сов. Бел. 2 июня.

1969. Народная сатыра і гумар у барацьбе супраць перажыткаў мінулага ў свядомасці і быце савецкіх людзей // Праблемы сучаснага беларускага фальклору. Мн.; Падрыхтоўка шматтомнага выдання беларускага фальклору // Тэзісы дакладаў на канферэнцыі, прысвечанай вынікам даследаванняў беларускай народнай творчасці (люты 1969 г.). Мн.; Ленін і фальклор // Полымя. № 11.

1970. Жыватворная крыніца: [Рэц. на кн.: Грынчык М. Фальклорныя традыцыі ў беларускай дакастрычніцкай паэзіі. Мн., 1969] // Беларусь. № 1; «Не имеет себе равных...»: [Рэц. на кн.: Бараг Л. Беларуская казка. Мн., 1969] // Неман. № 12; Голос сердца: [Рэц. на кн.: Ставер А. Пад канвоем. Мн., 1969] // Знамя юности. 19 марта.

1971. Сатыра і гумар у беларускіх народных прыказках, прымаўках і загадках // Весці АН БССР. Сер. грамад. н. № 4; Развіццё беларускай савецкай фальклярыстыкі // Народна творчість та етнографія. № 5; Работа фольклористов г. Минска // Русский фольклор. № 12.

1972. Беларускі фальклор у творчасці Янкі Купалы // Весці АН БССР. Сер. грамад. н. № 5.

1973. Метким народным словом: (Сатира и юмор в белорусской устной поэзии и народной драме) // Научно-реферативный бюллетень. № 5.

1974. Некоторые проблемы изучения прозаических жанров белорусского фольклора // Прозаические жанры фольклора народов СССР. Мн.; Даследуецца спадчына // Беларусь. № 2; Вусная паэзія народа // Там жа. № 9; Научные основы многотомного издания белорусского фольклора // Македонский фольклор. № 13 / Сааўт. В. Бандарчык; Прозаические жанры фольклора народов СССР // Народна творчість та етнографія. № 4; Проблемы изучения про-

ических жанров белорусского фольклора // Там жа. № 5; Певчий край: [Рэц. на кн.: Беларускі фальклор у сучасных запісах: Брэсцкая вобласць. Традыцыйныя жанры. Мн., 1973] / Неман. № 1; Из родника народной поэзии [Рэц. на кн.: Песні сямі вёсак: Традыцыйная народная лірыка Міншчыны. Мн., 1973] // Там жа. № 9.

1975. Народна-паэтычная творчасць // Беларуская савецкая энцыклапедыя. Мн. Т. 12 / Сааўт. К. Кабашнікаў; Гумар і сатыра ў беларускіх народных казках пра жывёл // Этнаграфічны зборнік. Мн.; Грунтоўная работа // Беларусь. № 1; Выкарыстанне фальклору ў вучэбна-выхаваўчай рабоце // Нар. асвета. № 1; Белорусский свадебный фольклор // Народна творчість та етнографія. № 5.

1976. Беларускія казкі ў запісах Эмы Дмухоўскай Беларускі казачны эпас. Мн.; Працуючы разам // Пясняр мужнасці. Мн.; З сыноўняй адданасцю Радзіме: Да 70-годдзя з дня нараджэння І. В. Гутарава // Беларусь. № 4; Багацце паэтычных народных скарбаў // Голас Радзімы. № 24—26; Собрание батрацких и отходнических песен // Народна творчість та етнографія. № 3; Образы восточнославянской волшебной сказки // Сов. этнография. № 3; Шчырасць любві да народа: [Рэц. на кн.: Шырма Р. Песня — душа народа. 1929—1939. 1944—1974 гг. Мн., 1976] // Звязда. 22 чэрв.; Дзівосны свет дзяцінства: [Рэц. на кн.: Швед В. Дружба. Мн., 1976] // Чырв. змена. 30 мая.

1977. Выказанае сэрцам // Маладосць. № 6; Шчаслівы лёс педагога і вучонага // Звязда. 13 ліст.

1978. Белорусские лирические необрядовые песни в современных записях // Всесоюзная сессия, посвященная итогам полевых этнографических и антропологических исследований 1976—1977 гг. Тезисы докладов. Ереван; Народная паэтычная творчасць Савецкай Беларусі // Весці АН БССР. Сер. грамад. н. № 6; З глыбінь народных: [Рэц. на кн.: Гілевіч Н. У гэта веру. Мн., 1978] // Чырв. змена. 28 крас.; Глыбокае даследаванне: [Рэц. на кн.: Бараг Л. Сюжэты і матывы беларускіх народных казак. Мн., 1978] // Чырв. змена. 25 ліст. / Пад псеўд. А. Сямёнаў.

1979. Сацыяльна-бытавыя і навелістычныя казкі Сааўт. К. Кабашнікаў; Фальклор савецкай эпохі; Сямейна-абрадавая паэзія; Радзінныя абрады і паэзія; Вясельныя песні; Пахавальныя галашэнні; Сказы; Анекдоты; Народны тэатр // Беларуская народна-паэтычная творчасць. Мн.

1980. Збіранне і вывучэнне беларускага фальклору на сучасным этапе // Беларуская фальклярыстыка. Мн.; Сокровища народного творчества // Бюллетень ЮНЕСКО. Мн. 1 (2); Традиционные белорусские народные песни в современном репертуаре деревни // Всесоюзная сессия по итогам полевых и антропологических исследований 1978—1979 гг. Тезисы докладов. Уфа; Песні заручын і ад'езду маладога да нявесты // Вяселлі. Песні. Мн. Кн. 1; Самаадданае служэнне навуцы // Весці АН БССР. Серыя грамад. н. № 4; Народная поэзия борьбы // Научно-реферативный бюллетень. № 47; У сэрцы і думах народных // Полымя. № 2; Духоўныя багацці народа // ЛіМ. 11 крас.; Палымяны пясняр і выдатны вучоны // Чырв. змена. 6 ліп.

1981. Традиционный фольклор в наши дни // Фольклорное наследие народов СССР и его роль в художественной культуре развитого социализма. М. / Сааўт. К. Кабашнікаў; Народная творчасць вогненных гадоў // Нар. асвета. № 5.

1982. Сучасная беларуская фальклярыстыка і роля Беларускага дзяржаўнага універсітэта ў яе развіцці // Актуальные проблемы общественных наук. Тезисы научной конференции. Мн.; Даследаванне помнікаў народнай культуры — важная задача вучоных // Народная культура і быт беларусаў. Тэзісы дакладаў. Мн.; Формы и условия бытования белорусского традиционного фольклора в современный период // Проблемы европейской этнографии и фольклора. Тезисы докладов. М.; Фольклорные формы выражения народной смеховой культуры восточных славян; Якуб Колас и белорусское народное творчество // Славянские культуры и мировой культурный процесс. Мн.; Пытанні ўзаемасувязей фальклору і літаратуры ў сучаснай беларускай навуцы // Узроўні фальклорных уплываў. Мн.; Проблемы современной песенности славянских народов // Народна творчість та етнографія. № 1; З фальклорных глыбіняў // Полымя. № 6; На мяжы літаратуры і гісторыі: [Рэц. на кн.: Мальдзіс А. Беларусь у люстэрку мемуарнай літаратуры XVIII стагоддзя. Мн., 1982] // Там жа. № 8 / Сааўт. В. Фядосік; Карпатліва збіраць, ашчадна захоўваць // ЛіМ. 20 жн.

1983. На крылах фальклору // ЛіМ. 23 снеж.

1984. Беларускі песенны фальклор у Шальчынінскім раёне Літоўскай ССР // Быт і культура беларусаў. Мн.; Вучоны і грамадскі дзеяч // Весці АН БССР. Сер. грамад. н. № 6 / Сааўт. У. Няфёд.

1985. Народна-паэтычная творчасць перыяду Вялікай Айчыннай вайны і рэчаіснасць // Вялікая Айчынная вайна ў фальклоры і мастацтве Беларусі. Мн.; Фольклорные формы выражения народной смеховой культуры восточных славян; Якуб Колас и фольклор // Славянские культуры и мировой культурный процесс. Мн.; Песня ад шчырага сэрца // Беларусь. № 8.

1.4.

1976. Апалінскі А. Металічны грэбень: Апавяданне / З пол. // ЛіМ. 1 кастр.

1.5.

На ўкраінскую мову. Атеістичні мотиви дожовтневого і сучасного білоруського фольклору // Народна творчість та етнографія. 1963. № 1; Білоруський весільний фольклор // Там жа. 1975. № 5; Усна поетична творчість слов'ян // Там жа. 1977. № 1.

1.6.

Казкі беларускага Палесся. Мн., 1965 / Скл. Рэц.: Канапацкі М., Музафараў Р. Казкі беларускага Палесся // Ніва. 1966. 20 лют.

Сацыяльна-бытавыя казкі. Мн., 1976 / Скл.

Беларускі фальклор: Хрэстаматыя. 2 выд., дап. Мн., 1977 / Скл. з інш.

Вяселле: Абрад. Мн., 1978 / Рэд. з В. Бандарчыкам.

Хто з'еў прасвірку: Антырэлігійныя казкі і жарты. Мн., 1979 / Скл. з У. Васілевічам.

Славянские культуры и мировой культурный процесс: Тезисы докладов и сообщений международной научной конференции 28 сентября — 1 октября 1982. Мн., 1982 / Рэд. з інш.

Жарты, анекдоты, гумарэскі. Мн., 1984 / Скл.

Вялікая Айчынная вайна ў фальклоры і мастацтве Беларусі: (Мастацтвазнаўства, этнаграфія, фальклярыстыка): Тэзісы дакладаў на канферэнцыі, прысвечанай 40-годдзю Перамогі, крас. 1985 г., г. Мінск. Мн., 1985 / Рэд. з інш.

Вяселле: Песні: У 6 кн. Мн., 1988. Кн. 6 / Рэд.

Казкі ў сучасных запісах. Мн., 1989 / Рэд. з інш.

Прыпеўкі. Мн., 1989 / Рэд. з інш.

Чаго на свеце не бывае: Антырэлігійныя казкі, анекдоты, прыказкі ўсходнеславянскіх народаў. Мн., 1990 / Скл. з Г. Пятроўскай.

Замовы. Мн., 1992 / Рэд.

Паэзія беларускага земляробчага календара. Мн., 1992 / Рэд. з інш.

Жаніцьба Цярэшкі. Мн., 1993 / Рэд.

В. М. Грышкевіч.

Х

ХАДАНОВІЧ ІГАР

Хадановіч Ігар Піліпавіч (10.6.1940, в. Шпількі Дзяржынскага р-на Мінскай вобл.— 9.1.1966, Мінск; пахаваны на Усходніх могілках), празаік, паэт.

Нарадзіўся ў сям'і настаўніка. У 1957—62 вучыўся на аддзяленні журналістыкі філфака БДУ. Скончыўшы універсітэт, працаваў у рэдакцыі газеты «Чырвоная змена». З 1963 у Мінскім абкоме камсамола. У 1964—66 у рэдакцыі газеты «Літаратура і мастацтва». Трагічна загінуў ад рукі бандыта.

Першы верш І. Хадановіча («Хлеб») надрукаваны ў 1957 на старонках газеты «Чырвоная змена». Першы зборнік яго апавяданняў, нарысаў і нататак «За акном дождж» выйшаў толькі пасля смерці, у 1967. Галоўны герой гэтай кнігі — чысты, даверлівы хлапчук, які яшчэ зусім не падрыхтаваны да барацьбы з несправядлівасцю і пошласцю, але ўжо напружана раздумвае пра сваё месца ў жыцці. Творы І. Хадановіча вызначаюцца высокім маральным пафасам, тонкімі назіраннямі, вялікай цікавасцю да ўнутранага свету чалавека, імкненнем да псіхалагічнага абгрунтавання кожнага ўчынку героя.

Т. М. Тарасава.

Бібліяграфія

1.2.

За акном дождж: Апавяданні. Мн., 1967. Рэц.: Бечык В. На пачатку дарогі // Полымя. 1967. № 10; Бураўкін Г. След на зямлі // ЛіМ. 1967. 25 ліп.; Мехаў У. Акно ў сэрца // Маладосць. 1967. № 6; Паўлаў У. Пырскі сонца // Чырв. змена. 1967. 25 ліп.

На досвітку: Апавяданні, нарысы, з запісных кніжак і пісьмаў. Мн., 1986.

1.3.

1957. Хлеб: [Верш] // Чырв. змена. 29 снеж.

1958. Эстафета бацькоў: [Верш] // Чырв. змена. 6 ліст.

1959. Радзіма мая: [Верш] // Калг. праўда. 1 студз.

1960. Новы дом: Апавяданне // Звязда. 6 ліст.

1961. За вокнамі дождж: Апавяданне // ЛіМ. 1 жн.; Свежы вецер: (Расказы аб важатых з вытворчасці) // Чырв. змена. 4 студз.; На граніцы — ЮСП // Там жа. 3 жн.

1963. Раннія яблыкі: Апавяданне // Маладосць. № 1.

1965. Пятая хата: Апавяданне // Беларусь. № 10; У кватэры заставаўся хлопчык: Апавяданне // Маладосць. № 9; На досвітку: Апавяданне // ЛіМ. 16 лют.; Цяжкае заданне: Апавяданне // Чырв. змена. 23 вер.

1.5.

На рускую мову. В квартире оставался мальчик: [Апавяданне] / Пер. Т. Мартыненко // Неман. 1968. № 1; Пятая хата: Рассказ // Волга. 1972. № 9.

2.3.

На беларускай мове. Бечык В. «Душа не сціхае...» // Бечык В. Свет жывы і блізкі. Мн., 1974; Брыль Я. Непарадны агляд // Брыль Я. Трохі пра вечнае. Мн., 1978. С. 17; Вярцінскі А. Высокае неба ідэала. Мн., 1979. С. 90—94; Яго ж. Чалавек з нашай біяграфіі // Хадановіч І. За акном дождж. Мн., 1967; Лісіцкі А. Талент чалавечнасці // ЛіМ. 1974.

7 вер.; Памяці друга: Некралог // Там жа. 1974. 11 студз.; Пісьменнікі Савецкай Беларусі. Мн., 1981.

На рускай мове. Бондарева Е. Писатель и кино // Неман. 1972. № 2; Стрельцов М. Первое знакомство // Неман. 1968. № 1.

З. У. Драздова.

ХАДКЕВІЧ ТАРАС

Хадкевіч Тарас Канстанцінавіч [псеўд. Тарас Вярзіла, Вяроўка, Т. Вяроўка, Тарас Ліпнёвы; крыпт. Т. В., Тар. Вяр., Х., Т. Хад., Тар. Хад., Тар. Х-віч; 23.2(7.3).1912, в. Шайцерава Дрысенскага пав. Віцебскай губ., цяпер Верхнядзвінскі р-н Віцебскай вобл.— 14.8.1975, Мінск; пахаваны на Паўночных могілках], празаік, паэт, перакладчык. Член СП Беларусі з 1947. Заслужаны работнік культуры Беларусі (1972).

Паходзіў з сялян. Бацька, Канстанцін Андрэевіч, атрымаў ад дзеда трэць валокі зямлі. Нягледзячы на тое, што жылося нялёгка, бацьку «дужа хацелася вывесці каго-небудзь з дзяцей у людзі». І пастаўленую перад сабой мэту ён імкнуўся рэалізаваць — яшчэ да рэвалюцыі старэйшую дачку вывучыў на настаўніцу (у час Айчыннай вайны яна расстраляна за сувязь з партызанамі). Хлапчуком Т. Хадкевіч дапамагаў бацькам па гаспадарцы — араў поле, касіў, убіраў збожжа, даглядаў жывёлу. З дзяцінства на ўсё жыццё застаўся ў памяці 1919 год — голад, тыф. Вучыцца пачаў з шасці гадоў. Пад уплывам сястры-настаўніцы рана выявілася ў яго цікавасць да мастацкага слова — творчасці А. Пушкіна, М. Лермантава. З 5-га класа наведваў сямігодку ў в. Валынцы, дзе ў школьнай насценгазеце быў змешчаны яго першы верш «Да новага жыцця». У 1926 уступіў у камсамольскую ячэйку, атрымаў членскі білет «Маладняка». Скончыўшы сямігодку, у 1927—29 вучыўся ў Полацкім педагагічным тэхнікуме. Затым працаваў у газеце «Чырвоная Полаччына» (1929—31), дзе пасябраваў з А. Астрэйкам і Э. Самуйлёнкам. З восені 1931 у Мінску. Вучыўся ў Беларускім вышэйшым педагагічным інстытуце (1931—33). Вучобу сумяшчаў з вячэрняй работай у Беларускім тэлеграфным агенцтве, рэдакцыі газеты «Рабселькор». Быў членам бюро камсамольскай арганізацыі пісьменнікаў. У 1933—34 працаваў у газеце «Чырвоная змена». Служыў у Чырвонай Арміі (1934—36), друкаваўся ў газеце «Красноармейская правда», рыхтаваў да друку зборнік вершаў «Смяецца моладзь» (застаўся нявыдадзеным). У 1935 выпадкова выратаваўся ад рэпрэсій. У 1936—41 як раз'язны карэспандэнт «Звязды» пабываў у розных мясцінах краіны. Прыняў удзел у вызваленні Заходняй Беларусі. У час Вялікай Айчыннай вайны быў камандзірам узвода, ваяваў пад Вялікімі Лукамі, Тарапцом. У верасні 1941 паранены трапіў у палон. Быў у лагерах ваеннапалонных у Тарапцы, Даўгаўпілсе, пад Рыгай, у «шталагах» і на земляных работах у Германіі. Удзельнічаў у інтэрнацыянальным руху Супраціўлення. Тройчы ўцякаў з палону (апошні раз, вясной 1945, паспяхова). У складзе Чырвонай Арміі пабываў у Чэхаславакіі, Венгрыі, Польшчы. Дэмабілізаваўшыся ўвосень 1945, вярнуўся ў Мінск, працаваў раз'язным карэспандэнтам у газеце «Звязда» (1945—50). Потым загадчык аддзела публіцыстыкі газеты «Літаратура і мастацтва» (1950—51), літаратурны кансультант СП БССР (1953—72). Узнагароджаны ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга, «Знак Пашаны» і медалямі.

Першы верш Т. Хадкевіча надрукаваны ў 1925 у часопісе «Малады араты». У 1932 выйшаў зборнік паэзіі «Смялей, таварыш!». Потым перайшоў на прозу. Пасляваенная творчасць прысвечана інтэрнацыянальнай еднасці антыфашыстаў (аповесці «Братэрства», «Рэха ў гарах»), жыццю калгаснай вёскі (аповесць «Вяснянка», раман «Даль палявая»), людзям новабудоўляў (раман «Песня Дзвіны», нарыс «Нафтагігант на Дзвіне»). У некаторых з гэтых твораў, даволі папулярных у свой час, выявілася прыхарошванне рэчаіснасці. Аўтар пяці зборнікаў апавяданняў для дзяцей. Пераклаў на беларускую мову кнігі М. Горкага, А. Чайшвілі. Імем Т. Хадкевіча названы Цэнтральная раённая бібліятэка ў Верхнядзвінску, вуліца ў Полацку.

І. П. Чыгрын.

Бібліяграфія

1.1.

Выбранае. Мн., 1970. (Б-ка бел. прозы).

Творы: У 2 т. Мн., 1982. Т. 1. Даль палявая: Раман; Вяснянка: Аповесць. Т. 2. Песня Дзвіны: Раман; Апавяданні. Рэц.: Міхалевіч Д. Кнігапіс // ЛіМ. 1982. 31 снеж.

1.2.

Смялей, таварыш! Мн., 1932. Рэц.: А. С. [Ліхадзіеўскі С.]. Голая паэтыка і «казачныя феі» // ЛіМ. 1932. 24 ліп.

Шлях да пяршынства: Нарыс. Мн., 1934. (Б-чка стаханаўскага вопыту).

Братэрства: Аповесць і апавяданні. Мн., 1948. Рэц.: Конанаў С. // Бальш. сцяг. 1949. 10 крас.; Кудраўцаў І. Чалавек — уладар падзей // Полымя. 1949. № 3.

Вяснянка: [Аповесць]. Мн., 1949. Рэц.: Бурьян Б. Наши современники // Сталин. молодежь. 1949. 10 июля; Герцович Я. Веснянка // Там жа. 1948. 4 июня; Майхровіч С. Паэзія калгаснай працы // Беларусь. 1949. № 9; Урэцкі А. Аповесць аб людзях калгаснай вёскі // Наст. газ. 1949. 11 жн.

За сінім лесам: Апавяданні. Мн., 1951. Рэц.: Новыя кнігі // Віцеб. рабочы. 1951. 21 снеж.

Рэха ў гарах: Аповесць. Мн., 1951. Рэц.: Бур'ян Б. У імя міру // Беларусь. 1951. № 8; Клешчанка В. Дружба, загартаваная ў баі // Полымя. 1951. № 10; Шчарбатаў Г. Рэха ў гарах // Мін. праўда. 1951. 7 ліп.

Сяброўства: Аповесці і апавяданні. Мн., 1952. Рэц.: Бурьян Б. Испытание временем // Сталин. молодежь. 1953. 5 марта; Гульман Р. Сяброўства // Мін. праўда. 1953. 17 лют.; Данская Я. Сяброўства // ЛіМ. 1953. 7 лют.; Кніжная паліца // Наст. газ. 1952. 20 ліст.

На новым месцы: Апавяданні. Мн., 1954. Рэц.: Есакоў А. Новыя апавяданні для дзяцей // Беларусь. 1955. № 1; Казека Я. Апавяданні для дзяцей // ЛіМ. 1955. 19 лют.; Новыя кнігі // Калг. праўда. 1954. 10 снеж.

Беларуская ССР. Мн., 1958 / Сааўт. І. Краўчанка, Н. Раманоўскі. Рэц.: Маскаленка В. Кніга аб Беларусі // Сав. школа. 1959. № 1.

Савецкая Беларусь у фотаілюстрацыях: Альбом. Мн., 1958 / Сааўт. У. Юрэвіч.

Даль палявая: Раман. Мн., 1959. Рэц.: Бойко В. С жизнью в ногу // Сов. Отчизна. 1959. № 1; Бурносаў В. Далягляды жыцця // Звязда. 1959. 8 кастр.; Казбярук У. Працяг размовы // ЛіМ. 1959. 20 чэрв.; Майхровіч С. На прасторах калгаснага жыцця // Беларусь. 1959. № 3; Налівайка А. Раман пра нашу сучаснасць // Мін. праўда. 1959. 10 сак.

Спеюць яблыкі: Апавяданні. Мн., 1959. (Школьная б-ка).

Мая Беларусь: Нарыс. Мн., 1961. Рэц.: Аляксееў І. Наша Беларусь // Беларусь. 1964. № 3; Бечык В. // Наст. газ. 1962. 18 ліп.; Буран В. // ЛіМ. 1961. 1 снеж.; Глускі А. Мая Беларусь // Гродзен. праўда. 1961. 17 ліст.; Мін. праўда. 1961. 22 ліст.; Жучкевіч В. Кніга аб Беларусі // Нар. асвета. 1962. № 7; Зуёнак В. Наша любоў — Беларусь // Полымя. 1962. № 1; Клышко М. Очерки о родном крае // Сел. газ. 1964. 17 марта; Лідзін С. Расказ аб нашай рэспубліцы // Зара. 1961. 28 ліст.; Модэль М. Ясназорная Беларусь // Беларусь. 1962. № 2; Осипчук Г. Образы родного края // Неман. 1964. № 6.

Мінск: Даведнік. Мн., 1962 / Бел., англ.

Нафтагігант на Дзвіне: Нарыс. Мн., 1963.

Прыгажосць душэўная. Мн., 1963 (Гутаркі на маральна-этычныя тэмы).

Мы раскажам пра Мінск: Нарыс. Мн., 1964 / Сааўт. С. Грахоўскі, У. Карпаў, Р. Сабаленка.

Сад у квецені: Апавяданні, нарысы. Мн., 1966.

Жыла-была казка: Апавяданні. Мн., 1967.

За акном дождж: Апавяданні. Мн., 1967.

Дзвіна пайшла: Апавяданні. Мн., 1968. (Школьная б-ка).

Мая Беларусь: Нарысы. Мн., 1968. Рэц.: Сабаленка Р. Хвала ёй на вякі // Полымя. 1968. № 12.

Мінск: [Альбом]. Мн., 1968.

Савецкая Беларусь: [Фотаальбом]. Мн., 1968 / Бел., рус.

Савецкая Беларусь. Мн., 1971 / Бел., англ.

Даль палявая: Раман. Мн., 1972.

Савецкая Беларусь: [Фотаальбом]. Мн., 1972 / Бел., рус.

Песня Дзвіны: Раман. Мн., 1975. Рэц.: Сталяроў М. Песня пра Дзвіну // Беларусь. 1975. № 8; Мартинович А. Свой след на земле // Дружба народов. 1976. № 8.

Мінск: [Фотаальбом]. Мн., 1975 / Бел., рус., англ., фр., ням.

Крынічка: Апавяданні. Мн., 1983.

Братэрства; Рэха ў гарах; Вяснянка: Аповесці. Мн., 1987.

Крынічка: Апавяданні. Мн., 1990.

1.3.

1925. Пра «Малады араты»: [Верш]; «Малады араты» у нашай вёсцы // Малады араты. 1925. № 17—18.

На беларускай мове. Александровіч А. Беларуская савецкая паэзія // ЛіМ. 1936. 23 лют.; Бечык В. Глядзеў праз сэрца час... // Бечык В. Свет жывы і блізкі. Мн., 1974; Яго ж. Паэзія шчырасці // Чырв. змена. 1965. 27 студз.; Яго ж. Прад высокаю красою... // ЛіМ. 1973. 8 сак.; Яго ж. Чытаючы паэзію Уладзіміра Хадыкі // Сборник научных работ БГУ. Вып. 2. Мн., 1967; Бярозкін Р. Вершы Уладзіміра Хадыкі // ЛіМ. 1956. 12 мая; Яго ж. З краінай поўны дагавор // Хадыка У. Вершы. Мн., 1969; Яго ж. Тры паэты // Маладосць. 1964. № 12; Яго ж. Уладзімір Хадыка // Бярозкін Р. Кніга пра паэзію. Мн., 1974; Верабей А. [Бія-бібліяграфічная нататка да 80-годдзя нараджэння] // Полымя. 1985. № 1; Яго ж. Жывы агонь паэтавай душы: (Да 80-годдзя з дня нараджэння Ул. Хадыкі) // ЛіМ. 1985. 4 студз.; Яго ж. Уладзімір Хадыка // Беларускія пісьменнікі і літаратурны працэс 20—30-х гадоў. Мн., 1985; Г. П. Устаноўкі, што патрабуюць перагляду // ЛіМ. 1933. 16 кастр.; Гарэцкі М. «Маладняк» за пяць гадоў. 1923 — 1928 // Максім Гарэцкі: Успаміны, артыкулы, дакументы. Мн., 1984. С. 293—294; Гілевіч Н. Акрыленая рэвалюцыяй: (Паэзія «Маладняка»). Мн., 1962. С. 109—111, 169—170; Глебка П. За ідэйную глыбіню ў нашай творчасці // ЛіМ. 1936. 28 сак.; Гніламёдаў У. Традыцыі і наватарства. Мн., 1972. С. 71; Грахоўскі С. Другому сэрцу перадам // ЛіМ. 1980. 4 студз.; Зарыцкі А. Жылі-былі паэты // Зарыцкі А. За словам — пада-

рункам. Мн., 1985; Карпачоў М. «Я люблю» Ул. Хадыкі: Слова чытача // ЛіМ. 1936. 8 ліп.; Клімковіч. Змаганне за больш высокую якасць // Там жа. 1936. 7 крас.; Крапіва К. За здаровую, прынцыповую крытыку // Там жа. 1936. 31 сак.; Куніцкі С. Аналізаваць творчы метад пісьменніка // Там жа. 1936. 28 сак.; Яго ж. Змагацца за якасць кожнага слова мастацкай літаратуры // Там жа. 1934. 6 крас.; Кучар А. Крызіс ідэалістычнага светапогляду: (Уладзімір Хадыка) // Кучар А. Вялікая перабудова. Мн., 1933; Яго ж. Уладзімір Хадыка // Полымя рэвалюцыі. 1932. № 2; Ларчанка М. Пра паэзію ў «Полымі рэвалюцыі» // ЛіМ. 1934. 12 лют.; Над чым працуюць паэты // Там жа. 1932. 15 чэрв.; Пісьменнікі Савецкай Беларусі: Кароткі даведнік. Мн., 1981; Плашчынскі І. Слова пра новы дзень паэта // ЛіМ. 1935. 23 снеж.; Пруднікаў П. Сэрца паэта: Да 80-годдзя з дня нараджэння У. Хадыкі // Чырв. змена. 1985. 6 студз.; Становішча мастацкай літаратуры // Палес. праўда. 1933. 4 крас.; Хатулёў П. Рэалізаваць указанні «Праўды» // ЛіМ. 1936. 22 сак.; Яго ж. «Трамыліны таямніц»: (Творчасць Ул. Хадыкі) // Там жа. 1934. 12 крас.; Хведаровіч М. Натхнёныя песні: Да 60-годдзя з дня нараджэння Ул. Хадыкі // Там жа. 1965. 5 студз.; Яго ж. Рысы партрэта // Дзень паэзіі — 69. Мн.; Яго ж. Уладзімір Хадыка // Хведаровіч М. Незабыўнае. Мн., 1976; Шукліна Н., Кабаковіч А., Шпакоўскі І. Паэзія абнаўлення свету. Мн., 1981. С. 169, 170, 181, 182; Шушкевіч С. Старонкі біяграфіі // Полымя. 1964. № 12; Яго ж. Уладзімір Хадыка // Шушкевіч С. Выбр. тв.: У 2 т. Мн., 1978. Т. 2; «Я люблю» У. Хадыкі // ЛіМ. 1936. 8 ліп.; Ярош М. Янка Купала і беларуская паэзія. Мн., 1971. С. 205—206; Ярош М., Бечык В. Беларуская савецкая лірыка. Мн., 1979. С. 91—92.

На польскай мове. Jasieński B. O poetach białoruskich / Tł. K. Jaworski // Kamena. 1935. Nr 7; F. O. Wyścig donosicielstwa // Słowo. 1937. Nr 182.

На рускай мове. Звонак А. Песни остаются молодыми: (К 60-летию со дня рождения А. Дудара и В. Хадыки) // Неман. 1964. № 6.

2.4.

Бічэль-Загнетава Д. Хадыкі: [Верш] // Бічэль-Загнетава Д. Загасцінец. Мн., 1985; Яго ж. Уладзіміры — Хадыка і Жылка: [Верш] // ЛіМ. 1979. 16 ліст.; Яго ж. Хадыка і Жылка: [Верш] // Бічэль-Загнетава Д. Дзе ходзяць басанож. Мн., 1983; Купала Я. Нібы эпіграмы: Валодзю Хадыку: [Верш] // Купала Я. Зб. тв.: У 7 т. Мн., 1974. Т. 4; Таўбін Ю. Занатоўкі: [Верш] // Таўбін Ю. Мн., 1969; Хведаровіч М. Уладзіміру Хадыку: [Верш] // Хведаровіч М. Выбр. тв.: У 2 т. Мн., 1974. Т. 2.

3.1.

БДА, ф. 205, воп. 3, спр. 717. *З. У. Драздова.*

ХАЛІП УЛАДЗІМІР

Халіп Уладзімір Трафімавіч (н. 7.10. 1939, в. Двор Пліна Ушацкага р-на Віцебскай вобл.), драматург, мастацтвазнавец, празаік, публіцыст. Член Саюза журналістаў Беларусі з 1961, Саюза кінематаграфістаў Беларусі з 1978. Кандыдат мастацтвазнаўства (1975). Піша на беларускай і рускай мовах.

Нарадзіўся ў сялянскай сям'і. Пасля заканчэння сярэдняй школы (1956) працаваў у мясцовым калгасе. З 1957 загадчык Плінскага сельскага клуба. У 1958 паступіў на аддзяленне журналістыкі БДУ (скончыў у 1963). У 1961, яшчэ студэнтам, прыняты ў штат рэдакцыі газеты «Чырвоная змена», дзе працаваў да 1964 (літсупрацоўнік, загадчык аддзела). У 1964—65 служыў у Савецкай Арміі. Пасля звальнення ў запас зноў працаваў загадчыкам аддзела ў газеце «Чырвоная змена». У 1965—68 вучыўся ў аспірантуры Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору АН БССР. Быў уласным карэспандэнтам газеты «Советская культура» па Беларусі (1968—70), інструктарам аддзела культуры ЦК КПБ (1970—72), галоўным рэдактарам Дзяржкамітэта Савета Міністраў БССР па кінематаграфіі (1972—81), галоўным рэдактарам сцэнарнай майстэрні кінастудыі «Беларусьфільм» (1981—87). З 1987 мастацкі кіраўнік студыі дакументальных фільмаў «Летапіс». Абараніў кандыдацкую дысертацыю на тэму «Інсцэніроўка твораў беларускай мастацкай літаратуры».

У. Халіп дэбютаваў у друку аднаактовай п'есай «Адрачэнне» (1961). Выступае на старонках рэспубліканскіх перыядычных выданняў па праблемах тэатра, кіно. Даследуе заканамернасці сцэнічнага ўвасаблення «недраматургічных» твораў, ана-

лізуе спектаклі, у аснове якіх раманы і аповесці беларускіх пісьменнікаў («Радок, прачытаны тэатрам»). Аўтар лібрэта опер «Джардана Бруна» (музыка С. Картэса, адзначана 2-й прэміяй на ўсесаюзным конкурсе музычна-сцэнічных твораў, пастаўлена тэатрам оперы і балета БССР у 1977), «Матухна Кураж і яе дзеці» (пастаўлена тэатрамі Каўнаса, Кішынёва, Якуцка), «Візіт старой дамы» (паводле Ф. Дзюрэнмата). Напісаў сцэнарыі двухсерыйнага мастацкага фільма «Полымя» (сааўтары Г. Бураўкін, Ф. Конеў, пастаўлены ў 1975 рэжысёрам В. Чацверыковым на кінастудыі «Беларусьфільм», адзначаны галоўнай прэміяй на 8-м Усесаюзным кінафестывалі), пяцісерыйнага тэлефільма «Нас выбраў час» (сааўтар А. Петрашкевіч, пастаўлены ў 1976—78 рэжысёрам М. Пташуком на той жа кінастудыі), прысвечаных партызанскаму руху ў гады фашысцкай акупацыі. Па сцэнарыях У. Халіпа на «Беларусьфільме» пастаўлены мастацкі фільм «Мама, я жывы!» (1985, рэжысёр І. Дабралюбаў); дакументальныя фільмы «Брэсцкая крэпасць» (1975, сааўтар і рэжысёр І. Пікман), «Тры колеры радасці» (1979, сааўтар А. Кудравец, рэжысёр І. Вейняровіч), «Саюз рэспублік і сэрцаў» (1982, сааўтар А. Кудравец, рэжысёры І. Вейняровіч, В. Каралёў, І. Шышкоў); кароткаметражныя фільмы «Стаялі насмерць» (1976, рэжысёр І. Пікман), «Я, салдат Брэсцкай крэпасці...» (1980, рэжысёр І. Пікман), «Чырвоны сшытак» (1981, рэжысёр І. Пікман, адзначаны прызам за лепшы сцэнарый на 14-м Усесаюзным кінафестывалі) і інш. Піша п'есы пра маральна-этычныя праблемы нашай сучаснасці («Цень гары», пастаўлена Беларускім тэатрам імя Я. Коласа ў 1987), выдатных дзеячаў мінулага («Ратнікі вечнасці» пра М. Гусоўскага).

Жыве ў Мінску.

Л. С. Савік.

Бібліяграфія

1.2.

Строка, прочтенная театром. Мн., 1973. Рэц.: Каладзінскі М. Мастацкая проза і сцэна // ЛіМ. 1973. 14 снеж.; Станюта А. Сцена и литература // Неман. 1974. № 9.

Инсценировка произведений белорусской художественной литературы: Автореф. дис. ... канд. филол. н. Мн., 1974.

Кортес С. Джордано Бруно: Опера в 2-х д. 6-ти карт. с прологом и эпилогом. Либретто В. Халипа; Клавир (с пением). Л., 1982.

1.3.

1961. Адрачэнне: П'еса ў адной дзеі // Чырв. змена. 29 снеж.

1962. Хорошая запеўка // Чырв. змена. 25 снеж.

1963. Жывыя дрэвы // Чырв. змена. 9 кастр.

1966. Там, дзе прагучаў «Турэцкі марш» // Чырв. змена. 27 сак.; Мяцежная муза Ігната // Там жа. 27 вер.

1967. «Сэрца на далоні» // Чырв. змена. 1 лют.; Чырвоныя коннікі фрэсак // Там жа. 10 чэрв.; Бліскавіца над рэйкамі // Там жа. 27 ліп.; Сейбіты чыстага полымя // Там жа. 21 вер.; Летапісцы быліннага часу // Там жа. 4 кастр.; Акварэлі далёкіх дарог // Там жа. 14 снеж.

1968. Тэма народнага гераізму ў літаратуры і тэатры [Беларусі] // Весці АН БССР. Сер. грамад. н. № 5; Колокола над пеплом // Сов. культура. 28 дек.; Старонкі легендарнай біяграфіі // Чырв. змена. 13 студз.; Граніт і дрэва // Там жа. 16 крас.; Імя гордае — Мсціслявец: Дакум. аповесць // Там жа. 25, 26, 29 мая; 2, 4—6, 8 чэрв.; Драматург прынёс п'есу // Там жа. 7 ліп.

1969. След на земле // Неман. № 9; Столетие пройдя до половины: Заметки с юбилейной художественной выставки «50 лет БССР и КПБ» // Сов. культура. 20 февр.

1970. Театр, повествующий о подвиге // Сов. культура. 14 февр.

1971. Стоит ли инсценировать? // Неман. № 9.

1972. Еще горит Хатынь... // Неман. № 5.

1974. Полымя: Фрагменты сцэнарыя двухсерыйнага маст. фільма // ЛіМ. 1, 8, 15, 22, 29 сак., 5 крас. / Сааўт. Г. Бураўкін, Ф. Конеў.

1982. И назван город Любоградом // Сов. Бел. 6 марта.

2.3.

На беларускай мове. Аўдзееў І. Пра незабыўнае: дубль другі // Чырв. змена. 1985. 31 снеж.; Бадзічка Л. Іх выбраў час // ЛіМ. 1979. 2 ліст.; Даніленка М. Полымя народнага гневу // Гомел. праўда. 1975. 8 мая; Крупеня Я. Дзяцінства, апаленае вайной // Наст. газ. 1985. 28 жн.; Яго ж. Ішла вайна народная... // Звязда. 1979. 13 ліст.; Яго ж. Полымя партызанскай барацьбы // Мін. праўда. 1974. 24 жн.; Нячай В. Полымя народнага змагання // Звязда. 1974. 8 жн.; Плаўнік А. Іх выбраў час // Вяч. Мінск. 1980. 23 вер.; Пятроў У. Тры колеры радасці // Звязда. 1979. 27 вер.; Саламаха У. Рэспублік і сэрцаў саюз // Там жа. 1982. 14 ліст.; Хвайніцкі В. Парад гісторыі самой // Вяч. Мінск. 1979. 4 кастр.

На рускай мове. В пламени гнева народного // Сов. Молдавия. 1975. 22 апр.; Нечай О. Первая осечка: «Барбаросса» // Знамя юности. 1975. 3 сент.

З. У. Драздова.

ХАРКОЎ ПЁТР

Харкоў Пётр Андрэевіч (15.8.1922, ст. Хацень Сухініцкага р-на Калужскай вобл.— 10.1.1983, Мінск; пахаваны на Паўночных могілках), драматург, кінадраматург, паэт, публіцыст. Член СП Беларусі з 1961. Пісаў на рускай мове.

Нарадзіўся ў сям'і чыгуначніка. З 1931 жыў у Маскве. Адукацыю атрымаў у Маскоўскім тэатральна-тэхнічным вучылішчы, якое скончыў у 1939, і Літаратурным інстытуце імя М. Горкага (1940—43). Потым быў карэспандэнтам армейскай газеты «На штурм» (1943—45). Салдат і журналіст П. Харкоў прайшоў франтавую дарогу ад Арлоўска-Курскай дугі да Усходняй Прусіі. У пасляваенны час працаваў у газеце «Защитник Родины» (да 1960), асабістым карэспандэнтам «Советской культуры» па Беларусі (1963—65). З 1966 да 1983 член рэпертуарна-рэдакцыйнай калегіі Міністэрства культуры БССР. Узнагароджаны ордэнамі Айчыннай вайны 1-й і 2-й ступеняў і медалямі.

Творчы старт П. Харкова быў надзіва шчаслівы. Семнаццацігадовым юнаком ён прыняў удзел ва Усесаюзным конкурсе на лепшае апавяданне пра чыгуначнікаў і атрымаў прэмію за свой твор «На далёкім раз'ездзе». Друкавацца пачаў у 1940 у маскоўскіх выданнях (публікацыі не выяўлены). Першая выяўленая публікацыя — артыкул «Жывы Маякоўскі: (Да 17-годдзя з дня смерці)», надрукаваны ў газеце «Заря» (1947). Доўгі час працаваў як ваенны публіцыст. З сярэдзіны 1950-х гадоў захапіўся тэатрам. Драматычныя творы П. Харкова ставіліся на сцэнах беларускіх тэатраў. Сярод іх «Ад імя пакалення», «Вечны агонь», музычныя камедыі «Спявае жаўрук», «Рэпартаж з пекла» (музыка Я. Глебава). Яго кінааповесць пра генерала Карбышава «Пакуль б'ецца сэрца» атрымала 2-ю прэмію на Усесаюзным конкурсе на лепшы твор для кіно. У шматстайнай спадчыне пісьменніка ёсць кантаты, канцэртныя маналогі, вершы, паэмы, песні. У апошнім жанры П. Харкоў супрацоўнічаў з кампазітарамі В. Дарохіным («Салдацкае сэрца»), Д. Камінскім («Вялікае імя»), І. Лучанком («Любімы, просты і вялікі»), Ю. Семянякам («Песня воінаў ПВА», «Песня партызан») і інш. Паэма П. Харкова «Кветкі і попел» — маналог салдата, які загінуў у час Вялікай Айчыннай вайны — адрасавана моладзі наступных пакаленняў. Усёй сваёй творчасцю пісьменнік сцвярджаў непарыўную сувязь пройдзенага і перажытага з сучаснасцю і будучыняй.

Л. А. Бялевіч.

Бібліяграфія

1.2.

От имени поколения: Романтическая трагедия в 3 д., 10 карт. Мн., 1962. Рэц.: Белашэеў А. Пераклічка пакаленняў // ЛіМ. 1963. 12 лют.; Колосов А. Слово о вечной любви // Во славу Родины. 1962. 5 дек.; Сергеев П. Пьеса о вечно живых // Сов. Бел. 1963. 22 мая.

Вечный огонь: Драматическая поэма в 3 д. с прологом. Мн., 1967.

Подвиг без награды: Киноповесть, пьесы. Мн., 1983.

1.3.

1947. Живой Маяковский: (К 17-летию со дня смерти) // Заря. 15 апр.; Сердце нашей Родины: Очерк // Там жа. 1 мая; Москва в живописи: [Очерк] // Там жа. 7 снеж.

1948. Люди нашего времени // Заря. 4 дек.

1949. Поэма Н. Грибачёва // Заря. 22 февр.

1954. Боевое оружие // Сталин. молодежь. 15 сент.

1959. Новогоднее слово солдата Смыслова: [Верш] // Во славу Родины. 1 янв.; «В едином могучем стремленье...»: [Верш] // Там жа. 22 апр.; Сказание о городе Минске: Отрывки из киносценария // Там жа. 3 июля; От имени однополчан: [Верш] // Там жа. 17 сент.

1960. Новогодний прогноз: [Верш] // Во славу Родины. 1 янв.; Клянутся воины Отчизне: [Верш] // Там жа. 19 янв.; Солдатская слава: [Верш] // Там жа. 18 марта; «Стоит Ильич на постаменте...»: [Верш] // Там жа. 15 апр.; В угожденье богу злата...: [Верш] // Там жа. 30 июля; Великий полет: [Верш] // Там жа. 23 авг.; Счастливая наша звезда: [Верш] // Там жа. 3 дек.

1961. Взлетел корабль в космические дали: [Верш] // Во славу Родины. 13 апр.; Слушай, сердце: [Верш] // Там жа. 11 авг.

1962. «Мчится время полным ходом...»: [Верш] // Во славу Родины. 1 янв.; Дороже жизни: [Верш] // Там жа. 18 марта; «Такого, друзья, пятилетья...»: [Верш] // Там жа. 4 окт.; Слово солдата в канун славной даты: [Верш] // Там жа. 6 нояб.

1963. Вечный огонь: Драматическая поэма // Во славу Родины. 13, 14, 17, 18, 20, 21, 24, 26, 28 июля; Минск октябрьский: [Верш] // Там жа. 6 нояб.; В строю навечно // Там жа. 29 дек.; О любви и призвании // Сов. Бел. 23 янв.; Книга о белорусском театре: [Рэц. на кн.: Нефед В. Современный белорусский театр. Мн., 1961] // Сов. культура. 15 янв.

1964. Слово о городе Минске // Во славу Родины. 30 июня, 1, 2 июля; Космических подвигов вехи: [Верш] // Там жа. 14 окт.

1965. Двадцатая весна: [Верш] // Во славу Родины. 10 мая; Бессмертный гарнизон: [Верш] // Там жа. 18 сент.; Брестскому театру — двадцать лет // Сов. культура. 2 марта.

1966. Ровесникам Победы: [Верш] // Во славу Родины. 9 мая.

1967. Неизвестный солдат: [Верш] // Маг. праўда. 5 снеж.

1968. Неизвестный солдат: [Верш] // Чтоб всегда было солнце. Мн.; Отчизны верные сыны: [Верш] // Во славу Родины. 28 нояб.

1969. «Нам сегодня весь мир благодарен...»: [Верш] // Во славу Родины. 15 янв.

1970. Баллада о Вечном огне: [Верш] // Путь к победе. Мн.

1972. Порядок в танковых войсках: [Верш] // Сов. Бел. 15 авг.; Раздумья о любви: [Верш] // Там жа. 19 окт.

1975. Колокольный призыв Хатыни: [Верш] // Дзень паэзіі — 75. Мн.; У могилы солдата: [Верш] // Рэха ў граніце. Мн.

1977. Гимн поколению: [Верш] // Дзень паэзіі — 77. Мн.; От имени поколения: [П'еса] // Сов. Крым. 20 февр.

1980. «Добрых душ врачуя боль і раны...»: [Верш] // Дзень паэзіі — 80. Мн.

1982. «Умирали солдаты под Вязьмою...»: [Верш] // Знамя юности. 15 авг.

1.5.

На беларускую мову. Кніга вялікага маштабу // Зара. 1948. 17 студз.; «Ваўкі і авечкі» // Там жа. 1948. 18 студз.; Музей імя Суворава // Там жа. 1948. 25 студз.; Вялікі пісьменнік і патрыёт: (Да 3-годдзя з дня смерці А. Н. Талстога) // Там жа. 1948. 4 лют.; Паэма Н. Грыбачова // Там жа. 1949. 22 лют.; «Любоў Яравая» // Звязда. 1951. 29 ліп.; Шалёныя грошы // Там жа. 1951. 6 снеж.; Аповесць пра Гастэлу: [Рэц. на кн.: Шпанов И. За жизнь. М., 1950] // ЛіМ. 1951. 8 вер.; Суворавцы // Маладосць. 1958. № 8; Сусветнае яднанне моладзі // Беларусь. 1954. № 11; «Пакуль б'ецца сэрца»: Урывак са сцэнарыя // ЛіМ. 1957. 19 студз.; Ад імя пакалення: Трагедыя // Там жа. 1958. 22 лют.; Слова ў страі: Да 70-годдзя з дня нараджэння Ільі Эрэнбурга // Там жа. 1961. 31 студз.; Пачатак подзвігу // Там жа. 1961. 17 сак.; Велічная слава // Там жа. 1961. 9 мая; Вечны агонь: Драматычная паэма ў 3 дзеях з пралогам // Там жа. 1963. 28 мая; Вечная слава подзвігу // Там жа. 1963. 24 вер.; Міязмы «святога духа» // Там жа. 1963. 1 кастр.; А побач — малітоўны дом // Там жа. 1964. 10 ліп.; Вецер веку // Там жа. 1966. 1 студз.; Настаўнік // Там жа. 1969. 30 мая; Ля магілы салдата: [Верш] / Пер. П. Макаль // Рэха ў граніце. Мн., 1975.

2.3.

На беларускай мове. Белашэеў А. Пераклічка пакаленняў // ЛіМ. 1963. 12 лют.; Макаль П. Пятру Харкову — 50 // Там жа. 1972. 11 жн.; Пісьменнікі Савецкай Беларусі. Мн., 1981; Прыходзька П. Услаўляючы подзвіг // Вяч. Мінск. 1972. 15 жн.; Пятру Харкову — 60 // ЛіМ. 1982. 13 жн.; У гэтым месцы // Беларусь. 1972. № 8.

На рускай мове. Вольский А. Верность памяти храня: К 60-летию со дня рождения П. Хорькова // Сов. Бел. 1982. 13 авг.; Нефед В. О драматических произведениях Петра Хорькова // Хорьков П. Подвиг без награды. Мн., 1983. *В. І. Козіч.*

ХАРУЖАЯ ВЕРА



Харужая Вера Захараўна [псеўд.: Антолька, Вера, Вераніка Карчэўская, Г. С. Корнилова, Падпольнік, Польская комсомолка, Алеся Шыпшына, Al. Szypszyna, Komsomołka; polska 14(27).9.1903, Бабруйск — снежань 1942, Віцебск], публіцыст, дзеяч рэвалюцыйнага руху ў Заходняй Беларусі, адзін з кіраўнікоў Віцебскага антыфашысцкага падполля ў гады Вялікай Айчыннай вайны, Герой Савецкага Саюза (1960, пасмяротна). Пісала на беларускай, рускай і польскай мовах.

Нарадзілася ў сям'і царскага паліцэйскага Захара Баніфацьевіча Харужага, які потым быў звольнены са службы за адмову страляць у бязузбройных дэманстрантаў. Па збегу жыццёвых акалічнасцей сям'я Харужых вымушана была пакінуць Бабруйск і пераехаць у Мазыр, дзе прайшлі дзіцячыя і юнацкія гады В. Харужай. Пасля заканчэння Мазырскай адзінай працоўнай школы

2-й ступені (1919) настаўнічала ў в. Пагарэлае Мазырскага пав. Разам з мясцовымі сялянамі актыўна змагалася супраць польскіх акупантаў, за што трапіла пад нагляд дэфензівы. У складзе часцей асобага прызначэння і Камуністычнага батальёна ўдзельнічала ў баях супраць арміі Булак-Балаховіча (1920). Тады ж уступіла ў камсамол. Некаторы час загадвала аддзеламі палітасветы Мазырскага і Бабруйскага павятовых камітэтаў КСМБ. Член КПСС з 1921. З 1922 жыла ў Мінску, вучылася ў рэспубліканскай саўпартшколе (скончыла ў 1923). У 1922—23 працавала ў апараце ЦК камсамола Беларусі, адначасова была членам рэдкалегіі газеты «Малады араты», супрацоўнічала ў часопісе «Полымя», газеце «Чырвоная змена», была рэдактарам рукапіснага часопіса «Партшкольный мирок», а таксама вяла літаратурныя заняткі ў Мінскім доме юнацтва і камсамольскай камуны. У лютым 1924 В. Харужая накіравана на падпольную работу ў Заходнюю Беларусь. Яна нелегальна перайшла савецка-польскую граніцу і адразу ж уключылася ў падпольную дзейнасць кампартыі і камсамола Зах. Беларусі, стала прафесійнай рэвалюцыянеркай. Яе адразу кааптавалі ў склад ЦК камсамола Заходняй Беларусі, у чэрвені 1924 выбралі сакратаром ЦК КСМЗБ і членам ЦК камсамола Польшчы, членам ЦК Кампартыі. Яна пісала і распаўсюджвала адозвы з заклікам да барацьбы супраць акупацыйнага рэжыму ў Зах. Беларусі, выступала ў нелегальным друку, на мітынгах і сходах, стварала партыйныя і камсамольскія ячэйкі ў гарадах і вёсках. Пры актыўным удзеле В. Харужай камсамол Заходняй Беларусі пачаў выдаваць газету «Малады камуніст» (на беларускай, рускай і яўрэйскай мовах). Яна супрацоўнічала ў часопісе «Камуністычны інтэрнацыянал» і газеце «Чырвоны сцяг», рыхтавала, а затым кіравала ходам II канферэнцыі КСМЗБ (Вільня, 1925). У час падрыхтоўкі Беластоцкай акруговай канферэнцыі КПЗБ В. Харужая арыштавана дэфензівай (15.9. 1925) і пасля 15-месячнага зняволення паводле рашэння суда (Брэст, 1927) прыгаворана да 8 гадоў турэмнага зняволення. На адкрытых судовых працэсах у Брэсце (1927) і ў Беластоку (1928) яна выступіла з палымянымі рэвалюцыйнымі прамовамі ў абарону працоўных, з выкрыццём антынароднай палітыкі польскага санацыйнага рэжыму ў Заходняй Беларусі. Адбывала пакаранне ў катаржнай жаночай турме горада Фардон. Там яна вяла заняткі палітграматы сярод членаў турэмнай камуны, рэдагавала рукапісны часопіс «На барыкады!», вяла перапіску з роднымі і сябрамі па агульнай справе. Адначасова распачала стварэнне задуманай ёй серыі нарысаў пра жыццё і барацьбу моладзі Заходняй Беларусі. У 1932 у выніку абмену палітвязнямі паміж урадамі СССР і Польшчы В. Харужая выйшла на волю і вярнулася ў Мінск. Тут яна цалкам прысвяціла сябе грамадска-палітычнай дзейнасці, актыўна супрацоўнічала ў друку. У 1935 па партыйнай пуцёўцы накіравана ў Казахстан — на «Балхашбуд», адзін з важнейшых аб'ектаў 2-й пяцігодкі. 1937 год прынёс рэвалюцыянерцы суровае выпрабаванне — яна была беспадстаўна абвінавачана ў антысавецкай дзейнасці і трапіла ў турму. Аднак пасля з'яднання Заходняй і Усходняй Беларусі ёй дазволілі вярнуцца на радзіму. Працавала на партыйнай рабоце ў Целяханах і Пінску, дзе яе застала Вялікая Айчынная вайна. В. Харужая актыўна ўключылася ў барацьбу з фашысцкімі акупантамі, увайшла ў склад кіраўніцтва партызанскага атрада В. Каржа. З вясны 1942 працавала ў апараце ЦК КП(б)Б у Маскве, затым накіравана ў варожы тыл. З верасня 1942 яна ўзначаліла групу антыфашысцкага падполля ў Віцебску. 13.11. 1942 арыштавана і закатавана ў фашысцкім засценку. Перад адыходам у варожы тыл напісала шэраг запісак («Светазарная мая Беларусь», «Камуністы адказваюць за ўсіх дзяцей на свеце» і інш.), якія прасякнуты пачуццём вялікай любові да Беларусі, верай у перамогу гуманістычных ідэалаў.

Першыя публікацыі В. Харужай датуюцца 1922. Яе артыкулы і літаратурныя замалёўкі 1922—23 вызначаюцца страснасцю, эмацыянальнасцю, шчырай верай у новае жыццё. З кастрычніка 1922 друкавалася ў газеце «Юны араты», разлічанай на маладога вясковага чытача. На старонках перыядычных выданняў яна выступала за стварэнне ў вёсках камсамольскіх арганізацый, шмат увагі аддавала ліквідацыі непісьменнасці, школьнай адукацыі. Змясціла серыю антырэлігійных нарысаў і замалёвак («У храме божым», «Марш, марш упярод»), у якіх імкнулася асэнсаваць праблему ўплыву рэлігіі на моладзь. Праўда, часта публіцыстцы не ўдавалася пазбегнуць вузкасацыяльных установак, зададзенасці ацэнак і схематызму. Многа публікавалася ў выданнях Заходняй Беларусі. У 1930, калі В. Харужая знаходзілася ў польскай турме, сябры ў Савецкай Беларусі сабралі і выдалі асобнай кнігай частку яе пісем пад назвай «Лісты на волю». Гэта кніга, прасякнутая верай у будучыню, гордасцю за поспехі Савецкай Беларусі, у 1930-я гады перавыдавалася на беларускай, польскай, рускай мовах. Вылхаваўчае значэнне «Лістоў...» высока ацаніла Н. Крупская. Вярнуўшыся з турэмнага зняволення, В. Харужая завяршыла частку пачатых у турме публіцыстычных нарысаў і выдала іх брашурамі «За Чырвоны Кастрычнік у Заходняй Беларусі», «Мы — маладая гвардыя рабочых і сялян», «Увага, школьнікі» і інш., у якіх паказала ролю і месца моладзі ў рэвалюцыйнай барацьбе. Публіцыстыцы В. Харужай гэтага перыяду характэрны дзейснасць, аператыўнасць, перакананасць, экспрэсіўнасць. Яе артыкулы і брашуры выклікалі вялікую цікавасць у чытача, іх часта абмяркоўвалі на сходах і пасяджэннях. Частка публіцыстычных твораў В. Харужай сабрана ў кнізе «Слаўная дачка беларускага народа», якая неаднаразова перавыдавалася.

Памяць В. Харужай увекавечана ў розных гарадах нашай краіны. Помнікі і мемарыяльныя дошкі ёй устаноўлены ў Бабруйску, Брэсце, Віцебску, Мазыры, Мінску, Пінску. Яе імем названы вуліцы, плошчы і школы ў Алма-Аце, Бабруйску, Брэсце, Віцебску, Мазыры, Мінску, а таксама цеплаход.

М. А. Варвашэвіч.

Бібліяграфія

1.2.

Письма на волю. М., 1932 / Пад псеўд. Польская комсомолка.

Мы — маладая гвардыя рабочых і сялян. Вільня, 1933 / Пад псеўд. Ал. Шыпшына.

Увага, школьнікі! Беласток, 1933 / Пад псеўд.

Антолька.

О Czerwony Październiernik na Białorusi Zachodniej: W szesnastą rocznicę Wielkiej Rewolucji Październikowej. Wilno, 1933 / Пад псеўд. Al. Szypszyna.

Listy z więzienia. M., 1934 / Пад псеўд. Komsomołka polska.

Письма на волю. М., 1957. Рэц.: Буран В. Лісты Веры Харужай // Чырв. сцяг. 1958. 17 чэрв.

Пісьмы на волю. Мн., 1958. Рэц.: Бачыла А. Пісьмы на волю // Полымя. 1958. № 7.

Слаўная дачка беларускага народа: Пісьмы, артыкулы В. Харужай і ўспаміны аб ёй. Мн., 1960.

Славная дочь белорусского народа: Письма, статьи В. Хоружей и воспоминания о ней. Мн., 1960. 2 доп. изд. Мн., 1962. Рэц.: Алферова Л. Жизнь — подвиг // Парт. жизнь. 1961. № 15—16; Алексяевіч І. Салдат партыі // Нар. асвета. 1961. № 2; Афанасьев А. Счастье — это борьба // Знамя юности. 1962. 26 авг.; Бурносаў В. Рысы легендарнага вобраза // Беларусь. 1961. № 2; Васильев Б. Солдат партии // Молодой коммунист. 1961. № 5; Васільеў П. Будзённае-гераічнае Звязда. 1961. 27 крас.; Гуркович В. Жизнь — подвиг // Неман. 1961. № 4; Дастанка М. Гераічнае жыццё // ЛіМ. 1961. 6 студз.; Досін М. Цудоўнае жыццё гераіні // Полымя. 1961. № 3; Ільеўскі З. Гераічнае жыццё // Зара. 1961. 26 лют.; Казлоў А. Жыццё-легенда // Мін. праўда. 1961. 12 крас.; Новиков И. Жизнь — подвиг // Правда. 1961. 6 апр.; Самуцін В. Палымяная патрыётка // Камуніст Бел. 1961. № 4; Тоўсцік А. Мяцежнае сэрца // Чырв. змена. 1961. 28 сак.

Listy z więzienia; Notatki; Wspomnienia o Wierze. Warszawa, 1961; Рэц.: Barszczewski A. // Rocz. Białostocki. 1964. T. 5; Ховратович И. Героям поклоняются все // Сов. Бел. 1962. 17 янв.

Письма на волю. М., 1962. Рэц.: Зорын А. Слаўны лёс кнігі // Гомел. праўда. 1963. 27 вер.

Статьи и письма о комсомоле. Мн., 1970; 2 изд. Мн., 1975.

1.3.

1922. Последняя боевая страница: (Из жизни мозырской организации) // Красная смена. 1922. 22 дек.

1923. Дальше во флот; Проводы комсомольцев во флот // Красная смена. 1923. 6 янв.; В храме Господнем // Там жа. 14 янв.; За год // Там жа. 3 февр.; Марш, марш, вперед!; Рабочая молодежь протестует против войны; Шеф Красного Флота — вся молодежь; Долой синагогу, да здравствуй рабочий клуб // Там жа. 21 февр.; Детвора организуется // Там жа. 18 апр.; Как мы приняли первый номер: [Успаміны] // Там жа. 5 мая.

1928. «Мы не папросім літасці!»: (З ліста) // Сав. Бел. 11 сак.

1933. Лісты з турмы: (1927/28 г.) // Хрэстаматыя рэвалюцыйнай літаратуры Заходняй Беларусі. Мн.

1941. Святкаванне 1 мая на Піншчыне ва ўмовах панскага гнёта // Палес. праўда. 25 крас.

1957. Письма // Сов. Отчизна. № 2.

1959. [Нататкі] // За вярт. на Радзіму. № 89; Светозорная моя Беларусь...; Лучше быть вдовой героя, чем женой труса; Коммунисты отвечают за всех детей на свете // Правда. 25 нояб.

1960. Таварыш Бернацкі // Мін. праўда. 13 вер.

1961. У чаканні вызвалення: Старонкі з дзённіка // Голас Радзімы. № 17.

1963. Письма В. З. Хоружей из Витебского подполья // Говорят погибшие герои. М. 2 доп. изд.; Камуністы адказваюць за ўсіх дзяцей на свеце: З запісак В. Харужай. 1942 г.; Пісьмы на волю: Акцябратам і піянерам; Школьнай настаўніцы В. Трызна // Наст. газ. 28 вер.

1966. Тюрьма пост: (С Интернационалом воспрянет род людской!.. Пять страниц из биографии Интернационала) // Комс. правда. 4 окт.

1967. Пісьмы Веры Харужай // Бярозка. № 3.

1974. Комсомол Западной Белоруссии // Хрэстаматыя па гісторыі беларускай савецкай публіцыстыкі. Мн.

1.5.

На беларускую мову. Лісты на волю / Пер. І. Дубровскі. Мн., 1932 / Пад псеўд. Польская камсамолка.

На польскую мову. Z listów KZM-owki // Życie Partii. 1957. Nr 5.

На ўкраінскую мову. За всіх дітей на світі // Молодь Укр. 1959. 1 груд.

На якуцкую мову. Белоруссия хороун кьыпын Вера Хоружай суруктора / Пер. К. Зохаров // Хотучу Сулус. 1960. № 6.

2.1.

На рускай мове. Жизнь, отданная людям: Рек. список лит. к 75-летию со дня рождения Героя Сов. Союза В. З. Хоружей // Могилев, 1978.

2.2.

На рускай мове. Булацкий Г., Талапина С. Вера Хоружая — революционер, публицист, Мн., 1973. (Бел. публицисты).

В. З. Хоружая: [Фотоальбом]. Мн., 1977.

Жизнь, отданная борьбе. Мн., 1975. Рэц.: Садоўскі Я. // Мін. праўда. 1974. 7 вер.

Новиков И. Вера Хоружая: (Очерк жизни и деятельности пламенной коммунистки). М., 1962. Рэц.: Аляксееў А. Подзвіг патрыёткі // Чырв. змена. 1962. 29 крас.; 2 изд., перераб. М., 1973.

2.3.

На беларускай мове. Анісаў С. Легендарная патрыётка // Звязда. 1963. 27 вер.; Аношкін І. Яе жыццё — подзвіг // Маг. праўда. 1967. 26 снеж.; Арэхва Н. Вера Харужая: (Успаміны) // Гродзен. праўда. 1960. 20 мая; Булацкі І. Жыццё — подзвіг // Вяч. Мінск. 1973. 26 вер.; Булацкі Р., Талапіна С. Палымянае слова — моладзі // Чырв. змена. 1973. 27 вер.; Ваткович Г. Жыццё, аддадзенае барацьбе // Вяч. Мінск. 1978. 27 вер.; Вера Харужая // Беларускі каляндар на 1958 год. Беласток, 1957; Вера Харужая і яе запіскі // Звязда. 1959. 27 ліст.; Гайдук М. Жыццё, аддадзенае змаганню // Ніва. 1973. 30 вер.; Губароўскі В. Як святло яркай зоркі // Звязда. 1966. 15 чэрв.; Даніленка М. Жыццё — факел // Наст. газ. 1969. 24 вер.; Яго ж. Яе псеўданім — Вераніка Карчэўская // Гомел. праўда. 1969. 22 ліп.; Дарафеенка М. Патрыёты Віцебска // Віцеб. рабочы. 1985. 26 ліст.; Дастанка М. Высокі подзвіг // Наст. газ. 1963. 28 вер.; Дворак В. Слаўная зямлячка // За вярт. на Радзіму. 1958. № 74; Досін М. Мужнасці сястра // Беларусь. 1973. № 9; Жураў А. Жыццё на лініі агню // Чырв. змена. 1965. 21 ліст.; Жыццё — подзвіг // Віцеб. рабочы. 1963. 27 вер.; Завадскі А. Бурай народжаная: [Успаміны] // Чырв. змена. 1963. 20 кастр.; Яго ж. Постаць, якая не заціраецца ў памяці // Ніва. 1963. 13 кастр.; Камароў І. Помнік В. З. Харужай // Бярозка. 1969. № 9; Карпаў М. Яны ведалі Веру Харужую // Маг. праўда. 1960. 3 крас.; Кляшторная Р. Адна з першых // Піянер Бел. 1973. 23 жн.; Краўчанка І. Жыццё, аддадзенае барацьбе // Звязда. 1978. 26 вер.; Крупская Н. Палымянае сэрца // Чырв. змена. 1958. 19 сак.; Кэмрад С. Вера Харужая // Чырв. змена. 1959. 22, 25, 26, 28, 29, 31 сак., 1, 2, 5, 7, 8 крас.; Яго ж. Жыццё — подзвіг // Жанчыны Савецкай Беларусі. Мн., 1954; Ласковіч В. Сяброўка Веры Харужай // Звязда. 1963. 13 жн.; Ліст з-за кратаў: Невядомая старонка з біяграфіі В. Харужай // Чырв. змена. 1964. 19 ліп.; Макоўская А. Успаміны пра Веру Харужую // Полымя. 1956. № 9; Маноцкава С. Яна заўсёды ішла першай // Чырв. змена. 1978. 27 вер.; Марудзіч Л. Навечна ў памяці народнай // Віцеб. рабочы. 1978. 28 вер.; Марціновіч А. Жыццё — подзвіг // ЛіМ. 1966. 19 крас.; Міськo П. Яна была такой: Яшчэ пра Веру Харужую // Звязда. 1960. 29 крас.; Мішын М. Назаўсёды ў сэрцы // Чырв. змена. 1973. 30 вер.; На радзіме В. Харужай // За вярт. на Радзіму. 1959. № 94; Найдзёнава Н. Подзвіг яе неўміручы // Віцеб. рабочы. 1973. 27 вер.; Напорка А. Сэрца, аддадзенае людзям // Вяч. Мінск. 1973. 21 вер.; Невядомае пісьмо Веры Харужай // Мін. праўда.

1960. 13 вер.; Новікаў І. Жыццё — подзвіг // Звязда. 1973. 27 вер.; Новыя дакументы пра Веру Харужую // За вярт. на Радзіму. 1960. № 2; Новыя матэрыялы аб Веры Харужай // Голас Радзімы. 1960. № 12; Пачанін С. Слаўная дачка беларускага народа // Камуніст Бел. 1960. № 5; Поляк В. Сказ пра Веру Харужую // ЛіМ. 1970. 25 вер.; Прытыцкі С. Салдат партыі // Голас Радзімы. 1960. № 38; Рубінчык А. Мае сустрэчы з Верай Харужай // Зара. 1960. 10 вер.; СадоўскіЯ. Палымяная журналістка Вера Харужая // ЛіМ. 1960. 5 мая; Селядзіеўская Н., Селядзіеўскі А. Палымяныя радкі Веры Харужай // Чырв. змена. 1980. 29 кастр.; Іх жа. Тут працавала Вера Харужая // Помнікі гіст. і культ. Бел. 1973. № 3; Іх жа. Успаміны пра В. Харужую // Работніца і сялянка. 1971. № 2; Слаўнай дачцэ беларускага народа // ЛіМ. 1969. 30 вер.; Слаўная дачка беларускага народа: (Да 50-годдзя з дня нараджэння Веры Захараўны Харужай) // Сав. Палессе. 1953. 29 вер.; Собаль Ф. Гераіня беларускага народа // Бярозка. 1960. № 6; Сямёнава С. Народная гераіня // Звязда. 1960. 18 мая; Удаченка А. Верная дачка народа: Да 75-годдзя з дня нараджэння Героя Савецкага Саюза Веры Харужай // Беларусь. 1978. № 9; Хадановіч В. Помнік на беразе Балхаша // Беларусь. 1983. № 2; ХаружаяА. Ганаруся сваёй маці. Пісьмо дачкі Веры Харужай // Работніца і сялянка, 1960. № 2; Хаўратовіч І. Новае аб Веры Харужай // Чырв. змена. 1961. 31 мая; Хмялеўская В. Ёю ганарыцца Радзіма // Работніца і сялянка. 1960. № 2; Яго ж. Пісьмо ад Веры // Там жа. 1973. № 9; Швед В. Ушанаванне памяці Веры Харужай // Ніва. 1961. 10 вер.; Я. К. «Лісты на волю» // Палес. праўда. 1932. 10 вер.; Ярохін А. Вышывалі кофтачку для Веры // Работніца і сялянка. 1979. № 11; Яго ж. «За ўсіх дзяцей на свеце...» // Там жа. 1979. № 7; Яго ж. Наш карэспандэнт // Чырв. змена. 1973. 27 вер.

На польскай мове. Masłoŭski R. Imię Wiery Chorążej — symbol męstwa i heroizmu // Czerw. Szt. 1960. 14 maja; Michałowski M. Na Wileńszczyźnie // Z niedawnej przeszłości: Wspomnienia KPP-owców. Wrocław, 1959; R. F. Nowe materiały o działaczce KPZB Wierze Chorużej // Z pola walki. 1960. Nr 1; Zawadzki A. Postać, która nie zaciera się w pamięci: w 60-rocznicę urodzin Wiery Chorużej // Trybuna ludu. 1963. Nr 267.

На рускай мове. Белоус В. Поиск продолжается: Новое о В. Хоружей // Знамя юности. 1967. 24 марта; Боярский Ф., Мухин О. Сердце, отданное людям // Сов. Бел. 1964. 16 авг.; Булацкий Г., Талапина С. Некоторые особенности языка и стиля публицистики В. З. Хоружей // Весн. БДУ. Сер. 4. 1973. № 3; Бычковский П. Окрыленные верой // Знамя юности. 1978. 27 сент.; Васильев Н. Жизнь — подвиг: К 20-летию со дня гибели Героя Советского Союза В. З. Хоружей // Во славу Родины. 1962. 1 дек.; Вдовенко А. Такой ее помню // Заря. 1968. 5 нояб.; Давидович М. Штрихи к образу // ЛГ. 1960. 21 мая; Додин Р. В семье героини // Сов. Бел. 1963. 27 сент.; Жизнь, отданная людям: Новые документы о Вере Хоружей // Там жа. 1962. 24 янв.; Звонак А., Нехай Р. Пламенное сердце // Героини войны. М., 1963; Люди легенд: Очерки о партизанах и подпольщиках Героях Советского Союза. М., 1968. Вып. 3; Иванькова А. Я — советская // Знамя юности. 1973. 27 сент.; Колыванов И. Балхашские будни Веры Хоружей // Коммунист Бел. 1968. № 7; Котельников Б. В семье Героини // Знамя юности. 1973. 27 сент.; Яго ж. ... И словом журналиста // Журналист. 1978. № 10; Яго ж. Ты живешь в наших сердцах, Вера! // Комс. правда. 1960. 18 мая; Кравец М. Имя Веры Хоружей бессмертно // Сов. Литва. 1959. 18 дек.; Круглов Г. «Мой милый, милый Мозырь...» // Сов. Бел. 1978. 24 сент.; Кэмрад С. Бессмертная героиня // Там жа. 1959. 21, 26 мая; Яго ж. Вера — Вероника — Анна // Комс. правда. 1973. 27 сент.; Яго ж. У Надежды Константиновны // Знамя юности. 1973. 27 сент.; Яго ж. Янка Купала и Вера Хоружая // Дружба народов. 1965. № 12; Ласкович В. Крылатая Вера // Заря. 1978. 27 сент.; Яго ж. Подвиг во имя Родины // Сов. Бел. 1978. 27 сент.; Либеровская Т. Память о ней живет...: (Новое о В. Хоружей) // Заря. 1967. 13 мая; Межевич В. Новые письма Веры Хоружей // Лесная пром-сть. 1960. 2 апр.; Мухин О. Следы вели в Вильно // Знамя юности. 1985. 24 сент.; Новиков И. Письмо пламенной патриотки // Сов. Бел. 1962. 5 мая; Яго ж. Посвящается Вере Хоружей // Правда. 1961. 5 февр.; Новые документы о Вере Хоружей // Ист. архив. 1961. № 3; Новые материалы о Вере Хоружей // Правда. 1960. 7 янв.; Ольшанский П. К деятельности Веры Хоружей в Западной Белоруссии в 1924—1925 годах // Сов. славяноведение. 1966. № 1; Орехво Н. Живется бурно, как никогда // Знамя юности. 1973. 27 сент.; Пиришко Ф. Бесстрашная подпольщица // Комс. правда (Вильнюс). 1967. 15 окт.; Поплавский З. Встречи с Верой Хоружей // Огонек. 1960. № 5; Садовский Е. Жизнь — подвиг: Из воспоминаний о Вере Хоружей // Знамя юности. 1960. 2 февр.; Яго ж. Дорогие рукописи // Сов. Бел. 1981. 27 дек.; Селидиевская Н., Селидиевский А. Сквозь годы / Пер. В. Касько // Письма с фронта. Мн., 1985; Соколов Н. Шагнув в вечность // Во славу Родины. 1973. 27 сент.; Файнберг С. Вера Хоружая и ее поколение // Молодежь Эстонии. 1960. 16, 18, 21 июня; Хведанцевич А. «Комиссар баржи» // Знамя юности. 1973. 27 сент.; Цигельницкая Ф. Славная дочь белорусского народа // Гродн. правда. 1973. 27 сент.; Шкляр-ник П. Открытое сердце // Знамя юности. 1978. 27 сент.; Это твоя дочь, Родина!// Известия. 1960. 18 мая; Яковенко В. Сердца вечный огонь // Знамя юности. 1962. 9 мая.

На ўкраінскай мове. Булацький Г. Редакторська і публіцистична діяльність В. З. Хоружы // Тези доповідей першої республіканської міжвузівської навукової конференції з питань теорії та історії публіцистики. Львів, 1965.

2.4.

На беларускай мове. Васілеўская Г. Што помніцца...: Аповесць пра дзяцінства Веры Харужай. Мн., 1991.

Мушынская-Гофман Г. Вера і яе таварышы: Аповесць / Пер. з пол. Я. Бяганская. Мн., 1965. Рэц.: Глускі А. Мяцежнае сэрца // Чырв. змена. 1965. 14 ліст.; Круглов Г. Солнечная Вероника // Знамя юности. 1965. 18 нояб.

Няхай Р. Героі не адступаюць: Аповесць. Мн., 1965. Рэц.: Кудраўцаў І. Сцежкамі героя і чалавека // Мін. праўда. 1965. 8 чэрв.

Астрэйка А. Кантата аб Веры Харужай: [Вершы] // Астрэйка А. Выбр. тв.: У 2 т. Мн., 1970. Т. 2; Басуматрава С. Вера Харужая: [Верш] // Басуматрава С. Кветкі палявыя. Мн., 1985; Бачыла А. Лісты Веры Харужай: [Вершы] // Бачыла А. Выбранае: У 2 т. Мн., 1978. Т. 1.; Броўка П. Бачу я ўсюды Веру Харужую: [Верш] // Чырвоныя лісткі календара. Мн., 1966; Яго ж. Вера Харужая: [Верш] // Звязда. 1973. 27 вер.; Вольскі А. Мацней за бронзу і граніт: [Верш] // Вольскі А. Чалавек, якому баліць. Мн., 1984; Вярба В. Веры Харужай: [Верш] // Віцеб. рабочы. 1964. 22 ліст.; Яго ж. Харужай: [Верш] // ЛіМ. 1967. 25 ліп.; Дарафеенка Н. Апошняя старонка: Апавяданне //Там жа. 1967. 1 снеж.; Законнікаў С. Устань да нікаў С. Вера: Трыпціх // Законнікаў С. Вера: Трыпціх // Калачынскі М. Чырвоныя русонца. Мн., 1976; Калачынскі М. Суквецце. Мн., 1977; Новікаў І. Сэрца інакш не можа: Урывак з дакумент. аповесці пра Веру Харужую // Наст. газ. 1960. 24 вер.; Нехай Р. Героі не адступаюць: [Урывак з аднайм. аповесці] // Калг. праўда. 1960. 8 сак.; Пестрак П. Памяці Веры Харужай: [Верш] // Звязда. 1960. 9 мая; Прыходзька П. Веры Харужай: [Верш] // Калг. праўда. 1960. 27 жн.; Яго ж. Пралескі: [Верш] // ЛіМ. 1982. 27 жн.;

Пчолка В. У школе імя В. З. Харужай: [Верш] // Віцеб. рабочы. 1979. 19 кастр.; Русак А. Веры Харужай: [Верш] // Русак А. Засцілайце сталы. Мн., 1984; Ставер А. Кантата пра Веру Харужую: [Верш] // Ставер А. Лірнік. Мн., 1975; Танк М. Дума пра Веру Харужую: [Верш] // Вершы, аднаактовыя п'есы. Мн., 1961; Чарот М. Лірычны ліст: Таварышу Веры Харужай: [Верш] // Бальш. моладзь. Мн., 1934; Янішчыц Я. Веры Харужай: [Верш] // Бярозка. 1964. № 8.

На польскай мове. Muszyńska-Heltmanowa H. Wierka i jej towarzysze. Warszawa, 1963. Рэц.: Саевіч А. Жыццё для ідэі // Ніва. 1964. 19 студз.

На рускай мове. Котельников Б. Нарвите подснежников...: Докум. повесть. М., 1981. Рэц.: Овсянников В. И становились легендой... // Сов. воин. 1982. № 7.

Мухин О., Боярский Ф. След в жизни: (Докум. повесть о В. З. Хоружей). Алма-Ата, 1967.

Астрейка А. Вера Хоружая: [Верш] // Во славу Родины. 1961. 22 июля; Бессмертие: [Вершы] // Віцеб. рабочы. 1960. 10 жн.; Косов А. Песня о Вере Хоружей; Подсолнух [Вершы] // Вяч. Мінск. 1979. 15 снеж.; Кэмрад С. Песня о Вере Хоружей: [Верш] // Віцеб. рабочы. 1979. 17 студз.; Симанович Д. У домика Веры Хоружей в Телеханах: [Верш] // Знамя юности. 1974. 18 апр.

В. І. Козіч.

ХАРЫК ІЗІ

Харык Ізі [Ісак Давыдавіч; псеўд. А. З. Зембін; 17.3.1898 (паводле іншых звестак 6.3.1896), м. Зембін Барысаўскага пав. Мінскай губ., цяпер Барысаўскі р-н Мінскай вобл.— 29.10.1937, Мінск], паэт. Член СП Беларусі з 1934. Член-карэспандэнт АН Беларусі (1936). Пісаў на яўрэйскай, беларускай і рускай мовах.

Паходзіў з сям'і местачковага шаўца. У 1919 добраахвотна ўступіў у Чырвоную Армію, удзельнічаў у грамадзянскай вайне. Вучыўся ў Вышэйшым літаратурным інстытуце імя В. Брусава (1921—23). Скончыў яўрэйскае аддзяленне педфака 2-га Маскоўскага дзяржаўнага універсітэта (1927). Пераехаўшы ў Мінск, працаваў рэдактарам яўрэйскага часопіса «Штэрн» («Зорка», 1928—37). У 1931 выбраны членам ЦВК БССР. Быў членам прэзідыумаў Саюзаў пісьменнікаў СССР і БССР. У 1935 шырока і ўрачыста адзначаны 15-гадовы юбілей творчай дзейнасці І. Харыка і ён узнагароджаны Ганаровай граматай БССР. На юбілейным вечары ў гарадскім тэатры прысутнічалі тагачасныя кіраўнікі партыі і ўрада, дэлегацыі ўсіх рэспублік СССР. У 1937 І. Харыка рэпрэсіравалі: 11.9.1937 ён быў арыштаваны, а 28.10.1937 Ваеннай калегіяй Вярхоўнага суда СССР яму быў падпісаны смяротны прысуд. Даведаўшыся пра гэта, ён, па расказах іншых вязняў, кінуўся ў печ у турэмнай кацельні і згарэў там. Паводле іншых звестак, быў расстраляны з групай беларускіх пісьменнікаў. Бязлітасна абышліся і з яго сям'ёй: жонку, Дзіну Звулаўну, саслалі, дваіх маленькіх сыноў забралі ў дзіцячы прытулак НКУС, дзе яны і загінулі. 13.6.1956 І. Харык рэабілітаваны.

Літаратурную дзейнасць І. Харык пачаў у 1920 у яўрэйскіх газетах (публікацыі не выяўлены). У 1922 у Мінску выдадзена яго першая кніга вершаў «Трапятанне». З 1925 друкаваўся ў часопісе «Штэрн». Да 1936 асобнымі выданнямі ў Мінску, Маскве і Кіеве выйшла больш за 10 кніг паэта на яўрэйскай мове. З пачатку 1930-х гадоў І. Харык друкаваў артыкулы і нарысы таксама ў беларускамоўных выданнях («ЛіМ» і інш.). Быў адным з сааўтараў (разам з Я. Купалам, Я. Коласам, А. Александровічам, П. Глебкам і П. Броўкам) верша «Пісьмо беларускага народа вялікаму Сталіну» (1936), што, аднак, не выратавала паэта ад расправы. І. Харыку належала адно з першых месц у яўрэйскай савецкай літаратуры. Творы яго станавіліся хрэстаматыйнымі, іх вывучалі ў яўрэйскіх школах, вучылішчах. У 1928 яго вершы ўпершыню з'явіліся ў перакладзе на беларускую мову ў «Маладняку» (перакладчык І. Плаўнік). Яго перакладалі А. Александровіч, П. Броўка, З. Бядуля, А. Дудар, А. Куляшоў, М. Танк, М. Хведаровіч і інш. У 1958 і 1969 асобнымі кнігамі ў перакладзе на беларускую мову выдадзены выбраныя творы І. Харыка. Тэматыка і пафас яго вершаў і паэм звязаны з рэчаіснасцю 1920—30-х гадоў, з перамен ами жыцця, прынесенымі рэвалюцыяй. Даследчы-

кі пазней трапна заўважылі, што пафас рэвалюцыйных змен вельмі адпавядаў «чалавечаму тэмпераменту Харыка». Драматычны, востраканфліктны характар яго творчасці адзначыў Р. Бярозкін, звязваючы гэту адметнасць з разуменнем паэтам тых складанасцей і супярэчнасцей, якія суправаджалі шлях чалавека ў новую рэвалюцыйную эпоху. Харык бачыў яе суровасць, жорсткасць, але, як і большасць паэтаў-сучаснікаў, прымаў і вітаў рэвалюцыйныя ідэі па пераўтварэнні грамадства. Сацыялістычныя ілюзіі арганічна пераплаўляліся ў грамадзянскі пафас яго вершаў і паэм, мастацкі ўзровень якіх быў высокім. У сваёй творчасці, асабліва эпічнай, ён не абмінаў дылем рэвалюцыйнай эпохі, акцэнтаваў увагу на тых сітуацыях, дзе павінен адбывацца выбар, і гэты выбар, часам няпросты і драматычны, быў на баку пралетарскай рэвалюцыі, яе ідэалаў і працоўнага энтузіязму (паэмы «Мінскія балоты», «Катрынка», «Хлеб», «Адданасць», «Круглыя тыдні»; вершы «Небам светлыя саставы...», «На будоўлі», «Наша мужнасць» і інш.). Больш раскаваная, незалежная ад сацыяльных матываў лірыка І. Харыка, у якой паэт даваў волю пачуццям, і яны — самыя розныя, ад трывогі і насцярожанасці да летуцення, вялі паэта па вяршынях і бяздоннях у спасціжэнне сябе і свайго часу. На яўрэйскую мову перакладаў з беларускай творы Я. Коласа, М. Чарота, з польскай З. Рымашэўскага. Яго ж творы, апрача беларускай, перакладаліся на літоўскую, польскую, рускую, украінскую мовы. Вершы І. Харыка «Над Бярозай» і «Хлеб» былі пакладзены на музыку С. Палонскім.

І. Э. Багдановіч.

Бібліяграфія

1.1.

Адданасць: (Выбр. тв.). М., 1970 / Яўр.

1.2.

Трапятанне. Мн., 1922 / Яўр.

На гэтай зямлі: Вершы і паэмы. М., 1926 / Яўр. Рэц.: Бранштэйн Я. // Штэрн. 1926. № 5—6 / Яўр.

Крывёю і плоццю: Паэма. Мн., 1928 / Яўр. Рэц.: Бранштэйн Я. Кроў і плоць // Штэрн. 1929. № 2 / Яўр.; 2 выд. М., 1931 / Яўр.

Вершы і паэмы. К., 1930 / Яўр.

Хлеб: (Паэма). М.; Харкаў, 1930 / Яўр.

Круглыя тыдні: Паэма. Мн., 1932 / Яўр. Рэц.: Сярэбраны І. На шляхах да сацыялістычнай эпапеі // ЛіМ. 1932. 8 кастр.

У канвееры дзён: Паэма. Мн., 1932; 2 выд. М., 1935 / Яўр.

У канвееры дзён: Паэма / У скарачэнні для школ. Мн., 1933 / Яўр.

Ад полюса да полюса: (Паэма). Мн., 1934 / Яўр. Рэц.: Сярэбраны І. Ад полюса да полюса // ЛіМ. 1935. 6 крас.

Вершы і паэмы. Мн., 1934 / Яўр. Рэц.: Выгодский Д. // Звезда. 1935. № 3; Доктарович Е., Кравец Н. // Худ. лит. 1935. № 10.

Наша бадзёрасць: (Вершы і паэмы). Кіеў, 1934; Харкаў, 1935 / Яўр.

Вялікаму Сталіну: Пісьмо народаў Савецкай Беларусі. Мн., 1936 / У сааўт. з інш.

На чужым балі: Паэма. Мн., 1936; 2 выд. Мн., 1937 / Яўр.

Пісьмо народаў Савецкай Беларусі правадыру працоўных Вялікаму Сталіну. Мн., 1936 / У сааўт. з інш.

Пяць паэм. М., 1936 / Яўр.

1.3.

1925. Песні аб песнях: [Вершы] // Штэрн. № 1 / Яўр.

1926. Лазар Шэйман — маршалак з Зембіна // Цайтшрыфт. № 1 / Яўр.; Зіма: [Верш] // Штэрн. № 4 / Яўр.; Неба ўсё роўна блакітнае: [Верш] // Там жа. № 9—10 / Яўр.

1927. Квітнее жыта; Світанне; У белай квецені; Восень: [Вершы] // Штэрн. № 9 / Яўр.

1930. Залатое пахаванне: [Верш] // Штэрн. № 2—3 / Яўр.; Круглыя тыдні: [Урыўкі з паэмы] // Там жа. № 5—6 / Яўр.; Неделя Советской Белоруссии: «Неделя» наносит сокрушительный удар великодержавным шовинистам и контрреволюционным нацдемам // Рабочий. 7 янв.

1931. Торф: [Паэма] // Штэрн. № 4—5 / Яўр.

1932. Да класа, які завецца чалавецтвам: [Верш] // Штэрн. № 10—11 / Яўр.; Яўрэйская пралетарская літаратура БССР // ЛіМ. 11 крас. / Сааўт. Я. Бранштэйн, Х. Дунец.

1933. Як знялі раён з чорнай дошкі: [Нарыс] // Звязда. 14 чэрв. / Сааўт. А. Александровіч; Бліжэй да сацыялістычнага жыцця // ЛіМ. 27 жн.

1934. Аб паэме П. Броўкі «Так пачыналася маладосць»: [Даклад на пленуме Аргкамітэта ССПБ] // За высокую якасць літаратуры. Мн.; Смялей глянуць у будучыню: (З прамовы на Усесаюзным з'ездзе пісьменнікаў) // Звязда. 11 вер.; «Ад полюса да полюса» // ЛіМ. 6 студз.; Дваццаць першага студзеня: [Верш] // Там жа. 26 студз.; «Так пачыналася маладосць»: З даклада на пленуме Аргкамітэта ССПБ // Там жа. 17 мая; Смелее заглядывать в наше будущее: (Речь на Всесоюзном съезде писателей) // ЛГ. 1 сент.; Мінскія балоты: Урывак з паэмы // Піянер Бел. 8 чэрв.

1935. [Вершы] // Ямпольскі Л. Заклік. Мн. / Яўр.; Вялікія святы: [Вершы] // Штэрн. № 1 / Яўр.; Я ведаю цябе, Беларусь: [Вершы] // Там жа. № 5—6 / Яўр.; ЛіМ. 11 ліп. / Яўр.; На чужым вяселлі: [Урыўкі з паэмы] // Штэрн. № 10—11 / Яўр.; З самай высокай трыбуны: [Верш] // ЛіМ. 1 мая / Яўр.; І калі краіна ўскалыхнулася: [Верш]: (Урыўкі) // Там жа. 7 ліст. / Яўр.; Прывітанне Я. Купалу // Там жа. 11 снеж.; Праздник пролетарского интернационализма // Рабочий. 24 янв.

1936. Пісьмо беларускага народа вялікаму Сталіну // Бальш. Бел. № 6; Полымя рэвалюцыі. № 7; Работніца і калгасніца Бел. № 14; Віцеб. пралетарый. 14 ліп.; Звязда. 11 ліп.; Камунар Магілёўшчыны. 14 ліп.; Камуніст. 14 ліп.; ЛіМ. 11 ліп.; Палес. праўда. 14 ліп. / У сааўт.; Прамова Ізі Харыка: (На пленуме праўлення Саюза савецкіх пісьменнікаў) // Штэрн. № 2 / Яўр.; На чужым балі: [Урывак з паэмы] // Там жа. № 4 / Яўр.; Ноччу: [Верш] // Там жа. № 11; Больш страснасці ў крытыцы нашае работы: Слова ў абмеркаванні даклада аб беларускай паэзіі А. Александровіча // ЛіМ. 6 лют.; За ідэйна насычаную аптымістычную паэзію: Апрацаваная стэнаграма прамовы на III пленуме праўлення ССП СССР // Там жа. 29 лют.; Традиции Маяковского // ЛГ. 29 февр.

1937. Ганаруся савецкай разведкаю: Слова пісьменніка // Звязда. 12 чэрв.; Мы павінны ўдзесяцярыць нашу пільнасць: Слова пісьменніка // ЛіМ. 28 студз.; Супраць буржуазна-нацыяналістычнай кантрабанды ў літаратуры // Там жа. 11 ліп. / Сааўт. Л. Кацовіч.

1962. Дарагі Янка Купала! // Народны паэт Беларусі. Мн.

1.4.

1926. Чарот М. Карчма: [Паэма] / З бел. // Штэрн. № 11 / Яўр.

1930. Рымашэўскі З. Паўстанцы: [Верш] / З пол. // Штэрн. № 2—3 / Яўр.

1936. Колас Я. Свісток: [Верш] / З бел. // Штэрн. № 10 / Яўр.

1.5.

На беларускую мову. Выбр. тв. / З яўр. Мн., 1958. Рэц.: Іванавіч С. Крылы паэзіі // Полымя. 1959. № 2; Хведаровіч М. Мужная песня // Беларусь. 1958. № 11.

Выбранае / З яўр. Мн., 1969. Рэц.: Букчын С. Скіраваная ў будучыню // Полымя. 1970. № 9.

Песня крамнікаў; Чужынец-госць...: [Вершы] / Пер.

І. Плаўнік // Маладняк. 1928. № 7; 21-ае студзеня
Пер. І. Плаўнік // Там жа. 1929. № 7; Урывак з паэмы «Душою і целам» / Пер. Ю. Таўбін // Там жа. 1929. № 8; Урыўкі з паэмы «Мінскія балоты» / Пер. І. Плаўнік // Там жа. 1930. № 6—7; Між самых высокіх: [Верш] / Пер. І. Плаўнік // Полымя. 1930. № 2; Урыўкі з паэмы «Менскія балоты» / Пер. І. Плаўнік // Чырв. змена. 1931. 11 вер.; ЛіМ. 1932. 11 крас.; Мы — маладая гвардыя...; Трэція заняткі; Дзень добры, свет!: Урыўкі з паэмы «Душою і целам» / Пер. І. Плаўнік // Чырв. змена. 1931. 8 кастр.; Хай слова бярэ хто-нібудзь; І яна ўгледзела; Вяртанне: Урыўкі з паэмы «Душой і целам» / Пер. І. Плаўнік // Там жа. 1932. 24 кастр.; Мінскія балоты: Урывак з паэмы / Пер. І. Плаўнік // Чырв. Бел. 1933. № 5; Рот-фронт: [Верш]
Пер. А. Дудар // ЛіМ. 1933. 23 крас.; Зважай: (З паэмы «У канвееры дзён»); На торфараспрацоўках: [Верш] // Там жа. 1933. 12 мая; Кулак: З паэмы «У канвееры дзён» / Пер. З. Бядуля // Там жа. 1933. 27 жн.; Урыўкі з паэмы «Менскія балоты»; На торфараспрацоўках; Рот фронт: [Верш] // Бальш. моладзь. Мн., 1934; Пілот: [Верш] / Пер. З. Бядуля // Полымя рэвалюцыі. 1934. № 2; Чырв. змена. 1934. 15 жн.; Рот фронт: [Верш] / Пер. А. Дудар // Звязда. 1934. 23 ліп.; Смялей заглядаць у наша будучае: (Прамова на І з'ездзе ССП) // ЛіМ. 1934. 13 вер.; Мінскія балоты: (Урыўкі) / Пер. І. Плаўнік // Атака: Альм. 2. Мн., 1935; Смялей заглядаць у наша будучае // Пісьменнікі БССР на першым Усесаюзным з'ездзе савецкіх пісьменнікаў. Кн. 2. Мн., 1935; Ноч у Бірабіджане / Пер. П. Броўка; Раніца / Пер. А. Александровіч; «У светлы сад наш забаронен уваход...»; Снег
Пер. М. Хведаровіч: [Вершы] // Полымя. 1935. № 11; Карына: [Верш] / Пер. С. Дарожны // Работніца і калгасніца Бел. 1935. № 22; Раніца: [Верш]
Пер. А. Александровіч // Звязда. 1935. 6 кастр.; Чырв. змена. 1935. 17 ліст.; Ноч у Бірабіджане: [Верш]
Червоний мак: Оповідання / Пер. П. Баратинський // Рад. Житомирщина. 1963. 22 січ.; Колгоспне село. 1964. 26 квіт.; Солдатський колодзязь: (Оповідання) // Барвінок. 1965. № 5; Шість кілометрів дорогі: (Оповідання) / Пер. В. Швець // Там жа. 1965. № 6; Солдатський колодязь: [Апавяданне] / Пер. Г. Демченко // Рідний дім. К., 1967; У гості: Гумореска / Пер. В. Кохан // Молодь Закарпаття. 1967. 19 лист.; У квітні: [Апавяданне] / Пер. Ю. Збанацький // Ленінські читання. К., 1969. Вып. 2; Оберемок: Оповідання // Вінницька правда. 1969. 7 трав.; Гості: Казка // Київ. правда. 1969. 18 трав.; У квітні: [Апавяданне] / Пер. Ю. Збанацький // Иди в життя, як Ленін. К., 1970; Лимонад: Гумореска / Пер. С. Вігучин // Київ. правда. 1970. 2 лип.; Моя роботиха: [Гумарэска] / Пер. М. Крилов // Рад. жінка. 1979. № 8; Жменя рідної землі: Оповідання / Пер. В. Довжик // Барвінок. 1983. № 6; Тры каски: [Апавяданне] // Сільські вісті. 1983. 21 трав.

На эстонскую мову. Südametunnistus / Tlk. K. Kits // Noorte Hääl. 1962. 24. Mai; Prügi silma / Tlk. V. Järv // Pikker. 1963. Nr 22; Külalised / Tlk. A. Jaaksoo // Nõk Naine. 1972. Nr 10.

На б. Югаславіі мовы. Užaljenost // Ciciban. 1965. Št. 6; Stare i nove zagonetke / Prev. N. Jeremić // Zmaj. 1981. № 1.

1.6.

З Леніным заўсёды Беларусь: Вершы, апавяданні. Мн., 1970 / Скл.

2.3.

На беларускай мове. Беларуская дзіцячая літаратура. Мн., 1980. С. 88, 105—106; Беларуская літаратура. Дзень сённяшні. Мн., 1980. С. 217—219; Бугаёў Д. Пра сучасную прозу: (Суб'ектыўныя нататкі) // Бугаёў Д. Чалавечнасць. Мн., 1985; Бярозкін Р. Адзін лісток // ЛіМ. 1965. 19 сак.; Васіль Хомчанка // Хрэстаматыя па беларускай дзіцячай літаратуры. Мн., 1966; Васілю Хомчанку — 60 // ЛіМ. 1979. 12 студз.; Гаўрылаў А. Сярод добрых людзей: (Да 60-годдзя з дня нараджэння В. Ф. Хомчанкі) // Вяч. Мінск. 1979. 12 студз.; Гіль М. Па схільнасці, па душэўным ладзе: Васілю

Хомчанку — 50 гадоў // ЛіМ. 1969. 10 студз.; Яго ж. Пра гэтую кніжку і яе аўтара // Хомчанка В. Паклон. Мн., 1976; Голубева Л. Пра дзяцей і для дзяцей // Полымя. 1970. № 4; Дзюбайла П. Беларускі раман: Гады 70-я. Мн., 1982. С. 80—83; Яго ж. На шляху да сінтэзу // Полымя. 1978. № 12; Яго ж. У вялікай дарозе. Мн., 1981. С. 186—187; Жураўлёў В. Цудоўны свет дзіцяці // ЛіМ. 1959. 1 ліп.; Іваноў В. Дабрата цёплай зямлі // Вяч. Мінск. 1971. 28 вер.; Каласоўскі Б. Рамантыка, прыгоды... і жыццё // ЛіМ. 1981. 31 ліп.; Краўчанка У. Клапаціцца аб дзіцячай літаратуры // Наст. газ. 1958. 28 лют.; Крупеня Я. На ветразях рэвалюцыі // Наст. газ. 1982. 21 жн.; Лагоўскі Б. Была ў хлапчука мара // Маг. праўда. 1982. 15 мая; Ленсу А. Фарміраванне і развіццё літаратурных здольнасцей у вучняў сярэдніх класаў у працэсе вывучэння тэарэтычных паняццяў // Адзінства навучання і выхавання на ўроках літаратуры. Мн., 1982; Лецка Я. Выхаваўчая роля літаратуры. Мн., 1980. С. 106—109; Навуменка І. Кніга адкрывае свет // Навуменка І. Зб. тв.: У 6 т. Мн., 1984. Т. 6; Пісьменнікі Савецкай Беларусі: Кароткі даведнік. Мн., 1981. С. 354—355; Пянкрат М. Уступны артыкул // Хомчанка В. Лёгкая рука. Мн., 1979; Рубінскі У. Бібліятэка юных папаўняецца // Чырв. змена. 1959. 13 жн.; Савіцкі А. Хай добра шукаецца бурштын! // ЛіМ. 1979. 12 студз.; Сямёнаў А. Чакаем новых сустрэч // Вяч. Мінск. 1969. 11 студз.; Тычына М. У пошуках новага зроку // ЛіМ. 1979. 16 лют.; Уагонь вяртаюцца двое... // Там жа. 1978. 11 жн.; Цудоўны свет прыроды // Там жа. 1962. 25 мая; Чарнушэвіч А. На хвалях мары і жыцця // Звязда. 1982. 14 ліп.; Шаўцоў П. Выхоўваю адчуванне прыгожага // ЛіМ. 1978. 9 чэрв.; Шупенька Г. Даваяраць таленту // Там жа. 1981. 24 ліп.; Шымук В. Сябар юных чытачоў // Звязда. 1969. 12 студз.

На рускай мове. Баруздин С. О Василии Хомченко // Баруздин С. Заметки о детской литературе. М., 1975; Букчин С. Велика надежда... // Неман. 1970. № 1; Гуревич Э. Детская литература Белоруссии. М., 1982. С. 117—119, 150—151, 154—156, 166—168; Мартинович А. Обретение мастерства // Знамя юности, 1982. 22 окт.; Шупенька Г. Талант доброты // Хомченко В. Возвращение в огонь. М., 1982.

В. І. Козіч.

ХРАПТОВІЧ ЯЎХІМ

Храптовіч Яўхім (Іаахім, Яахім) Ігнацы Юзаф Літавор (4.1.1729, маёнтак Ясянец Навагрудскага ваяв., цяпер в. Ясянец Баранавіцкага р-на Брэсцкай вобл.— 4.3.1812, Варшава), публіцыст, паэт, перакладчык, мецэнат, вучоны-гуманіст, грамадскі, палітычны і культурны дзеяч. Канцлер Вялікага княства Літоўскага (з 1793). Пісаў на польскай, лацінскай і беларускай мовах.

Паходзіў са старадаўняга беларускага магнацкага роду, які карыстаўся гербам Адравонж і меў ва ўладанні маёнткі Шчорсы, Вішнева, Бешанковічы, Халопенічы, Зембін. Яго маці, Рэгіна Вайнянка — навагрудская падчашанка, бацька, Марцыян Храптовіч, вербельскі староста. Нарадзіўся і выхоўваўся (з адзінай сястрой Ганнай) у доме сваіх бабулі і дзеда па маці Тэафілі з дэ Раэсаў і маршалка шляхты Навагрудскага ваяводства Казіміра Несялоўскага, даволі папулярнага польскага і лацінскага пісьменніка, які выдаваў кнігі ў Пінску і Варшаве. Першапачатковую адукацыю Я. Храптовіч атрымаў у Ясянцы, а потым у доме бацькоў у Шчорсах (цяпер Навагрудскага р-на). На працягу года слухаў курс рыторыкі ў Нясвіжскай езуіцкай калегіі. Правучыўшыся 2 гады ў Віленскай акадэміі, працягваў адукацыю ў Германіі. Потым для пашырэння кругагляду і азнаямлення з найноўшымі дасягненнямі эканомікі і філасофіі наведаў Англію, Італію, Францыю, Швейцарыю. Вярнуўшыся на радзіму, стаў навагрудскім стольнікам (1752), паслом сойму Рэчы Паспалітай (1754). Служыў у арміі і даслужыўся да палкоўніка. Быў на дыпламатычнай рабоце ў Вене і Парыжы. Займаў высокія пасады ў Вялікім княстве Літоўскім: маршалак Галоўнага трыбунала (з 1756), падканцлер (з 1773), міністр замежных спраў (з 1791). Як ініцыятар і член Адукацыйнай камісіі (1773—94) узначальваў дэпартамент акадэміі і школ Вялікага княства Літоўскага. У 1784 прымаў у Шчорсах польскага караля Станіслава Аўгуста. Падзяляючы ідэі еўрапейскага Асветніцтва і фізіякратызму, выступаў за пашырэнне прыродазнаўчых ведаў, рэарганізаваў гаспадарку ў сваіх маёнтках Шчорсы і Вішнева, дзе паншчыну замяніў сялянам чыншам, даў ім асабістую вольнасць (1790); адкрыў тут школу і бальніцу. У Шчорсах пабудаваў новы палац і уніяцкую царкву, упрыгожыў іх творамі мастацтва, сабраў бібліятэку, у якой налічвалася каля 10 тысяч кніг. З 1794 жыў у Вене, потым у Варшаве, дзе выступіў адным з заснавальнікаў Таварыства сяброў навук.

Першым літаратурным творам Я. Храптовіча было, відаць, беларускае вершаванае віншаванне «Всім многі век у новай хаце...», прысвечанае бабулі і дзядулю Т. і К. Несялоўскім з нагоды іх навасельля ў Ясянцы. Потым пісаў вершы на польскай і лацінскай мовах, прасякнутыя ідэямі Асветніцтва і рацыяналізму («Гімн да прыгажосці», «Аб каханні», «Адказ Храптовіча Карпінскаму», «Ля карціны Рафаэля»). Аўтар артыкула «Паэзія» ў даведніку І. Красіцкага «Збор найбольш патрэбных звестак» (1781). Выступаў у друку з артыкуламі па сельскай гаспадарцы. Пакінуў у рукапісе працу пра свой радавод («Храналогія роду Храптовічаў»), апублікаваную толькі ў канцы 19 ст. Справу Я. Храптовіча працягнуў яго сын Адам, які значна павялічыў зборы Шчорсаўскай бібліятэкі (цяпер знаходзяцца ў Кіеве, у бібліятэцы АН Украіны).

С. Ф. Цярохін.

1.2.
Zdanie..., podkanclerza W. X. Lit. na proiekt pod tytułem: Powinności i władza departamentów w radzie na sessii seymowey dane 23/IX.1766. Warszawa.

O prawie natury: Pismo oryginalne Jednego z współziomków. Warszawa, 1814.

1.3.
1781. Poezja // Krasicki J. Zbiór potrzebniejszych wiadomości. Warszawa.

1785. Wiadomość względem użytecznego i trwałego poprawia[nia] łąk // Magazyn Warszawski. T. 1. Cz. 2 / Пад крыпт. J. C. C. L.

1806. Odpowiedź... // Karpiński F. Dzieła wierszem i prozą. Warszawa. T. 1.

1818. Portret Kiopka szpica, faworytnego króla Stanisława Augusta // Tyg. Wileński. T. 5. 15 lut.

1890. Pamiętnik rodu Chreptowiczów / Ogłosił W. K. [Korotyński] // Kronika rodzinna. 1890. S. 609, 646, 676; 1891. S. 36, 77.

2.2.
На лацінскай мове. K o r y c k i M. Dirae in vulcanum, qui in lonis illustrissimi atque excellentissini domini Joachimi in Szczorse, Zembin et Wiszniew comitis Littawor Chreptowicz procencellarii M. D. Lith., prafecti castris Orzensis officinam ad conficiendum ferrum magnus impensis magnisque utilitatibus constructam in cineres redegit. Varsowiae, 1780.

На польскай мове. M e h l i n g K. Opisanie gospodarstwa pszczołowego w Szczorsach. Warszawa, 1785.

На рускай мове. Р я б и н и н И. К вопросу о побегах русских крестьян в пределы Речи Посполитой в конце XVIII в. (По письмам Игнатия Омульского к Иоахиму Хрептовичу). М., 1911.

2.3.
На беларускай мове. Б у к А. Лёс бібліятэкі // Мін. праўда. 1981. 14 лют.; М а л ь д з і с А. На скрыжаванні славянскіх традыцый. Мн., 1980. С. 281—282; П е д а г а г і ч н а я дзейнасць і погляды І. Храптовіча і М. Пачобута // Асвета і педагагічная думка ў Беларусі. Мн., 1985; Ц ы б у л я В. Прыватная бібліятэка Храптовічаў // Помнікі гіст. і культ. Бел. 1973. № 3; Ц я р о х і н С. Энцыклапедыст са Шчорсаў // ЛіМ. 1987. 4 вер.

На польскай мове. B a l i ń s k i M. Dawna Akademia Wileńska. Pbg, 1862. S. 386, 515—516; E t t i n g e r P. Ioachim Chreptowicz jako miłośnik sztuki // Odgłosy: Książka zbiorowa. M., 1916; I w a s z k i e w i c z J. O dwóch Joachimach Chreptowiczach // Atheneum Wileńskie. 1937; K o p c z y ń s k a Z. Język a poezja: Studia z dziejów świadomości językowej i literackiej Oświecenia i romantyzmu. Wrocław; Warszawa; Kraków, 1976. S. 37—47; M e h l i n g K. Opisanie wybornego gospodarstwa w dobrach Szczorse Chreptowicza // Pam. polityczny i historyczny. 1785. Maj.

На рускай мове. И с т о р и я белорусской дооктябрьской литературы. Мн., 1977. С. 304; К о х а н о в с к и й Г. «Редкости для общественного употребления...» // Неман. 1979. № 7; Ш у м с к и й К. Из библиотеки последнего канцлера Литовского // Там жа. 1968. № 8.

3.1.
Бібліятэка Асалінскіх у Вроцлаве, аддз. рукап., адз. зах. 9665; Бібліятэка Варшаўскага ун-та, аддз. рукап., адз. зах. 278; Бібліятэка ПАН у Кракаве, аддз. рукап., адз. зах. 2059; Бібліятэка ПАН у Курніку (Польшча), аддз. рукап., адз. зах. 1280. *Г. І. Рэут.*

ХРОМЧАНКА КУЗЬМА

Хромчанка Кузьма Рыгоравіч (н. 25.10. 1929, пас. Калінаўка Краснапольскага р-на Магілёўскай вобл.), літаратуразнавец, крытык. Член СП Беларусі з 1983. Кандыдат філалагічных навук (1958).

З сялянскай сям'і. У 1935—39 наведваў Вялікахутароўскую пачатковую школу, у 1939—41 Гарадзецкую сямігодку. У 1943—47 вучыўся ў Краснапольскай СШ. У 1951 скончыў літаратурны факультэт Магілёўскага педінстытута. Выкладаў беларускую мову і літаратуру ў Дзятлаўскай СШ (1951—53), вучыўся ў аспірантуры (1953—56), працаваў вучоным сакратаром, навуковым супрацоўнікам Інстытута літаратуры АН БССР (1956—66). Затым перайшоў на выкладчыцкую работу ў БДУ, дацэнт кафедры беларускай літаратуры (1966—93), з 1993 загадчык кафедры славістыкі.

Друкуецца К. Хромчанка з 1957. Вядомы як аўтар літаратурна-крытычных артыкулаў, кніг «Пі-

ліп Пестрак», «За шчасце зямное», «Беларуская мастацкая проза». Даследуе праблемы развіцця беларускай прозы ад вытокаў да сённяшняга дня, пытанні тэксталогіі, мастацкага перакладу, літаратурных узаемасувязей («На шляхах яднання»). У манаграфіі «Беларуская мастацкая проза» прасочвае асноўныя тэндэнцыі і заканамернасці развіцця беларускай мастацкай прозы на прыкладзе творчасці Ф. Багушэвіча, Ядвігіна Ш., Я. Коласа, З. Бядулі, М. Гарэцкага і інш. Піша рэцэнзіі на творы сучасных беларускіх аўтараў.

Жыве ў Мінску.

З. А. Суднік.

Бібліяграфія

1.2.

Творчество Филиппа Пестрака: Автореф. дис. ... канд. филол. н. Мн., 1958.

Піліп Пестрак: Жыццё і творчасць. Мн., 1960. Рэц.: Канэ Ю. Мінаць пратаптаныя сцежкі // Полымя. 1961. № 1; Касцян М. Пра пісьменніка і барацьбіта // ЛіМ. 1960. 8 ліп.; Луфераў М. Манаграфія прысвячаецца пісьменніку // Звязда. 1960. 2 кастр.; Макарэвіч А. Кніга пра пісьменніка-рэвалюцыянера // Маг. праўда. 1960. 17 чэрв.

За шчасце зямное. Мн., 1966 (Б-чка атэіста). Рэц.: Алексяевіч І. Атэізм у творах беларускіх пісьменнікаў // Нар. асвета. 1966. № 4.

Беларуская мастацкая проза (канец XIX — пачатак XX ст.). Мн., 1979. Рэц.: Барысава А., Петраковіч М. Плённыя традыцыі // Маг. праўда. 1981. 12 чэрв.; Грынчык М. Ад Каліноўскага да Коласа // Полымя. 1980. № 8; Мірачыцкі Л. Слова пра мастацкую прозу // Звязда. 1979. 3 кастр.; Семашкевіч Р. Ля вытокаў нашай прозы // ЛіМ. 1979. 7 вер.

1.3.

1957. Раман Піліпа Пестрака «Сустрэнемся на барыкадах» // Весці Акад. навук БССР, серыя грамад. н. № 2; Дарогаю змагання // ЛіМ. 18 вер.; Пісьменнік-патрыёт // Мін. праўда. 23 ліп.

1958. Экзамен перад чытачом // ЛіМ. 26 ліп.; Напярэдадні з'езду славістаў // Там жа. 9 жн.; Летапіс гераічнага змагання // Там жа. 16 жн.; Подых суровага часу: Да выхаду ў свет рамана-эпапеі М. Лынькова «Векапомныя дні» // Там жа. 20 снеж.; Пытанні літаратуры ў «Вучоных запісках» // Наст. газ. 21 лют.; Даваенная творчасць Піліпа Пестрака і рэвалюцыйная літаратура Заходняй Беларусі // Беларуская літаратура. Мн. Вып. 2; У імя шчасця народа: [Рэц. на кн.: У суровыя гады падполля. Мн., 1958] // ЛіМ. 29 крас.

1960. Сведчанне мастацкай сталасці // ЛіМ. 16 жн.

1963. Працяг размовы: [Рэц. на кн.: Калеснік У. Час і песні. Мн., 1962] // Полымя. № 4.

1964. Дапаможнік па творчасці Я. Купалы: [Рэц. на кн.: Янка Купала. Мн., 1963] // Нар. асвета. № 5.

1965. Работа текстологов Белоруссии // Вопр. лит. № 6; Першае навуковае выданне: Да выхаду Зб. тв. Я. Коласа ў 12-ці тамах // ЛіМ. 12 сак.

1966. Піліп Пестрак // Гісторыя беларускай савецкай літаратуры: У 2 т. Мн. Т. 2.

1968. Вякамі выпрабавання: [Рэц. на кн.: Садружнасць літаратур. Мн., 1968] // ЛіМ. 13 жн.

1969. Ованес Туманян в белорусских переводах // Ованес Туманян. Ереван; Даследуюцца праблемы майстэрства // Полымя. № 6; Падзеі незабыўных дзён: [Рэц. на кн.: Машара М. Крэсы змагаюцца. Мн., 1966; Сонца за кратамі. Мн., 1968] // Вяч. Мінск. 23 кастр.; Суровы лёс пакалення // Там жа. 18 снеж.

1970. Вернасць жыццёвай праўдзе // Пестрак П. Апавяданні. Мн.

1971. Вечна жывы вянок // Вяч. Мінск. 25 лют.

1972. Янка Купала і Якуб Колас у іх сувязях з Беларускім дзяржаўным універсітэтам // Народныя песняры. Мн. / Сааўт. В. Рагойша; Вместе с народом // Гродн. правда. 18 нояб.; Заря. 18 нояб.; Мін. праўда. 18 ліст.

1974. Шляхі развіцця літаратуры былой Заходняй Беларусі // Веснік БДУ. Сер. 4. Філалогія, журналістыка, педагогіка, псіхалогія. № 2; У свеце коласаўскай прозы: [Рэц. на кн.: Гальмакоў Д. Стыль прозы Я. Коласа. Мн., 1973] // ЛіМ. 5 крас.; У сям'і славян: [Рэц. на кн.: Ларчанка М. Яднанне братніх літаратур. Мн., 1974] // Там жа. 6 вер.

1975. Беларуска-ўкраінскія літаратурныя ўзаемасувязі 20-х гадоў // Весн. БДУ. Сер. 4. Філалогія, журналістыка, педагогіка, псіхалогія. № 3.

1976. Ля вытокаў беларускай мастацкай прозы // Весн. БДУ. Сер. Філалогія, журналістыка, педагогіка, псіхалогія. № 3; Сваёй дарогай // Вяч. Мінск. 24 крас.

1977. Беларуска-ўкраінскія літаратурныя ўзаемасувязі 20 — пачатку 30-х гадоў // Тыпалогія славянскіх моў і ўзаемадзеянне славянскіх літаратур. Мн.

1980. Трилогия о жизни и борьбе народа // Машара М. Кресы борются. М.

1981. Янка Купала ва ўкраінскіх перакладах і крытыцы // Песні беларускай валадар. Мн.

1982. Аркадий Кулешов — переводчик украинской поэзии // Вопросы литературы народов СССР. Киев — Одесса. Вып. 8; Якуб Колас у італьянскім друку // З глыбінь народных. Мн.; Якуб Колас на Украіне // Творчая спадчына Янкі Купалы і Якуба Коласа і развіццё славянскіх моў і літаратур. Мн.

1983. [Рэц. на кн.: Денисюк И. Розквіт української малої прози XIX — поч. XX ст. К., 1981] // Весн. БДУ. Серыя 4. Філалогія, журналістыка, педагогіка, псіхалогія. № 2; Прызначаецца студэнтам-філолагам: [Рэц. на кн.: Гісторыя беларускай літаратуры: XIX — пачатак XX ст. Мн., 1981] // ЛіМ. 21 студз.; Шлях пісьменніка-барацьбіта // ЛіМ. 25 ліст.

1984. О белорусско-армянских литературных взаимосвязях // Литературные связи. Ереван. Т. 4; Водгалас зведанага і перажытага // Пестрак П. Зб. тв.: У 5 т. Мн. Т. 1; Сэрцы і песні — з народам і партыяй // Беларусь. № 6; Падзеі гістарычнай важнасці // ЛіМ. 20 ліп.

1.6.

Пестрак П. Зб. тв.: У 5 т. Т. 1. Мн., 1984 / Рэд.

2.3.

На беларускай мове. Прыняты ў Саюз пісьменнікаў БССР // ЛіМ. 1983. 27 мая.

В. У. Смольская.

ХРЫСТАФОР ФІЛАЛЕТ

Хрыстафор Філалет (Хрыстафорус Філалетус; сапр. Бранеўскі Марцін; ? — ?), пісьменнік-паляміст, рэлігійны і грамадскі дзеяч канца 16—1-й трэці 17 ст. Пісаў на старабеларускай і польскай мовах.

Нарадзіўся, верагодна, у Пазнáнскім ваяводстве ў сям'і Пракопа Бранеўскага, які належаў да Чэшскіх братоў. У 1595 выступіў на Торуньскім сінодзе, удзельнічаў там у камісіі па тэалагічных пытаннях. Імкнучыся да кансалідацыі антыкаталіцкіх сіл, часта звяртаўся да палітычных праблем, выступаў у абарону праваслаўя і пратэстантызму. З 1598 браў удзел у сеймiках ад імя кіеўскага ваяводы К. Астрожскага як яго «добры сябар», быў пасрэднікам у зносінах яго з кіраўніком пратэстантаў Вялікага княства Літоўскага віленскім ваяводам К. Радзівілам — пры яго ўдзеле яны пагадзіліся склікаць сумесны з'езд (Вільня, май — чэрвень 1599). Арганізаваў дыспут паміж езуітам С. Сміглецкім і С. Турноўскім (2.6.1599), запісаў ход гэтага дыспуту і ўручыў нататкі Турноўскаму. Кантактаваў з Кірылам Лукарысам, паслом Александрыйскага патрыярха Мялеція. Быў паслом на сеймах 1605 і 1606. На апошнім зачытаў апалогію варшаўскай канфедэрацыі пад назвай «Сведчанне непамернасці, або Знявага закону», складзеную, верагодна, ім самім. Браў удзел у змове Забржыдоўскага, на сесіі 24.8.1606 зачытаў «пункты рокашу», напісаныя па даручэнні «Сандамірскага з'езду». Пасля правалу змовы стаў больш пасіўны, хоць і быў абраны паслом на сеймы 1621 і 1623. У 1632 рэвізаваў дзяржаўную казну.

Паводле меркавання даследчыкаў, Хрыстафор Філалет з'яўляецца аўтарам рукапісных палемічных твораў «Абураны адказ на патрабаванне евангелістаў разбурыць Кракаўскі сабор... у 1592 годзе», «Акты рокашу ў Кароне Польскай пад Сандамірам... А. Д. 1607». Верагодна, яго ж пяру належыць «Меркаванне на сейміку перад вальным сеймам 1615 г.» і «Разгром татараў вяльможным гетманам Каронным Станіславам Жулкеўскім... у 1620 годзе». Найбольш значным і дасканалым у мастацкіх адносінах з'яўляецца «Апокрысіс, або Адказ на кнігі пра брэсцкі сінод ад імя людзей старажытнай рэлігіі грэцкай, дадзены ў абурэнні Хрыстафорам Філалетам» (Вільня, 1597; у перакладзе на старабеларускую мову 1598). Лічыцца, што аўтарам гэтага палемічнага твора, напісанага як адказ на «Брэсцкі сінод» П. Скаргі, быў М. Бранеўскі, схаваны пад псеўданімам Хрыстафора Філалета (Хрыстаносца Праўдалюба). У «Апокрысісе» ў яркіх і дасціпных вобразах-алегорыях, легендах і прыпавесцях паказаны стан хрысціянскай Царквы. З лагічнай паслядоўнасцю і дакладнасцю аўтар выступаў у абарону праваслаўя і пратэстантызму, у прыватнасці кальвінізму. *А. А. Мельнікаў.*

Бібліяграфія

1.2.

Апокрисис, альбо отповедь на книжкы о соборе Берестейском... Вильно, 1597.

Апокрисис Христофора Филалета: Вновь изданныя в память юбилея Киев. духовн. академии 28 сент. 1869 года. К., 1869.

1.3.

1820. Апокрисис, албо отповедь на книжкы о съборе берестейском // Памятники полемической литературы в Западной Руси. Пб., 1882. Кн. 2 (РИБ. Т. VII) [Тэкст на пол., бел. мовах].

1882. Апокрисис: Сочинение Христофора Филалета в двух текстах — польском и западно-русском 1597—1599 гг. // Рус. ист. б-ка. № 7.

1959. Апокрисис, албо отповедь на книжкы о съборе Берестейском... // Хрэстаматыя па старажытнай беларускай літаратуры. Мн.

1.5.

На рускую мову. Апокрисис Христофора Филалета в переводе на современный русский язык. К., 1870.

Рэц.: // Вестник Зап. России. 1870. Т. 3. № 7.

Апокрисис // Труды Киевской духовной академии. 1869. № 8.

2.2.

На польскай мове. Arcudius P. [Pociej H.?] Antirrisis, abo Apologia przeciwko Krzysztofowi Philaletowi, który niedawno wydał książki imieniem starożytney Rusi, religii greckiej, przeciwko książkom o synodzie Breskim, napisanym w r. 1597. Wilno, 1600.

Smotrycki M. Exethesis, albo Expostulatia, to iest rozprawa między Apologią i Antidotem o ostanek błędów, heresie i kłamstw Zyzaniowych, Philaletowych, Orthologowych i klerykowych uchylona przez M. Smotryckiego. Lwów, 1629.

На рускай мове. Криштапович Л. Гуманизм «Апокрисиса» Христофора Филалета и национальное самосознание белорусского народа. Мн., 1992.

Скабаланович Н. Об Апокрисисе Христофора Филалета. Спб., 1873. Рэц.: Объявление о новой книге // Лит. епарх. вед. 1873. № 30.

На ўкраінскай мове. Яременко П. Український письменник-полемист Христофор Філалет і його «Апокрисис». Львів, 1964.

2.3.

На беларускай мове. Вольскі В. Нарысы па гісторыі беларускай літаратуры эпохі феадалізма. Мн., 1952. С. 122—126; Гісторыя беларускай дакастрычніцкай літаратуры: У 2 т. Мн., 1968. Т. 1. С. 296—305; [Коршунаў А.] [Уступны артыкул] // Хрэстаматыя па старажытнай беларускай літаратуры. Мн: 1959. С. 238—239; Ларчанка М. Літаратура канца XVI — першай паловы XVII ст. // Ахрыменка П., Ларчанка М. Старажытная беларуская літаратура: Вучэб. дапаможнік для філал. фак. вну. Мн., 1968. С. 96—98; Майхровіч С. Нарыс гісторыі старажытнай беларускай літаратуры XIV—XVIII ст. Мн., 1980. С. 156—160.

На польскай мове. Tretiak J. Skarga i Filalet // Piotr Skarga w dziejach i literaturze unii Brzeskiej. Kraków, 1912.

На рускай мове. Бедрицкий Н. Литературная полемика православных с протестантами в юго-западной Руси в XVI и XVII вв. // Мин. епарх. вед. 1888. № 5; Брянцев П. Виленский Свято-Духовский монастырь // Виленский календарь на 1898 год. Вильна, 1897; Василенок С. Фольклор и литература Белоруссии эпохи феодализма (XIV—XVIII вв.). М., 1961. С. 199—204; История белорусской дооктябрьской литературы. Мн., 1977. С. 167—170; Об издании древнего сочинения в защиту православия против латинства и унии под заглавием: «Апокрисис Христофора Филалета» // Мин. епарх. вед. 1873. № 17; Перепечин В. «Наука» святого Кирилла Лукариса... о противной унии (неисследованный памятник западно-русской историко-полемической литературы) // Там жа. 1894. № 4; Потей И. Антиризис, или апология против Христофора Филалета в двух текстах: западно-русском (1599 г.) и польском (1600 г.) // Рус. ист. б-ка. 1903. № 3; Чемерицкий В. Белорусская литература // История всемирной литературы: В 9 т. М., 1985. Т. 3.

На ўкраінскай мове. Грушевський. Історія української літератури. К., 1927. Кн. 5, друга половина. С. 392—394.

Т. М. Махнач.

ХУРСІК СЫМОН

Хурсік Сымон Аляксеевіч [псеўд. С. Багун; 31.1(13.2). 1902, в. Снусцік Ігуменскага пав. Мінскай губ., цяпер Пухавіцкі р-н Мінскай вобл.— 31.3.1972], празаік, перакладчык.

Нарадзіўся ў сялянскай сям'і. У 1925 скончыў Мінскі белпедтэхнікум. Настаўнічаў у мяст. Валынцы на Полаччыне і ў Полацку, працаваў у рэдакцыі газеты «Чырвоная Полаччына». У 1930 скончыў літаратурна-лінгвістычнае аддзяленне педфака БДУ. 10.4.1931 беспадстаўна асуджаны на 5 гадоў высылкі ў г. Йашкар-Ала. Працаваў настаўнікам у школах Марыйскай і Чувашскай АССР, у Казахстане. У час Вялікай Айчыннай вайны служыў у Савецкай Арміі. Удзельнічаў у баях на 4-м Украінскім і 1-м Беларускім франтах, быў двойчы кантужаны. Пасля вайны зноў настаўнічаў. 13.10.1958 рэабілітаваны. Жыў у пас. Айдабул Какчэтаўскай вобл., а з 1964 у Карагандзе.

Першае апавяданне С. Хурсік апублікаваў у газеце «Савецкая Беларусь» у 1924. Аўтар зборнікаў апавяданняў «Першы паўстанак» (1925) і «Шляхамі навальніц» (1930), аповесці «Чорны мост» (апублікавана ў час. «Маладняк», 1929—30), прысвечаных жыццю беларускай вёскі ў першыя гады пасля рэвалюцыі. Пісаў таксама вершы, якія друкаваў у «Чырвонай Полаччыне». Пераклаў на беларускую мову аповесць А. Серафімовіча «Горад у стэпе», апавяданне А. Гараўскага «Алёнка» і інш.

І. П. Чыгрын.

Бібліяграфія

1.2.

Першы паўстанак: Апавяданні. Мн., 1925 (Кн-ца Маладняка), Рэц.: М. Я. Першы паўстанак // Наддзвінне. Полацк, 1926.

Шляхамі навальніц: Апавяданні, 1930. Рэц.: Сядура У. // Полымя. 1930. № 5—6; Шынклер Х. // Маладняк. 1930. № 5.

1.3.

1924. Адам Залес: Апавяданне // Сав. Бел. 12, 13, 15, 16, 19 крас.

1925. Зарабіў: Апавяданне // Маладняк. № 8.

1926. Францішак Скарына: Аповесць; Адказ: [Верш] // Наддзвінне. Полацк; Асенняе: [Верш] // Літаратурна-мастацкі дадатак да газ. «Чырв. Полаччына». 24 ліст.; З «Першым мая»: (Апавяданне) // Чырв. Полаччына. 1 мая; Францішак Скарына: Адрывак з аповесці // Там жа. 15 снеж.

1927. Пажар; Стой пралетары пільней на пасту; Эй, брат!..; Звіні струна...; Вясна ідзе; Ой, ты, гаю...: [Вершы] // Росквіт. Полацк; Барвяныя бляскі: Апавяданне // Маладняк. № 10; Звіні, струна: [Верш] // Чырв. Полаччына. 15 студз.; Ой, ты, гаю...: [Верш] // Там жа. 12 лют,; У полі спела волі сталь...: [Верш] // Там жа. 5 сак.; Беларусь ты мая сінякрылая...: [Верш] // Там жа. 16 сак.; Пажар!: [Верш] // Там жа. 6 крас.; Вясна ідзе!; Эй, брат!: [Вершы] // Там жа. 16 крас.; Над зялёным борам заквітнелі зоры...: [Верш] // Там жа. 2 мая; Настроі: [Верш] // Там жа. 21 мая; Стой пралетары пільней на пасту!: [Верш] // Там жа. 22 чэрв.

1928. Здань: Апавяданне // Літ. дадатак да газ. «Сав. Бел.» № 3; Змітрок: Апавяданне // Маладняк. № 1; Янка з Палесся: Апавяданне // Там жа. № 3; Пільнікі: Апавяданне // Там жа. № 7, 8.

1929. Чорны мост: Аповесць // Маладняк. № 11—12; 1930. № 1, 2; Чужынец: [Апавяданне] // Звязда. 10 ліст.

1930. Прэч з дарогі: Нарыс // Маладняк. № 2; Чорны мост: [Урывак з аповесці] // Сав. Бел. 5 студз.

1967. Янка з Падлесся: [Апавяданне] // Анталогія беларускага апавядання: У 2 т. Мн. Т. 1.

1.4.

Серафімовіч А. Горад у стэпе: [Аповесць] / З рус. Мн., 1930.

1930. Гараўскі А. Алёнка: Апавяданне / З пол. // Маладняк. № 6—7.

2.3.

На беларускай мове. Гарэцкі М. «Маладняк» за пяць гадоў. 1923—1928 // Максім Гарэцкі: Успаміны, артыкулы, дакументы. Мн., 1984; Навумовіч У. З кагорты маладнякоўцаў: 70 год з дня нар. С. Хурсіка // ЛіМ. 1972. 10 сак.; Наш каляндар // Там жа. 1982. 5 лют.; Пісьменнікі Савецкай Беларусі: Кароткі даведнік. Мн., 1981; Скрыган Я. Біяграфія // Скрыган Я. Некалькі хвілін чужога жыцця. Мн., 1979; Сымон Хурсік: [Некралог] // ЛіМ. 1972. 7 крас.

На рускай мове. На собрании белапповцев // Рабочий. 1930. 16 апр.; Творческая работа // Там жа. 1929. 22 окт.

2.4.

Козік Я. Бунтару (Прысв. С. Хурсіку): [Верш] // Літаратурна-мастацкі дадатак да газ «Чырв. Полаччына». 1926. 24 ліст.

М. П. Барташэвіч.

Ц

ЦАДРОЎСКІ ЯН

Цадроўскі Ян (3.3.1617, в. Пагост Слуцкага пав. Мінскага ваяв., цяпер Салігорскі р-н Мінскай вобл.— 1688), грамадскі дзеяч, пісьменнік-мемуарыст. Пісаў на польскай мове.

Нарадзіўся ў сям'і грамадскага дзеяча Яна Цадроўскага і Сафіі Цёлкаўны-Камароўскай, кальвіністаў па веравызнанні. Вучыўся разам з братам-блізнюком Стэфанам (памёр у 1676) спачатку ў Крулявецкім (Кёнігсбергскім, 1631—33), потым у Кракаўскім (1636) універсітэтах. У 1637 пасланы бацькам на службу да князя Багуслава Радзівіла, дзе знаходзіўся да яго смерці (1669). У 1638 вучыўся ва Утрэхцкім універсітэце. У 1638—39 падарожнічаў са сваім патронам па Германіі, Даніі, Галандыі, Францыі, Італіі і Англіі. У 1641 па службовых справах зноў ездзіў у Галандыю. З 1642 служыў чыноўнікам у радзівілаўскім маёнтку Старая Весь на Падляшшы. У час вайны Расіі з Рэччу Паспалітай 1654—67, калі Мінскае ваяводства было захоплена расійскімі войскамі (1655), Я. Цадроўскі з сям'ёй выехаў на Жмудзь. У 1656 вярнуўся і быў пасланы мінскай шляхтай да цара Аляксея са скаргай на ўціск з боку маскоўскіх ваяводаў. У 1658 удзельнічаў ва ўзброеным выступленні мінскай шляхты супраць расійскіх войск, няўдалы вынік якога прымусіў яго ратавацца ў Слуцку. Тады ж зноў пасланы ў Маскву, каб растлумачыць прычыны, што прывялі да паўстання. У 1666 быў членам і сакратаром камісіі, прызначанай Б. Радзівілам для рэвізіі Койданава. Я. Цадроўскі неаднаразова выбіраўся дэлегатам ад Мінскага ваяводства на трыбуналы і сеймы. На сейме 1654 быў прызначаны дэпутатам пры літоўскім падскарбіі для збору падатку на вайсковыя патрэбы, у 1668 і 1674 удзельнічаў у абранні каралёў Яна-Казіміра і Яна III Сабескага.

Асноўныя падзеі свайго жыцця Я. Цадроўскі занатаваў у мемуарах (без назвы, іх арыгінал захоўваецца ў зборах Б. Уляноўскага ў бібліятэцы ПАН у Кракаве). У іх расказваецца пра падзеі ад нараджэння аўтара да 4.4.1682. Асноўная частка мемуараў напісана ў 1672, запісы працягнуты ў 1682. Мемуары прысвечаны ў асноўным асабістым, сямейным справам, але падаюцца яны на фоне гістарычных і грамадскіх падзей таго часу (вайна 1654—67, голад на Міншчыне, расправа католікаў над кальвіністамі ў 1682 у Вільні). З мемуараў відаць, што іх аўтар верыў у справядлівасць, гарманічнасць зямнога жыцця, заклікаў суайчыннікаў да верацярпімасці. Упершыню яго мемуары апублікаваны на рускай мове ў часопісах «Временник императорского Московского общества истории и древностей российских» (1855). *А. А. Мельнікаў.*

Бібліяграфія

1.2.

Dwa pamiętniki z XVII wieku: Jana Cedrowskiego i Jana Floriana Drobysza Tuszyńskiego. Wrocław, 1954. Рэц.: Mincer F. // Sprawy i ludzie. 1955. Nr 9; Sajkowski A. // Studia Źródłoznawcze. 1958. T. 2.

1.3.

1855. Записная книга... // Временник Имп. Московского общества истории и древностей российских. М. Т. 23.

1859. Pamiętnik // Baliński M. Pamiętniki historyczne do wyjaśnienia spraw publicznych w Polsce XVII wieku posługujące. Wilno.

1977. Успаміны Яна Цадроўскага, запісаныя яго ўласнаю рукой у XVII ст. // Беларуская літаратура. Мн. Вып. 5.

1983. Успаміны // Помнікі мемуарнай літаратуры Беларусі XVII ст. Мн.

2.3.

На беларускай мове. Коршунаў А. Успаміны Яна Цадроўскага // Беларуская літаратура. Мн. 1977. Вып. 5.

На польскай мове. Baliński M. Wstęp // Pamiętniki historyczne do wyjaśnienia spraw publicznych w Polsce XVII wieku posługujące. Wilno, 1859; Bartoszewicz J. Pamiętnik J. Cedrowskiego, własną jego reką spisany, zabytek historyczny wieku XVII // Bibl. Warsz., 1856. T. 3; Konarski S. Szlachta kalwińska w Polsce. Warszawa, 1936. S. 38—39; Przyboś A. Wstęp // Dwa pamiętniki z XVII wieku. Wrocław, 1954.

На рускай мове. История белорусской дооктябрьской литературы. Мн., 1977. С. 216—217.

Т. М. Махнач.

ЦАМБЛАК ГРЫГОРЫЙ

Цамблак Грыгорый [1365(?), Балгарыя — 1419 (?)], славянскі пісьменнік, культурны і царкоўны дзеяч. Прадстаўнік Тырнаўскай кніжнай школы, аўтар больш як 40 твораў розных жанраў (жыцій, пахвальных слоў, пропаведзяў, павучанняў, палемічных слоў, канонаў і стыхір). Пісаў на царкоўнаславянскай мове.

Паходзіў са знатнага балгарскага роду. Гуманітарную падрыхтоўку атрымаў у тырнаўскім манастыры Святой Тройцы пад кіраўніцтвам патрыярха Яўфімія. Светапогляд, пісьменніцкі і аратарскі талент Цамблака сфарміраваліся ў атмасферы грамадска-палітычнага і рэлігійнага жыцця паўднёвых і ўсходніх славян канца 14 — пач. 15 ст., якія знаходзіліся тады пад уплывам грэка-візантыйскай культуры. У перыяд турэцкай экспансіі на Балканах вымушаны быў пакінуць радзіму (1394), займаўся прапаведніцкай дзейнасцю ў манастырах Візантыі (ігумен манастыра Пантакратара), Малдавіі (прэсвітэр Сучаўскай царквы), Сербіі (ігумен Дзечанскага манастыра), Вялікага княства Літоўскага, з 1415 мітрапаліт Кіеўскі і ўсёй Літоўска-Беларускай дзяржавы.

Першыя ўрачыстыя словы Г. Цамблак напісаў у Візантыі ў 1397—1400 і 1403—06: «Слова пахвальнае велікамучаніку Георгію», «Слова пахвальнае сарака пакутнікам», «Слова пахвальнае прароку Ільі», «Слова на вялікі чацвер», «Слова на вялікую пятніцу» і інш. У час знаходжання ў Малдавіі (1401—03) створаны «Жыціе Іаана Новага Белгарадскага», «Слова пахвальнае тром отракам і прароку Данііілу», «Слова аб нябожчыках», «Слова пахвальнае Пятру і Паўлу» і інш.

У 1406 Г. Цамблак упершыню наведаў беларускія землі (ехаў праз іх па запрашэнні Кіпрыяна ў Маскву). У Вільні ён даведаўся пра смерць мітрапаліта ўсяе Русі (некаторыя даследчыкі лічаць, што Кіпрыян даводзіўся яму дзядзькам). Потым накіраваўся ў Сербію, дзе напісаў адзін з выдатнейшых твораў — «Жыціе Стэфана Дзечанскага». У 1409 наведаў Кіеў, дзе сказаў «Надмагільнае слова мітрапаліту Кіпрыяну». Знаходзячыся ў Літоўска-Беларускай дзяржаве, пазнаёміўся з праваслаўнымі епіскапамі і вялікім князем Вітаўтам, у якога ўскладніліся адносіны з рускім мітрапалітам Фоціем. Па прапанове Вітаўта на саборы беларускаўкраінскіх епіскапаў у 1414 ён быў вылучаны на пасаду мітрапаліта Вялікага княства Літоўскага. Нягледзячы на анафемы канстанцінопальскіх патрыярхаў і Фоція, 15.11.1415 сабор праваслаўных епіскапаў у беларускім горадзе Навагарадку (Навагрудку) абраў Грыгорыя Цамблака мітрапалітам. Вясной 1416 Грыгорый перанёс у Вільню мітрапалітаву кафедру (Кіеў спаліў хан Эдыгей), а сваёй рэзідэнцыяй зрабіў Наваградак. У 1418 на чале дэлегацыі з 300 прадстаўнікоў Літоўска-Беларускай дзяржавы, Вялікага Ноўгарада, Малдавіі і Вялікай Арды ён прымаў удзел у Канстанцкім саборы, дзе выступіў з дзвюма прамовамі («Прывітальнае слова папу Марціну V» і «Прывітальнае слова айцам Канстанцкага сабору»), але да уніі не схіліўся. Жывучы ў Беларусі (1414—19), Цамблак напісаў «Пахвальнае слова Яўфімію Тырнаўскаму», «Пахвальнае слова святому Дзімітрыю», палемічнае слова «Як трымаюць веру немцы», «словы» на царкоўныя святы (на Ушэсце, Прачыстую, Адсячэнне галавы Іаана Хрысціцеля і інш.), стыхіру «На Прачыстую», займаўся перапісваннем богаслужэбных кніг, прымаў удзел у складанні «Акруговай граматы» і «Апраўдальнага паслання заходнярускіх епіскапаў». Памёр, найбольш верагодна, у 1419, аднак некаторыя даследчыкі (А. Яцымірскі і інш.) выказвалі меркаванне, што ён каля 1420 падаўся ў Малдавію, дзе пражыў манахам у манастыры да сярэдзіны 15 ст.

Творы Цамблака напісаны яркай вобразнай мовай у экспрэсіўна-эмацыянальным стылі «пляцення славес». На беларускіх землях ён працягваў і развіваў традыцыі ўрачыстага красамоўства Кірылы Тураўскага, узнімаў пытанні шырокага грамадскага значэння. Абарона роднай веры і культуры, услаўленне нацыянальна-культурных дзеячаў ва ўмовах турэцкага нашэсця былі глыбока патрыятычным актам, узнімалі актуальнасць яго твораў. Ісіхасцкае светаадчуванне Грыгорыя арыентавала яго на зямны свет; у яго жыціях адчуваецца цікавасць да ўнутранага стану чалавека, канкрэтызуецца апісанне, ствараецца абстрактна-псіхалагічны вобраз героя. Літаратурная спадчына Цамблака была добра вядома ўсходнім і паўднёвым славянам, яго «словы», пазначаныя перадрэнесансавымі павевамі, захаваліся ў шматлікіх рукапісных зборніках 15—19 ст. — «Таржэственніках», «Жыціях святых», «Чэццях-мінеях», былі ўключаны ў старадрукаваны «Саборнік» (1642). Актыўна перапісваліся яго пропаведзі і жыціі ў беларускіх манастырах (Супрасльскім, Слуцкім Свята-Траецкім, Жыровіцкім, Аршанскім, Лаўрышаўскім і інш.), служачы своеасаблівымі літаратурнымі ўзорамі для мясцовых кніжнікаў і прапаведнікаў, духоўна ўзбагачаючы беларускіх чытачоў. Творчасць Цамблака сведчыць аб плённасці міжславянскіх літаратурных сувязей. Яна адыграла важную ролю ў гісторыі беларускай літаратуры, асабліва ў перыяд яе станаўлення, а таксама ў час жорсткай палемічнай барацьбы канца 16—17 ст. за захаванне нацыянальнай культуры і традыцый. *Т. П. Казакова.*

Бібліяграфія

1.2.
Похвално слово за Евтимий от Григорий Цамблак. София, 1971.

Житие на Стефан Дечански от Григорий Цамблак. София, 1983.

1.3.

1846. Стих «На успение пресвятой Богородицы» // Чтения в ОИДР. № 3.

1875. «Како держат веру немцы» // Попов А. Историко-литературный обзор древнерусских полемических сочинений против латинян (XI — XV вв.). М.; Стих «На успение пресвятой Богородицы»; «Слово в великий четверток» // Изв. ОРЯС. Отд. рус. яз. и словесности. Т. 6. Вып. 2.

1907. «Слово похвальное, иже у Флорентии и у Костентии собору...» // Сб. ОРЯС. Т. 82. № 4.

1981. «Слово похвальное, иже у Флорентии и у Костентии собору...» // Bulgarian Historical Review. Ninth year. Sofia.

1.5.

На балгарскую мову. Похвально слово за Киприан; Похвално слово за Евтимий; Похвално слово за Димитър Солунски // Стара българска литература: В 7 т. София. 1982. Т. 2.

На б. Югаславії мовы. Срблъак. Службе, канони, акатисти. Приредио Б. Трифуновиħ / Пер. Д. Богдановиħ. Београд. 1970. Кн. 2.

2.2.

На англійскай мове. Heppel M. The ecclesiastical career of Gregory Camblak. London, 1979.

На балгарскай мове. Давидов А., Данчев Г., Дончева-Панайотова Н., Ковачева П., Генчева П. Житие на Стефан Дечански от Григорий Цамблак. София, 1983.

Дончева-Панайотова Н. Киприан — старобългарски и староруски книжовник. София, 1981.

Дончева-Панайотова Н. Търновската книжовна школа и Русия в края на XIV и началото на XV век: Киприан и Григорий Цамблак: Автореф. на канд. дис. Велико Търново, 1974.

Киселков В. Митрополит Григорий Цамблак. София, 1943. 2 изд. София, 1946.

Киселков В. Патриарх Евтимий: Похвалното слово от Григорий Цамблак. София, 1935.

Мечев К. Григорий Цамблак. София, 1969.

Русев П., Гълъбов И., Давидов А., Данчев Г. Похвално слово за Евтимий от Григорий Цамблак. София, 1971.

Русев П., Давидов А. Григорий Цамблак в Румъния и в старата румънска литература. София, 1966.

Търновска книжовна школа. София, 1984. Т. 3. Григорий Цамблак: Живот и творчество.

На рускай мове. Сивкова А. Русско-болгарские литературные связи XV века: (Лит. история слов Григория Цамблака): Автореф. дисс... канд. филол. н. Л., 1983.

Яцимирский А. Григорий Цамблак: Очерк его жизни, административной и книжной деятельности. Спб., 1904.

Яцимирский А. Из истории славянской проповеди в Молдавии: Неизвестные произведения Григория Цамблака, подражания ему и переводы монаха Гавриила, Спб., 1906.

2.3.

На англійскай мове. Alissandratos J. The structure of Gregory Camblak's Eklogy of Cyprian // Palaeobulgarica (Sofia). 1982. № 1; Alissandratos J. The structure of Gregory Camblac's Seomon on Euthymius in the context of byzantine and medieval slavic literature // Palaeobulgarica. 1980. № 4.

На балгарскай мове. Ангелов Б. Из старата българска, руска і сръбска литература. София, 1958. Т. 1. С. 180—190; Яго ж. Проникване на старобългарски съчинения в старата руска литература // Старобългарска литература: Изследования и материалы. София, 1977. Кн. 2; Яго ж. Старобългарски писатели. София, 1981. С. 118—126; Яго ж. Страницы из историята на старобългарска литература. София, 1974. С. 202—210; Байчева М. Григорий Цамблак и Епифаний Премудрый // Трудове на Великотърновски университет «Кирил и Методий»: Филологически ф-т. 1981. Т. 16. № 1; Яго ж. Интерес към психологично изображение в «Похвално слово за Евтимий» и «Житие на Стефан Пермски» // Трудове на Великотърновски университет «Кирил и Методий». Филологически ф-т. Литературознание. 1983. Т. 18. № 1; Бегунов Ю. Гербът на Григорий Цамблак // Език и литература. 1973. № 4; Богданов И. Кратка история на българската литература в две части. София, 1969. Ч. 1. С. 140—149, 150—154; Велчев В. За някои черты в творчеството на Григорий Цамблак // Велчев В. От Константин Философ до Паисий Хилендарски. София, 1979; Яго ж. Творчеството на Григорий Цамблак в светлината на южнославянския предренесанс // История на българската литература. София, 1962. Т. 1; Език и литература. 1961. № 2; Генов М. Григорий Цамблак: (Из историята на културните отношения между българи, руси, сърби и румъни) // Българска историческа библиотека. София, 1930. Т. 2; Давидов А. За някои стилистични особености на Цамблаковата реч: Върху материал от «Мъчение на Йоан Нови» и «Похвално слово за патриарх Евтимий» // Славистични проучвания (Сборник в чест на VII Международен славистичен конгрес). София, 1973; Яго ж. Към лексикалната характеристика на «Похвално слово за Евтимий» у «Мъчение на Иоан Нови» от Григорий Цамблак // Търновска книжовна школа. 1371—1971. София, 1974; Яго ж. Неизвестен препис на «Похвално слово за патриарх Евтимий» от Григорий Цамблак // Език и литература. 1968. № 5; Данчев Г. Традициите на Търновската книжовна в Житието на Стефан Дечански от Григорий Цамблак // Търновска книжовна школа. 1371—1971. София, 1974; Динеков П., Куев К., Петканова Д. Христоматия по старобългарска литература. София, 1961. С. 366—384; София, 1967. С. 418—444; Дончева-Панайотова Н. Когда и къде е написано «Похвално слово за Киприан» от Григорий Цамблак // Литературна мисъл. 1976. № 20; Яго ж. Към въпроса за родството между митрополит Киприан и Григорий Цамблак // Старобългарска литература. София, 1978. Кн. 3; Яго ж. «Похвално слово за Киприан» от Григорий Цамблак // Литературна мисъл. 1978. № 4; Дуйчев И. Из старата българска книжнина. София, 1944. Ч. 2. С. 239—250, 401—403; Иванова К. Григорий Цамблак // Творци на българската литература. София, 1980. Т. 1; Илиева А. «Слово за преподобните отци в сирна събота» от Григорий Цамблак в руската ръкописна традиция // Старобългарска литература. София, 1982. Кн. 12; История на философската мисъл в България. София, 1970. Т. 1. С. 110—177; Киселков В. Проуки и очерти по старобългарска литература. София, 1956. С. 231—260; Коцева Е. Григорий Цамблак // Бележити българи. София, 1967. Т. 1; Мечев К. Григорий Цамблак: Черти от неговата съвременности, творчество и личноста му // Векове. 1974. № 1; Яго ж. Образът из патриарх Евтимий нарисуван от Григорий Цамблак // Български език и литература. 1964. № 4; Яго ж. Похвалното слово за Киприан от Григорий Цамблак // Литературна мисъл. 1966. № 2; Панчовски И. Григорий Цамблак като духовник и книжовник: (По случай 600 години от рождението му) // Духовна култура. 1964. № 12; Петкова И. Личност и народ в Похвално слово за Евтимий от Григорий Цамблак // Търновска книжовна школа. София, 1980. [Т.] 2; Първев Г. Констанцкият събор (1414—1418) и участието на Григорий Цамблак в него // Там жа. София, 1980. Т. 2; Първев Г., Бонев К. Срещата на Григорий Цамблак с папа Мартин II на събора в Констанц през 1418 г. // Исторически преглед. 1982. № 5; Русев П. Григорий Цамблак — български, сръбски, румънски и руски писател // Трудове на Висшия педагогически институт «Братя Кирил и Методий». Велико Търново. София, 1968. Т. 4; Яго ж. Естетика и майсторство на писателите от Евтимиевата книжовна школа. София, 1983. С. 112—171, 230—260; Яго ж. Литературното наследство на Григорий Цамблак // Русев П. Избрани страници. София, 1982; Селимски Л. Бележки за езика на Словото на Цамблак за Евтимий // Търновска книжовна школа. София, 1980. Т. 2; Снегаров И. Духовно-културни връзки между България и Русия през средните векове (X — XV в.). София, 1950. С. 71—89; Фай Х. Българско културно наследство в Германия: Григорий

Цамблак на Вселенския събор в Констанц — 1418 година // Лит. мисъл. 1981. № 10.

На беларускай мове. Самасейка Л. Беларуска-паўднёваславянскія літаратурныя сувязі ў старажытнасці // Садружнасць літаратур. Мн., 1968.

На нямецкай мове. Attar A. Abriss der ostslawischen Kirchengeschichte. Wien, 1950. S. 125—136; Kałużniacki E. Aus der panegyrischen Litteratur des Südslaven. Wien, 1901. S. 15—88.

На польскай мове. Chodynicki K. Kościół prawosławny a Rzeczpospolita Polska: Zarys historyczny. Warszawa, 1934. T. 1. S. 37—40, 45—47, 73—74; Fiałek J. Biskupstwo greckie w ziemiach ruskich od połowy w. XIV: Na podstawie źródeł greckich // Kwart. historyczny. (Lwów). 1897. Zesz. 1; Hlebowicz A. O pisarzach i dziełach polskich, ze słownika historycznego o pisarzach w Rossyi ze stanu duchownego greko-rossyjskiego kościoła // Dz. Wileński. 1822. Nr 7; Lewicki A. Sprawa unii Kościelnej za Jagiełłonów // Kwart. historyczny. (Lwów). 1897. T. XI. Nr 1; Narbutt T. Dzieje narodu litewskiego. Wilno, 1839. T. VI. S. 343—344; Prochaska A. Dążenia do unii cerkiewnej za Jagiełły // Przegl. powszechny (Warszawa), 1896. T. 13. Nr 6, 7; Stadnicki K. Bracia Władysława-Jagiełły Olgierdowicza Króla polskiego, wielkiego księcia Litwy. Lwów, 1867. S. 129—132.

На румынской мове. Landat J. D. Din relaţiile culturale romano-bulgare: Eftimie de Tirnovo şi scoala sa Nicodini de la Tismana, Grigore Ţamblac. Bucureşti, 1981. P. 108—129, 146—154; Melhisedec, episcopul. Mitropolitul Grigorie Tamblak. Viaţą şi opevile slave // Biserica ortodoxă romănă (Bucureti), 1884. Nr 6, 7, 9.

На рускай мове. [Балхавіцінаў Я.] Словарь исторический о бывших в России писателях духовного чина греко-российской церкви. Изд. 2. Спб., 1827. Т. 1. С. 97—103; Барбашев А. Витовт: Последние двадцать лет княжения (1410—1430). Спб., 1891. С. 179—187; Бегунов Ю. К вопросу о церковно-политических планах Григория Цамблака // Сов. славяноведение. 1981. № 3; Яго ж. К стилистике торжественного красноречия: Кирилл Туровский и Григорий Цамблак // Търновска книжовна школа. 1371—1971. Международен симпозиум Велико Търново, 11—14 октомври 1971. София, 1974; Яго ж. Малоизвестные и неизвестные сочинения Григория Цамблака // Byzantinobulgarica. Sofia, 1979. Т. 5; Яго ж. Рукописное наследие Григория Цамблака и задачи его изучения // Byzantinobulgarica. Sofia, 1978. Т. 5; Голенищев-Кутузов И. Славянские литературы. М., 1973. С. 29—33; Голубинский Е. История русской церкви: Период второй, московский. М., 1900. Т. 2. С. 377—388; Горина Л. «Похвальное слово Евфимию Тырновскому» Григория Цамблака как исторический источник // Славянские культуры и Балканы. I. IX — XVII вв. София, 1978; Горский А. Фотий, митрополит Киевский и всея Руси // Прибавления к твореним святых отец. М., 1852. Кн. 11; Греков И. Восточная Европа и упадок Золотой Орды (на рубеже XIV — XV вв.). М., 1975. С. 291—310; Яго ж. Очерки по истории международных отношений Восточной Европы XIV — XVI вв. М., 1963. С. 110—114; Дончева-Панайотова Н. Григорий Цамблак о Варламе и его ереси // Byzantinobulgarica. Sofia, 1980. Т. 6; Яго ж. «Похвальное слово Киприану» Григория Цамблака как произведение древнеболгарской и древнерусской литературы // Болгарская русистика. 1980. № 1; Яго ж. Сборники «Книга Григория Цамблака» — возникновение, содержание, распространение // Etudes balkanigues (Sofia). 1981. № 3; Дурново Н. Григорий Цамблак, митрополит Киевский // Русская беседа. 1895. № 1; / Иаков [Дамніцкі І.] Русское проповедничество: Исторический его обзор и взгляд на современное его направление. Спб., 1871. С. 39—46; Иван Федоров и восточнославянское книгопечатание. Мн., 1984. С. 154—155; Илиева-Сивкова А. Григорий Цамблак // ТОДРЛ. 1985. Т. 40; История белорусской дооктябрьской литературы. Мн., 1977. С. 50—51; Калиганов И. Новая попытка реконструкции биографии Григория Цамблака // Сов. славяноведение. 1983. № 1; Катаев Н. Очерк истории русской церковной проповеди. Одесса, 1874. С. 79—87; Леонид. Григориа мниха и презвитера, игумена обители Плинаирьскыа, надгробное иже во святыхъ по истиннъ Киприану, архиепископу Ростовскому // Чтения в ОИДР. 1872. № 1; Яго ж. Киприян до восшествия на Московскую митрополию // Там жа. 1867. № 2; Макарий. История русской церкви. Спб., 1886. Т. 4. С. 375—377; Т. 5. С. 216—230; Яго ж. О Григорие Цамблаке, митрополите Киевском, как писателе // Изв. ОРЯС. 1857. Т. 6. Вып. 2; Яго ж. Русская духовная литература в период домонгольский // Духовный вестник (Харьков). 1962. Вып. 1; Мечев К. Речь Григория Цамблака на Церковном соборе в Констанце // Bulgarian Historical Review: Ninth year. Sofia, 1981; Наумов Е. Кем написано второе Житие Стефана Дечанского // Славянский архив. М., 1963; Нікольский Материалы для истории древнерусской духовной письменности // Сборник ОРЯС. 1907. Т. 82. № 4; Петровский Н. К хронологии проповедей Григория Цамблака // Рус. филол. вест. 1901. Т. 48; Попов А. Историко-литературный обзор древнерусских полемических сочинений против латинян (XI — XV в.) М., 1875. С. 316—325; Поторжинский М. История русской церковной проповеди в биографиях и образцах пастырей-проповедников с $^1/_2$ IX—XIX в. К., 1901. С. 128—137; Пыпин А., Спасович В. История славянских литератур. Изд. 2. Спб., 1879. Т. 1. С. 94—155; Русев П. Литературное наследие Григория Цамблака // Etudes balkaniques (Sofia). 1980. № 2; Яго ж. Место и роль Тырновской Евфимиевой школы в культурном общении на Балканах и в Восточной Европе в Средние века // Славянские культуры и Балканы. I. IX — XVII вв. София, 1978; S. [Сакалоў П.] Киевский митрополит Григорий Цамблак: (Очерк его жизни и деятельности) // Богословский вест. 1895. № 7, 8; Снегаров И. К истории культурных связей между Болгарией и Россией в конце XIV — начале XV в. // Международные связи России до XVII в. М., 1961; Соббатовский А. Григорий Цамблак, митрополит Киевский и Литовский // Лит. епарх. вед. 1884. № 26, 36—39, 50; Соколов Д. История разделения русской митрополии. Спб., 1900. С. 70—81; Соловьев С. История России с древнейших времен. М., 1960. Т. 4. Кн. 2. С. 574—576, 578, 622; Станишич И. К проблеме двуязычия и многоязычия в литературе южных славян // Многоязычие и литературное творчество. Л., 1981; Сырку П. Новый взгляд на жизнь и деятельность Григория Цамблака // ЖМНП. 1884. № 11; Турилов А. Памятники южнославянской книжности в составе русских библиотек конца XV — XVII вв. // Сов. славяноведение. 1971. № 1; Шевырев С. История русской словесности: Столетие XIII — XIV и начало XV. М., 1858. С. 342—376, 382—388; Яцук В. У истоков белорусской философии // Философия и научный коммунизм. Мн., 1982. Вып. 9.

На ўкраінскай мове. Возняк М. Історія української літератури. Львів, 1920. Т. 1. С. 267—272; Грушевський М. Історія України-Руси. Львів, 1905. Т. 5. Ч. 2. С. 399—403, 512—518; Яго ж. Історія української літератури. К., 1926. Т. 5. Вып. 1. С. 13—18; Дам'янова М. «Похвальне слово» Григорія Цамблака на соборі в Констанці і традиції Тирновської літературної школи: (Проблеми стилю і мови) // Проблеми слов'янознавства. Львів, 1978. Вып. 14; Пелешенко Ю. З творчості та діяльності Григорія Цамблака // Українська література XVI — XVIII ст. та інші слов'янські літератури. К., 1984; Яго ж. Маловідомий твір Григорія Цамблака // Рад. літ.-знавство. 1985. № 7; Яго ж. Середньовічний художник слова // Всесвіт. 1984. № 2.

На французскай мове. Turdeanu É. Grégoire Çamblak: faux arguments d'une biographie // Revue des études slaves. 1946. T. XXII. Nr 1—4.

На б. Югаславіі мовах. Бегунов І. Граћа за библиографиіу радова о Григориіу Цамблаку // Књижевна историја (Београд). 1974. № 6; Кашанин М. Српска књижевност у средњем веку. Београд, 1975. С. 323—348; Кукулевић-Сакцински И. Жи-

вот Стефана Дечанского, краля србскога: Писан Григорием, игуменом обители дечанска // Arkiv za povijestnicu Jugoslavensku. Zagreb, 1857. Кп. 4; Маринковић Р. О месту Григорија Цамблака у српској књижевности // Търновска книжовна школа. 1371—1971. София, 1974; Я г о ж. О српској средњовековној биографској књижевности и о месту Григорија Цамблака у њој // Књижевност и језик (Београд). 1971. № 3—4; Павловић И. Домаћи извори за српску историју. Део први: Житиа краль срьбьскыхь. Београд, 1877. С. 251—292; Поповић П. «Житие Стефана Дечанского» Григориіе Цамблака // Старе српске биографиіе XV и XVII века. Цамблак, Константин и Пајсије. Београд, 1936. С. XII—XXXVI; Стара књижевност. Приредио Ч. Трифуновић. Београд, 1965; Изд. 2. Београд, 1972; Преписар Я. Шафарик // Гласник Друштва српске словесности. Београд, 1859. Кн. 11; Радојичић Ч. Творци и дјела старе српске књижевности. Титоград, 1963. С. 175—182; Трифуновић Ч. Emocinalni mehanizam Camblakoьh ličnosti // Стара књижевност. Београд, 1965.

Т. М. Махнач.

ЦАПРЫНСКАЯ АЛЕНА

Цапрынская-Цікава (Цапрынскайтэ) Алена (псеўд.: Алена, Алёна, Helena; канец 19 ст.— пасля 1930), паэтэса, празаік, перакладчыца, драматург. Пісала на беларускай, літоўскай і польскай мовах.

Нарадзілася А. Цапрынская на Случчыне, відаць, у сям'і дробнага шляхціца. Паводле ўскосных звестак у 1920-я гады жыла ў Савецкай Беларусі, у сталыя гады жыла ў Вільні.

У беларускім друку дэбютавала ў 1907 перакладам верша М. Горкага «Песня астрожніка» («Сонца ўсходзіць і заходзіць...»), у польскім — у 1908. У 1907—14 змяшчала свае творы на старонках «Нашай нівы», «Беларускага календара «Нашай нівы». Адначасова рэдагавала польскі часопіс «Lud» («Народ»), прызначаны для літоўцаў, актыўна супрацоўнічала з рэдакцыяй часопіса «Litwa» («Літва»). Верагодна, ёй належыць нататка «Беларуская справа», змешчаная ў часопісе «Люд» за 1913 год (№ 7—8). У 1907 у Вільні выйшаў на польскай мове яе вершаваны зборнік. Прыкладна з 1910 перайшла ў паэзіі і прозе на літоўскую мову. Свае літоўскія творы ў 1910—17 друкавала ў рыжскай газеце «Rigos garsas» («Рыжскі голас»).

У беларускіх вершах дакастрычніцкага часу А. Цапрынская паказвала бязрадасную рэчаіснасць, здзекі над простым чалавекам («Дудка», «Жнейка»), пісала творы, прасякнутыя шчырым пачуццём любві да Радзімы («Думка», «Марыля»). У 1925—29 свае беларускія вершы і апавяданні змяшчала ў газеце «Сялянская ніва», часопісе «Беларуская работніца і сялянка» («Кахаю Беларусь», «Праўда аб Беларусі», «К перавыбарам» і інш.).

М. А. Варвашэвіч.

Бібліяграфія

1.2.

Poezye. Wilno, [1907]. Рэц.: Ślepowron A. // Litwa. 1910. Nr 15.

«Odstępca»: Obrazek dramatyczny. Wilno, 1909.

1.3.

1908. O, Litwo moja // Litwa. Nr 5; Wigilia: Obrazek // Litwa. Nr 6.

1909. Litwa się budzi!..: Obrazek dramatyczny // Litwa. Nr 4; Wiosna; Litwo nasza // Litwa. Nr 6; Idźmy w dal wieków // Litwa. Nr 8; Małanka // Litwa. Nr 9; Odstępcy: Obrazek dramatyczny // Litwa. Nr 11, 12; Ziemio moja!..; Królowa Jura: (Opowieść fantastyczna) // Litwa. Nr 14—15; Składam Tobie cześć!..: Sonet; Z burzliwej chwili // Litwa. Nr 16; Świsłoczanka: (Obrazek dramatyczny) // Litwa. Nr 17; Oto idzie jesień // Litwa. Nr 18; Cześć Litwince!.. // Litwa. Nr 20—21; Piosnka ojcowa: (Obrazek dramatyczny) // Litwa. Nr 20—21, 22, 23; 1910. Nr 1, 2.

1910. Малым дзеткам: [Верш] // Н. н. 1 крас. / Пад псеўд. Алена; Szczęście; Zima // Litwa. Nr 3; Wiedźmiedź z Hłuszy: Nowela // Litwa. Nr 4, 9, 12—14, 17—18. 19, 21—24; Wiosna; Szarony // Litwa. Nr 7; Litwinie!.. // Litwa. Nr 8; Drużynie Artystów na pamiątkę litewskiego wieczoru w Mińsku Litewskim d. 20 kwietnia 1910 roku // Litwa. Nr 9; Ofiara: Dramacik w 2-ch aktach // Litwa. Nr 10, 11, 13, 14; Litwinom: Z moich wspomnień // Litwa. Nr 15, 16; Panu Adamowi w odpowiedź na Jego śliczny wiersz w Nr 17—18 «Litwy» // Litwa. Nr 20.

1911. Жнейка: [Верш] // Н. н. 11 жн. Gwiazda nadziei // Litwa. Nr 1; Wieniec Miłości: (Dramacik w 2-ch aktach) // Litwa. Nr 2—6; Pieśń wiosenna // Litwa. Nr 7; Marzyciel: (Sztuka w 3-ch aktach) // Litwa. Nr 7—11, 13, 15, 17—18; Pamięci Brata Kazimierza zabitego w dniu 1-go września 1911 roku // Litwa. Nr 17—18; Dla niej: Obrazek dramatyczny w 3-ch aktach // Litwa. Nr 20—22, 24; 1912. Nr 5, 9—10, 13; Przyjaciołom «Litwy» // Litwa. Nr 24.

1912. Малым дзеткам: [Верш] // Беларускі каляндар «Нашай нівы» на 1912 год. Вільня / Пад псеўд. Алена; Марыля: [Верш] // Н. н. 21 снеж.; Nie siejcie nienawiści // Litwa. Nr 3; Z chwili // Litwa. Nr 6; Prośba: // Litwa. Nr 7; Promienie; Z pola walki // Litwa. Nr 8; Balkon; Z wycieczki do Werek // Litwa. Nr 14; Falo niewierna!..; Odpowiedź // Litwa. Nr 16; Cyrk Nerona; Bądź wola Twoja!..; Do braci — pieśniarzy // Litwa. Nr 19; Serce: (Obrazek dramatyczny) // Litwa. Nr 21, 23—24; W burzę; Cicho, Bracie!.. // Litwa. Nr 22; Godzina Bólu // Litwa. Nr 23—24; Do Litewskiego ludu // Lud. Nr 1; Błagamy cię; Nie drżycie; Cichy chłopiec: (Obrazek z życia) // Lud. Nr 3; Idę (Odpowiedź p. R. K.); Rzeka // Lud. Nr 7; Wiósna // Lud. Nr 8; W świątyni // Lud. Nr 10; Pogadanki // Lud. Nr 10—14, 18, 20—23; **1913.** Nr 2—3, 5—12; Maj // Lud. Nr 12; Bądź pochwalone, o serce Jezusa! // Lud. Nr 17; Hymn Błagalny // Lud. Nr 22.

1913. Nowy Rok // Litwa. Nr 1; Promienie: (Opowieść współczesna) // Litwa. Nr 4, 6, 9—10, 13—30; Nie rzucaj skarg; Naprzód // Litwa. Nr 7—8; Nie siejcie nienawiści; Kocham cię; Wiosna // Litwa. Nr 18—19; Litwo — Matko!.. // Litwa. Nr 25—26; Na mogile // Litwa. Nr 27—28; Ja kocham Litwę // Litwa. Nr 29—30; Kiedy? // Litwa. Nr 33—35; Odpowiedź; Czemu!.. // Litwa. Nr 39—41; Dzień zaduszny; Idę do pracy //

Litwa. Nr 42—44; Litwa!..; Piosenka // Litwa. Nr 45—47; Noworoczne życzenia; Ofiara // Lud. Nr 1; Pamięci młodego poety Kazia Kalinowskiego // Lud. Nr 3; W zimie; Zamieć // Lud. Nr 4; Luty // Lud. Nr 7—8; Zima powraca // Lud. Nr 9—10; Kiedy okręt tonie // Lud. Nr. 11—12.

1914. Думка: [Верш] // Н. н. 31 студз.; Nowy Rok // Litwa. Nr 1—2; Na Zachodzie // Litwa. Nr 3—4; Ostatnia struna // Litwa. Nr 5—6; Fragment; W marcu; Piosenka; Do młodej Litwinki // Litwa. Nr 7—10; Wielkanoc // Litwa. Nr 11—12; Dzwony // Litwa. Nr 13—14; Toast na cześć Członków Akademii Umiejętności w Genewie // Litwa. Nr 15—16; Na gwiazdkę Litwinom i Litwinkom; Na gwiazdkę «Litwie»; Autorowi wiersza «Na mogiłach»; Odpowiedź na odpowiedź // Litwa. Nr 50—52.

1925. Кахаю Беларусь: [Верш] // Сялян. ніва. 6 снеж. / Пад псеўд. Алена; Праўда аб Беларусі: [Верш] // Там жа. 21 снеж. / Пад псеўд. Алена.

1926. «Ой нядолечку каваль мне накаваў...»: [Верш] // Сялян. ніва. 24 студз. / Пад псеўд. Алена; Задума: [Верш] // Там жа. 21 лют. / Пад псеўд. Алена.

1927. К перавыбарам: [Верш] // Чырв. Палессе. 24 снеж. / Пад псеўд. Алена. Аўт. спрэчнае.

1928. Сваяк: [Апавяданне] // Бел. работніца і сялянка. № 8 /Пад псеўд. Алена. Аўт. спрэчнае.

1929. Што казаў школьны будынак: Апавяданне // Бел. работніца і сялянка. № 9 /Пад псеўд. Алена. Аўт. спрэчнае.

1967. Думка: [Верш] // Беларуская дакастрычніцкая паэзія. Мн.

1.4.

1907. Горкі М. Песня астрожніка: [Верш] // Н. н. 25 студз. / Пер. пад псеўд. Алена. *У. І. Мархель.*

ЦВІРКА КАСТУСЬ

Цвірка (Цвірка-Гадыцкі) Кастусь (Канстанцін Аляксеевіч; псеўд.: К. Гадыцкі; н. 28.3. 1934, в. Зялёная Дуброва Старадарожскага р-на Мінскай вобл.), паэт, перакладчык, фальклярыст, этнограф. Член СП Беларусі з 1961. Кандыдат гістарычных навук (1972).

Нарадзіўся ў сялянскай сям'і. Бацька, Аляксей Сымонавіч, быў калгаснікам; вярнуўшыся дадому з фінскага фронту, моцна хварэў і памёр у 1942 ва ўзросце 33 гадоў. Маці, Надзеі Канстанцінаўне, тады было 28 гадоў, і на руках у яе засталося пяцёра дзяцей: самаму большаму, Кастусю, споўнілася сем, самая меншая, Яня, нарадзілася праз некалькі дзён пасля смерці бацькі. Бацькаў брат, Фёдар, быў у партызанах і часта прыходзіў з лесу, каб атрымаць звесткі пра нямецкі гарнізон. Сям'я жыла пад пастаяннай пагрозай. Аднойчы немцы схапілі маці і павялі на допыт. Цудам ёй удалося выратавацца. У 1953 К. Цвірка скончыў сярэднюю школу ў г. п. Старыя Дарогі і паступіў на філалагічны факультэт БДУ. У 1958 скончыў універсітэт і 2 гады выкладаў рускую і беларускую мову і літаратуру ў Труханавіцкай сярэдняй школе Капыльскага р-на. Потым працаваў загадчыкам аддзела раённай газеты «Рудзенская праўда» (1959—60), рэдактарам выдавецтва Акадэміі сельскагаспадарчых навук БССР (Мінск), рэдактарам літаратурна-драматычнага вяшчання Беларускага радыё (1960—63), быў на творчай рабоце (1963—65). У 1965—68 старшы інспектар Упраўлення па распаўсюджанні друку Міністэрства сувязі БССР, у 1968—69 старшы метадыст рэспубліканскага Дома народнай творчасці, у 1969—72 аспірант Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору АН БССР. З 1972 малодшы, з 1973 старшы навуковы супрацоўнік гэтага інстытута. З 1984 загадчык аддзела паэзіі часопіса «Полымя». Член Рады СП Беларусі (з 1990).

Першыя артыкулы К. Цвіркі з'явіліся ў рэспубліканскім друку ў 1951, першыя вершы — у 1953. Першы зборнік паэзіі «Такія сэрцы ў нас» (1959) звярнуў на сябе ўвагу крытыкі: яго разглядалі разам з першымі кнігамі М. Арочкі, Р. Барадуліна, А. Лойкі і інш. Праца і побыт, юнацкія мары, рамантычная мэтанакіраванасць яго лірычнага героя перарастаюць у летапіс жыцця цэлага пакалення. Поруч з сучаснасцю ў яго творах абавязкова заглыблены экскурс у гісторыю свайго народа. Шчырая споведзь у вершах і паэмах К. Цвіркі «Хат вячысты дар», «Дзе дуб з бярозкай звіўся», «Дома» вырастае з асэнсавання спрадвечнага вопыту народа, яго гістарычнай памяці, праблем сучаснасці. Ён аўтар зборнікаў вершаў для дзяцей «Зайчыкаў хлеб», «Дарункі лесу», «Як Алесь згубіўся ў лесе», «Добрыя суседзі», кнігі мастацкіх нарысаў «Той курган

векавечны», манаграфіі «Слова пра Сыракомлю». Складальнік тома «Вяселле. Абрад» фальклорнай серыі «Беларуская народная творчасць». Выступае ў друку з артыкуламі, рэцэнзіямі па пытаннях літаратуры, этнаграфіі і фальклору. Перакладае польскамоўныя паэтычныя творы ўраджэнцаў Беларусі Т. Зана, А. Міцкевіча, У. Сыракомлі, Я. Чачота, а таксама з англійскай, грузінскай, рускай, украінскай моў. Песні на вершы К. Цвіркі напісалі Я. Касалапаў, І. Лучанок, А. Турышаў.

Жыве ў Мінску.

Л. М. Гарэлік.

Бібліяграфія

1.1.

Рэха дарог: Вершы. Мн., 1982 (Б-ка беларус. паэзіі). Зялёная Дуброва: Кніга паэзіі. Мн., 1987.

1.2.

Такія сэрцы ў нас: Вершы. Мн., 1959. Рэц.: Канэ Ю. Песню нялёгка скласці // Маладосць. 1960. № 3; Шаўня А. Песні неспакойнага юнацтва // Беларусь. 1960. № 9.

Бягуць раўчукі: Вершы. Мн., 1962. Рэц.: Каваль М. Шчырае і надуманае // ЛіМ. 1962. 28 жн.; Лявонаў М. Каб сцежка вывела на дарогу // Полымя. 1962. № 12.

Зайчыкаў хлеб: Вершы. Мн., 1966.

Чарназём: Вершы. Мн., 1967. Рэц.: Аляхновіч У. Бальшакамі жыцця // Чырв. змена. 1968. 10 крас.; Блатун С. Сіла зямлі // Вяч. Мінск. 1968. 12 жн.; Вертинский А. Возвращение к истокам // Дружба народов. 1968. № 10; Вярцінскі А. Песня ў сэрцы ляжала... // Полымя. 1968. № 5; Гіль М. Жыць на зямлі // ЛіМ. 1968. 26 крас.; Макарэвіч В. Кліч зямлі // Мін. праўда. 1968. 5 сак.

Дарункі лесу: [Вершы]. Мн., 1969. Рэц.: Шаховіч М. Дарункі зялёнай дубровы // Наст. газ. 1972. 5 жн.

Быт и культура белорусов в творчестве В. Сырокомли: Автореф. дисс... канд. историч. наук. Мн., 1972.

Дарога ў сто год: Нарыс. Мн., 1974. Рэц.: Рудчык В. Тры кніжкі пра аднаго паэта // Ніва. 1975. 23 ліст.

Каласы: Вершы. Мн., 1975. Рэц.: Бабей В. Залог новых встреч // Сел. газ. 1976. 14 янв.; Марчанка С. Ніва паэта // Беларусь. 1976. № 11.

Слова пра Сыракомлю: Быт і культура беларусаў у творчасці «вясковага лірніка». Мн., 1975. Рэц.: Мархель У. Ад спадчыны Сыракомлі // Полымя. 1976. № 9; Wilczyński W. // Prz. Humanistyczny. 1976. Nr 5.

Сцежка дадому: Вершы. Мн., 1980. Рэц.: Багданаў Ю. Краю роднага рысы // Полымя. 1981. № 9; Мішчанчук М. Пераадольваючы самога сябе // ЛіМ. 1981. 2 студз.

Хат вячысты дар: Вершы і паэма. Мн., 1982. Рэц.: Васілевіч У. Высокі свет зямлі // Маладосць. 1983. № 5; Гарэлік Л. Шукае душа гармоніі // ЛіМ. 1983. 26 жн.; Клімуць Я. Сувязь часоў // Полымя. 1983. № 11.

Той курган векавечны...: Сцяжыны вандровак. Мн., 1985. Рэц.: Панаёк Н. Падарожжа ў мінуўшчыну // Ніва. 1985. 22 вер.

Як Алесь згубіўся ў лесе: Казкі і вершы. Мн., 1986.

Добрыя суседзі: Вершы, казка. Мн., 1988.

Лодка долі тваёй: Кніга паэзіі. Мн., 1988.

Беларуская фальклярыстыка: Эпоха феадалізму. Мн., 1989 / Сааўт. Г. Каханоўскі, Л. Малаш.

Лісце забытых алеяў: Эсэ. Мн., 1933.

1.3.

1951. Боевой помощник // Сталин. молодежь. 14 дек.

1953. Камбайнёрка маладая: [Верш] // Маладосць. № 9; Вясна; Карціна: [Вершы] // Полымя. № 5; Малады меліяратар: [Верш] // Сав. Радзіма. 19 крас.

1954. Пастух: [Верш] // Вожык. № 6; У полі; Садоўнік; Экскаватар: [Вершы] // Полымя. № 6; Баяніст: [Верш] // Чырв. змена. 15 сак.; Ходзіць трактар: [Верш] // Там жа. 17 кастр.; Салаўі: [Верш] // Там жа. 14 ліст.

1955. На радзіме паэта; На балоце; Мой друг: [Вершы] // Беларусь. № 4; Вёска мая: [Верш] // Маладосць. № 9; Грэчка; Лівень: [Вершы] // Полымя. № 7; У студэнцкім інтэрнаце: [Верш] // Чырв. змена. 15 мая; Беларускае мора: [Верш] // Там жа. 21 жн. / Сааўт. І. Калеснік.

1956. Пастух: [Верш] // Мастацкае слова. Мн.; Вясна ў Дуброве: [Верш] // Беларусь. № 5; Падарунак: [Верш] // Вожык. № 7; Залатыя прыскі ля Джэтыгары: [Верш] // Маладосць. № 12; У кузні: [Верш] // Чырв. змена. 25 сак.; Песня паэта: [Верш] // Там жа. 24 чэрв.; Помнік Леніну; Хлапчукі; На трактары: [Вершы] // Там жа. 15 снеж.; «Ідзе яна, і вецярок з зарэчча...»: [Верш] // Там жа. 23 снеж.

1957. Будаўнік: [Верш] // Беларусь. № 8; Па Уралу; Палатка; Экзамены; У гасцях у казаха; Рукі; Хлеб: [Вершы] // Маладосць. № 9; У музеі Янкі Купалы: [Верш] // Полымя. № 7; Маладая зямля: [Верш] // Чырв. змена. 8 чэрв.; Як гартавалася сталь: [Верш] // Там жа. 20 кастр.

1958. Вясна; Салаўі; Палатка; Ручай; Залатыя прыскі ля Джэтыгары; Хлеб; Мае падарункі; Экскаватар; У полі; Камбайнёрка маладая; Карціна: [Вершы] // Падарунак. Мн.; Мой бацька: [Верш] // Беларусь. № 1; Двое ў стэпе; Тарпан: [Вершы] // Там жа. № 6; Мяцеліца: [Верш] // За вярт. на Радзіму. № 94; Такія сэрцы ў нас; «Нават дзень, скажы, пражыць мне як...»; У лесе: [Вершы] // Маладосць. № 3; Госць: [Верш] // Там жа. № 7; Ліпень: [Верш] // Полымя. № 7; Рэха: [Верш] // Там жа. № 12; «Я з кніжкаю бегаў у школу штодня...»: [Верш] // Работніца і сялянка. № 5; Крылы верша // Чырв. змена. 29 чэрв.; Я вас разумею, хлопцы: [Верш] // Там жа. 4 вер.; «Беларусі ўжо граніца!..»: [Верш] // Там жа. 31 снеж.

1959. Камбайнёрка маладая: [Верш] // За вярт. на Радзіму. № 2; Ідзе палямі аграном; Лодачкі; «Зямля — аркестр. Ты да зары...»: [Вершы] // Маладосць. № 5; Аб школьных праграмах па літаратуры // Полымя. № 9; Агрэхі ў добрай кніжцы: [Рэц. на кн.: Грахоўскі С. Ад вясны да вясны. Мн., 1959] // Там жа. № 12; Дуб: [Верш] // Чырв. змена. 17 мая.

1960. Ленін па свеце ідзе: [Вершы] // Беларусь. № 4; Бягуць раўчукі: [Верш] // Там жа. № 5; Чатыры кляны: [Верш] // Там жа. № 6; Асенняя радасць: [Верш] // Там жа. № 10; Калгасны хор; Пціч: [Вершы] // Маладосць. № 6; Калі не знойдзена свая тэма: [Рэц. на кн.: Скрыпка М. Мая хата не з краю. Мн., 1959] // Полымя. № 3; Без надакучлівай дыдактыкі: [Рэц. на кн.: Прануза П. Добры дожджык. Мн., 1960] // Там жа. № 11; Голасам самабытным і свежым // ЛіМ. 17 лют.; Крыніца: [Верш] // Там жа. 9 крас.

1961. Такія сэрцы ў нас; Лодачкі: [Вершы] // Анталогія беларускай паэзіі: У 3 т. Мн. Т. 3; Ленін па свеце ідзе: [Верш] // Вершы, аднаактовыя п'есы. Мн.; Дарогі; Патрэбны на працу; Людзі; Сонца: [Вершы] // Маладосць. № 12; Калі зніжаецца патрабавальнасць: [Рэц. на кн.: Шмань Г. Жывое срэбра. Мн., 1960] // Полымя. № 7; Калі паэт знізіў патрабавальнасць: [Рэц. на кн.: Вольскі А. Чырвоная зорка. Мн., 1961] // Там жа. № 11; Паэзія сябруе з неспакойнымі: [Рэц. на кн.: Гілевіч Н. Неспакой. Мн., 1961] // Там жа. № 12; Твае рукі: [Верш] // Работніца і сялянка. № 10; Вырастае гэтак вось з Мікалая Міка // Звязда. 21 снеж.; «Не раз я хадзіў тут на золку да дня...»: [Верш] // Чырв. змена. 28 мая; Здзіўляліся хлопцы...: [Верш] // Там жа. 17 вер.

1962. У музеі Янкі Купалы: [Верш] // Народны паэт Беларусі. Мн.; Патрэбны на працу // Слаўце Радзіму. Мн.; Смерць каваля; «З поля каровы ідуць...»: [Вершы] // Беларусь. № 3; На радзіме паэта // Сел. гасп. Бел. № 11 / Сааўт. А. Рыбак; Героі паэмы трымаюць

сцяг // Калг. праўда. 5 ліп. / Сааўт. І. Курбека; «Праз ноч усю гуляў віхор...»: [Верш] // Ніва. 18 лют.; «Быў клён, як садзіў я...»; «Праз ноч усю гуляў віхор...»: [Вершы] // Чырв. змена. 4 лют.; «Вышаў з горада, горды...»: [Верш] // Там жа. 17 лют.; Вы, пэўна, бачылі..: [Верш] // Там жа. 15 сак.; Шляхамі дружбы: Паэма // Там жа. 8 мая; Нябесным братам: [Верш] // Там жа. 25 жн.

1963. Помнік Леніну: [Верш] // Бяссмерце. Мн.; «Чатыры стыхіі»: [Рэц. на кн.: Дзяргай С. Чатыры стыхіі. Мн., 1962] // Беларусь. № 4; Голас партызан пад Палікам: [Верш] // Там жа. № 10 / Пад прозв. Цвірка-Гадзіцкі К.; Мой друг: [Верш] // Бярозка. № 8; Этапы шляху баявога: Да 45-годдзя Ленінскага Камуністычнага Саюза Моладзі: [Вершы] // Там жа. № 10; Коцікі: [Верш] // Вясёлка. № 5; Куры: [Верш] // Там жа. № 7; Чатыры вятры; «Мы смяёмся і плачам...»; «Людзі — зоркі...»: [Вершы] // Маладосць. № 2; «Ужо й красавік — убок...»; «Хачу параўнаць паэта...»; «Сёння спаць не пайду, не пайду...»; «Дрэвы паміраюць, як салдаты...»: [Вершы] // Там жа. № 12; Паэтычная разведка: [Рэц. на кн.: Макарэвіч В. Вогненная камета. Мн., 1963] // Полымя. № 5; Струмень паэзіі: [Рэц. на кн.: Барскі А. Белавежскія матывы. Беласток. 1962. Там жа. № 6; Чорная скіба: [Верш] // Там жа. № 7 / Пад прозв. Цвірка-Гадзіцкі К; Такія сэрцы ў нас: [Верш] // Віцеб. рабочы. 29 кастр.; Сакавік: [Верш] // Звязда. 5 сак.; З жыццёвых шляхоў: [Рэц. на кн.: Лойка А. Дарогі і летуценні. Мн., 1963] // ЛіМ. 31 мая; «Як жывы глядзіць на нас...»: [Верш] // Там жа. 30 ліп.; Выпрабаванне часам: [Рэц. на кн.: Сташэўскі В. Шуміць бярэзінка. Мн., 1963] // Там жа. 27 жн.; Вершы застаюцца ў страі // Там жа. 27 вер.; Свет дзіцячай душы: [Рэц. на кн.: Парахневіч М. Мы майструем самалёт. Мн., 1963] // Там жа. 26 ліст.; Жыцця майго клубок: [Верш] // Там жа. 17 снеж. / Пад прозв. Цвірка-Гадзіцкі К.;Мінск: [Верш] // Мін. праўда. 26 мая; Дзень паэзіі: [Верш] // Там жа. 11 снеж.; Птушыны хор: [Верш] // Піянер Бел. 26 ліп.; Вялікі майстра: [Верш] // Чырв. змена. 20 студз.

1964. Замачылі: [Верш] // Рэпертуарныя старонкі. Мн.; Віцеб. рабочы. 22 ліст.; Чалавек з «Кап Арконы»: Нарыс // Маладосць. № 12; З сэрцам і перцам: [Рэц. на кн.: Пад корань. Мн., 1963] // Полымя. № 2; Дзеці любяць добрыя вершы: [Рэц. на кн.: Лось Е. Вяселікі. Мн., 1963] // Там жа. № 5; Спрэчка ў лесе: [Верш] // Работніца і сялянка. № 4; Каб мы жылі: [Верш] // Віцеб. рабочы. 25 студз.; Сакавік: [Верш] // Там жа. 29 сак.; Шукаць, ісці далей: [Рэц. на кн.: Каспяровіч І. Спяваючыя ступенькі. Мн., 1963] // ЛіМ. 10 студз.; Коцікі: [Верш] // Ніва. 10 мая; Купіў сабе касцюм Савось: [Верш] // Там жа. 25 кастр.; Чырв. змена. 13 вер.; Вясны зялёныя сцягі...: [Верш] // Там жа. 1 мая.

1965. Беларускія грыбы: [Верш] // Бярозка. № 7; Рыбакі: [Верш] // Там жа. № 8; Дождж: [Верш] // Работніца і сялянка. № 9; Неўміручасць // Звязда. 3 жн.; Куры; Кошык: [Вершы] // Ніва. 29 жн.; Радуйся: [Верш] // Чырв. змена. 10 кастр.

1966. Жамчужыны роднай зямлі: [Верш] // Дзень паэзіі — 66. Мн.; Тры краіны; «Калі над горадам усходжваецца непагода...»: [Вершы] // Полымя. № 10; Патрэбен краязнаўчы часопіс // ЛіМ. 9 мая / У сааўт.; Падпіска — не адпіска // Там жа. 8 ліп.

1967. Пешкі; Памылкі; «Усё мінаецца, мяняецца...»: [Вершы] // Маладосць. № 1; Зямлі патрэбны паэты; Цецерукова мова: [Вершы] // Полымя. № 2; Зайчыкаў хлеб // Работніца і сялянка. № 1; Мой друг: [Верш] // Звязда. 24 ліст.; «Люблю па базары...»; Пра сабак, якія вартуюць дачы: [Вершы] // ЛіМ. 28 ліст.

1968. «Людзі — зоркі: запаляцца ў свеце...»: [Верш] // Ніва. 16 чэрв.

1969. Такія сэрцы ў нас; Лодачкі: «Ідзе яна, і ветрык ёй з зарэчча...»; «Ужо і зіма — убок...»; «Мы смяёмся і плачам...»: [Вершы] // Мары юнацкія. Мн.; Рака: [Верш] // Бярозка. № 6; Балада пра Хатынь; «Аднекуль з-пад воблачка...»: [Вершы] // Полымя. № 11.

1970. Коцікі: [Верш] // Крынічка. Мн.; Я прыйшоў да вас; «Трасе, трасе планету праз гады...»; Нашто нам; «Далёка ад азародаў...»; Чатырохрадкоўі; «Замятае ліцем, замятае...»: [Вершы] // Маладосць. № 12; Першае слова паэта: [Рэц. на кн.: Дайнека Л. Галасы. Мн., 1969] // Полымя. № 4; [Рэц. на кн.: Ставер А. Пад канвоем. Мн., 1969] // Там жа. № 6; Збіральнікі жывога летапісу: [Рэц. на кн.: Гілевіч Н. З клопатам пра песні народа. Мн., 1970] // ЛіМ. 16 кастр.; [Прадмова да вершаў Х. Ляшкевіча] // Чырв. змена. 9 жн.

1971. Такія сэрцы ў нас: [Верш] // Універсітэт паэтычны. Мн.; Аўтар кнігі — народ: [Рэц. на кн.: Беларускі фальклор. Мн., 1970] // Полымя. № 3; Дарога ў сто год: Нарыс // Там жа. № 6; Карэктура кнігі «Вясковага лірніка» // ЛіМ. 2 ліп.; Урывак з паэмы «Сонцаход» // Мін. праўда. 30 сак.

1972. Чорная скіба: [Верш] // Залацінкі. Мн.; Я прыйшоў да Вас...; Лодачкі; Забытая: [Вершы] // Зорка Венера. Мн.; Этнаграфічная спадчына Уладзіслава Сыракомлі // Весці АН БССР. Сер. грамад. н. № 1; «Я цябе, як песню, любіў...»; Закон вады: [Вершы] // Маладосць. № 9; Записки «Вясковага лірніка» // Неман. № 3; Уладзіслаў Сыракомля і Беларусь // Полымя. № 4.

1973. З майго жыцця // Вытокі песні. Мн.; «З далёкай вандроўкі...»; «Тут усе...»: [Вершы] // Дзень паэзіі — 73. Мн.; Завуць касманаўтаў планеты; Даяркі; Апошняе слова Каліноўскага: [Вершы] // Беларусь. № 10; Хадыка; «Зноў вярнуўся я ў бацькаў свет...»; «За Стоўбцамі, дзе, як паданне, ноч...»; Жураўліныя ягады: [Вершы] // Маладосць. № 11; Я з той краіны...; «Мае землякі...»; Песня партызана; «У мяне ёсць мара глыбінная...»; «Былі тады — ноч...»; Першы крык: [Вершы] // Полымя. № 7; Вызваленне: [Верш] // Звязда. 3 ліп.; Хаця б чаго не выйшла: [Верш] // ЛіМ. 27 ліп.; Галоўны герой — чалавек: [Рэц. на кн.: Рыбак А. Дарогі бываюць розныя. Мн., 1972] // Мін. праўда. 12 чэрв. / Пад псеўд. К. Гадыцкі; Вытокі песні «вясковага лірніка» // Чырв. змена. 29 вер.

1974. Бацькаўшчына: [Верш] // Дзень паэзіі — 74. Мн.; Вучыцца ў Леніна нам трэба; Герцэн; «Мова зямлі маёй...»; «Вось ізноў...»; «Праз вуліц і двароў хітраспляценні...»; «Так кожнаму наканавала...»: [Вершы] // Полымя. № 11; Самацветы народнай творчасці // Звязда. 25 жн. / Сааўт. А. Ліс, І. Цішчанка; Гераічнае ў паўсядзённым // ЛіМ. 1 сак.; Вучыцца ў Леніна нам трэба: [Верш] // Маг. праўда. 13 ліст.; Мова зямлі маёй!..: [Верш] // Ніва. 22 снеж.; Вытокі народнай творчасці: [Рэц. на кн.: Беларускі фальклор у сучасных запісах. Мн., 1973] // Чырв. змена. 4 чэрв.

1975. Навуковая спадчына П. Ф. Глебкі // Глебка П. Пытанні гісторыі, філалогіі, мастацтва. Мн.; Балада пра Хатынь // Слухайце — Хатынь! Мн.; Скарбы народнай творчасці: [Рэц. на кн.: Жартоўныя песні. Мн., 1974] // Беларусь. № 8; Паэзія купалля: [Рэц. на кн.: Ліс А. Купальскія песні. Мн., 1974] // Маладосць. № 2; [Рэц. на кн.: Беларускае народнае жыллё. Мн., 1973] // Нёман. № 3; Дзекабрысты: [Верш] // Полымя. № 12.

1976. «На тое ж у нас...»; «Памёр чалавек...»: [Вершы] // Дзень паэзіі — 76. Мн.; Такія сэрцы ў нас; «З-пад плуга твайго...»; «Нават дзень...»: [Вершы] // Люблю будзённы дзень. Мн.; Аб сутнасці забабонаў // Беларусь. № 8; [Рэц. на кн.: Беларускае народнае адзенне. Мн., 1975] // Помнікі гіст. і культ. Бел. № 3; Цікавае даследаванне: [Рэц. на кн.: Изменения в быту и культуре городского населения Белоруссии. Мн., 1976] // Чырв. змена. 12 жн.

1977. Чатыры вятры: [Верш] // Дзень добры, мама! Мн.; Лірыка; «Прыстаў да льду каліны ліст...»; Зноў вы стынеце, вербы мілыя...; «І дабрата, і прыгажосць...»: [Вершы] // Маладосць. № 2; Біяграфія рыбалоўства: [Рэц. на кн.: Браім І. Рыбалоўства на Беларусі. Мн., 1976] // Помнікі гіст. і культ. Бел. № 2; Вучыцца ў Леніна нам трэба: [Верш] // Работніца і сялянка. № 4; Калі гісторыя — сучаснасць // Чырв. змена. 3 ліп.

1978. «Зноў вярнуўся я ў бацькаў свет палявы...»; Я прыйшоў да вас: [Вершы] // Адданасць. Мн.; Балада пра Хатынь // Беларуская балада. Мн.; Беларускае традыцыйнае вяселле // Вяселле: абрад. Мн.; Дарогі: [Верш] // Дзень паэзіі — 78. Мн.; Такія сэрцы ў нас: [Верш] // Сэрцам табе прысягаю. Мн.; Бліжэй да зямлі: [Рэц. на кн.: Карызна У. Цеплыня. Мн., 1977] // Беларусь. № 2; Францыск, Скарынін сын; Ізлач; Рыжкі; «Пакуль маё сэрца замкнёна было...»;

«Згубіў цябе. Куды ж пайсці?..»; «Няхай табе даўно за сорак...»; «Ізноў я прачынаюся на сене...»; Старадарожскі раён: [Вершы] // Полымя. № 1; Кветкі Чарнышэўскаму: [Верш] // Там жа. № 7; «Згубіў цябе. Куды ж пайсці...»: [Верш] // Голас Радзімы. 9 сак.; Да штыка прыраўняўшы пяро: [Рэц. на кн.: Сачанка І. Публіцыстыка беларускіх пісьменнікаў у гады Вялікай Айчыннай вайны. Мн., 1977] // ЛіМ. 13 студз.; Праз небасхілы залатыя...: [Вершы] // Там жа. 13 кастр.

1979. Пра майстэрства; Сіта: [Вершы] // Дзень паэзіі — 79. Мн.; «Каташкі на вольхах, каташкі...»; «Цякла рачулка з узгор'я, як знала...»: [Вершы] // Беларусь. № 12; Лірыка: «Можа і ў мяне над галавой...»; «Жыць, каб толькі пад'есці...»; «А можа б ён і жыў між нас...»; «Транжыру дні, як мот...»; «Мо ў тым і ўсе нашы пралікі...»; «Калі на голаў чарада няўдач...»; «Лодку долі сваёй...»; «Зары запозненай каснік...»; «Не крыўдуй на мяне, не крыўдуй...»; «Рассыпала ноч алмазы...»: [Вершы] // Маладосць. № 7; «Радзіма...»; «Жыцця нястрымны ход...»; Маці; «Палессе...»; «Такую падзею...»: [Вершы] // Полымя. № 8; Этнаграфічная экспедыцыя на Палессе // Помнікі гіст. і культ. Бел. № 3; Абнаўленне; «Мы — людзі, зямляне...»; І вершы, як салдаты; Пра старую Адэлю; «Жанчыны зямлі нашай!..»; «Дажываюць свой век...»; «Дарыць усмешкі...»; «Туманам зацягнула дні...»: [Вершы] // ЛіМ. 28 снеж.; Тэма размовы — паэзія: [Рэц.: на кн. Шпакоўскі Я. Узрушанасць. Мн., 1978] // Чырв. змена. 15 жн.

1980. Такія сэрцы ў нас: [Верш] // Такія сэрцы ў нас. Мн.; Радзькаўшчына: Да біяграфіі Янкі Купалы // Беларусь. № 7; Легенда пра Вулляну // Маладосць. № 8; «Зноў — сівец, і хвойкі, і дымок...»; «Быць дабрэй...»; «Палессе...»: [Вершы] // Голас Радзімы. 18 снеж.; Любоў і боль сучасніка: [Рэц. на кн.: Макаль П. Заручыны. Мн., 1979] // ЛіМ. 7 сак.; «Жыву каля рэха...»; «Дома ў нас...»; «Каханне — гэта чысціня...»: [Вершы] // Чырв. змена. 30 крас.

1981. Спадчына; Жывая памяць; «Ледзь толькі раніца асвеціць вокны...»; «Вясна, вясна ў сяле...»: [Вершы] // Маладосць. № 8; Хат вячысты дар: Паэма // Полымя. № 4; Паэма народнага лёсу: [Рэц. на кн.: Зуёнак В. Маўчанне травы. Мн., 1980] // Там жа. № 5.

1982. Перадзім'е: [Верш] // Дзень паэзіі — 82. Мн.; Я з той краіны...; Золата Джэтыгары: [Вершы] // На сцягу і ў сэрцы. Мн.; Радзькаўшчына // Успаміны пра Янку Купалу. Мн.; У пошуках «першароднага» слова: [Рэц. на кн.: Забалоцкая Л. Радаводны васілёк. Мн., 1981] // Полымя. № 5; З паэтычнага сшытка: [Вершы] // ЛіМ. 21 мая; «Поклон мой народу за песні» // Сел. газ. 20 июня; «І дабрата, і прыгажосць...»: [Верш] // Чырв. змена. 15 крас.

1983. Зайчыкаў хлеб; Спрэчка звяроў; Ладкі-ладушкі: [Вершы] // Вяснянка. Мн.; Вучыцца ў Леніна нам трэба: [Верш] // Заўсёды з Леніным. Мн.; Пчолы і кветкі: [Казка ў вершах] // Казкі беларускіх пісьменнікаў. Мн.; Калекцыя вясёлак: [Рэц. на кн.: Рамануюк М. Беларускае народнае адзенне. Мн., 1981] // Маладосць. № 1; Чаканае выданне: [Рэц. на кн.: Дрэва кахання. Мн., 1980] // Помнікі гіст. і культ. Бел. № 1; Першы камень у падмурак: (На радзіме Янкі Купалы) // ЛіМ. 20 мая; З наднеманскіх палёў // Там жа. 7 кастр.

1984. Я сею жыта; «Зноў забралі цябе шляхі...»; «Як сон, азярко далёкае...»; У Ялце: [Вершы] // Дзень паэзіі — 84. Мн.; Можа, і ў мяне над галавой: [Верш] // За цябе, радзіма! Мн.; Сакавік: [Верш] // Бярозка. № 3; Вецер; Дарога: [Вершы] // Вясёлка. № 3; «Мы ўсе адтуль, адтуль...»; Віна (Расказ равесніка): [Вершы] // Маладосць. № 10; «Там возера Свіцязь, як шыбіна лёду...»: Дакументы // Полымя. № 4; Горкі шлях: Урывак з паэмы // ЛіМ. 16 сак.

1985. «Жыцця нястрымны ход!..»; «Не, не кажыце мне — вайна...»: [Вершы] // Воляй азорыцца свет. Мн.; Голас партызана над Паліком; Песня партызана: [Вершы] // Партызаны, партызаны... Мн.; Туганавічы // Сучаснік. Мн.; «Тварыць нанова свет»: Васілю Зуёнку — 50 // Беларусь. № 6; І пісьменнік, і педагог // Бярозка. № 4; Да зорак: (Паэма) // Там жа. № 12; Грыбныя хованкі: Казка // Вясёлка. № 7; На сваёй зямлі: [Раздзел з паэмы «Дзе дуб з бярозай звіўся»] // Там жа. № 12; Ян Чачот: [Уступная нататка] // Полымя. № 7; «Шкадую тых, хто ніколі...»; «Не запірайце душу на завалы...»; «Дзень прапаў у мяне...»; Не толькі ў сне было; Прывыкаем...; Мост дружбы...; «А вецер зноў раўкамі...»: [Вершы] // ЛіМ. 13 снеж.; Вучань прыйшоў у музей // Мін. праўда. 25 студз.

1.4.

Вяліеў С. Вусаты ага; Кулік: Аповесці / З азерб. Мн., 1985.

Байрамаў Н. Дождж у пустыні: Вершы / З туркм. Мн., 1987.

Чачот Я. Навáградскі замак: Творы / З пол. Мн., 1989.

Сыракомля У. Вандроўкі па маіх былых ваколіцах: Успаміны, даследаванні гісторыі і звычаяў. / З пол. Мн., 1992.

1957. Марэмпольскі В. Сястра: [Верш] / З укр. // ЛіМ. 22 чэрв.

1961. Пракоф'еў А. «Шляхі паўкруг...»; «Пра яго нідзе...»; «На табе алела кофта...»: (Вершы з кнігі «Запрашэнне да падарожжа») / З рус. // Чырв. змена. 27 крас.; Дагадаеў У. Да зорных вяршынь: [Верш] / З рус. // Там жа. 17 жн.; Грыбачоў М. Касцёр: [Верш] / З рус. // Там жа. 19 жн.

1962. Гайраці. Слова бацькі; Шэйхзадэ. Крамлёўскі гадзіннік: [Верш] / З узб. // Спявае Узбекістан. Мн.

1963. Рыбачкін А. Вясенні дождж; Смаляко ў С. У родным сяле: [Вершы] / З рус. // Віцеб. рабочы. 7 чэрв.; Яго ж. Шчасце: [Верш] / З рус. // ЛіМ. 28 мая; Малдоніс А. Высокія ноты: [Верш] // З літ. // Там жа. 20 вер.; Адамовіч А. Нашы прыйшлі: Урывак з дылогіі «Партызаны» // Там жа. 12 ліст.; Гелаваці М. Ленін; Ад Мтацмінды да Смаленска: [Вершы] / З груз. // Там жа. 27 вер.; Цэнджаеў Г. У Леніна вучуся; Паэзія; Адгукніся!: [Вершы] / З манг. // Чырв. змена. 11 ліп.; Гелаваці М. Даруйце; Другу-паэту: [Верш] / З груз. // Там. жа. 28 ліст.

1966. Гайраці. Слова бацькі; Икрам М. Раніца; Добры настрой; Ты — там, я — тут...: [Вершы] / З узб. // Сонца ў арыках. Мн.; Цэнджаеў Г. У Леніна вучуся: [Верш] / З манг. // Піянер Бел. 17 ліп.

1967. Мальцінскі Х. Калі пуста ў сэрцы тваім: [Верш] / З яўр. // Маладосць. № 12.

1968. Смелякоў Я. Ты ў сэрцы маім: [Верш] / З рус. // ЛіМ. 27 снеж.

1969. Кавалёў Д. «На восьмы мой паверх вясною ў поўнач...»; «Вясна пачынаецца — вось што...»: [Вершы] / З рус. // Беларусь. № 10; Уітмэн У. У смутку і ў думе; Любоўная ласка арлоў; Думка; Ідзі з поля, бацька: [Вершы] / З англ. // Полымя. № 5.

1970. Гелаваці М. Леніну; Ад Мтацмінды да Смаленска: [Вершы] / З груз. // Гелавані М. Клятва. Мн.; Дабравольскі С. Р. Пра вершы; Жартоўнае перамаўленне з Федэрыкам Гарсія Лоркам; Veto; Тады; Пасланне да в'етнамскіх братоў; У Навагрудскай старане: [Вершы] / З пол. // Дабравольскі С. Р. Як хлеб і сонца. Мн.; Яго ж. У навагрудскай старане; Жартоўнае перамаўленне з Федэрыкам Гарсіа Лоркам; Пасланне да в'етнамскіх братоў; Тады: [Вершы] / З пол. // ЛіМ. 20 сак.

1973. Сыракомля У. Лірнік вясковы: Ідылія / З пол. // Полымя. № 9.

1974. Матузявічус Э. Данелайціс / З літ.; Гушча Я. Вязынка / З пол.: [Верш] // Дзень паэзіі — 74. Мн.

1975. Лящюк Я. Матэматыка; Тры небы: [Вершы] / З укр. // Украінская савецкая паэзія. Мн. Т. 2; Селялёніс Э. Сям'я: [Верш] / З літ. // Вясёлка. № 4.

1976. Дабравольскі С. Р. Пад золатам красак; У навагрудскай старане: [Вершы] / З пол. // Гродн. правда. 9 окт.

1979. Ло Чо Бул. Позняя восень; Камелія: [Вершы] / З карэйск. // Чырв. змена. 30 вер.

1982. Каладзе К. Жаўранак; Прытча пра бурдзюк для віна і бурдзюк-катрынку: [Вершы] // Братэрства. Мн.; Гушча Я. Вязынка: [Верш] / З пол. // Нам засталася спадчына. Мн.

1983. Дзіброва В. Салдацкая вішанька: Драм. навела / З укр. // Слова гонару. Мн.; Сыракомля У.

Акраец хлеба: [Урывак з паэмы]; Пілігрым у канцы вандроўкі: [Верш] // ЛіМ. 7 кастр.

1984. Камінчук А. У вавёркі, коні і поні; Кацецкі А. Лянота; Гульня: [Вершы] / З укр. // Ад круч дняпроўскіх. Мн.; Джура С. Сон; Герой Качкар; Пісьмо з фронту: [Вершы] / З узб. // Братэрства. Мн.; Бінкіс К. Рыбалоў; Селялёніс Э. Сям'я; Гедра В. Наш дзядзька; Скучайтэ Р. Той раніцай у горадзе над Бугам: [Вершы] / З літ. // Бурштынавыя пацеркі. Мн.; Мураташ І. Споведзь салдата: Урывак з паэмы / З укр. // Ля Вечнага агню. Х.; Мн.; Межэлайціс Э. Час: [Верш] / З літ. // Межэлайціс Э. Чалавек. Мн.; Гелаванi М. Ты помніш?; Клятва: [Вершы] / З груз. // ЛіМ. 29 чэрв.; Туфані К. Чырвоная дарога: [Верш] / З афг. // Там жа. 27 ліп.

1985. Байрамаў Н. Каракумы; Наша бавоўна; Джэйранчык; Раніца; Туркменія мая; Я гатоў: [Вершы] / З туркм. // Ветразь. Мн.; Эрыставі Р. Вадаспад; Запрашэнне ў школу; Цэрэтэлі А. Вясна; Хлопчык і матылёк; Птушка, якая трапіла ў сіло; Яблык і Шакара; Чыладыдэлі Г. Успамін; Гелаванi М. Леніну; Ад Мтацмінды да Смаленска; Ты помніш?; Развітанне: [Вершы] / З груз. // Дружная з сонцам. Мн.; Міцкевіч А. «Дзе ты, мая Лаура, дзе сяброў сям'я?»; Да Лауры; «Дзе ні йду я, з сабою ўвесь час размаўляю...»; «У цябе не іскрыцца вучонасцю слова...»; «Асудзіць нас ханжа, распуснік асмяе...»; Ранак і вечар; Да Нёмана; Адмаўленне: [Вершы] / З пол. // Беларусь. № 12; Забаштанскі У. Усюды са мною; Вясельная балада: [Вершы] / З укр. // Маладосць. № 12; Чачот Я. Узногі; Мышанка: Балады / З пол. // Полымя. № 7.

1.5.

На англійскую мову. Black Earth; Grouse Language; «Far beyond the hay-heaps drying...»; Partisan Song / Transl. W. May // Fair Land of Byelorussia. M., 1976.

На літоўскую мову. «Iš tolimo kelio...» / Vert. J. Jakštas // Tarybinys mokytojas. 1975. Kovo 22.

На малдаўскую мову. Трей цэрь; Кынтекул партизанулуй; Кукошул сэлбатик: [Вершы] / Трад. А. Чокану // Поець белорушь. Кишинэу, 1975; Кукошул сэлбатик: [Верш] / Трад. А. Чокану // Констелацие де инимь. Кишинэу, 1976; Плоица / Трад. И. Гадыркэ // Помул ку приетень. Кишинэу, 1983.

На польскую мову. Dary lasu / Tł. B. Oszerow. Mn., 1978.

Takie mamy serca / Tł. K. A. Jaworski // Życie Literackie. 1967. Nr 17; Jaworski K. A. Pisma. Lublin, 1972. T. 3; Poeta i Białoruś // Czerw. Szt. 1973. Nr 229; Pieśń partyzanta / Tł. J. Huszcza // Poezja. 1974. Nr 9.

На рускую мову. Дары леса: [Вершы] / Пер. Н. Кислик. Мн., 1973.

Закон воды: Стихи / Пер. И. Бурсов. М., 1978.

Подарок: [Верш] / Пер. Л.Смирнов // Сов.Укр. 1957. № 9; Такие сердца у нас: [Верш] / Пер. М. Львов // Огонек. 1958. № 52; Гость: [Верш] / Пер. Е. Ружанский // Урал. 1959. № 1; В дороге: [Вершы] / Пер. Н. Кислик // Неман. 1968. № 7; «Падают деревья, как солдаты...»: [Вершы] / Пер. Н. Кислик // Лит. Азербайджан. 1972. № 9; Я пришел к вам...: [Верш] / Пер. Б. Спринчан // Неман. 1974. № 8; Счастье на свете — есть!: [Верш] / Пер. Ю. Мезенко // Комс. знамя. 1976. 23 мая; Я пришел к вам...: [Верш] / Пер. Б. Спринчан // Спринчан Б. Вечная страда. Мн., 1978; Дождик: [Верш] / Пер. В. Шульжик // Земля с лазурными очами. М., 1979; Основа: [Вершы] / Пер. И. Бурсов // Неман. 1979. № 1; Беспокойством томимый...; Зима отслужила свой срок...: [Вершы] / Пер. И. Василевский // Извечной песни голоса. Мн., 1980; Я пришел к вам...: [Верш] / Пер. Б. Спринчан // Стожары. Мн., 1984; Песня партизана: [Верш] / Пер. И. Бурсов // Венок славы. М., 1985. Т. 8; Песня партизана: Голоса партизан над Паликом: [Вершы] / Пер. Б. Кежун // Партизанская слава. Л., 1985; О мастерстве: [Верш] / Пер. И. Василевский // Наш современник. 1985. № 8.

На ўкраінскую мову. Такі серця у нас: [Верш] / Пер. Т. Коломієць // Дніпро. 1959. № 1; Я правду шукав у книжках трьох славетних учених; Пермени рідної землі; «На тій землі, де в зорний час...»; «На луки й поля завзято...»; Холодом з-над річки потягло: [Вершы] / Пер. С. Жолоб, М. Львович, В. Лучук // Калинові мости. К., 1969; Такі серця у нас; Лодоньки; Пермени рідної землі: [Вершы] / Пер. М. Упеник, М. Львович // Білоруська радянська поезія. К., 1971. Т. 2; Учитись в Леніна нам треба: [Верш] / Пер. П. Баратинський // Комс. зірка. 1975. 6 вер.; З Кастуся Цвиркі: [Вершы] / Пер. Ю. Мезенко // Друг читача. 1979. 20 вер.

1.6.

З Леніным у сэрцы. Мн., 1968 / Скл.

Глебка П. Пытанні гісторыі, філалогіі, мастацтва. Мн., 1975 / Скл.

Вяселле: абрад. Мн., 1978 / Скл. Рэц.: Sielicki F. // Slavia Wratislavensia. 1982. Z. 23.

Узроўні фальклорных уплываў. Мн., 1982. / Рэд. з У. Гніламёдавым.

Ніве і хлебу: Паэзія, проза. Мн., 1986 / Скл. з А. Рыбаком.

Дзень паэзіі — 87. Мн., 1987 / Рэдкал.

Успаміны пра Змітрака Бядулю. Мн., 1988 / Скл. з Я. Садоўскім.

Сыракомля У. Добрыя весці. Мн., 1993 / Скл. з У. Мархелем.

2.3.

На беларускай мове. Блатун С. Сіла зямлі // Вяч. Мінск. 1968. 12 жн.; Вярцінскі А. Песня ў гонар Зялёнай Дубровы // ЛіМ. 1984. 30 сак.; Яго ж. Песня ў сэрцы ляжала... // Вярцінскі А. Высокае неба ідэала. Мн., 1979; Гілевіч Н. Ідзе папаўненне // Полымя. 1959. № 9; Яго ж. Маладая паэзія // Маладосць. 1958. № 7; Кастусю Цвірку — 50 // ЛіМ. 1984. 30 сак.; Кобрын У. Зямлі бацькоў жывыя токі // Мін. праўда. 1984. 28 сак.; Курбека І. Юнацкае сэрца // ЛіМ. 1960. 9 сак.; Лойка А. Сустрэча з днём сённяшнім. Мн., 1968. С. 141—143; Пісьменнікі Савецкай Беларусі: Кароткі даведнік. Мн., 1981; Ярош М., Бечык В. Беларуская савецкая лірыка. Мн., 1979. С. 283—284.

На польскай мове. Rudczyk W. Śladami Syrokomli: (Polonica zza miedzy) // Kontrasty. 1971. Nr 9.

На рускай мове. Халип В. Еще горит Хатынь... // Неман. 1972. № 5.

3.1.

БДАМЛіМ, ф. 55, спр. 1—13. *Т. М. Махнач.*

ЦЁТКА

Цётка [сапр. Пашкевіч Алаіза Сцяпанаўна; інш. псеўд. Анелька, Банадысь Асака, Гаўрыла, Гаўрыла з Полацка, Мацей Крапіва, Крапіўка, М. Крапіўка, Мацей Крапіўка, Тымчасовы; крыпт. Ц-ка, Ц-тка; 3(15).7.1876, фальв. Пясчына (Пешчын, Пешчына) Лідскага пав. Віленскай губ., цяпер Шчучынскі р-н Гродзенскай вобл.— 5(17).2.1916, фальв. Стары Двор таго ж павета, пахавана там жа], паэтэса, празаік, публіцыст, асветніца, удзельніца рэвалюцыйнага руху пач. XX ст.

Нарадзілася ў сям'і багатага селяніна, які меў дзвесце дзесяцін зямлі (вялікі пасаг прынесла жонка, маці Алаізы, а пасля прыкупіў суседні фальварак Стары Двор). Хрышчана ў васілішкаўскім касцёле. У сям'і Пашкевічаў было дванаццаць (па іншых звестках, семнаццаць) дзяцей. Пасля смерці першай жонкі Сцяпан Пашкевіч перадаў будучую паэтэсу на выхаванне дзеду. У Старым Двары, на дзедавай гаспадарцы, і гадавалася Алаіза, бачачы галечу і беззямелле бедных вяскоўцаў, спачуваючы ім і іх дзецям, занятым цяжкай працай. Выхоўвала дзяўчынку пераважна бабка Югася, якая ведала шмат казак і песень. З малых гадоў Алаіза цягнулася да кнігі, марыла хутчэй вырвацца з вёскі ў вялікае жыццё. Значны ўплыў на фармаванне свядомасці і грамадскіх ідэалаў Алаізы зрабіла курсістка Вера Тацішчава, якая на працягу года была яе хатняй настаўніцай. У 1894 Алаіза Пашкевіч паехала ў Вільню, паступіла ў 4-ы клас прыватнай гімназіі Прозаравай. Закончыўшы 6 класаў гімназіі і атрымаўшы пасведчанне хатняй настаўніцы, у 1901 стала настаўнічаць у вёсцы. Важным у жыцці Алаізы быў 1902, калі яна паехала ў Пецярбург, дзе экстэрнам здала экзамены за поўны курс Аляксандраўскай жаночай гімназіі і паступіла на курсы П. Лесгафта, дзе рыхтавалі выхавацелек і кіраўніц фізічнай адукацыі. У 1903 у Пецярбургу была заснавана Беларуская рэвалюцыйная грамада. Алаіза стала актыўным членам яе левага крыла, была выбрана членам ЦК грамады. У 1904 пакінула курсы Лесгафта, вярнулася ў Вільню і працавала фельчаркай у псіхіятрычнай лячэбніцы ў Нова-Вілейцы (Новай Вільні). Тут разгарнулася яе рэвалюцыйная дзейнасць; яна часта выступала з прамовамі па-беларуску на мітынгах і сходах. Па партыйнай мянушцы «Цётка» яе ведалі рабочыя Вільні і сяляне навакольных вёсак. Арганізоўвала рабочыя гурткі, пісала і распаўсюджвала антыўрадавыя пракламацыі, пачала пісаць вершы,— вольналюбівыя, прасякнутыя ідэяй змагання за сацыяльную і нацыянальную справядлівасць. Вершы «Хрэст на свабоду», «Мора», «Пад штандарам» распаўсюджваліся як рэвалюцыйныя пракламацыі, перакладаліся на літоўскую мову. У маі 1905 была дэлегаткай ад віленскіх работніц на з'ездзе жанчын у Маскве. Прыняла актыўны ўдзел у рэвалюцыйных маніфестацыях у Вільні зімой 1905, у падзямеллі лячэбніцы трымала шапірограф. Ёй пагражаў арышт, і яна некаторы час хавалася ў Вільні і ваколіцах, а затым была вымушана эмігрыраваць. У канцы 1905 паехала ў Галіцыю, якая тады была часткай Аўстра-Венгерскай імперыі. Жыла спачатку ў Львове, дзе была вольнай слухачкай філасофскага факультэта Львоўскага універсітэта. У 1906 у Жоўкве каля Львова, у друкарні базыльянскага манастыра, былі надрукаваны два зборнікі яе вершаў — «Хрэст на свабоду» і «Скрыпка беларуская» (друкаваліся кірыліцай і лацінкай). Некалькі разоў Цётка нелегальна прыязджала ў Вільню і Пецярбург. У Вільні прымала ўдзел у выданні першай беларускай легальнай газеты «Наша доля», у першым нумары якой было надрукавана яе апавяданне «Прысяга над крывавымі разорамі». У Пецярбургу ў 1906 у выдавецтве «Загляне сонца і ў наша аконца» выйшла яе «Першае чытанне для дзетак беларусаў». Жывучы на Украіне, Цётка прапагандавала сярод украінскай інтэлігенцыі беларускую літаратуру і культуру. У 1908—09 жыла ў Кракаве, вучылася на гуманітарным аддзяленні Ягелонскага універсітэта, была членам рэвалюцыйнай арганізацыі універсітэцкай моладзі «Спуйня» («Лучнасць»), дзеля атрымання навуковай ступені выканала навуковую працу «Батлейкі на Беларусі і іх сувязь з польскай драматычнай літаратурай». Нейкі час жыла ў Закапанэ, выязджала ў Германію і Італію. У эміграцыі цярпела нястачу, што адбівалася на здароўі, прымушала ўвесь час думаць аб сродках на лячэнне. У эміграцыі Цётка пражыла 6 гадоў (1906—1911). У 1911 выйшла там замуж за інжынера-тэхнолага, актыўнага дзеяча літоўскай сацыял-дэмакратыі Сцяпанаса Кайрыса, які ў 1944 выехаў з Каўнаса ў Германію, а потым у ЗША, пакінуўшы рукапісы жонкі (лёс іх невядомы). Змена прозвішча дала магчымасць вярнуцца на радзіму. Вяртанне супала з новым рэвалюцыйным уздымам у Расіі, і Цётка з вялікім энтузіязмам акунулася ў грамадска-асветніцкую дзейнасць. З

тэатрам І. Буйніцкага ездзіла і выступала ў розных кутках Беларусі, удзельнічала ў спектаклях «Па рэвізіі» М. Крапіўніцкага, «У зімовы вечар» паводле Э. Ажэшка. У 1912 у Вільні, Нова-Вілейцы і Лідзе Цётка арганізавала некалькі тайных беларускіх школ. У 1914 стала заснавальніцай і рэдактарам першага беларускага часопіса для дзяцей і моладзі «Лучынка» (Мінск), выдала 6 яго нумароў. Для часопіса напісала шэраг апавяданняў, публіцыстычных артыкулаў і нарысаў. У красавіку 1914 наведала Фінляндыю, у ліпені таго ж года ездзіла на лячэнне ў Швецыю. Больш двухсот кіламетраў прайшла пешкі — ад Стакгольма да Гётэборга, была ў яе задума прайсці і Нарвегію, але першая сусветная вайна перашкодзіла гэтым планам. У 1915 Цётка працавала ў Вільні сястрой міласэрнасці ў тыфозным салдацкім бараку. У пачатку студзеня 1916 атрымала вестку, што цяжка захварэў бацька. Яна адразу паехала ў Ліду, але бацьку жывым не заспела. Пасля яго пахавання засталася ў Старым Двары, каб аказаць медыцынскую дапамогу землякам, якія гінулі ад эпідэміі тыфу. Аднак, ратуючы іншых, не ўсцераглася сама, захварэла на тыф і ў ноч на 5 лютага 1916 памерла. Яе сям'я працягвала жыць у Старым Двары і ў 1939 трапіла пад сталінскія рэпрэсіі: брат Войцах быў вывезены ў Сібір, адкуль не вярнуўся, а сёстры вымушаны былі выехаць у Польшчу і ЗША.

Пісаць Цётка пачала ў 1902 пад уплывам Ф. Багушэвіча. У часопісе «Свабода», тыраж якога быў знішчаны, змясціла верш «Мужык». У прадмове да зборніка «Скрыпка беларуская» Цётка так пісала пра вытокі сваёй паэзіі: «Дзякуй табе, Мацей Бурачок! Чэсць і слава тваему слову! А ты, «дудка», грай і мне голас дай. З таго дня пачаў і я майстраваць інструмант. Выйшла з-пад рук «Скрыпка». У 1904 у «Каляднай пісанцы» і «Велікоднай пісанцы» былі надрукаваны вершы Цёткі «Мужыцкая доля», «Мужык не змяніўся», «Нямаш, але будзе», «Музыкант беларускі». Прасякнутыя спагадай да цяжкага лёсу мужыка, яны садзейнічалі абуджэнню сацыяльнай і нацыянальнай самасвядомасці беларуса. Цётка, як і Ф. Багушэвіч, шырока карысталася народна-песеннай сімволікай (вобразы музыкі, скрыпкі, дудкі). Рэвалюцыя 1905—07, непасрэдны ўдзел у яе падзеях сталі для паэтэсы магутным творчым імпульсам. Вершы «Мора», «Хрэст на свабоду», «Вера беларуса», што сталі хрэстаматыйнымі, заклікалі народ да барацьбы з царызмам; рэвалюцыя параўноўвалася ў іх з магутнай стыхіяй, якую цяжка суняць, выкрываліся злачынствы самаўладства. Цётка першай у беларускай паэзіі так палка, адкрыта і натхнёна сцвярджала галоўную ідэалагічную каштоўнасць свайго часу — рэвалюцыйную барацьбу за роўнасць і братэрства, стварыла наватарскі вобраз лірычнага героя, чалавека актыўнага, рэвалюцыйна свядомага. З паэзіяй Цёткі ў беларускую літаратуру прыйшла рэвалюцыйная рамантыка і пафас. У ранніх яе вершах выяўляецца блізкасць да творчасці Ф. Багушэвіча і А. Гурыновіча (эвалюцыя светапогляду мужыка, дэмакратычныя ідэі вольнасці, роўнасці, асветы). Рамантычна-сімвалічнай вобразнасцю, алегарычнасцю малюнкаў, пераўвасабленнямі паэзія Цёткі сугучная з масавай рэвалюцыйнай рускай паэзіяй пачатку XX ст. У творах паэтэсы выявіўся яе тэмперамент і светаадчуванне, напоўненыя незвычайнай эмацыянальнасцю, гарачай зацікаўленасцю ў лёсе народа, вера ў народныя сілы. Калі ў зборнік «Скрыпка беларуская» ўвайшлі раннія вершы, пераважна вершы-заклікі, то ў кнізе «Хрэст на свабоду» апяваецца непасрэдна сама рэвалюцыя, апісваюцца падзеі крывавай нядзелі 9 студзеня («Хрэст на свабоду», «Небывалыя часы», «Бура ідзе», «Мора»). Асобны перыяд у творчасці Цёткі складаюць вершы 1908—14, дзе пераважалі матывы грамадзянскай журбы, выявілася засяроджанасць на долі адзінокага чалавека, сіраты («З чужыны», «Грайка», «Арлы-браце, дайце скрыдлы», «Сірацінка»). Тут адлюстраваліся балючыя перажыванні аўтаркі, выкліканыя адарванасцю ад роднага краю, марнасцю спадзяванняў, трагічнымі прадчуваннямі. Цётка таксама адна з пачынальнікаў беларускай прозы і публіцыстыкі. Яе апавяданні «Прысяга над крывавымі разорамі», «Лішняя», «Зялёнка», «Міхаська», «Асеннія лісты» і інш. вызначаюцца псіхалагізмам, экспрэсіўнасцю. Для «Першага чытання...» Цётка напісала шэраг апавяданняў для дзяцей — «Сварба», «З прыску ды ў агонь», «Журавель і Чапля», «Сірата». Публіцыстыка Цёткі па аб'ёму амаль роўная з прозай. Яе артыкулы «Да вясковай моладзі беларускай», «Шануйце роднае слова!», «Аб душы маладзёжы», «Да дзяўчатак», «Да школьнай моладзі» ўспрымаюцца як духоўны запавет пісьменніцы беларусам. У іх выявіліся асветніцкія погляды Цёткі — яе заклікі да стараннай і сур'ёзнай вучобы дзеля будучых спраў, карысных для Бацькаўшчыны, яе клопат аб павышэнні культуры сяла, аб паляпшэнні штодзённага побыту народа. Асобную старонку ў яе публіцыстыцы складаюць дарожныя нататкі, нарысы, напісаныя пад уражаннем падарожжаў у Італію, Фінляндыю, Швецыю, Германію. Аўтар навукова-папулярных артыкулаў «Газа», «Пералётныя птушкі», «Наша народная песня» і інш.

Цётка сябравала з Я. Купалам, К. Каганцом, З. Бядулем, А. Бурбісам, літоўскімі паэтамі і мастакамі І. Білюнасам, Л. Гірам, А. Варнасам, А. Станейкам. Яе творы перакладзены на нямецкую, польскую, рускую, украінскую і інш. мовы. Да вобраза Цёткі звярталіся беларускія пісьменнікі (аповесці Л. Арабей «На струнах буры» і «Стану песняй», раман В. Коўтун «Крыж міласэрнасці», паводле якога створаны чатырохсерыйны тэлефільм), мастакі (У. Крукоўскі, М. Купава, І. Раманоўскі, Л. Шчамялёў і інш.; іх творы ў 1976 экспанаваліся на рэспубліканскай выстаўцы, прысвечанай 100-годдзю з дня нараджэння паэтэсы), скульптары (А. Заспіцкі, Б. Лазарэвіч і інш.). На словы Цёткі кампазітарамі І. Лучанком, Ю. Семянякам, Д. Смольскім і інш. напісаны песні. Пісьменніцы пастаўлены помнікі ў г. п. Астрына і ў в. Шастакоўцы Шчучынскага р-на, мемарыяльная дошка ў Мінску; яе імя носяць школы ў Астрыне і Гродзенскае культасветвучылішча, бібліятэка № 15 у Мінску і Шчучынская раённая бібліятэка, вуліцы ў Мінску, Маладзечне і Шчучыне.

З. П. Мельнікава.

Бібліяграфія

1.1.

Творы. Мн., 1934. Рэц.: Ст. Ст. Творы Цёткі Алоізы Пашкевіч // Калоссе. 1935. № 1.

Выбр. тв. Мн., 1941.

Выбр. тв.: [Вершы і апавяданні]. Мн., 1949.

Выбр. тв. Мн., 1952.

Выбр. тв. Мн., 1967.

Творы. Мн., 1976. Рэц.: Ермаловіч М. Жыве яе ліра // Полымя. 1977. № 3.

1.2.

Mora: (Rewolucja narodna). Wilno, 1905 / Ананімна.

Пад штандарам: [Верш]. Вільня, 1905 / Ананімна.

Pad sztandaram. Wilnia, 1905 / Ананімна.

Chrest na swabodu. [Wilnia, 1905]. / Ананімна.

Першае чытанне для дзетак беларусаў. Пб., 1906.

Pierszaje czytańne dla dzietak biełarusaû. Pb., 1906.

Скрыпка беларуская: [Вершы]. [Жоўква], 1906 / Пад псеўд. Гаўрыла з Полацка.

Skrypka biełaruskaja. [Жоўква (?)], 1906.

Хрэст на свабоду: [Вершы]. [Б.м., 1906] / Пад псеўд. Гаўрыла.

Праграма для збірання матэрыялаў аб батлейках на Беларусі. [Вільня, 1910] / Ананімна.

Skrypka biełaruskaja. Wilnia, 1918.

Вершы і апавяданні. Мн., 1990.

Першае чытанне для дзетак беларусаў: Вершы, апавяданні, казкі, загадкі. Мн., 1992.

1.3.

1904. Нямаш, але будзе; Музыкант беларускі: [Вершы] // Велікодная пісанка. Пб., [1904] / Пад псеўд. Гаўрыла; Мужыцкая доля: [Верш] // Калядная пісанка. Пб. / Пад псеўд. Банадысь Асака; Песні. [Б.м.].

1906. Прысяга над крывавымі разорамі: [Апавяданне]; Наш палетак: [Верш] // Наша доля. 1 вер. Пад псеўд. Мацей Крапіўка; Разумныя ды не на дурня напалі: Апавяданне // Там жа. 27 вер. / Пад псеўд. Крапіўка; Як нам вучыцца // Н. н. 10 ліст. / Пад псеўд. Мацей Крапіўка.

1908. «Гэй, братка, ты, Новы Годзе...»: [Верш] // Н.н. 4 студз. / Пад крыпт. Ц-ка; Навагодні ліст: Апавяданне; Вясковым кабетам: [Верш] // Там жа. 18 студз. / Пад крыпт. Ц-ка; «Скора прыдзе вясна, паняседа «ку-ку»...»: [Верш] // Там жа. 29 лют. / Пад псеўд. Мацей Крапіва.

1909. З чужыны: [Верш] // Н.н. 9 студз. / Пад крыпт. Ц-ка; Грайка: [Верш] // Там жа. 29 студз. / Пад псеўд. Мацей Крапіва.

1910. Вясковым кабетам; Грайка: [Вершы] // Першы беларускі каляндар на 1910 г., Вільня / Пад псеўд. Мацей Крапіўка; Беларуская вечарынка ў Пецярбурзе // Н.н. 4 сак. / Пад псеўд. Мацей Крапіўка; Гаданне: [Верш] // Там жа. 11 ліст. / Пад псеўд. Мацей Крапіўка.

1911. «Я хацела б...»: [Верш] // Беларускі каляндар «Нашай нівы» на 1911 год. Вільня.

1965. Четверо с «голубой молнии»: [Фантаст. апавяданне] // Знамя юности. 11, 13 апр. / Сааўт. Г. Караткевіч; Василиск: [Фантаст. апавяданне] // Там жа. 7, 8 июля / Сааўт. Г. Караткевіч; «Трэці карабель»: Фантаст. апавяданне // Чырв. змена. 15 мая / Сааўт. Г. Караткевіч; «Даеш старт!»: Фантаст. пародыя // Там жа. 12 снеж. // Сааўт. Г. Караткевіч.
1966. Когда прилетают аисты // Неман. № 1; Не садись отдыхать: [Апавяданне] // Там жа. № 7; Стакан воды // Там жа. № 10; Положительный мир: [Фантаст. апавяданне] // Знамя юности. 1, 2 февр. / Сааўт. Г. Караткевіч; Чужие звезды: [Фантаст. апавяданне] // Там жа. 24 мая / Сааўт. Г. Караткевіч; Стэлла: [Фантаст. апавяданне] // Там жа. 18, 21 авг. / Сааўт. Г. Караткевіч; Крот умирает в подземелье: [Аповесць] // Там жа. 21—23, 27—30 сент.; Спытайцеся ў Сфінкса: [Фантаст. апавяданне] // Чырв. змена. 18 студз.; Сірэна: [Фантаст. апавяданне] // Там жа. 26, 27, 30 кастр.

1967. Пасажыры чорнага «опеля»: [Нарыс] // Юнацтва баявое. Мн.; Залатыя медалі школьнікаў; Іскрынка запальвае сэрцы: [Апавяданні] // Эстрада пакаленняў: Мн.; Загадка синего протуберанца: [Фантаст. апавяданне] // Знамя юности. 13, 14, 16, 18, 20, 22, 23, 28 июня; 2, 4 июля / Сааўт. Г. Караткевіч; Даніна «мора беларускага»: [Нарыс] // Чырв. змена. 9 ліп.

1968. Клятва Гиппократа // Неман. № 1; Малюнкі з дзяцінства: [Апавяданне] // Вяч. Мінск. 19 жн.

1969. Марсіянін: [Фантаст. апавяданне] // Маладосць. № 12; Кто угнал самолет?: [Дакум. аповесць] // Знамя юности. 12, 14 февр., 13 марта, 13, 14, 16 мая, 6, 26 июня / Сааўт. У. Левін; Синие тетради // Там жа. 22 апр.; Золотая «Z»: [Фантаст. апавяданне] // Там жа. 18 дек.; Сэрца героя // Піянер Бел. 30 кастр.

1970. Сіняе неба Захара Гало: [Нарыс] // Камсамольскі білет. Мн.; Да месца прызначэння не прыбылі...: [Урывак з аповесці «Прыгавор прыведзены ў выкананне»] // ЛіМ. 27 ліст.; Чараўнік. Хто ён? // Піянер Бел. 14 мая; Апошні бой // Чырв. змена. 3 лют.

1971. Планшет: [Нарыс] // Гавроши сурового времени: Мн.; Приговор приведен в исполнение: [Дакум. аповесць] // Неман. № 4, 5 / Сааўт. Г. Круглоў; Дырэктар: [Нарыс] // Полымя. № 10; Прощание: [Апавяданне] // Знамя юности. 23 апр.; Обретенные крылья: Аповесць // Там жа. 27 апр.; 1, 5, 7, 8 мая / Сааўт. У. Левін; Светлае імя // Піянер Бел. 1, 8 крас.; Повезло всем // Сел. газ. 27 нояб.

1972. Солнечный камень: [Нарыс] // Неман. № 4 ; Где-то есть город...: [Апавяданне] // Там жа. № 8; Паўпрэд краіны Саветаў // Піянер Бел. 10 лют.; Гэты дурань цюця: Апавяданне // Там жа. 6 ліп.

1973. Ціхія кіламетры: [Аповесць] // Беларусь. № 4—6 / Сааўт. Г. Круглоў; Трое на рацэ: [Апавяданне] // Бярозка. № 8; ...И будут строить города // Неман. № 8; Елка: [Апавяданне] // Вяч. Мінск. 6 студз.; У пошуках актыўнага характару // ЛіМ. 31 жн. / Сааўт. М. Няхай; Вучань правадыра: [Апавяданне] // Піянер Бел. 18 студз.; «На заранку нашай перамогі» // Там жа. 24, 31 мая; Інспектары крымінальнага вышуку // Чырв. змена. 18 крас. / Сааўт. Г. Круглоў.

1975. Хлопчык з планеты Аэла: [Фантаст. аповесць] // Бярозка. № 4; 5; [Рэц. на: Сапожков Ю. Стихи // Знамя юности. 1975. № 10] // Неман. № 7; Загадка тайги: [Фантаст. апавяданне] // Зорька. 27 июня; «Чырвоны камандзір тав. Азін» // Піянер Бел. 30 кастр.

1976. Ціхія кіламетры: [Апавяданне] // Дарогі вы, дарогі... Мн. / Сааўт. Г. Круглоў; «Чацвёрка» па логіцы; Я сам; Чатыры цягнікі ў будучае: [Навелы] // Бярозка. № 4; [Рэц. на кн.: Геллер М. Необычная страна. Мн., 1975] // Неман. № 10; Алькино счастье: Рассказ-быль // Знамя юности. 1 янв.; Поезд в будущее: [Апавяданне] // Зорька. 30 июля; Жалезны камдзіў // Піянер Бел. 13 мая.

1977. Красные банты Октября // Неман. № 12; [Рэц. на кн.: Краснапёрка Г. Сузор'е. Мн., 1976] // Знамя юности. 19 апр.; Выйдзі пад гэтае неба: [Фантаст. апавяданне] // Чырв. змена. 17, 22 вер.

1978. Паядынак // Бярозка. № 11; «По праву возраста...»: [Рэц. на кн.: Сапожков Ю. Возраст. Мн., 1978] // Неман. № 8; «Капитан Татьяна» // Знамя юности. 6 янв.; Рэйс на Брусель — па раскладу: [Аповесць] // Чырв. змена. 18, 19, 21, 22 кастр. / Сааўт. Г. Круглоў.

1979. Такія ім выпалі гады // ЛіМ. 17 жн.

1980. Душы неабходна музыка: [Рэц. на кн.: Бондар Т. ...І голас набыла душа. Мн., 1980] // Чырв. змена. 4 вер.

1981. [Рэц. на кн.: Баравікова Р. Такое короткае лета. Мн., 1981] // Неман. № 12; Добрай раніцы!: [Навела] // Піянер Бел. 6 жн.; Цяпло «развітальных кастроў»: [Рэц. на кн.: Тарас В. Прощальные костры. Мн., 1980] // Чырв. змена. 10 лют.; Жывы голас паэзіі: [Рэц. на кн.: Турбина Л. Улица детства. Мн., 1981] // Там жа. 10 чэрв.

1982. Між любоўю і нянавісцю // Беларусь. № 6; Старые Дороги: [Апавяданне] // Неман. № 4; [Рэц. на кн.: Мазаник Е. Возмездие. Мн., 1981] // Чырв. змена. 7 студз.

1983. Огненные автографы: [Нарысы] // Ступени. Мн.; [Рэц. на кн.: Спринчан Б. Стремнина. Мн., 1982] // Неман. № 6.

1984. Нялёгкі шчаслівы лёс: [Нарыс] // Беларусь. № 3; Шляхі-дарогі сяржанта Сапуна: [Нарыс] // Там жа. № 10; Планшэт: Апавяданне // Бярозка. № 1.

1985. Год Анатоля Прымакі: [Нарыс] // На пярэднім краі. Мн.; Жыць, ствараць, памятаць: [Нарыс] // Маладосць. № 11.

1.5.

На беларускую мову. Патэфон з пласцінкай: [Апавяданне] / Пер. П. Валкавец // Бярозка. 1979. № 2.

1.6.

Шупеня С. Гневная Щара. Мн., 1977 / Зап. у сааўт. з Е. Левіным.

Мурашов А. Партизанская береза. Мн., 1988 / Літ. апр.

Блавацкий В. Рядом со смертью. Мн., 1990 / Зап.

Чигринов И. Земля, на которой родился // Учит. газ. 1982. 8 июня / Зап. *М. П. Барташэвіч.*

ЦЭЛЕШ МІКОЛА

Цэлеш (Целеш) Мікола Яфімавіч [псеўд. Марцін (Мартын) Люцiч; крыпт. М. Ц.; 25.6.1900, па інш. звестках 1904, в. Заазер'е Барысаўскага пав. Мінскай губ., цяпер Барысаўскі р-н Мінскай вобл.— пасля 1976], празаік, публіцыст, перакладчык.

Нарадзіўся ў сялянскай сям'і. Закончыў царкоўна-прыходскую школу ў в. Заазер'е, потым год вучыўся ў вышэйшым народным вучылішчы ў м. Бялынічы. У 1914 з-за першай сусветнай вайны вучобу кінуў. На пачатку 1916 выехаў у Варонеж, пасля — у Данбас; там у якасці саначніка працаваў да ліпеня 1919. Калі Данбас апынуўся пад чарговай акупацыяй войска генерала Дзянікіна, М. Цэлеш добраахвотна паступіў у Чырвоную Армію. Дэмабілізаваўся ў 1924; жыў у Мінску, служыў у розных савецкіх установах горада, займаўся самаадукацыяй. Вялікую Айчынную вайну сустрэў у Мінску. Далейшы жыццёвы і творчы лёс М. Цэлеша малавядомы. Паводле адных крыніц, ужо ў 1941 у ноч на кастрычніцкія святы гестапаўцы беспадстаўна арыштавалі М. Цэлеша, членаў яго сям'і і ўсіх затым вывезлі ў Германію. Па іншых звестках, выехаў у Германію сам з сям'ёй толькі ў 1944, з тэрыторыі былой Заходняй Беларусі. У Германіі правёў некалькі гадоў. У 1949 пераселіўся ў ЗША, жыў у Нью-Йорку. Пастаянна займаўся літаратурнай працай. Перапісвацца з роднымі пачаў у канцы 1950-х. Праз дзесяць гадоў ліставанне спынілася. На Захадзе лічаць нечаканае знікненне М. Цэлеша ў 1976 («выйшаў аднойчы з дома і не вярнуўся») вельмі загадкавым. Па словах яго ўдавы, якая прыязджала ў Мінск, яшчэ да свайго таямнічага знікнення праз М. Танка і ўдаву М. Зарэцкага М. Цэлеш перадаў у Беларусь некаторыя творы, якія нібыта былі надрукаваны ў «Полымі» пад псеўданімам Лясун ці Пралеска, але такая публікацыя не выяўлена. Паводле меркавання жонкі, мог выехаць з ЗША у тагачасны Савецкі Саюз, дзе нібыта і прапаў без вестак.

Друкавацца пачаў у 1929 (першай публікацыяй было апавяданне «Па воўчых сцежках» у часопісе «Паляўнічы Беларусі»). У 1930 г. М. Цэлеш часта выступаў на старонках рэспубліканскіх газет і часопісаў з нарысамі, апавяданнямі, аповесцямі. Супрацоўнічаў з часопісамі «Полымя рэвалюцыі», «Маладняк», «Работніца і калгаснiца Беларусі», «Паляўнічы Беларусі», газетамі «Літаратура і мастацтва» і інш. Да вайны выдаў у Мінску кнігі «Апавяданні паляўнічага», «Са стрэльбай і сабакай: Апавяданні паляўнічага», «Курылка», аповесць «Буська», зборнік апавяданняў «Знаходка». Знаходзячыся на эміграцыі, друкаваў свае творы ў газетах «Бацькаўшчына», «Беларус», альманаху твораў беларускіх эмігрaцыйных пісьменнікаў «Ля чужых берагоў». За мяжой выйшла кніга М. Цэлеша «Дзесяць апавяданняў». Аўтар болей як сотні твораў, што былі перакладзены на рускую, польскую мовы. Пераклаў на беларускую мову шэраг апавяданняў венгерскіх і яўрэйскіх пісьменнікаў. М. Цэлеша-пісьменніка асабліва хвалявала тэма ўзаемадачыненняў чалавека і прыроды. Адчуваецца яго творчая вучоба ў І. Тургенева, М. Прышвіна. Героямі дынамічных, з цікавым, займальным сюжэтам, твораў М. Цэлеша сталі простыя людзі, захопленыя красой роднай прыроды, пераважна паляўнічыя, рыбакі.

С. Б. Сачанка.

Бібліяграфія

1.2.

Апавяданні паляўнічага: [Апавяданні]. Мн., 1931.

Са стрэльбай і сабакам: Апавяданні паляўнічага. Мн., 1932.

Курылка: (Запіскі вучня царкоўна-прыходскай школы): [Апавяданне]. Мн., 1935. Рэц.: Куніцкі С. // Полымя рэвалюцыі. 1935. № 9; Шушкевіч С. «Запіскі вучня царкоўна-прыходскай школы» // ЛіМ. 1935. 16 вер.; 2 выд. Мн., 1938; Карпачоў М. Цікавая аповесць для дзяцей // ЛіМ. 1939. 9 сак.

Буська. Мн., 1939.

Знаходка: Зборнік апавяданняў. Мн., 1939.

1.3.

1929. На воўчых сцежках: Нарыс // Паляўнічы Бел. № 6; На радзіме журавоў: Нарыс // Там жа. № 10; Чарнавухая кумачка: Апавяданне // Там жа. № 11—12.

1930. Людзі, зверы, птахі: Апавяданне // Паляўнічы Бел. № 2—3; Смелы драч: Апавяданне // Там жа. № 5; Слуцкія галавацяпы, ці жывая пасылка за № 55: Фельетон; Справа загадчыка запаведнікам Гурына // Там жа. № 6; Сны паляўнічага: Апавяданне // Там жа. № 7; Сільней кошкі звера няма: Фельетон // Там жа. № 8; Метыс: Апавяданне // Там жа. № 9; Шэрая ваўчыца: Апавяданне // Там жа. № 10; На аб'езчыкавых загонах: Апавяданне // Там жа. № 11—12.

1931. На прывале: Апавяданне // Маладняк. № 5; Вясна: Апавяданне // Паляўнічы Бел. № 2; Навала: Апавяданне // Там жа. № 6; Любае дзела: Апавяданне // Там жа. № 7—8; З апавяданняў паляўнічых: Апавяданні // Там жа. № 10; Лісы выручылі: Апавяданне // Там жа. № 11.

1932. Зімовыя пабегі: Апавяданне // Паляўнічы Бел. № 3—6; Максім з «Малінавай рошчы»: Апавяданне // Там жа. № 9.

1933. Лявонка-звераловў: Апавяданне // Іскры Ільіча. № 5; Рост тэатра рускай драмы; Сустрэча пісьменнікаў Масквы і Мінска // ЛіМ. 10 снеж.

1934. Курылка: Аповесць // Полымя рэвалюцыі. № 4; Рой: Апавяданне // ЛіМ. 26 студз.; Чатырнаццаты нумар: [Рэц. на кн.: Паслядовіч М. Чатырнаццаты нумар. Мн., 1934 // Там жа. 26 ліп.; Выпадак у тайзе [Апавяданне] // Піянер Бел. 14 лют.; Героі: Аповесць // Там жа. 26 лют.; Курылка: [Апавяданне] // Там жа. 26 сак.; Заграбала: Апавяданне // Там жа. 9 ліп.

1935. Слава: [Апавяданне] // Работніца і калгасніца Бел. № 21.

1936. Жыццё або смерць: Апавяданне чырвонаармейца // Полымя рэвалюцыі. № 12.

1937. Пра матыля і Васіля: Апавяданне // Іскры Ільіча. № 7; Перамога нашай кухаркі: Апавяданне // Полымя рэвалюцыі. № 6; Закон рычага: Апавяданне // Там жа. № 8; Абавязак: Апавяданне // Там жа. № 9—10; Кветкі: [Апавяданне] // Піянер Бел. 30 вер.

1938. Буськова заслуга: Апавяданне // Іскры Ільіча. № 9; Наша лісічка: Апавяданне // Піянер Бел. 5, 11, 15 жн.

1939. Буська: Апавяданне // Полымя рэвалюцыі. № 2; Зарніцы: Апавяданне // Там жа. № 10; Пойдзем усе: Расказ // Работніца і калгасніца Бел. № 3; Народная артыстка: (Ларыса Пампееўна Александроўская) // Там жа. № 4.

1940. Лясныя шумы: Апавяданне // Іскры Ільіча. № 3, 6—7; Лясныя шумы; Хітры заяц; Лось; Хітруны; Воўчая смерць; «Дзякуй, што паказаў»; Смелы драч; «За двума зайцамі пагонішся...»; Ільюковы вязкі; Жартаўнікі; На Палессі: Апавяданні // Полымя рэвалюцыі. № 8; Запалоненая вясна: (Навела) // ЛіМ. 12 кастр.; Магутны талент: (Да 80-годдзя з дня нараджэння А. П. Чэхава) // Піянер Бел. 29 студз.; Эдуард Багрыцкі: Нарыс аб пісьменніку // Там жа. 17 лют.; Ф. К. Багушэвіч: Да 100-годдзя з дня яго нараджэння // Там жа. 27 сак.; Эміль Заля: Сто год з дня нараджэння // Там жа. 9 крас.; Слаўка: Апавяданне // Там жа. 11 чэрв.; На лінейцы: Аб жыцці піянераў у лагеры // Там жа. 23 чэрв.; Анры Барбюс: Прамова да 5-гадовага юбілею з дня смерці // Там жа. 1 вер.; На першых уроках: Аб пачатку вучэбнага года ў школах // Там жа. 5 вер.

1941. Перспектыва // Іскры Ільіча. № 3; Сэрца дзяўчыны; Нечаканы канец: [Навелы] // Полымя. № 3; Урок: Апавяданне // Піянер Бел. 11 мая; Вадзяны звер: Апавяданне // Там жа. 19 чэрв.

1.4.

Цурмулен Г. Сыны Айшы: Казка / З рус. Мн., 1929.

Розанаў С. Прыгоды Траўкі / З рус. Мн., 1934.

1937. Балаш Б. Карл Брунэр: [Апавяданне] / З венг. // Піянер Бел. 17 лют., 15 сак.; З крас.

1939. Эрпенбек Ф. Зацкаваная: Апавяданне // Работніца і калгасніца Бел. № 4.

1940. Брохес Р. Зорка: [Апавяданне] // Піянер Бел. 1, 5 мая / Сааўт. пер. Р. Рэлес.

1.5.

На рускую мову. Сердце девушки: (Новелла) // Сталин. молодежь. 1941. 8 марта.

2.3.

На беларускай мове. Клімковіч М. Агляд апавяданняў 1940 года // Полымя. 1941. № 3; Л. «Полымя рэвалюцыі». Кніга 4-я за 1934 г. // ЛіМ. 1934. 26 ліп.; Нортман С. Дзве кнігі: «Буська» — М. Цэлеша; «Пакет» — М. Калачынскага // Чырв. змена. 1940. 18 студз.; Паглыбляць творчую дыскусію // ЛіМ. 1936. 31 сак.

М. П. Барташэвіч.

ЦЯЖКІ АРТУР

Цяжкі Артур Іосіфавіч (23.7.1943, в.Лылойці Смаргонскага р-на Гродзенскай вобл.— 5.4.1984, в. Нястанішкі Смаргонскага р-на Гродзенскай вобл.), празаік. Член СП Беларусі з 1982.

Нарадзіўся ў сялянскай сям'і. Скончыўшы Свірскую сярэднюю школу Мядзельскага р-на (1963), працаваў у смаргонскай раённай газеце «Светлы шлях». Служыў у Савецкай Арміі (1963—67), у 1967—68 — літсупрацоўнік раённай газеты, з 1969 карэспандэнт газеты «Чырвоная змена», з 1971 карэспандэнт гэтай жа газеты па Брэсцкай вобл. У 1972—75 і ў 1978 — карэспандэнт брэсцкай абласной газеты «Заря». Скончыў завочнае аддзяленне факультэта журналістыкі БДУ (1974). У 1975—77 карэспандэнт раённай газеты «Астравецкая праўда», з 1978 — адказны сакратар Гродзенскага абласнога таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры. З 1979 карэспандэнт газеты «Голас Радзімы», «Знамя юности». З 1981 рэдактар Гродзенскага абласнога навукова-метадычнага цэнтра народнай творчасці. Узнагароджаны медалямі.

Першыя апавяданні А. Цяжкі апублікаваў у газеце «Літаратура і мастацтва» ў 1966. Выйшлі зборнікі яго аповесцей і апавяданняў «Сустрэча пасля вясны», «Пара блакітных дажджоў», «Дзе мой дом?..». У цэнтры ўвагі пісьменніка — асэнсаванне сутнасці чалавека. Добра ведаючы жыццё, празаік па-мастацку вырашаў агульначалавечыя праблемы — сэнс жыцця, паводзіны чалавека перад абліччам смерці. Яго апавяданням і аповесцям уласціва выверанае і дакладнае слова, свая мелодыка і танальнасць.

Г. В. Якаўлева.

Бібліяграфія

1.2.

Сталь закалялась в борьбе (Из истории Синкевич. подполья). Брест, 1971.

Сустрэча пасля вясны: Апавяданні. Мн., 1980. Рэц.: Пайна С. // Лит. обозрение. 1983. № 11; Шупенька Н. Сустрэча прынесла надзею // ЛіМ. 1980. 18 ліп.

Пара блакітных дажджоў: Апавяданні. Мн., 1982. Рэц.: Васючэнка П. Парог вучнёўства // ЛіМ. 1983. 7 студз.; Марціновіч А. Поруч са сваімі героямі. 1983. № 11; Петкевич А. Просвещение души // Гроднен. правда. 1982. 25 дек.

Дзе мой дом?..; Аповесці і апавяданні. Мн., 1986.

1.3.

1966. Бульба; Пралеска; Маленькі эпізод; Аднойчы ноччу: Кароткія апавяданні // ЛіМ. 19 ліп.

1967. Бульба: Апавяданне // Чырв. змена. 10 снеж.

1969. Смаргонскія цымбалы // Чырв. змена. 5 чэрв.

1970. ... І ажывае метал // Чырв. змена. 31 снеж.

1971. Вікторыя — значыць перамога: Нарыс // Чырв. змена. 4 крас.; Неўміручы твой подзвіг, вечна жывы гарнізон! // Там жа. 25 крас. / Сааўт. М. Зянькавіч; Як стаць групе баявой? // Там жа. 22 ліп. / Сааўт. С. Захарава.

1972. Энергию юности — делу коммунизма // Заря. 7 марта / Сааўт. В. Вялічка; Наставник // Там жа. 27 мая; Рассказ о делах «Оснежицкого»: [Рэц. на кн.: У нас в «Оснежицком». Мн., 1972] // Там жа. 28 сент.; Дело, которому служишь // Там жа. 7 окт.; ... И оживает металл // Там жа. 13 окт.; Гонар брыгады // Чырв. змена. 22 чэрв.

1973. Его призвание // Заря. 11 янв.

1974. Іду на людзей // Чырв. змена 11 мая.

1975. Шел ребятам в ту пору // Гродн. правда. 27 сент.; Бацькоўская шчодрасць // Чырв. змена. 12 кастр.

1976. Хоровод дружбы // Комс. правда (Вильнюс). 27 янв.; У водах шэрай рачулкі: Пародыя // ЛіМ. 16 студз.; Служить людям // Сел. газ. 20 авг.; Доброе утро, председатель! // Там жа. 10 окт.; Боец ленинской гвардии // Там жа. 6 нояб.; Деревня шагает в завтра // Там жа. 21 дек.; Доброта // Там жа. 30 дек.; Малююць дзеці // Чырв. змена. 18 мая; Карагоды дружбы // Там жа. 2 чэрв.

1977. Вясковая акварэль; Тацяніна радасць; Сустрэча; Падарунак; На радасць людзям: Навелы // Маладосць. № 4; Книга для чтецов: [Рэц. на кн. Каляда А. Выразнае чытанне. Мн., 1976] // Гродн. правда. 26 марта; Цель и средства // Сел. газ. 5 мая; Соперник командора Перри // Там жа. 17 авг.; Завтрашнее утро: Рассказ // Там жа. 21 сент.

1978. Яблыкі: Апавяданне // Маладосць. № 11; Банальная история: [Апавяданне] // Заря. 10 февр.; Дело на века // Там жа. 16 февр.; Музыкант //

Там жа. 25 марта; Яблоки: [Апавяданне] // Там жа 8 апр.; Людям на радость; Картошка: [Навелы] // Там жа. 24 июня; Многоликий образ Кубы // Там жа. 27 июня; Трубач // Сел. газ. 11 июня; Юля: Рассказ // Там жа. 23 июля.

1979. Як Франц Паташкевіч стаў Героем Сацыялістычнай Працы // Голас Радзімы. 29 сак.; Ёсць горад над сіняю Шчарай // Там жа. 17 мая; Карагод дружбы // Там жа. 26 крас.; Бераг мой, бераг ласкавы // Там жа. 19 ліп.; Там, за Усой,— Багушэвічы // Там жа. 13 вер.; Эх, коні, коні! // Там жа. 4 кастр.; «Где-то далеко идут грибные дожди...» // Заря. 13 нояб.; Железный комиссар // Сел. газ. 25 марта.

1980. Тата Андрэй і сын Віця; Гаспадар вяндлярні: [Апавяданні] // Маладосць. № 8; Музыкант // Голас Радзімы. 20 сак.; Драўгістэ — значыць дружба // Там жа. 1 мая; Банальная история: Рассказ // Знамя юности. 22 февр.; На рубеже веков и эпох // Там жа. 6 апр.; Вечная молодость // Там жа. 26 июня; Необычный пассажир фрегата «Паллада» // Там жа. 22 авг.; Очей очарованье: Этюды о природе // Там жа. 10 сент.; Борозда длиной до солнца // Там жа. 24 сент.; О втором хлебе // Там жа. 19 дек.

1981. Горкае салодкае шчасце: Апавяданне // Беларусь. № 8; Вечером у телевизора: Рассказ // Гродн. правда. 5 сент.; ...И ткет проворная рука // Там жа. 7 нояб.; Чакае Пракоп сына: [Апавяданне] // ЛіМ. 20 сак.; Васільковы росы // Там жа. 4 снеж.

1982. Малітва маці; Маёвае ранне: Апавяданні // Маладосць. № 5; Свята душы // Голас Радзімы. 8 крас.; Крыніца вечная, жывая // Там жа. 22 ліп.; Криница вечная, живая: Со 2-го обл. фестиваля фольклора // Гродн. правда. 15 апр.; Песня, которая не кончается // Там жа. 10 июня; Из солдатской тетради: [Рассказы] // Там жа. 7 авг.

1983. Бераг мой, бераг ласкавы: [Нарыс] // На зямлі бацькоў. Мн.; «Я для таго мабілізую мову...» // Голас Радзімы. 9 чэрв.; Вясёлкавыя дываны // Там жа. 21 ліп.: Становление // Гродн. правда. 19 янв.; Жил в Ошмянах художник // Там жа. 3 марта; Серый кот: Рассказ // Там жа. 16 апр.; Всегда среди людей // Там жа. 22 июля; Мотоцикл: Рассказ // Там жа. 5 нояб.

1.5.

На рускую мову. Смятение: Повести, рассказы / Пер. С. Пайна. М., 1990.

Инцидент: Рассказ // Знамя юности. 1982. 15 сент.

2.3.

На беларускай мове. Мальдзіс А. Літаратурная рунь Астравеччыны // ЛіМ. 1980. 30 мая; Сідарэвіч А. Свабодная фантазія і законы жанру // Там жа. 1980. 5 вер.; Скрыган Я. Культура творчасці і мы // Скрыган Я. Выбр. тв. Мн., 1985. Т. 2.

Т. М. Махнач.

ЦЯПІНСКІ ВАСІЛЬ

Цяпінскі (Цяпінскі-Амельяновіч) Васіль Мікалаевіч (1530—40-я г., маёнт. Цяпіна ў Полацкім ваяв., цяпер в. Цяпіна Чашніцкага р-на Віцебскай вобл.— да 1603), перакладчык, асветнік, кнігавыдавец, дзеяч рэфармацыйнага руху.

Нарадзіўся, верагодна, на Полаччыне ў сям'і гаспадарскага баярына Мікалая Іванавіча Амельяновіча (згадваецца ў дакуменце 1528) і Матроны Мікалаевай Цяпінскай (згадваецца ў 1534). Першыя звесткі пра В. Цяпінскага адносяцца да 1560-х г., калі разам з братамі Жданам і Іванам Войнамі ён называецца ў завяшчанні маці (1563) і ў дакументах судовага працэсу супраць Ю. Осціковіча, які ў 1564 зрабіў напад на іх родавы маёнтак Свіраны. У 1565 В. Цяпінскі служыў у падканцлера Я. Валовіча, у 1567 афіцэрам («таварышам») аршанскага старосты Ф. Кміты-Чарнабыльскага. На пачатку 1570-х, верагодна, жыў на Валыні. У 1578 падстароста аршанскі. У 1585 судзіўся з людзьмі кіеўскага мітрапаліта; магчыма, да гэтага пэўны час жыў у Кіеве. Меў родавы маёнтак Цяпіна (цяпер Чашніцкі р-н), які ў канцы 16 ст. перайшоў ва ўладанне М. Стучкі. Валодаў таксама спадчыннымі і набытымі маёнткамі Латыгалічы (Пінскі пав., з 1567), Вярсоцкае (Лідскі пав., у 1579 заменены на маёнтак Полкаўскае Ашмянскага пав.), Свіраны (Віленскі пав., з 1564). У лютым 1604 полацкі суд вёў працэс паміж сынамі В. Цяпінскага і яго жонкі, князёўны Соф'і Жыжэмскай, за падзел яго спадчыны (паводле знойдзенай у архіве судовай справы, ён быў забіты пляменнікамі ў 1599 ці 1600. Паводле іншых крыніц, ён загінуў крыху пазней).

Народжаны ў праваслаўнай сям'і і выхаваны ў традыцыях праваслаўя, В. Цяпінскі ў сваіх рэлігійна-філасофскіх пошуках прыйшоў да пратэстанцкага радыкальна-рацыяналістычнага накірунку — сацыніянства. Паплечнік С. Буднага, ён у асноўным падзяляў яго сацыяльныя і рэлігійныя погляды. У 1574 у адным з маёнткаў В. Цяпінскага адбыўся з'езд сацыніянаў. Разам з Будным ён прымаў удзел і ў з'ездзе 1578. Цяпінскі палемізаваў з прадстаўнікамі крайніх утапічных сацыяльна-палітычных плыняў (напр., з М. Чаховічам), адстойваў права дзяржавы на справядлівыя войны, прызнаваў прыватную ўласнасць на зямлю. Вялікі аматар кнігі, ён сабраў надзвычай вялікую і каштоўную бібліятэку, а ў канцы 1570-х г. заснаваў у Цяпіне ўласную друкарню (магчыма, перавёз туды, набыўшы, частку нясвіжскай Радзівілаўскай друкарні). У ёй каля 1580 выдаў «Новы запавет, або Тастамент...» [два вядомыя сёння экземпляры захоўваюцца ў Расійскай Нацыянальнай б-цы (Спб) у складзе Супрасльскага зборніка і ў Архангельскім краязнаўчым музеі]. Кніга была выдадзена на царкоўнаславянскай мове з паралельным перакладам на тагачасную беларускую мову, выкананым самім В. Цяпінскім. Евангеллю папярэднічала яго прадмова, па нейкіх прычынах тады ненадрукаваная (укладзена ў пецярбургскі экземпляр). Яна вызначалася публіцыстычнай страснасцю, закранала хвалюючыя праблемы развіцця беларускай культуры. У прадмове В. Цяпінскі выявіў сябе не столькі прапаведнікам, які далучаў да пратэстантызму чытачоў, колькі гуманістам, што дбаў пра культурнае развіццё народа, заклікаў свецкіх уладароў клапаціцца пра духоўны росквіт грамадства, пашырэнне асветы, развіццё школ і кнігадрукавання на роднай мове. Канстатуючы духоўны ўпадак праваслаўнага духавенства і занядбанне пісьменства на «рускай» мове, аўтар першым пачаў барацьбу супраць паланізацыі не на рэлігійнай, а на нацыянальна-культурнай аснове, змагаўся за палітычнае і нацыянальнае адзінства беларускага народа, за кансалідацыю яго сіл, абуджэнне грамадскай актыўнасці. Магчыма, друкарня Цяпінскага засноўвалася для публікацыі толькі аднаго Евангелля, прынцыпы выдання якога стваралі перашкоду для друкавання кнігі ў іншых друкарнях. Аднак верагодна, што В. Цяпінскі меў намер выдаць тут яшчэ і «Катэхізіс...», рукапіс якога ўключаны ў Супрасльскі зборнік і належыць, відаць, таксама яго пяру.

Памяць В. Цяпінскага ўвекавечана на Віцебшчыне: у в. Цяпіна на будынку мясцовай дзесяцігодкі ўстаноўлена мемарыяльная дошка, а на месцы маёнтка, дзе была друкарня,— камень з дошкай-надпісам (1990).

А. А. Мельнікаў.

Бібліяграфія

1.3.

1923. З прадмовы да Евангелля: [Урывак]; З перакладу Евангелля: [Урывак] // Гарэцкі М. Хрэстаматыя беларускае літаратуры. Вільня.

1925. Предмова // Выпісы з беларускай літаратуры. М.; Л. Т. 2.

1959. Предмова // Хрэстаматыя па старажытнай беларускай літаратуры. Мн.

1962. Предисловие // Из истории философской и общественно-политической мысли Белоруссии. Мн.

1.4.

Первая часть Нового Завета або Тастаманту подлуг словенъского розделенья, то ест от чотырех евангелистов с[вя]тое евангелие Ис[у]са Х[ри]с[т]а списаное, в которых иж одно писмо евангелское, прото одным словом его назвали Евангелие. [Цяпіна (?), 1670-я г.].

2.1.

На рускай мове. О п и с а н и е старопечатных изданий кирилловского шрифта. М., 1979 (Свод. кат. и описание старопеч. изд. кириллов. и глаголич. шрифтов) [Вып. 15]: Описание изданий Несвижской типографии и типографии Василия Тяпинского.

2.2.

На рускай мове. Д о в н а р - З а п о л ь с к и й М. В. Н. Тяпинский переводчик евангелия на белорусское наречие. Спб., 1899.

М у т а л и м о в а М. Причастия в Мариинском кодексе и соответствия в Евангелии В. Тяпинского: Автореф. дис. ... канд. филол. наук. Мн., 1970.

2.3.

На беларускай мове. В а с і л ь Цяпінскі // Асвета і педагагічная думка ў Беларусі. Мн., 1985; В а с і л ь Цяпінскі // Беларускі гаспадарскі каляндар на 1927 год. Вільня, 1926; В о л ь с к і В. Васіль Цяпінскі // Нарысы па гісторыі беларускай літаратуры. Мн., 1956; Я г о ж. Нарысы па гісторыі беларускай літаратуры эпохі феадалізма. Мн., 1952. С. 102—109; Г а л е н ч а н к а Г. Васіль Цяпінскі — паслядоўнік скарынінскай справы // 450 год беларускага кнігадрукавання. Мн., 1968; Я г о ж. Партрэты першадрукароў Беларусі Ф. Скарыны, С. Буднага, В. Цяпінскага // Помнікі гіст. і культ. Бел. 1972. № 1; Г а р э ц к і М. Васіль Цяпінскі // Гарэцкі М. Гісторыя беларускае літаратуры. Вільня, 1920; 2 выд., Вільня, 1921; 3 выд. Вільня, 1924; 4 выд. Мн., 1926; Д а б р ы н і н М. Беларуская літаратура: Старажытны перыяд. Мн., 1952. С. 170—171; Ж у р а ў с к і А. Перакладчыцкая дзейнасць В. Цяпінскага // Жураўскі А. Гісторыя беларускай літаратурнай мовы. Мн., 1967. Т. 1; Я г о ж. Тыпы і асаблівасці глос у «Евангеллі» В. Цяпінскага // Працы Інстытута мовазнаўства АН БССР. 1960. Вып. 7; З я м к е в і ч Р. Васіль Цяпінскі // Бел. жыццё. 1919. 14 ліп.; К о р ш у н а ў А. Васіль Цяпінскі // Гісторыя беларускай дакастрычніцкай літаратуры: У 2 т. Мн. 1968 Т. 1; Я г о ж. Васіль Цяпінскі // Гісторыя беларускай літаратуры. Мн., 1985; Я г о ж. Васіль Цяпінскі // Нарысы гісторыі народнай асветы і педагагічнай думкі ў Беларусі. Мн., 1968; Л а р ч а н к а М. Васіль Цяпінскі // Ахрыменка П., Ларчанка М. Старажытная беларуская літаратура. Мн., 1968; [Л а с т о ў с к і В.] Васіль Цяпінскі // Беларускі каляндар Сваяка 1919 год. Вільня, 1919; Беларускі Гаспадарскі Каляндар на 1926 год. Вільня, 1925; Я г о ж. Васіль Цяпінскі // Гоман. 1916. 31 сак.; Я г о ж. Вялікі патрыёт — Васіль Цяпінскі // Часопіс. 1920. № 1; М а й х р о в і ч С. З зычлівасцю да Айчыны // Голас Радзімы. 1967. № 6; Я г о ж. «Народу своему услугую...»: Да 425-годдзя з часу нараджэння В. Цяпінскага // ЛіМ. 1965. 24 снеж.; Я г о ж. Нарыс гісторыі старажытнай беларускай літаратуры XIV—XVIII ст. Мн. 1980. С. 80—83; М у т а л і м а в а М. Аб дзеепрыметніках у «Евангеллі» В. Цяпінскага: [У супастаўленні з помнікамі стараславянскай пісьменнасці] // Весн. БДУ. Сер. 4. 1969. № 2; П а р э ц к і Я. Сымон Будны. Мн., 1975. С. 31—33; П - к а Ів. [Пачопка І.]. 400-лецце беларускага друку // Праваслаўны беларус. 1925. № 2; Ш а л ь к е в і ч В. Палымяны патрыёт: Да 440-годдзя з дня нараджэння В. Цяпінскага // Голас Радзімы. 1980. 11 снеж.

На польскай мове. C i a p i ń s k i Bazyli // Kawecka-Gryczowa A., Korotajowa K., Krajewski W. Drukarze dawnej Polski od XV do XVIII wieku. Z. 5. Wielkie Księstwo Litewskie. Wrocław; Kraków, 1959; T o p o l s k a M. Czytelnik i książka w Wielkim Księstwie Litewskim w dobie Renesansu i Baroku. Wrocław, 1984. S. 60, 73, 93, 134, 194, 213, 215, 264, 274; S i e l i c k i F. Publicystyka protestancka: W. Ciapiński i S. Budny // Sielicki F.

Literatura białoruska do końca XVIII wieku. Wrocław, 1985.

На рускай мове. Алексютович Н. Тяпинский и его предисловие к Евангелию // Из истории философской и общественно-политической мысли Белоруссии. Мн., 1962; Владимиров П. Предисловие Василя Тяпинского к печатному евангелию, изданному в Западной России, около 1570 года // Киевская старина. 1889. № 1; Довнар-Запольский М. О сходстве инициалов в изданиях В. Тяпинского и Ф. Скорины; В. П. Тяпинский. Переводчик Евангелия на белорусское наречие // Довнар-Запольский М. Исследования и статьи. К., 1909. Т. 1; Дорошевич Э., Конон В. Очерк истории эстетической мысли Белоруссии. М., 1972. С. 76; Евсеев И. Очерки по истории славянского перевода Библии // Христианское чтение. 1912. Спб. 1366—1369; История белорусской дооктябрьской литературы. Мн., 1977. С. 127—132; Карабан С. Очерки истории белорусской эстетической мысли и литературной критики. Мн., 1971. С. 27; Карский Е. Белорусы. Пг., 1921. Т. 3. Вып. 2. С. 35—38; Конон В. От Ренессанса к классицизму: Становление эстетической мысли Белоруссии в XVII—XVIII вв. Мн., 1978. С. 79—81; Пичета В. Белоруссия и Литва XV—XVI вв. М., 1961. С. 630—632, 690—698; Тиховский Ю. Новые данные о западнорусских переводах священного писания XVI века // Труды четырнадцатого археологического съезда в Чернигове. 1909. М., 1911. Т. 3; Чемерицкий В. Белорусская литература // История всемирной литературы в 9 т. М., 1985. Т. 3. С. 497; Шалькевич В. Современники Ивана Федорова Сымон Будный и Василий Тяпинский // Иван Федоров и восточнославянское книгопечатание. Мн., 1984.

На ўкраінскай мове. Грушевський М. Історія української літератури. К., 1927. Т. 5. С. 242; Левицький О. Про Василя Тяпинського, що переклав в XVI ст. Евангеліе на просту мову // Зап. Укр. Наук. Тов. в Київі. 1913. Т. 12.

В. І. Козіч.

ЦЯЦЕРСКІ МІХАЛ

Цяцерскі (Цацэрскі) Міхал (?—12.9. 1797), драматург, педагог. Пісаў на польскай, лацінскай і беларускай мовах.

Біяграфічных звестак пра М. Цяцерскага надзвычай мала. Вядома толькі, што яго бацька, Ян Цяцерскі, жыў у Варміі, але, мяркуючы па прозвішчы, паходзіў з Беларусі, магчыма, з Забелаў на Полаччыне (цяпер в. Валынцы Верхнядзвінскага р-на), дзе ў дамініканскай калегіі выкладалі ўсе тры яго сыны — Міхал, Фаўстын і Фелікс, якія занялі прыкметнае месца ў грамадскім і літаратурным жыцці Беларусі і Літвы. Доктар філасофіі і тэалогіі Фаустын Цяцерскі ўзначальваў змову супраць Паўла I, за што быў асланы на катаргу ў Сібір; вярнуўшыся, працаваў у Забельскай калегіі, пісаў там успаміны, гісторыю Літвы і Беларусі. Там жа выкладаў паэтыку і рыторыку; аўтар падручнікаў па гэтых прадметах і па эксперыментальнай фізіцы. Міхал Цяцерскі таксама выкладаў (прыкладна з 1784) паэтыку і рыторыку ў Забельскай калегіі. Вынікам яго педагагічнай практыкі стаў лацінамоўны падручнік па рыторыцы (рукапіс зберагаецца ў бібліятэцы Вільнюскага універсітэта). Разам з іншымі педагогамі калегіі (К. Марашэўскі, І. Юрэвіч) заснаваў у Забелах школьны тэатр, у якім ставіліся шматактныя драмы і камедыі. Сярод іх была і зробленая М. Цяцерскім беларуска-польская пераробка п'есы Ж.-Б. Мальера «Лекар па прымусу» (паст. ў 1787). У 1788 і 1790 напісаў на польскай мове трагедыі «Сапар», «Фемістокл» на сюжэты з антычнай гісторыі, а пазней яшчэ дзве камедыйныя п'есы: «Шлюб, перакулены дагары нагамі арлекінавымі хітрыкамі» і «Камедыя». М. Цяцерскаму належаць і празаічныя дыялогі ў камічнай оперы Р. Вардоцкага «Апалон-заканадаўца, або Рэфармаваны Парнас» (1789). Магчыма, ён жа з'яўляўся аўтарам арацыі «Пчолы» (1790). У рукапісе загінула трагедыя М. Цяцерскага на польскай мове «Свабода і нядобрасумленнасць».

Драматычныя творы М. Цяцерскага, рукапісы якіх захоўваюцца ў ЦБ АН Літвы, напісаны ў традыцыях класіцызму. У трагедыях паслядоўна праводзяцца ідэі і прынцыпы эпохі Асветніцтва, выразна гучаць матывы самаахвярнага служэння народу і айчыне, асуджаюцца тыранія і дэспатызм. У камедыях выкрываюцца заганныя бакі тагачаснага грамадства: інтэлектуальнае ўбоства вышэйшых саслоўяў, франкаманія, адмаўленне народнай культуры. Камедыі М. Цяцерскага на новым узроўні працягвалі традыцыі інтэрмедый да школьнай драмы, развівалі распрацаваныя ёю эстэтычныя прынцыпы. Аўтар смела насычаў іх нацыянальным беларускім каларытам (вобразы сялян Хведара і Апанаса, што замяняюць Цібо і Перэна ў «Лекары па прымусу», а таксама селяніна, які побач з антычнымі персанажамі дзейнічае ў «Апалоне-заканадаўцы»).

А. А. Мельнікаў.

Бібліяграфія

1.3.

1978. Доктар па прымусу: [Камедыя] // Беларуская дакастрычніцкая драматургія. Мн.

2.3.

На беларускай мове. Ахрыменка П. Развіццё драматургіі: Школьныя драмы, інтэрмедыі, камедыі і батлейка // Ахрыменка П., Ларчанка М. Старажытная беларуская літаратура. Мн., 1968; Гісторыя беларускага тэатра: У 3 т. Мн., 1983. Т. 1. С. 170; Гісторыя беларускай дакастрычніцкай літаратуры: У 2 т. Мн., 1968. Т. 1. С. 429—430; Мальдзіс А. Вакол Парнаса Забельскай калегіі // Мальдзіс А. Таямніцы старажытных сховішчаў. Мн., 1974; Яго ж. На скрыжаванні славянскіх традыцый. Мн., 1980. С. 321—322, 326—329; Усікаў Я. Беларуская камедыя. Мн., 1979. С. 73—75; Яго ж. Беларуская камедыя: (Ля вытокаў жанру). Мн., 1964. С. 131—151.

На рускай мове. Карский Е. Белорусы. Пг., 1921. Т. 3. Вып. 2. С. 231—233.

3.1.

ЦБ АН Літвы, ф. 18, рук. 1, 201.

Г. І. Рэут.

Ч

ЧАБАН ТАМАРА

Чабан Тамара Канстанцінаўна (31.5. 1952, в. Чабаны Глыбоцкага р-на Віцебскай вобл.— 20.3. 1992, г. Мінск, пахавана ў г. п. Ракаў), крытык, літаратуразнавец. Член СП Беларусі з 1988. Кандыдат філалагічных навук (1982).

Нарадзілася ў сялянскай сям'і. Яе бацька, Канстанцін Сцяпанавіч, і маці, Алена Сямёнаўна,— калгаснікі, цяпер на пенсіі. У 1969 Т. Чабан скончыла Чарневіцкую сярэднюю школу і паступіла на філалагічны факультэт БДУ. У 1974, атрымаўшы дыплом, накіравана ў Полацкі раён, дзе ў Ветрынскай сярэдняй школе выкладала беларускую мову і літаратуру. З 1976 у завочнай аспірантуры пры кафедры беларускай літаратуры БДУ (скончыла ў 1980). З 1978 у Мінску. Працавала старшым карэктарам у выдавецтве «Навука і тэхніка». У 1982 абараніла кандыдацкую дысертацыю на тэму «Рамантычныя тэндэнцыі ў сучаснай беларускай паэзіі». З 1981 малодшы, з 1985 старшы навуковы супрацоўнік Інстытута літаратуры імя Я. Купалы АН Беларусі. Абіралася старшынёй савета клуба «Братэрства», членам рэдкалегіі штогоднікаў «Дзень паэзіі» — 88 і 89. Вяла шырокую дзейнасць у абарону прыроды.

Літаратурную творчасць пачала з вершаў у сярэдняй школе. У друку ўпершыню выступіла ў 1977 з рэцэнзіяй на кнігу В. Іпатавай «Парасткі» («Літаратура і мастацтва»). Яе артыкулы па праблемах сучаснага літаратурнага працэсу друкаваліся на старонках рэспубліканскіх і саюзных выданняў, а таксама ў зборніках «Песні беларускай валадар», «Узроўні фальклорных уплываў» і інш. Т. Чабан аўтар шматлікіх творчых партрэтаў, рэцэнзій на кнігі вершаў Р. Баравіковай, А. Грачанікава, В. Іпатавай, Г. Каржанеўскай, Н. Мацяш, Я. Янішчыц і інш. Яе працы пазначаны шырынёй аўтарскага погляду, прафесійнай падрыхтаванасцю, аналітычнай заглыбленасцю, навуковасцю і эмацыянальнасцю, уменнем весці гаворку пра значнае. Выдала манаграфію «Крылы рамантыкі» і кнігу «Сучасная паэзія і фальклор» (у сааўтарстве з Я. Гарадніцкім). Склала зборнікі «Вобраз» — 86 і «Зона бяды».

Л. М. Гарэлік.

Бібліяграфія

1.2.

Крылы рамантыкі: Рамантычныя тэндэнцыі у сучаснай беларускай паэзіі. Мн., 1982. Рэц.: Верабей А. На крылах рамантыкі // Маладосць. 1983. № 1; Кулагин А. // Лит. обозрение. 1983. № 12; Нуждзіна Т. Далягляды рамантычнай паэзіі // ЛіМ. 1983. 21 студз.

Романтические тенденции в современной белорусской поэзии: Автореф. дисс... канд. филол. н. Мн., 1982.

Сучасная паэзія і фальклор. Мн., 1988 / Сааўт. Я. Гарадніцкі.

1.3.

1977. Пачуццё меры: [Рэц. на кн.: Іпатава В. Парасткі. Мн., 1976] // ЛіМ. 6 мая.

1979. Насустрач сабе: [Рэц. на кн.: Філімонава Л. Гучныя фарбы. Мн., 1978] // Маладосць. № 10; Шлях да сапраўднага: [Рэц. на кн.: Баравікова Р. Слухаю сэрца. Мн., 1978] // Чырв. змена. 23 жн.

1980. Рух слова: [Рэц. на кн.: Някляеў У. Вынаходцы вятроў. Мн., 1979] // Маладосць. № 8; Крыніца вечная, жывая // ЛіМ. 11 ліп.; «Лікуючая туга слоў...»: «Вечная тэма» ў творчасці маладых паэтаў // Чырв. змена. 25 мая.

1981. Купалаўская рамантычная традыцыя // Песні беларускай валадар. Мн.; Вернасць вытокам: Маладая беларуская паэзія, год 1980. // Маладосць. № 3; Радаводная повязь // ЛіМ. 2 кастр.; Навука глыбіні: [Рэц. на кн.: Макаль П. Смак яблыка. Мн., 1981] // Чырв. змена. 14 ліст.

1982. Фальклорныя элементы ў рамантычнай вобразнасці сучаснай беларускай паэзіі // Узроўні фальклорных уплываў. Мн.; Над перавясламі радкоў: [Рэц. на кн.: Коўтун В. На зломе маланкі. Мн., 1982] // Маладосць. № 9; Светлая элегія быцця: [Рэц. на кн.: Рудкоўскі М. Трыгор'е. Мн., 1981] // Полымя. № 7.

1983. Сцежкі ўтоптаныя і няходжаныя: [Рэц. на кн.: Сцяжына. Мн., 1983] // ЛіМ. 23 верас.; Увасабленне: [Рэц. на кн.: Бічэль-Загнетава Д. Дзе ходзяць басанож. Мн., 1983] // Там жа. 9 снеж.

1984. Традиция обязывает // Неман. № 3; «Я пра гэта ведаю...»: [Рэц. на кн.: Лойка А. Няроўныя даты. Мн., 1983] // Полымя. № 5; Паміж быццём і бытам: [Рэц. на кн.: Каржанеўская Г. Жылабыла. Мн., 1983] // Полымя. № 6.

1985. Приручение мира: [Рэц. на кн.: Бічэль-Загнетава Д. Дзе ходзяць басанож. Мн., 1983; Бічэль-Загнетава Д. За гасцінец. Мн., 1985] // Дружба народов. № 8; Вечны ветразь: [Рэц. на кн.: Хамчук В. Ветразь надзеі. Мн., 1983] // Маладосць. № 4; У рытме сэрца, зямлі і падзей: [Рэц. на кн.: Танк М. За маім сталом. Мн., 1984] // Полымя. № 12; Дакрануцца да святла: [Рэц. на кн.: Жыгуноў А. Матчына вышыванка. Мн., 1984; Рубін І. Над вечнасцю гнязда. Мн., 1984] // ЛіМ. 1 лют.

1.6.

Вобраз — 86: Літ.-крытыч. артыкулы. Мн., 1986 / Скл.

Броўка П. Зб. тв.: У 9 т. Мн., 1987, Т. 4. Вершы. Паэма: 1965—1972 / Рэд.

Зона бяды: Пісьменнікі, вучоныя, публіцысты пра экалогію. Мн., 1990 / Скл.

Янішчыц Я. «Задумацца. І зноў узяць пяро...»: [Інтэрв'ю] // ЛіМ. 1985. 8 сак. / Зап. *Т. М. Махнач.*

ЧАБОР ЯНКА

Чабор Янка [сапр. Пятаповіч Іван Сцяпанавіч; 29.6(11.7).1911, в. Рачканы Слуцкага пав. Мінскай губ., цяпер Ляхавіцкі р-н Брэсцкай вобл.— 1943], паэт, публіцыст, рэвалюцыянер.

Нарадзіўся ў сялянскай сям'і. Скончыў Віленскую беларускую гімназію (1931), вучыўся ў Віленскім універсітэце. Удзельнік нацыянальна-вызваленчай барацьбы ў Зах. Беларусі. Адзін з ініцыятараў стварэння Літаратурнага фронту сялянска-рабочых пісьменнікаў Зах. Беларусі. 10.12.1933 на з'ездзе пісьменнікаў быў абраны рэдактарам-выдаўцом часопіса «Літаратурная старонка», які стаў друкаваным органам Літаратурнага фронту. Першы нумар часопіса выйшаў з друку 25.1.1934 і быў адразу канфіскаваны ўладамі. У 1934 Я. Чабор быў асуджаны на 5 гадоў турмы. У верасні 1936 выйшаў з турмы па амністыі і заняўся арганізацыяй кааператываў у вёсках сваёй ваколіцы. Пасля ўз'яднання Зах. Беларусі прымаў удзел ва ўстанаўленні савецкай улады і ў рабоце першых савецкіх устаноў. Месца і абставіны смерці нявысветленыя.

Першыя вершы Я. Чабора («Васілёк», «Мы арлы») былі змешчаны ў 1928 у рукапісным часопісе падпольнай камсамольскай ячэйкі Віленскай беларускай гімназіі «Васілёк» (№ 1). У 1931 надрукаваў «Адкрыты ліст» з заклікам да заходнебеларускіх пісьменнікаў аб'яднацца ў адзіную пісьменніцкую арганізацыю. У «Літаратурнай старонцы» змясціў некалькі вершаў («Заклік», «Гэй, арліна мая сіла...»), галоўным пафасам якіх быў заклік да рэвалюцыйнай перабудовы жыцця. Друкаваўся таксама ў «Беларускай газеце». *У. А. Лебедзеў.*

Бібліяграфія

1.3.

1934. Заклік; Гэй, арліная мая сіла: [Вершы] // Літ. старонка. 25 студз.

1965. Заклік; «Гэй, арліна мая сіла...»: [Вершы] // Сцягі і паходні. Мн.

1.5.

На польскую мову. List z Białorusi // Mies. Lit. 1931. Nr 17.

На ўкраінскую мову. Лист із Білорусі // Вікна. 1931. № 5.

2.3.

На беларускай мове. Міско Я. Хлопец з вёскі Рачканы // Міско Я. Маё маўклівае сэрца. Мн., 1983; Палітычны працэс «Беларускай газеты» і «Асвы» // Наша воля. 1936. 12 крас.

3.1.

ЦНБ АН Беларусі, аддз. рукап., ф. 5, воп. 1, адз. зах. 1, с. 226. *Т. М. Махнач.*

ЧАВУСКІ МІХАСЬ

Чавускі Міхась [Майсей Моталевіч; псеўд.: Л. Вірня, Лявон Вірня, Я. Вірня, М. Майскі, Ш. Майскі, Лявон Мінскі, Шапілава-Майскі, Я. Шапілаў; крыпт.: Л. В., М. Ч., М. Ч-скі, М. Ча-скі; 12(25).12.1904, в. Шапілава Рагачоўскага пав. Магілёўскай губ., цяпер в. Майскае Жлобінскага р-на Гомельскай вобл.— 1.7.1984, Мінск, пахаваны на Паўночных могілках], празаік, драматург. Член СП Беларусі з 1957.

З сям'і вясковага шаўца. У 1917—24 працаваў у друкарні г. Жлобіна, загадваў хатай-чытальняй у в. Майскае Жлобінскага р-на. У 1924—26 і 1928—30 наборшчык друкарні ў Мінску. Служыў у пагранічных войсках (1926—28). У 1927 уступіў у кампартыю. Працаваў у Белспажыўсаюзе (1930—32), рэдакцыях газет «Советская Белоруссия», «Звязда», газеты Плешчаніцкай МТС, мінскай раённай газеты «Шлях сацыялізму», у аддзеле агітацыі і прапаганды аднаго з райкомаў КП(б)Б г. Мінска, інструктарам ЦК КП(б)Б (1932—38). У 1934—37 завочна вучыўся ў Камуністычным інстытуце журналістыкі ў Ленінградзе. У 1938—41 быў адказным кіраўніком, галоўным рэдактарам БелТА. У Вялікую Айчынную вайну адказны рэдактар газеты-плаката «Раздавім фашысцкую гадзіну» (1941—43), рэдактар сатырычнай газеты Вілейскага падпольнага абкома КП(б)Б «Партызанскае слова» (1943—44). У 1944—47 быў намеснікам старшыні Радыёкамітэта БССР, галоўным рэдактарам рэспубліканскага радыёвяшчання. Працаваў у часопісе «Вожык» (1947—61) галоўным рэдактарам, потым загадчыкам аддзела фельетонаў. У 1964—70 быў дырэктарам Бюро прапаганды мастацкай літаратуры Саюза пісьменнікаў БССР.

З артыкуламі М. Чавускі пачаў выступаць у рэспубліканскім друку ў 1937, з апавяданнямі — у 1940. Аўтар зборнікаў апавяданняў, фельетонаў, гумарэсак, аднаактовых п'ес, дакументальнай аповесці «Фарбамі гневу». Яго творчасць мела яскрава выяўлены гумарыстычна-сатырычны характар. Высмейваў заганы (пераважна прыватныя) тагачаснага жыцця, выкрываў дробных бюракратаў, хабарнікаў, распуснікаў. *В. І. Яцухна.*

Бібліяграфія

1.2.

Навагодняе пасланне правіцелям ЗША ад Ігната Кныша з калгаса «Шлях Ільіча»: (Рэпертуарны матэрыял для мастацкага чытання). Мн., 1952 (Рэсп. дом нар. творчасці Беларусі) / Пад псеўд. Л. Вірня.

Крытычны момант: Гумар і сатыра. Мн., 1954. Рэц.: Цітоў К. Аб сапраўдным і ненатуральным // Полымя. 1955. № 2.

Індык на курорце: (Фельетоны і гумарэскі). Мн., 1960 (Б-ка «Вожыка») / Пад псеўд. Л. Вірня.

Рука руку мые: Сцэнкі. Мн., 1964 (У рэпертуар маст. самадзейнасці).

Чаму ж не смяяцца?: Гумар і сатыра. Мн., 1969. Рэц.: Валасевіч Э. Дасціпная і вясёлая // ЛіМ. 1969. 11 крас.; Сталяроў М. Чаму ж не смяяцца // Беларусь. 1969. № 8.

Фарбамі гневу. Мн., 1975 («Б-ка «Вожыка»). Рэц.: Шныпаркоў А. // Гомел. праўда. 1975. 11 вер.

Стрэляны Вераб'ёў: Гумар; Сатыра. Мн., 1976.

Фарбамі гневу: Дакум. аповесць. Мн., 1978. Рэц.: Вішнеўскі І. Кнігапіс // ЛіМ. 1978. 21 ліп.; Іваноўская Л. У рэдакцыю не вярнуўся... // Наст. газ. 1979. 29 снеж.; Каршукоў Я. Недапісаны дзённік // Чырв. змена. 1978. 27 чэрв.; Нікішын М. Зброяй слова і пэндзеля // Там жа. 1978. 14 кастр.; Шырокі А. З арлінага племя // Гомел. праўда. 1978. 6 вер.

1.3.

1937. Партыйны дзень па выніках XVI з'езда КП(б)Б // Звязда. 27 чэрв.; Яшчэ раз аб справах наркомасветы // Там жа. 2 жн. / Сааўт. П. Кавалёў.

1938. Надзежда Грыгор'еўна Грэк: [Нарыс] // Звязда. 19 чэрв.

1940. Адноўленае жыццё: Апавяданне // Работніца і калгасніца Бел. № 4; Вызваленыя з панскай няволі // Камунар Магілёўшчыны. 15 сак.; Патрыятызм савецкага народа // Сял. газета. 16 крас.

1942. Сустрэча чыстакроўных Гансаў // Раздавім фашысцкую гадзіну. № 35 / Пад псеўд. Шапілава-Майскі; Небяспечная хвароба // Там жа. № 36 / Пад псеўд. Шапілава-Майскі; Вясенніе жучкі Гебельса // Там жа. № 37 / Пад псеўд. Шапілава-Майскі; Мы вызваляць цябе ідзём: [Верш] // Там жа. № 45 / У сааўт.; Гітлераўскі іканастас // Там жа. № 56 / Пад крыпт. М. Ч—скі; Ежа для варон забяспечана // Там жа. № 62 / Пад крыпт. М. Ча—скі; Калі выюць ваўкі // Там жа. № 66 / Пад крыпт. М. Ч.; Малая партызанская энцыклапедыя // Там жа. № 71—72 / У сааўт.

1945. Няўдалае інтэрв'ю: Апавяданне // Вожык. № 1; Продкаварства і любоў: Апавяданне // Там жа.

№ 4; Ад грос-фанабэрства да грос-катастрофы // Раздавім фашысцкую гадзіну. № 141; Сумуе горкая асіна: Фельетон // Сав. селянін. 1 мая.

1946. Вобраз, які жыве ў народзе: (З запісной кніжкі) // ЛіМ. 15 чэрв.; Літаратура і музыка на радыё // Там жа. 7 вер.

1947. Пад Новы год: [Гумарэска] // Вожык. № 1.

1948. Найбольшы скарб: [Гумарэска] // Вожык. № 11 / Пад псеўд. Л. Вірня.

1949. Не жарты: [Жарт] // Вожык. № 2 / Пад псеўд. Л. Вірня; Шторм: [Гумарэска] // Там жа. № 4 / Пад псеўд. Л. Вірня; Творчы план: [Апавяданне] // Там жа. № 7 / Пад псеўд. Л. Вірня; Чырвоны першамай: [Нарыс] // Там жа. № 8 / Пад псеўд. Л. Вірня; Па сакрэту ўсяму свету: [Гумарэска] // Там жа. № 9 / Пад псеўд. Л. Вірня.

1951. «У мяне такі характар»: [Гумарэска] // Вожык. № 23 / Пад. псеўд. Л. Вірня;

1952. Мацёры воўк: [Апавяданне] // Мастацкае слова. Мн. / Пад. псеўд. Л. Вірня; Сустрэча: П'еса // Беларусь. № 11 / Пад псеўд. Л. Вірня; сааўт. В. Зуб.

1953. Тонкая сітуацыя: Камедыя // Беларусь. № 9 / Пад псеўд. Л. Вірня; Сані ў Казані, хамут у Разані // Вожык. № 23 / У сааўт.

1954. Пястунчыкі; «У мяне такі характар»; Хліпак; Па сакрэту ўсяму свету: [Вершы] // Размова па шчырасці. Мн. / Пад псеўд. Л. Вірня; Надзея: [Апавяданне] // Беларусь. № 3 / Пад псеўд. Л. Вірня; На языку мёд, а ў сэрцы лёд: [Сцэнка] // Там жа. № 6 / Пад псеўд. Л. Вірня; Вобраз: [Апавяданні] // Там жа. № 10 / Пад псеўд. Л. Вірня; Чырвоны мак: Трагікамедыя ў трох карцінах // Полымя. № 11 / Пад псеўд. Л. Вірня; Цынікі: [Фельетон] // Чырв. змена. 3 сак. / Пад псеўд. Л. Вірня.

1955. Ахвяра смеху: [Апавяданне] // Беларусь. № 10 / Пад псеўд. Л. Вірня; Каханенькія-роднень-кія: (Гумарэскі) // Полымя. № 9 / Пад псеўд. Л. Вірня; Сюрпрыз: (Гумарэска) // Работніца і сялянка. № 9 / Пад псеўд. Л. Вірня; Перед свистком судьи: Фельетон // Правда. 31 авг. / Сааўт. А. Макаёнак.

1956. Ордэр: Трагікамедыйны эцюд // Беларусь. № 1 / Пад псеўд. Л. Вірня; Заваяваны аўтарытэт: Нарыс // Полымя. № 7 / Пад псеўд. Л. Вірня; Партрэт: [Інтэрмедыя] // Работніца і сялянка. № 1 / Пад псеўд. Л. Вірня.

1957. Тата, мама, бабуля і я: Вадэвіль // Беларусь. № 9 / Пад псеўд. Л. Вірня; Трымаць сатырычны порах сухім // ЛіМ. 4 мая; Строгі рэжым: Апавяданне // Мін. праўда. 28 ліп. / Пад псеўд. Л. Вірня; Акцыі: (П'еса-фельетон) // Чырв. змена. 30 крас. / Пад псеўд. Л. Вірня.

1958. Ордэр: [П'еса] // Сцэнкі для сцэны. Мн.; Барсуковы сляды // Вожык. № 18 / Пад псеўд. Л. Вірня; Рак і мянтуз: [Байка] // Там жа. № 19 / Пад. псеўд. Л. Вірня; Слова — свята: Гумарэска // Маладосць. № 5 / Пад псеўд. Л. Вірня; Хто смяецца апошнім: (Фельетон) // Мін. праўда. 1 студз. / Пад псеўд. Л. Вірня.

1959. Хто ж паклёпнік: Камедыя // Беларусь. № 12 / Пад псеўд. Л. Вірня; Ружовы канверт: Скетч // Работніца і сялянка. № 7 / Пад псеўд. Л. Вірня.

1960. Рэгент і інжынер: Фельетон // ЛіМ. 19 сак. / Пад псеўд. Л. Вірня; Папяровая перастрэлка: Фельетон // Там жа. 27 мая / Пад псеўд. Л. Вірня; Кума кумцы па сакрэту...: Трагедыйная сцэнка // Там жа. 26 ліп. / Пад псеўд. Л. Вірня; Цуд за цудам: Фельетон // Там жа. 2 жн. / Пад псеўд. Л. Вірня; Чалавека падмянілі: Фельетон // Там жа. 29 ліст. / Пад псеўд. Л. Вірня; Абяцанкін: Сцэнарый кароткаметражнага хранікальна-дакументальнага кінафельетона // Чырв. змена. 28 мая / Пад псеўд. Л. Вірня.

1961. Людмілачка дае канцэрты: Фельетон // ЛіМ. 17 студз. / Пад псеўд. Л. Вірня; Клавачка з бронзавымі кудлямі: Гумарэска // Чырв. змена. 5 крас. / Пад псеўд. Л. Вірня.

1962. З перцам, але са шчырым сэрцам: Эстрадная праграма // А гармонік грае, грае. № 5; Красуйся і ў шчасці жыві!: Навагодняя праграма для самадзейнай эстрады // Там жа. № 12; Прададзеныя нявесты: Фельетон // ЛіМ. 6 сак. / Пад псеўд. Л. Вірня; Цудадзейныя грамы: Сцэнарый кароткаметражнага дакументальнага фільма: Фельетон // Там жа. 7 снеж. / Пад псеўд. Лявон Вірня; Рэкламны індык // Наст. газ. 30 мая / Пад псеўд. Л. Вірня.

1963. Індык на курорце; Шчупакова крыўда: [Апавяданні] // Пад корань. Мн. / Пад псеўд. Л. Вірня; Слова — свята; Спагадлівыя бацькі; Таўстун і меца-сапрана: [П'есы] // А гармонік грае, грае. № 12; На рэактыўнай чапяле: [Фельетон] // ЛіМ. 1 студз. / Пад псеўд. Л. Вірня.

1964. Ордэр: Сцэнка; Акуля, чаму шыеш не адтуля?..: Канферанс; Толькі строга паміж намі: Сцэнка; Дроў наламалі: Сцэнка-жарт; Днём з агнём: Жарт; Свістунчыкі: Канферанс // А гармонік грае, грае. № 12; Ордэр: Сцэнка // ЛіМ. 15 снеж.; Крыж і свастыка: [Сцэна з п'есы «Людзі супраць вылюдкаў»] // Там жа. 25 снеж.

1966. Манеўры імперыялістаў: [Гумарэска] // Вожык у дарозе. Мн.; Вакантнае месца: [П'еса] // Крывавы бізнес. Мн.

1968. Цярэшачка: Сцэнка // Вожык. № 12.

1969. Сакрэт маладосці: Сцэнка // Вожык. № 1; Рэжым: Апавяданне // ЛіМ. 11 лют.

1971. Фарбамі гневу // ЛіМ. 10 снеж.

1972. Фінансавая каралева: [Гумарэска] // Беларусь. № 7; Колькі зла ад «казла»...: [П'еса] // Там жа. № 10; Жлуктач і селядзёнак: Сцэнка // Вожык. № 7; Фарбамі гневу: Дакументальная аповесць // Маладосць. № 5; Фарбамі гневу: [Раздзелы з аповесці] // Звязда. 7, 8, 10, 12, 15 кастр.; Паміж намі, дзяўчатамі: П'еса // ЛіМ. 3 сак.

1973. Сакрэт маладосці: Гумарэска // ЛіМ. 26 студз.; Усё аддай і мала: Гумарэска // Там жа. 12 мая; Голас з печы: Гумарэска // Там жа. 30 ліст.

1974. Небяспечная хвароба: [Фельетон] // Хрэстаматыя па гісторыі беларускай савецкай публіцыстыкі. Мн.; Трапнасць сатырычнага слова // Беларусь. № 7; Сакрэт маладосці: Сцэнка // Там жа. № 12; Памылка друку; Сустрэча ў поездзе; Зрабіў вывады: [Гумарэскі] // Маладосць. № 12; Няма такога вогнетушыцеля: [Сцэнка] // Вяч. Мінск. 28 снеж.; І сатыра ваявала... // ЛіМ. 8 мая; Характарыстыка падвяла: Маленькая трагікамедыя // Там жа. 23 жн.; Будзіла-віцкая мадонна: Урывак з рамана-памфлета // Там жа. 27 снеж.; Дзень цудоўных падманаў: [Урыўкі з п'есы] // Мін. праўда. 25 снеж.

1975. Бацькі і дзеці; Крэпасць абароны: Карацелькі // Беларусь. № 6; «Говорит «Савецкая Беларусь» // Неман. № 5; Агнём сатыры // Чырв. змена. 21 студз.

1976. Вася-Васілёк: Урыўкі з аповесці // Бярозка. № 10; Мініяцюры з натуры: Гумар // ЛіМ. 13 лют.

1978. На прыёме ў доктара; Да самай глыбокай старасці; Не ў брыво, а ў вока: Гумарэскі // ЛіМ. 19 мая.

1979. Індык на курорце: Гумарэска // Беларусь. № 12; «Пладаягада» і «Каапгандаль»: Фельетон // ЛіМ. 9 лют.; Ружовы канверт: Трагікамедыя // Там жа. 30 ліст.

1.5.

На беларускую мову. Перад свістком суддзі: Фельетон // Звязда. 1955. 1 вер. / Сааўт. А. Макаёнак.

На латышскую мову. Draugs draugam čukst pa draugam: Skečs gandrīz no dzives // Lenina Karogs. 1960. 13. Sept.

На рускую мову. Хлипак: [Апавяданне] / Пер. А. Николаев // Авторы «Вожыка». М., 1955; В ночь под Новый год: [Сцэнка] // Сов. Бел. 1957. 1 янв. / Пад псеўд. Л. Вірня; Шкафное знакомство; Заботливый отец: [Апавяданні] / Пер. Е. Весенин, В. Корчагин // Юмор «Вожыка». М., 1959; Кум куму по секрету / Пер. М. Горский // Сов. Латвия. 1960. 4 сент.; Фельетоны-сценки / Пер. В. Лазаревская // Неман. 1962. № 2 / Пад псеўд. Л. Вірня; Летучка: [Апавяданне] / Пер. А. Лозневой // Там жа. 1964. № 6; В чем дело, бабушка?: [Апавяданне] / Пер. В. Тарас // Белорусский юмор. Мн., 1965; Очень короткая биография // Молодой коммунист. 1967. № 6; В семнадцать мальчишеских лет: [Нарыс] / Пер. Я. Островский // Чтоб всегда было солнце. Мн., 1968; В семнадцать мальчишеских...: [Успаміны] / Пер. Я. Островский // Неман. 1968. № 1; В чем дело, бабушка? / Пер. В. Тарас; Шкаф № 6 / Пер. Е. Весенин, В. Корчагин:

[Апавяданні] // Белорусский юмор. Мн., 1969; Рассказ полонянки // Неман. 1975. № 2.

На ўкраінскую мову. Разюча зброя // Літ. газета. 1958. 10 січ.

1.6.

Размова па шчырасці: Зборнік гумару і сатыры. Мн., 1954 / Скл.

2.3.

На беларускай мове. «Аматарам вясёлага слова...» // Беларусь. 1974. № 12; Бараноўскі А. Журналіст і пісьменнік: (Да 70-годдзя з дня нараджэння М. Чавускага) // Мін. праўда. 1974. 25 снеж.; Зуб В. Так трымаць! // ЛіМ. 1979. 21 снеж.; Касцюк Л. [Біябібліяграфічная нататка да 80-годдзя нараджэння] // Полымя. 1984. № 12; [Некралог] // ЛіМ. 1984. 6 ліп.; Пісьменнікі Савецкай Беларусі: Кароткі даведнік. Мн., 1981. *Г. І. Рэут.*

ЧАМЯРЫЦКІ ВЯЧАСЛАЎ

Чамярыцкі Вячаслаў Антонавіч (псеўд. В. Чарнавус, В. Навагрудскі; н. 22.7.1936, в. Рабкі Дзятлаўскага р-на Гродзенскай вобл.), літаратуразнавец, крытык. Член СП Беларусі з 1983. Кандыдат філалагічных навук (1967). Лаўрэат Дзярж. прэміі Беларусі (1994; за ўдзел у стварэнні цыкла прац «Скарына і беларуская культура»).

Нарадзіўся ў сялянскай сям'і. Ранняе дзяцінства прайшло ў вёсцы. Маляўнічыя краявіды Навагрудчыны, самабытныя народныя звычаі і абрады, сакавітая родная мова, працавітыя і высакародныя людзі, якія свята захоўвалі свае традыцыі, з маленства дабратворна ўплывалі на яго, спрыялі ранняму фарміраванню яго як асобы, нацыянальна свядомай, неабыякавай да беларускай гісторыі, культуры, літаратуры. У 1937 бацькі В. Чамярыцкага пераехалі ў Навагрудак, горад гістарычных легенд і паданняў. Калі пачалася Вялікая Айчынная вайна, бацька пайшоў на фронт, загінуў без вестак у 1944. Нямецкую акупацыю сям'я (маці і двое дзяцей) перажыла ў сваякоў на вёсцы. Пасля заканчэння беларускай СШ № 1 у Навагрудку (1953) ён паступіў у БДУ на беларускае аддзяленне філалагічнага факультэта, якое скончыў у 1958. Працаваў настаўнікам Слабадской сямігадовай школы Вілейскага р-на (1958—59), карэктарам абласной газеты «Чырвоны сцяг» у г. Маладзечна (1959), інспектарам аддзела народнай асветы Маладзечанскага р-на (1959—62). У 1965 скончыў аспірантуру Інстытута літаратуры імя Я. Купалы АН БССР і абараніў кандыдацкую дысертацыю «Беларускія летапісы як помнікі літаратуры», якая выйшла асобнай кнігай у 1969 і атрымала шырокі водгук у нашай краіне і за мяжой як першая на беларускай мове праца пра гісторыю летапіснага жанру ў Беларусі. З 1965 працуе ў Інстытуце літаратуры, з 1969 старшы навуковы супрацоўнік, з 1991 узначальвае аддзел гісторыі старажытнай і новай беларускай літаратуры. Узнагароджаны медалём Ф. Скарыны.

Першыя спробы пяра В. Чамярыцкага адносяцца да пачатку 1950-х г. Гэта былі вершы аб роднай прыродзе, Радзіме. Друкавацца пачаў з 1952 у навагрудскай раённай газеце «Новае жыццё» (верш «На лыжах»). Усяго апублікаваў у мясцовым і рэспубліканскім друку каля 20 вершаў. Яго творчаму росту спрыяла не толькі тое, што дзяцінства і юнацтва прайшло ў паэтычных мясцінах Навагрудчыны, на радзіме А. Міцкевіча, але і вучоба ў С. Александровіча (школьны настаўнік), знаёмства і сяброўства з А. Клышкам, іншымі беларускімі пісьменнікамі. Гэта вызначыла галоўны кірунак будучых літаратуразнаўчых інтарэсаў: роднае слова, беларуская літаратура, даўняя пісьмовая спадчына. З 1959 актыўна выступае ў друку з рэцэнзіямі, літаратурна-крытычнымі, публіцыстычнымі, навукова-папулярнымі артыкуламі — пераважна пра творчасць маладых беларускіх паэтаў. Пазней захапіўся старажытнай беларускай літаратурай і гісторыяй. Унёс значны ўклад у вывучэнне беларускага летапісання, стварыў яго першую навуковую гісторыю, сказаў новае слова пра летапісы і хронікі як помнікі літаратуры. Падрыхтаваў да друку і ўпершыню апублікаваў каштоўны помнік беларускага пісьменства 17—18 ст.— Магілёўскую хроніку. В. Чамярыцкі ўдзельнічаў у стварэнні першай навуковай гісторыі беларускай літаратуры (на беларускай і рускай мовах), у напісанні «Гісторыі сусветнай літаратуры», у падрыхтоўцы да выдання

тэкстаў беларускіх летапісаў і хронік у 2 тамах (сумесна з М. Улашчыкам), у стварэнні першых беларускіх энцыклапедычных выданняў. Па заказу ЮНЕСКА напісаў (у сааўтарстве) навукова-папулярны нарыс пра Ф. Скарыну (выдадзены ў 1979—80 у Парыжы па-французску і па-англійску). Адрэдагаваў шэраг манаграфій і зборнікаў, прысвечаных беларускаму першадрукару. Ён аўтар раздзелаў падручніка беларускай літаратуры для студэнтаў ВНУ. Выступае як папулярызатар пісьмовай спадчыны беларускага народа, перакладчык твораў старажытнай літаратуры на сучасную беларускую мову. Яго стыль вылучаецца дакладнасцю аргументацыі, пераканаўчасцю вывадаў, прастатой і выразнасцю, сцісласцю і важкасцю выкладу.

Жыве ў Мінску. *Л. С. Савік.*

Бібліяграфія

1.2.

Белорусские летописи как памятники литературы: (Возникновение и лит. история первых сводов). Автореф. дисс. ... канд. филол. н. Мн., 1967.

Беларускія летапісы як помнікі літаратуры: Узнікненне і літаратурная гісторыя першых зводаў. Мн., 1969. Рэц.: Коршунаў А. Па слядах летапісаў // Маладосць. 1970. № 7; Ларченко М. На современном уровне // Вопр. лит. 1971. № 2; Прашковіч М. Крыніцы нашай гісторыі // ЛіМ. 31 сак.; Улашчык М. Пра беларуска-літоўскія летапісы // Полымя. 1970 № 7; Федчанка З. Сведкі гісторыі // Звязда. 1969. 4 ліст.; Nadson A. // J. of Byelorus. Studies. 1971. Nr 3; Sielicki F. // Sl. Orient. 1970. Nr 4.

Традыцыі літаратуры старажытнай Русі ў беларускай літаратуры: Дакастрычніцкі перыяд. Мн., 1982 / Сааўт. А. Коршунаў, А. Лойка. Рэц.: Sielicki F. // Sl. Orient. 1984. Nr 2.

Беларускі тытан эпохі Адраджэння (Да 500-годдзя з часу нараджэння Скарыны). Мн., 1990.

1.3.

1953. Калгасны гарманіст [Верш] // Чырв. змена. 29 жн.

1956. Адаму Міцкевічу: [Верш] // Чырв. змена. 25 сак.

1958. Калгасны гарманіст: [Верш] // Падарунак. Мн.; Шанаваць родную мову // ЛіМ. 8 студз.; Лямпачкі: [Верш] // Там жа. 12 лют.; Рэўнасць [Верш] // Чырв. змена. 27 крас.

1959. Падгледжанае і прыдуманае. Рэц. на кн.: Шмань Г. Для забавы ўсё цікава. Мн., 1959) // Полымя. № 12; Проба голасу: [Рэц. на кн.: Свірка Ю. Шэпчуцца ліўні. Мн., 1959] / Пад псеўд. В. Чарнавус; Мужнасць: [Верш] // Чырв. сцяг. 11 кастр.

1960. Словы крылатыя і бяскрылыя: [Рэц. на кн.: Янкоўскі Ф. Крылатыя словы і афарызмы. Мн., 1960] // Маладосць. № 10; У пошуках свайго голасу: [Рэц. на кн.: Бураўкін Г. Майская просінь. Мн., 1960] // Там жа. № 12.

1961. Хай не гасне агонь: [Рэц. на кн.: Макаль П. Вечны агонь. Мн., 1960] // Маладосць. № 7; Якой павінна быць праграма: Беларуская літаратура ў 9—11-х класах // Наст. газ. 25 ліст.

1963. Пратаптанымі сцежкамі: [Рэц. на кн.: Карызна У. Край мой сінявокі. Мн., 1963] // Маладосць. № 11.

1964. Папулярна і па-навуковаму: [Рэц. на кн.: Юрэвіч А. Навука і рэлігія аб паходжанні мовы. Мн., 1964] // Полымя. № 4; Памылкі па алфавіту: [Рэц. на кн.: Макарэвіч А. Кароткі літаратуразнаўчы слоўнік. Мн., 1963] // Там жа. № 5; Беларусь у нямецкай энцыклапедыі // ЛіМ. 24 студз.; Песня ў няволі // Мін. праўда. 10 студз.

1965. Да пытання аб раннім летапісанні Беларусі (XII—XIII стст). Весці АН БССР. Сер. грам. н. № 3; Друкар кніг, перад тым нязнаных: 475 гадоў з дня нараджэння Францыска Скарыны // Маладосць. № 6; Кніга пра роднае слова: [Рэц. на кн.: Крывіцкі А. Наша родная мова. Мн., 1964] // Полымя. № 2.

1966. Беларус і яго імя: [Рэц. на кн.: Слоўнік асабовых уласных імён. Мн., 1965] // Полымя. № 4; Старонкі нашай гісторыі: [Рэц. на кн.: Вольскі В. Старонкі нашай гісторыі. Мн., 1966] // Там жа. № 10.

1967. Беларускія летапісныя зводы і іх рэдакцыі // Весці АН БССР. Сер. грамад. н. № 1; Голас гісторыі: [Рэц. на кн.: Хроніка Быхаўца. М., 1966] // Маладосць. № 4; Слова пра настаўніка: [Рэц. на кн.: Ерёмин И. Литература древней Руси. М.; Л., 1966] // Полымя. № 4 / Сааўт. М. Прашковіч.

1968. Узнікненне і пачатак развіцця беларускай літаратуры; Летапісы // Гісторыя беларускай дакастрычніцкай літаратуры: У 2 т. Мн. Т. 1; Ігнат Данілоўіч // Полымя. № 7.

1969. Звездный час белорусов // Неман. № 7; З новым букваром, першакласнік. [Рэц. на кн.: Клышка А. Буквар. Мн., 1969] // Звязда. 29 жн.

1970. Неацэнныя багацці: [Рэц. на кн.: Скарына Ф. Прадмовы і пасляслоўі. Мн., 1969] // Помнікі гіст. і культ. Бел. № 1; Адказ гісторыку // ЛіМ. 3 сак. / У сааўт.

1975. Літаратура 14—15 ст.; Літаратура 16 — 1-й пал. 17 ст. / Сааўт. А. Коршунаў // Беларуская савецкая энцыклапедыя. Мн. Т. 12.

1976. Шматграннасць вучонага // Звязда. 14 лют. / Сааўт. Г. Каханоўскі.

1977. Франциск Скорина / Сааўт. А. Коршунаў; Литература периода барокко / Сааўт. А. Мальдзіс; Литература древней Руси; Литература XIV — начала XVI в.; Предпосылки гуманизма в Белоруссии; Поэзия [Литература XVI — первой половины XVII в.); Симеон Полоцкий; Переводная литература XV—XVII вв. // История белорусской дооктябрьской литературы. Мн.; Калі памёр Васіль Вашчыла? // ЛіМ. 29 ліп.

1978. Литература 16 — 1-й пол. 17 века // Белорусская советская социалистическая республика. Мн. / Сааўт. А. Коршунаў; Литература 14—15 веков // Белорусская советская социалистическая республика. Мн.

1979. Франциск Скорина и становление белорусской литературы // Белорусский просветитель Франциск Скорина и начало книгопечатания в Белоруссии и Литве. М.; Мясцовае летапісанне Беларусі XVII—XVIII стст.: (Магілёўск. хроніка) // Весці АН БССР. Сер. грамад. н. № 4; Магілёўская хроніка // Голас Радзімы. 22 ліст.

1980. Ад Скарыны да Марашэўскага: [Рэц. на кн.: Конон В. От ренессанса к классицизму. Мн., 1978] // Голас Радзімы. 22 мая; Жывая спадчына: [Рэц. на кн.: Белорусский просветитель Франциск Скорина и начало книгопечатания в Белоруссии и Литве. М., 1979] // Там жа. 21 жн.; Неўміручая спадчына паэта // Звязда. 23 снеж.

1981. Гістарыяграфія беларуска-літоўскага летапісання (дасавецкі перыяд) // Книга в Белоруссии. Мн.; Работа автора первого белорусско-литовского свода над русскими источниками // Летописи и хроники, 1980 г. В. Н. Татищев и изучение русского летописания. М.; Вялікі паэт Беларусі эпохі Адраджэння // Весці АН БССР. Сер. грамад. н. № 2; Летапісец роднай гісторыі // Голас Радзімы. 19 сак.

1984. На пачатку ўсходнеславянскага кнігадруку: [Рэц. на кн.: Иван Федоров и восточнославянское книгопечатание. Мн., 1984] // Весці АН БССР. Сер. грамад. н. № 5.

1985. Уводзіны / Сааўт. М. Лазарук; Літаратура старажытнай Русі; Літаратура XIV — пачатку XVI ст.; Перадумовы гуманізму на Беларусі; Перакладная літаратура // Гісторыя беларускай літаратуры: Стара-

жытны перыяд. Мн.; Белорусская литература // История всемирной литературы: В 9 т. Мн. Т. 3; Неўміручая песня старажытнай Русі // Маладосць. № 9; Непаўторная песня славянскай паэзіі // Звязда. 22 снеж.; Найбольшае яго захапленне // ЛіМ. 19 крас.

1.5.

На англійскую мову. Francisk Skorina. Paris, 1980 / Сааўт. Г. Галенчанка, В. Шматаў. Рэц.: Шалькевіч В. О Скорине — зарубежному читателю // Неман. 1982. № 210.

На французскую мову. Francisk Skorina / Trad. G. Gache. Paris, 1979 / Сааўт. Г. Галенчанка, В. Шматаў. Рэц.: Дышыневіч В. Франциск Скорина по-французски // Знамя юности. 1979. 17 чэрв.; Казыра Л. [«Кнігапіс»] // ЛіМ. 1979. 8 чэрв.; Шалькевіч В. Выданні ЮНЕСКА пра Скарыну // Голас Радзімы. 1982. 12 жн.

1.6.

Гісторыя беларускай дакастрычніцкай літаратуры: У 2 т. Т. 1. З старажытных часоў да канца XVIII ст. Мн., 1968 / Рэд. з В. Барысенкам і інш.

История белорусской дооктябрьской литературы. Мн., 1977 / Рэд. з В. Барысенкам і Ю. Пшырковым.

Дорошкевич В. Новолатинская поэзия Белоруссии и Литвы: Первая половина XVI в. Мн., 1979 / Рэд.

Мальдзіс А. На скрыжаванні славянскіх традыцый: Літаратура Беларусі пераходнага перыяду (другая палавіна XVII—XVIII ст.). Мн., 1980 / Рэд. з Ю. Пшырковым.

Слова пра паход Ігаравы — Слово о полку Игореве. Мн., 1986 / Скл.

Францыск Скарына: Зб. дакументаў і матэрыялаў. Мн., 1988 / Рэд. з Я. Ісаевічам.

Спадчына Скарыны: Зборнік матэрыялаў першых Скарынаўскіх чытанняў (1986). Мн., 1989 / Рэд. з Г. Галенчанкам і У. Кононам.

Скарына і яго эпоха. Мн., 1990 / Рэд.

Скарына Ф. Творы: Прадмовы, сказанні, пасляслоўі, акафісты, пасхалія. Мн., 1990 / Рэд.

Немировский Е. Л. Франциск Скорина. Жизнь и деятельность белорусского просветителя. М., 1990 / Рэд.

Гайдук М. Паратунак: Гістарычныя эсэ. Мн.; 1993 / Рэд.

Галенчанка Г. Францыск Скарына — беларускі і ўсходнеславянскі першадрукар. Мн., 1993 / Рэд.

Кісялёў Г. Ад Чарота да Багушэвіча. Праблемы крыніцазнаўства і атрыбуцыі беларускай літаратуры XIX ст. Мн., 1993 / Рэд.

Кніга жыцій і хаджэнняў. Мн., 1994 / Рэд.

Ад Полацка і Нясвіжа да Падуі і Венецыі. Da Polask e Niesvij a Padova e Venezia. Мн., 1994 / Рэд. з А. Мальдзісам і А. Разанавым.

2.3.

На беларускай мове. Гайдук М. Улюбёны ў летапісы // Ніва. 1979. 10 кастр.; Калеснік У. Адчараваныя скарбы // Полымя. 1969, № 6; Рагуля А. Праз вякі // ЛіМ. 1978. 20 студз.; Усікаў Я. Сталасць даследчыцкай думкі // Звязда. 1978. 2 чэрв.

На рускай мове. Буланин Д. Древняя белорусская литература в «Истории белорусской дооктябрьской литературы» // Рус. литература. 1979, № 3; Улащик Н. Введение в изучение белорусско-литовского летописания. М., 1985. С. 25—27.

В. І. Козіч.

ЧАПЕГА УЛАДЗІМІР

Чапега Уладзімір Пятровіч (н. 18.6.1939, в. Сялец Брагінскага р-на Гомельскай вобл.), перакладчык. Член СП Беларусі з 1982.

Нарадзіўся ў сям'і калгаснікаў. Сярэднюю адукацыю атрымаў у Брагінскай школе № 1. У 1961 скончыў Мінскі педагагічны інстытут замежных моў, у 1973 — Данецкае вышэйшае ваенна-палітычнае вучылішча. Працоўны шлях пачаў асістэнтам на кафедры граматыкі і гісторыі нямецкай мовы Мінскага педінстытута замежных моў. Пазней стаў ваенным перакладчыкам (служыў у Германіі і Беларусі). Быў выкладчыкам Мінскага суворaўскага вучылішча, сакратаром партыйнай арганізацыі, прапагандыстам у вайсковых часцях. Пасля 26 гадоў службы ў арміі звольніўся ў 1988 маёрам. У 1964 ажаніўся ў Германіі з Гундулай Рандаў, перакладчыцай з беларускай на нямецкую мову.

Перакладам беларускай прозы на нямецкую мову У. Чапега пачаў займацца ў канцы 1960-х гадоў. Першыя пераклады апублікаваны ў анталогіі

беларускага апавядання «Буслы над балотамі», выдадзенай у ГДР (1971). Дзякуючы яму нямецкі чытач пазнаёміўся з творамі Я. Брыля, В. Быкава, П. Галавача, М. Зарэцкага, К. Крапівы, І. Мележа, Я. Нёманскага, Я. Скрыгана і інш. Некаторыя з іх увайшлі ў анталогію класічнага беларускага апавядання «Малады дубок» (Лейпцыг, 1987). Сваёй дзейнасцю пісьменнік уносіць значны ўклад у папулярызацыю беларускай літаратуры і фальклору ў нямецкамоўных краінах. Творы беларускіх майстроў слова перадаюцца ім з вялікай увагай да слова, удумліва і кваліфікавана. Перакладае таксама з нямецкай на беларускую мову. У друку У. Чапега выступае ў сааўтарстве з Гундулай Чапега, яе братам літаратуразнаўцам і перакладчыкам Норбертам Рандаў і інш.

Жыве ў г. Нойстрэліц, ФРГ. *Л. А. Бялевіч.*

Бібліяграфія

1.4.

Melesh I. Menschen im Sumpf: Roman / Aus dem Belorus. Berlin, 1974 / Сааўт. пер. Г. Бярозка, Г. Чапега.

Bykau W. Verrat: Novelle / Aus dem Belorus. Leipzig, 1978.

Bykau W. Der Obelisk; Sein Batalion: Novellen / Aus dem Belorus. Berlin, 1980 / Сааўт. пер. Н. Рандаў, Г. Чапега, Г. Лёфлер.

Der Alte Bär sitzt auf dem Klotz: Belorussisches Volkslied / Aus dem Belorus. Mn., 1980.

Jakimowitsch A. Die schlaue Füchsin: Belorus. Volksmärchen / Aus dem Belorus. Mn., 1980.

Witka W. Der Flüstergeist: Volkslieder für Kinder aus Belorussland / Aus dem Belorus. Mn., 1980.

Jakimowitsch A. Der goldene Apfelbaum: Belorussisches Volksmärchen / Aus dem Belorus. Mn., 1981.

Kater Maxim: Belorussisches Volksmärchen / Aus dem Belorus. Mn., 1981.

Witka W. Der Flüstergeist: Kinderreime aus Belorussland / Aus dem Belorus. Mn., Bayreuth, 1982.

Ота Г. Пара ў дарогу, буслы: Раман / З ням. Мн., 1982 / Сааўт. пер. Я. Семяжон.

Аменда А. Апасіяната: З жыцця Людвіга ван Бетховена: Раман / З ням. Мн., 1983 / Сааўт. пер. Г. Чапега.

Karatkewitsch U. Land unter weitssen Flügeln / Aus dem Belorus. Mn., 1983.

Kudrawets A. Gotengedenken / Aus dem Belorus. Berlin., 1983 / Сааўт. пер. Н. Рандаў, Г. Чапега.

Andrej der Allerklügste: Eine Sammlung belorussischer Volksmärchen / Aus dem Belorus. Mn., 1986 / Сааўт. пер. Г. Чапега.

Belorussische Volksmärchen / Aus dem Belorus. Mn., 1986 / Сааўт. пер. Г. Чапега.

Франк Л. Ісусавы вучні: Раман / З ням. Мн., 1989 / Сааўт. пер. Г. Чапега.

Lasarew W. Italieniche Maler der Renaissance /Aus dem Rus. Dresden, 1990 / Сааўт. пер. Н. Рандаў, Г. Чапега.

1971. Zjotka. Herbstblätter; Njomanski J. Romeo und Julia in Belorussland; Krapiwa K. Nachbarsleute; Sarezki M. Die Krebsmühesteine; Das Poem von den schwarzen Augen / Сааўт. пер. Г. Чапега; Kawal W. Ilka / Сааўт. пер. Г. Бярозка; Halawatsch P. Knak; Kaljuha L. Die zu eng gewordene Jacke; Bryl J. Um Mitternacht / Aus dem Belorus. // Störche über den Sümpfen. Berlin. / Сааўт. пер. Г. Чапега.

1973. Штадэ М. Блакітны «цэпелін»: Апавяданне / З ням. // Незабыўны дзень. Мн.

1975. Bykau W. Der Obelisk / Aus dem Belorus. // Erlesenes 2: Novellen. Berlin / Сааўт. пер. Г. Чапега, Н. Рандаў.

1985. Гэрмлін Ш. Вячэрняе святло: [Апавяданне] / З ням. // Далягляды. Мн. *Т. М. Махнач.*

ЧАРГІНЕЦ МІКАЛАЙ

Чаргінец Мікалай Іванавіч (н. 17.10.1937, Мінск), празаік, публіцыст. Член СП Беларусі з 1978, Саюза журналістаў Беларусі з 1973. Кандыдат юрыдычных навук (1977). Заслужаны работнік МУС СССР (1977). Генерал-лейтэнант унутранай службы (1993). Піша на рускай мове.

Нарадзіўся ў Мінску ў сям'і рабочага. Пасля заканчэння СШ № 13 г. Мінска (1955) М. Чаргінец быў залічаны ў Мінскую футбольную школу моладзі, а ў 1957 у футбольную каманду «Спартак» (Мінск). Выступаў за футбольныя каманды «Лакаматыў» (Вінніца), «Малдова» (Кішынёў), «Ураджай» і «Беларусь» (Мінск), «СКА» (БВА). Скончыў Вышэйшую школу трэнераў Беларускага інстытута фізічнай культуры (1963). У 1963 уступіў у кампартыю. Працаваў рэгуліроўшчыкам Мінскага прыборабудаўнічага завода імя Леніна (1963—64). У 1963 паступіў на завочнае аддзяленне факультэта журналістыкі БДУ, з 2-га курса перавёўся на юрыдычны факультэт, які закончыў у 1969. У 1964 накіраваны на работу ў крымінальны вышук Савецкага райаддзела ўнутраных спраў г. Мінска. Працаваў начальнікам крымінальнага вышуку Савецкага (1967—69), намеснікам начальніка Першамайскага (1969—73), начальнікам Ленінскага (1973—75) райаддзелаў унутраных спраў г. Мінска, намеснікам начальніка ўпраўлення ўнутраных спраў Мінгарвыканкома (1975—81), начальнікам Упраўлення крымінальнага вышуку МУС БССР (1981—84). У 1984—87 быў у Афганістане, прымаў удзел у баявых дзеяннях, быў паранены. З 1987 начальнік Беларускага ўпраўлення ўнутраных спраў на транспарце МУС Беларусі. У 1990—91 член ЦК КПБ. З 1993 старшыня Камітэта па сацыяльнай абароне ваеннаслужачых пры Савеце Міністраў РБ. Узнагароджаны ордэнам Чырвонага Сцяга, двума ордэнамі Чырвонай Зоркі, вышэйшым афганскім ордэнам «Чырвоны Сцяг», Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета Беларусі.

Журналісцкай дзейнасцю М. Чаргінец пачаў займацца з 1963. Выступаў з артыкуламі па прафілактыцы правапарушэнняў і інтэрв'ю на старонках газет «Советская Белоруссия», «Знамя юности», «Правда». Яго першая дакументальная аповесць «Чацвёрты след» апублікавана ў 1973. Аповесці і раманы М. Чаргінца напісаны звычайна ў жанры дэтэктыва. Матэрыял, якім карыстаецца аўтар, асабістая жыццёвая практыка даюць яму магчымасць будаваць востразаймальныя напружаныя сюжэты. Выкрывае паразітычныя, злачынныя элементы нашага грамадства, паказвае характары, побыт, складаную і небяспечную службу работнікаў міліцыі ў гады вайны і мірны час. Яго творы «Трывожная служба», «Следства працягваецца», «Служба — дні і ночы», «Вам — заданне», «За секунду да стрэлу», «Загад № 1» і інш. публікаваліся ў часопісе «Неман», выходзілі асобнымі выданнямі. Вынікам знаходжання ў Афганістане стала кніга «Тайна Чорных Гор», раман «Сыны» (ганарар за яго аўтар перадаў на дапамогу інвалідам афганскай вайны). Адзін з аўтараў працы «Прафілактыка правапарушэнняў» (разам з В. Піскаровым, А. Белавусам). Неаднаразовы пераможца рэспубліканскіх літаратурных конкурсаў «Мая міліцыя» МУС БССР, Саюза пісьменнікаў і Саюза журналістаў БССР, лаўрэат Усесаюзнага конкурсу дэтэктыўнай і прыгодніцкай літаратуры (1978). У 1990 за раман «Сыны» ўзнагароджаны сярэбраным медалём імя А. Фадзеева.

Жыве ў Мінску.

Л. С. Савік.

Бібліяграфія

1.2.

Четвертый след: Докум. повесть / Лит. зап. Э. Найденова. Мн., 1973. Рэц.: Белоус А. По обе стороны незримой черты // Сов. Бел. 1973. 19 авг.; Маслоўскі Р. Людзі мужнай прафесіі // Звязда. 1973. 5 вер.

Тревожная служба: Записки сотрудника милиции. Мн., 1975.

Следствие продолжается: (Докум. повесть). Мн., 1977.

Профилактика правонарушений. Мн., 1978 / Сааўт. В. Піскароў, А. Белавус.

Финал Краба: Повесть. Мн., 1979. Рэц.: Вішнеўскі І. Кнігапіс // ЛіМ. 1979. 28 вер.

Служба — дни и ночи: Повести. Мн., 1981. Рэц.: Шыловіч Г. Слова пра вартавых правапарадку // Звязда. 1981. 9 крас.

Вам — задание: Роман. Мн., 1982. Рэц.: Быков В. Наука побеждать // ЛГ. 1983. 4 мая; Якубович П. За днем бегущим // Знамя юности. 1982. 16 июля.

За секунду до выстрела: Роман. Кн. 2. Мн., 1983. Рэц.: Громов Н. Момент истины // Знамя юности. 1984. 6 марта.

Приказ № 1: Повесть. Мн., 1985. Рэц.: Салаўёў М. У незабыўным семнаццатым // Вяч. Мінск. 1985. 18 ліст.; Якубович П. Минск, 1917... // Знамя юности. 1985. 25 июня.

Следствие продолжается; Финал Краба: Повести. Мн., 1986.

Тайна Черных Гор: Роман. Мн., 1987.

Приказ № 1: Повесть. Мн., 1988.

Сыновья: Роман. Мн., 1989.

За секунду до выстрела: Роман-дилогия. М., 1992.

1.3.

1974. Свадьбы в среду не будет: Повесть // Неман. № 12; Дзейнічаць актыўна, сумесна // Вяч. Мінск. 18 кастр.; Далеко не семейное дело // Правда. 20 июня.

1977. Следствие продолжается: Повесть // Неман. № 3, 4; Ценное пособие: [Рэц. на кн.: Законодательные акты об административной ответственности. Мн., 1977] // Сов. Бел. 16 авг.

1979. Сутнасць крымінальнай адказнасці // Беларусь. № 4; Догадка майора Ветрова: Повесть // Неман. № 5; Любить человека: [Інтэрв'ю] / Зап. А. Радуцкий // Знамя юности. 4 нояб.; Трудная должность // Сов. Бел. 29 сент.

1980. Галасы з падзямелля: Урывак з кнігі «Новая служба Славіна» // Звязда. 6, 9, 10 снеж.

1981. Самы галоўны сакрэт: [Інтэрв'ю] / Зап. М. Харытонаў // Звязда. 1 ліст.; «Бороться за доброту»: [Інтэрв'ю] / Зап. В. Лапин // Знамя юности. 13 марта; Вам — задание: (Отрывки из романа) // Там жа. 28 июля — 9 авг.

1983. За секунду до выстрела: Роман // Неман. № 6—8. Рэц.: Марцінавіч А. Па закліку сэрца і сумлення // ЛіМ. 1983. 9 вер.; Пра іх мае кнігі // ЛіМ. 11 ліст.

1985. Приказ № 1: Роман // Неман. № 4—6. Рэц.: Марцінавіч А. Мінск, трывожны семнаццаты // ЛіМ. 1985. 13 вер.

1.5.

На беларускую мову. Тайнік у ціхім завулку: Аповесці / Пер. У. Рубанаў. Мн., 1992.

На іспанскую мову. La orden nr. 1: Novela / Trad del rus. C. Sherman. Mn., 1990.

На літоўскую мову. Tardymas tęsiamas; Krabo finalas: Apysakos / Vert. A. Banevičius. Vilnius, 1984.

Krabo finalas: Apysaka // Vak. naujienos. 1983. Kovo 29 — bal. 14, bal. 17 — geg. 14.

2.3.

На беларускай мове. Быкаў В. Мікола Чаргінец // Быкаў В. Праўдай адзінай. Мн., 1984; Марці-

новіч А. Служба дні і ночы // ЛіМ. 1982. 3 вер.; Пісьменнікі Савецкай Беларусі: Кароткі даведнік. Мн., 1981.

На рускай мове. Быков В. [Уступнае слова] // Чергинец Н. Финал краба. Мн., 1979; Матуковский Н. Перевернута последняя страница... // Чергинец Н. За секунду до выстрела. Мн., 1983; Миронов А. Не писательская «придумка» // Сов. Бел. 1977. 14 дек.; Тимошенко И. [Уступны артыкул] // Чергинец Н. Тревожная служба. Мн., 1975; Чигринов И. Предисловие // Чергинец Н. Служба дни и ночи. Мн., 1981. *Т. М. Махнач.*

ЧАРКАЗЯН ГАНАД

Чарказян Ганад Бадрыевіч (псеўд. Торне Бадр, н. 18.10.1946, в. Ерасхаун Акцембяранскага р-на, Арменія), паэт, празаік. Піша на курдскай, армянскай і рускай мовах. Член СП Беларусі з 1988.

Нарадзіўся ў сялянскай сям'і. Бацькі маці ў 30-я гады былі асланы ў Сібір, дзе і загінулі. Бацька ўдзельнічаў у баях за вызваленне Беларусі ў час Вялікай Айчыннай вайны. У 1966 Г. Чарказян скончыў 11 класаў Маркарынскай сярэдняй школы ў Арменіі. Вучыўся ў тэхнічным вучылішчы № 1. г. Ерэвана (1967—68). Пераехаўшы ў г. Туапсе Краснадарскага краю, працаваў токарам на суднарамонтным заводзе (1968—69). Служыў у Савецкай Арміі (1969—71). Пасля дэмабілізацыі працаваў выхавацелем прафесійна-тэхнічнага вучылішча № 27 у г. Эчміадзін (Арменія, 1971—73). У 1973, ажаніўшыся з беларускай, пераехаў у Мінск. Працаваў ст. тэхнікам у Беларускім дарожным навукова-даследчым інстытуце (1973—74), інжынерам па каштарысах рамонтна-будаўнічага ўпраўлення № 10 (1974—79), начальнікам участка рамонтна-будаўнічага ўпраўлення № 15 (1979—82). Завочна скончыў індустрыяльна-педагагічны тэхнікум у Ерэване (1975), будаўніча-педагагічны факультэт Беларускага політэхнічнага інстытута (1984). З чэрвеня 1982 інжынер-тэхнолаг мінскага ўчастка слонімскай фабрыкі «Гасцінічная мэбля». З 1993 загадчык аддзела маркетынгу выдавецтва «Мастацкая літаратура».

Першы верш Г. Чарказяна «Зіма, стары і кажух» апублікаваны ў 1963 у часопісе «Піянер» (Ерэван). У Беларусі першая публікацыя — верш «Смутак Хатыні» (у перакладзе Ф. Яфімава з армянскай на рускую мову) — з'явілася ў 1977 у часопісе «Неман». Першыя апавяданні Г. Чарказяна на рускай мове ўбачылі свет у 1978 (газета «Во славу Родины»). Яго вершы друкаваліся ў армянскім часопісе «Гарун», газеце «Рйа таза», у маладзёжных выданнях Арменіі, у беларускіх калектыўных зборніках «Братэрства», «Беларусь — маё слова і песня», замежнай перыёдыцы. У перакладзе на рускую мову выйшлі зборнікі паэзіі Г. Чарказяна «Трываласць», «Колер дабрыні», «Прастора і час». Лірычны герой паэта — наш сучаснік, малады будаўнік, улюбёны ў сваю справу. Шмат вершаў Г. Чарказяна прысвечана Арменіі і Беларусі, сяброўству, каханню. Піша казкі для дзяцей (у калектыўным зборніку на рускай мове «Арэшак Ціхоня»).

Жыве ў Мінску.

Г. М. Урупіна.

Бібліяграфія

1.3.

1963. Зіма, стары і кажух: [Верш] // Піянер (Ерэван). № 2 / Арм.

1973. Туга; Сябар; Сон: [Вершы] // Гарун. № 11 / Арм.; Фатаграфія: [Верш] // Рйа таза. 12 лют. / Курд.; Восень: [Верш] // Там жа. 24 мая / Курд.; Раніца: [Верш] // Там жа. 16 вер. / Курд.; Чаканне: [Верш] // Там жа. 18 жн. / Курд.

1974. Вяртанне: [Верш] // Рйа таза. 17 лют. / Курд.; Музыка: [Верш] // Там жа. 2 сак. / Курд.; Пяшчотнасць: [Верш] // Там жа. 26 сак. / Курд.

1975. Зіма; [Верш] // Авангард. 9 лют. / Арм.;

Месяц: [Верш] // Там жа. 13 жн. / Арм.; Паварот: [Верш] // Там жа. 20 вер. / Арм.; Школа: [Верш] // Рйа таза. 2 сак. / Курд.; Дарога: [Верш] // Там жа. 14 лют. / Курд.; Поле; Дождж: [Верш] // Там жа. 5 чэрв. / Курд.; Вышыня: [Верш] // Там жа. 21 ліст. / Курд.

1976. Шагі: [Верш] // Авангард. 23 студз. / Арм.; Дарога: [Верш] // Рйа таза. 18 мая / Курд.; Звязда: [Верш] // Там жа. 12 жн. / Курд.; У гасцях: [Верш] // Там жа. 24 ліст. / Курд.

1977. Усталасць; Сонца; Арагац: [Вершы] // Гарун. № 3. / Арм.; Вяртанне: [Верш] // Рйа таза. 28 снеж. / Курд.

1978. Объятие: [Верш] // Во славу Родины. 21 мая; Зеленый дождь: Рассказ // Там жа. 3 сент.; Строевые занятия: Юмореска // Там жа. 19 нояб.

1979. Рабочий: Лирическая баллада // Во славу Родины. 3 июня; ...Присяги слова стали частью моей: [Вершы] // Там жа. 29 июля; Марш-бросок: [Верш] / Там жа. 15 сент.; Тайна красоты: [Верш] // Там жа. 30 сент.; Лирика: [Вершы] // Там жа. 28 окт.

1980. Пора подснежников: [Верш] // Во славу Родины. 6 янв.; «Дядя» приехал: (Рассказ) // Во славу Родины. 12 окт.; На подъеме: Рассказ // Там жа. 4 нояб.

1981. Моя книга; Крылья; Объятие; Березовый сок: [Вершы] // Зн. юности. 20 февр.; Воспоминание о раненой весне: [Верш] // Во славу Родины. 14 авг.; На посту: [Верш] // Там жа. 16 авг.; Одно из двух: [Апавяданне] // Знамя юности. 30 окт.; Гвоздь: [Апавяданне] // Там жа. 25 дек.

1982. Партизанский бор: [Верш] // Во славу Родины. 28 нояб.; Совесть: [Апавяданне] // Знамя юности. 12 марта; Гимнастёрка: [Верш] // Там жа. 9 мая; «Дядя» приехал: [Апавяданне] // Там жа. 3 сент.; Воспоминание; «Опять тебе мерещится дорога...»; «Прежде чем сорвать белую гвоздику...»; «Истин немного и всем известны...»: [Вершы] // Там жа. 15 сент.; Он и она: [Апавяданне] // Там жа. 24 сент.; «Писатель»: [Апавяданне] // Там жа. 22 окт.

1983. 21 июня; «Хочу, чтоб солнце дымом не закрылось...» [Вершы] // Знамя юности. 25 июня; Строевые занятия: [Апавяданне] // Там жа. 8 июля; «В окнах казармы Монкада...»: [Верш] // Там жа. 26 июля; Слова; Как пишутся стихи: [Вершы] // Там жа. 9 окт.

1.5.

На беларускую мову. Лонг Кеш; «На вайне — не дзіва — забівалі...»; «Якая ў бярозы пяшчота...»; «Птушыныя праз сон...»; «Лёгкі туман закудрыўся над снягамі»: [Вершы] / Пер. з курд. А. Вольскі // Братэрства. Мн., 1985.

На рускую мову. Прочность: Стихи / Пер. с арм. В. Липневич. Мн., 1980. Рэц.: К а н э Ю. «Кто выстоит, не сломается...» // Знамя юности. 1981. 2 окт.

Цвет доброты: Стихотворения / Пер с курд. Ф. Ефимов. Мн., 1986.

Пространство и время: Кн. поэзии / С курд. Мн., 1990.

Обожженные жаворонки: Стихи / С курд. Мн., 1992.

Скорбь Хатыни: [Верш] / Пер. с арм. Ф. Ефимов // Неман. 1977. № 6; Моя книга: [Вершы] / Пер. с арм. В. Липневич // Там жа. 1977. № 11; Обожженные жаворонки: [Верш] / Пер. с арм. В. Липневич // Рабочая смена. 1977. № 12; Прочность: [Вершы] / Пер. с арм. В. Липневич // Неман. 1978. № 5; В объятии одном земля и человек: [Вершы] / Пер. с курд. авт. // Во славу Родины. 1978. 23 дек.; В строю остаюсь навсегда: Проверка; Гимнастёрка; Расставание: [Вершы] / Пер. с арм. Д. Дворниченко // Там жа. 1979. 8 апр.; В строю остаюсь навсегда: [Вершы] / Пер. с арм. Д. Дворниченко // Там жа. 1979. 8 апр.; Сыновий долг: [Верш] / Пер. с арм. Д. Дворниченко // Там жа. 1979. 25 нояб.; Солдат победы: [Верш] / Пер. с арм. В. Жданович // Там жа. 1980. 8 июня; «Спой мне, соловушка, спой...»; Оружие; Стойкость; Кто бы помог?...: [Вершы] / Пер. с курд. Ф. Ефимов // Знамя юности. 1982. 17 янв.; Пора подснежников; Первая ласточка; Мечта; Песня: [Вершы] / Пер. с арм. В. Липневич // Там жа. 1982. 18 июля; Из новой книги стихов: «Ты спишь...»; «Всему приходит свой черед...»; «Ты ждёшь меня, не знаю...»; «Звенят лучи, течёт со стрех...»: [Вершы] / Пер. с курд. Ф. Ефимов // Там жа. 1982. 17 окт.; Свет в окне: [Вершы] / Пер. с арм. Ф. Ефимов // Неман. 1983. № 11; Зелёный дождь: Рассказ / Пер. с курд. авт. // Знамя юности. 1983. 26 янв.; «Цеплялась за густую крону...»; Парадоксы пути; «В мышленьи не бывает перерыва...» / Пер с курд. Ф. Ефимов; С дочкой у окна / Пер. с арм. В. Липневич: [Вершы] // Там жа. 1983. 21 апр.; «Как твой голос отдален от слова...»; «Доброе утро, осень!..»; Стекло: [Вершы] / Пер. с курд. авт. // Там жа. 1984. 2 марта; О любви; Строится метро; Расставание; «Ты взором путь свой мысленно окинешь...»; «Утренний покой и тишина...»: [Вершы] / Пер. с курд. Ф. Ефимов // Там жа. 1984. 6 июля.

2.3.

На рускай мове. Б р о в к а П. О самом главном: [Прадмова] // Чарказян Г. Прочность. Мн., 1980; Я г о ж. [Уступ да вершаў] // Неман. 1977. № 11.

Т. М. Махнач.

ЧАРКАСАЎ АНАТОЛЬ

Чаркасаў Анатоль Паўлавіч (н. 28.11.1928, г. Новагеоргіеўск, цяпер Светлаводск Кіраваградскай вобл., Украіна), празаік, нарысіст, перакладчык, крытык. Член СП Беларусі з 1969.

Нарадзіўся ў сям'і служачых. У 1933—35 сям'я жыла ў Крэменчугу, потым у Палтаве, куды ў 1935 бацьку пісьменніка накіравалі на службу ў часцях Чырвонай Арміі. Тут А. Чаркасаў скончыў 5 класаў сярэдняй школы. Перад вайной сям'я пераехала ў Харкаў (новае месца службы бацькі), а потым эвакуіравалася на Паволжа; бацька пайшоў на фронт. На ст. Алтата Саратаўскай вобл. А. Чаркасаў пачаў працаваць на складзе боепрыпасаў вучнем столяра, пазней — электраманцёрам. У час выбуху быў цяжка паранены — страціў абедзве рукі і нагу, але не скарыўся лёсу. Пасля лячэння ў шпіталі жыў у Краснадары, а потым пераехаў да бацькі ў Бабруйск. З 1948 у Мінску. Скончыў сямігодку, Мінскі бібліятэчны тэхнікум (1951) і аддзяленне журналістыкі філалагічнага факультэта БДУ (1956). Літаратурна-журналісцкую дзейнасць пачаў у Дзяржаўным выдавецтве БССР, дзе прайшоў шлях ад карэктара (1956—57) да рэдактара (1957—64). Пазней быў на розных пасадах у выдавецтвах «Беларусь» (1967—72), «Мастацкая літаратура» (1972—86), «Юнацтва» (1986—89).

Першы грунтоўны твор А. Чаркасава, нарыс «На станкабудаўнічым», надрукаваны ў 1957. Пісьменніка заўсёды цікавіла тэхніка, таму і характар яго твораў у асноўным навукова-папулярны. У кнігах «Балотны скарб», «Цудоўны камень» аўтар шчыра і пранікнёна расказаў юным чытачам аб прыродных багаццях Беларусі, аб прафесіях геолага, будаўніка, шахцёра, пра важныя адкрыцці ў навуцы і тэхніцы. У наступных кнігах, «Волаты на дарогах» і «Старонкі слаўнага летапісу», А. Чаркасаў пацвердзіў свой талент папулярызатара навукі. Плённа працуе пісьменнік і ў жанрах мастацкай прозы, публіцыстыкі, дакументальнага кіно. Па яго сцэнарыях пастаўлены фільмы «Мазырскі ліст», «Наш завод — наш дом» і інш. Займаецца таксама перакладамі з рускай, украінскай і іншых моў.

Жыве ў Мінску.

Л. А. Бялевіч.

Бібліяграфія

1.2.

Балотны скарб. Мн., 1959. Рэц.: Бечык В. Скарб нашых балот // ЛіМ. 1960. 9 крас.; Гордышева З. Рассказ о болотном кладе // Сел. жизнь. 1960. 26 мая.

Цудоўны камень. Мн., 1963. Рэц.: Жычка Х. Не толькі для дзяцей // ЛіМ. 1964. 10 крас.; Скабинский С. // Сел. газ. 1964. 3 июня.

Старонкі слаўнага летапісу. Мн., 1964 (Б-чка камсамольца-школьніка).

Магутны твой зямляк: [Нарыс]. Мн., 1969.

Волаты на дарогах: Нарыс. Мн., 1974.

Пашталь ён: Апавяданне ў малюнках. Мн., 1991.

На ўсе рукі майстар: Нарыс. Мн., 1993.

1.3.

1957. На станкабудаўнічым: [Нарыс] // Над краем спяваюць гудкі. Мн.; Выдадзена ў 1957-м // Піянер Бел. 22 сак.

1958. На малочным камбінаце: [Нарыс] // Бярозка. № 4; Балотныя скарбы // Там жа. № 10; Гісторыя адной дэталі // Там жа. № 12.

1960. Расказ аб цудоўным камені // Бярозка. № 8; Літаратура для дзяцей // Голас Радзімы. № 69.

1961. Працяг легенды // Бярозка. № 4; Цудоўныя памочнікі // Там жа. № 6.

1962. Другое нараджэнне // Бярозка. № 8.

1964. Супраць граду-гарматы // Голас Радзімы. № 33—34.

1971. Крэпасць на колах // Бярозка. № 12.

1972. Цяжкі дзень: Апавяданне // Бярозка. № 10.

1974. Тры фотаздымкі: Апавяданне // Бярозка. № 1.

1.4.

Звераў М. Там, дзе бялеюць палаткі юннатаў / З рус. Мн., 1958.

Івіч А. Трэба аб'ехаць краіну, забрацца пад зямлю і забрацца пад ваду, каб даведацца, як працай тысяча людзей і тысяча машын стваралася звычайная лямпа, якая асвятляе твой стол / З рус. Мн., 1959.

Жарыкаў Л. Аповесць пра суровага сябра / З рус. Мн., 1961 / Сааўт. пер. У. Шахавец.

Біянкі В. Клуб Калумбаў: [Аповесць] / З рус. Мн., 1962.
Васіленка І. Зялёны куфэрак / З рус. Мн., 1964 / Сааўт. пер. В. Лукін.
Андрэева К. Развенчаныя цуды / З рус. Мн., 1965 / Сааўт. пер. Я. Курто.
Чапек К. Казкі і вясёлыя гісторыі / З чэш. Мн., 1966 / Сааўт. пер. Я. Курто.
Прыляжаева М. Тры тыдні спакою: Аповесць / З рус. Мн., 1970.
Чаравікі-самаскокі: Англійская народная казка. Мн., 1972 (Казка за казкай).
Каштоўны каменьчык: Балгарская народная казка. Мн., 1973 (Казка за казкай).
Дрофань А. Загадка старой званіцы: Аповесць / З укр. Мн., 1974.
Ранап Я. Апошні арлан — Белае пяро: Аповесць / З эст. Мн., 1976.
Ярмыш Ю. Лятучае дрэва: Казкі / З укр. Мн., 1977.
1968. Багмут І. Кавалак пірага; Байдэбура П. Сын; Грымайла Я. Нямы; Гуцала Я. Стрэльба; Даўжэнка А. Воля да жыцця; Дзесняк А. Схільнасць; Дрозд У. Тры чароўныя пярліны; Забанацкі Ю. Бярозка; Капыленка А. Сярод лясоў; Сіманенка В. Дума пра дзеда; Шаўчук В. Аціла і Шэры: [Апавяданні] / З укр. // Матчын салодкі хлеб. Мн.
1974. Каваль і яго верная жонка; Дзіўнае імя; Браты-вандроўнікі; Дачка дрывасека; Сыны Нуржана; Храбры асёл: Казахскія народныя казкі / З каз. // Цудоўны сад. Мн.
1984. Багмут І. Кавалак пірага; Ярмыш Ю. Лятучае дрэва: [Апавяданні] / З укр. // Ад круч дняпроўскіх. Мн.
1985. Чарняк С. Экзамен на мужнасць: Нарыс / З укр. // Ад школьнага парога. Мн.
2.3.
На беларускай мове. Адрасуецца юнаму чытачу // Беларусь. 1978. № 11; Анатолю Чаркасаву — 50 // ЛіМ. 1978. 17 ліст.; Беларуская дзіцячая літаратура. 2 выд., дапрац. і дап. Мн., 1980. С. 109—110; Гальмакаў Д. Дзівоснае побач // ЛіМ. 1970. 14 жн.; Пісьменнікі Савецкай Беларусі: Кароткі даведнік. Мн., 1981. *Т. М. Махнач.*

ЧАРНОЦКІ НАПАЛЕОН

Чарноцкі Напалеон Ежы Якуб Казіміравіч (крыпт. Н. Ч.; 13.7.1866, маёнтак Нач-Брындзоўская Слуцкага пав. Мінскай губ., цяпер в. Нача Ляхавіцкага р-на Брэсцкай вобл.— 14.2.1937, в. Вялікая Лябёдка Лідскага пав. Віленскага ваяв., цяпер Шчучынскі р-н Гродзенскай вобл.), публіцыст, перакладчык. Пісаў на беларускай і польскай мовах.

Паходзіў з вядомага шляхецкага роду, выхоўваўся ў дэмакратычных і патрыятычных традыцыях. Скончыў Слуцкую гімназію (1887), быў членам самаадукацыйнага гуртка. У гэты ж час пазнаёміўся з рускай рэвалюцыйнай літаратурай, польскім сацыялістычным друкам. Некалькі гадоў працаваў бібліятэкарам школьнай бібліятэкі, у якой таксама ўтварыўся гурток. У 1889—95 вучыўся на медыцынскім факультэце Маскоўскага універсітэта, уваходзіў у тайныя студэнцкія гурткі сацыялістычнай накіраванасці, далучыўся да рэвалюцыйнага студэнцкага руху. За ўдзел у студэнцкіх хваляваннях у 1890 часова выключаны з універсітэта і сасланы пад нагляд паліцыі на радзіму, у маёнтак бацькі. З 1895 працаваў лекарам у Ліпнішках і Міры. Устанавіў сувязь з тайнай друкарняй сацыялістаў. У час расійска-японскай вайны 1904—05 быў як лекар мабілізаваны на Манчжурскі фронт. У 1908 эміграваў у Канаду і вярнуўся адтуль перад пачаткам першай сусветнай вайны. Быў узяты на вайсковую лекарскую службу. У 1918 пераехаў у Варшаву, з 1919 працаваў кватэрным інспектарам, потым жыў у Вільні, кіраваў Касай хворых. У 1922 уступіў у Польскую сацыялістычную партыю. З 1928 працаваў лекарам Касы хворых у Крамянцы на Валыні, а з 1931 — у Лідзе. У 1936 пакінуў лекарскую практыку і заняўся вырошчваннем зёлак у в. Вялікая Лябёдка (гэтую справу распачаў яшчэ ў эміграцыі ў Канадзе).

Першая літаратурная праца Н. Чарноцкага — удзел у 1885 у перакладзе гурткоўцамі Слуцкай гімназіі на беларускую мову папулярнай тады сацыялістычнай брашуры «Дзядзька Антон» і выданні яе гектаграфічным спосабам у Слуцку (выданне не выяўлена) і ў 1892 у Тыльзіце. Аўтар вядомых у свой час публіцыстычных прац «Як будзе з зямлёю?», «Да пытання пра беларускую народ-

ную школу», у якіх выступаў у абарону беларускай мовы, з сімпатыяй пісаў пра творчасць Я. Коласа, выявіў добрае веданне беларускага фальклору. Напісаў нарыс «Аб адбудове гістарычнай Літвы» (не выяўлена). Актыўна выступаў як перакладчык. Пераклаў на беларускую мову п'есы «Сватанне» А. Чэхава і «Пашыліся ў дурні» М. Крапіўніцкага. Аўтар успамінаў пра рэвалюцыйны рух. Захавалася некалькі лістоў Н. Чарноцкага да У. Караленкі, у якіх ён закранае пытанні перакладу яго апавяданняў, а таксама ліст у «Нашу ніву» з Канады ў 1912.

І. Э. Багдановіч, В. У. Скалабан.

Бібліяграфія

1.2.

Як будзе з зямлёю. Пб., 1907.

1.3.

1907. З Слуцкага ўезду: [Карэсп.] // Н. н. 25 студз. / Пад крыпт. Н. Ч.

1908. К вопросу о белорусской народной школе // Мин. курьер. 10 апр.

1912. З Канады: [Карэсп.] // Н. н. 21 чэрв.

1918. Што значыць пан, што мужык, а што хам // Вольная Беларусь. 7 крас.

1923. Przyczynki do historii PPS // Księga pamiątkowa PPS. Warszawa.

1925. Marian Abramowicz: (Wspomnienie pośmiertne) // Prz. Wileński. Nr I.

1983. Батлейкі з ваколіц Начы // Народны тэатр. Мн.

1.4.

Крапіўніцкі М. Пашыліся ў дурні / З укр. Пб., 1910 / Аўт. пер. спрэчнае.

Чэхаў А. Сватанне: Жарцік / З рус. Пб., 1910.

1918. Чэхаў А. Сватанне: Жарт у 1 акце / З рус. // Зборнік сцэнічных твораў. Мн. Сш. 2.

2.3.

На беларускай мове. Александровіч С. Пуцявіны роднага слова. Мн., 1971. С. 152, 160, 182—183, 191; Кабржыцкая Т., Рагойша В. Карані дружбы. Мн., 1976. С. 186—190; Каханоўскі Г. Таямніцы за Чортавым мостам // Маладосць. 1992. № 5; Скалабан В. Працяг гісторыі з «Дзядзькам Антонам» // Голас Радзімы. 1983. 18 жн.; Полымя. 1988. № 2.

На польскай мове. Turonek J. Wokół genezy «Dziadźki Antona» // Sl. Orient. 1983. Nr 3.

На рускай мове. Орехов А. Социал-демократическое движение в России и польские революционеры: 1887—1893 гг. М., 1973. С. 232.

3.1.

Нац. архіў Рэспублікі Беларусь, ф. 295, воп. 1, спр. 4895; ЦДГА Літвы, ф. 1135, воп. 4, спр. 394.

Т. М. Махнач.

ЧАРНУШЭВІЧ НІЧЫПАР

Чарнушэвіч Нічыпар Тодаравіч [Фёдаравіч, Хведаравіч; 1(14).11.1900, мяст. Капыль Слуцкага пав. Мінскай губ., цяпер г. п. Мінскай вобл.— 18.2.1967, Мінск, пахаваны на Усходніх могілках], паэт, перакладчык, драматург. Член СП Беларусі з 1957.

Паходзіў з беднай сялянскай сям'і. Брат пісьменніка М. Хведаровіча. У час першай сусветнай вайны знаходзіўся ў Калузе (вучыўся, жыў у пансіянаце для дзяцей бежанцаў). У 1917—20 настаўнічаў у Траянаўскім народным вучылішчы на Капыльшчыне. У 1922—28 вучыўся на гістарычным факультэце БДУ. Адначасова працаваў у школе малодшага каманднага і палітычнага складу 4-й Смаленскай дывізіі (1922—23), загадчыкам аддзела газеты «Савецкая Беларусь» (1924—29). Член літаратурнага аб'яднання «Маладняк». У 1926 разам з М. Модалем быў рэдактарам друкаванага органа беларускага студэнцтва «Голас студэнта». У 1929—30 слухач Вышэйшых навукова-педагагічных курсаў пры 2-м Маскоўскім універсітэце. Улетку 1930 Н. Чарнушэвіча арыштавалі, абвінаваціўшы ў «нацыянал-дэмакратызме, шпіянажы, тэроры, сувязях з міжнароднай буржуазіяй і шкодніцтве». 10.4.1931 прыгаварылі да 5 гадоў ссылкі ў г. Вятку (у жніўні 1935 абвінавачанні зняты, канчаткова рэабілітаваны ў 1960). У 1931—35 супрацоўнік газеты «Вятская правда» (пазней «Кировская правда»). У 1935—41 выкладчык гісторыі ў 8—10 класах 379-й і 395-й сярэдніх

школ г. Масквы. У кастрычніку 1941 эвакуіраваўся ў г. Цюмень; працаваў там загадчыкам аддзела ў рэдакцыі газеты «Тюменская правда», дзе друкаваў свае нарысы, вершы, сатыру. З 1947 жыў і працаваў у Мінску: начальнікам планавага аддзела Белсельгасснаба, з 1949 — выкладчыкам гісторыі Мінскай афіцэрскай школы, з 1952 старшым інжынерам трэста папяровай прамысловасці. У розныя гады працаваў у Беларускім дзяржаўным выдавецтве, на Беларускім радыё. Працяглы час (з 30-х гадоў) хварэў на сухоты.

Першыя вершы Н. Чарнушэвіч («Вясна», «Набягаючы дзень») апублікаваў у 1923. З гэтага часу і да 1930 стала друкаваўся ў часопісах «Полымя», «Маладняк», газеце «Савецкая Беларусь» і ў іншых перыядычных выданнях. Аўтар кніг паэзіі «Дзіва», «Нясу надзею», «Гаворка дум», п'есаў «Шукальнік вышыні», «Сям'я доктара Чыверса», кінааповесці «Арсенал пачуццяў». Творы Н. Чарнушэвіча апавядаюць пра месца чалавека на зямлі, сэнс жыцця. Асноўная іх мастацкая адметнасць — роздум, засяроджанасць на ўнутраным жыцці героя. Перакладаў на беларускую мову творы рускіх, украінскіх, яўрэйскіх паэтаў.

І. П. Чыгрын.

Бібліяграфія

1.1.

Выбр. вершы. Мн., 1975.

1.2.

Дзіва: Вершы. Мн., 1927. Рэц.: Б а р - к і С. // Чырв. сейбіт. 1927. № 14; В. З. Аб зборніку вершаў Н. Чарнушэвіча «Дзіва» // Узвышша. 1928. № 6; М. Гр. // Росквіт. Полацк, 1927; М. І. К. // Полымя. 1927. № 4.

Нясу надзею. Мн., 1962.

Гаворка дум: Вершы. Мн., 1966. Рэц. Г і л ь М. Песня дарогу знойдзе // ЛіМ. 1966. 1 ліст.

1.3.

1923. Вясна; Набягаючы дзень: [Вершы] // Полымя. № 3—4; Камсамольцам: [Верш] // Сав. Бел. 20 снеж.

1924. З цыкла: «Змаганне» «На, бура, жар адкрыты мой твар...»; «Волі я повен, шырацца грудзі...»: [Вершы] // Полымя. № 2; Пацеркі лета: [Верш] // Там жа. № 3; Ліпнёвы кругабег: [Верш] // Там жа. № 4; Вяснянак іскрыстых прадвесніка...: [Верш] // Радавая рунь. № 2; Пацеркі лета: [Верш] // Малады араты. 1 кастр.; На смерць У. І. Леніна: [Верш] // Сав. Бел. 25 студз.; З паэмы «Маёвы зажын» // Там жа. 1 мая.

1925. Рабочы: (З паэмы «Камсамолка»): [Верш]; Алесь Гурло, як паэт і грамадзянін: (Да 15-гадовага юбілею яго літаратурнай чыннасці) // Маладняк. № 6; Сацыяльныя матывы творчасці Алеся Гурло // Сав. Бел. 22 сак.; «Вецер заснуў у бяздонні...»: [Верш] // Там жа. 25 кастр.

1926. «Бацьку»; «Усё растала...»: [Вершы] // Маладняк. № 7—8; Заціхаюць бубны: [Верш] // Сав. Бел. 10 студз.; «А за бор, за бор, за даліну»: [Верш] // Там жа. 28 сак.; «За далямі — балотамі...»: [Верш] // Там жа. 4 крас.; Кажанамі палонены логі: [Верш] // Там жа. 11 крас.; Разлейся, вадзіца: [Верш] // Там жа. 25 крас. «Не трэба занадта слоў»: [Верш] // Там жа. 4 ліп.; «Калі скарга на вачах навісне?»: [Верш] // Там жа. 18 ліп.

1927. У два галасы: [Верш] // Маладняк. № 3.

1928. Голас прадвесня: [Верш] // Літ. дад. да газ. «Сав. Бел.» № 3.

1929. Душу мне апаліла дзяўчына: [Верш] // Сав. Бел. 27 студз.

1957. Мы не дазволім вайны!: [Верш] // Звязда. 3 жн.; Харaство: [Верш] // Калг. праўда. 28 чэрв.; Госць з Судана: [Верш] // Там жа. 11 жн.; Ляці...: [Верш] // Там жа. 18 кастр.

1958. Песня з Украіны: [Верш] // Полымя. № 7.

1960. «Што за дзіва бачым на прыгуменні...»; Магнолія: [Вершы] // Полымя. № 12.

1961. Магнолія; Ракета: [Вершы] // Анталогія беларускай паэзіі: У 3 т. Мн. Т. 2; Ветэран: [Верш] // Беларусь. № 4; Камуністка: [Верш] // Там жа. № 8; Ракета: [Верш] // Полымя. № 5; Нясу надзею: [Верш] // Там жа. № 10.

1962. «Надсеклі клён, каб сок салодкі даў ён...»; «Аднойчы нечакана быў я сведкам...»; Усё ці нічога: [Вершы] // Полымя. № 3; Размова з унукам: [Верш] // Там жа. № 7; «Кажаш, нешта страшнае...»: [Верш] // Там жа. № 12.

1963. Хто слыху не мае, нашто яму песня; Весяліцеся, смейцеся, хлопцы-малойцы: [Вершы] // Беларусь. № 3; Стратэг: [Верш] // Вожык. № 4; «Як сыходзіць з неба зорка...»; Дзве яблыні: [Вершы] // Полымя. № 5; Не ўсё, што жыве, старэе; «Сарамлівы, як дзяўчына, ранак...»: [Вершы] // Звязда. 14 ліп.

1965. Загадка: [Верш] // Дзень паэзіі — 65. Мн.

1966. Будучыня: [Верш] // Голас Радзімы. № 14; Звязда. 1 крас.; Зменлівы час...; Шчасце; Знічка; Добрай раніцы, нашая радасць!; Пошчак: [Вершы] // ЛіМ. 19 крас.

1967. «Без гучных напышлівых слоў...»: [Верш] // Дзень паэзіі — 67. Мн.; Зямля і Чалавек: [Верш] // Мы славім Леніна, мы славім партыю. Мн.

1969. Зямля і чалавек: [Верш] // Жыве між нас геній. Мн.

1971. Сонца пах: [Верш] // Універсітэт паэтычны. Мн.

1973. Аўтабіяграфія // Вытокі песні: Аўтабіяграфіі беларускіх пісьменнікаў. Мн.

1978. Буслы: [Балада] // Беларуская балада. Мн.; Агні: [Верш] // Сэрцам табе прысягаю. Мн.

1982. Янка Купала: [Верш] // Нам засталася спадчына. Мн.

1.4.

1948. П р а к о ф ' е ў А. Матрос у Кастрычніку; Клятва; «Як павялося з даўнасці сівое...»; Любачка; «Усё як ёсць вазьму, што ты дасі мне...»: [Вершы] / З рус. // Пракоф'еў А. Выбр. вершы. Мн.

1957. П л а т н е р А. Працаваў цалюткі дзень я...; Шолам-Алейхем: [Вершы] / З яўр. // Платнер А. Соль жыцця. Мн.; Б е л а у с Д. Відушчы крытык; Напралом: [Вершы] / З укр. // Полымя. № 9.

1958. М а ц к я в і ч у с Б. Таварышам; Ш ы р в і с П. Жалейка: [Вершы] / З літ. // Галасы сяброў. Мн.

1959. В а ц з е м н і е с к Л. Ліелупе; В а ц ы е ц і с О. Тост; Х е й с л е р Х. Дзяўчына спіць: [Вершы] / З лат. // Ветрык, вей! Мн.

1960. В і е р у Г. Хлеб: [Верш] / З малд. // Паэты сонечнай Малдовы. Мн.; Т э л е у к э В. Бярозы і зноў бярозы: [Верш] / З малд. // Зара. 21 вер.; ЛіМ. 2 жн.

1962. П у л а т Х. Я шчаслівы: [Верш] / З узб. // Спявае Узбекістан. Мн.

1966. П у л а т Х. Я шчаслівы: [Верш] / З узб. // Сонца ў арыках. Мн.

1984. Д у н і н - М а р ц і н к е в і ч В. Галубкі: [Верш] / З пол. // Дунін-Марцінкевіч В. Творы. Мн.

1.5.

На літоўскую мову. Pirmas susitikimas; Svečias iš Sudano / Vert. R. Alekna; Grožis / Vert. A. Žukauskas // Atplaukia Nemunu daina. Vilnius, 1958.

На ўкраінскую мову. Батькові; А за бір, за бір: [Вершы] / Пер. І. Кулик // Нова Білорусь. К., 1929; Стратег: [Верш] / Пер. Е. Бандуренко // Чорномор. комуна. 1968. 28 січ.; Батькові; «Загукала весна...»; Пісня з Україні; Ракета; Вогні; Несу надію: [Вершы] / Пер. О. Шевченко, Ф. Скляр, І. Гончаренко // Білоруська радянська поезія. К., 1971. Т. 1.

На б. Югаславіі мову. Jednoga dana... / Prev. Bran M. Divošić // Rijčka revija. 1965. Br 7—10.

2.3.

На беларускай мове. Г а р б у к В. Госць з Беларусі // Дзень паэзіі — 71. Мн., 1971; Я г о ж. Некалькі сустрэч з паэтам // Полымя. 1970. № 11; Я г о ж. Пазыўныя ў заўтрашні дзень // Голас Ра-

дзімы. 1970. № 48; Грахоўскі С. Паэзіі радавы: Да 70-годдзя з дня нараджэння Нічыпара Чарнушэвіча // ЛіМ. 1970. 13 ліст.; Гурыновіч У. З глыбінь душы // ЛіМ. 1975. 21 ліст.; Дымар У. [Біябібліяграфічная нататка да 85-годдзя з дня нараджэння] // Полымя. 1985. № 11; Зарыцкі А. Покуль грае сэрца // Зарыцкі А. За словам — падарункам. Мн., 1985; Звонак А. З надзеяй у сэрцы // Беларусь. 1970. № 41; [Некралог] // ЛіМ. 1967. 21 лют.; Пісьменнікі Савецкай Беларусі. Мн., 1981; Прывітанне юбіляру // ЛіМ. 1960. 15 ліст.; Шукліна Н., Кабаковіч А., Шпакоўскі І. Паэзія абнаўлення свету. Мн., 1981. С. 107. Шушкевіч С. Бывай, друг... // ЛіМ. 1967. 21 лют.

На рускай мове. Садовский Е. Молодые — старому // Трибуна искусства. 1925. № 13. *В. І. Козіч.*

ЧАРНЫШЭВІЧ АРКАДЗЬ

Чарнышэвіч Аркадзь Дзмітрыевіч [26.7(8.8). 1912, в. Кулакі Слуцкага пав. Мінскай губ., цяпер Салігорскага р-на Мінскай вобл.— 18.1.1967, Мінск, пахаваны на Усходніх могілках], празаік. Член СП Беларусі з 1954.

На беларускай мове. Бондар Т. «Пра ўсё сказаць прыйшла пара...» // Маладосць. 1984. № 3; Марціновіч А. На мяжы пошуку і адкрыцця // Звязда. 1985. 19 ліп.; У першыню ў «Беларусі» // Беларусь. 1979. № 11.

У. М. Ларчанка.

ШПАКОЎСКІ ІВАН

Шпакоўскі Іван Сцяпанавіч (н. 14.8.1936, в. Мясяцічы Пінскага павета Брэсцка-Літоўскага ваяводства, цяпер Пінскі р-н Брэсцкай вобл.), літаратуразнавец, крытык. Кандыдат філалагічных навук (1969). Піша на беларускай, рускай і ўкраінскай мовах.

Нарадзіўся ў сялянскай сям'і. Вучыўся ў пачатковай школе в. Мясяцічы, у сярэдняй школе ў в. Лемяшэвічы. Пасля заканчэння ў 1954 дзесяці класаў у г. Лунінцы паступіў на філфак Брэсцкага педінстытута. Пасля заканчэння інстытута з 1959 працаваў настаўнікам, дырэктарам Грыўкавіцкай сямігадовай школы (Пінскі р-н), літсупрацоўнікам газеты «Сцяг перамогі» (г. Маларыта, 1960—61), настаўнікам Маларыцкай СШ (1961—62), дырэктарам і настаўнікам Маларыцкай вячэрняй школы (1962—64), ст. выкладчыкам Брэсцкага педінстытута (1964—65). У 1962—66 вучыўся ў аспірантуры Кіеўскага універсітэта (спачатку завочна, потым на стацыянары). З 1966 працаваў у Нежынскім педінстытуце асістэнтам кафедры рускай літаратуры, ст. выкладчыкам. У 1968—69 в. а. дацэнта кафедры рускай літаратуры БДУ. З 1969 у Інстытуце літаратуры імя Я. Купалы АН БССР, малодшы, потым старшы навуковы супрацоўнік. У 1988 дацэнт Кіеўскага педінстытута. З 1989 дацэнт Мінскага педагагічнага універсітэта. Абараніў кандыдацкую дысертацыю па тэме: «Умоўна-асацыятыўная вобразнасць і пытанні майстэрства» (1967).

Літаратурную дзейнасць І. Шпакоўскі пачаў з рэцэнзій на зборнікі паэзіі, кінафільмы, спектаклі. Яго першая публікацыя — артыкул «Кнігу — у масы» (газ. «Сцяг перамогі», 1961, 29 сакавіка). У коле яго навуковых інтарэсаў — праблемы вобразнасці, майстэрства, тыпізацыі, стылёвага развіцця паэзіі. Разглядае індывідуальныя асаблівасці стылю Р. Барадуліна, А. Вярцінскага, В. Зуёнка, У. Караткевіча, А. Куляшова, П. Панчанкі, А. Пысіна, М. Танка. Займаецца праблемамі рускай і ўкраінскай літаратур (артыкулы пра творчасць Б. Алейніка, І. Драча, У. Лугаўскога, Л. Мартынава і інш.). Аўтар кніг «Структура вершаванага вобраза», «Узрушанасць» і інш. Публікаваў навуковыя артыкулы ў перыёдыцы, калектыўных манаграфіях, энцыклапедычных выданнях.

Жыве ў Мінску.

Л. С. Савік.

Бібліяграфія

1.2.

Структура вершаванага вобраза: Умоўная асацыятыўнасць у сучаснай сав. паэзіі. Мн., 1972. Рэц.: Ратыўнасць у сучаснай сав. паэзіі. Мн., 1972. Рэц.: Р а г о й ш а В. Структура вершаванага вобраза // Полымя. 1973. № 5; С к і д а н В. Слова да сучаснікаў // Чырв. змена. 1973. 23 студз.; С о л о в е й Е. Нові дослідження про метафору // Рад. літаратуразнавство. 1973. № 2; Я р а ц В. Верш і вобраз // ЛіМ. 1973. 9 лют.

Узрушанасць: Артыкулы пра сучасную беларускую паэзію. Мн., 1978. Рэц.: Ц в і р к а К. Тэма размовы — паэзія // Чырв. змена. 1979. 15 жн.; Я р а ц В. Усхваляваная патрабавальнасць // ЛіМ. 1979. 2 ліст.

Тыпізацыя ў лірыцы: Формы і сродкі. Мн., 1980. Рэц.: Г у р с к а я А. Прадмет увагі — лірыка // Полымя. 1982. № 5.

1.3.

1961. На кожным кроку навіна: [Рэц. на кн.: В я л ю г і н А. Насцеж. Мн., 1960] // Зара. 28 ліп. / Сааўт. С. Крываль; Сіламі грамадскасці // Наст. газ. 20 вер.

1962. Дзе тут казкі, дзе тут былі...: [Рэц. на кн.: Д у б о ў к а У. Палеская рапсодыя. Мн., 1961] // Зара. 23 сак.; С песней о Полесье // Заря. 20 июля; Рост: [Рэц. на кн.: Б о р о д у л и н Р. Целиноград. М., 1961] // Там жа. 11 нояб.

1963. Поэзия без выходных: [Рэц. на кн.: Б р о в к а П. А дни идут... Мн., 1962] // Заря. 7 марта.

1964. Слово — искра живая // Заря. 5 сент.; «Русский лес» // Там жа. 4 дек.

1965. Переплавленное сердце поэта: [Рэц. на кн.: К у л е ш о в А. Новая книга. Мн., 1964] // Заря. 24 июля; Правда Украины. 16 апр.; На орбите сердца: [Рэц. на кн.: Т а н к М. Мой хлеб надзённы. Мн., 1961] // Знамя юности. 19 марта.

1966. Об условной образности в поэзии Леонида Мартынова // Вопросы рус. литературы. Львов. Вып. 3; Пошукі і знаходкі: [Рэц. на кн.: М а л я ў к а М. Едуць маразы. Мн., 1966] // Беларусь. № 9; О ритмических особенностях современной белорусской поэзии // Вісн. Київського університету. Сер. філології та журналістики. № 8; Вибір власного шляху: [Рэц. на кн.: О л і й н и к Б. Вибір. К., 1966] // Дніпро. № 3; Молода білоруська поезія // Там жа. № 6; Про структуру умовно-асоціативних поетичних образів // Радянське літературознавство. № 1; Мандри за Суттю: [Рэц. на кн.: О л і й н и к Б. Поезії. К., 1966] // Комс. гарт. 28 берез.; Хлеб паэта // ЛіМ. 24 мая; Світ стобарвний і стозвонний // Літературна Україна. 29 берез.

1967. Хваляванне сучасніка // ЛіМ. 4 ліст.

1968. Сталасць: [Рэц. на кн.: Б а р а д у л і н Р. Адам і Ева. Мн., 1968] // Беларусь. № 11; Дзень пражыты і перажыты: [Рэц. на кн.: С і п а к о ў Я. Дзень. Мн., 1968] // ЛіМ. 5 ліп. / Сааўт. У. Гніламёдаў; Кніга яшчэ ў дарозе: [Рэц. на: З у ё н а к В. Вершы // Маладосць. 1967. № 3; Маладосць. 1968. № 6] // Там жа. 24 вер.

1969. Художественная условность в творчестве Достоевского // Проблемы реализма в русской и зарубежной литературах. Метод и мастерство. Тезисы докладов 2-ой межвузовской науч. конференции литературоведов. Май 1969 г. Вологда; Лангфела на беларускай мове // Беларусь. № 12; Молоде пагіння // Дніпро. № 4; Душа, открытая людям: [Рэц. на кн.: Н а ў р о ц к і А. Гарачы снег. Мн., 1968] // Дружба народов. № 6; «Вот и пришла пора отчета...»: [Рэц. на кн.: Г і л е в і ч Н. Лісце трыпутніку. Мн., 1968] // Там жа. № 12; «...Між двух жорнаў»: [Рэц. на кн.: Н а ў р о ц к і А. Гарачы снег. Мн., 1968] // Маладосць. № 2; Сціпласць: [Рэц. на кн.: Б л а т у н С. Раўнавага. Мн., 1968] // Там жа. № 7; «Гадзіннік-будзільнік цікае...» // Неман. № 2; Вогонь поетичної думки: [Рэц. на кн.: К о р о т и ч В. Вогонь. К., 1968] // Дняпрянська правда. 18 лют.; Поетове коло: [Рэц. на кн.: О л і й н и к Б. Коло. К., 1968] // Прапор комунізму. 4 берез.; Паэтавы перазовы // Чырв. змена. 9 сак.

1970. Первородство: [Рэц. на кн.: З у ё н а к В. Крутаяр. Мн., 1969] // Дружба народов. № 8; Талент абавязвае: [Рэц. на кн.: В я р б а В. Высакосны год. Мн., 1969] // Маладосць. № 1; Першароднасць вобразнага мыслення: [Рэц. на кн.: Б а р а д у л і н Р. Лінія пераменны дат. Мн., 1969] // Там жа. № 2; Лірыка шырокага дыхання: [Рэц. на кн.: К а р а т к е в і ч У. Мая Іліяда. Мн., 1969] // Там жа. № 8; Світла доблесть плуга: [Рэц. на кн.: К о р ж В. Зелені камертони. К., 1969] // Ленінскае плем'я. 1 серп.; Даследванне пра Герцэна: [Рэц. на кн.: Ч о п о р о в П. Романтизм и реализм Герцена. Мн., 1969] // Наст. газ. 9 вер.; У пошуках свого почерку // Прапор комунізму. 27 жовт.

1971. Белорусская литература для детей: [Рэц. на кн.: Г у р э в і ч Э. Беларуская дзіцячая літаратура (1917—1967). Мн., 1970] // Вопр. лит. № 6 / Сааўт. І. Дзюрыч; Пошукі законаў паэзіі: [Рэц. на кн.: С у ч а с н а я беларуская паэзія. Мн., 1970] // Маладосць. № 6; [Рэц. на кн.: Р а л ь к о І. Беларускі верш. Мн., 1969] // Рад. літаратуразнавство. № 12.

1972. [Рэц. на кн.: Ш м а т а ў В. Міхась Філіповіч. Мн., 1971] // Неман. № 3; Навуковы грунт, які ён? // ЛіМ. 14 студз.

1974. Прынцыпы і формы лірычнай кампазіцыі // Жураўлёў В., Шпакоўскі І., Яскевіч А. Пытанні паэтыкі. Мн.

1975. Времен былых и новых связь // Неман. № 11.

1976. «Жыццё — акіян, не задачнік...»: [Рэц. на кн.: П а н ч а н к а П. Крык сойкі. Мн., 1976] // ЛіМ. 22 кастр.; Голас славянскай еднасці // Там жа. 19 ліст.

1977. Умоўнасць як сродак лірычнай тыпізацыі Жыццёвая праўда і сучаснае мастацкае мысленне. Мн.; З лексікі паўднёвай Піншчыны // Народная лексіка. Мн.; «Я вновь готов к рывку...»: [Рэц. на кн.: П а н ч а н к а П. Крык сойкі. Мн., 1976] // Дружба народов. № 6; Переписка с землей: [Рэц. на кн. Т а н к М. Дарога, закалыханая жытам. Мн., 1976] // Там жа. № 12; Сувязь з часам і людзьмі: [Рэц. на кн. К у л я ш о ў А. Хуткасць. Мн., 1976] // Звязда. 7 чэрв.; «Рукі зноў апусціў на плуг»: [Рэц. на кн.: Т а н к М. Дарога, закалыханая жытам. Мн., 1976] // ЛіМ. 22 крас.

1978. Нерасторжима связь времен // Неман. № 3; З клопатам пра паэзію: [Рэц. на кн.: П а н ч а н к а П. На паэтычным небасхіле. Мн., 1977] // ЛіМ. 7 ліп.; Жывая повязь. Штрыхі да творчага партрэта Р. Барадуліна // Там жа. 21 ліп.

1979. Паэзія маладога пакалення 60-х гадоў (На рускім, украінскім і беларускім матэрыяле) // Асаблівасці развіцця літаратурнага працэсу ў Беларусі на сучасным этапе: Матэрыялы рэсп. навукова-тэарэтыч. канферэнцыі. Мн.; Вобраз адрасата ў структуры вершаванага тэксту // Весці АН БССР. Сер. грамад н. № 5; Енергія сумлiння: [Рэц. на кн.: Г і л е в і ч Н. Вибране. К., 1978] // Комс. гарт. 24 берез.; А слово сонця варте: [Рэц. на кн.: Д р а ч І. Слово і солнце. К., 1978] // Літ. Україна. 12 черв.; Світ митця: [Рэц. на кн.: Б о р о д у л і н Р. Свято бджоли. К., 1978] // Під прапором Леніна. 4 трав.

1980. Паэзія аднаго пакалення // Адзінства і ўзаемаўзбагачэнне: Пытанні ўзаемасувязей савецкіх літаратур. Мн.

1981. Развіццё наватарскіх рыс у беларускай паэзіі 30-х гадоў // Паэзія абнаўлення свету. Мн. Рэц.: Н я х а й М. Даследуючы заканамернасці сацыялістычнага рэалізму // Весці АН БССР. Сер. грамад. н. № 2.

1984. «Непасрэднасці вечны закон»: Штрыхі да творчага партрэта Янкі Сіпакова // ЛіМ. 31 жн.

1985. «Бондарівна» І. Карпенка-Карого і Янки Купалі (деяки аспекти порівняльного аналізу) // Карпенко-Карий — видатний драматург і громадські діяч. Кіровоград; І адгукнулася глыбіня: [Рэц. на кн.: З у ё н а к В. Лукам'е. Мн., 1984] // Полымя. № 12.

1.6.

Літаратуразнаўства: Зб. арт. Мн., 1990 / Рэд.

Актуальная праблема багдановічазнаўства: Матэрыялы канф. Мн., 1992 / Скл.

Літаратуразнаўства: Зб. арт. Мн., 1992 / Скл., Рэд.

Гарачы подых пачуцця: Дыялог крытыкаў Дабрамысла і Злаіла пра паэзію Раісы Баравіковай // Маладосць. 1979. № 8. / Зап. *Т. М. Махнач.*

ШПІЛЕЎСКІ ПАВЕЛ

Шпілеўскі Павел Міхайлавіч [псеўд.: Барон Икс, П. Древлянский, П. М. Древлянский, Знакомый человек; 31.10(12.11). 1823, в. Шыпілавічы Бабруйскага пав. Мінскай губ., цяпер Бабруйскі р-н Магілёўскай вобл.— 17(29).10.1861, Пецярбург (?)], празаік, драматург, публіцыст, этнограф, фальклярыст, тэатральны крытык. Кандыдат багаслоўя (1847). Пісаў пераважна на рускай мове, шырока выкарыстоўваючы беларускамоўныя ўстаўкі, а таксама па-польску.

Сын праваслаўнага святара. Вучыўся ў Мінскай духоўнай семінарыі. У 1843 паступіў у Пецярбургскую духоўную акадэмію, якую скончыў у 1847. У 1847—52 выкладаў славеснасць у Варшаўскім павятовым духоўным вучылішчы. З 1853 жыў і працаваў у Пецярбургу: служыў пакаёвым наглядчыкам у Галоўным педагагічным інстытуце (1853—55), дзе пазнаёміўся з М. Дабралюбавым, тады студэнтам, быў настаўнікам школы пры Экспедыцыі падрыхтоўкі дзяржаўных папераў (1855—59).

Друкавацца П. Шпілеўскі пачаў у 1846. Прафесійна займаўся журналістыкай з 1856. Пастаянны супрацоўнік пецярбургскіх перыядычных выданняў «Музыкальный и театральный вестник», «Сын отечества», «Русский мир», «Искусство», у якіх выступаў як публіцыст і тэатральны крытык. Асабліва цесна быў звязаны з «Иллюстрацией» У. Зотава, дзе вёў рубрыку «Дзённік Знаёмага чалавека». З юнацтва захапляўся вывучэннем гісторыі, побыту, вуснай народнай творчасці і мовы беларусаў, якую лічыў сваёй роднай. Вынікі яго шматгранных даследаванняў у галіне беларусазнаўства: артыкулы «Беларускія народныя павер'і» (1846), «Апісанне пасольства Льва Сапегі ў Маскве ў 1600 годзе» (1850), «Народныя прыказкі з тлумачэннем паходжання і значэння іх» (1852), «Беларускія прыказкі» (1853), «Даследаванне пра ваўкалакаў. На падставе беларускіх павер'яў» (1853), «Вясельныя абрады ў засцянкоўцаў (акалічан) Віцебскай губерні» (1854). Самымі значнымі і найбольш буйнымі ў рускім друку 1-й паловы 19 ст. публікацыямі пра Беларусь былі яго цыклы нарысаў «Падарожжа па Палессі і беларускім краі» (1853—55) і «Беларусь у характарыстычных апісаннях і фантастычных яе казках» (1853—56). Яны прынеслі П. Шпілеўскаму вядомасць як аднаму з першых даследчыкаў і папулярызатараў беларускай гісторыі, этнаграфіі і фальклору. У яго журналісцкай дзейнасці вядучае месца займала таксама беларуская тэматыка. У свае агляды ён шырока ўключаў весткі з Беларусі, першы паведаміў рускаму чытачу пра творчасць В. Дуніна-Марцінкевіча, рэцэнзаваў спектаклі Мінскага тэатра. Многія літаратурныя творы пісьменніка маюць аўтабіяграфічны характар. Як белетрыст П. Шпілеўскі дэбютаваў у 1851 у някрасаўскім «Современнике» апавяданнем «Знаёмая незнаёмка». Аўтар апавяданняў «Нарысы польскіх звычаяў» (1854), аповесці для дзяцей «Цыганё» (1855), драмы «Дажынкі» (1857), серыі апавяданняў пад агульнай назвай «Заходнерускія нарысы» (1858—59). У белетрызаванай форме напісаны яго нарысы «Падарожжа па Палессі і беларускім краі», «Беларусь у характарыстычных апісаннях і фантастычных яе казках», «Мазыршчына», «Паездка ў заходнерускія губерні». У іх найбольш яскрава выявіліся своеасаблівасць таленту пісьменніка, характэрнае для яго спалучэнне навуковага і мастацкага бачання свету. Багаты і разнастайны фактычны матэрыял пра Беларусь П. Шпілеўскі ўдала спалучаў з цікавымі апісаннямі і назіраннямі, эмацыянальнымі лірычнымі маналогамі. Беларускі этнаграфічны абрад пісьменнік паставіў у цэнтр драмы «Дажынкі», якая ўяўляе сабой своеасаблівую варыяцыю на тэму «Ідыліі» Дуніна-Марцінкевіча. У гісторыі, этнаграфіі, міфалогіі ён шукаў і знаходзіў доказы старажытнасці і самабытнасці беларускага народа. Пісьменнік смела ўводзіў у свае рускамоўныя творы беларускую фальклорную і моўную стыхіі. Двухмоўнай па сутнасці з'яўляецца п'еса «Дажынкі», у якой аўтар усхваляў селяніна як носьбіта нацыянальных культурных традыцый і высокай маральнасці. Пісьменнік ідэалізаваў беларускую вёску і яе жыхароў, імкнуўся не заўважаць вострых сацыяльных супярэчнасцей, марыў аб ідэйнай і культурнай еднасці беларускіх паноў і мужыкоў. Залішняя сентыментальнасць і павучальнасць адмоўна адбіліся на літаратурных вартасцях яго твораў, а супярэчлівасць і непаслядоўнасць ідэйных пазіцый пісьменніка, які вагаўся ад дэмакратызму і памяркоўнай ліберальнасці да адкрытай рэакцыйнасці і антысемітызму, выклікалі, з аднаго боку, нападкі расійскіх кансерватараў, з другога, рэзкую і справядлівую крытыку з боку дэмакратычных колаў. Галоўнае ў творчасці П. Шпілеўскага — пільная ўвага і павага да ўсяго беларускага. У той час, калі самадзяржаўе адмаўляла нават магчымасць самастойнага існавання і развіцця беларускага народа, пісьменнік адстойваў у рускім друку правы беларусаў. Ён праўдзіва адлюстраваў станаўленне нацыянальнай свядомасці свайго народа і прыняў актыўны ўдзел у фарміраванні беларускай нацыянальнай культуры.

У рукапісным аддзеле бібліятэкі АН Санкт-Пецярбурга захоўваецца рукапіс ранняй навуковай працы П. Шпілеўскага — складзены ім слоўнік беларускай мовы «Кароткая граматыка беларускай гаворкі» (1845).

С. А. Кузняева.

1.2.

Белорусские народные поверья. Статья 3. Спб., 1852. (Отд. отт. из «ЖМНП», 1852. Лит. прибавление № 3).

Белоруссия в характеристических описаниях и фантастических её сказках. Спб., 1853 (Отд. отт. из «Пантеона», 1853, т. 8, № 3, 4; т. 9, № 5, 6; т. 10, № 7; 1854, т. 15, № 5, 6; 1856, т. 25, № 1; т. 26, № 3).

Цыганенок: Повесть для детей. Спб., 1955. Рэц.: Чернышевский Н. // Современник. 1855. № 12.

Археологическая находка. [Спб., 1857] (Из «Санктпетерб. вед.» ... 1857 г., № 18).

Дожинки. Белорусский народный обычай: Сценич. представление в 2-х д., с хорами, песнями, хороводами и плясками белорус. Спб., 1857 / Рус., бел. Рэц.: Обзор русских книг // Сын отечества. 1857. № 8.

Путешествие по Полесью и Белорусскому краю. Спб., 1858.

Мозырщина. Спб., 1859.

Путешествие по Полесью и белорусскому краю. Мн., 1992.

1.3.

1846. Белорусские народные поверья // Прибавления к Журналу министерства народного просвещения. № 1, 4; 1852. № 3 / Пад псеўд. Древлянский.

1850. Описание посольства Льва Сапеги в Москву в 1600 году // ЖМНП. № 12.

1851. Знакомая незнакомка: Рассказ // Современник. № 7.

1852. Народные пословицы, с объяснением происхождения и значения их // Москвитянин. Т. 4. № 16; Korrespondencja «Gazety Warszawskiej»: Z Cesarstwa // Gaz. Warszawska. 15 maja.

1853. Белоруссия в характеристических описаниях и фантастических ее сказках // Пантеон. Т. 8. № 3, 4; Т. 9. № 5, 6; Т. 10. № 7; 1854. Т. 15. № 5, 6; 1856. Т. 25. № 1; Т. 26. № 3; Исследование о вовкалаках на основании белорусских поверий // Москвитянин. Т. 2. Кн. 1—2. № 5, 8; Путешествие по Полесью и белорусскому краю // Современник. Т. 39. № 6; Т. 40. № 7, 8; 1854. Т. 47. № 11; 1855. Т. 52. № 7.

1854. Путешествие по Полесью и Белорусскому краю: (в отрывках) // Журнал для чтения воспитанникам военно-учебных заведений. Т. 109. № 436; Свадебные обряды у застенковцев (околичан) Витебской губернии // Пантеон. Т. 15. № 5; Очерки польских нравов: Урок старому болтуну; Тяжба // Современник. № 10.

1855. Очерки Жмуди: Описание страны, ее нравов, языка и песен // Пантеон. Т. 19. № 1 / Пад псеўд. П. М. Древлянский.

1857. Археологическая находка // Санкт-Петербургские ведомости. № 18.

1858. Дневник знакомого человека // Иллюстрация. № 3—5, 7—9, 11—13, 15—18, 20—22, 25 / Без подпісу; Западнорусские очерки: [Введение] // Иллюстрация. № 43; Ребе-хаим и Кузьма-бобыль: Очерк // Там жа. № 45; Кум и кума: Очерк // Там жа. № 49.

1859. Мозырщина: (Из путешествий по Западно-русскому краю) // Архив ист. и практ. сведений, относящихся к России. № 3; Краснолупский комиссар и мужик Аксен: Очерк // Иллюстрация. № 52; Дударь // Там жа. № 55; Пинчуки: Очерк // Там жа. № 59; Воспоминание о петербургской маслянице // Там жа. № 66—67; Арендарь Пейсах // Там жа. № 69—71; Волочобники в Витебской губернии // Рус. дневник. № 101.

1860. Поездка в западные губернии // Иллюстрация. № 131—132.

1923. З «Падарожжа па Палессю і Беларускаму краю»: [Урыўкі] // Гарэцкі М. Хрэстаматыя беларускае літаратуры. Вільня.

1978. Некалькі старонак з «Падарожжа па Палессі і Беларускім краі» Шпілеўскага // Кісялёў Г. Пошукі імя. Мн.

1981. Падарожжа па Палессі і беларускім краі: [Урывак] // Беларуская дзіцячая літаратура. Мн.

1985. Выказванне аб вуснай народнай творчасці: [Урывак] // Беларускі фальклор. Мн.

1.4.

Седая маска; Три сестры; Гюго Абель; Венецианский карнавал: [Апавяданні] / З фр. Спб. 1857.

1.6.

Белорусские пословицы: Сборник. Спб., 1853 / Скл.

2.3.

На беларускай мове. Александровіч С. Пісьменнік і этнограф Павел Шпілеўскі // Беларусь. 1947. № 7; Асветніцкая дзейнасць П. М. Шпілеўскага // Асвета і педагагічная думка ў Беларусі. Мн., 1985; Бандарчык В. Адзін з першых // ЛіМ. 1961. 21 ліп.; Яго ж. Гісторыя беларускай этнаграфіі XIX ст. Мн., 1964. С. 38—43; Бандарчык В., Ларчанка М. Развіццё беларускай фальклярыстыкі // Беларуская вуснапаэтычная творчасць. Мн., 1966. С. 32—35; Бараг Л. Беларуская казка. Мн., 1969. С. 10—11; Бас І. «Колокол» і «Современник» пра Беларусь; Рэцэнзіі Чарнышэўскага і Дабралюбава // Бас І. Падарожжа ў літаратурнае мінулае. Мн., 1971; Яго ж. Матэрыялы пра Беларусь на старонках «Современника» // Беларусь. 1954. № 11; Гарэцкі М. Павел Шпілеўскі // Гарэцкі М. Гісторыя беларускае літаратуры. Вільня. 1920; 2 выд. Вільня, 1921; 3 выд. Вільня, 1924; 4 выд. Мн., 1926; Германовіч І. П. М. Шпілеўскі // Германовіч І. Беларускія мовазнаўцы. Мн., 1985; Яго ж. П. Шпілеўскі як мовазнавец // Весці АН БССР. Сер. грамад. н. 1976. № 3; Гілевіч Н. З клопатам пра песні народа. Мн., 1970. С. 28—29; Гісторыя беларускага тэатра: У 3 т. Мн., 1983. Т. 1. С. 289—290; Каваленка В. Вытокі. Уплывы. Паскоранасць. Мн., 1975. С. 172—174; Каханоўскі Г. Археалогія і гістарычнае краязнаўства Беларусі ў XVI—XIX стст. Мн., 1984. С. 68—69; Кісялёў Г. «...Я жыў з імі, я рос сярод іх...» // Кісялёў Г. Пошукі імя. Мн., 1978; Кліманскі С. Павел Шпілеўскі — публіцыст і тэатральны крытык // ЛіМ. 1968. 29 сак.; Ларчанка М. Жывая спадчына. Мн., 1977. С. 106—109; Яго ж. Славянская супольнасць. Мн., 1963. С. 19—23, 26; Яго ж. Сувязі беларускай літаратуры з літаратурамі суседніх славянскіх народаў у другой палавіне XIX ст. Мн., 1958. С. 15—23; Яго ж. На шляхах да рэалізма. Мн., 1958. С. 110—117; Малашкевіч У. Павел Шпілеўскі // Ніва. 1975. 22 чэрв.; Мальдзіс А. Забытая аповесць Шпілеўскага // Мальдзіс А. Падарожжа ў XIX стагоддзе. Мн., 1969; Маляўка М. М. А. Дабралюбаў і П. М. Шпілеўскі // Беларуская літаратура і літаратуразнаўства. Мн., 1973. Вып. 1; Навіна А. [Луцкевіч А.]. Літаратурны плагіят // Сын беларуса. 1924. 5 вер.; Сакалова В. Беларусь у рускіх творах П. М. Шпілеўскага («Падарожжа па Палессю і Беларускаму краю», «Дажынкі») // Узроўні фальклорных уплываў. Мн., 1982. С. 142—151; Хромчанка К. Беларуская мастацкая проза (канец XIX — пачатак XX ст.). Мн., 1979. С. 8—9; Цікоцкі М. Публіцыстычная дзейнасць П. М. Шпілеўскага // Цікоцкі М. З гісторыі беларускай журналістыкі XIX стагоддзя. Мн., 1960.

На рускай мове. Букчин С. «...Труд мой не будет бесполезным»: [Нарыс] // Неман. 1980. № 11; Добролюбов Н. Заметки и размышления по поводу лекций Степана Иосифовича Лебедева // Добролюбов Н. Собр. соч. М.; Л., 1964. Т. 8; Яго ж. Письмо А. И. и З. В. Добролюбовым // Там жа. Т. 9; Зотов В. Петербург в сороковых годах // Истории. вестник. 1890. Т. 39. С. 555; Кассиан. Заметки о новой драматической школе: (Письмо к г. Шпилевскому) // Сев. пчела. 1856. № 147; Кузняева С. Русская дореволюционная печать и советское литературоведение о Павле Шпилевском // Книга в Белоруссии: Книговедение, источники, библиография. Мн., 1981; Ларченко М. Братство народов — братство литератур // Неман. 1972. № 12; Яго ж. Неразрывные связи // Сов. Отчизна. 1957. № 3; Олехнович Н. Брест 130 лет назад // Заря. 1983. 27 дек.; П. М. Шпилевский: [Некралог] // Семейный иллюстрир. листок. 1861. № 193; Письма из Петербурга // Иллюстрация. 1860. № 123; Стопановский М. Нам пишут // Искра. 1860. № 22, 31; Троцкий В. Шпилевский Павел Михайлович // Рус.

биогр. словарь. Спб., 1911; Улыбышев А. Письмо к редактору // Муз. вестник. 1856. № 17; Чернышевский Н. Полн. собр. соч. М., 1953. Т. 16. С. 56, 77—78.
3.1.
БДГА: ф. 136, воп. 13, спр. 28; Б-ка Расійскай АН ў Санкт-Пецярбургу: № 1, 4, 49—50; ДГА Літвы: ф. 13, воп. 1, спр. 4100; РНБ у Санкт-Пецярбургу: ф. 744, адз. зах. 244; ІРЛІ: ф. 93, воп. 3, адз. зах. 1408; ф. 548, воп. 1, адз. зах. 49; ЦДГА г. Санкт-Пецярбурга: ф. 77, воп. 2, спр. 92.

Т. М. Махнач.

ШПЭТ ЯЗЭП

Шпэт Язэп Геркуланавіч [псеўд. Дзядзька Язэп, Свой, магчыма, Сумны, Вясковы; крыпт. Ю. Ш—т, Язеп Ш—т; 11(23).2.1891, мяст. Зембін Барысаўскага пав. Мінскай губ., цяпер Барысаўскі р-н Мінскай вобл.— 21.1.1955], празаік, публіцыст.

Бацька Я. Шпэта, Гекулан Аляксандравіч, быў арганістам, паслухаць якога ў Зембін прыходзілі людзі з далёкіх вёсак. Многіх падлеткаў з роднага мястэчка і ваколіц навучыў ён іграць на народных інструментах. Маці з ранніх гадоў расла сіратой, выхоўвалася пры доме пана Свянціцкага, была жанчынай з чулай душой. Пад уплывам музыкі, любові да прыгожага, родных мясцін выхоўваліся і дзеці. Першапачатковую адукацыю Я. Шпэт атрымаў у сваім мястэчку. Пазней у Вільні вучыўся на майстра па вытворчасці масла. Там зблізіўся з супрацоўнікамі «Нашай нівы», што аказала на яго рашаючы ўплыў (ён меў нават намер працаваць у яе рэдакцыі). Пасля заканчэння вучобы вярнуўся дамоў. У 1911—12 быў аканомам у пана Я. Граковіча ў маёнтку Замышша. Затым у маёнтку Казіміра працаваў па набытай у Вільні спецыяльнасці ў пана М. Свянціцкага. Пазнаёміўся і падтрымліваў сувязі з Р. Зямкевічам, які настойліва раіў Я. Шпэту запісваць фальклор і народныя абрады. У 1913 некалькі месяцаў жыў у Вільні, адкуль прызваны ў армію. У 1915 пісаў карэспандэнцыі і лісты з дзеючай арміі. Кастрычніцкую рэвалюцыю сустрэў прыхільна і адразу перайшоў на яе бок. Працаваў сакратаром Зембінскага суда, рахункаводам Плешчаніцкага і Каменскага вучылішчаў, рахункаводам-статыстыкам Барысаўскай МТС, лабарантам на Зембінскім масласыразаводзе. Быў адным з арганізатараў калгасаў, пра што пісаў у сваіх газетных артыкулах. З канца 30-х гадоў і да канца жыцця працаваў бухгалтарам у адным з калгасаў каля Зембіна. У вольны час любіў маляваць краявіды родных ваколіц (гэтая яго спадчына не захавалася).

Ніхто ў акрузе не ўмеў так прыгожа ткаць і вышываць, як ён. Асабліва славіўся Я. Шпэт беларускімі паясамі. Быў паслядоўным захавальнікам і абаронцам нацыянальнай культуры, у сваім адзенні прытрымліваўся беларускага стылю. Меў прыгожы голас і добра спяваў. Р. Зямкевіч запісаў ад яго многа беларускіх народных песень.

Літаратурную творчасць Я. Шпэт пачаў у 1913 у час вучобы ў Вільні пад уплывам «Нашай нівы», «Беларуса» і асабістага знаёмства з некаторымі іх супрацоўнікамі. У дарэвалюцыйны час надрукаваў у «Нашай ніве» больш за 20 апавяданняў, пад якімі падпісваўся псеўданімамі, крыптанімамі і сваім прозвішчам. Яго апавяданні ў асноўным уяўляюць сабой фрагменты-абразкі тагачаснага жыцця Барысаўшчыны, Лагойшчыны, роднага Зембіна («Пажар», «У ноч перад святым Янам», «Злічыла», «Выбар старшыні», «Дарагія лекі», «Адукаваная кабыла» і інш.). Яго творчасць па-сялянску простая і шчырая. Любоўю да роднай зямлі і павагай да народа вызначаецца публіцыстыка Я. Шпэта. У савецкі час яго прозвішча сустракалася ў «Звяздзе», «Савецкай Беларусі», «Беларускай вёсцы». Хаця быў ужо у пажылым узросце, але гарнуўся да «Маладняка Барысаўшчыны». Збіраў краязнаўчыя матэрыялы для часопіса «Наш край». Яго апавяданні савецкага часу ўражваюць прастатой аўтарскай манеры, народнасцю мовы. *З. П. Мельнікава.*

Бібліяграфія

1.3.

1913. Сіроцкая доля: [Апавяданне] // Беларус. 27 студз.; Добры дух: [Апавяданне] // Там жа. 1 сак.; На чужым хлебе: Апавяданне // Н. н. 15 лют. / Пад крыпт. Ю. Ш-т; Ад гарэлкі да разбою // Там жа. 1 сак. / Пад крыпт. Язэп Ш-т; Алегант: Апавяданне // Там жа. 31 мая / Пад крыпт. І. Ш-т; Выбары старшыні: Апавяданне // Там жа. 12 вер. / Пад крыпт. Язэп Ш-т.

1914. Суд: [Апавяданне] // Беларус. 15 мая; Зладзеі: [Апавяданне] // Там жа. 10 ліп.; Хацеў бы я: [Апавяданне] // Там жа. 21 жн.; Да думак: [Апавяданне] // Там жа. 2 кастр.; У восенні дзень: [Апавяданне] // Там жа. 16 кастр.; Чары: Апавяданне // Н. н. 27 лют.; Разбагацеў: Апавяданне // Там жа. 20 сак.; Злічыла: Апавяданне // Там жа. 22 мая; Пажар: Апавяданне // Там жа. 18 вер.

1915. Добрае сэрца: [Апавяданне] // Беларус. 19 лют.; Язэп на вайне: [Апавяданне] // Там жа. 17 ліп.; З пазіцыі: Ад нашага карэспандэнта // Н. н. 1 мая.

1917. Як папала кветка рожы ў свет: [Казка] // Літаратурны зборнік «Вольнае Беларусі». Сш. 1. Мн.; Вольная Беларусь. № 7; Бацькаўшчына мая!: [Верш у прозе] // Там жа. № 5; Некалькі слоў аб настаўніцкім з'ездзе // Там жа. 7 ліп.; Жыццё мяняецца // Там жа. 9 кастр.; Наша павіннасць // Там жа. 15 кастр.; У ноч перад св. Янам: [Апавяданне] // Там жа. 15 снеж.

1918. Аб зайздрасці: [Апавяданне] // Вольная Беларусь. 14 крас.

1921. Бацькаўшчына мая! // Беларускі каляндар на 1922 год. Вільня.

1922. Вайна: [Верш] // Бел. вед. (Вільня). 15 студз. / Пад псеўд. Дзядзька Язэп.

1923. Залом: Апавяданне з сялянскага жыцця // Сав. Бел. 15 вер.; Абразкі жыцця // Там жа. 18—20 вер.; У нядзелю: [Апавяданне] // Там жа. 31 кастр.; Кантрабандыст: [Апавяданне] // Там жа. 13 ліст.

1924. На хвэст: Апавяданне // Сав. Бел. 7, 8 лют.

1925. На кірмашы: Апавяданне // Сав. Бел. 25 кастр.

1926. Тры святы: [Апавяданне] // Бел. вёска. 11 мая; Малюнкі вясны // Сав. Бел. 18 крас.; Угодкі: Апавяданне // Там жа. 25 чэрв.; Мінулае ўспомніў: [Апавяданне] // Там жа. 15 жн.

1927. На перапісе ў вёсцы // Сав. Бел. 4 студз.; Якая была праца — гэткая і падрыхтоўка да перавыбараў // Там жа. 4 студз.

1928. Пакідаюць верыць у бога // Бел. вёска. 5 крас.

1929. [Рэц. на кн.: Друцкі-Падбярэскі Б. Падручны беларуска-польскі слоўнік. Вільня, 1929] // Бел. крыніца. 28 чэрв.

1965. Выбары старшыні; Разбагацеў: [Апавяданні] // Беларуская дакастрычніцкая проза. Мн.

2.3.

На беларускай мове. Каханоўскі Г. Салаўіныя гнёзды Міншчыны // ЛіМ. 1978. 20 кастр.; Яго ж. Язэп Шпэт // Каханоўскі Г. Адчыніся, таямніца часу. Мн., 1984.

Т. М. Махнач.

ШРУБ ПАВЕЛ



Шруб Павел Міхайлавіч (н. 20.2.1955, в. Хільчыцы Жыткавіцкага р-на Гомельскай вобл.), паэт. Член СП Беларусі з 1988. Лаўрэат прэміі Ленінскага камсамола Беларусі (1988, за зборнік вершаў «Лабараторыя»).

Нарадзіўся ў сялянскай сям'і. Бацька, Міхаіл Пятровіч, і маці, Мар'я Пятроўна,— калгаснікі. П. Шруб пачаў вучыцца ў школе з сямі гадоў, але пасля восьмага класа пакінуў школу і экстэрнам здаў экзамены на атэстат сталасці ў Тураўскай СШ № 1. У 1971 паступіў на фізічны факультэт Ленінградскага універсітэта, пасля заканчэння якога працаваў старшым інжынерам кафедры фізікі Наваполацкага політэхнічнага інстытута (1977—79). У 1979—81 старшы інжынер лабараторыі вадароднай энергетыкі Інстытута цепла- і масаабмену АН Беларусі. У 1981—83 служыў у Савецкай Арміі. З лютага 1983 выкладчык-метадыст Мінскай спецыяльнай сярэдняй школы міліцыі. Адначасова завочна вучыўся ў Мінскай вышэйшай школе МУС СССР (1983—87), пасля заканчэння якой атрымаў спецыяльнасць правазнаўца. Мае званне маёра міліцыі.

У рэспубліканскіх выданнях П. Шруб друкуецца з 1979. Аўтар зборнікаў паэзіі «Лабараторыя», «Позні світанак». Яго творам уласцівы лірызм, яркая, нетрадыцыйная вобразнасць, абвостранасць думкі і пачуццяў, спалучэнне навуковасці і паэтычнасці. Глыбокая засяроджанасць, шчырасць і непасрэднасць асабліва характэрныя для яго вершаў пра вясковае жыццё, якое яму добра вядома з маленства.

Жыве ў Мінску.

Л. М. Гарэлік.

Бібліяграфія

1.2.

Лабараторыя: Вершы. Мн., 1987 (Першая кніга паэта).

Позні світанак: Вершы. Мн., 1992 (Б-ка часоп. «Маладосць).

1.3.

1979. «Пялёсткі ранішніх садоў...»; «Вільготны бляск расплюшчаных вачэй...»; «Я ад'язджаў з вакзала, а жаданні...»; «Цікава, чаму...»; «Жаўрук над полем кожны дзень пяе...»: [Вершы] // Маладосць. № 7.

1981. «Дык чаму ж я ліст не напішу...»; «Жыццё пражыць — не поле перайсці...»; «Ніколі не спытаю...»; «Спачатку...»: [Вершы] // Маладосць. № 6; Рамантычная балада: [Верш] // Чырв. змена. 22 снеж.

1982. Дуб; «Збіраюць маркі і медалі...»: [Вершы] // Дзень паэзіі — 82. Мн.; «Столькі мы ведаем слоў...»; «Здалося мне...»; Майскі ранак...; Сасна над абрывам; «Я вычытаў...»; «Зоркі на небе рассыпаны зернем...»: [Вершы] // Маладосць. № 4.

1983. Пасля жніва; Трывога; Адвечнае; Казка: [Вершы] // Беларусь. № 6; Блакітная птушка; «Бадай не вернецца ўжо...»; Жнівеньская ноч: [Вершы] // Маладосць. № 5; Балада аб старым гляку; «Душой — не зрокам успрымай...»; Сінім вечарам: [Вершы] // ЛіМ. 25 сак.

1984. Сакавіцкая сінь; Гадзіннік і пясчынка; Двайная сістэма; Матылёк: [Вершы] // Маладосць. № 9.

1985. Знічка; Балада з палыновым пахам; Ланцуг; Ян; «Не люблю фасады дамоў...»; Медаль; Блудны сын; «Адзін у халоднай пустыні...»; «Прысыпаю, тушу пажар...»: [Вершы] // Маладосць. № 7.

1.5.

На літоўскую мову. «Mes žinome daugeli žodžiu...»; Gegužio rytmetys / Vert. J. Siožinys // Jaunimo gretos. 1982. Nr 8.

2.3.

На беларускай мове. Вялюгін А. У добры час // Беларусь. 1983. № 6.

Т. М. Махнач.

ШТЭЙНЕР ІВАН

Штэйнер Іван Фёдаравіч (н. 10.9.1953, в. Беражное Столінскага р-на Брэсцкай вобл.), літаратуразнавец, крытык. Кандыдат філалагічных навук (1982), дацэнт (1988).

Нарадзіўся ў сялянскай сям'і. Бацька, Фёдар Раманавіч, і маці, Вольга Дзмітрыеўна, працуюць у калгасе. У 1970 І. Штэйнер скончыў Беражноўскую сярэднюю школу. У 1975 скончыў БДУ і да 1977 працаваў дырэктарам Хатомельскай васьмігадовай школы на Століншчыне, супрацоўнікам Гомельскага інстытута ўдасканалення настаўнікаў. У 1978—81 займаўся ў аспірантуры пры кафедры беларускай літаратуры Гомельскага універсітэта. З 1981 асістэнт, старшы выкладчык, з 1983 загадчык кафедры беларускай літаратуры Гомельскага універсітэта.

З артыкуламі па літаратуразнаўстве І. Штэйнер выступае з 1980. Даследуе беларускую баладу ў яе сувязях з народнымі і літаратурнымі традыцыямі славянскіх народаў. Аўтар манаграфіі «Вытокі жанру і паэтычная структура», метадычнага дапаможніка (у сааўтарстве з В. Смыкоўскай). Галоўны рэдактар рэспубліканскага навуковага зборніка «Беларуская літаратура».

Жыве ў Гомелі.

М. М. Воінаў.

Бібліяграфія

1.2.

Белорусская баллада: Истоки жанра и поэтическая структура: Автореф. дисс. ... канд. филол. н. Мн., 1982.

Методическое пособие по изучению творчества писателей-лауреатов Ленинской премии в литературах народов СССР. Гомель, 1985 / Сааўт. В. Смыкоўская.

Беларуская балада: Вытокі жанру і паэтыч. структура. Мн., 1989.

Варожасць балады вякоў: Бел. балада і слав. традыцыі. Мн., 1993.

1.3.

1980. Жанравыя асаблівасці беларускай балады //

Беларуская літаратура. Мн. Вып. 8; Беларуская рамантычная балада ў яе тыпалагічных сувязях і традыцыях // Рэгіянальныя традыцыі ва ўсходнеславянскіх мовах, літаратурах і фальклоры. Гомель.

1981. Балады Янкі Купалы і народная паэзія // Беларуская літаратура. Мн. Вып. 9.

1982. Балады Якуба Коласа // Беларуская літаратура. Мн. Вып. 10; Роля фальклорных традыцый у станаўленні беларускай балады // Узроўні фальклорных уплываў. Мн.; Народна-фантастычныя вытокі беларускай балады // Весці АН БССР. Сер. грамад. н. № 3.

1983. Эвалюцыя «рамантычных» жанраў у паэзіі Янкі Купалы // Беларуская літаратура. Мн. Вып. 11.

1984. Гучы, роднае слова!: [Рэц. на кн.: Яфімава М. Гучыць жывое слова. Мн., 1983] // Нар. асвета. № 12; Пошукі «няўлоўнага дамавіка: [Рэц. на кн.: Казбярук У. Рамантычны пошук. Мн., 1983] // ЛіМ. 17 жн.

1985. Аляксандр Рыпінскі (1810—1900) // Беларуская літаратура. Мн. Вып. 13; Регионализм сборника Сипакова «Вече славянских баллад» // Региональные особенности восточно-славянских языков, литератур, фольклора и методы их изучения. Гомель. Ч. 2.

1.6.

Беларуская літаратура. Мн., 1991. Вып. 19 / Рэд.

Беларуская літаратура. Мн., 1992. Вып. 20 / Скл.

М. П. Барташэвіч.

ШУКАЙЛА ПАЎЛЮК

Шукайла Паўлюк (Павел Захаравіч; псеўд.: Заходні, П. Заходні, Паўлюк Заходні; крыпт.: П. З-ні; 1904, в. Лапенеўцы Ваўкавыскага пав. Гродзенскай губ., цяпер Бераставіцкі р-н Гродзенскай вобл.— 14.4.1939), паэт, празаік, крытык, арганізатар літаратурнага жыцця. Прафесар (1933).

Да 1925 жыццёвы шлях П. Шукайлы праглядаецца не вельмі пэўна. Прыкладна ў 1923 уключыўся ў падпольны рэвалюцыйны рух у Заходняй Беларусі і стаў членам КПЗБ. У канцы 1924 або пачатку 1925 перайшоў мяжу, магчыма, ратуючыся ад праследаванняў дэфензівы, і апынуўся ў Савецкай Беларусі. Тады якраз ствараўся «Маладняк», і П. Шукайла актыўна далучыўся да літаратурнай і літаратурна-арганізацыйнай дзейнасці. У 1925 выехаў у Слуцк, дзе арганізаваў філію «Маладняка», быў рэдактарам акруговай газеты, спрыяў выпуску літаратурнага альманаха. Неўзабаве перабраўся ў г. Расоны, працаваў там сакратаром райкома партыі, удзельнічаў у рабоце Полацкай філіі «Маладняка». Адначасова з'яўляўся старшынёй Нацыянальнай камісіі пры акруговым камітэце партыі і выканкоме па праверцы ходу беларусізацыі ў раёне. У 1926 ён прыехаў у Мінск і паступіў на літаратурна-лінгвістычнае аддзяленне педфака БДУ. У гэты час стаў ініцыятарам стварэння ў Мінску новага літаратурнага аб'яднання «Беларуская літаратурна-мастацкая камуна». У 1928 адкамандзіраваны на вучобу ў Камакадэмію ў Маскву. Скончыў пры ёй так званы факультэт «чырвонай прафесуры» (1930) і ў 1930—31 працаваў загадчыкам кафедры метадалогіі мастацтва ў Інстытуце кінематаграфіі. Да 1931 кіраўнік Беларускай секцыі Маскоўскай асацыяцыі пралетарскіх пісьменнікаў. Нейкі час быў рэдактарам газеты «Кіно» (Масква), дырэктарам Цэнтральнага тэхнікума тэатральнага мастацтва.

У верасні 1930 Б. Шукайла быў арыштаваны, але яму ўдалося адвесці ад сябе абвінавачванні, і пасля непрацяглага следства ён быў выпушчаны. З 1932 П. Шукайла ў Ленінградзе на пасадзе віцэ-прэзідэнта Дзяржаўнай акадэміі мастацтваў. У 1936 зноў у Маскве. 1.11.1938 ён зноў арыштаваны ў дварэ свайго дома. Ён не прызнаў сябе вінаватым ні на допытах, ні на так званым «судовым пасяджэнні» Ваеннай калегіі Вярхоўнага суда СССР. Тым не менш 13.4.1939 Шукайла быў прыгавораны да вышэйшай меры пакарання і на наступны дзень расстраляны. Рэабілітаваны 14.4.1959 г.

Няўрымслівы ў жыцці, шырокай натуры, энергічны чалавек, П. Шукайла быў такім і ў сваёй творчасці. У беларускім савецкім друку ён пачаў друкавацца з 1925. У 1930 выйшла яго першая і адзіная кніга паэзіі «Акрываўленая зямля», куды ўвайшлі вершы, паэмы «Акорды дзён» і «Партызанка Люба». Як паэт П. Шукайла імкнуўся не толькі не адстаць ад сучаснасці, але і быць наперадзе яе; ён надзвычай абвостра рэагаваў на кожную чарговую дэкларацыю аб тым, якой павінна быць сапраўдная пралетарская літаратура. Сам тэарэтычна

абгрунтоўваў яе пастулаты з арыентацыяй на футурызм, ідэі «Лефа». Перабольшанае абсалютызаванае ўяўленне аб рэвалюцыйнасці літаратуры, яе непасрэдным удзеле ў «будаўніцтве сацыялістычнай камуны сусвету» прыводзілі П. Шукайлу ў стыхію рыторыкі, надзвычай эмацыянальнай вершаванай апалагетыкі камуністычных кастрычніцкіх ідэй («Увесь свет на свой лад перавернем, Сусветны зробім Рэўком!»). У крытычных артыкулах П. Шукайла быў досыць непрымірымым да сваіх літаратурных апанентаў, што вынікала з апантанасці яго натуры, цалкам захопленай ідэяй усясветных пераўтварэнняў. Ён не прызнаваў у паэзіі ніякіх «музычных і пяшчотных тонаў», лічыў іх фальшам ва ўмовах «сучаснага кіпучага жыцця». Крытыкаваў з гэтых пазіцый паэзію У. Жылкі, Т. Кляшторнага, В. Маракова і нават А. Дудара. Пасля 1930 П. Шукайла адышоў ад літаратурнай дзейнасці. Ёсць звесткі, што ён напісаў аповесць «Бацька Булак-Булаховіч», аднак лёс гэтага твора невядомы. Нягледзячы на пэўныя ідэалагічныя перахлёсты, дэкларатыўнасць паэтычных твораў, П. Шукайла быў яркай асобай сярод маладых беларускіх літаратараў 1920-х гадоў. *І. Э. Багдановіч.*

Бібліяграфія

1.2.
Акрываўленая зямля: Паэзія. Мн., 1930.
1.3.
1925. Братам — беларусам: [Верш] // Малады араты. № 5; Вясковыя плеткары: [Верш] // Бел. вёска. 23 чэрв.; Чуй, Беларусь / Пад псеўд. П. Заходні; Тым, што ў няволі: [Вершы]; На рубяжы: (З натуры) // Вясковы будаўнік. 10 ліп.; Эх, песні мае: [Верш] / Пад псеўд. Заходні; У хвалях жыцця: (Раман). Частка першая / Пад псеўд. Паўлюк Заходні // Вясковы будаўнік. 24 ліп.; Сем год // Там жа. 9 снеж.; У Слуцкай філіі «Маладняка» / Пад крыпт. П. З-ні; Маладняк / Пад псеўд. П. Заходні; [Урывак з верша] // Літаратурны маладняк Случчыны. 10 ліп.

1926. На Беларусі...; Марыльцы: [Вершы]; Аднойчы вясною...: [Урывак з аповесці] // Наддзвінне. Полацк; Расцвіло; Думкі асеннія; Песня жаўра; Думкі аб бацькаўшчыне: [Вершы] // Слуцкія песняры. Мн.; У дзень вялікага жалю: (Урывак з паэмы «Дні вялікага жалю») // Вясковы будаўнік. 22 студз.; Сястрыцы Любе: [Верш] // Сав. Бел. 6 чэрв.; Вясновае: [Верш] // Чырв. Полаччына. 26 мая.

1927. Ветру: [Верш] // Чырв. Полаччына. 15 студз.; У дзень вялікага жалю: [Верш] // Там жа. 21 студз.; Б'ем перамогу!..: [Верш] // Там жа. 23 сак.

1928. Ім...; Эй, націснем, хлопцы!; Паравоз; Аднаму з Заходняй Беларусі; Я іду наперад!; Сястрыцы Любе: [Вершы]; Літаратурнае сёння // Росквіт. № 1; Літаратурнае сёння: Крытычны нарыс; «Пресвятая багародзіца, спасі нас» // Там жа. № 2; 1001 ноч на пошце: (Не казка, а трагібыль у дзвюх частках з тлумачэннямі): [П'еса] // Сав. Бел. 29 жн.; Людзі і быдла: (Пра паэзію, мазгі і аб людской прыказцы — «ня стрымаеш таго, што ўцякло») // Там жа. 4 вер.; Лагойскія «прыгажосці»: [Фельетон] // Там жа. 5 вер.; Пра адказнага, але непісьменнага сакратара: [Фельетон] // Там жа. 9 вер.; Хлестакоў, якіх яшчэ не бывала // Там жа. 11 вер.

1929. Партызанка Люба: (Урывак з паэмы) // Полымя. № 7; Арміі Леніна: [Верш] // На Беларусі. 22 лют.; На разгром Грамады: [Верш] // Там жа. 8 сак; Паравоз: [Верш] // Там жа. 22 сак.; Кветкі жыцця: (Акорды) // Там жа. 18 ліп.; Партызанка Люба: (Урывак з паэмы) // Там жа. 18 ліп., 1 жн.; Вёска сёння: (Апавяданне) // Там жа. 8 жн. / Пад псеўд. Паўлюк Заходні; Жніўная радасць: [Верш] // Там жа. 15 жн.; Чырв. змена. 4 жн.

1930. Акорды дзён: Паэма // Полымя. № 1.
1.5.
На рускую мову. Партизанка Люба: (Отрывок из поэмы) / Пер. С. Кирсанов // Сборник белорусской поэзии. М.; Л., 1930.
2.3.
На беларускай мове. А р о ч к а М. Беларуская савецкая паэма. Мн., 1979. С. 140—141; С к р ы г а н Я. Госці з Мінска // Скрыган Я. Некалькі хвілін чужога жыцця. Мн., 1979. *Т. М. Махнач.*

ШУМАЎ МІХАІЛ

Шумаў Міхаіл (сапр. Шульман Міхаіл Іосіфавіч; інш. псеўд. Шумаў, М. Шумаў, Міхась Шумаў; н. 17.10. 1923, г. Магілёў), празаік. Член СП Беларусі з 1967. Піша на рускай і беларускай мовах.

З сям'і служачых. Бацька працаваў бухгалтарам Магілёўскага педвучылішча, маці — там жа бібліятэкарам. Пасля заканчэння ў 1940 сярэдняй школы ў Магілёве паступіў на літаратурны факультэт Магілёўскага педінстытута, але вучобе перашкодзіла вайна. Добраахвотна ўступіў у камсамольскі знішчальны батальён, які прымаў удзел у абароне Магілёва. Перайшоўшы лінію фронту, ваяваў на Паўднёва-Заходнім і Заходнім франтах. У жніўні 1943 быў цяжка паранены і да канца 1943 знаходзіўся на лячэнні. У 1944—45 працаваў мантажнікам і кантрольным майстрам на заводзе «Кінап» у г. Самаркандзе. Пасля вайны працягваў вучобу ў Магілёўскім педінстытуце (закончыў у 1949), БДУ. Вучобу спалучаў з працай мантажніка (Мінскі радыёзавод), загадчыка вучэбнай часткі Магілёўскага абласнога дома піянераў, выкладчыка Магілёўскага культасветвучылішча (1947—49). Затым выкладчык рускай і беларускай моў і літаратур у сярэдніх школах г. Магілёва (1950—79). Цяпер на пенсіі. Узнагароджаны ордэнамі Вялікай Айчыннай вайны I і II ступені і медалямі.

Друкавацца М. Шумаў пачаў з 1960, калі ў часопісе «Неман» з'явілася яго першая аповесць «Жыццё кліча». У цыкле аповесцей і раманаў апавядае пра лёс пакалення, маладосць якога прыпала на цяжкія 1930-я, ваенныя і пасляваенныя гады (аповесць «Печаныя яблыкі», раман-трылогія «Прыйдзе і твой час», «Хроніка вуліцы Грушавай», «Вечны шлях»). М. Шумаў зрабіў літаратурны запіс успамінаў падпольшчыцы З. Хаўранковай («Шэсць сясцёр», 1971), партызанскіх камісараў Н. Храпко, Ф. Папова («Па закліку сэрца», 1982), камандзіра Магілёўскага партызанскага злучэння К. М. Белавусава. Аўтар нарысаў пра Героя Сацыялістычнай Працы П. П. Цімашэнку, пра сучасную беларускую вёску («Сож мой, Сож». Полымя. № 8, 9, 1989). Выступае і як публіцыст.

Жыве ў Магілёве.

В. І. Атрашкевіч.

Бібліяграфія

1.2.

Жизнь зовет: Повесть. Мн., 1962. Рэц.: Бур'ян Б. Выпрабаванне вытрымана // ЛіМ. 1962. 13 ліп.; Малінковіч Я. Дзве аповесці // Наст. газ. 1964. 17 чэрв.; Палітыка А. З вераю ў чалавека // Маг. праўда. 1962. 21 кастр.

Печеные яблоки: Повесть. Мн., 1963. Рэц.: Кандрусевіч А. Яблыні будуць цвісці // Маг. праўда. 1963. 14 чэрв.; Кулешов Ф. Через линию фронта // Неман. 1963. № 3; Малінковіч Я. Дзве аповесці // Наст. газ. 1964. 17 чэрв.; Мехаў У. У тыя суровыя дні // ЛіМ. 1963. 8 кастр.; Рыбак А. І гэта подзвіг // Беларусь. 1964. № 4.

Придёт и твоё время: Повесть. Мн., 1980. Рэц.: Аношкін І. Маладосць гартавалася ў агні // Маг. праўда. 1983. 28 студз.; Генкин В. // Неман. 1981. № 7.

Хроника улицы Грушевой: Повесть. Мн., 1982. Рэц.: Аношкін І. Маладосць гартавалася ў агні // Маг. праўда. 1983. 28 студз.

Аккорды давних тревог: Повести. Мн., 1983.

Вечный шах: Повесть. Мн., 1986.

Девять дней в неделю: Повесть. Мн., 1992.

1.3.

1960. Жизнь зовет: Повесть // Неман. 1960. № 5.

1963. Дом вечной юности: Очерк // Неман. № 1; Уздзейнічаць на сэрцы, а не паведамляць факты // ЛіМ. 25 студз.; Чатыры прафесіі аднаго дырэктара: [Нарыс] // Там жа. 9 ліп.; Клуб і тры яго гаспадары: [Нарыс] // Там жа. 25 кастр.; Асцярожна: Мякішавы! // Маг. праўда. 3 лют.; На поўны крок: [Нарыс] // Там жа. 6 ліп.; Творчая сталасць // Там жа. 12 ліст.

1964. Чаму маўчыць міністэрства? // ЛіМ. 18 снеж.

1965. Тут былі нашы акопы: Урывак з аповесці // ЛіМ. 29 чэрв.

1966. Дняпроўскі вал // Маг. праўда. 8 ліп.; Мальер з пятага санаторыя: [Апавяданне] // Там жа. 23 ліст.

1968. Вялікі, як свет // Маг. праўда. 2 сак.

1969. Роздум пасля спектакля // Маг. праўда. 3 вер.

1970. Мушу ісці: [Нататкі] // ЛіМ. 22 мая; «Канец Хітрова рынку» // Маг. праўда. 18 ліст.

1971. Радаўніца: Апавяданне // ЛіМ. 16 крас.

1972. Подкова: Рассказ // Неман. № 4. Рэц.: Трипутин Н. Ржавая подкова // Сов. Бел. 22 июля.

1973. Подых суровых дарог // Маг. праўда. 26 кастр.

1975. Апошняя батарэя: [Урывак з кнігі «Усе мы ў адной камандзе»] // Маг. праўда. 11 студз.

1976. Одна, но пламенная страсть: [Нарыс] // Дела их золотом горят. Мн.

1977. У пошуках... учарашняга дня // ЛіМ. 25 ліст.

1985. Сатырыка нялёгкі хлеб // Маг. праўда. 6 лют.

1.6.

Ховренкова З. Шесть сестер: [Успаміны]. Мн., 1971 / Літ. зап.

Храпко Н., Попов Ф. По зову сердца: [Успаміны]. Мн., 1982 / Літ. зап.

Белоусов К. Зарево над Друтью: [Успаміны]. М., 1990 / Літ. зап.

Ховренкова З. Шесть сестер: Воспоминания // Неман. 1967. № 9, 10 / Літ. Зап.; Храпко Н., Попов Ф. В лесах под Глуском: Воспоминания // Неман. 1980. № 2 / Літ. зап.

2.3.

На беларускай мове. Атрашкевіч В. Кліча жыццё: Да 60-годдзя М. Шумава // Маг. праўда. 1983. 15 кастр.; Міхаілу Шумаву — 60: [Віншаванне] // ЛіМ. 1983. 14 кастр.; Пісьменнікі Савецкай Беларусі: Кароткі даведнік. Мн., 1981; Пысін А. З франтавога пакалення // Маг. праўда. 1973. 17 кастр.; Яго ж. Міхаілу Шумаву — 50 // ЛіМ. 1973. 19 кастр.; У гэтым месяцы... // Беларусь. 1973. № 10.

2.4.

На беларускай мове. Пысін А. Добры конік «Запарожац»: [Верш] // Пысін А. Ёсць на свеце мой алень. Мн., 1978.

Т. М. Махнач.

ШУПЕНЬКА ГЕНАДЗЬ

Шупенька Генадзь Серафімавіч (н. 6.4.1936, в. Падбярэззе Мядзельскага р-на Мінскай вобл.), крытык, літаратуразнавец. Член СП Беларусі з 1975.

Нарадзіўся ў сялянскай сям'і. Бацька яго двойчы быў зняволены ў турмах даваеннай Польшчы, у гады Вялікай Айчыннай вайны быў у партызанах, пасля вайны працаваў у розных савецкіх установах, у 1954 загінуў пры выкананні службовых абавязкаў. На руках маці засталося сямёра дзяцей. Г. Шупенька быў у цяжкім стане: летам 1941 фашысцкі салдат ударыў хлопчыка па спіне так, што ён захварэў на туберкулёз хрыбетніка. У школу змог пайсці ў 1945. Скончыў Ніўкаўскую пачатковую школу (1949), Балашэўскую сямігодку (1952), з залатым медалём Куранецкую СШ (1955). Паступіў на аддзяленне беларускай мовы і літаратуры філфака БДУ. З 2-га курса давялося на доўгія гады легчы ў бальніцу, дзе перанёс некалькі аперацый, пасля чаго вучыўся нанава хадзіць. У 1965 з дыпломам выдатніка скончыў універсітэт, рэкамендаваны ў аспірантуру, паспяхова здаў кандыдацкі мінімум і пачаў пісаць дысертацыю. Але хвароба не адступала. Трапіў у Маскоўскі інстытут туберкулёзу, дзе ў 1967 яму зрабілі 6-ю аперацыю, пасля якой змог скончыць аспірантуру і ў 1969 быў накіраваны ў Навукова-даследчы інстытут педагогікі Міністэрства асветы Беларусі. Працаваў там старшым навуковым супрацоўнікам у галіне методыкі выкладання беларускай літаратуры ў школе. З 1982 загадчык рэдакцыі серыйных выданняў выдавецтва «Мастацкая літаратура». Узнагароджаны медалём Ф. Скарыны, Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета РБ.

З артыкуламі па пытаннях развіцця сучаснай беларускай літаратуры і рэцэнзіямі Г. Шупенька пачаў выступаць у друку з 1969. Даследуе творчасць беларускіх празаікаў І. Мележа, Я. Скрыгана, А. Васілевіч і многіх інш. Займаецца праблемамі мастацкага майстэрства, творчай індывідуальнасці пісьменніка (зборнік нарысаў, літаратурных партрэтаў, артыкулаў «Цеплыня чалавечнасці» і інш.). У часопісах «Полымя», «Маладосць», «Нёман», газеце «Літаратура і мастацтва» змяшчае агляды творчасці маладых беларускіх празаікаў. Выдаў зборнік артыкулаў «Майстэрства сучаснай беларускай прозы». Піша сцэнарыі тэлеўрокаў па творчасці беларускіх пісьменнікаў, метадычныя дапаможнікі для школы. Пераклаў на беларускую мову аповесць венгерскага празаіка Ц. Дзеры «Мілы ба-пэр!..»

Жыве ў Мінску.

Л. С. Савік.

Бібліяграфія

1.2.

Цеплыня чалавечнасці: Нарысы, літаратурныя партрэты, артыкулы. Мн., 1977. Рэц.: Тычына М. Голас маладой крытыкі // ЛіМ. 1978. 16 чэрв.

Галоўнае — талент. Мн., 1987.

1.3.

1969. Майстэрства Мележа-раманіста // Нар. асвета. № 3; Творчасць Івана Мележа ў крытыцы // Полымя. № 3; Творчасць — гэта ператварэнне матэрыялу: [Рэц. на кн.: Васілёнак Я. Вячэрняя размова. Мн., 1968] // Там жа. № 8.

1970. Слова дакладнае і прыблізнае: [Рэц. на кн.: Герцовіч Я. На вайне як на вайне. Мн., 1969] // Полымя. № 3; «А мая зброя — смех!»: [Рэц. на кн.: Вішня А. Усмешкі: Гумарыстычныя апавяданні. Мн., 1969] // Там жа. № 9; Астаецца сагрэтае сэрцам: [Рэц. на кн.: Рылько А. Выбранае. Мн., 1969] // Там жа. № 12; Яшчэ раз пра «Палескую хроніку» // ЛіМ. 26 чэрв.

1972. Галоўны крытэрый — мастацкая пераканаўчасць: [Рэц. на кн.: Даніленка М. Наш дом. Мн., 1971] // Полымя. № 2; Шчыры і добры талент // Там жа. № 4; Народ у гісторыі: Дылогія І. Мележа вылучана на атрыманне Ленінскай прэміі // ЛіМ. 17 сак.

1973. Рыцар малого жанра: Штрихи к портрету Янки Скрыгана // Неман. № 9; Цяпло чалавечых сустрэч: [Рэц. на кн.: Гардзіцкі А. Сустрэчы. Мн., 1972] // Полымя. № 5.

1974. Талент вымагае: [Рэц. на кн.: Вышынскі М. На павароце. Мн., 1973] // Маладосць. № 2; Прага мастацкасці // Там жа. № 5; На алтарь дружбы: [Рэц. на кн.: Рука друга. Мн., 1973] // Неман. № 8; Ідучы ад фактаў жыцця: [Рэц. на кн.: Гіль М. Ранішнія сны. Мн., 1975] // Полымя. № 8.

1975. Пра некаторыя пытанні цэласнага тэкстуальнага аналізу эпічных твораў // Пытанні выкладання літаратуры ў школе. Мн.; Калі ёсць што сказаць людзям: [Рэц. на кн.: Міськo П. Калянае лісце. Мн., 1974] // Маладосць. № 2; Заклапочана і эмацыянальна: [Рэц. на кн.: Бечык В. Свет жывы і блізкі. Мн., 1974] // Там жа. № 9; [Рэц. на кн.: Юрэвіч У. Погляд. Мн., 1974] // Неман. № 2; І глыбіні, і водмелі: [Рэц. на кн.: Яскевіч А. Грані майстэрства. Мн., 1974] // Полымя. № 7; Проза жыцця і майстэрства прозы: [Рэц. на кн.: Пушкін Я. Бабіна лета. Мн., 1974] // ЛіМ. 31 студз.; Усё яшчэ наперадзе: [Рэц. на кн.: Калодзежны Л. Аўсяны звон. Мн., 1975] // Там жа. 10 кастр.

1976. Некаторыя асаблівасці вывучэння стылю буйных эпічных твораў у старэйшых класах сярэдняй школы // Аналіз мастацкага твора ў школе. Мн.; Когда есть что сказать людям... // Дружба народов. № 5; Многае пад сілу: [Рэц. на кн.: Жук А. Паляванне на старых азёрах. Мн., 1975] // Маладосць. № 9; «Собственное право» критика: [Рэц. на кн.: Каваленка В. Прага духоўнасці. Мн., 1975] // Неман. № 1; Не только о литературе: [Рэц. на кн.: Мележ І. Жыццёвыя клопаты. Мн., 1975] // Там жа. № 9; З любасцю да чалавека і яго слова: [Рэц. на кн.: Янкоўскі Ф. Абразкі. Мн., 1975] // Полымя. № 10; Натхнёным словам: [Рэц. на кн.: Калеснік У. Зорны спеў. Мн., 1975] // ЛіМ. 20 жн.; Мужнасць чалавечага сэрца // Там жа. 10 вер.; Слова пра нашых пісьменнікаў: [Рэц. на кн.: Пра таварышаў па пяру. Мн., 1976] // Наст. газ. 6 ліст.

1977. Пра сейбітаў і воінаў: [Рэц. на кн.: Пташнікаў І. Найдорф. Мн., 1976] // Беларусь. № 1; Асэнсоўваць з'явы жыцця: [Рэц. на кн.: Гігевіч В. Спелыя яблыкі. Мн., 1976] // Там жа. № 7; Пра людзей харошых: [Рэц. на кн.: Воранаў М. Ветраны дзень. Мн., 1976] // Там жа. № 12; Стыль пісьменніка // Нар. асвета. № 2; Пра нашу мужнасць, пра нашу годнасць: [Рэц. на кн.: Міськo П. Мора Геродота. Мн., 1976] // ЛіМ. 4 сак.; З любоўю і спагадай да чалавека: [Рэц. на кн.: Брыль Я. Акраец хлеба. Мн., 1977] // Там жа. 17 чэрв.

1978. Выразна і праўдзіва: [Рэц. на кн.: Асіпенка А. Два дні і дзве ночы. Мн., 1977] // Беларусь. № 8; Творчы неспакой: [Рэц. на кн.: Гілевіч Н. У гэта веру. Мн., 1978] // ЛіМ. 15 снеж.; «Просты і шчыры ў кожным слове...» // Чырв. змена. 16 лют.

1979. Память сердца // Саченко Б. Чужое небо. Мн.; Культура пачуцця і думкі: [Рэц. на кн.: Лойка А. Лінія жыцця. Мн., 1978] // Беларусь. № 1; Праўда характару: [Рэц. на кн.: Гіль М. «Таццянін чэрвень». Мн., 1978] // Там жа. № 6; Принципы и проблемы реалистического перевода: [Рэц. на кн.: Рагойша В. І нясе яна дар... Мн., 1977] // Дружба народов. № 2; Шукаць, каб знаходзіць: Маладая проза, год 1978 // Маладосць. № 3; [Рэц. на кн.: Науменко И. Замять желтолистья. М., 1978] // Неман. № 3; З сыноўняй любоўю: [Рэц. на кн.: Мележ І. Завеі, снежань. Мн., 1978] // Звязда. 6 вер.; Ісці ад перажытага: [Рэц. на кн.: Ярашэвіч Э. Белыя Лугі. Мн., 1978] // ЛіМ. 11 мая; Вечнае не старэе: [Рэц. на кн.: Брыль Я. Золак, убачаны здалёк. Мн., 1979] // Там жа. 17 жн.

1980. Вывучэнне эпічных твораў // Вывучэнне літаратуры: Пытанні методыкі. Мн.; Далягляды беларускай савецкай лірыкі: [Рэц. на кн.: Ярош М., Бечык В. Беларуская савецкая лірыка. Мн., 1979] // Беларусь. № 9; Свет памяти: [Рэц. на кн.: Святло яго душы. Мн., 1979] // Неман. № 12; Найважней — біяграфія душы // Голас Радзімы. 10 ліп.; Высокі лад балады: [Рэц. на кн.: Беларуская балада: Мн., 1978] // ЛіМ. 4 студз.; Галоўнае — вышыня погляду // Там жа. 8 лют.; Сустрэча прынесла надзею: [Рэц. на кн.: Цяжкі А. Сустрэча пасля вясны. Мн., 1980] // Там жа. 18 ліп.

1981. Галоўнае — вышыня погляду // Вобраз — 81. Мн.; Ёсць што сказаць людзям // Міськo П. Выбранае. Мн.; Спагадлівасць: Успаміны // Маладосць. № 2; Даваць таленту // ЛіМ. 24 ліп.; З высокай годнасцю // Наст. газ. 7 лют.

1982. Мужны і чалавечны // Успаміны пра Івана Мележа. Мн.; Талант доброты // Хомченко В. Возвращение в огонь. М., Свой след на зямлі // Звязда. 16 вер.; «Чалавеку быць чалавечным...» // Там жа. 21 снеж.; Актыўнасць душы: Чытацкі дзённік пісьменніка // ЛіМ. 23 крас.; Кніга, вартая многіх тамоў // Там жа. 22 кастр.; Не выпадковае пачуццё: [Рэц. на кн.: Гілевіч Н. Удзячнасць і абавязак. Мн., 1982] // Там жа. 12 ліст.

1983. Абавязак перад талентам: [Рэц. на кн.: Жук А. Паляванне на апошняга жураўля. Мн., 1983] // Маладосць. № 12.

1984. Быў верным праўдзе // Голас Радзімы. 6 снеж.

1985. [Прадмова] // Гаўрылкін Л. Як Клава мужа шукала. Мн., Не поле перайсці // Краўчанка У. Крыгалом. Мн.; Голасам народа // Пташнікаў І. Алімпіяда. Мн.; Голасам народа: Пра новы раман Івана Пташнікава // Маладосць. № 1; С требовательной любовью: [Рэц. на кн.: Иващенко В. Круги надежды и добра. Мн., 1983] // Неман. № 4.

1.4.

Дзеры Ц. Мілы ба-пэр!..: Аповесць / З венг. Мн., 1983.

Лагерквіст П. Кат: Аповесць; Карлік: Раман / З швед. Мн., 1986 (Б-ка замеж. прозы) / Сааўт. пер. М. Гіль.

1983. Новікава М. Пераклад і кантэкст / З рус. // Далягляды. Мн.

1984. Тандзюк Л. Цярэшкаў пясец; Бічуя Н. Самая высокая ў свеце гара: [Апавяданні] / З укр. // Ад круч дняпроўскіх. Мн.;

1985. Разікашвілі П. Злодзей; Безарашвілі Н. Цеплыня сэрца: [Апавяданні] / З груз. // Дружная з сонцам. Мн.

1.6.

Наднёманскія галасы. Мн., 1980 / Рэд.

2.3.

На беларускай мове. Бечык В. Прад высокаю красою... Мн., 1984. С. 226—228; Пісьменнікі Савецкай Беларусі: Кароткі даведнік. Мн., 1981.

2.4.

На беларускай мове. Лойка А. Полька: [Верш] // Лойка А. Калі ў дарозе ты... Мн., 1971.

У. М. Ларчанка.

ШУТОВІЧ ЯНКА

Шутовіч Іван Іосіфавіч [псеўд. Іван Дубневіч, Ян Дубневіч, Я. Сцяблінскі; крыпт. І. Ш., Я. Ш., Я. Ш-ч, І. Ш; 11(24).1.1904, в. Шутавічы Ашмянскага пав. Віленскай губ., цяпер Смаргонскі р-н Гродзенскай вобл.— 9.12.1973, Вільнюс, пахаваны ў Павільнісе], літаратуразнавец, выдавец, грамадска-культурны дзеяч Заходняй Беларусі.

Нарадзіўся ў сям'і малазямельных і шматдзетных сялян. Вучыўся ў Віленскай беларускай гімназіі. У 1934 скончыў юрыдычны факультэт Віленскага універсітэта з дыпломам магістра права. Належаў да партыі хрысціянскіх дэмакратаў. Працаваў карэктарам у беларускай друкарні імя Ф. Скарыны, у Беларускім студэнцкім саюзе і Беларускім інстытуце гаспадаркі і культуры ў Вільні. З 1935 да 1939 быў выдаўцом і рэдактарам літаратурна-навуковага часопіса «Калоссе», у якім друкаваліся творы М. Танка, В. Таўлая, Я. Драздовіча, М. Машары, А. Іверса і інш.; часопіс знаёміў таксама чытачоў з творамі пісьменнікаў Савецкай Беларусі. Кіраваў міжарганізацыйным сакратарыятам па справе беларускіх школ на тэрыторыі Заходняй Беларусі. Зняволены польскімі ўладамі ў канцэнтрацыйным лагеры ў Бярозе Картузскай, адкуль вызвалены ў 1939 савецкімі войскамі. З лютага 1941 да лістапада 1944 быў супрацоўнікам, а пазней загадчыкам Беларускага музея ў Вільні, садзейнічаў захаванню яго матэрыялаў у цяжкія гады акупацыі. У лістападзе 1944 арыштаваны органамі НКУС і рашэннем Асобай нарады пры НКУС СССР асуджаны на 10 гадоў зняволення. Пакаранне адбываў у Унжлагу Горкаўскай вобл. і ў Пясчанлагу Карагандзінскай вобл. Вызвалены з турмы 28.8.1954. Да 10.4.1956 знаходзіўся ў ссылцы ў Карагандзе і ў г. Сарань Карагандзінскай вобл. Пасля ссылкі вярнуўся ў Вільнюс. 25.4.1958 Вярхоўны суд ЛітССР адмяніў рашэнне Асобай нарады пры НКУС СССР, і справа была спынена за недаказанасцю абвінавачання. З 1957 працаваў пажарнікам у Вільнюскім дзяржаўным мастацкім музеі. З 1940 быў жанаты з літоўскай паэтэсай Онай Міцютэ (1909—73), разам з якой працаваў над перакладамі твораў беларускіх і літоўскіх пісьменнікаў.

Першыя публікацыі Я. Шутовіча ў заходнебеларускім друку датуюцца 1927. Рыхтаваў матэрыялы пра М. Гарэцкага, А. Гурыновіча, М. Забэйду-Суміцкага, з якім перапісваўся, пра Віленскі беларускі музей і інш., некаторыя з іх публікаваліся ў савецкіх часопісах і газетах, большай жа часткай засталіся ў рукапісах. Адшукаў у архіве рукапіс рамана-хронікі М. Гарэцкага «Віленскія камунары». Пісаў артыкулы па пытаннях беларускай мовы, захавання помнікаў беларускай культуры. Архіў Я. Шутовіча захоўваецца ў ЦНБ АН Беларусі.

Я. М. Кісялёва.

Бібліяграфія

І.3.

1927. Таварыства Беларускае Школы ў Вільні // Беларускі каляндар. Вільня // Пад крыпт. Я. Ш-ч. Аўт. спрэч.

1932. Беларускае студэнства — тварам да вёскі! // Бел. крыніца. 13 сак.

1934. Адам Гурыновіч // Шлях моладзі. № 3; Бел. крыніца. 11 сак.

1935. Адам Гурыновіч // Калоссе. № 1; Песняры-юбіляры // Там жа. № 4.

1936. Праўныя парады // Беларускі сялянскі каляндар на 1937 год. Вільня.

1937. Цішка Гартны // Шлях моладзі. № 16 / Пад крыпт. Я. Ш.

1938. Вялікі грузінскі паэт і яго паэма; Алесь Гурло // Калоссе. № 2; 10 год літаратурнай творчасці М. Машары // Там жа. № 11; Шлях моладзі. № 26 / Пад крыпт. Я. Ш.

1939. Паўлюк Трус // Шлях моладзі. № 6 / Пад крыпт. Я. Ш.

1940. Юбілей кс. Адама Станкевіча; На пройдзеным шляху // Ксёндз Адам Станкевіч... Вільня; Юбілей Адама Станкевіча // Крыніца. 12 студз.

1957. Мастак Пётр Сергіевіч // Беларусь. № 9.

1960. Чалавек стварае цуды // Голас Радзімы. № 26; Новая знаходка // Там жа. № 41; ЛіМ. 31 мая; Слаўны юбілей // Голас Радзімы. № 43; Юбілей старэйшага мастака // Там жа. № 53; «Калючая ружа» на хвалях эфіру; Голас радыёслухача // Там жа. № 95; Юбілей садавода — мічурынца // Там жа. № 97.

1961. Мае пажаданні // Голас Радзімы. № 3; Сардэчны сябра народнага паэта // Там жа. № 7; Прапагандуйце, чытайце, любіце яе // Там жа. № 15—16; Выдатная опера // Там жа. № 26; Мужнае жыццё // Там жа. № 29; Жыццё ў барацьбе: Якуб Колас пра аднаго са сваіх сяброў // ЛіМ. 7 крас.

1962. Святкаванне купалаўскага юбілею ў братняй Літве // Голас Радзімы. № 56.

1963. Максім Гарэцкі // Голас Радзімы. № 17; Ніва. 17 сак.; У беларускага Карчагіна // Голас Радзімы. № 21; Кампазітар Галкоўскі // Ніва. 14 крас.

1964. Каштоўнае выданне // Полымя. № 7; Памяці паэта-рэвалюцыянера // Ніва. 5 крас.

1966. Гурыновіч Адам: (Паводле старых і новых архіўных матэрыялаў) // Полымя. № 11.

1.4.

1927. Міцкевіч А. Паварот таты: [Верш] / З пол. // Бел. крыніца. 9 снеж. / Пер. пад крыпт. І. Ш.

1961. Межалайціс Э. Дзе Нёман цячэ: [Верш] / З літ. // Голас Радзімы. № 22.

1967. Слуцкіс М. Цяпло; Апуціс Й. Дабіле; Поцюс А. Чорны камень; Востраў: [Апавяданні] / З літ. // Полымя. № 6 / Сааўт. пер. А. Шарахоўская.

1.5.

На ўкраінскую мову. Сучасна білоруська література // Назустріч (Львів). 1938. 15 квіт.

3.1.

ЦБ АН Літвы, аддз. рукап., ф. 21, адз. зах. 597; ЦНБ АН Беларусі, аддз. рукап., ф. 5. воп. 1, адз. зах. 1, с. 329.

З. У. Драздова.

ШУТЭНКА ГАЎРЫІЛ

Шутэнка Гаўрыіл Карнеевіч (н. 24.6.1924, с. Арзгір Стаўрапольскага краю), паэт. Член СП Беларусі з 1970. Піша на рускай мове.

Сын сялян Домны Тарасаўны і Карнея Кірылавіча Шутэнкаў. Бацька быў забіты фашыстамі ў 1942. Пасля заканчэння школы ФЗН пры швейнай фабрыцы імя В. Валадарскага ў Баку ў 1940 Г. Шутэнка працаваў рабочым на гэтай жа фабрыцы. У 1942, у 18-гадовым узросце, пайшоў на фронт, быў разведчыкам. Пасля цяжкага ранення ў баі пад сялом Багародзічнае (Данбас) назаўсёды страціў зрок. З 1943 да 1946 працаваў старшынёй касы ўзаемадапамогі калгаса «Парыжская камуна» (ст. Мар'інская Стаўрапольскага краю), пазней культработнікам у таварыстве сляпых Кіраўскага раёна. У 1946 Г. Шутэнка прыехаў на Беларусь пагасцяваць да старэйшага брата. Беларускі край вельмі спадабаўся, і ён застаўся тут назаўсёды. Неўзабаве стаў членам Беларускага таварыства сляпых, доўгі час працаваў у ім культработнікам, рабочым і інш. З 1963 на творчай працы. У 1964 скончыў вышэйшыя паэтычныя курсы Літаратурнага інстытута імя М. Горкага. Узнагароджаны ордэнам Вялікай Айчыннай вайны I ступені, медалямі «За баявыя заслугі», «За перамогу над фашысцкай Германіяй» і інш., дзвюма Ганаровымі граматамі Вярхоўнага Савета Беларусі.

Друкавацца Г. Шутэнка пачаў у 1939 (верш «Пра трактарыстку» ў газеце «Стахановец» паліт-аддзела Мар'іна-Зольскай МТС Георгіеўскага р-на Стаўрапольскага краю). Уплыў на будучага паэта аказалі лермантаўскія мясціны, Пяцігорск, непадалёку ад якога ён жыў. Пачынаючы з 1952, вершы Г. Шутэнкі сталі друкавацца ў Беларусі. Пазней яны склалі першую кнігу «Мае вочы». Так чалавек нялёгкага лёсу знайшоў сваё прызванне ў паэтычнай творчасці, якая вызначаецца аптымізмам, напоўнена гукамі і фарбамі той зямлі, што стала яму роднай. Тэма Вялікай Айчыннай вайны — адна з асноўных у яго творчасці (кнігі «Памяць», «Смага»). Шмат вершаў паэт прысвяціў Навагрудку, рацэ Нёман, возеру Свіцязь. Піша для дзяцей. Некаторыя яго вершы пакладзены на музыку.

Жыве ў Навагрудку.

Л. А. Бялевіч.

1.2.

Мои глаза: Стихи. Мн., 1961. Рэц.: Бойка У. Шчодрае сэрца // ЛіМ. 1961. 14 ліп.

Память: Стихи. Мн., 1969. Рэц.: Макарчык У. Заўсёды ў страі // Маладосць. 1970. № 5; Тепляков Г. Стихи — на линии огня // Соц. Донбасс. 1970. 24 февр.; Чекин В. Память сердца // Гродн. правда. 1970. 6 янв.; Ягож. Сквозь фронтовые дали... // Сел. газ. 1970. 29 нояб.

Жажда: Стихи. Мн., 1974. Рэц.: Гаўрусёў С. Урок мужнасці // Беларусь. 1975. № 2; Марціновіч А. Праўда адна — ленінская // Вяч. Мінск. 1974. 24 вер.; Паценко Н. Жажда жизни // Гродн. правда. 1975. 21 янв.; Сапожков Ю. Искусство доброты // Сов. Бел. 1974. 3 сент.

Наш котенок Димурлы / Для дошк. возраста. Мн., 1978. Рэц.: Голуб Ю. Про озорника Димурлы // Гродн. правда. 1978. 25 нояб.

Солнце на ресницах: Строки разных лет. Мн., 1984. Рэц.: Чекин В. «...Светом мирного дня» // Гродн. правда. 1984. 1 сент.

Горит костер воспоминаний: Стихи. Мн., 1990.

1.3.

1952. Я партию славлю: [Верш] // Гродзен. праўда. 12 крас.; Чырв. звязда. 5 кастр.

1953. Дубки; От Волги до Дона: [Вершы] // Сталин. молодежь. 18 янв.; Я партию славлю: [Верш] // Там жа. 31 марта; Связистка: [Верш] // Там жа. 24 июня; На Немане: [Верш] // Чырв. звязда. 1 сак.; Связистка; «Мне приятно, подруга, с тобою...»: [Вершы] // Там жа. 24 мая; Цветет мой край: [Верш] // Там жа. 23 вер.; Мои права: [Верш] // Там жа. 5 снеж.; Комсомольский билет; Родные просторы; Надя; Артиллерист; Снова в строю: [Вершы] // Там жа. 15 снеж.

1954. Едет молодежь: [Верш] // Гродзен. праўда. 28 сак.; «Любой из нас...»; «Девушку такую не любить нельзя...»: [Вершы] // Там жа. 16 мая; Родной республике: [Верш] // Там жа. 3 ліп.; Дубки: [Верш] // Там жа. 28 жн.; Великому земляку А. Мицкевичу: [Верш] // Там жа. 28 ліст.

1955. Шофер: [Верш] // Сов. Отчизна. № 3; Вместе с тобою: [Верш] // Гродзен. праўда. 20 сак.; Тетрадь; Пионерам; На посту; Барельеф: [Вершы] // Там жа. 24 крас.; «Чтоб ценить еще сильней...»; Наборщик: [Вершы] // Там жа. 5 чэрв.; «Чтоб ценить еще сильней...»: [Верш] // Там жа. 31 ліп.; Снова в строю: [Верш] // Там жа. 18 вер.; Мой сосед: [Верш] // Там жа. 23 кастр.; В нашей школе; Елочка: [Вершы] // Там жа. 25 снеж.; «Мне ордер выдан...»: [Верш] // Сов. Бел. 6 окт.; Футболка: [Верш] // Сталин. молодежь. 15 июня.

1956. Связистка; Дубки: [Вершы] // Нёман. Гродна; Артиллерист; «Солнца луч...»: [Вершы] // Сов. Отчизна. № 5; Родине: [Верш] // Гродзен. праўда. 20 мая; «Мне приятно, подруга, с тобою...»: [Верш] // Там жа. 19 жн.; Где ты?: [Верш] // Там жа. 2 снеж.

1957. Учителю: [Верш] // Гродзен. праўда. 26 мая.

1958. Флаг над Городечно: [Верш] // Неман. № 2; К переднему краю: [Верш] // Гродзен. праўда. 25 мая; Растут молодежи колонны: [Верш] // Там жа. 28 чэрв.; Цветет Беларусь: [Верш] // Калг. праўда. 2 жн.

1959. В новогодний вечер; Мое счастье: [Верш] // Сов. Отчизна. № 1; Здравствуй, весна!: [Верш] // Гродзен. праўда. 19 крас.; Мое спасибо: [Верш] // Там жа. 29 ліст.; Памяці паэта // ЛіМ. 16 мая.

1960. Мы гордимся: [Верш] // Гродзен. праўда. 3 крас.; Дочери: [Верш] // Там жа. 5 чэрв.

1961. Родился сын; Пришла любовь; В пути: [Вершы] // Гродзен. праўда. 7 лют.; Весна в Заполье: [Верш] // Там жа. 2 крас.; Мы выполним великую программу: [Верш] // Там жа. 8 жн.; Вдохновенье; Мечты: [Вершы] // Там жа. 3 вер.

1962. «Мне дорог край...»: [Верш] // Гродзен. праўда. 14 студз.; Боритесь!: [Верш] // Там жа. 3 чэрв.; Космонавтам А. Николаеву и П. Поповичу: [Верш] // Там жа. 21 жн.; Вот это темпы: [Верш] // Там жа. 26 жн.; Остров свободы: [Верш] // Там жа. 27 кастр.; Лес шумит: [Верш] // Там жа. 4 ліст.; Первыми нам идти: [Верш] // Там жа. 16 снеж.

1963. С Новым годом!: [Верш] // Гродн. правда. 1 янв.; Вместо напутствия: Маленькая поэма // Там жа. 6 янв.; Фронтовому другу: [Верш] // Там жа. 3 февр.; Я голосую: [Верш] // Там жа. 3 марта; Опять к Луне!: [Верш] // Там жа. 5 апр.; Малышам: [Верш] // Там жа. 13 апр.; Газетчикам: [Верш] // Там жа. 5 мая; Ленин с нами: [Верш] // Там жа. 19 мая; Навстречу Пленуму: [Верш] // Там жа. 9 июня; Вот это работа!: [Верш] // Там жа. 16 июня; Небесной сестре: [Верш] // Там жа. 20 июня; Над Бугом: [Верш] // Там жа. 6 июля; «О партии думы мои...»: [Верш] // Там жа. 30 июля; Беларусь: [Верш] // Там жа. 14 сент.; Новогрудские огни: [Верш] // Там жа. 20 окт.; Огонь Октября: [Верш] // Там жа. 7 нояб.; Строителям слава!: [Верш] // Там жа. 13 нояб.; «Мне дорог край...»: [Верш] // ЛіМ. 19 сак.

1964. Павшим друзьям; Юность моя; Дети: [Вершы] // Неман. № 2; С Новым годом!: [Верш] // Гродн. правда. 1 янв.; Комсомол: [Верш] // Там жа. 5 янв.; Орденоносцам: [Верш] // Там жа. 21 февр.; Подругам: [Верш] // Там жа. 8 марта; Самому первому: [Верш] // Там жа. 12 апр.; Юность моя: [Верш] // Там жа. 23 мая; В венок Кобзарю: [Верш] // Там жа. 31 мая; Мы — ленинцы: «И причалы, и простор заречный...»: [Вершы] // Там жа. 20 июня; Моя республика: [Верш] // Там жа. 7 авг.; Песня о партизане Белуше: [Верш] // Там жа. 26 сент.; Новогрудчина: [Верш] // Там жа. 1 нояб.; Артиллеристы: [Верш] // Там жа. 18 нояб.; Счастья всем!: [Верш] // Там жа. 30 дек.

1965. Моя песнь: [Верш] // Гродн. правда. 23 янв.; Память: [Верш] // Там жа. 13 февр.; Мы протестуем!: [Верш] // Там жа. 3 марта; Ура героям: [Верш] // Там жа. 20 марта; Прочь от Вьетнама!; «Дарю тебе подснежники...»: [Вершы] // Там жа. 7 мая; Славлю песней: [Верш] // Там жа. 26 июня; Два солнца; Туристическое; Моя норма: Новые стихи // Там жа. 22 авг.; Неманскому краю: [Верш] // Там жа. 4 сент.; Романтика: [Верш] // Там жа. 31 окт.; Великое знамя: [Верш] // Там жа. 20 нояб.; Моя песнь: [Верш] // Заря. 16 апр.

1966. Песня о партизане Белуше: [Верш] // Неман. № 1; На туристских тропах: [Верш] // Там жа. № 9; «Ты защитила власть Советов...»: [Верш] // Гродн. правда. 23 февр.; С тобой, партия!; На приморском бульваре; В санатории «Россия»: [Вершы] // Там жа. 25 марта; Интернационал: [Верш] // Там жа. 12 апр.; Беларусь родная: [Верш] // Там жа. 31 июля; Свитязь: [Верш] // Там жа. 9 окт.; Большевик: [Верш] // Там жа. 6 нояб.

1967. Мой город: [Верш] // Гродн. правда. 15 янв.; Мой брат: [Верш] // Там жа. 29 янв.; Чабанские звезды: [Верш] // Там жа. 15 апр.; Память: [Верш] // Там жа. 11 мая; Пожелание: [Верш] // Там жа. 9 сент.; За мир стоит моя Россия: [Верш] // Там жа. 16 сент.; Родная власть Советов: [Верш] // Там жа. 16 дек.; «Когда приходит сон к саперу...»: [Верш] // Заря. 1 дек.

1968. «Я не хочу...»: [Верш] // Неман. № 2; Ласточка: [Верш] // Там жа. № 10; Родство: [Верш] // Там жа. № 12; Пусть будет мир: [Верш] // Гродн. правда. 1 янв.; Иван Дубовик: [Верш] // Там жа. 18 янв.; Шумит Налибокская пуща: [Верш] // Там жа. 9 февр.; В степях донецких; Твое лицо: [Вершы] // Там жа. 22 февр.; Весне: [Верш] // Там жа. 23 марта; Черешлянка: [Верш] // Там жа. 31 мая; Наша Ласточка // Там жа. 29 июня; Мы с тобой, Вьетнам!: [Верш] // Там жа. 26 июля; Сыновья; В бою: [Вершы] // Там жа. 10 авг.; Родная Беларусь; Мой город; Растут сыновья; Строитель; Я остаюсь солдатом; Родина; На рыбалке; «Думают иные...»: [Вершы] // Там жа. 31 авг.

1969. «Думают иные...»: [Верш] // Неман. № 10; Космодром: [Верш] // Гродн. правда. 12 апр.; Мое солнце; Колодец: [Вершы] // Там жа. 31 мая; Поездка: [Вершы] // Там жа. 12 июля; Польским друзьям; Ромашки Белоруссии; Перед жатвой; М. Ю. Лермонтову; «Машук швыряется обломками грозы...»; Пятигорское

утро: [Вершы] // Там жа. 27 сент.; В Минске; На Машуке; «Невозможно выразить словами...»; Твои зеленые глаза; «Уж давно отпели соловьи...»;«Ему бы в дальнюю дорогу...»: [Вершы] // Там жа. 1 нояб.; Мечта: [Верш] // Там жа. 29 нояб.

1970. Вереск: [Вершы] // Неман. № 11; Интернационал; Строитель; Утро; Павшим друзьям; Я не хочу: [Вершы] // Вяч. Мінск. 7 вер.; Пятигорское утро; Лермонтову; Ромашки Белоруссии; «Невозможно выразить словами...»: [Вершы] // Там жа. 29 кастр.; Родная армия: [Верш] // Гродн. правда. 7 марта; Здравствуй, Ильич!: [Верш] // Там жа. 29 апр.; Ветераны зажгли огонек; На посту; «Не принесли покоя годы...»; Красным следопытам: [Вершы] // Там жа. 17 окт.; Знамя Октября: [Верш] // Там жа. 6 нояб.; На посту: [Верш] // Там жа. 10 нояб.

1971. Родство; Заходите сегодня ко мне: [Вершы] // Вяч. Мінск. 17 чэрв.; Ты будешь жить!: [Верш] // Гродн. правда. 23 янв.; Надежда: [Верш] // Там жа. 30 янв.; Новогрудчина: [Верш] // Там жа. 27 апр.; Радость: [Верш] // Там жа. 29 мая; Счастье: [Верш] // Там жа. 29 июня; В непогодь: [Верш] // Там жа. 14 авг.

1972. Заходите сегодня ко мне: [Верш] // Дзень паэзіі — 72. Мн.; Победа: [Верш] // Гродн. правда. 9 мая; Памяти отца моего: [Верш] // Там жа. 3 июня.

1973. Дружба: [Верш] // Гродн. правда. 23 июня; Заходите сегодня ко мне: [Верш] // Сел. газ. 16 сент.

1974. Мой брат; Солдаты мира: [Вершы] // За тебя, Беларусь. Мн.; Мои глаза; На дороге: [Вершы] // Во славу Родины. 27 окт.; «...Пою о тех, кто счастье строит»: [Вершы] // Вяч. Мінск. 24 чэрв.; Родина; Твои глаза; Побратимы; Судьба моя светла; Дружба: [Вершы] // Гродн. правда. 22 июня; Боевым побратимам; Благодарность; «Я из края...»; «Край новогрудский...»: [Вершы] // Сел. газ. 23 июня.

1975. В строю: [Верш] // Гродн. правда. 22 февр.; Людмиле Сечко: [Верш] // Там жа. 8 марта; Женщине: [Верш] // Там жа. 15 марта.

1976. «Я хотел сравнить тебя с цветами...»: [Верш] // Вяч. Мінск. 7 ліп.; Лес; «Рассвет улегся на живот...»: [Вершы] // Гродн. правда. 24 янв.; Наш котенок Димурлы: [Верш] // Там жа. 19 июня; Не забудьте: [Верш] // Сел. газ. 9 мая.

1977. Встреча; Благовещенск; Багульник: [Вершы] // Гродн. правда. 27 авг.; Под знаменем Октября: [Верш] // Там жа. 19 нояб.; Дорога; Багульник; На передовой: [Вершы] // Сел. газ. 31 дек.

1978. На границе: [Верш] // Гродн. правда. 20 мая; Каждая строчка: [Верш] // Там жа. 7 окт.; Родина: [Верш] // Сел. газ. 13 авг.; Внук: [Верш] // Там жа. 24 сент.

1979. «Знали мы, что эти хлопцы будут...»: [Верш] // Гродн. правда. 20 янв.; К товарищу: [Верш] // Там жа. 12 мая; Бессмертие; «Улеглась пенсионною папкой...»: [Вершы] // Там жа. 20 окт.; Налибокская пуща; Воронча: [Вершы] // Там жа. 1 дек.

1980. В Бресте: [Верш] // Гродн. правда. 31 мая; «Для нас вы были светлою мечтою...»: [Верш] // Там жа. 4 окт.; Беларусь; Восторг; «Спешит на Свитязь...»: [Вершы] // Там жа. 1 нояб.

1981. Николаю Островскому: [Верш] // Гродн. правда. 10 янв.; «Отчего в моих стихах улыбки...»: [Верш] // Там жа. 7 марта; Катюша: [Верш] // Там жа. 9 мая; Поиски; Восторг; «Хотел бы я...»: [Вершы] // Там жа. 4 июля; Людей хороших очень много; Баку; «Могу сказать, что счастлив я...»: [Вершы] // Там жа. 5 сент.; Вспомнились дни: [Верш] // Там жа. 12 дек.

1982. Я хочу стать кружевницей; «Катилось солнце, раскаляясь...»; Я из Арзгира; «...В бою мы не могли...»: [Вершы] // Гродн. правда. 6 марта; «Умылись дождями рассветы...»; «Мне опять бы в Тынду...»: [Вершы] // Там жа. 8 мая; Антон: [Верш] // Там жа. 26 июня; Петушок наш Карфаген: [Верш] // Там жа. 7 авг.; «Стою, как в кабине темной...»; «В лес вошел...»: [Вершы] // Там жа. 20 нояб.; Богатыри: [Верш] // Там жа. 25 дек.

1983. «Прикури-ка мне, друг, чтоб ровнее горело...»: [Верш] // Гродн. правда. 5 февр.; На страже мира; Партизанскими тропами: [Вершы] // Там жа. 12 окт.; Миру — мир: «Катилось солнце, раскаляясь...»: [Вершы] // Там жа. 31 дек.

1984. Над Донцом; Землякам; Литовка; Спасибо вам, новогрудчане: [Вершы] // Гродн. правда. 12 мая; «Отчего в моих стихах улыбки...»: Фартук: [Вершы] // Там жа. 23 июня; Спасибо вам, новогрудчане; Восторг: [Вершы] // Сел. газ. 30 авг.

1985. Погиб я в 43-м; «Я твою косу тугую...»: [Вершы] // Гродн. правда. 5 янв.; Литовка: [Верш] // Там жа. 2 марта; Победа: [Верш] // Там жа. 17 авг.

1.5.

На беларускую мову. Свіцязь: [Верш] / Пер. П. Прыходзька // Беларусь. 1967. № 2; Сябрам, якія загінулі: [Верш] / Пер. А. Гранчык // Там жа. 1968. № 5; Нёманскаму краю: [Верш] / Пер. А. Гранчык // Гродн. правда. 1968. 28 дек.; У санаторыі «Крыніца»: [Верш] // Беларусь. 1969. № 8; Улетку: [Верш] / Пер. А. Гранчык // Гродн. правда. 1969. 10 янв.; Заўсёды ў страі: [Верш] // Вожык. 1970. № 8; Віншую з перамогай: [Верш] / Пер. А. Гранчык // Гродн. правда. 1970. 9 мая; Ранак: [Верш] / Пер. А. Гранчык // Звязда. 1970. 6 жн.; Чарашлянка; Маё шчасце: [Вершы] / Пер. В. Шымук // Наст. газ. 1970. 30 снеж.; Прыгажосць: [Верш] / Пер. А. Гранчык // Там жа. 1971. 26 мая; Рупнасць: [Верш] / Пер. Ю. Голуб // Звязда. 1974. 21 вер.; Унук: [Верш] / Пер. Г. Дзмітрыеў // Вясёлка. 1984. № 6; Пеўнік: [Верш] / Пер. Г. Дзмітрыеў // Там жа. 1984. № 8; Загінуўшым сябрам; «Не страляюць...»; «Ён не ўпаў...»; Навагрудак: [Вершы] / Пер. В. Шымук // ЛіМ. 1984. 22 чэрв.; Унук: [Верш] / Пер. Г. Дзмітрыеў // Ніва. 1985. 20 студз.

На літоўскую мову. Nade; «Ramybės metai nedalina...»; «Kada Kazachstano stepėj...» / Vert. R. Graibus // Mūsu žodis. 1978. Nr 5; Susitikimo rytas / Vert. R. Graibus // Tiesa. 1978. Spalio 7; Ramybės metai nedalina / Vert. R. Graibus // Tiesa. 1978. Lapkr. 21; Akiu šviesa / Vert. R. Graibus // Tiesa. 1978. Geg. 19.

2.3.

На беларускай мове. Андрэеў І., Левін У. Каляровыя сны // Беларусь. 1980. № 5; Гаўрылу Шутэнку — 60: [Віншаванне] // ЛіМ. 1984. 22 чэрв.; Калюта І., Левін У. Памяць пра сонца // Там жа. 1971. 17 вер.; Каралёў М. «Я знайшоў для песень словы...» // Там жа. 1984. 12 кастр.; Левін У. Агонь натхнення // Чырв. змена. 1981. 5 лют.; Пастрон Р. Прага жыцця // ЛіМ. 1978. 24 лют.; Пісьменнікі Савецкай Беларусі: Кароткі даведнік. Мн., 1981; Рашкоўскі Л. Праметэяў агонь: Нарыс // Чырв. змена. 1971. 7 снеж.; Федзюковіч М. Вачамі памяці // ЛіМ. 1974. 28 чэрв.; Фомчанка А. Песня стала байцом // Вяч. Мінск. 1970. 7 вер.

На літоўскай мове. Usinavičius J. Žeme, duok jegų iš tamsos išsiveržti // Mūsų žodis. 1978. Nr 5.

На рускай мове. Быков В. Свежо и проникновенно // Гродн. правда. 1974. 22 июня; Голуб Ю. Юным шагнул в разрывы...: (К 60-летию поэта Г. К. Шутенко) // Там жа. 1984. 23 июня; Дайлида В. «Но я за солнце отдал зренье...» // Знамя юности. 1985. 26 мая; Ераминок В. «...Всегда на линии передовой» // Заря. 1977. 26 июля; Карпюк А. Рождение поэта: Очерк // Гродн. правда. 1976. 10 янв.; Нидер А. Адреса переписки: Ленинград, космос, Новогрудок // Там жа. 1983. 26 февр.; Ягож. Трудное счастье // Там жа. 1979. 21 марта.

2.4.

На беларускай мове. Шушкевіч С. Ты запаліў душы сваёй святло: [Верш] // Шушкевіч С. Рэха маладосці. Мн., 1984; Янчанка М. Дзіва: [Верш] // Янчанка М. Кросны. Мн., 1980.

В. У. Смольская.

ШУЦЬКО ІВАН

Шуцько Іван Цітавіч (20.12.1925, в. Гаць Крупскага р-на Мінскай вобл.— 31.8.1984, г. п. Крупкі, пахаваны на пасялковых могілках), паэт, празаік. Член СП Беларусі з 1954.

Нарадзіўся ў сялянскай сям'і. У 1939 скончыў Выдрыцкую сямігодку і паступіў у 8-ы клас Крупскай СШ, дзе вучыўся да 1940. Працаваў у Крупскім раённым камітэце радыёінфармацыі (1940—41). У Вялікую Айчынную вайну, у лістападзе 1943, разам з іншымі вяскоўцамі І. Шуцько быў вывезены ў нямецкі канцэнтрацыйны лагер «Троіль» (у ваколіцах цяперашняга Гданьска). У 1944 яму ўдалося ўцячы з лагера і пасля доўгіх блуканняў вярнуцца ў родную вёску. У 1944—45 служыў у асобным кулямётна-артылерыйскім батальёне на Беларускім фронце. Затым у складзе савецкіх войск знаходзіўся ў Польшчы. Пасля дэмабілізацыі працаваў брыгадзірам калгаса ў сваёй вёсцы (1947—57). У 1958—61 літсупрацоўнік крупскай раённай газеты «Голас калгасніка». У 1959 скончыў 10 класаў школы рабочай моладзі (г. п. Крупкі). Вучыўся на Вышэйшых літаратурных курсах у Маскве (1961—63). З 1963 літсупрацоўнік, з 1964 фотакарэспандэнт крупскай раённай газеты «Ленінскім курсам». Узнагароджаны медалямі.

Першая публікацыя І. Шуцько (верш «У ціры») з'явілася яшчэ ў школьныя гады ў 1940 у газеце «Піянер Беларусі». Рэгулярна выступаць у друку пачаў з 1949. Першы зборнік яго вершаў «Мой мяч» выйшаў у 1953. Аўтар зборнікаў дзіцячых вершаў «Лепшая сяброўка», «Першае слова», апавяданняў «Дзедава рэліквія» і «Дзіма хоча быць героем», казак «Чужая хатка», зборніка баек і вершаваных мініяцюр «Са свайго пункту гледжання». У вершах І. Шуцько адчуваецца добрае веданне псіхалогіі вясковых дзяцей. Паэта цікавіць іх унутраны свет, дзіцячая шчырасць. Творы пісьменніка перакладаліся на латышскую, рускую, украінскую і іншыя мовы.

Г. М. Урупіна.

Бібліяграфія

1.2.

Мой мяч: Вершы. Мн., 1953.

Чужая хатка: Казкі. Мн., 1958.

Лепшая сяброўка: Вершы. Мн., 1959. Рэц.: Пестрак П. Каб дружба была сапраўдная // Полымя. 1960. № 10.

Дзедава рэліквія: Апавяданні. Мн., 1960.

Першае слова: Вершы. Мн., 1964.

Дзіма хоча быць героем: Апавяданні. Мн., 1965.

Са свайго пункту гледжання: Вершы, байкі, мініяцюры. Мн., 1966 (Б-ка Вожыка) / Сааўт. М. Макаеў, М. Смагаровіч.

1.3.

1940. У ціры: [Верш] // Піянер Бел. 24 кастр.

1941. Свіны язык: Апавяданне // Іскры Ільіча. № 3; На ўроку: Апавяданне // Піянер Бел. 9 сак.; Першы май: [Верш] // Там жа. 1 мая.

1947. Няўдалы майстар: [Верш] // Бярозка. № 9; Выбух: Апавяданне // Там жа. № 10.

1949. У навагодні вечар: [Верш] // Бярозка. № 1.

1950. У непагоду; Смелы заяц: [Вершы] // Бярозка. № 2; Наш Кастрычнік: [Верш] // Там жа. № 11; Сын: Апавяданне // Полымя. № 5; Родине: [Верш] // Зорька. 1 янв.

1952. Зінін дыван; Зімою: [Вершы] // Бярозка. № 2; Яршова праўда: [Казка] // Там жа. № 8; На лыжах: [Верш] // Піянер Бел. 4 студз.

1953. Няўдалы майстар; Пасадзім сад; Жарабятка: [Вершы] // Бярозка. № 8; Новы дом; Вожык; Мой мяч; Мая сяброўка: [Вершы] // Работніца і сялянка. № 10; Вожык: [Верш] // ЛіМ. 18 ліп.

1954. Мой тата: [Верш] // Бярозка. № 1; Яечка: [Верш] // Там жа. № 9; Выхваляцца не хачу: [Верш] // Работніца і сялянка. № 4.

1955. Рэха: [Верш] // Бярозка. № 9; Сваты: [Верш] // Калг. праўда. 4 вер.; Юнат: [Верш] // Піянер Бел. 16 вер.

1957. Памылка: Апавяданне // Бярозка. № 1; Белалобая: Апавяданне // Там жа. № 5; Сцяжынка: [Верш] // Там жа. № 9; Юркава дапамога: Апавяданне // Вясёлка. № 1; Мая машына: [Верш] // Там жа. № 2; Добры памочнік // Там жа. № 4; Жураўлі; Буду юнатам: [Вершы] // Там жа. № 6; Лепшая сяброўка: [Верш] // Піянер Бел. 22 сак.

1958. Чырвоная рэчка: Апавяданне // Бярозка. № 10; Ласун; Два сады: [Вершы] // Вясёлка. № 2; Азбука: Апавяданне // Там жа. № 9; Упартыя галкі: Апавя-

данне // За вярт. на Радзіму. № 74; Дзедава ёлачка // Там жа. № 96.

1959. Два сады; Загадка; Мая машына; Вавёрка; Рыбак; Жураўлі; Восень; Змена: [Вершы] // Мы спяваем. Мн.

1960. Першая дарога: [Верш] // Вясёлка. Мн.; Яечка; Новы дом; Жураўлі; Пачатак зімы; Верабей; У навагодні вечар; Сакавік; Бусел; Першамай; Два сады; На лыжах; Самі; Шпакі; Мой тата: [Вершы]; Смелая ўнучка: [Апавяданне] // Дзецям. Мн.; Смажаныя галавеньчыкі: Апавяданне // Мін. праўда. 7 вер.; Знайшоўся: [Верш] // Піянер Бел. 11 сак.

1961. Ласун: [Верш] // Для школьнай эстрады. Мн.

1963. Новы звеннявы: Апавяданне // Бярозка. № 2; Кран: [Верш] // Там жа. № 8; Бора такі, як ёсць: Апавяданне // Там жа. № 10; Загаварыўся; Пілі за здароўе...; Сэканомілі: [Вершы] // Вожык. № 4; Сіла прывычкі: [Верш] // Там жа. № 8; Апраўдаўся: [Жарт] // Вясёлка. № 4; Ніва. 22 вер.; Канец мянушкі: [Апавяданне] // Вясёлка. № 5; Мае санкі; Сняжок: [Вершы] // Работніца і сялянка. № 2; Сіла прывычкі: [Верш] // Ніва. 2 чэрв.

1964. Халасцяк-бюракрат; Зайздрослівы конік: [Вершы] // Мініяцюры і карыкатуры. Мн.; Хітры Ігнат: [Верш] // Бярозка. № 9; Дадатковыя звесткі: Гумарэска // Там жа. № 11; Мазоль і лайдак; Рэшата і збанок: Мініяцюры // Вожык. № 20; Перахітрыла; На каньках: [Вершы] // Вясёлка. № 1; Чые алоўкі лепшыя; Востры язычок; Кавалі: [Вершы] // Там жа. № 3; Задача: [Верш] // Там жа. № 5; Лепшая сяброўка: [Верш] // Ніва. 15 сак.; Не пайду гуляць: [Верш] // Там жа. 22 сак.; Прыход вясны: [Верш] // Там жа. 29 сак.; Сцяжынка: [Верш] // Там жа. 12 крас.; Ці любіць хто мышку: [Апавяданне] // Там жа. 19 крас.; Яршова праўда: [Апавяданне]; Вясною: [Верш] // Там жа. 26 крас.; Ганарлівы ручай: [Апавяданне] // Там жа. 3 мая; Хмарка заблудзілася: [Верш] // Там жа. 24 мая; Салавей; Дружная сям'я: [Апавяданні] // Там жа. 31 мая; Палахліўцы: [Апавяданне] // Там жа. 14 чэрв.; Пакіну другім; Самі: [Вершы] // Там жа. 19 ліп.; Спагадлівая ўнучка: [Верш] // Там жа. 9 жн.; Чаго дождж ідзе; Ласун; Разява: [Вершы] // Там жа. 20 вер.; Пацяжэў; Страшны звер: [Вершы] // Там жа. 27 вер.; Ножык: [Верш] // Там жа. 18 кастр.

1965. Мы яшчэ сустрэнемся: Апавяданне // Бярозка. № 10; Любіш катацца — любі саначкі вазіць: [Верш] // Ніва. 14 сак.; Задача: [Верш] // Там жа. 2 мая; Востры язычок: [Верш] // Там жа. 6 чэрв.

1966. Шпакоўня: [Верш] // Бярозка. № 3; Шчаслівае лета: [Апавяданне] // Піянер Бел. 1 ліп.

1967. Лічылачка; Кран; Разумныя козлікі; Дзяцельбудаўнік: [Вершы] // Арлянятам: У 2 т. Мн. Т. 1; Яечка: [Верш] // Нам светит солнце ясное. Мн.; Шкляны вузел: Гумарэска // Беларусь. № 8; Урок на лёдзе: Апавяданне // Бярозка. № 3; Адналюб; Свістун; Жар-птушка; Зялёны дождж: Паляўнічыя эцюды // Маладосць. № 12; Роднымі сцежкамі: Абразкі // ЛіМ. 24 кастр.; Саламяны капялюш: Гумарэска // Мін. праўда. 30 вер.

1968. У навагодні вечар: [Верш] // Мы веселые ребята. Мн.

1972. Гаючая крыніца: Апавяданне // Мін. праўда. 12 вер.

1974. Калі сябры жывуць у згодзе: [Апавяданне] // Вясёлка. № 1.

1975. У зімовым садзе; На лыжах; Зайкавы абноўкі: [Вершы] // Вясёлка. № 12.

1976. Заячая капуста: [Верш] // Бярозка. № 3.

1977. Незвычайны эскорт: Апавяданне // Бярозка. № 6.

1978. Подзвіг: [Нарыс] // Бярозка. № 2.

1979. Пісаў паэт пра перапёлку; Зайздроснік: [Вершы] // ЛіМ. 28 снеж.; Калі Пеця стаў Пятром: [Верш] // Наст. газ. 10 сак.; Не застаўся ў даўгу: [Верш] // Там жа. 22 вер.

1980. Фарбы восені: «Возіць восень у двары...»: [Вершы] // Мін. праўда. 21 ліст.

1981. Перспективная порода: Юмореска // Сел. хоз-во Белоруссии. № 6; Грамянок: Гумарыстычнае апавяданне // ЛіМ. 21 жн.; Ох, ужо гэтыя мужчыны!..: Гумарэска // Мін. праўда. 16 вер.

1982. Люблю я майстраваць; Дзіўны кош; На ўзлеску: [Вершы] // Бярозка. № 1; Заранка над Гарадзішчам: [Нарыс] // ЛіМ. 26 лют.

1983. Кран; Разумныя козлікі: [Вершы] // Вясянка. Мн.; Палахліўцы: [Казка] // Казкі беларускіх пісьменнікаў. Мн.; Снягурка: [Апавяданне] // Бярозка. № 1; Пацешка: [Верш] // Вясёлка. № 9; Навучыла: [Верш] // Там жа. № 12; Разумная дачушка; За дапамогай; Навучыў: [Вершы] // Мін. праўда. 7 снеж.; «Паліглот»: [Верш] // Ніва. 24 ліп.

1984. Яечка: [Верш]; Смелая ўнучка: [Апавяданне] // Дашкалятам. Мн.; Палахліўцы: [Казка] // Голас Радзімы. 9 жн.

1.5.

На латышскую мову. Uzticamie draugi // Bērnība. 1960. Nr 9.

На рускую мову. Практиканты; Привычка взяточника: Сатир. миниатюры / Пер. В. Смирнов // Закарпат. правда. 1967. 30 сент.; Копирка; Кто виноват?: [Вершы] / Пер. И. Василевский // Неман. 1967. № 7; Новые лыжи: [Верш] / Пер. Е. Андреев // Земля с лазурными очами. М., 1979.

На ўкраінскую мову. Коротко і ясно [Сатыр. мініяцюры]: Практиканты; Хоч по воду; З досвідом / Пер. В. Левицький // Вітчизна. 1969. № 10.

1.6.

Тры казкі: Руская загадка; Сквапны дзядзька; Як памёр кацёл // Бярозка. 1953. № 12 / Апрац.; Як поп пагарэў: Быль // Вясёлка. 1985. № 12 / Зап.

2.3.

На беларускай мове. Ваданосаў М. Мякіна і зярняты // ЛіМ. 1959. 3 кастр.; Іван Шуцько: [Некралог] // Там жа. 1984. 7 вер. Клышка А. Першае знаёмства // Там жа. 1954. 9 студз.; Копію зняў Іван Шуцько // Там жа. 1968. 19 сак.; Краўчанка У. Клапаціцца аб дзіцячай літаратуры // Наст. газ. 1958. 28 лют.; Нічыпарэнка С. [Біябібліяграфічная нататка да 60-годдзя нараджэння] // Полымя. 1985. № 12; Пісьменнікі Савецкай Беларусі: Кароткі даведнік. Мн., 1981; Халмагорскі С. Дробязі псуюць уражанне // ЛіМ. 1961. 23 мая.

У. М. Ларчанка.

ШУШКЕВІЧ СТАНІСЛАЎ

Шушкевіч Станіслаў Пятровіч [псеўд.: Я. Бор, Янка Бор, С. Койданаўскі, Саўка Койданаўскі, В. Эрнест, Вільгельм Эрнест, В. Эрнэст; крыпт.: С. Ш., Стах Ш., С. Ш. и В. М. (з Мараковым), С. Ш-ч, С. Ш—ч, Шуш, В. Э., Э—ст, В. Эрн; 6(19).2.1908, в. Бакінава Мінскага пав., цяпер Дзяржынскі р-н — 1.2.1991, Мінск, пахаваны ў в. Шчытомірычы Мінскага р-на], паэт, празаік. Член СП Беларусі з 1934. Заслужаны работнік культуры Беларусі (1983).

Нарадзіўся ў сям'і беззямельнага селяніна-парабка. Абставіны склаліся так, што сям'я вымушана была выехаць у Смаленскую губ. і толькі ў 1914 вярнулася ў Беларусь. Бацька знайшоў працу ў маёнтку Сенніца. У 1921 С. Шушкевіч пайшоў у 2-і клас мясцовай пачатковай школы. Вучыўся ў настаўніцы А. Сонцавай, якая ў 1889 вучыла Я. Купалу. У 1923—24 працаваў рабочым саўгаса «Шчытомірычы» Мінскай вобл. У 1924—26 вучыўся ў 11-й сямігадовай школе Мінска. На здольнага вучня звярнулі ўвагу школьныя настаўнікі — пісьменнік А. Бабарэка, мастакі А. Тычына і У. Кудрэвіч. Першы верш С. Шушкевіча надрукаваны ў газеце «Чырвоная змена» ў студзені 1924 і прысвечаны памяці У. І. Леніна. Пасля заканчэння сямігодкі (1926) С. Шушкевіч паступіў у Мінскі педагагічны тэхнікум, дзе выкладаў Я. Колас. У 1926 яго прынялі ў літаратурную арганізацыю «Маладняк». Васемнаццацігадовы паэт радасна вітаў жыццё, захоплена, рамантычна ўзнёсла ставіўся да рэчаіснасці, што было наогул уласціва маладнякоўцам. Пазней паэзія С. Шушкевіча набывае тэматычную змястоўнасць, напаўняецца жыццёвымі рэаліямі, заклапочанасцю лёсам чалавека (нізка вершаў «Заход», «Асінбуд», «Паходны марш» і інш.). Пасля 2-га курса педтэхнікума С. Шушкевіч пайшоў працаваць у Кніжную палату і Дзяржаўную бібліятэку БССР (1928—30). Потым загадваў бібліятэкай Навукова-даследчага інстытута сельскай і лясной гаспадаркі (1930—31), працаваў у рэдакцыях газ. «Літаратура і мастацтва» (1934—35), «Звязда» (1935—36). Адначасова вучыўся на крытычна-творчым аддзяленні літаратурнага факультэта Вышэйшага педагагічнага інстытута імя М. Горкага, які скончыў у 1934. 15.11.1936 С. Шушкевіч беспадстаўна арыштаваны і асуджаны на 8 год пазбаўлення волі. Знаходзіўся ў турме, лагеры, ссылцы; працаваў цесляром, шахцёрам, бухгалтарам саўгаса МУС у Кемераўскай вобл. (1937—46), вольнанаёмным бухгалтарам (1946). Вярнуўшыся на радзіму, працаваў настаўнікам СШ у Данілавічах Дзяржынскага р-на Мінскай вобл. (1946—49). У 1949 паўторна рэпрэсіраваны і высланы на спецпасяленне ў Краснаярскі край, дзе працаваў лесарубам, у геалагічных партыях і экспедыцыях (1950—56). Вярнуўшыся ў Мінск, працаваў у газ. «Мінская праўда» (1956—58), быў загадчыкам аддзела пісем газеты «Літаратура і мастацтва» (1958—70). З 1970 — пенсіянер. Канчаткова па абедзвюх справах рэабілітаваны 26.9.1975. Першая жонка С. Шушкевіча — пісьменніца А. Раманоўская. Іх сын, С. С. Шушкевіч, быў Старшынёй Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь (1991—94).

Друкавацца пачаў у 1924 у газ. «Чырвоная змена» (першыя публікацыі не выяўлены). Да першага арышту паспелі выйсці толькі 2 кнігі С. Шушкевіча — «Вершы» і «Звярыны баль». З 2-й паловы 1950-х г. ён зноў актыўна ўключыўся ў літаратурнае жыццё. Перажытае ў сталінскіх турмах і лагерах наклала яўны адбітак на яго паэзію, якая становіцца жыццёва сталай, разважлівай, часта засмучанай, хоць паэт і не страціў веры ў свой народ, паэтызаваў любоў да Бацькаўшчыны, сяброўства, каханне, апяваў прыгажосць роднай зямлі (зб. «Дарогаю вясны», «Услед за марамі», «Навальніца», «Сябрам»). Лепшыя вершы С. Шушкевіча вызначаюцца напружаным унутраным пачуццём, надзённасцю праблематыкі, успрымаюцца як споведзь пакалення, маналог сучасніка, які шмат перажыў і перадумаў (зб. «Рэха маладосці»). С. Шушкевіч вядомы і як празаік, аўтар шматлікіх кніг апавяданняў, казак, вершаў, пацешак для дзяцей («Лясная калыханка», «Сарочы церамок», «Мы на змену ідзём», «Гара Марата Казея», «Будзільнік», «Вясёлыя дзятлікі», «Колькі кіпцікаў у кошкі», «Дванаццаць пасланцоў», «Красавік», «Барадаты камар», «Ліса з магнітафонам», «Казачны церам»). Яго паэзія для дзяцей даступная, меладычная. Шмат якія яго вершы пакладзены на музыку беларускімі кампазітарамі Д. Лукасам, Л. Лявітавай, Ю. Семянякам, Я. Цікоцкім, М. Чуркіным. Ён аўтар шматлікіх успамінаў пра беларускіх пісьменнікаў старэйшага пакалення, сваіх сяброў і равеснікаў,

што разам з ім ішлі па складаных шляхах жыцця («Вяртанне ў маладосць»). Выступаў ён як крытык і перакладчык. За апошнія гады выйшлі кнігі яго лірыкі («Сонца над маім асеннім садам»), сатыры і гумару («Казёл на верталёце», «Грушы на вярбе»). Ён быў укладальнікам і каментатарам выбраных твораў М. Грамыкі «Родная пушча». Займаўся грамадскай работай, быў членам бюро секцыі дзіцячай літаратуры. Многія творы С. Шушкевіча перакладзены на рускую і ўкраінскую мовы. Узнагароджаны дзвюма Ганаровымі граматамі і Граматай Вярхоўнага Савета БССР. *Л. С. Савік.*

Бібліяграфія

1.1.

Выбр. тв.: У 2 т. Мн., 1978. Т. 1. Вершы, казкі. Т. 2. Апавяданні; Нарысы; Успаміны; Крытычныя эцюды. Рэц.: Кажамякін Ц. Радасная сустрэча // Гомел. праўда. 1979. 7 жн.; Клімуць Я. Слова мудрае, слова шчырае // Маг. праўда. 1979. 17 лют.; Ягож. Час творчых справаздач // Звязда. 1979. 13 студз.; Коўтун В. Нягасныя рабінавыя гронкі // ЛіМ. 1979. 15 чэрв.; Крупенька Я. «Шукаю чарадзейны ключык» // Чырв. змена. 1980. 10 студз.; Лиокумович Т. Созревшей нивы урожай // Заря. 1979. 26 сент.; Літвінаў Р. Глыбокі след // Полымя. 1979. № 6; Марціновіч А. Крынічнай чысціні талент // Наст. газ. 1979. 1 жн.; Міцура Т. Звоніць радасць словам маладым // Мін. праўда. 1979. 12 мая; Паўловіч В. І сталасць, і майстэрства // Віцеб. рабочы. 1979. 7 сак.; Хвесь Г. Разнастайнасць таленту // Голас Радзімы. 1979. 18 кастр.; Хорсун С. Дарыць цяпло душы // Вяч. Мінск. 1979. 4 вер.

Дарога ў залатую восень: Вершы. Мн., 1983 (Б-ка беларус. паэзіі). Рэц.: Кобрын У. Усё аддаць людзям душа гатова... // Мін. праўда. 1983. 22 ліст.; Шкут А. Адчуваць сябе маладым // Гомел. праўда. 1983. 8 ліп.

Выбранае: Вершы. Мн., 1988.

1.2.

Вершы. Мн., 1934. Рэц.: Шарахоўскі Я. На шляху паэтычнага самавызначэння // ЛіМ. 1934. 22 ліп.

Звярыны баль: Байка. Мн., 1936.

Лясная калыханка: [Вершы] / Для дашк. ўзросту. Мн., 1958. Рэц.: Данілевіч Л. Вершы для дзяцей // Наст. газ. 1958. 16 вер.; Іванова Л. Не ўсе вершы аднолькавыя // Наст. газ. 1959. 29 вер.; Скрыпка М. Шчырым голасам // ЛіМ. 1958. 23 жн.

Дарогаю вясны: Вершы. Мн., 1959. Рэц.: Палітыка Д. Дарогай вясны // ЛіМ. 1960. 16 студз.; Пушча Я. «Дарогай вясны» // Беларусь. 1960. № 2.

Сарочы церамок: Вершы / Для дашк. і малодш. ўзросту. Мн., 1959. Рэц.: Боган У. Добры падарунак маленькім // Мін. праўда. 1959. 24 кастр.; Замерфельд Я. Проста бусел ці дробнаўласніцкая птушка? // ЛіМ. 1959. 21 кастр.; Іванова Л. Не ўсе вершы аднолькавыя // Наст. газ. 1959. 29 вер.; Пушча Я. Маленькім чытачам // Полымя. 1960. № 1.

Мы на змену ідзём: Вершы // Для сярэд. ўзросту. Мн., 1961. Рэц.: Федчанка З. Шчырая размова з дзецьмі // Звязда. 1962. 10 лют.

Услед за марамі: Вершы. Мн., 1961. Рэц.: Варлен Б. [Бечык В.] З чалавечай дабратою // ЛіМ. 1961. 29 снеж.; Стральцоў М. Спадарожніца — маладосць // Полымя. 1962. № 3.

Гара Марата Казея: Вершы / Для сярэд. ўзросту. Мн., 1963. Рэц.: Гаўрусёў С. Без дакладнага адраса // Чырв. змена. 1963. 4 снеж.; Мірачыцкі Л. Цікавая сустрэча // Наст. газ. 1964. 8 лют.; Сідарэнка М. Свет дзіцячай душы // Мін. праўда. 1963. 20 снеж.; Шкраба Р. Пра дакладнасць слова і вобраза // Полымя. 1964. № 1.

Будзільнік: Вершы / Для дашк. ўзросту. Мн., 1966. Рэц.: Псікаў А. Паэзія маленства // Наст. газ. 1967. 10 чэрв.; Стральцоў М. ...І для дарослых // Полымя. 1967. № 8.

Навальніца: Вершы. Мн., 1966. Рэц.: Бойка У. Кельня мае форму сэрца // Мін. праўда. 1967. 11 жн.; Замерфельд Я. Ярка, запамінальна, праўдзіва // Чырв. змена. 1967. 16 сак.; Пруднікаў П. Улюбёнасць // Беларусь. 1967. № 5.

Апавяданні пра Марата Казея // Для сярэд. і старэйш. ўзросту. Мн., 1968. Рэц.: Парахневіч М. Сцежкамі юнага героя // Мін. праўда. 1968. 15 вер.; Пранузя П. З любоўю да героя // Наст. газ. 1969. 29 сак.; Радзіміч М. Парадніўся юнак з мужнасцю // Чырв. змена. 1969. 11 сак.

Вяртанне ў маладосць: Успаміны і нататкі. Мн., 1968. Рэц.: Базарэвіч М. Дарагія абліччы // Чырв. змена. 1969. 14 студз.; Грахоўскі С. Падарожжа ў літаратурную маладосць // Полымя. 1969. № 2; Звонак А. // Звязда. 1969. 12 лют.; Кудраўцаў І. Калі праз сэрца прапушчана // Вяч. Мінск. 1968. 30 ліст.; Лісоўскі М. // Гомел. праўда. 1968. 30 кастр.; Ліякумовіч Ц. З хваляваннем і любоўю // Маг. праўда. 1969. 26 лют.; Царанкоў Л. Незабыўнае // Маладосць. 1969. № 12; Шаўня А. Захавала ўдзячная памяць // Беларусь. 1969. № 1.

Грушы на вярбе: Вершы, байкі, эпіграмы. Мн., 1969 (Б-ка Вожыка). Рэц.: Парахневіч М. Смехам па агрэхам // Вяч. Мінск. 1969. 30 кастр.

Вясёлыя дзятлікі / Для дашк. ўзросту. Мн., 1970. Рэц.: Вікцюк П. У краіне шчырасці і даверу // ЛіМ. 1970. 29 мая; Літвінаў Р. // Наст. газ. 1970. 27 чэрв.; Слаўковіч Д. «Краем лесу ехаў зайка...» // Полымя. 1970. № 10.

Колькі кіпцікаў у кошкі: Вершы / Для дашк. ўзросту. Мн., 1972. Рэц.: Валькоўскі І. Чытай, тата, яшчэ... // Маг. праўда. 1972. 28 вер.; Даніленка М. Для нашых дзяцей // Гомел. праўда. 1972. 13 кастр.; Ягож. Размова з юным чытачом // Наст. газ. 1972. 5 снеж.; Літвінаў Р. З разуменнем дзіцячага свету // Полымя. 1973. № 3.

Сябрам: Вершы. Мн., 1972. Рэц.: Літвінаў Р. Блізкасць да жыцця // Беларусь. 1973. № 3; Ракаў В. Слоў жывучыя зярняты // Звязда. 1972. 19 вер.; Фомчанка А. Светлай раніцы падай руку // Вяч. Мінск. 1972. 27 вер.

Дванаццаць пасланцоў: Вершы // Для мал. шк. ўзросту. Мн., 1973. Рэц.: Кобрын У. Сто тысяч пасланцоў // ЛіМ. 1974. 31 мая; Мядзведзеў І. Сонечныя вершы // Наст. газ. 1974. 21 вер.

Барадаты камар: Вершы для дашк. ўзросту. Мн., 1977. Рэц.: Паўлюкоўскі І. Пяшчотна, замілавана // ЛіМ. 1978. 5 мая.

Красавік: Вершы і казкі // Для мал. і сярэд. шк. ўзросту. Мн., 1977. Рэц.: Бечык В. «Бо хораша на свеце так...» // ЛіМ. 1977. 23 вер.; Галіноўская Н. Для маленькіх сяброў // Мін. праўда. 1977. 27 мая; Касько У. Калі ў сэрцы красавік // Наст. газ. 1977. 24 жн.; Коўтун В. З клопатам пра маленькага чытача // Полымя. 1977. № 9; Крупенька Я. Гэты цікавы дзіцячы свет // Чырв. змена. 1977. 1 кастр.; Марціновіч А. Свет даверу і мудрасці // Наст. газ. 1977. 16 ліп.; Якіменка Т. Чыстае неба Радзімы // Гомел. праўда. 1977. 28 чэрв.

Ліса з магнітафонам: Казкі / Для мал. шк. ўзросту. Мн., 1979. Рэц.: Гаварушка Я. Казачнае і рэальнае // Звязда. 1980. 5 жн.; Кажамякін Ц. Здольнасці казачніка // Гомел. праўда. 1981. 21 студз.; Літвінаў Р. Жанр — стары, знаходкі — новыя // ЛіМ. 1980. 27 чэрв.; Марціновіч А. Казачны свет маленства // Наст. газ. 1980. 9 жн.; Сапешка А. Спалучаючы рэальнае з казачным // Мін. праўда. 1980. 14 чэрв.

Казачны церам: Вершы, казкі. / Для мал. шк. ўзросту. Мн., 1983. Рэц.: Гаварушка Я. З любоўю да дзяцей // Наст. газ. 1984. 23 чэрв.

Рэха маладосці: Вершы. Мн., 1984. Рэц.: Барсток М. Гукае рэха маладосці // Полымя. 1985. № 3; Марціновіч А. «...Крылы час не апаліў» // ЛіМ. 1984. 1 чэрв.

Едзе страшная Яга: Вершы і казкі / Для мал. шк. ўзросту. Мн., 1985.

Казёл на верталёце: Вершы / Для дашк. ўзросту. Мн., 1987.

Сонца над маім асеннім садам: Вершы. Мн., 1987.

Апавяданні пра Марата Казея / Для сярэд. і ст. шк. ўзросту. Мн., 1988 (З арлінага племені).

Непаседлівыя вавёркі. Мн., 1993.

1.3.

1925. Ліпнёвае: [Верш] // Малады араты. № 7; Вечар; «Гора мне крылле змачыла...»: [Вершы] // Там жа. № 8; Я успомніў сёння дзяцінства: [Верш] // Там жа. № 9—10; Ураджайнае: [Верш] // Там жа. № 11 / Пад псеўд. Янка Бор; Сонца свеціць, сонца грэе...: Песня // Там жа. № 13 / Пад псеўд. Янка Бор; «У Дзянісавай Агаты...»: [Верш] // Там жа. № 16 / Пад псеўд. Янка Бор; Восень: [Верш] // Чырв. сцяг. № 7; Ураджайнае: [Верш] // Чырв. змена. 29 вер. / Пад псеўд. Янка Бор; «Мае думкі — вы птушкі крылатыя...»: [Верш] // Там жа. 23 снеж.

1926. Ураджайнае: [Верш] // Ураджайнае свята. Мн. / Пад псеўд. Я. Бор; Камсамол; «Каля хаткі, сэрцу мілай...»; «Радасць мая звоніць...»: [Вершы] // Малады араты. № 3; «Лісце з дрэў сарваў увосень вецер...»: [Верш] // Там жа. № 8; Восень: [Верш] / Чырвоны сейбіт. № 2 / Пад псеўд. Я. Бор.; Падслухай шум вясёлае вясны; «Там дзве мяжы...»: [Вершы] // Там жа. № 4; Звініць звон: [Верш] // Бел. вёска. 27 крас. // Пад псеўд. Я. Бор; «Гудзі, мой цэп...»: [Верш] // Чырв. змена. 8 студз.; У няволі: З вершаў «Захад» // Там жа. 21 лют.; З дапамогаю брата: [Апавяданне] // Там жа. 3 сак.; У далейшым так працаваць нельга // Там жа. 10 сак. / Пад псеўд. Я. Бор; Пяць год: [Верш] // Там жа. 21 крас.; Частушкі / Пад псеўд. Я. Бор; «У зялёным шоўкалісці...»: [Верш] // Там жа. 8 ліп.; «Вольныя» галовы альбо «камсамольскае казацтва» // Там жа. 22 ліп. / Пад псеўд. Я. Бор.

1927. «Смяецца месяц...»: [Верш] // Чырв. сейбіт. № 6—7; Шум хваляў гордых: [Верш] // Там жа. № 17; «Не чакай...»: [З вершаў «Заходняя Беларусь»): [Верш] // Звязда. 20 ліст.; «У будучыню хто ня верыць...»: (Санет) // Чырв. змена. 5 мая.

1928. Дворнікі: Апавяданне // Літ. дад. да газ. «Сав. Бел.» № 10; Паўстанне вершаў: [Верш] // Маладняк. № 1; Ціхім я стаяў: [Верш] // Там жа. № 3; Песні аб пяру: [Вершы] // Там жа. № 6; Прыйдзе час: [Верш] // Звязда. 22 студз.; «Краіна вольная...»: [Верш] // Чырв. змена. 30 снеж.

1929. Звярыны баль: Байка // Бел. піянер. № 8; Загінулі: [Верш] // Маладняк. № 1; Сам ня ведаю, пра што мне напісаць?!: [Верш] // Сав. Бел. 13 студз.; Чытаў паэта верш...: (Некаторым сябрам па пяру прысвячаю): [Верш] // Там жа. 8 снеж.; «Падабраў у полі ноты вецер...»: [Верш] // Чырв. змена. 22 вер.

1930. «Зноў стрэлка вернецца...»: [Верш] // Маладняк. № 2; Дэманстрацыя; Ад «А» да «Я»: [Вершы] // Там жа. № 8—9; ...На Асінбуд: [Верш] // Чырв. змена. 27 студз.

1931. Паходны марш: [Верш] // БелЛАЧАФ: Зборн. першы. Мн.; Добрая парада: [Верш] // Іскры Ільіча. № 3; «То пра зоркі, то пра месяц...»: Некаторым паэтам: [Верш] // Чырв. змена. 1931. 5 чэрв.

1932. «Трактарыст набраў вады...»: Частушка // Беларусь калгасная. № 3; Кавалачак з аўтабіяграфіі паэта Разекі: Фельетон // Маладняк. № 7; Арышт таварыша: [Верш] // Чырв. Бел. № 19; Яшчэ адна ластаўка з гнязда вялікадзяржаўнікаў: Пра выхад кніжкі М. Рыбнікавай «Загадки»; Польскаму педтэхнікуму — дзесяць год // ЛіМ. 10 ліп.; Спакой і мір: [Верш] // Там жа. 5 жн.; Чырвонаарм. праўда. 1 жн.; У цырульні: [Верш] // Піянер Бел. 31 кастр. / Пад прозв. В. Шушкевіч. Аўт. спрэчнае; Песня пагранічніка: [Верш] // Чырвонаарм. праўда. 5 вер.

1967. Амірбекаў Ж. Пераўтвораны край: [Верш] / З каз. // Звязда. 5 крас.; Мухтар А. «Як сусветны закон цягацення...»; Рахім Э. Мінску; Тураб Т. Зноў да цябе імкнуся...; Вуліцы: [Вершы] / З узб. // Там жа. 1 чэрв.; Шукрула. Гром міру: [Верш] / З узб. // Там жа. 7 чэрв.; Балтакіс А. Дарога: [Верш] / З літ. // Там жа. 21 ліп.; Баржанскі Ю. Паўлінка: [Верш] / З малд. // Там жа. 10 жн.; Сяйтліеў К. Туркменка ў Крамлі: [Верш] / З туркм. / Там жа. 26 кастр.

1968. Рахім А. Мінску / З узб.; Баржанскі Ю. Паўлінка / З малд.: [Вершы] // Табе, Беларусь: Паэты свету пра Беларусь. Мн.; Тарасян Ш. Наш горны край; Цяжкі шлях — ды ты са мной...; Загінуўшым на вайне: [Вершы] / З арм. // Чырв. змена. 14 ліп.

1969. Туманян А. Верацяно: [Верш] / З арм. // Туманян А. Мн.; Ханінаў М. Споведзь калмыка; Хлапчук і карнікі: [Вершы] / З калм. // Звязда. 31 жн.

1970. Дабравольскі С. Р. Размова з Лермантавым; Сабе самому байка; Аўтару «Парыжскай камуны»; Не забароніце...: [Вершы] / З пол. // Дабравольскі С. Р. Як хлеб і сонца. Мн.; Кульбак М. Песня да Расіі: [Верш]; Ці маеш ты хлеб?.. / З яўр. // Кульбак М. Выбранае. Мн.; Кунанбаеў А. «О, доўга як жыццё вадзіла...»; Вясна: [Вершы] / З каз. // Кунанбаеў А. Выбранае. Мн.; Ханінаў М. Хлапчук і карнікі; Споведзь калмык: [Вершы] / З калм. // Ханінаў М. Хвоі і цюльпаны. Мн.; Харкевіч А. Твая Радзіма; Роздум; Заўсёды маладая: [Вершы] / З рус. // Наст. газ. 24 кастр.; Шутэнка Г. Чарашлянка; Маё шчасце: [Вершы] / З рус. // Там жа. 30 снеж.

1971. Нерыс С. Ля крыніцы: [Верш] / З літ. // Нерыс С. Калі зямля прачынаецца... Мн.; Цялічка М. Вясна ў Брэсце; Да канца быў героем; На заставе: [Вершы] / З рус. // Наст. газ. 26 мая; Юшчанка А. Гасцюю ў Беларусі: [Верш] / З укр. // Чырв. змена. 24 сак.

1972. Рахім Э. Мінску / З узб.; Сасюра У. Беларусі / З укр.: [Вершы] // Чырв. змена. 16 вер.

1973. Глазавы П. Гукаізаляцыя; Грошы трэба берагчы; Шпаркі жаніх: [Вершы] / З укр. // ЛіМ. 17 жн.; Яраменка М. Я быў паранены...; Дальва: [Вершы] / З укр. // Там жа. 5 кастр.

1974. Бухвалаў А. Ля вечнага агню; Загарулька У. «Пасляваенныя не знаюць дзеці...»: [Вершы] / З рус. // ЛіМ. 25 студз.; Балтакіс А. Новая дарога; Венцлава А. Лета; Малдоніс А. «Даўно сабраў гармонік...»: [Вершы] / З літ. // Там жа. 8 лют.; Мікялінскас Й. Цёплыя рукі: Апавяданне / З літ. // Там жа. 1 сак.; Мацявічус Ю. Юнацтва: [Верш] / З літ. // Там жа. 15 сак.; Венцлава А. Я хачу вам пакінуць...: [Верш] / З літ. // Там жа. 22 сак.; Барута І. Вясна; Мацявічус Б. Сустрэча з юнацтвам / З літ. // Там жа. 29 сак.; Карун М. Сябры: Байка / З арм. // Там жа. 5 крас.; Лагода В. І ў нас, і ў вас... / З укр.; Тула Т. Мая Фергана / З узб.; Тарасян Ш. Тым, хто загінуў на вайне / З арм.: [Вершы] // Там жа. 12 крас.; Мулдагаліеў Д. Таварыш: [Верш] / З каз. // Там жа. 1 мая; Кірсанаў Г. Данбас; Любе Шаўцовай; Яроменка М. Хлеб; Яблыня; Хадакова Р. Краснадонка; Раманенка А. «А можа дрэвы...»; Святлічны І. Сярэдзіна лета: [Вершы] / З укр. // Там жа. 16 жн.; Юшчанка А. Сёстры: [Верш] / З укр. // Там жа. 30 жн.; Бугаёў В. Маленькія байкі: Шайба; Аловак; Мудрае рашэнне; Няўдзячнасць / З укр. // Там жа. 13 вер.; Яго ж. Выразнае слова; Няскрованы венік: [Байкі ў прозе] / З укр. // Там жа. 4 кастр.; Хузангай П. З цыкла «Вышыня»: [Верш] / З чуваш. // Там жа. 11 кастр.; Дарыенка П. Малдавеняска: [Верш] / З малд. // Там жа. 5 снеж.; Бубніс В. Аднойчы вечарам: [Апавяданне]; Венцлава А. Лета: [Верш] / З літ. // Наст. газ. 20 сак.

1975. Зуй Нгуен. Кветкі цвітуць; То Хыў. Радасць перамогі; Хоанг Нюэн Кам. Асенняе пісьмо: [Вершы] / З в'ет. // Звязда. 7 вер.; Калган А. Кот-вучоны: Байка / З чуваш. // ЛіМ. 17 студз.; Карун М. Чалавек і ліса: Байка / З арм. // Там жа. 7 лют.; Кашавой А. Дні суровыя мы пераносім; «На бацькаўшчыну нашу мілую...»; «Ты, матуля, навокал зірні...»; Мне цяжка; «Я з вамі навінай хачу падзяліцца...»; Вы са славай загінулі: [Вершы] / З укр. // Там жа. 21 лют.; Абашыдзе І. Голас міру: [Верш] / З груз. // Там жа. 28 сак.; Зуй Нгун. На маршы праз перавал Нганг: [Верш] / З в'ет. // Там жа. 5 вер.; Яроменка М. Восень / З укр.; Костараў М. Слова пра БАМ / З рус.; Файзулін М. Сельскі музей / З тат.: [Вершы] // Там жа. 7 ліст.

1976. Баравы В. Ліст; Шапавал М. Мая страна: [Вершы] / З укр. // Вяч. Мінск. 24 мая; Венцлава А. Шторм: [Верш] / З літ. // ЛіМ. 6 лют.; Сірэнка М. «Зямля і Ленін...» / З укр.; Калаздзе К. «Сад падрастае...» / З груз.: [Вершы] // Там жа. 20 лют.; Хачыраў С. На моры: [Верш] / З асец. // Там жа. 19 сак.; Фацееў У. Моцны голас: [Верш] / З рус. // Там жа. 9 крас.; Смелякоў Я. Кніжка ўдарніка / З рус.; Чыбатару А. Вецер / З малд.: [Вершы] // Там жа. 30 крас.; Салаухін В. Дзень добры! [Верш] / З рус. // Там жа. 18 чэрв.; Бончаў Г. Нашы бацькі; Дамянаў Д. П. «Каторы год цвіце вясна...»; Гадзіннік: [Вершы] / З балг. // Там жа. 10 вер.; Вальчак Г. Зямля: [Верш] / З пол. // Там жа. 1 кастр.; Фёдараў В. З табой, Расія: [Верш] / З рус. // Там жа. 5 ліст.; Сірэнка М. Тры таполі: [Верш] / З укр. // Мін. праўда. 30 мая; Нізавы І. Малюю Данбас; Яроменка М. Я дару табе пралескі: [Вершы] / З укр. // Там жа. 4 чэрв.; Яго ж. Сталь і хлеб; Жыла б зямля...: [Вершы] / З укр. // Наст. газ. 22 мая; Сірэнка М. «Зямля і Ленін... Ленін і Зямля...»; Раса; «Зямля Сасюры. Родны мой Данбас...»; «Сонца, сонца...»: [Вершы] / З укр. // Чырв. змена. 7 крас.

1977. Эзізаў К. Мая зямля: [Верш] / З туркм. // ЛіМ. 5 жн.; Смаханулы Ш. Тэлеграма; Мудрацы: [Вершы] / З каз. // Там жа. 14 кастр.; Рашкоўскі Л. Хатынь; «Я знаў, што мора — гэта мора!..»: [Вершы] / З рус. // Мін. праўда. 29 ліп.; Яго ж. У мяне такая доля; Адданыя спорту; Гордая чайка: [Вершы] / З рус. // Наст. газ. 5 студз.; Краўцоў А. Жывая сувязь пакаленняў / З рус.; Кручанюк П. Радзіма / З малд.; Мацкявічус Б. Сустрэча з юнацтвам / З літ.; Тажыбаеў А. Дарога жыцця / З каз.; Чарняўскі М. Ля помніка Алегу Кашавому / З укр.: [Вершы] // Там жа. 30 крас.

1978. Алейнік Б. Балада пра першага / З укр. // Звязда. 28 мая; Сава У. Адказ па сутнасці...: [Верш] / З укр. // ЛіМ. 13 студз.; Сцяпанаў В. Вартаўніца; Стрэл міма: [Вершы] / З рус. // Там жа. 31 сак.; Круганюк П. Радзіма: [Верш] / З малд. // Там жа. 28 крас.; Сцяпанаў В. Мая Радзіма; Смага; Шахцёр: [Вершы] / З рус. // Наст. газ. 28 студз.

1979. Пшыбыш Я. Падабенства; Заяц; Знаёмы незнаёмец: [Гумарэскі] / З пол. // Вясёлы калейдаскоп. Мн.; Калган А. Дуб і Дзяцел: Байка / З чуваш. // ЛіМ. 6 ліп.; Яго ж. Сарока: [Байка] / З чуваш. // Там жа. 17 жн.; Мюлер А. Буслы; Нейман М. Рукі; Прэйслер Г. Фестываль: [Вершы] / З ням. // Наст. газ. 13 кастр.

1980. Рашкоўскі Л. Расія Леніна вітала: [Верш]

// Беларусь. № 4; Шавялёва К. Помнік прыроды; У гасцях: [Вершы] / З рус. // Работніца і сялянка. № 9.

1982. Шавялёва К. Ні з кім не пераблытаеш мяне...; Граніцы Масквы; Рэчка Ронжа; Пабачыце!; Галінка; Бярозавы край; Два жыцці; Нарач; Вецер перамешвае возера; У госцях: [Вершы] / З рус. // Шавялёва К. Зямная веліч. Мн.; Карун М. Асёл і Вярблюд: [Байка] / З арм. // Вожык. № 19; Сачывец І. Пасаг: Гумарэска / З укр. // Работніца і сялянка. № 5; Грашы А. Дума пра Ерэван: [Верш] / З арм. // Звязда. 24 крас.

1984. Гастэла Н. Верны сокал Айчыны: [Урыўкі з дакументальнай аповесці «Расказ пра брата»] / З рус. // Звязда. 18, 19 мая; Васілеўскі І. Віцебскі край; Возера Палік: [Вершы] / З рус. // Там жа. 15 ліст.; Шутэнка Г. Загінуўшым сябрам; «Не страляюць...»; «Ён не ўпаў...»; Навагрудак: [Вершы] / З рус. // ЛіМ. 22 чэрв.

1985. Рашкоўскі Л. Расія Леніна вітала; «Я знаў, што мора — гэта мора!..»; Хатынь; «Гавары, не патрывожу...»: [Вершы] / З рус. // Мін. праўда. 17 вер.; Венцлава А. Дзеці ля помніка Леніну: [Верш] / З літ. // Наст. газ. 27 ліп.; Маўленаў С. Ленін у Тургаі: [Верш] / З каз. // Там жа. 14 жн.

1.5.

На рускую мову. Только вперед: [Нарыс] / Пер. Б. Бурьян // Пионеры — герои. Мн., 1965; Сыновья; Раздумье; Памяти солдата: [Вершы] / Пер. С. Шахбазов // Знамя юности. 1967. 29 нояб.; Только вперед: [Нарыс] / Пер. Б. Бурьян // Пионеры — герои. Мн., 1968; Наследники Гастелло: [Верш] / Пер. А. Шарапов // Во славу Родины. 1969. 13 июня; Лучеса: Поэма / Пер. А. Харкевич // Знамя юности. 1969. 15 июля; Вечный огонь; Наследники Гастелло: [Вершы] / Пер. А. Шарапов // Путь к победе. Мн., 1970; Только вперед: [Нарыс] / Пер. Б. Бурьян // Пионеры — герои. Мн., 1972; Березина; Лебеда; Котра: [Вершы] / Пер. А. Приходько // Знамя юности. 1972. 10 февр. Пока бьется сердце: Записки о Л. М. Доваторе / Пер. Б. Антонов // Неман. 1973. № 5; Наследники Гастелло: [Верш] / Пер. А. Шарапов // Во славу родины. 1975. 6 апр.; Я стою в дозоре: [Верш] / Пер. М. Плотников // Там жа. 1975. 2 нояб.; Наследники Гастелло: [Верш] / Пер. И. Василевский // Извечной песни голоса. Мн., 1980; ГораВенец; В доме Зырянова; Беседка: [Вершы] / Пер. В. Овчаренко // Неман. 1983. № 4; Крейсер «Аврора» / Пер. В. Овчаренко; В доме Зырянова / Пер. В. Моргулис; Наследник Гастелло; Утро в Зеленом Лугу; Птицы / Пер. И. Василевский; Белорусские березки / Пер. А. Харкевич: [Вершы] // Знамя юности. 1983. 3 апр.; Лебеди: [Верш] / Пер. А. Приходько // Зорька. 1983. 1 апр.; Неизвестный партизан: [Верш] / Пер. В. Кузнецова // Партизанская слава. Л., 1985; Только вперед: [Нарыс] / Пер. Б. Бурьян // Пионеры — герои. Мн., 1985.

На ўкраінскую мову. Проспект: [Верш] / Пер. К. Курашкевич // Вінніц. правда. 1969. 7 трав.; Незамінний Степан: [Верш] / Пер. І. Немирович // Київ. правда. 1975. 21 черв.; Проспект: [Верш] // Південна правда. 1975. 19 черв.; Привітання Волзі: [Верш] / Пер. О. Юрченко // Прапор. 1977. 1; Матірі: [Верш] // Прапор перемоги. 1982. 16 трав.; Балада про матір / Пер. В. Гуцаленко // Черкас. правда. 1983. 4 трав.

На туркменскую мову. «Аврора» крейсеринде; Ойланмэк; Эне хакда баллада: [Вершы] / Терж. А. Ташов // Ленин ёлы. 1980. 5 июль.

1.6.

Вышыня: Нарысы. Мн., 1971 / Скл.

Глебаў А. Дарогай пошуку: [Інтэрв'ю] // Звязда. 1968. 16 студз. / Зап.; Куляшоў А. Слова шчырае, народнае: [Інтэрв'ю] // Звязда. 1969. 26 лют. / Зап.; Шаўчэнка С. Мастацтва ўкраінскіх сяброў: [Інтэрв'ю] // Там жа. 1971. 24 ліп. / Зап.

2.3.

На беларускай мове. Аркадзін М. Ад шчырага сэрца // Сав. селянін. 1947. 23 крас.; Віктару Шымуку — 50. // ЛіМ. 1983. 1 крас.; Лойка А. Паэзія і час. Мн., 1981. С. 51—53; Марціновіч А. Павышаць паэтычнае майстэрства // Калг. праўда. 1951. 10 студз.; Пісьменнікі Савецкай Беларусі: Кароткі даведнік. Мн., 1981; Цывака В. З вышыні пражытага // Мін. праўда. 1983. 2 крас. *Т. М. Махнач.*

ШЫНКЛЕР ХВЯДОС

Шынклер Хвядос Сяргеевіч [псеўд.: Сяргееў, Кв. Шынклер, Явар (?), Хв. Явар, Хвядос Явар, Я. Явар, крыпт.: Х. Ш., Хв. Ш., Хвядос Ш., Ш-р, Шын.; 9(22).9.1903, станцыя Ізаслаў Мінскага пав. Мінскай губ., цяпер ст. Беларусь, Мінскі р-н — 25.10.1942, ваколіцы Сталінграда], празаік, паэт, крытык.

З сям'і чыгуначнага служачага. Яго дзіцячыя і юнацкія гады прайшлі на ст. Рудзенск, куды ў хуткім часе пасля нараджэння сына бацьку прызначылі начальнікам станцыі. У 1914—20 вучыўся ў Мінскім рэальным вучылішчы. У сям'і існаваў мікраклімат, які спрыяў развіццю ў дзяцей здольнасцяў. «Бацькі нашы вучылі нас, дзяцей, цаніць найперш духоўныя каштоўнасці, а ў людзях

сумленнасць і высакародства,— успамінае сястра пісьменніка Марыя Шынклер.— Яны выхоўвалі ў нас любоў да кнігі. У нас была даволі вялікая бібліятэка з твораў айчыннай і зарубежнай літаратуры. Выпісваліся часопісы». У 1919, не пакідаючы вучобы, будучы пісьменнік пачаў працаваць тэлеграфістам на чыгунцы, на станцыі Асіповічы, дзе праслужыў сем гадоў. Быў таксама бібліятэкарам, загадчыкам клуба, вёў прафсаюзную і камсамольскую работу. З 1922 рабкор цэнтральных і рэспубліканскіх газет і часопісаў («Правда», «Гудок», Савецкая Беларусь», «Камуніст», «Маладняк», «Узвышша» і інш.). Па прадстаўленні М. Лынькова ўвайшоў у Літаратурнае аб'яднанне «Маладняк». З 1929 працаваў у бабруйскай акруговай газеце «Камуніст» (у апошні год узначальваў сектар рэканструкцыі сельскай гаспадаркі). Са снежня 1931 — сакратар рэдакцыі раённа-транспартнай газеты «Ударнік» (Жлобін). З чыгункай пісьменнік быў звязаны ўсё жыццё, што, натуральна, адбілася на ўсёй яго творчасці. «Тэмай для мяне служыць выключна чыгунка,— прызнаваўся ён у «Аўтабіяграфіі», напісанай у 1932.— Чыгунку лепш за ўсё ведаю, люблю. На чыгунцы я пачаў хадзіць «пехатой пад вагоны», на ёй вырас, на ёй шмат перажыў, на ёй стаў свядома глядзець на жыццё, прыклаў і свае сілы да агульнай справы». У 1935—41 працаваў у газеце «Літаратура і мастацтва» і часопісе «Полымя рэвалюцыі». У час Вялікай Айчыннай вайны эвакуіраваны ў Свярдлоўск, працаваў на тэлеграфе. У сакавіку 1942, нягледзячы на дрэннае здароўе, добраахвотнікам пайшоў у армію. Чатыры месяцы быў курсантам вайсковага вучылішча ў г. Кыштым Чалябінскай вобл. Пасля заканчэння атрымаў званне малодшага лейтэнанта. Загінуў у баях пад Сталінградам.

Шлях у мастацкую літаратуру пачаў у 1922 з рабкораўскіх допісаў. Потым перайшоў да артыкулаў, нарысаў, фельетонаў, рэцэнзій. Першае апавяданне «Пас зачапіў» надрукаваў у 1928. Асобнымі кнігамі выйшлі яго апавяданні «Ічэ», «Блок», зборнік апавяданняў «Стрэлачнік Мігай», аповесці «Сонца пад шпалы», «Запіскі інструктара Томана», «Пульс жыцця». Аўтар аповесці для дзяцей «Петрык-завадатар», п'есы «Пачэсны рэйс», кінасцэнарыя «Шчаслівы шлях» (1940, з Ю. Рудзько), дзённікаў «Пульс жыцця. Запіскі тэлеграфіста» (1942, на рус. мове), «Дзённік сувязіста» (1957). Вядучая тэма яго творчасці — станаўленне рабочага класа рэспублікі ў паслякастрычніцкі час, нялёгкая, але рамантычная праца чыгуначнікаў. Характэрныя адзнакі стылю Х. Шынклера — дакладнасць слова, трапнасць мастацкай дэталі.

І. П. Чыгрын.

Бібліяграфія

1.1.

Выбр. тв. Мн., 1960. Рэц.: Герцовіч Я. Творы, якія не старэюць // Полымя. 1960. № 11.

1.2.

Ічэ: Апавяданне. Мн., 1929 / Пад псеўд. Хвядос Явар (Б-ка школьніка). Рэц.: Мікуліч Б. // Сав. Бел. 1930. 9 лют.; Чурылавец А. [Якімовіч А.] // Кам. выхаванне. 1930. № 2; 2 выд. Мн., 1931 / Пад псеўд. Хвядос Явар.

Стрэлачнік Мігай: Апавяданні. Мн., 1930.

Блеск: Апавяданне. Мн., 1933.

Сонца пад шпалы: Аповесць. Мн., 1933. Рэц.: Мікуліч Б. Аб «Сонца пад шпалы» Шынклера // Полымя рэвалюцыі. 1934. № 4; Піятуховіч. «Сонца пад шпалы» Хв. Шынклера // ЛіМ. 1934. 12 сак.

Запіскі інструктара Томана. Мн., 1934. Рэц.: Клімковіч М. Некаторыя заўвагі пра новую кніжкуХв. Шынклера «Запіскі інструктара Томана» // ЛіМ. 1934. 28 мая; Ларчанка М. Авалодаць мастацкім майстэрствам // Крытыка-бібл. бюл. 1934. № 8.

Чырвонасцяжны калгас «Колас»: [Нарыс]. Мн., 1934 / Сааўт. А. Юдэльсон / Яўр.

Петрык-завадатар: Аповесць. Мн., 1935. Рэц.: Багун М. Цікавая і карысная кніга // ЛіМ. 1936. 16 студз.; Куніцкі С. // Полымя рэвалюцыі. 1936. № 2.

Пульс жизни: Записки телеграфиста. М., 1942 (Бойцы трудового фронта). Рэц.: Белецкая Л. Трудовые будни советских патриотов // Вестник связи. 1942. № 13.

Пульс жыцця. Мн., 1950. Рэц.: Барсток М. Адчуванне пульсу жыцця // Звязда. 1950. 3 вер.; Казека Я. Хвалюючая кніга // ЛіМ. 1950. 19 жн.; Кудраўцаў І. Жывое слова мастака // Беларусь. 1950. № 7.

Петрык-завадатар: Аповесць. Мн., 1959.

Пульс жыцця: Аповесці. Мн., 1959.

Сонца пад шпалы: Аповесць. Мн., 1972 (Школьная б-ка).

Петрык-завадатар: Аповесць. Мн., 1973.

Апошні рэйс. Мн., 1984.

1.3.

1924. Нужен ли рабкору корбилет // Звезда. 13 июня; Устраните недостатки; Дровяная льгота; (Западные железные дороги) // Правда. 27 июня.

1925. 2-я выстаўка ў Асіповічах (Бабруйшчына): Нарыс // Плуг. № 10—11.

1926. Як толькі снег...: [Верш] // Малады араты. № 8 / Пад псеўд. Я. Явар. Аўт. спрэчнае; Трыбуна селькора: [Верш] // Бел. вёска. 26 сак. / Пад псеўд. Я. Явар. Аўт. спрэчнае; Працоўная ўмова да смерці // Сав. Бел. 26 лют.; Партасвета ў Асіповічах // Там жа. 27 лют.; [Рэц. на кн.: Гарэцкі М. Досвіткі. Мн., 1926] // Там жа. 18 крас.

1927. [Рэц. на кн.: Евдокимов И. Колокола. М., 1926] / Пад крыпт. Ш-р.; «На Беларусі»: Двухтыднёвая старонка «Гудка» № 1 ад 9 сак. 1927 г. // Маладняк. № 4; Культпраца на лініі (Заходнія чыгункі) // Сав. Бел. 14 крас.; Як прыцягнуць беспартыйных на партсходы // Там жа. 28 мая; Зіму не ўпусцілі — скарысталі: (Асіповіцкі р-н, Бабруйшчына) // Там жа. 31 мая; Асвета дарослых праходзіць добра: (Ст. Асіповічы Зах. чыг.) // Там жа. 8 чэрв.; Канфлікты цягнуцца месяцамі: (Ст. Асіповічы Зах. чыг.) // Там жа. 2 чэрв. / Пад крыпт. Хв. Ш.; ТСТ Зах. чыг. вядзе правільную лінію; Тэхнічныя гурткі працавалі кепска // Там жа. 8 ліп.; 68 дзён бюракратычнай мамоне (Гомель. Зах. чыг.) // Там жа. 14 ліп.; «Трэба ж камунебудзь кіраваць»: (Асіповічы, Бабруйшчына) // Там жа. 5 жн.; Здзельшчына зойме сваё месца: (Менскі вучастак, заходн. чыг.) // Там жа. 11 жн.; Сталая праца: (ТСТ зах. чыг.) // Там жа. 21 снеж. / Пад псеўд. Явар.

1928. Каб не формулы; Загінуўшая грамата: [Апавяданні] / Пад псеўд. Хв. Явар; [Рэц. на «Аршанскі маладняк». Красавік. 1928] // Уздым. Бабруйск. Кн. 2; Загінуўшая грамата: Апавяданне // Вясна. № 3 / Пад псеўд. Хв. Явар; Стрэлачнік Мігай: Апавяданне // Там жа. № 5 / Пад псеўд. Хв. Явар; Апошні рэйс: Апавяданне // Там жа. № 6 / Пад псеўд. Хв. Явар; Чмута: Апавяданне // Там жа. № 7 / Пад псеўд. Хв. Явар; Бібліяграфія: [Рэц. на кн.: Ісбах А. Са стрэльбай і кнігай. Мн., 1928] // Там жа. № 8; Бібліяграфія: [Аглядны арт. пра «Маладняк»] / Пад крыпт. Х. Ш.; Юбілей Ц. Гартнага // Там жа. № 9; Аб слове «савет»»; Аб слове «цягнік»: Лінгвістычныя нататкі; Рэц. на кн.: Чатырохсотлецце беларускага друку. Мн., 1926 // Узвышша. № 1; Ці «ваенізуемыя» мы?: Нататка пра словаўжыванне // Там жа. № 6; Аб распаўсюджанні беларускіх кніжак // Сав. Бел. 18 студз.

1929. Чую кліч: [Верш] // Вясна. № 1 / Пад псеўд. Хвядос Явар; А. С. Грыбаедаў // Там жа. № 2 / Пад крыпт. Хв. Ш.; Бібліяграфія // Там жа. № 7; Паўлюк Трус // Там жа. № 9; [Рэц. на кн.: Кропивин: байкі / Пер. С. Пилипенко. Харків, 1928] // Маладняк. № 2; Ічэ: Апавяданне // Там жа. № 4 / Пад псеўд. Хвядос Явар; Сонца пад шпалы: Аповесць // Там жа. № 11—12; [Рэц. на кн.: Працы кафедры этнаграфіі Інбелкульту. Т. 1. Сш. 1. Мн., 1928] // Узвышша. № 3; Мост: (БДТ — 1) // Камуніст. 7 ліп.; Парасткі культуры ўзыходзяць на палетках Беларусі // Там жа. 10 ліп. / Пад псеўд. Хвядос Ш.; «Малінавае варэнне»: (Рабочы тэатр Пралеткульта) // Там жа. 21 ліп.; «У добрым хадзяйстві» // Там жа. 28 жн.; Трэцюю пазыку рэалізуем // Там жа. 16 вер.; Свята Бабруйскага раёна // Там жа. 18 вер.; Што чытаць селяніну // Там жа. 11 кастр.; У адзіным імкненні // Там жа. 4 снеж.; Камсамольская: [Нарыс] // Чырв. змена. 5 мая.

1930. Хата: Апавяданне // Вясна. № 2; Шлях паэта: Да 25-гадовага юбілею Янкі Купалы. // Там жа. № 4; Тварам да вытворчасці; Бібліяграфія: [Рэц. на кн. Ракіта С., Палескі В., Казак Р. Разгон. Гомель, 1930] // Там жа. № 8; [Рэц. на кн.: Мікуліна Е. Спаборніцтвы мас. Мн., 1930] // Маладняк. № 3; Расійскія пісьменнікі на беларускай мове: [Рэц. на кн.: Фурманаў Д. Чорны дэсант. Мн., 1929; Масквін М. Падрыўнікі. Мн., 1929 і інш.) // Там жа. № 4; [Рэц. на кн.: Хурсік С. Шляхамі навальніц. Мн., 1930] // Там жа. № 5; Заквітнелі новыя нівы // Там жа. № 6—7; Блок: Апавяданне; [Рэц. на кн.: Галаўко А. Бур'ян / З укр. Мн., 1929]; [Рэц. на часоп. «Наши достижения». М., 1930. № 1—6] // Там жа. № 8—9; Пачатак: Нататкі пра Бабруйскую філію Бел. АПП // Там жа. № 12.

1931. «Как дошли мы до жизни такой» // Вясна. № 1. Ці будзем мець тэатр? // Камуніст. 28 чэрв. / Пад псеўд. Шын.; «Гута» // Там жа. 10 жн.; За жорсткую эканомію газетнай плошчы // Рабселькор. 15 сак.

1932. Сігнал трэба пачуць: [Рэц. на кн.: Маркоўскі У. Паравоз 04 963. Мн., 1932[// ЛіМ. 9 снеж.

1933. Змагар за чыстую работу: Нарыс // Камунар Магілёўшчыны. 10 вер.; Плот Страйболава: Урывак з аповесці «Сонца пад шпалы» // Там жа. 12 кастр.; Інжынеры: Урыўкі з аповесці «Сонца пад шпалы; Самакрытычныя нататкі // ЛіМ. 18 студз.; Кузьма Архіпыч падкузьміў: Урывак з новай кнігі // Там жа. 31 кастр.; Спатканне: Урывак з аповесці «Сонца пад шпалы» // Чырв. змена. 4 ліп.

1934. Чыгунка — мая тэматыка // ЛіМ. 16 лют.

1935. Ромбы і шпалы: Апавяданне // Іскры Ільіча. № 5; На Цішоўскім пустыры: Нарыс // ЛіМ. 6 снеж.; Шчаслівая старасць: [Апавяданне] // Чырв. змена. 1, 3 сак.

1937. І. С. Каровін: Нарыс // ЛіМ. 11 снеж.

1938. Кузьма Архіпыч падкузьміў: [Апавяданне] // Зборнік для гурткоў мастацкай самадзейнасці. Мн.; Знойдзеная радасць: Нарыс // Іскры Ільіча. № 12; Звязда. 8 снеж.; Дзмітрый Сцяпанавіч Гусеў: [Нарыс] // Звязда. 13 чэрв.; Велічны шлях: [Нарыс] // Там жа. 26 чэрв.; Магілёў: Нарыс // ЛіМ. 22 крас.; «На крутым павароце»: [Рэц. на кн.: Краўчанка У. На крутым павароце. Мн., 1937] // Там жа. 11 чэрв.; Мужнасць і адвага: Нарыс // Там жа. 11 ліп.

1939. Молеў: [Апавяданне] // Ардэнаносная Беларусь. Мн. / Яўр.; Незабыўная дата // Вызваленым братам. Мн.; Адважны Вадзік: Апавяданне // Іскры Ільіча. № 6; Пачэсны рэйс: П'еса ў 3-х актах, 8 карцінах // Полымя рэвалюцыі. № 4. Рэц.: Есакоў А. П'еса аб новых людзях // ЛіМ. 1939. 3 ліп.; Пачэсны рэйс: Урывак з п'есы // Там жа. 11 крас.; Не згасне сонца: Апавяданне // Там жа. 11 ліп.; Міхась Лынькоў // Там жа. 11 снеж.; Першыя мары: (З падарожжа па Заходняй Беларусі) // Піянер Бел. 11, 15 ліст.; Пачэсны рэйс: Урывак з другой карціны 1-га акта // Чырв. змена. 26 мая.

1940. З песняю ў жыццё // ЛіМ. 23 лют.; «Юныя змагары»: [Рэц. на кн.: Рунец П. Юныя змагары. Мн., 1940] // Там жа. 31 жн.; Радасная падзея // Там жа. 16 ліст.; Першы з'езд камсамола Беларусі // Чырв. змена. 25 вер.

1941. Стварыць беларускі літаратурны музей // ЛіМ. 18 студз. / У сааўт.

1948. Сонца пад шпалы: Урывак з аповесці // Беларуская савецкая проза і драматургія. Мн.

1949. Пульс жыцця: (Запіскі тэлеграфіста) // Мы іх не забудзем. Мн.; Полымя. № 2.

1966. Аўтабіяграфія // Пра час і пра сябе. Мн.

1967. Стрэлачнік Мігай: [Апавяданне] // Анталогія беларускага апавядання: У 2 т. Мн., 1967. Т. 1; У цемры восеньскай ночы: (З аповесці «Петрык-савадатар») // Арлянятам: У 2 т. Мн. Т. 2.

1974. Велічны шлях // Хрэстаматыя па гісторыі беларускай савецкай публіцыстыкі. Мн.

1977. Пульс жыцця: [Нарыс] // Беларускі савецкі нарыс: У 2 т. Мн. Т. 1.

1.4.

Рэмарк Э.-М. На заходнім фронце без перамен: Раман / З фр. Мн., 1931.

Бак П. Зямля: Раман / З англ. Мн., 1937.

1930. Беліна-Падгаецкі Н. Кандат'еры: Апавяданне / З рус. // Вясна. № 5.

1935. Лордкіпанідзе К. Далоў кукурузную рэспубліку: Урывак з рамана / З груз. // Полымя рэвалюцыі. № 7; Бядуля З. «Набліжэнне»: Отрывок из повести / С бел. // Рабочий. 1 авг.

1936. Паўленка П. На усходзе: Урывак з рамана / З рус. // Звязда. 24 кастр.; Тагіраў А. Лівень: Урывак з кнігі «Кроў машын» / З башк. // ЛіМ. 16 студз.; Кудзімаў В. Качкі: Урывак з рамана / З рус. // Там жа. 8 сак.; Леонаў Л. У Леніна: Урывак з рамана «Скутарэўскі» / З рус. // Там жа. 21 крас.; Панч П. Асада ночы: Урывак з рамана / З укр. // Там жа. 23 кастр.; Афінагенаў А. «Салют, Іспанія!»: Урывак з п'есы / З рус. // Там жа. 12 ліст.; Астроўскі М. Народжаныя бурай: Урывак з рамана // Там жа. 29 снеж.; Катаеў В. Хлопчыкі: Апавяданне / З рус. // Піянер Бел. 17, 24, 29 кастр.

1937. Горкі М. Самгін назірае рэвалюцыю: Урывак з рамана / З рус. // ЛіМ. 12 жн.; Катаеў В. Хлопчыкі: Апавяданне / З рус. // Піянер Бел. 4 студз.; Сіндбад мараход: [Араб. казка] // Там жа. 15, 17, 22 мая; 3, 10, 15, 17, 20, 28, 30 чэрв.

1940. Ансельм К. Жоўтыя паўбацінкі: Урывак з аповесці «Некролаг» / З пол. // ЛіМ. 21 вер.

1.5.

На беларускую мову. Дзённік сувязіста / Пер. У. Карпаў // Полымя. 1957. № 10.

На рускую мову. Кузьма Архипыч подкузьмил: (Отрывок) / Пер. авт. // Антология белорусской литературы. М., 1934.

2.2.

Арабей Л. Хвядос Шынклер: Жыццё і творчасць. Мн., 1959.

2.3.

На беларускай мове. Андраюк С. Вывяраючы жыццём: Крыт. артыкулы. Мн., 1976. С. 155—156; Арабей Л. Пісьменнік, грамадзянін, воін // ЛіМ. 1957. 26 кастр.; Беларуская Савецкая проза: Апавяданне і нарыс. Мн., 1971. С. 76, 290—292; Беларуская савецкая проза: Раман і аповесць. Мн., 1971. С. 117; Бранштэйн Я. Праблемы стылю ў творчасці маладых празаікаў // ЛіМ. 1934. 28 сак.; Вышынскі М. Пульс жыцця // Там жа. 1963. 27 вер.; Вялюгін А. Яны змагаліся за Радзіму // Там жа. 1947. 22 лют.; Герцовіч Я. Пясняр рабочых будняў// Герцовіч Я. На перадавых пазіцыях. Мн., 1957; Яго ж. Творчасць Хвядоса Шынклера // Полымя. 1951. № 10; Гісторыя беларускай савецкай літаратуры: У 2 т. Мн., 1964. Т. 1. С. 109; Гісторыя беларускай савецкай літаратуры: У 2 т. Мн., 1966. Т. 2. С. 43; Грахоўскі С. Як той явар // Шынклер Хв. Апошні рэйс. Мн., 1984; Гурэвіч Э. Беларуская дзіцячая літаратура (1917—1967). Мн., 1970. С. 140—141; Зарынка С. На пульсе жыцця // Беларусь. 1973. № 9; Каваленка В. У працэсе станаўлення // Шляхі развіцця беларускай савецкай прозы. Мн., 1972. С. 139—141; Канэ Ю. Спадарожнік у вялікі свет // Полымя. 1960. № 1; Кіркевіч А. Хвядос Шынклер // Гродн. правда. 22 сент.; Клімковіч М. Літаратурны Гомель // Палес. праўда. 1934. 12 мая; Кохан Я. Вобраз чысцейшай дабрыні

// Шынклер Хв. Апошні рэйс. Мн., 1984; Лаўроў У. Пра подзвіг пісьменніка // ЛіМ. 1959. 26 снеж.; Лобан М. Радасць спаткання // Шынклер Хв. Апошні рэйс. Мн., 1984; Яго ж. Хвядос Шынклер // Шынклер Хв. Выбр. тв. Мн., 1960; Яго ж. Хвядос Шынклер // Шынклер Хв. Пульс жыцця. Мн., 1950; Яго ж. Чалавек духоўнай цеплыні // ЛіМ. 1978. 15 вер.; Лынькоў М. Зб. тв. у 8 т. Мн., 1985. Т. 8. С. 39, 43, 46; Лысенка А. Лісты ваенных гадоў: Да 80-годдзя з дня нараджэння Хв. Шынклера // Беларусь. 1983. № 9; Яго ж. Хвядос Шынклер // Беларускія пісьменнікі і літаратурны працэс 20—30-х гадоў. Мн., 1985; Мікуліч Б. Бабруйшчына рапартуе Нататкі пісьменніка // Маладняк. 1930. № 2; Мішын Ф. П'есы для дзяцей: «Цудоўная дудка» В. Вольскага і «Пачэсны рэйс» Хв. Шынклера // Чырв. змена. 1939. 26 мая; Мысліве ц В. У памяці людской // Чырв. змена. 1973. 22 вер.; Навумовіч У. Шляхамі арлянят: (Проза «Маладняка»). Мн., 1984. С. 122—124; Пасляловіч М. Шчасце цяжкіх дарог // ЛіМ. 1973. 28 вер.; Пісьменнікі Савецкай Беларусі: Кароткі даведнік. Мн., 1981; Плашчынскі І. Некалькі заўваг пра «Запіскі інструктара Гомана» // ЛіМ. 1939. 16 вер.; Рабінін Б. Успамінаючы тыя дні... // Шынклер Хв. Апошні рэйс. Мн., 1984; Раманава Н. Дарагі мой чалавек // Шынклер Хв. Апошні рэйс. Мн., 1984; Ржэвуцкі Б. Каштоўная кніжка: Слова чытача // ЛіМ. 1935. 22 жн.; Ружанцова. «Запіскі інструктара Гомана»: Слова чытача // Там жа. 1934. 24 кастр.; Скрыган Я. Нядоўгая сустрэча // Скрыган Я. Выбр. тв.: У 2 т. Мн., 1985. Т. 2; Хомчанка А. След на зямлі // Вяч. Мінск. 1969. 28 мая; Шкраба Р. Пульс жыцця // ЛіМ. 1949. 28 мая; Шынклер М. Нязгаснае // Шынклер Хв. Апошні рэйс. Мн., 1984; Ярош М. Пульс жыцця // Полымя. 1973. № 9.

2.4.

Зарыцкі А. Некалькі слоў пра гісторыю нашай літаратуры: [Верш] // ЛіМ. 1948. 17 студз.

3.1.

БДАМЛіМ, ф. 300.

У. М. Ларчанка.

ШЫРКО ВАСІЛЬ



Шырко Васіль Аляксандравіч (н. 31.8. 1948, в. Чурылава Уздзенскага р-на Мінскай вобл.), празаік, публіцыст, паэт. Член СП Беларусі з 1990, Саюза журналістаў Беларусі з 1975.

Нарадзіўся ў сялянскай сям'і на Уздзеншчыне. Яго бацька, Аляксандр Аляксандравіч, працаваў брыгадзірам будаўнічай брыгады ў саўгасе «Уздзенскі», ведае на памяць творы многіх беларускіх паэтаў, выступае з імі на тэлебачанні і радыё; маці, Ніна Васілеўна, працавала паляводам. В. Шырко вучыўся ў Чурылаўскай пачатковай (1956—59), Зенькавіцкай васьмігадовай (1959—63) школах. У 1966 скончыў Уздзенскую СШ. З 1966 вучыўся на факультэце журналістыкі БДУ. У 1972—73 служыў у Савецкай Арміі. У 1973—78 працаваў карэспандэнтам «Сельскай газеты». З 1978 рэдактар, старшы рэдактар, загадчык аддзела літаратуры і мастацтва Галоўнай рэдакцыі літаратурна-драматычных праграм Беларускага тэлебачання, вёў перадачу «Ліра», рыхтаваў творчыя партрэты пісьменнікаў і празаікаў. З 1986 загадчык аддзела нарыса часопіса «Полымя». Узнагароджаны Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета Беларусі. Лаўрэат прэміі Міністэрства культуры Беларусі (1987, за інсцэніроўку рамана М. Гарэцкага «Віленскія камунары») і дыпламант прэміі таго ж міністэрства (1987, за інсцэніроўку гумарыстычных твораў Н. Гілевіча).

Дэбютаваў вершамі («Дзеду, мілы мой дзеду...»; Каб раней мог адчуць...») у 1967 у газеце «Чырвоная змена». У часопісе «Маладосць» за 1968 год надрукаваў падборку вершаў («Пісьмо шукала адрасата...», «Вясну люблю», «Вір»). Першая прыгодніцкая аповесць «Зелле ад скрухі» з'явілася ў часопісе «Маладосць» у 1985. У 1989 у газеце «Мінская праўда» надрукавана другая прыгодніцкая аповесць «Воўчыя грыбы». Друкаваўся таксама ў калектыўных зборніках «Сучаснік», «Труд, талант, доблесть», рэспубліканскай перыёдыцы. Вядомы і як публіцыст. У часопісе «Полымя» надрукавана яго публіцыстычная аповесць «Дыханне жыта», нарысы «Споведзь правінцыяла», «Імем барыкад...» і інш. Аўтар кніг «Зямлі бацькоўскай прыцягненне», «Сцяжынка да людзей». У публіцыстыцы В. Шырко адчуваецца добрае веданне вясковага жыцця, уздымаюцца і аналі-

зуюцца яго актуальныя праблемы. Піша таксама для дзяцей. Яго казкі змяшчаліся ў калектыўным зборніку «Цвіце верас», часопісе «Полымя». Па словах Я. Пархуты, дзіцячыя казкі В. Шырко — «сапраўдная скарбонка народнага побыту, гумару, спадзяванняў селяніна». Аўтар кінасцэнарыя «Песня пшанічнага поля» (1984, Беларусьфільм). Выступае як актыўны прапагандыст роднай мовы на радыё, тэлебачанні, у друку.

Жыве ў Мінску.

Г. М. Урупіна.

Бібліяграфія

1.2.

Зямлі бацькоўскай прыцягненне. Мн., 1987.

Сцяжына да людзей: Дакументальныя аповесці, нарысы. Мн., 1989 [Рэспубліка. Час. Людзі].

Дзед Манюкін не салжэ: Казкі. Мн., 1990.

Дарагія мае землякі. Мн., 1991.

Хай людзі бачаць. Мн., 1991 (Б-ка часоп. «Маладосць»).

1.3.

1967. «Дзеду мілы мой дзеду...»; «Каб раней мог адчуць...»: [Вершы] // Чырв. змена. 21 мая; Самае важнае: [Верш] // Там жа. 23 ліп.; Песня [Верш] // Там жа. 29 кастр.

1968. «Пісьмо шукала адрасата...»; «Вясну люблю...»; Вір: [Вершы] // Маладосць. № 8; Апошні з племені «Арла»: [Верш] // Чырв. змена. 4 лют.

1969. Ты — музыка...: [Верш] // ЛіМ. 18 ліст.; Музыкальнае дрэва: [Верш] // Мін. праўда. 16 сак.; Мае героі: [Верш] // Чырв. змена. 23 ліст.

1970. Там, дзе вучыўся Купала // ЛіМ. 13 ліст. / Сааўт. Г. Зяньковіч.

1971. «Як верыць нам у непазбежнасць...»: [Верш] // Універсітэт паэтычны. Мн.; Святаяннік: [Верш] // Маг. праўда. 4 вер.

1973. В поисках «папараць-кветкі» // Знамя юности. 14 нояб.; Святаяннік; «Нібы магічнаю рукою...»; Загад; Роднае слова: [Вершы] // Чырв. змена. 8 вер.

1974. Калі размаўлялі гарматы...: Нарыс // ЛіМ. 1 лют.; Буду слухаць песні Асінстрою» // Там жа. 8 мая; Непратаптанай сцежкай: [Рэц. на кн.: Шымук В. Леў Даватар. Мн., 1973] // Чырв. змена. 9 студз.

1977. Святаяннік; Роднае слова; «Ад чаго, не ведаю, трывожна...»: [Вершы] // Полымя. № 6.

1978. Бацькава вуліца: Нарыс // Полымя. № 9.

1984. Зямлі прыцягненне: Нарыс // Полымя. № 12.

1985. Зелле ад скрухі: Аповесць // Маладосць. № 11.

М. П. Барташэвіч.

ШЫРМА РЫГОР



Шырма Рыгор Раманавіч [псеўд.: Р. Баравы, Вучыцель, крыпт.; В. М., В.-ч, Г. Ш., Р. Ш.; 8(20).1.1892, в. Шакуны Пружанскага пав. Гродзенскай губ., цяпер Пружанскі р-н Брэсцкай вобл.—23.3.1978, Мінск, пахаваны на Усходніх могілках], харавы дырыжор, фальклярыст, грамадскі і музычны дзеяч, публіцыст, літаратуразнавец. Народны артыст Беларусі (1949). Народны артыст СССР (1955). Герой Сацыялістычнай Працы (1977). Заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі (1946). Член Саюза пісьменнікаў Беларусі з 1966, Саюза кампазітараў Беларусі з 1946. Лаўрэат Дзяржаўных прэмій Беларусі (1966, 1974; за стварэнне канцэртных праграм і збіральніцка-фальклярыстычную дзейнасць).

Сялянскі род Шырмаў славіўся здольнымі людзьмі, дзед Васіль займаўся бандаркай і атрымаў мянушку «Майстровіч», якая перайшла на нашчадкаў; бацька Раман і маці Тадора Дзям'янаўна ведалі шмат песень, а цётка па бацькавай лініі Захвея Хвораст выдатна ўмела спраўляць народныя абрады, прыгожа спявала — ад яе Р. Шырма запісаў 150 народных песень. Любоў да песні выхоўвалі ў яго і хатні настаўнік Салук, і настаўнік літаратуры Пружанскага гарадскога вучылішча Манцэвіч, які навёў яго на думку запісваць народныя творы. Будучы слухачом двухгадовых настаўніцкіх курсаў у Свянцянах (1911—12), Р. Шырма прайшоў сальфеджыо, студэнтам настаўніцкага інстытута — навучыўся іграць на скрыпцы. У Яраслаўлі, куды эвакуіравалі інстытут

у гады 1-й сусветнай вайны, арганізаваў хор, авалодаў тэхнікай дырыжыравання (грошы з канцэртаў ішлі ў фонд дапамогі дзецям беларускіх бежанцаў). Там Шырма ўпершыню сутыкнуўся з адсутнасцю музычных апрацовак беларускіх народных песень. У канцы 1-й сусветнай вайны ён быў мабілізаваны ў армію. Пасля рэвалюцыі настаўнічаў у вёсцы Навагольская Навахапёрскага пав. Варонежскай губ. (яго вучнем там аказаўся будучы рускі пісьменнік Гаўрыла Траяпольскі — першы талент з народа, якога Шырма заўважыў, прабудзіў і вывеў у свет). У пачатку галоднага 1922 г. вярнуўся з жонкай, выкладчыцай матэматыкі К. Раеўскай, на радзіму, але застаў на месцы бацькавай хаты папялішча. Давялося працаваць лесарубам у Белавежскай пушчы. Перапісваўся з тагачасным дырэктарам Віленскай беларускай гімназіі Б. Тарашкевічам. Прыняў удзел у рабоце Беларускага выбарчага камітэта на Пружаншчыне; дзе атрымаў запрашэнне на пасаду настаўніка спеваў і выхавацеля ў інтэрнаце Віленскай гімназіі. Выбраны сакратаром Галоўнай управы Таварыства беларускай школы (ТБШ), ён наведваў глыбінныя раёны, нёс метадычную дапамогу гурткам ТБШ, хорам, хатам-чытальням, бібліятэкам, чытаў лекцыі і даклады, запісваў фальклор. З 1933 пачаў з Ф. Стацкевічам выдаваць часопіс «Летапіс ТБШ» (пазней «Беларускі летапіс»), стаў сябрам і апекуном маладых беларускіх паэтаў (выдаў зборнікі М. Васілька «Шум баравы» і «З сялянскіх ніў», М. Танка «На этапах»), абараняў іх ад нападак польскай шавіністычнай і беларускай згодніцкай прэсы, сам абараняўся ад левасектанцкіх выпадаў камуністычнай прапаганды, хоць не парываў сувязяў з патрыятычнымі сіламі КПЗБ і камсамола, лічачы апошні авангардам нацыянальнага вызвалення заходніх беларусаў. У сярэдзіне 1930-х г. адзін з першых сярод дзеячаў культуры падтрымаў праграму Народнага фронту, актыўна супрацоўнічаў як публіцыст у народнафронтаўскай «Нашай волі», выкрываючы дзеянні польскай рэакцыі. Ідучы па шляху народнафронтаўскага супрацоўніцтва і гуртавання дэмакратычных плыняў культуры, перапісваўся з рускім кампазітарам А. Грачанінавым (Парыж); украінскімі кампазітарамі А. Кошыцам і М. Гайваронскім (ЗША), пасылаў ім для апрацоўкі і гарманізацыі тэксты беларускіх песняў з нотамі, стварыў у Вільні 2 хоры: вучнёўскі пры беларускай гімназіі і студэнцкі пры Віленскім універсітэце. Ён наладжваў беларускія музычныя перадачы па польскім радыё, супрацоўнічаў з выдатным спеваком М. Забэйдам-Суміцкім. Выдаў для школьных і самадзейных хораў зборнікі «Беларускія народныя песні» (1929) і «Наша песня» (1938). Яго пастаянна праследавалі ўлады буржуазнай Польшчы: быў звольнены з пасады настаўніка гімназіі, двойчы быў арыштаваны і сядзеў на лаве падсудных. Пасля ўз'яднання Заходняй Беларусі з БССР арганізаваў у 1940 Дзяржаўную акадэмічную капэлу БССР, якая пад яго кіраўніцтвам увайшла ў лік выдатных калектываў краіны. У Айчынную вайну выступаў з канцэртамі ў вайсковых шпіталях і часцях дзеючай арміі. Пасля вайны працаваў з калектывам у Гродне, затым пераехаў у Мінск. Выдаў рэпертуарны зборнік «Дзвесце беларускіх народных песень», сістэматызаваў і апублікаваў у 4-х тамах плён сваёй шматгадовай збіральніцкай працы — «Беларускія народныя песні», выданне якіх вылучаецца высокай эстэтычнай якасцю адбору і мастацкімі вартасцямі тэкстаў. Быў ініцыятарам стварэння значных харавых і вакальна-сімфанічных твораў беларускай музыкі (кантата «Беларускія песні» А. Багатырова, хоры Р. Пукста і У. Алоўнікава на вершы П. Броўкі і М. Танка). Супрацоўнічаў з майстрамі рускай харавой музыкі, садзейнічаў стварэнню хораў В. Шабаліна, А. Ленскага, А. Фляркоўскага і інш. (на вершы Я. Купалы, П. Броўкі, М. Танка, М. Лужаніна). Погляды на грамадскую ролю народнай песні і мастацкага слова ва ўмовах нацыянальнага адраджэння Р. Шырма выказваў у артыкулах, нарысах, сабраных у зборніку «Песня — душа народа». Прыхільнік народных і класічных традыцый у мастацтве і літаратуры, ён крытычна ставіўся да авангардыстскіх навацый і вульгарнай эстраднасці.

Р. Шырма вёў вялікую грамадскую работу. Выбіраўся дэпутатам Вярхоўнага Савета БССР (1955—78). З 1966 і да канца жыцця кіраваў кампазітарскай арганізацыяй Беларусі, адначасова з'яўляўся сакратаром Саюза кампазітараў СССР. Доўгі час быў старшынёй Беларускага аддзялення таварыства па культурных сувязях з суайчыннікамі за мяжой. Узнагароджаны ордэнамі Леніна, Кастрычніцкай Рэвалюцыі, Працоўнага Чырвонага Сцяга, Знак Пашаны, балгарскім ордэнам Кірыла і Мяфодзія. Атрымаў Ганаровае званне «Заслужаны для польскай культуры».

З літаратуразнаўчымі артыкуламі і рэцэнзіямі Р. Шырма пачаў выступаць у друку ў 1933. У заходнебеларускай народнафронтаўскай перыёдыцы 1930-х г. вёў змаганне за кансалідацыю дэмакратычных пісьменнікаў на прынцыпах гуманізму і абароны духоўных каштоўнасцей ад фашысцкага вандалізму. Выдатным укладам у заходнебеларускую літаратурную думку сталі яго артыкулы пра Я. Коласа, Я. Купалу, А. Пушкіна, Л. Талстога, творчасць якіх аўтар успрымаў як маральны і эстэтычны эталон. З вышыні класічнай паэзіі ацэньваў творчасць заходнебеларускіх паэтаў рэвалюцыйнай арыентацыі, прызнаў у іх асобе пераемнікаў эстафеты народнасці, нацыянальнай свабоды і сацыяльнай справядлівасці. Спрабаваў свае сілы і ў драматургіі: у 1930 напісаў сцэнічны абразок «Зорным шляхам», які захоўваецца ў рукапісе ў Цэнтральнай бібліятэцы Літоўскай Акадэміі навук. У пасляваенных артыкулах і прамовах выступаў «пасрэднікам» паміж паэзіяй і музыкай, змагаўся за больш шырокае выкарыстанне кампазітарамі высокамастацкіх твораў беларускіх паэтаў дзеля ўзбагачэння нацыянальнай музычнай скарбніцы. Ад інтэнсіўнасці і змястоўнасці гэтага працэсу залежала, на яго думку, само існаванне беларускай культуры, захаванне нацыянальнай тоеснасці беларусаў, што, апынуўшыся ва ўмовах аўтарытарызму на цывілізацыйных сутыках і пагранічча паміж славянскім усходам і захадам, «размываліся» этнічна і духоўна. «Песня злучае народ» — вось дэвіз Р. Шырмы.

Памяць пра Р. Шырму ўвекавечана ў Беларусі. Яго імя носяць Дзяржаўная акадэмічная харавая капэла Беларусі і Пружанская музычная школа, дзе адкрыты прысвечаны яму музей. У сярэдняй школе № 150 г. Мінска дзейнічае прысвечаная яму экспазіцыя. На доме № 19 на пл. Незалежнасці ў Мінску, дзе Р. Шырма доўгі час жыў, у 1980 устаноўлена мемарыяльная дошка. Яго партрэты намалявалі М. Гусеў, У. Стальмашонак і інш. У 1980 на магіле Р. Шырмы ўстаноўлены бронзавы бюст работы скульптара І. Місько.

У. А. Калеснік.

Бібліяграфія

1.2.

Песня — душа народа: Публіцыстыка; Фальклор; Музыка; Літаратура: 1929—1939; 1944—1974 гг. Мн., 1976. Рэц.: Абакумовская Т. // Лит. обозрение. 1977. № 4; Мартинович А. Мыслей и чувств чистота // Сел. газ. 1976. 6 июля; Миско Я. Пламенная страсть // Неман. 1977. № 1; Фядосік А. Шчырасць любві да народа // Звязда. 1976. 22 чэрв.

Песня — душа народа: З літ. спадчыны. Мн., 1993.

1.3.

1933. Першыя крокі // Летапіс ТБШ. № 3—4 / Пад крыпт. Г. Ш.

1934. Шырокія і глыбокія фундаменты // Да злучэння! № 7—8 / Пад крыпт. В. М.

1935. Святло і цемра: (З нагоды 25-лецця з дня смерці Л. М. Талстога) // Наша воля. 24 снеж. / Пад крыпт. В. М.

1936. Матывы творчасці Максіма Танка // Танк М. На этапах. Вільня / Пад псеўд. Р. Баравы; Мастацкая песня ў Заходняй Беларусі // Маладая Беларусь. Вільня. № 1; Ідэя волі ў паэзіі Якуба Коласа // Бел. летапіс. № 1 / Пад крыпт. Р. Ш.; Пад Новы год // Там жа. № 1—3 / Пад крыпт. Р. Ш.; Беларускія валачобныя песні і іх распаўсюджанне на гэтым баку савецка-польскай граніцы // Калоссе. № 2; Пад Новы год: [Апавяданне] // Летапіс ТБШ. № 1—3 / Пад крыпт. Р. Ш.; Шукаюць аблічча // Наша воля. 20, 21 студз. / Пад крыпт. В. М.; Журнальны агляд // Там жа. 12 крас. / Пад крыпт. [В-ч]; «Маладая Беларусь» // Там жа. 2 мая / Пад крыпт. В-ч; «Першыя зярняткі»: [Рэц. на кн.: Паўловіч С. Першыя зярняткі. Вільня, 1936] // Там жа. 19 чэрв. / Пад. крыпт. В. М.

1937. Дзве стыхіі // Бел. летапіс. № 2—3 / Пад крыпт. Г. Ш.; Жыццё і смерць Пушкіна // Там жа. № 4 / Пад крыпт. Г. Ш.; Валачобнікі: [Апавяданне] // Снапок. № 1; Сёмуха: [Апавяданне] // Там жа. № 2.

1939. Да гісторыі працы над беларускай песняй // Бел. летапіс. № 1; На простор широкий // Освобожденный Белосток. 28 дек.; Białoruska pieśń ludowa // Sygnały. Nr 75.

1940. Фестываль калгаснай музыкі і песні // Вольная праца. 12 снеж.; Swobodnie rozbrzmiewa pieśń ludowa // Sztandar Wolności. 5 grud.

1941. На Усход ідучы: [Рэц. на кн.: Тарас Н. На Усход ідучы. Мн., 1940] // Вольная праца. 8 лют.

1944. Беларуская народная песня // Беларусь. № 3.

1948. Песні Вялікай Айчыннай вайны // Гродз. праўда. 12 сак.

1949. Сяргей Крывец // Мы іх не забудзем. Мн.; Гарадскі агляд мастацкай самадзейнасці // Гродз. праўда. 28 кастр.

1951. Песні барацьбы і народнага шчасця // Гродз. праўда. 25 сак. / Сааўт. А. Кіркевіч; Песня служыць народу // Калг. праўда. 16 вер.

1952. Аб сучаснай беларускай песні // Звязда. 21 снеж.; Мудры эпас // ЛіМ. 15 ліст.

1953. Паездка на Украіну // Маладосць. № 8; Гастроли И. С. Козловского в Минске // Сов. Бел. 23 июня; Творческий путь композитора // Там жа. 27 дек.

1954. Выдающийся мастер сцены: (К 50-летию со дня рождения народной артистки СССР Л. П. Александровской) // Сов. Бел. 17 февр.; Об исполнительском мастерстве // Там жа. 23 марта; Служение народу // Сов. культура. 2 марта.

1955. Душа народа: Канцэрты Польскага ансамбля «Шлёнск» // Звязда. 16 кастр.; Народныя таленты // Калг. праўда. 27 крас.; З невычэрпных крыніц // ЛіМ. 26 ліст.; Няспынна ўзбагачаць беларускую музычную культуру // Мін. праўда. 11 лют.

1956. Музычную літаратуру — у масы: [Пісьмо ў рэдакцыю] // Звязда. 13 чэрв. / У сааўт.; Слово к любителям музыки // Сталин. молодежь. 2 февр. / У сааўт.

1957. Хочам бачыць вас у нашых радах // За вярт. на Радзіму. № 44; Ад шчырага сэрца // Звязда. 27 кастр.; Народу — добрую песню // Мін. праўда. 10 сак.; Змагацца за сапраўдную песню: [Інтэрв'ю] // Чырв. змена. 4 вер.

1958. Аб музычным выхаванні моладзі // Маладосць. № 2 / Сааўт. А. Каландзёнак; Звініць радасная песня // За вярт. на Радзіму. № 64; Адны ў нас мары, імкненні адны // Звязда. 14 чэрв.

1959. Ад сэрца віншую // За вярт. на Радзіму. № 33; Хто мае рацыю? // Там жа. № 78; Са святам вас, суайчыннікі! // Там жа. № 82; «На пороге бессмертия» // Сов. Бел. 12 сент.

1960. Ясна, хто мае рацыю // Голас Радзімы. № 19; Перамога прыгожага // Там жа. № 37.

1961. Прамова на прыёме землякоў з ЗША у Беларускай секцыі камітэта за вяртанне на Радзіму і развіццё культурных сувязей з суайчыннікамі // Голас Радзімы. № 46; Народу — сапраўднае мастацтва // Наст. газ. 23 вер.; Глубокий след // Сов. Бел. 13 июня; З песняй па свеце // Чырв. змена. 16 снеж.

1962. Замест прадмовы // Беларускія народныя песні Гродзеншчыны. Мн.; Невычэрпная крыніца; Народная гордасць // Жыццё для народа. Мн.; Ад роднае зямлі // Голас Радзімы. № 89; ЛіМ. 2 ліст.; Голас Забэйды // Звязда. 12 вер.; Сэрцам і песняй сваёй пратэстую // ЛіМ. 12 чэрв.; Нерасторжимая связь // Сов. культура. 27 янв.

1963. Лейся, песня // Сов. Бел. 21 июля; Талант — народу // Там жа. 22 дек.

1964. Тут было сказана шмат пераканаўчых слоў...: [Выступленне] // Голас Радзімы. № 37—38; Са святам вас, землякі! // Там жа. № 64; Свежыя галасы // ЛіМ. 23 чэрв.; На прастор, на шырокі разлог... // ЛіМ. 18 вер.; Певец Беларуси // Сов. культура. 23 янв.

1965. Багата талентамі наша зямля // ЛіМ. 20 ліп.; Калі ласка! // Сов. Бел. 10 янв.; Еще одно прочтение // Сов. культура. 7 авг.

1966. Маршрутам братэрства: Дружба — наша сіла, наша радасць // ЛіМ. 5 крас.; Выхаванне пачуццяў: Нататкі з III Рэспубліканскага агляду мастацкай самадзейнасці школьнікаў // Там жа. 15 ліп.; Створым этнаграфічны музей: Пісьмо ў рэдакцыю // Там жа. 23 жн. / У сааўт.; Новые радости, светлые идеи, рабочее настроение // Лит. Россия. 15 апр.; С народом, для народа // Сов. Бел. 12 нояб.

1967. Калі ласка, сябры! // Голас Радзімы. № 36; Харaство пачуццяў і дум: Даклад на пленуме праўлення творчых Саюзаў // ЛіМ. 27 кастр.; У майстроў сцэны — добрая змена: [Інтэрв'ю] / Зап. П. Саковіч // Чырв. змена. 25 ліп.

1968. Цветет наш край // Коммунист Бел. № 12; Хлопец з Чэрвеня // ЛіМ. 1 студз.; Музыка, якая заўсёды з намі // Там жа. 13 снеж.; [Выступленне на чацвёртым з'ездзе кампазітараў СССР] // Сов. культура. 18 дек.

1969. Падтрымліваем! // ЛіМ. 13 чэрв.; Мелодыі зямлі роднай: [Інтэрв'ю] // Там жа. 26 вер.; Глубокий след // Сов. Бел. 22 мая; Искусство должно быть прекрасным // Сов. культура. 10 апр.

1970. Бывай, сямідзесяты! Дзень добры, Новы год! // Голас Радзімы. № 51; Рэвалюцыйны гарт паэта і дзеяча // Звязда. 11 чэрв.; Акрылены песнямі: М. Забэйду-Суміцкаму — 70 гадоў // ЛіМ. 12 чэрв.; Цяпло Радзімы: [Інтэрв'ю] // Чырв. змена. 1 крас.

1971. У песнях Радзіму славім: [Інтэрв'ю] // Вяч. Мінск. 14 студз.; Віктару Аляксандравічу Яхантаву: [Ліст] // Голас Радзімы. № 21 / Сааўт. В. Мацкевіч; Натхнёна служыць народу: Даклад // Звязда. 22 мая; З невычэрпных крыніц жыцця: Справаздачны даклад VI з'езду кампазітараў Беларусі // ЛіМ. 28 мая; Заспявае школа — заспявае народ // Наст. газ. 25 жн.

1972. Сяргей Крывец: Замест вянка на далёкую магілу ў ратным полі // Крывец С. Дубок. Мн.; Ад роднай зямлі // Маладосць. № 9; Слова пра паэта // Полымя. № 3; [Аб развіцці музычнай крытыкі ў Беларусі] // Сов. музыка. № 8; Вёска чакае спецыяліста: З выступлення на рэспубліканскай нарадзе работнікаў культуры // ЛіМ. 14 крас.; ...І ад ніў беларускіх // Там жа. 21 ліп.; Эпоха, жыццё, музыка: З даклада на Пленуме, прысвечаным 50-годдзю ўтварэння СССР // Там жа. 17 ліст.

1973. Прадмова // Беларускі фальклор у сучасных запісах. Мн.; Гордость советского человека // Сов. музыка. № 4; Вернасць вялікай мэце // Звязда. 19 крас.; А песня жила... // Сов. молодежь (Рига). 17 июня; До новых встреч, друзья! // Сов. Чувашия. 29 сент.

1974. [Аб беларускай музычнай публіцыстыцы] // За действенную музыкальную критику: Из материалов V пленума правления Союза композиторов СССР. М.; Служэнне народу // Тэатр. Мінск. № 1; Народны калектыў // Звязда. 3 крас.; Служение народу // Знамя юности. 17 февр.; Слово друзей: [Інтэрв'ю] // Сов. Бел. 12 окт.

1975. Подвиг поэтической души народа: [Інтэрв'ю] // Сов. музыка. № 5; Майстэрства натхнёнае, узнёслае // Звязда. 29 ліст.; «Песня — душа народа»: [Інтэрв'ю] // ЛіМ. 4 студз.; Гимн подвигу // Сов. Бел. 18 июня.

1976. Белорусская советская музыка // Муз. жизнь. № 2; Як галіны аднаго дрэва // Вяч. Мінск. 24 мая; Жыццё — крыніца натхнення: [Інтэрв'ю] / Зап. Я. Гарэлік // Звязда. 21 кастр.; «Музыкі крылы натхнёныя»: [Інтэрв'ю] / Зап. Я. Хвайніцкі // ЛіМ. 22 кастр.; Наша агульнае багацце: [Інтэрв'ю] / Зап. У. Майсееў // Мін. праўда. 23 мая; Музы друзей // Сов. Бел. 23 мая; От нив родных... // Сов. культура. 9 марта.

1977. Причина одна — страх // Правда о правах человека. М.; Сов. культура. 19 апр.; Жывая, дзейсная сувязь: [Інтэрв'ю] // Голас Радзімы. 6 студз.; Ураčыстым акордам // ЛіМ. 24 чэрв.; «...Песня — душа народа...»: [Інтэрв'ю] / Зап. П. Шаўцоў // Там жа. 16 снеж.; Жыццё, прысвечанае песні: [Інтэрв'ю] // Мін. праўда. 12 лют.; Калі спяваюць крыніцы: [Інтэрв'ю] / Зап. Т. Дзмітрусёва // Чырв. змена. 20 студз.

1981. Зберагаць культуру народа: Успаміны // Полымя. № 11.

1985. Разважанні пра вусную народную творчасць // Беларускі фальклор. Мн.

1.4.

Косаўскі Я. Для бліжніх: Драма ў 4-х дзеях / З укр. Вільня, 1933 (Бел. каап. б-ка, № 2) / Пер. пад. крыпт. Г. Ш.

1933. Парфановіч З. Шпітальныя нарысы: Апэрацыя «Кроў» / З укр. // Летапіс ТБШ. № 2 / Пер. пад крыпт. Г. Ш.

1.5.

На літоўскую мову. Pasidabinę kūrybos žiedais // Tiesa. Kovo. 19; «Garbingas pašaukimas liuti...» // Ciurlioniui 100. Vilnius, 1977.

1.6.

Беларускія народныя песні. Вільня, 1929. Вып. 1 / Скл.

Беларускія народныя песні, загадкі і прыказкі. Мн., 1947. Т. 1. / Скл. Рэц.: Данская Я. Аб зборніку беларускіх народных песень // Гродз. праўда. 1948. 9 студз.

Беларускія песні. Мн., 1955 / Скл. Рэц.: Охрименко П. // Сов. этнография. 1957. № 3.

Школьны спеўнік. Мн., 1957 / Скл. Рэц.: Ініч І. Прыкметы нашай музычнай будучыні // Маладосць. 1958. № 8; Нисневич И. // Сов. музыка. 1958. № 8.

Двести белорусских народных песен. М., 1958 / Скл.

Избранные песни из репертуара Государственного хора Белорусской ССР. М., 1958 / Тэкст на рус. і парал. на бел. і рус., укр. і рус., пол. і рус. / Скл.

Беларускія народныя песні: У 4 т. / Зап. Р. Шырма. Мн., 1959—1974. Т. 1. Любоўныя баладныя і бытавыя жартоўныя. Мн., 1959 / Зап. Рэц.: Ліс А. Неўміручыя народныя скарбы // Маладосць. 1959. № 6; Цішчанка І. Песня — душа народа // Калг. праўда. 1959. 31 мая; Т. 2. Жаночая доля, недабраная пара, хрэсьбінныя і сіроцкія; Казацкія, рэкруцкія і салдацкія; Батрацкія і прымацкія, песні няволі і змагання. Мн., 1960. Рэц.: Семяжон Я. Неадступная родная песня // Полымя. 1961. № 4; Ягo ж. Родная песня // Звязда. 1961. 22 крас.; Цішчанка І. Духоўны скарб народа // Маладосць. 1961. № 8; Ялатаў В. З багатай народнай скарбніцы // ЛіМ. 1961. 25 крас.; Т. 3. Вяснянкі, валачобныя і юраўскія; Купальскія, пятроўскія, жніво і дажынкі; Яравое жніво і восень; Калядныя і масленічныя. Мн., 1962. Рэц.: Куліковіч М. Чатырохтомнік беларускіх народных песняў у запісах Р. Шырмы // Бацькоўшчына. 1962. № 1—2; Т. 4. Вяселле. Мн., 1976.

Анталогія беларускай народнай песні. Мн., 1968 / Рэд.

Беларускія народныя песні: (Для хору). Мн., 1971. Т. 1. / Скл.

Крывец С. Дубок: Вершы. Мн., 1972 / Скл.

Беларуская народная творчасць савецкага часу. Мн., 1978 / Рэд.

Прыляцелі гусі: Народная песня з в. Шакуны Пружанскага пав. // Бел. летапіс. 1939. № 1 / Зап.

Народныя загадкі і прыказкі // Бярозка. 1945. № 4 / Зап.; Я ў сераду радзілася: Бел. нар. песня // Работніца і сялянка. 1955. № 8 / Зап.; Цераз рэчаньку; Ой, у полі крынічанька: Беларускія народныя песні // За вярт. на Радзіму. 1959. № 77 / Зап.; Чырвона каліна: Беларуская народная песня // Голас Радзімы. 1960. № 26 / Зап.

2.2.

На беларускай мове. Песня на ўсё жыццё: Успаміны пра Г. Р. Шырму: Мн., 1983. Рэц.: Kozlovskis A. Daina — tautos siela // Lit. ir menas. 1983. Geg. 14.

Рыгор Шырма: [Фотаальбом] / Аўт.-склад. В. Ліцвінка. Мн., 1990.

На рускай мове. Литвинко В. Г. Р. Ширма — фольклорист: Автореф. дис... канд. филол. н. Мн., 1984.

Паходзіў з сям'і саматужніка. Сярэднюю школу скончыў у Мінску (1929), працаваў рабочым у гуце, акцёрам у Мінскім тэатры рабочай моладзі (1929—31). У 1935 скончыў Дзяржаўны інстытут мастацтва ў Маскве. Потым вярнуўся ў Мінск, працаваў загадчыкам аддзела тэатра ў рэдакцыі газеты «Літаратура і мастацтва» (1935—40), а таксама ва Упраўленні па справах мастацтва пры Саўнаркоме БССР. З 1940 у Чырвонай Арміі, удзельнічаў у савецка-фінляндскай вайне. Загінуў на фронце ў час Вялікай Айчыннай вайны.

Як драматург М. Юдэлевіч пачаў творчасць у 1929 (публікацыі яго п'ес не выяўлены). Адзін з аўтараў калектыўнай п'есы «Першы штандар» (паст. ў 1930, па іншых звестках у 1929), аўтар п'есы «Зямля гарыць» (напісана ў 1932), якая ставілася на радыё. Зрабіў інсцэніроўку паводле рамана М. Астроўскага «Як гартавалася сталь» (паст. ў 1937), гэты ж твор ён паклаў у аснову лібрэта оперы «Паўка Карчагін» (музыка П. Падкавырава), якая ставілася ў пасляваенны час на сцэне кансерваторыі як студэнцкі аматарскі спектакль. У беларускім друку 30-х гадоў М. Юдэлевіч быў вядомы пераважна як тэатральны крытык і аглядальнік. Друкаваў водгукі на тэатральныя пастаноўкі, артыкулы і рэцэнзіі на спектаклі і творы драматургіі. Падыходзіў да ацэнкі п'ес з агульнапрынятых на той час ідэйна-класавых пазіцый. Развіваў канцэпцыю росквіту сучаснай яму драматургіі, адзначаў прыход у яе вядомых пісьменнікаў. Драматургічная канцэпцыя М. Юдэлевіча спалучала ў сабе супярэчлівыя рысы, якія вынікалі з абсалютнай дэфармацыі эстэтычных ацэнак і творчай інтуіцыі ў той час.

І. Э. Багдановіч.

Бібліяграфія

1.3.

1931. Справа ТРАМу — справа ўсяго камсамола: (На 1-й Усебеларускай трамаўскай нарадзе) // Чырв. змена. 1 чэрв.

1935. «Суд» // ЛіМ. 6 кастр.; Замест ненапісанай прадмовы: [Рэц. на кн.: Модэль М. Тэатр і драматургія. Мн., 1935] // Там жа. 17 снеж.

1936. Драматург абароннай тэмы // ЛіМ. 23 лют.; Пра работу з пачынаючымі // Там жа. 29 лют.; Пра мнімыя праблемы і яўнае ўбоства («Ася» ў Белдзяржтраме) // Там жа. 17 сак.; «...Як яе завуць»: (Прэм'ера ў БДТ-1) // Там жа. 28 сак. / Сааўт. Б. Мікуліч; Мальер на клубнай сцэне / Пад крыпт. Ю. М.; Заўвагі па сутнасці / Сааўт. Б. Мікуліч; Любоў і самакрытыка // Там жа. 21 мая; «Мікола Гоман»: Водгук на тэатральную пастаноўку // Там жа. 17 жн.

1937. Новыя спектаклі ў яўрэйскім дзяржаўным тэатры // ЛіМ. 14 крас.

1938. «Партызаны»: Заметкі аб п'есе і спектаклі // ЛіМ. 1 мая; Об одном спектакле // Сталин. молодежь. 28 янв.

1939. Росквіт беларускай драматургіі // ЛіМ. 3 кастр.

1940. «Сёстры» // ЛіМ. 2 ліст.

1941. Аб п'есе Кузьмы Чорнага // ЛіМ. 31 мая.

1.4.

Гурский И. Сваты: Комедия в 2-х действ. / С бел. Мн., 1937.

1.6.

Аднаактныя п'есы: Зб. для самадзейнай сцэны. Мн., 1937 / Скл.

2.3.

На беларускай мове. Пісьменнікі Савецкай Беларусі: Кароткі даведнік. Мн., 1981. *Т. М. Махнач.*

ЮДЭЛЬСОН АРОН

Юдэльсон Арон Ісакавіч (17.7.1907, Рыга — 29.10.1937, Мінск), паэт, нарысіст. Пісаў на яўрэйскай мове. Член СП Беларусі з 1934.

Паходзіў з сям'і настаўніка. Да 1928 жыў у Латвіі (Латгаліі), потым пераехаў у Беларусь. У 1930 паступіў у Мінску на літаратурнае аддзяленне Педагагічнага інстытута, але пакінуў вучобу на 4 курсе. Працаваў у рэдакцыі яўрэйскай газеты «Октобэр», на радыё. У 1935 быў сакратаром яўрэйскай секцыі СП БССР. У 1937 рэпрэсіраваны, прысуджаны да вышэйшай меры пакарання. Рэабілітаваны пасмяротна ў 1957.

Друкавацца А. Юдэльсон пачаў у 1923 у нелегальным друку Латвіі (публікацыі не выяўлены). З 1929 выступаў у яўрэйскім друку Беларусі. Да 1935 часта публікаваўся ў часопісе «Штэрн». Выйшла некалькі кніг яго паэзіі і прозы на яўрэйскай мове. У 1961 у перакладзе на беларускую мову выйшла кніга выбраных вершаў А. Юдэльсона «Прывітанне». У першым яе раздзеле «Блуканні» сабраны вершы 1921—28, калі паэт яшчэ жыў у Латвіі. Другую частку «Мой дом» склалі творы, напісаныя за гады жыцця ў Савецкай Беларусі. Найбольшую глыбіню перажыванняў, сапраўдны лірызм і мастакоўскую чуласць да праяў жыцця паказаў паэт якраз у ранні, латгальскі, перыяд сваёй творчасці, калі натуральнасць пачуццяў не была яшчэ скасавана класавай ідэалогіяй.

І. Э. Багдановіч.

Бібліяграфія

1.2.
Камбінат: Паэма. М.; Х.: Мн., 1931 / Яўр. Рэц.: Кабакоў Н. Пра паэму Юдэльсона «Камбінат» // Маладняк. 1931. № 8; Ягож. Радасная з'ява // Штэрн. 1931. № 10—11 // Яўр.
Межы: Проза і вершы. Мн., 1934 / Яўр.
У нашай сталіцы: (Нарысы). Мн., 1934 / Яўр.
Чырвонасцяжны калгас «Колас». Мн., 1934 / Сааўт. Х. Шынклер / Яўр.
1.3.
1929. Негарэлае: [Паэма] // Штэрн. № 5—6 / Яўр.; Загадана сцерагчы, загадана стаяць...: [Верш] // Там жа. № 10 / Яўр.
1930. Наша зямля: [Верш] // Штэрн. № 2—3 Яўр.
1931. Лясы змагаюцца: [Вершы] // Штэрн. № 4—5 Яўр.
1932. Краіна магніту і будаўніцтва: [Паэма] // Штэрн. № 1—2 / Яўр.; Крышацца скалы: [Верш] / Там жа. № 10—11 / Яўр.
1933. Норд-ост: [Вершы] // Штэрн. № 5—6 Яўр.
1934. Рапартаваць з'езду творчасцю і масавай работай // ЛіМ. 20 студз.
1935. [Вершы] // Штэрн. № 10—11 / Яўр.
1.5.
На беларускую мову. Прывітанне: Вершы / З яўр. Мн., 1961.
Вітанне: [Верш] / Пер. І. Плаўнік // Маладняк. 1930. № 3; З паэмы «Негарэлае»: Урыўкі / Пер. І. Плаўнік // Там жа. 1930. № 6—7; Негарэлае: [Урывак з паэмы] / Пер. І. Плаўнік // Чырв. змена. 1931. 11 вер.; Ноч перад пускам: (Урывак з паэмы) / Пер. А. Зарыцкі // ЛіМ. 1933. 27 жн.; Надзея; Беларускія пушчы: [Уступ да паэмы «Камбінат»]; Вакзал: [Вершы] / Пер. С. Шушкевіч // Там жа. 1959. 21 студз.; Негарэлае: Урывак з паэмы / Пер. А. Вольскі, П. Макаль // Полымя. 1960. № 9.
На латышскую мову. Kur?; Es nezinu; Uz Latgales celiem; Cerība; Jaunība / Atdz. M. Kempe. // Karogs. 1962. Nr 7.
2.3.
На беларускай мове. Базарэвіч М. Прывітанне светламу дню // ЛіМ. 1961. 29 жн.; [«Наш каляндар»] // Там жа. 1982. 16 ліп.; Пісьменнікі Савецкай Беларусі: Кароткі даведнік. Мн., 1981; Платнер А. Арон Юдальсон // Юдальсон А. Прывітанне. Мн., 1961; Хведаровіч М. Ён быў у нашым страі // ЛіМ. 1967. 18 ліп.
На рускай мове. Ром Л. Писатель — рядовой боец социалистической стройки // Рабочий. 1931. 25 июля.

Т. М. Махнач.

ЮРЧАНКА ГЕОРГІЙ

Юрчанка Георгій Фёдаравіч (псеўд.: Харытон Бессардэчны, Ю. Георгіеў, Ю. Герасімаў, Ю. Грыгарук, Ягор Дзенісенка, Х. Дзенісёнак, Якаў Дзенісенкаў, Язэп Кудравіцкі, Я. Кудрыцкі, Ягор Кудрыцкі, Ю. Лявончык, Дзяніс Панкрацёнак, Ю. Паўлаў, Я. Фёдараў, Рыгор Юркевіч, Генадзь Юрчанка; н. 31.1.1928, в. Кудрычы Мсціслаўскага р-на Магілёўскай вобл.), паэт-сатырык, парадыст, мовазнавец, крытык. Член СП Беларусі з 1975.

Нарадзіўся ў сялянскай сям'і. Бацька, Фёдар Дзянісавіч, быў удзельнікам першай сусветнай, грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войнаў. Да пачатку вайны Г. Юрчанка скончыў 5 класаў, пасля вайны працаваў у калгасе рахункаводам, адначасова вучыўся. Скончыўшы СШ у Мсціславе (1949), паступіў у Магілёўскі настаўніцкі інстытут. З 1951 працаваў настаўнікам на Гродзеншчыне, выкладаў беларускую мову і літаратуру ў сярэдніх школах в. Ахонава Дзятлаўскага р-на, в. Любарты і Канвелішкі Воранаўскага р-на. Каб прадоўжыць адукацыю, паступіў на завочнае аддзяленне філалагічнага факультэта Гродзенскага педагагічнага інстытута, які закончыў у 1959. У 1959 ён паступіў ў аспірантуру Інстытута літаратуры імя Я. Купалы АН БССР. З 1961 рэдактар, загадчык рэдакцыі літаратуры і мастацтва, пазней рэдакцыі філалогіі выдавецтва «Навука і тэхніка». З 1988 на пенсіі. Узнагароджаны медалём.

Першы верш, «На смерць Марціна Рыля», Г. Юрчанка напісаў у 1940 пад уражаннем прачытанай аповесці Я. Коласа «Дрыгва». Вясной 1945 спрабаваў напісаць паэму пра партызанскую барацьбу. Але друкавацца пачаў толькі ў 1959 (вершы «Вясной», «Сонца, стаміўшыся, вейкі-праменні...») у воранаўскай раённай газеце «Путь социализма». У рэспубліканскім друку выступае з 1959. Пазней пачаў выступаць у дэфіцытных для беларускай літаратуры жанрах пародыі і эпіграмы. У гэтай галіне мае несумненныя поспехі: умее пранікнуць у спецыфіку ідэйна-творчай манеры, выявіць асаблівасці стылю таго або іншага паэта, празаіка, крытыка, у сяброўска-гумарыстычнай ці з'едліва-саркастычнай форме раскрыць, «агаліць» сутнасць твора, які парадзіруецца. І ў гэтым сэнсе Г. Юрчанка паўстае перад чытачом як свайго роду тонкі і назіральны даследчык. Пра гэта сведчаць яго кнігі літаратурных пародый і эпіграм «Распрэжаны Пегас», «Вярхом на вожыку», «Немеладычныя мелодыі», «Парнаскія ўхабы», «У натхнёнай паграбеньцы», «Негабляваная пегасня». Г. Юрчанка вядомы і як збіральнік народнай лексікі і фразеалогіі («Дыялектны слоўнік. З гаворак Мсціслаўшчыны», «Народная сінаніміка», збор дыялектнай фразеалогіі ў кнігах «І коціцца і валіцца», «І сячэ і паліць», «Слова за словам», а таксама «Народнае вытворнае слова» ў 3 кнігах, «Сучаснае народнае слова»). Выступае з артыкуламі, рэцэнзіямі на творы сучасных беларускіх пісьменнікаў.

Жыве ў Мінску.

Я. К. Усікаў.

Бібліяграфія

1.2.

Распрэжаны Пегас: Пародыі і эпіграмы. Мн., 1965 (Б-ка Вожыка). Рэц.: Дзюбайла П. Пародыя — таксама літаратурны твор // Полымя. 1966. № 10; Ерамінок У. У сваім сядле // ЛіМ. 1966. 15 ліп.; Лёсік Г. Дзядоўнік на Парнасе // Чырв. змена. 1966. 16 жн.

Дыялектны слоўнік: (З гаворак Мсціслаўшчыны). Мн., 1966. Рэц.: Аниченко В. Говор Мстиславщины // Сов. Бел. 1967. 31 марта; Жураўлёў В. Жывое народнае слова // Звязда. 1966. 10 снеж.; Новиков А. Ценный труд // Кн. обозрение. 1967. 8 апр.; Падгайскі Л. Слоўнік роднай гаворкі // Маладосць. 1967. № 4; Подлужный А. Говоры Мстиславщины: 2000 слов «Диалектного словаря» // Кн. обозрение. 1966. 18 нояб.; Прашковіч М. Важкае слова // Беларусь. 1967. № 4; Стэцка П. Дарагія скарбы // Полымя. 1967. № 4; Яшкін І. У скарбніцу роднай мовы // ЛіМ. 1966. 11 ліст.; Gutschmidt K. Zwei neue Beiträge zur belorussischen Lexikographie // Zeitschrift für Slawistik. 1969. H. 1.

Вярхом на вожыку: Літ. пародыі. Мн., 1968. Рэц.: Бярозкін Р. Творы дзейснага жанру // Беларусь. 1968. № 12; Казанаў Б. У люстры пародыі // ЛіМ. 1968. 25 кастр.; Яскевіч А. Вясёлым вокам пародыі // Полымя. 1969. № 5; Яго ж. Насмешлівым вокам пародыі // Маг. праўда. 1969. 4 сак.

Народная сінаніміка. Мн., 1969. Рэц.: Блінава Э., Падгайскі Л. Сінаніміка народнай мовы // Полымя. 1970. № 2; Булыка А. Багацце народнага слова // ЛіМ. 1969. 9 вер.; Яшкін І. З нівы народнай сінанімікі // Звязда. 1969. 23 жн.; Gutschmidt K. Zur belorussischen Lexikographie in den Jahren 1969 und 1970 // Zeitschrift für Slawistik. 1971. H. 3.

І коціцца і валіцца: Устойлівыя словазлучэнні ў гаворцы Мсціслаўшчыны. Мн., 1972. Рэц.: «И катится и валится» // Сел. газ. 1972. 16 апр.; Лепешаў І. З невычэрпных моўных скарбаў // Полымя. 1973. № 1; Пшыркоў Ю. Багацце і рознаколернасць мовы // Звязда. 1972. 23 жн.; Шугурова И., Аксамитов А. Первый опыт создания фразеологического словаря одного говора // Труды Самаркандского ун-та. 1975. Вып. 272; Вопросы фразеологии. 1975. № 8; Яшкін І. Хай коціцца, хай валіцца // ЛіМ. 1972. 26 мая.

І сячэ і паліць: Устойлівыя словазлучэнні ў гаворцы Мсціслаўшчыны. Мн., 1974. Рэц.: Васілеўскі М. У плынях мовы // Беларусь. 1975. № 6; «І сячэ і паліць» // Маладосць. 1975. № 3; Лепешаў І. Моўныя скарбы Мсціслаўшчыны // Полымя. 1975. № 9.

Немеладычныя мелодыі: Пародыі і эпіграмы. Мн., 1974. Рэц.: Іпатава В. І смешна, і трапна // Полымя. 1975. № 11; Ралько І. Пародыя: мёд ці палын?.. // Вяч. Мінск. 1976. 16 студз.; Усікаў Я. Майстар пародыі // Маг. праўда. 1975. 23 жн.; Яго ж. Талент пісьменніка-парадыста // Беларусь. 1975. № 4; Яўсееў Р. Не дзеля смеху адзінага // ЛіМ. 1974. 18 кастр.

Слова за слова: Устойлівыя словазлучэнні ў гаворцы Мсціслаўшчыны. Мн., 1977. Рэц.: Лепешаў І. Залацінкі народнай мудрасці // Полымя. 1978. № 1; Сцяцко П. Моўныя самацветы // Звязда. 1978. 1 лют.; Хацкевіч В. Фразеалагічныя багацці народнай мовы // Весці АН БССР. Сер. грамад. н. 1978. № 4; Шарупіч Р. Працы Юрага Юрчанкі ў галіне беларускай дыялекталогіі // Беларус (Нью-Йорк). 1977. Снежань. № 248; Яшкін І. Моўныя самацветы // ЛіМ. 1977. 18 ліст.

Парнаскія ўхабы: Пародыі, эпіграмы. Мн., 1979. Рэц.: Верас А. Парнаскія ўхабы // ЛіМ. 1979. 5 кастр.

Народнае вытворнае слова: З гаворкі Мсціслаўшчыны. А—Л. Мн., 1981. Рэц.: Абабурка М. Вывучэнне мовы Мсціслаўшчыны // Беларусь. 1981. № 12; Яго ж. Моўныя фарбы Мсціслаўшчыны // Маг. праўда. 1981. 24 ліп.; Войценкаў М. Слоўнік народных гаворак // Звязда. 1981. 16 мая; Сцяцко П. Невычэрпныя скарбы мовы народнай // Полымя. 1981. № 9; Яшкін І. Багацце народнага слова // ЛіМ. 1981. 26 чэрв.

Народнае вытворнае слова: З гаворкі Мсціслаўшчыны. М—Р (разбарона). Мн., 1983. Рэц.: Абабурка М. Шматтомнае даследаванне // Маг. праўда. 1983. 5 крас.; Хацкевіч В. Духоўны скарб народа // Полымя. 1983. № 9.

У натхнёнай паграбеньцы: Пародыі. Мн., 1983. Рэц.: Бабура І. Адзін супраць... 79-ці // ЛіМ. 1983. 29 ліп.

Народнае вытворнае слова: З гаворкі Мсціслаўшчыны. Р—Я. Мн., 1985. Рэц.: Абабурка М. З гаворкі Мсціслаўшчыны // Маг. праўда. 1985. 6 чэрв.; Яго ж. Моўныя скарбы Мсціслаўшчыны // ЛіМ. 1985. 26 ліп.

На мсціслаўскай зямлі ўзгадаваны: Нарыс жыцця і навук. дзейнасці П. П. Кабекі. Мн., 1986.

Сучаснае народнае слова: З гаворкі Мсціслаўшчыны. Мн., 1988.

Негабляваная пегасня: Літ. пародыі. Мн., 1989.

На земле Мстиславщины взращённый: Очерк жизни и научной деятельности П. П. Кобеко. Мн., 1991.

1.3.

1959. Паабяцалі і ... забыліся // Наст. газ. 27 ліст.

1960. В. Вольскаму, А. Лазнявому, П. Глебку; Драма; Узор байкі; Поўны збор мемуарыста: [Эпіграмы] // Вожык. № 8; Чаму зямля круціцца; На прыволлі; Наш знаёмы; Абяцалкін; Трусіны ўзгорак; Чарговы верш; На скале; І прыемна, і карысна...: Пародыі і эпіграмы // Вожык. № 15 / Пад псеўд. Дзяніс Панкраценак; «На бераг выцягнуўшы човен...»: [Верш] // Голас Радзімы. № 51; ЛіМ. 5 ліп. / Пад псеўд. Ягор Кудрыцкі; Твор аб знойдзеным шчасці // ЛіМ. 20 студз.; Сурова і праўдзіва // Там жа. 27 крас.; Паэтычны роздум; Ку-ка-рэ-ку; Тры загадкі; У рыфмаваных лапцях; Астранамічная паэзія; Паўтрыялета: [Пародыі і эпіграмы] // Там жа. 18 мая / Пад псеўд. Ягор Кудрыцкі; Прамова Кудліка перад крытыкамі: Пародыя // Там жа. 7 чэрв. / Пад псеўд. Ягор Кудрыцкі; Замужні хлопец; Салодкія ўспаміны: Пародыі // Там жа. 19 ліп. / Пад псеўд. Ягор Кудрыцкі; Прадчуванне: Пародыя // Там жа. 19 жн. / Пад псеўд. Ягор Кудрыцкі; У краіне долара: [Рэц. на кн.: Філімонаў М. Дзве паездкі за акіян. Мн., 1960] // Там жа. 18 кастр.

1961. Рак-наватар; Хлюст; Зазнайка: [Вершы] // Вожык. № 2 / Пад псеўд. Дзяніс Панкраценак; Веру; Кветкі; Здрада: Літаратурныя пародыі // Там жа. № 11 / Пад псеўд. Дзяніс Панкраценак; Пераклічка пакаленняў // Маладосць. № 3, 4; Адаму Русаку; Па сакрэту; Рвецца песня да нябёс: [Пародыі і эпіграмы] // Там жа. № 11; У госці; Пахне; Над часопісам: [Пародыі] // ЛіМ. 14 сак. / Пад псеўд. Ягор Кудрыцкі; Ісці непраторанымі сцежкамі: [Рэц. на кн.: Дуброўскі І. Паўз самыя вокны. Мн., 1961] // Там жа. 16 чэрв.; Родныя з'явы; Прызнанне ў любві: [Літаратурныя пародыі] // Там жа. 7 ліп. / Пад псеўд. Ягор Кудрыцкі; Усхваляваны голас: [Рэц. на кн.: Смагаровіч М. Маё выступленне. Мн., 1961] // Там жа. 29 вер.

1962. Погляд у будучыню; Па грыбы; Е. Лось: [Пародыі і эпіграмы] // Вожык. № 3; З увагай да чалавека: [Рэц. на кн.: Хомчанка В. Аднойчы майскім днём. Мн., 1962] // Полымя. № 10; Маладзечна; Млечным шляхам; Я — іду; Па грыбы; Мой шлях; Спроба ў галіне чыстай лірыкі: Па слову з многіх; Васіль Макарэвіч; Барыс Бур'ян; Пісьменнік-фантаст; Вячаслаў Адамчык; Ігнат Дуброўскі; Піліп Пестрак; Сааўтары; Малюнак ля Парнаса; Юбілярам добра быць; Дабрадзей; Непрызнаны аўтарытэт; Супакоілі; Дутая велічыня: [Пародыі. Эпіграмы. Байкі] // ЛіМ. 1 студз. / Пад псеўд. Ягор Кудрыцкі. У сааўт.; Саганная лірычная; Манументальна; З дагістарычнага; Вада; Мелодыі кветкава-агародныя; Шчыпальная сентыментальная: [Літаратурныя пародыі] // Там жа. 16 сак. / Пад псеўд. Ягор Кудрыцкі; Сяргей Грахоўскі; Генадзь Бураўкін; Васіль Вітка; Артур Вольскі; Авяр'ян Дзеружынскі; Сяргей Дзяргай; Алесь Звонак; Максім Лужанін; Пятро Прыходзька; Адам Русак; Аляксей Пысін; Янка (Іван) Сіпакоў; Кастусь Цвірка; Станіслаў Шушкевіч; Данута Бічэль; Сцяпан Гаўрусёў: Вясна на Парнасе: Літаратурныя пародыі // Там жа. 1 мая; Канчатковае перавыхаванне; Звілісты шлях Піндэра; Паляванне на шчупака; Веснавая музыка: Літаратурныя пародыі // Там жа. 11 снеж.

1963. Рак-наватар; Хлюст; Зазнайка: [Мініяцюры] // Працяг знаёмства. Мн.; Роспач; На захад і на ўсход: (Пародыі) // Вожык. № 1; З Аляксея Русецкага; З Антона Бялевіча; З Алеся Звонака: Літаратурныя пародыі // Там жа. № 20; Еўдакіі Лось; Нілу Гілевічу: [Пародыі] // Маладосць. № 4; Анатолю Клышку: [Эпіграма] // Там жа. № 10; Юрасю Свірку; Аляксею Яскевічу (Алесь Яскевіч); Уладзіміру Паўлаву: [Пародыі і эпіграмы] // Там жа. № 12; Сённяшняе і ўчарашняе: [Рэц. на кн.: Кавалёў П. Сонца ў вокны. Мн., 1962] // Полымя. № 4; З мемуараў некаторых маладых паэтаў; Хто я?; Я гавару: Літаратурныя пародыі // ЛіМ. 29 студз.; Піліп Пестрак; Алена Васілевіч; Іван Мележ; Алесь Шашкоў: Літаратурныя пародыі // Там жа. 30 крас.; Аграном; Неадкладная справа: Літаратурныя пародыі // Там жа. 13 жн.; Зямля; РайСлуцк; Трактат аб селядцах: Літаратурныя пародыі // Там жа. 10 вер.; У цэль і міма: [Рэц. на кн.: Пад корань. Мн., 1963] // Там жа. 15 ліст.; З Сяргея Грахоўскага; З Сцяпана Гаўрусёва; З Уладзіміра Дубоўкі; З Анатоля Вярцінскага; З Максіма Танка; З Піліпа Пестрака; З Кастуся Цвіркі-Гадзіцкага; З Нічыпара Чарнушэвіча; З Міхася Калачынскага: [Літаратурныя пародыі] // Там жа. 17 снеж.; Анатоль Астрэйка; Рыгор Барадулін; Уладзімір Нядзведскі; Якаў Герцовіч; Кастусь Кірэенка; Міхась Лынькоў; Станіслаў Шушкевіч; Еўдакія Лось; Мікола Ткачоў; Ніл Гілевіч; Авяр'ян Дзеружынскі: Літаратурныя пародыі // Там жа. 31 снеж.; Пясняр вялікай праўды: [Рэц. на кн.: Ярош М. Міхась Чарот. Мн., 1963] // Чырв. змена. 16 крас.; Васільковы подых успамінаў; Катлеты: [Пародыі] // Там жа. 17 крас.

1964. Бяссмерце паэта: [Рэц. на кн.: Тарас Шаўчэнка і беларуская літаратура. Мн., 1964] // Беларусь. № 3 / Пад псеўд. Я. Фёдараў; Трумсель на круйс-брамрэй: Пародыя // Там жа. № 4; Парыж: [Пародыя] // Там жа. № 9; Антон Бялевіч; Анатоль Вялюгін; Паўлюк Прануза; Васіль Макарэвіч, Юрась Свірка: Літаратурныя пародыі // Звязда. 5 студз.; І ад гумару часам сумна: [Рэц. на кн.: Скрыпка М. Усяк бывае... Мн., 1963] // ЛіМ. 17 студз.; Асацыяцыя дысацыяцый (А. Яскевіч); Сінеча зімовых пялёстак (В. Каваленка); Успрыняцце сутнасці нетыповага (А. Кучар); Новым жанрам — дарогу (В. Бурносаў): Літаратурныя пародыі // Там жа. 28 лют.; У цэль і міма: [Рэц. на кн.: Корбан У. Да цешчы на бліны. Мн., 1963] // Там жа. 13 сак.; Шлях пісьменніка: [Рэц. на кн.: Каваленка В. Пошукі і здзяйсненні. Мн., 1963] // Там жа. 7 крас.; Пра паэта зайздроснага лёсу: [Рэц. на кн.: Грынчык М. Аркадзь Куляшоў. Мн., 1964] // Там жа. 5 мая; Ілья Шэмет; Удава: Літаратурныя пародыі // Там жа. 5 чэрв.; Гумар і нумар; Па дарозе на Вялікую Мядзведзіцу; Паб'ёлс камянскі: Літаратурныя пародыі // Там жа. 11 жн.; Характары і схемы: [Рэц. на кн.: Данілёнка М. Наваселле. Мн., 1964] // Там жа. 20 ліст.; Валянцін Тарас; Сяргей Грахоўскі; Пятрусь Макаль; Кастусь Цвірка: Літаратурныя пародыі // Там жа. 24 ліст.; Пасля падарожжа: [Рэц. на кн.: Пестрак П. Серадзібор. Мн., 1963] // Там жа. 18 снеж.; Маладзіца: Пародыя // Чырв. змена. 16 лют.; Слёзы скрозь радасць: Літаратурная пародыя // Там жа. 21 сак.; Нагавіцы: Пародыя // Там жа. 17 снеж.; Кастусь Цвірка; Данута Бічэль-Загнетава; Віктар Ракаў; Сямён Блатун; Мар'ян Дукса: Пародыі // Там жа. 24 снеж.

1965. Па грыбы: Пародыя // Дзень паэзіі — 65. Мн.; Арэлі: Пародыя // Беларусь. № 6; Зразумеў; Баю-бай; Пацалуйце мяне: Літаратурныя пародыі // Вожык. № 18; Скарбы — побач // Полымя. № 1; Гэта не дробязі: [Рэц. на кн.: Машара М. Зелянушка і Кракатушка. Мн., 1964] // Там жа. № 4; У два адрасы: [Рэц. на кн. Якімовіч А. Прыгоды хлопчыка Іларыка. Мн., 1965] // Там жа. № 10; Воблакі над авечкамі; Бульбе не дамо загінуць: Літаратурныя пародыі // ЛіМ. 2 лют.; Прысяга на вернасць: [Рэц. на кн.: Куляшоў А. Новая кніга. Мн., 1964] // Там жа. 12 лют.; Аб ісцінах банальных: [Рэц. на кн.: Ракітны М. Была вясна... Мн., 1964] // Там жа. 19 сак.; Перамога кавалася ў барацьбе: [Рэц. на кн.: Няхай Р. Героі не адступаюць. Мн., 1965] // Там жа. 20 крас.; Ад песень і думак народных: [Рэц. на кн.: Макарэвіч А. Ад песень і думак народных. Мн., 1965] // Там жа. 28 мая; Старонкі з жыцця М. Горкага: [Рэц. на кн.: Богданович А. Страницы из жизни М. Горького. Мн., 1965] // Там жа. 11 чэрв. / Без подпісу; У прадбачлівым асвятленні; Праблема своечасовай коскі: Літаратурныя пародыі // Там жа. 15 чэрв.; Старонкі роздуму: [Рэц. на кн.: Скрыган Я. Ранішнія росы. Мн., 1965] // Там жа. 16 ліп.; Сон на скамейцы:

Літаратурная пародыя // Там жа. 6 жн.; Ён назаўсёды застаўся маладым // Там жа. 20 жн.; Галоўны герой — сучаснік: [Рэц. на кн.: Кулакоўскі А. Першае чаканне. Мн., 1965] // Там жа. 1 кастр.; Я паехаў; Рабіны: Літаратурныя пародыі // Там жа. 2 ліст.; Падарожжа ў краіну маленства: [Рэц. на кн.: Грамовіч І. Сонца скрозь воблакі. Мн., 1964] // Там жа. 23 ліст.; Толькі намеры: [Рэц. на кн.: Гаўрылкін Л. Прашу звольніць мяне. Мн., 1965] // Там жа. 21 снеж.; Яўген Ступенька; Анатоль Верхантовіч; Янка Хрыпакоў: [Пародыі] // Чырв. змена. 1 студз.; Васілю Макарэвічу; Казіміру Камейшу; Валянціну Лукшу: Пародыі // Чырв. змена. 28 студз.; У водпуску; Што было: Пародыі // Там жа. 22 вер.

1966. Зразумеў; Баю-бай; Пацалуйце мяне: Літаратурныя пародыі // Вожык у дарозе. Мн.; Марсіянін: Пародыя // Беларусь. № 4; Вучыцеся; Імя пісалі; Агуркі; Мае думкі; Ляснік; Песні — песні: Літаратурныя пародыі // Вожык. № 8; Народу свайму ўслугуючы...: [Рэц. на кн.: Пширков Ю. А. Е. Богданович. Мн., 1966] // Полымя. № 9; У краіне маленства: [Рэц. на кн.: Аношкін І. Навічок. Мн., 1966] // Там жа. № 12; Даследуюцца песні і казкі: [Рэц. на кн.: Ахрыменка П. Беларускія песні і казкі. Мн., 1965] // Звязда. 25 студз.; Очерки об ученых Белоруссии // Кн. обозрение. 21 окт.; Па законах жанру: [Рэц. на кн. Сіпакоў Я. Лысы юбілей. Мн., 1965] // ЛіМ. 14 студз.; У пад'ёме, на ўздыме (П. Дзюбайла): Літаратурная пародыя // Там жа. 28 студз.; Мсціслаўскі «Гарызонт» // Там жа. 4 лют.; Выдавецтва «Навука і тэхніка» // Там жа. 18 лют. / Без подп.; Гісторыя беларускай савецкай літаратуры. Том другі // Там жа. 5 крас. / Без подп.; Аукцыёнія; Вясной; Сустрэча; Слова за словам: Пародыі // Там жа. 10 чэрв.; Папаўся; Аповесць пра ўласны помнік; Як я кахаў; Чатырохкутнік; Вынаходнік: Пародыі // Там жа. 1 ліп.; Кіраўнік стотысячнай грамады: [Рэц. на кн.: Ліс А. Браніслаў Тарашкевіч. Мн., 1966] // Там жа. 7 кастр.; Смех — справа вясёлая: [Рэц. на кн.: Ваданосаў М. Прынцыповы аратар. Мн., 1966] // Там жа. 18 ліст.; Пасля спектакля; Сааўтарам; Узор байкі: [Эпіграмы] // Маг. праўда. 27 лют.; Палымянасць // Чырв. змена. 11 студз.; Уладзімір Верамейчык; Іван Летка; Міхась Стрыгалёў; Мікола Федзюковіч: Пародыі // Там жа. 20 студз.; Не байка, а быль // Там жа. 5 сак.; Вользе Іпатавай; Яўгену Крупеньку; Міколу Міцкевічу; Анатолю Сербантовічу; Уладзіміру Бабраўнічаму; Вячаславу Рагойшу; Аўгінні Кавалюк; Хведару Чэрню; Міколу Маляўку: Літаратурныя пародыі // Там жа. 12 мая.

1967. Трапным словам сатыры // Крапіва К. Вершы і байкі. Мн.; Мікратапанімія в. Кудрычы Мсціслаўскага р-на // Першая беларуская анамастычная канферэнцыя 1—3 снежня 1967 г. Мн.; Імклівіць час; Не траць надзеі; Ніл Гілевіч; Анатоль Клышка; Эдуард Зубрыцкі; Песня; Раман Тармола: [Пародыі] // Беларусь. № 1; Адзіны ратунак: Пародыі // Там жа. № 4; Антон Бялевіч; Анатоль Астрэйка; Рыгор Няхай; Пятрусь Макаль; Кастусь Цвірка: Пародыі // Вожык. № 24; Мне пра горы не кажыце...; Замест рэцэнзіі на адзін раман; На світанку нашча...; З дзённіка Івана Мележа; П. Кавалёву; Супярэчлівасць: Эпіграмы і пародыі // Неман. № 12; Слова пра родную мову: [Рэц. на кн.: Крывіцкі А. Наша родная мова. Мн., 1967] // Звязда. 3 чэрв.; Давно отгремели раскаты сражений // Кн. обозрение. 6 мая; Прыход зімы: Пародыі // ЛіМ. 1 студз.; Збіральнікам народных скарбаў // Там жа. 13 студз. / Без подп.; Двухтомная граматыка беларускай мовы // Там жа. 17 студз. / Без подп.; Беларускі лінгвістычны зборнік // Там жа. 14 лют. / Без подп.; Лужына; А няхай іх!..; Роздум; Апошні хутаранін: Літаратурныя пародыі // Там жа. 28 сак.; Сваё і перапетае: [Рэц. на кн.: Нядзведскі У. Начная пагоня. Мн., 1966] // Там жа. 12 мая; Выдавец «Жалейкі»: [Рэц. на кн.: Семашкевіч Р. Браніслаў Эпімах-Шыпіла. Мн., 1968] // Там жа. 21 мая / Пад псеўд. Ю. Грыгарук; Прачытаюць дашкаляты: [Рэц. на кн.: Дзеружынскі А. Кую-кую ножку. Мн., 1967] / Пад псеўд. Ю. Грыгарук; Вучням — пра паэта: [Рэц. на кн.: Міцкевіч У. Максім Танк у школе. Мн., 1966] // Там жа. 1 жн.; Пракурор; Дарогу; Асмужаныя прыгаршчы; Бубен біў: Пародыі, эпіграмы, усмешкі // Там жа. 4 жн.; Новая мовазнаўчая праца // Там жа. 18 жн. / Без подп.; Беларускі філосаф і мысліцель: [Рэц. на кн.: Дорошевич Э. Аниол Довгирд — мыслитель эпохи Просвещения. Мн., 1967] // Там жа. 12 вер.; Што такое шчасце: [Рэц. на кн.: Марцінковіч А. Прасека. Мн., 1967] // Там жа. 3 кастр.; Пабрацімства народаўзмагароў: [Рэц. на кн.: Бажко А. Татры. Мн., 1964] // Там жа. 20 кастр.; Гісторыя сучаснай літаратурнай мовы // Там жа. 26 снеж. / Без подп.; Перамагу; Чык-чырык; Раманс: Пародыі // Чырв. змена. 26 студз.; Уладзімір Васько; Анатоль Казловіч; Свістулька; Мар'ян Дукса; Васіль Зуёнак; Анатоль Малюк: Пародыі // Там жа. 1 мая; Міхась Стральцоў; Уладзімір Дзюба: Пародыі // Там жа. 27 жн.

1968. Пра адзін сінанімічны рад // З жыцця роднага слова. Мн.; Устойлівыя сінтаксічныя кампаненты ў сінанімічным радзе // Лінгвістычныя даследаванні. Мн.; Формула белага верша; На ўзвеі дзён; Салома: [Пародыі] // ЛіМ. 1 студз.; Кнігі беларускіх вучоных // Там жа. 26 студз. / Без подп.; Даследуецца мова братніх народаў // Там жа. 1 сак. / Без подп.; Праца маладых вучоных // Там жа. 5 сак. / Без подп.; Праз дзесяцігоддзі: [Рэц. на кн.: Лынькоў М. Летапіс эпохі. Мн., 1968] // Там жа. 26 крас.; Выдавец «Жалейкі»: [Рэц. на кн.: Семашкевіч Р. Браніслаў Эпімах-Шыпіла. Мн., 1968] // Там жа. 21 мая / Пад псеўд. Ю. Грыгарук; Даследуюць маладыя мовазнаўцы // Там жа. 12 ліп. / Без подп.; Прыбыткі і страты: [Рэц. на кн.: Валасевіч А. На вясёлай хвалі. Мн., 1967] // Там жа. 16 ліп.; Вакалізм народных гаворак: [Рэц. на кн.: Вайтовіч Н. Ненаціскны вакалізм народных гаворак Беларусі. Мн., 1968] // Там жа. 24 кастр. / Пад псеўд. Ю. Паўлаў; Пачатак і працяг: [Рэц. на кн.: Наўроцкі А. Гарачы снег. Мн., 1968] // Там жа. 3 снеж.; Жыццё роднага слова // Там жа. 17 снеж. / Без подп.; Віктар Ракаў; Кастусь Ільюшчыц; Славамір Хадаронак: [Пародыі] // Чырв. змена. 4 лют.; Пара ўстаць; Я на месцы; Прылёт птушак: [Пародыі] // Там жа. 12 мая / Пад псеўд. Генадзь Юрчанка; Як заўсёды; Абложны дождж і векавуха; Поўня і Нептун: [Пародыі] // Там жа. 30 чэрв.; Як сябе зразумець?; Аладкі: [Пародыі] // Там жа. 18 жн.; На ранку; Станавіся на мяне: [Пародыі] // Там жа. 19 ліст.

1969. Не варта баяцца; Глядзі ў корань; Болей святаў!; Хто разгадае?: Пародыі // Вожык. № 11; Сцяпан Гаўрусёў; Анатоль Сербантовіч; Янка Сіпакоў: [Пародыі] // Маладосць. № 2; Завоблачнае каханне; Жорсткі раманс; З чырвонага радка: Літаратурныя пародыі // Вяч. Мінск. 2 студз.; Зірнём углыб; Мая душа; На перавалах напеваў: Літаратурныя пародыі // Там жа. 29 мая; У дарогу; Над вякамі; Кожнаму — сваё: Пародыі // Там жа. 25 вер.; Не едзь паражняком; Кацінае шчасце; Бульба: Літаратурныя пародыі // Там жа. 30 кастр.; Як жа злавіць?: Пародыя // ЛіМ. 14 студз.; Гісторыя беларускай літаратурнай мовы // Там жа. 21 студз. / Пад псеўд. Ю. Лявончык; Праз паэтычныя сумёты: Літаратурныя пародыі // Там жа. 4 лют.; Сябруюць суседзі // Там жа. 25 сак.; Дулі; Па-царску; Буду працаваць: Пародыі // Там жа. 19 вер.; Новая праца па купалазнаўству: [Рэц. на кн.: Макарэвіч А. Фальклорныя матывы ў драматургіі Янкі Купалы. Мн., 1969] // Там жа. 12 снеж.; Невычэрпнае багацце // Там жа. 16 снеж.; Нязбытныя мары; Наўскапыта: [Пародыі] // Чырв. змена. 9 лют.

1970. Мікратапанімія вёскі Кудрычы Мсціслаўскага раёна // Пытанні беларускай тапанімікі. Мн.; На касмічным спатканні: Пародыя // Беларусь. № 2; Неладдзе; Прыручыце мяне: Пародыі // Маладосць. № 3; Першы народны...: [Рэц. на кн.: Атрошчанка А. Уладзіслаў Галубок. Мн., 1969] // Полымя. № 1; Ода пра чыгунок; Пчолы кусаюцца: Пародыі // Вяч. Мінск. 26 лют.; Атава; Міма: Пародыі // Там жа. 26 сак.; На серадах; Пасвіце кароў: Пародыі // Там жа. 28 мая; Бай; Прыгоды: Пародыі // Там жа. 25 чэрв.; Як пісалі нашы продкі: [Рэц. на

кн.: Булыка А. Развіццё арфаграфічнай сістэмы старажытнабеларускай мовы. Мн., 1970] // Там жа. 3 ліп.; Спяшайцеся; Імгненна: Пародыі // Там жа. 1 кастр.; Як лячыліся продкі: [Рэц. на кн.: Минько Л. Народная медицина Белоруссии. Мн., 1969] // Звязда. 10 лют.; Карагод на Парнасе: [Верш]; Каханне і крупнік: Пародыя // ЛіМ. 1 студз. / Пад псеўд. Язэп Кудравіцкі; Разам з дарослымі: [Рэц. на кн.: Ялугин Э. Камни Млечного Пути. Мн., 1969] // Там жа. 17 сак.; Ліст з ядронай Гуты: Літаратурная пародыя // Там жа. 3 крас.; Канчатковае рашэнне; Новая сям'я: Пародыі // Там жа. 24 крас.; Па дровы: Пародыя // Там жа. 22 мая; Рэха асацыяцый: Пародыя // Там жа. 12 чэрв.; Апошняя размова: Пародыя // Там жа. 3 ліп.; Пакліч: Пародыя // Там жа. 7 жн.; Са скарбніцы роднае мовы: [Рэц. на кн.: Сцяцко П. Дыялектны слоўнік. Мн., 1970] // Там жа. 13 ліст.; Пэўна, ніколі; Беражыце жанчын: Пародыі // Чырв. змена. 21 ліп.

1971. Веру; Калі ласка; Не частуй: Пародыі // Вожык. № 14; Сняжня на павуццё; У разведку; Лёкса і Стэпа; Па нішчымніцы: Пародыі // ЛіМ. 23 крас.; З тэорыі вершаскладання: Пародыі // Там жа. 28 мая; Гарадскі сялянчык: Пародыя // Там жа. 9 ліп.

1972. Не губляйце; Зайздрасць; Што лепей; Слёзы радасці: [Пародыі] // Вожык. № 14; Ля калыскі новага мастацтва: [Рэц. на кн.: Шматаў В. Міхась Філіповіч. Мн., 1971] // Вяч. Мінск. 21 лют.; Развага: Пародыя // ЛіМ. 31 сак.; У корань рэчаў: Пародыя // Там жа. 12 мая; Адна ноч: Пародыя // Там жа. 23 чэрв.; Каханне і абавязак: Пародыя // Там жа. 14 ліп.; У глыбіні відавочнасцяў: Пародыя // Там жа. 11 жн.; Пупышкі: Пародыя // Там жа. 25 жн.; Галава: Пародыя // Чырв. змена. 16 ліп.; Таропкі верш: Пародыя // Там жа. 30 ліп.

1973. Калыханачка: Літ. пародыя // Беларусь. № 6; Песня пра песню: Літ. пародыя // Там жа. № 7; За рулём: Літ. пародыя // Там жа. № 8; Карагодная: Літ. пародыя // Там жа. № 9; Дакладны разлік: Літ. пародыя // Там жа. № 11; Пытанне; Звонкі верш; Па дровы: [Пародыі] // Маладосць. № 5; Бабровыя ловы: Пародыя // Там жа. № 10; Паўнакроўнасць наватарства; Творчыя патэнцыі: Пародыі // ЛіМ. 5 студз.; На дно: Пародыя // Там жа. 26 студз.; Усё мяняецца: Пародыя // Там жа. 23 лют.; Зацяты шпак; Натхненне: [Пародыі] // Там жа. 6 крас.; «Навука і тэхніка», 1973 // Там жа. 13 крас.; Непажаданыя турботы; Вясновая песня; Байкар на паляванні; Вясной; Вобраз вясны ў гістарычным высвятленні; Незабыўнае; На ўлонні сусвету; Малако з батонам; Спаміны: Пародыі // Там жа. 27 крас.; Усё ў мінулым: Пародыя // Там жа. 3 жн.; Камандзіроўка; Каб жа; У цнатлівай бязгрэшнасці: [Пародыі] // Там жа. 14 вер.; Марны вузел: Пародыя // Там жа. 5 кастр.; «Навука і тэхніка», год 1974 // Там жа. 28 снеж.

1974. Прага кары: Літаратурная пародыя // Беларусь. № 1; Каханне і восы: Літаратурныя пародыі // Там жа. № 2; Па новыя вершы: Літаратурная пародыя // Там жа. № 8; На Міхася Яроша; На Алеся Адамовіча; На Паўла Дзюбайлу; На Рыгора Бярозкіна; На Івана Навуменку: Эпіграмы // Там жа. № 11; Слёзныя пентаметры; Ранішняя вечаровасць; Дагары карэннем: [Пародыі] // Вожык. № 11; Усяк бывае; Дзярзай: [Пародыі] // Маладосць. № 5; Адкрыцці: Пародыя // ЛіМ. 18 студз.; 66×55 // Там жа. 1 лют.; Апавяданне з рыфмай: Пародыя // Там жа. 24 мая; Пастухі: Пародыя // Там жа. 31 мая; Песня і яе менавіцікі: Пародыя // Там жа. 21 чэрв.; Трымай: Пародыя // Там жа. 2 жн.; Перамена прафесіі: Пародыя // Там жа. 13 вер.; Расцём!: Пародыя // Там жа. 20 вер.; Бабкавічы: Пародыя // Там жа. 4 кастр.; Папера: Пародыя // Там жа. 11 кастр.; Мяцежнік: Пародыя // Там жа. 13 снеж.; У забыцці; У гукавых глыбінях; Парнас і дзівасіл; Верш і якар; Новая кватэра: [Пародыі] // Там жа. 27 снеж.

1975. На Генадзя Бураўкіна; На Максіма Лужаніна; На Васіля Вітку; На Рыгора Семашкевіча: Эпіграмы // Дзень паэзіі — 75. Мн.; Некаторыя лексічныя групы ў гаворцы Мсціслаўшчыны // З народнага слоўніка. Мн.; Прымусовая сустрэча: Літ. пародыя // Беларусь. № 2; Вярні-і-ісця-а-а!..: Літ. пародыя // Там жа. № 8; Працоўны дзень: Літ. пародыя // Там жа. № 12; Івану Ралько; Віктару Каваленку; Міколу Арочку; Дзмітрыю Бугаёву: Эпіграмы // Маладосць. № 7; На шляху памглёнасці; Толькі падумаць: [Пародыі] // Вяч. Мінск. 6 лют.; Выдае «Навука і тэхніка» // ЛіМ. 10 студз.; Праз стыхіі: Пародыя // Там жа. 17 студз.; Санет № 101: Пародыя // Там жа. 19 студз.; Сумненні: Пародыя // Там жа. 7 лют.; Непаразуменне: Пародыя // Там жа. 21 лют.; Бойцеся: Пародыя // Там жа. 14 сак.; У вёсцы; У ляску: [Пародыі] // Там жа. 21 сак.; Разгубленасць: Пародыя // Там жа. 4 крас.; Знішчаць шкоднікаў; Хованкі: [Пародыі] // Там жа. 23 мая; Пажаданні; Песенька пра песеньку: [Пародыі] // Там жа. 4 ліп.; А-у-у, Толя: Пародыя // Там жа. 3 кастр.; У лірычнай крытычнасці: Пародыя // Там жа. 17 кастр.; Санет № 101 // Там жа. 19 снеж.

1976. А што ў суботу?; Мяняй прафесію; У новых ботах: [Пародыі] // Дзень паэзіі — 76. Мн.; Прыслоўныя раздзельна аформленыя ўтварэнні ў гаворцы Мсціслаўшчыны // Народнае слова. Мн.; Любоў да грыбоў; Дзякуй каханкам: [Вершы] // Вожык. № 8; Пастаянства: Пародыя // Там жа. № 24; Каханне; Паўнахроўнасць: Пародыі // Маладосць. № 1; Новы жанр; Не хвалявацца; У гасцях: Пародыі // Вяч. Мінск. 20 лют.; Апошні снег; Вясна: Пародыі // Там жа. 25 сак.; Словы ў новым адзенні: [Рэц. на кн.: Лепешаў І. Фразеалогія ў творах К. Крапівы. Мн. 1976] // Там жа. 24 ліст.; Патаемнае: Пародыя // ЛіМ. 9 студз.; Крутляй; Праз перашкоды: [Пародыі] // Там жа. 13 лют.; Выкрыццё: Пародыя // Там жа. 12 сак.

1977. Аддзеяслоўныя і гукаперайманьныя выклічнікі з адной вёскі // Народная лексіка. Мн.; Граматычныя эцюды: Пародыя // Беларусь. № 12; Пусціце ў пастухі: [Пародыя] // Вожык. № 24; Вашчынны спеў; Шэрыя пацалункі: [Пародыі] // Маладосць. № 1; У камлях: Пародыя // ЛіМ. 21 студз.; Вершы і дровы: Пародыя // Там жа. 4 сак.; Уважлівасць; Камары; Дзверы; Шлях верша; Мой выбар; Хадзіце!; Прычыненыя сувязі: Кароткія пародыі // Там жа. 1 ліп., Генадзю Кляўко; Віктару Дайліду: Эпіграмы // Там жа. 15 ліп.; Урокі вядзе пісьменнік // Там жа. 14 кастр.; Беглі ножкі: Пародыя // Там жа. 21 кастр.; Ведайце!: Пародыя // Там жа. 23 снеж.

1978. У замяці ліставею: Пародыя // Дзень паэзіі — 78. Мн.; З лексікі ткацкага начыння адной вёскі // Жывое слова. Мн.; Трапным словам сатыры // Крапіва К. Вершы; Байкі. Мн.; Начныя гармоніі; Пішацца: Пародыі // Беларусь. № 1; У нетрах бязнетрыцы: [Пародыя] // Там жа. № 5; Непазбежнасць; Радасць суму: Пародыі // Вожык. № 2; Трыялет; Няўлоўны колер; Збярыце мяне: [Пародыі] // Маладосць. № 3; Сардэчная збыткоўнасць: Пародыя // ЛіМ. 6 студз. / Пад псеўд. Харытон Бессардэчны; Прага вышыні; Жаданні: [Пародыі] // Там жа. 20 студз.; Кожнаму сваё; Радкі і дождж; Адрына і патрыятызм; Найлепшы сродак руху; Галоўны вінаваўца; Дубы; Не здаюся; Новы занятак: Кароткія пародыі і эпіграмы // Там жа. 3 лют.; Новае пра Паўла Левановіча // Там жа. 7 крас.; Кузьма і штаны; Поўная гатоўнасць; Надзейная замена: [Пародыі] // Там жа. 27 кастр.; На жаль; Вымоўнасць маўчання: [Пародыі] // Там жа. 15 снеж.; Шкадаванне; Бум-бом: Пародыі // Чырв. змена. 30 жн.

1979. Прыметнікі з памяншальна-ласкальнымі суфіксамі ў гаворцы адной вёскі // Народная словатворчасць. Мн.; Яно: [Літ. пародыя] // Беларусь. № 3; Лірычна-падарожнае: Літ. пародыя // Там жа. № 8; Мая радаслоўная: [Літ. пародыя] // Там жа. № 9; Вер каханню: [Літ. пародыя] // Там жа. № 11; Не верце мужчынам; Маё шчасце: [Пародыі] // ЛіМ. 9 сак.; Да харэя праз палі; Падлікі; Выгодніста; У паўзмроку забыцця: Пародыі // Там жа. 23 сак.; З чужых саней: Пародыя // Там жа. 11 мая; Не толькі для навукоўцаў // Там жа. 18 мая; Услаўлю!; Хачу ў вяночак; Вярхом на гісторыі: [Пародыі] // Там жа. 25 мая; Каханне ў дарозе: Пародыя // Там жа. 29 чэрв.; У вяршынях даследчасці: Пародыя //

Там жа. 20 ліп.; У санаторыйку: [Пародыя] // Там жа. 27 ліп.; Бясшкоднае пераўтварэнне; Прага: [Пародыі] // Там жа. 10 жн.; Так было...; [Пародыя] // Там жа. 31 жн.; Адпачынак: [Пародыя] // Там жа. 7 вер.; Вяртанне ў рэальнасць: [Пародыя] // Там жа. 14 вер.; Не фарбуйцеся!: [Пародыя] // Там жа. 21 вер.; Восы: Пародыя // Там жа. 19 кастр.; Таропкія радкі; Пачакайце трошкі: [Пародыі] // Там жа. 26 кастр.; Пара апускацца; За кім пайсці?: [Пародыі] // Там жа. 28 снеж.; Свояўство: Пародыя // Чырв. змена. 4 ліп.

1980. Гімн блытаніне: [Пародыя] // Беларусь. № 8; Лірычна-раённае: [Пародыя] // Там жа. № 10; Пачуй праўду; Першая сварка: Літ. пародыі // Вожык. № 2; Непакой: [Пародыя] // Маладосць. № 6; «Навука і тэхніка» — 1980 // ЛіМ. 11 студз.; Я ці не я?: [Пародыя] // Там жа. 25 студз.; Думкі ў дарозе: [Пародыя] // Там жа. 15 лют.; Грышка і Шарыквыхавацель: [Пародыя] // Там жа. 22 лют.; Гулкія скокі: [Пародыя] // Там жа. 14 сак.; Мы і іншыя: Сардэчны поціск; Калі ласка; Гарачыя абдымкі; Усё — усенькае: [Пародыі] // Там жа. 27 чэрв.; Помста: [Пародыя] // Там жа. 18 ліп.; Развітанне: [Пародыя] // Там жа. 25 ліп.; Думкі-развагі: [Пародыя] // Там жа. 8 жн.; Дакладнасць планавання: [Пародыя] // Там жа. 15 жн.; Крыніца натхнення: Пародыя // Там жа. 29 жн.; Спасцігэнне: [Пародыя] // Там жа. 19 вер.; Цуды: [Пародыя] // Там жа. 3 кастр.; Суладнасць; Радасць сустрэч: Пародыі // Там жа. 24 кастр.; Сапсуты настрой: [Пародыя] // Там жа. 14 ліст.; Ліст мадонны пасля лазні: [Пародыя] // Там жа. 21 ліст.; Чужая душа — не пацёмкі: [Рэц. на кн.: Гігевіч В. Жыціва. Мн., 1980] // Там жа. 12 снеж.; Дакладны прыток; Прадбачлівасць: [Пародыі] // Там жа. 26 снеж.

1981. З-за нешанцунку: [Пародыя] // Беларусь. № 4; Ненадзейнасць: [Пародыя] // Там жа. № 9; Не трэба вясны: [Пародыя] // Там жа. № 10; Уладзімір Ляпёшкін; Эдуард Валасевіч; Артур Вольскі: Эпіграмы / Пад псеўд. Харытон Бессардэчны; Заечае шчасце: [Пародыя] // Вожык. № 7; Шлях у прастрань: [Пародыя] // Там жа. № 20; Нясцерплазы: Пародыя // Маладосць. № 4; Жаданні: Пародыя // Маладосць. № 12; Не трэба вясны: [Пародыя] // Вяч. Мінск. 16 кастр.; Поступ пераканаўчасці: [Пародыя] // ЛіМ. 9 студз.; «Навука і тэхніка» // Там жа. 16 студз.; Па дарозе ў Стараградак: [Пародыя]; Даведнік па купалазнаўству / Без подп. // Там жа. 13 лют.; У акругласці даверу: [Пародыя] // Там жа. 13 сак.; Рыгор Барадулін; Генадзь Бураўкін; Леанід Гаўрылкін; Ігнат Дуброўскі; Уладзімір Караткевіч; Аляксей Карпюк; Алег Лойка; Уладзімір Някляеў; Вячаслаў Рагойша; Кастусь Цвірка: Эпіграмы // Там жа. 10 крас.; Таемная незнаёмка: [Пародыя] // Там жа. 17 крас.; Сон: [Пародыя] // Там жа. 15 мая; Дзе ж павага да чытача; [Рэц. на кн.: Даніленка М. Журлівіца. Мн., 1980] // Там жа. 2 кастр.; Я і гара; Сама не ведаю: Пародыі // Там жа. 9 кастр.; «Навука і тэхніка» // Там жа. 23 кастр.; У фінале суму: Пародыя // Чырв. змена. 6 чэрв.; Ненадзейнасць: Пародыя // Там жа. 18 ліп. / Без подп.

1982. З вышыні: [Пародыі] // Беларусь. № 2; Паэт і лель: Літаратурная пародыя // Вожык. № 5; Таўровы верш: [Пародыя] // ЛіМ. 15 студз.; Ночвы; Як яно будзе: [Пародыі] // Там жа. 22 студз.; Развод: [Пародыя] // Там жа. 12 лют.; Сумненні: [Верш] // Там жа. 12 сак.; На ачыстку лесу: [Пародыя] // Там жа. 9 крас.; Гузік: [Пародыя] // Там жа. 7 мая; Пі-трыёдны Кібернас, або Максімка-пяцідэшнік, або Гама-кінетычны пшык: [Пародыя] // Там жа. 28 мая; Куды і адкуль?: [Пародыя] // Там жа. 25 чэрв.; Кнігапіс: [Рэц. на кн.: Ярош М. Пясняр роднай зямлі. Мн., 1982] // Там жа. 2 ліп.; Авечкі: [Пародыя] // Там жа. 24 вер.; Роля пейзажу ў канцэпцыі сусвету: [Пародыя] // Там жа. 8 кастр.; У паэмным рэчышчы: [Пародыя] // Там жа. 31 снеж.

1983. З плеяды першапраходцаў // Полымя. № 2; Кладка: Пародыя // ЛіМ. 18 лют.; Макіяжная казыч; Ці пазнаеце: Пародыі // Там жа. 29 крас.; Ці ісці?: Пародыя // Там жа. 3 чэрв.; У пошуках: Пародыя // Там жа. 24 чэрв.; Як салдат; Бясконцае сонца: [Пародыі] // Там жа. 22 ліп.; Завуч і казёл: Пародыя // Там жа. 2 вер.; «Навука і тэхніка», 84 // Там жа. 23 вер.; Сюжэтна-кампазіцыйнымі шляхамі: Гумарэска // Там жа. 21 кастр.; Сцежкай спаткання: Гумарэска // Там жа. 11 ліст.; Прызнанне; Смех скрозь слёзы: Пародыі // Там жа. 2 снеж.; Адданы назаўсёды // Мін. праўда. 24 снеж.

1984. В созвездии равных // Неман. № 10; Інструкцыя: [Пародыя] // ЛіМ. 27 студз.; Одумныя напевы Пародыя // Там жа. 16 сак.; Праўда прызнання: [Пародыя] // Там жа. 25 мая; Першая мсціслаўская газета // Там жа. 12 кастр.; Мая хата: Пародыя // Там жа. 29 ліст.; Товарищ начштаба // Сел. газ. 2 жн.

1985. Рэцэнзіі пад капірку // ЛіМ. 2 жн.; «Навука і тэхніка», 1986 // Там жа. 16 жн.; Сінява кахання: [Пародыя] // Там жа. 30 жн.; Менавітымі пуцявінамі: [Гумарэска] // ЛіМ. 18 кастр.; Асэнсаванне: [Пародыя] // Там жа. 6 снеж.; Успомнім потым; Пляжныя ўспаміны; Згода; Вочы; Падарожнічаем: [Пародыі] // Там жа. 27 снеж.

1.5.

На рускую мову. После спектакля; Образец басни: (Эпиграммы) / Пер. В. Корчагин // Лит. Россия. 1966. 25 марта; После спектакля: (Эпиграмма) // Кировец («Динамо»). 1967. 19 июля.

1.6.

Фамін С. У. Дымнае жыта: Вершы, паэмы, пераклады. Мн., 1991 / Скл.

Карагодны трыпціх; Кудрыцкія частушкі // Праблемы сучаснага беларускага фальклору. Мн., 1969 / Публ.; У куля // Дзіцячы фальклор. Мн., 1972 / Публ.

2.3.

На беларускай мове. Арочка М. Сатырычная паэзія // Сучасная беларуская паэзія Мн., 1970. С. 246—249; [Віншаванне з юбілеем] // Беларусь. 1978. № 1; Георгію Юрчанку — 50 // ЛіМ. 1978. 27 студз.; Пісьменнікі Савецкай Беларусі: Кароткі даведнік. Мн., 1981; Яскевіч А. Вясёлым вокам пародыі // Яскевіч А. Грані майстэрства. Мн., 1974.

В. У. Смольская.

ЮРЭВІЧ УЛАДЗІМІР

Юрэвіч Уладзімір Міхайлавіч (псеўд.: Радыён Хваля; н. 22.7.1916, в. Дуброва Мінскага пав. Мінскай губ., цяпер Смалявіцкі р-н Мінскай вобл.), крытык, празаік, перакладчык. Член СП Беларусі з 1953. Заслужаны работнік культуры Беларусі (1976). Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі (1994; за кнігу «Слова жывое, роднае, гаваркое...»).

Нарадзіўся ў сям'і настаўнікаў сельскай школы. Яго дзед, Мікалай Фёдаравіч Турчановіч, таксама быў настаўнікам, усебакова падрыхтаваным педагогам, ведаў замежныя мовы. У яго за адну зіму (1897—98) у в. Бяларучы завяршыў курс пачатковай школы Я. Купала. У дзеда была багатая бібліятэка з выданнямі рускай літаратуры, першымі беларускімі кнігамі. Гады дзяцінства У. Юрэвіча прайшлі ў камуне «Звязда» (в. Мадуліна Смалявіцкага р-на), дзе бацькі працавалі настаўнікамі і вялі вялікую культурна-асветную работу сярод сялян-камунараў. У 10—12-гадовым узросце У. Юрэвіч пісаў для насценгазеты камуны «Звязда» вершы і байкі, якія не захаваліся. Вучыўся ў Першай беларускай сямігадовай школе г. Мінска, пасля скончыў Мінскі індустрыяльна-педагагічны тэхнікум (1934), будаўнічы факультэт Беларускага політэхнічнага інстытута (1941). Адначасова завочна вучыўся на філалагічным факультэце БДУ (1939—41). У 16 гадоў быў прыняты па конкурсе ў дыктары Беларускага радыё. Гэта праца захапіла юнака: увесь вольны ад вучобы час ён аддаваў вывучэнню роднай мовы, літаратуры, мастацтва, гісторыі. На трэці дзень вайны У. Юрэвіч з групай моладзі накіраваўся на ўсход. У Оршы атрымаў дазвол накіравацца ў савецкі тыл. Дабраўшыся да Казані, паступіў на работу памочнікам галоўнага інжынера будаўнічай канторы Упраўлення капітальнага будаўніцтва Наркамата авіяцыйнай прамысловасці. У верасні 1941 мабілізаваны на будаўніцтва ўмацаванага раёна на Волзе, быў прызначаны начальнікам вытворча-тэхнічнага аддзела будаўнічага ўчастка 2 Ваенна-палявой будоўлі Наркамата абароны СССР. Пасля завяршэння будаўніцтва вярнуўся ў Казань, дзе яго чакаў выклік ЦК КПБ у Маскву для ўдзелу ў аднаўленні радыёвяшчання на беларускай мове (радыёстанцыя «Савецкая Беларусь» пры Цэнтральным штабе партызанскага руху). Працаваў дыктарам і перакладчыкам. Тады ж пачаў пісаць публіцыстычныя артыкулы, нарысы. Пасля вяртання ў Мінск працаваў дыктарам, працягваў радыёжурналісцкую дзейнасць. У 1948 прызначаны адказным рэдактарам літаратурна-драматычнага вяшчання, у 1952 галоўным рэдактарам мастацкага вяшчання. З 1954 працаваў уласным карэспандэнтам «Литературной газеты» па Беларусі, з 1959 адказным сакратаром часопіса «Маладосць», у 1970—79 дырэктарам Літаратурнага музея Я. Купалы, палітычным аглядальнікам Дзяржкамітэта БССР па тэлебачанні і радыёвяшчанні, членам рэдкалегіі, рэдактарам аддзела часопіса «Камуніст Беларусі». У 1979—85 літкансультант СП Беларусі. З 1985 адказны сакратар Камітэта па Дзяржаўных прэміях Беларусі. Узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны 2-й ступені, медалямі, Ганаровымі граматамі і Граматай Вярхоўнага Савета БССР.

Першае выступленне У. Юрэвіча ў друку адносіцца да 1949, калі ў часопісе «Вожык» быў надрукаваны яго фельетон «Цецерукі і глушцы ў эфіры» (пад псеўданімам Радыён Хваля). З таго часу выступае ў друку з рэцэнзіямі на новыя творы беларускай літаратуры. Выхаваная з дзіцячых гадоў любоў да роднага слова, працяглая практычная праца з жывым словам дазволілі У. Юрэвічу спецыялізавацца на аналізе мовы мастацкіх твораў. Добры густ, багатыя назіранні, уменне прынцыпова і аб'ектыўна прааналізаваць майстэрства пісьменніка — характэрныя рысы яго літаратурна-крытычных прац (кнігі «Слова і вобраз», «Шматгалоссе жыцця», «Погляд», «Абрысы» і інш.). Вядомы і як перакладчык мастацкіх твораў з рускай і ўкраінскай моў, аўтар кніг для дзяцей («Тараскавы турботы», «Дзе начуе сонца», «Дожджык на колах», «Нястрашны страх» і інш.). Напісаў нарыс жыцця і творчасці Я. Купалы, нарысавую кнігу «Мінск: Учора, сёння, заўтра».

Жыве ў Мінску.

Л. С. Савік.

Бібліяграфія

1.1.

Абрысы: Выбр. з літ. крытыкі. Мн., 1976. Рэц.: К а в а л е н к а В. Сталыя абрысы творчай біяграфіі // Полымя. 1976. № 7.

Выбранае. Мн., 1987.

1.2.

Савецкая Беларусь у фотаілюстрацыях: [Альбом]. Мн., 1958 / Сааўт. Т. Хадкевіч.

Слова і вобраз: Назіранні над мовай маст. твора. Мн., 1961. Рэц.: А л е к с а н д р о в і ч С. Цудадзейная сіла слова // Полымя. 1961. № 7; Л о й к а А. Свая тэма знойдзена // ЛіМ. 1961. 4 ліп.

Першая неабходнасць. Мн., 1963.

Шматгалоссе жыцця: Літ. крытыка. Мн., 1965. Рэц.: Б у г а ё ў Д. Патрабавальнасць крытыка // ЛіМ. 1965. 22 кастр.; К а в а л е н к а В. Шматгалоссе жыцця і літаратуры // Полымя. 1966. № 8.

Тараскавы турботы: Апавяданні. Мн., 1966. Рэц.: З у б к о ў с к і Б. Турботы маленькага чалавека // ЛіМ. 1966. 5 крас.

Дзе начуе сонца: Апавяданні. Мн., 1970. Рэц.: П о л я к В. Таццянчын клопат // ЛіМ. 1970. 19 чэрв.

Агні Мінска: [Фотаальбом]. Мн., 1972.

Янка Купала — наш сучаснік. Мн., 1972.

Погляд: Літ. крытыка. Мн., 1974. Рэц.: А б р а м о в і ч М. Погляд даследчыка // Мін. праўда. 1975. 20 мая; А н д р а ю к С. Свой погляд // Полымя. 1976. № 1; Б а р с т о к М. Майстэрства крытыка // ЛіМ. 1975. 8 жн.; Г н и л о м е д о в В. В поисках истины // Сов. Бел. 1974. 17 сент.; Л а ў ш у к С. Сталы погляд // Звязда. 1974. 16 жн.; Ш у п е н ь к а Г. // Неман. 1975. № 2.

Дожджык на колах: Апавяданні. Мн., 1977.

Испытание зрелостью. М., 1981. Рэц.: Б у р ь я н Б. Живопись словом // Лит. Россия. 1982. 12 марта; В і ш н е ў с к і А. Кнігапіс // ЛіМ. 1982. 3 снеж.; Г н и л о м е д о в В. С уважением и любовью // Знамя юности. 1982. 24 марта.

Мінск: Учора, сёння, заўтра: Нарыс. Мн., 1982. Рэц.: Ш ы х а н ц о ў В. Горад, які мы любім // Чырв. змена. 1982. 31 ліп.

Янка Купала: Нарыс жыцця і творчасці. Мн., 1983.

Нястрашны страх: Апавяданні. Мн., 1986.

Слова жывое, роднае, гаваркое: Навук.-папул. кн. Мн., 1992.

1.3.

1949. Цецерукі і глушцы ў эфіры: Фельетон // Вожык. № 11 / Пад псеўд. Радыён Хваля; Творы савецкай літаратуры на радыё // ЛіМ. 7 мая.

1950. Больш увагі прапагандзе беларускай літаратуры па радыё // ЛіМ. 6 мая; Засакрэчаныя халтуршчыкі // Там жа. 9 вер.

1951. Вершы пра мір: [Рэц. на кн.: П р ы х о д з ь к а П. Салдаты міру. Мн., 1950] // Беларусь. № 6; Праца — герой кнігі // Полымя. № 2; У абарону міру: [Рэц. на кн.: Н а в а р ц е міру. Мн., 1950] // Там жа. № 4; Павярхоўны нарыс // ЛіМ. 1 вер.

1952. Карыснае даследаванне: [Рэц. на кн.: К а р п а ў У. Па шляху сталасці. Мн., 1952] // Беларусь. № 10; Пушкін — крытык // Полымя. № 1; Надзённая задача // ЛіМ. 29 сак.; Лёс Іштвана Хайду // Там жа. 19 крас.; Няспраўджаная назва // Там жа. 17 мая; Пясняр вялікай дружбы // Там жа. 5 ліп.

1953. Апавяданні маладога пісьменніка: [Рэц. на кн.: Р ы л ь к о А. Мае сустрэчы. Мн., 1952] // Беларусь. № 1; Апавяданні аб новым Кітаі // Маладосць. № 5; Поэзия счастливой молодости: [Рэц. на кн.: М о л о д а я Беларусь. М., 1952] // Сов. Отчизна. № 6; За творчы пераклад // ЛіМ. 11 крас.; Кніга паэзіі Савецкай Украіны: [Рэц. на кн.: У к р а і н с к а я савецкая паэзія. Мн., 1952] // Там жа. 1 мая; Па старонках новага часопіса («Маладосць» №№ 1, 2, 3) // Там жа. 4 ліп.; У даўгу перад паэтам // Там жа. 18 ліп.; Тэхніка і чалавек // Там жа. 19 вер.

1954. З мікрафонам па рэспубліцы: [Нарыс] // Беларусь. № 5; Лета ідзе // Там жа. № 6; П'есы аб нашых сучасніках // Там жа. № 11; Творчасць маладых // Маладосць. № 4; Нястомны барацьбіт // Полымя. № 3; За глыбокую, кваліфікаваную крытыку // Звязда. 28 сак.; Пабло Няруда // ЛіМ. 9 студз.; Аповесць аб лесарубах // Там жа. 20 сак.; Жывыя дакументы рэчаіснасці // Там жа. 10 крас.; Без павагі да слова // Там жа. 14 жн.; Издательство и книга // ЛГ. 9 дек.

1955. Услаўленне вялікага брацтва // Янка Купала. Мн.; Вялікая спадчына // Беларусь. № 1; Твор пра барацьбітоў за мір: [Рэц. на кн.: М а ў р Я. Цётка Эмілія. Мн., 1954] // Там жа. № 2; Кніга пра жаночае шчасце // Там жа. № 3; Мастак жыццёвай праўды // Там жа. № 5; Джамбул Джабаеў // Там жа. № 6; Аналіз і рэгістрацыя: (Рэцэнзія аб рэцэнзіях) // Полымя. № 11; Пясняр дружбы і брацтва // ЛіМ. 28 мая; Без внимания к мастерству // ЛГ. 5 февр.; Обещанного... семь лет ждут // Там жа. 14 мая; Творческие споры и формальные мероприятия // Там жа. 30 июня; Напутствие старших // Там жа. 1 окт.

Арахоўскі Мікалай Аляксандравіч (н. 3.7.1950, в. Сялец Бярозаўскага р-на Брэсцкай вобл.), драматург. Член СП Беларусі з 1991.

Нарадзіўся ў сялянскай сям'і. Скончыўшы 9 класаў Сялецкай СШ (1966), вучыўся ў Мінскім мастацкім вучылішчы (1966—68). У 1969—71 служыў у войску. Працаваў у розных месцах Беларусі тынкоўшчыкам, слесарам, мастаком-афарміцелем. У 1974 паступіў у Беларускі дзяржаўны тэатральна-мастацкі інстытут, але правучыўся ў ім 2 гады. У 1977 быў паралізаваны.

У літаратуру М. Арахоўскі прыйшоў праз фізічныя і духоўныя пакуты. Яго творы напоўнены думкамі аб недасканаласці грамадства і чалавека, трагізме жыцця наогул. Пачаткам творчасці сталі п'есы для лялечнага тэатра. Адна з іх, «Калі дракон прачнуўся», прысвечана праблемам экалогіі, выконвалася па радыё (1994). Першы друкаваны твор з'явіўся ў 1979. Піша апавяданні, казкі, артыкулы. Публікуецца ў бярозаўскай раённай газеце «Маяк». У 1986 напісаў драму «Напярэдадні» (пастаўлена ў 1991 Бярозаўскім народным тэатрам), выконвалася па радыё (1990—92). Трагікамедыя «Машэка» (1988) пастаўлена Брэсцкім абласным драматычным тэатрам (1989), паводле яе створаны тэлеспектакль (1990). П'еса «Ку-ку» (1991) пастаўлена тэатрам-лабараторыяй беларускай драматургіі «Вольная сцэна» (1992), надрукавана ў часопісе «Тэатральная Беларусь», адзначана 1-й прэміяй на Рэспубліканскім конкурсе драматургіі. Некаторыя драматычныя творы М. Арахоўскага напісаны з вялікай доляй умоўнасці, якая мяжуе з ірэальнасцю.

Жыве ў в. Сялец Бярозаўскага р-на.

Л. А. Бялевіч.

АРКУШ АЛЕСЬ

Аркуш Алесь (сапр. Козік Аляксандр Барысавіч, н. 28.5. 1960, г. Жодзіна Мінскай вобл.), паэт, празаік, крытык, выдавец. Сябра Таварыства вольных літаратараў Беларусі (з 1993).

Пасля заканчэння васьмі класаў (1975) паступіў у Жодзінскі політэхнічны тэхнікум. Скончыўшы яго ў 1979, працаваў электрамантажнікам на Беларускім аўтамабільным заводзе (г. Жодзіна). Пасля службы ў войску (1979—81) працаваў канструктарам на Беларускім аўтамабільным заводзе. У 1982—87 вучыўся на планава-эканамічным факультэце Беларускага інстытута народнай гаспадаркі. Па сканчэнні яго накіраваны ў аддзел камплектацыі завода «Вымяральнік» (г. Наваполацк). З 1988 у газетах наваполацкага будтрэста № 16 «Знамя новостройки», наваполацкага гарвыканкома «Новая газета». Уваходзіў у літаратурнае аб'яднанне «Тутэйшыя». Ініцыятар і стваральнік Таварыства вольных літаратараў, на ўстаноўчым сходзе (1993) якога абраны галоўным яго каардынатарам. Заснаваў выдавецкую суполку «Полацкае ляда». Актыўна супрацоўнічаў з полацкім рок-гуртом «Мясцовы час». З'яўляецца выдаўцом літаратурнага альманаха «Ксэракс беларускі» і зборнікаў серыі «Паэзія новай генэрацыі».

Першая публікацыя А. Аркуша з'явілася ў 1987 на старонках часопіса «Маладосць». Першая кніга — «Вяртанне» (1988). Друкаваўся ў зборніках «Дзень паэзіі», «Дзвіна», альманаху «Ксэракс беларускі», часопісе «Полымя» і інш. Вершы А. Аркуша пачалі з'яўляцца ў друку ў час новай хвалі нацыянальнага абуджэння. Аднак ад самага пачатку творчасці паэт пазбягае сацыяльнай тэматыкі, не захапляецца адраджэнцкай рыторыкай. Яго вершы вызначаюцца абвостраным псіхалагізмам, інтэлектуальнай заглыбленасцю. Актыўна выкарыстоўвае старажытныя грэчаскую, рымскую і славянскую міфалогіі. Відавочны ўплыў на яго творчасць аказалі паэты Ю. Кузняцоў, В. Саснора, А. Разанаў, А. Мінкін. Канцэптуальна распрацоўвае накірунак «пострамантызм», аўтар артыкулаў па гэтай тэматыцы.

Жыве ў Наваполацку.

С. І. Шыдлоўскі.

Бібліяграфія

1.2.

Вяртанне: [Вершы]. Мн., 1988 (Бібліятэка часопіса «Маладосць»).

Тайніца: [Вершы]. Полацак, 1991 / Сааўт. П. Бурдыка.

Крылы ператворацца ў карэньні: [Вершы]. Полацак, 1993.

Разьвітаньне з Танталам: [Вершы]. Полацак, 1994.

С. І. Шыдлоўскі.

АЎРУЦІН АНАТОЛЬ

Аўруцін
Анатоль Юр'евіч
(н. 3.7.1948, г. Мінск),
паэт, крытык,
перакладчык. Член СП
Беларусі з 1993.

Нарадзіўся ў сям'і інжынера-чыгуначніка. У 1966 скончыў сярэднюю школу № 3 г. Мінска, у 1972 — завочнае аддзяленне гістарычнага факультэта БДУ. Адначасова з вучобай ва універсітэце працаваў слесарам-інструментальшчыкам вагоннага дэпо ст. Мінск Беларускай чыгункі (1967—71), педагогам-арганізатарам домакіраўніцтва № 2 Мінскай дыстанцыі грамадзянскіх збудаванняў Беларускай чыгункі (1972—77). З 1977 літаратурны рэдактар часопіса «Служба быту Беларусі», адначасова літкансультант газеты «Железнодорожник Белоруссии». У 1991 адказны сакратар, намеснік галоўнага рэдактара часопіса «Салон», з 1992 галоўны рэдактар часопісаў «Личная жизнь» і «Авантюрист».

Першая публікацыя — падборка вершаў у газеце «Железнодорожник Белоруссии» за 1973. Вершы і літаратурна-крытычныя матэрыялы друкаваў у часопісах «Нёман», «Смена», «Техника молодежи», «Рабочая смена», «Крылья Родины»; «Литературная газета», «Літаратура і мастацтва», «Гудок», «Советская Белоруссия» і інш. Выйшлі зборнікі яго вершаў «Снегапад у ліпені» (1979), «Паваротны круг» (1983), «...Ад свету гэтага» (1991), нарысы аб прафесіях «Радыётэхнік» (1980), «Машыніст» (1983) і навукова-папулярная кніжка «Зёлкі для кахання» (1992).

Займаецца перакладам на рускую мову. Пераклаў вершы і паэтычныя падборкі М. Багдановіча, М. Танка, П. Панчанкі, Р. Барадуліна, А. Грачанікава, Г. Пашкова, У. Мазго, М. Мятліцкага і інш., а таксама вершы Г. Апалінэра, Ш. Бадлера, Г. Гейне, П. Элюара і інш. А. Аўруцін піша пра звычайны чалавечы побыт, сямейныя клопаты, каханне, прыроду.

Жыве ў Мінску.

В. У. Смольская.

Бібліяграфія

1.2.

Снегопад в июле: Стихи. Мн., 1979 (Первая книга поэта). Рэц.: Стральцоў М. Пачатак і працяг // ЛіМ. 1980. 8 лют.

Радиотехник. Мн., 1980.

Поворотный круг: Стихи. Мн., 1983. Рэц.: Москаленко В. // Неман. 1984. № 8; Яго ж. Любовь к отчей земле // Знамя юности. 1984. 15 июля.

Машинист. Мн., 1983.

...От мира сего: Стихотворения. Мн., 1991.

Любовные снадобья. Мн., 1992.

1.3.

1973. Хлеб на снегу: [Верш] // Сов. профсоюзы. № 1; Вяч. Мінск. 6 сак.; «Я тебя придумал, словно сказку...»: [Верш] // Знамя юности. 9 февр.; «Нужно уметь увидеть...»: [Верш] // Там жа. 27 февр.; «Густая тьма...»: [Верш] // Там жа. 23 нояб.; На лыжах: [Верш] // Физкульт. Бел. 9 янв.; Стихи о настольном теннисе: [Верш] // Там жа. 6 мая; Скалы: [Верш] // Там жа. 2 дек.

1974. [Цыкл вершаў] // Крылья Родины. № 11; Тишина: [Верш] // Неман. № 1; «У сердечной пружины не вечен завод...»; «На низком холмике...»; «Эй, сосна, зря бежишь по склону...»; «Вдруг рванется в небо стая...»; «Мне рассказывал друг-фотограф...»: [Вершы] // Раб. смена. № 8; «Обложено небо над вставшей рекою...»: [Верш] // Вяч. Мінск. 14 лют.; «Поколенье войны не знавших...»; «Я пушкинской сказки листаю страницы...»: [Вершы] // Там жа. 15 жн.; Пальцы сапера: [Верш] // Знамя юности. 6 янв.; Маляр: [Верш] // Сов. Бел. 1 окт.; Видеозапись: [Верш] // Физкульт. Бел. 15 апр.; У вечного огня: [Верш] // Там жа. 15 мая; Небо: [Верш] // Там жа. 26 мая; Первый марафон: [Верш] // Там жа. 10 авг.; Спринт: [Верш] // Там жа. 20 окт.

1975. [Рэц. на кн.: Огнецвет Э. Огоньки в окнах. М., 1974] // Неман. № 3; «Есть чуточку щемящие слова...»: [Верш]; Все ритмы земли родной // Там жа. № 8; Лыжня: [Верш] // Физкульт. Бел. 9 февр.

1976. Вторая книжка: обретения и потери // Неман. № 2; «Опять половина пути...»: [Рэц. на кн.: Евсеева С. Зову! Мн., 1974] // Там жа. № 8; У аўтобусе: (Гумарэска) // Служба быту Бел. № 5; [Цыкл вершаў] // Техника — молодёжи. № 9; Верш — пасланнік палеткаў: [Рэц. на кн.: Калачынскі М. Докшыцкі каравай. Мн., 1974] // ЛіМ. 30 ліп.; «Выпрацоўваць свой

почырк...»: [Інтэрв'ю з А. Грачанікавым] // Там жа. 10 снеж.; Фразы... // ЛГ. 1 янв. Забег: [Верш] // Физкульт. Бел. 16 мая.

1977. Потерь могло быть меньше... // Неман. № 5; [Цыкл вершаў] // Техника — молодёжи. № 12; С любовью к слову // Гудок. 13 янв.; «...Што вечна родніць з родным краем»: [Рэц. на кн.: Бачыла А. Белы бярэзнік. Мн., 1976] // ЛіМ. 6 мая; Другая спроба...: [Рэц. на кн.: Багданаў Ю. Рака часу. Мн., 1977) // Там жа. 30 вер.; Закат в Юрмале; Прощание с Ригой: [Вершы] // Сов. молодежь (Рига). 16 нояб.

1978. [Рэц. на кн.: Липневич В. Трава и дождь. Мн., 1977] // Неман. № 3; «Мне казалось в детстве, что Россия...»: [Верш] // Смена. № 2; Ці весела ў «Вясёлым цягніку»?: [Рэц. на кн.: Васілеўскі І. Вясёлы цягнік. Мн., 1977] // ЛіМ. 27 студз.

1979. «Порою хрустнет половица...»; «Как трудно освещать и лицезреть...»; «Возьмет метлу...»; «Швырнули речке в душу камень...»; «Меня учили люди умные...»: [Вершы] // Раб. смена. № 10; «Швырнули речке в душу камень...»; «Возьмет метлу...»: [Вершы] // Вяч. Мінск. 25 студз.; Белая Русь; «Заря, разбитая веслом...»; Хоттабыч: [Вершы] // Там жа. 29 ліст.; ...Каб правільна жыць: [Рэц. на кн.: Кіслік Н. Вераснёўская рака. Мн., 1978] // ЛіМ. 23 лют.; Ключы ад вясны: [Рэц. на кн.: Отчык Ю. Зялёны гром. Мн., 1978] // Там жа. 25 мая; «Адкрыць сябе — таксама адкрыццё...»: [Рэц. на кн.: Тармола Р. Зямное — зямному. Мн., 1979] // Там жа. 7 снеж.; Почта буквоеда // Л. Г. 28 февр.

1980. «Дзень добры на добры дзень...»: [Рэц. на творы: Янішчыц Я. Ягадны хутар; Акно ў дождж] // ЛіМ. 21 ліст.; «В сорок пятом сапожнику трудно жилось...»; «С годами сильнее сердце...»: [Вершы] // Чырв. змена. 30 студз.; «Их разве вспомнишь поименно...»; «В Кремле субботник...»; Белизна: [Вершы] // Там жа. 9 снеж.

1981. Родное; «Эти светлые названья...»; «В сорок пятом сапожнику трудно жилось...»; «Безымянных улиц не бывает...»: [Вершы] // Неман. № 12; «Курит женщина в коридоре...»; «Безымянных улиц не бывает...»; «Плохая книга, как недобрый дом...»; «Все так быстро, так скоро...»: [Вершы] // Вяч. Мінск. 11 лют.; ...Усё зямным жыццём было: [Рэц. на кн.: Пашкоў Г. Дзяўчынка з блакітным мячыкам // Полымя, 1980. № 10; // ЛіМ. 13 лют.; Гильза: [Верш] // Чырв. змена. 13 чэрв.

1982. «Курит женщина в коридоре...»: [Верш] // Дзень паэзіі – 82. Мн.; [Рэц. на кн.: Тарас В. Две тетради. Мн., 1982] // Неман. № 12; «Эти светлые названья белорусской стороны...»: [Верш] // Смена. № 7.

1983. «Пока живу тревогами людскими...»: [Верш] // Дзень паэзіі — 83. Мн.; Строгая пора зрелости: [Рэц. на кн.: Ефимов Ф. Светлые зимние ночи. Мн., 1982] // Неман. № 6.

1984. Тропинки ведут к дороге: [Рэц. на кн.: Добрыми глазами. Мн., 1983; Сцяжына. Мн., 1983] // Неман. № 5; «Мне рассказывал друг-фотограф...»: [Верш] // Гомел. праўда. 24 ліп.; «Запекаются капли пота...»: [Верш] // Там жа. 17 жн.; Огни «Магистрали»: [Інтэрв'ю] / Зап. А. Сендер // Знамя юности. 10 авг.; Поле; Однофамильцы; «У окна, в притихшей электричке...»; Правила деления: [Вершы] // Там жа. 23 дек.

1985. Ясный день // Неман. № 9; Тихий свет доброты: [Рэц. на кн.: Павлов В. Тихий свет. М., 1984] // Неман. № 10; Сквозное ранение // Там жа. № 11; «Взяв из детских ручонок...»; «А мой малыш играет с пистолетом...»; «Стирали на Грушевке бабы...»; «Грушевский поселок...»; «Как трудно быть отцом и сыном сразу...»; «Мне крестьянка поведала тихо...»: [Вершы] // Раб. смена. № 5; «Взяв из детских ручонок...»: [Вершы] // Гомел. праўда. 5 студз.; «По ночам здесь яблоками сад...»: [Верш] // Гомел. праўда. 1 мая.

2.3.

На рускай мове. Добкин В. Живя тревогами людскими... // Железнодорожник Бел. 1983. 8 дек.; Козин А. Твоя дорога // Гудок. 1983. 4 авг.; Шутик И. Шаги к горизонту // Там жа. 1980. 9 дек.; Ягож. Эта песня родной стороны // Железнодорожник Бел. 1980. 13 марта.

2.4.

На беларускай мове. Стральцоў М. «Мой май ужо адбушаваў...»: [Верш] // ЛіМ. 1980. 16 мая.

М. П. Барташэвіч.

АФАНАСЬЕЎ ІВАН



Афанасьеў Іван Мікалаевіч (н. 6.10.1963, г. Гомель), крытык, літаратуразнавец. Член СП Беларусі з 1992. Кандыдат філалагічных навук (1990). Піша на беларускай і рускай мовах.

З сям'і інтэлігентаў. У 1980 скончыў з залатым медалём Гомельскую СШ № 3 і паступіў на гісторыка-філалагічны факультэт Гомельскага універсітэта. Атрымаў дыплом з адзнакай, з 1985 аспірант кафедры рускай літаратуры ГДУ, затым асістэнт, з 1992 — старшы выкладчык гэтай жа кафедры. Абараніў кандыдацкую дысертацыю на тэму «Антываенная скіраванасць творчасці В. Быкава».

Літаратурную працу пачаў у 1985. Як літаратуразнавец даследуе пераважна літаратуру з ваеннай тэматыкай. Асаблівую ўвагу аддае праблеме маральна-этычных альтэрнатыў чалавецтва ў сучасную эпоху. Літаратурна-крытычныя артыкулы, сабраныя ў кнізе «Будзем садзіць сад» (1991), прысвечаны пытанням антымілітарысцкага мыслення ў творах А. Адамовіча, В. Быкава, В. Казько. У кнізе «Хто ўзыходзіць на Галгофу?» (на рускай мове, Мн., 1993), разглядае антываенную ідэю ў творчасці В. Быкава. У шэрагу публікацый даследуе адлюстраванне чарнобыльскіх праблем у беларускай літаратуры. Працам І. Афанасьева ўласцівы глыбокі навуковы аналітызм. Сфера яго даследчых інтарэсаў шырокая — ад асаблівасцей антываеннай свядомасці пісьменнікаў да агульных праблем выжывання чалавека.

Жыве ў Гомелі.

Г. М. Кісліцына.

1.2.

Антивоенная направленность творчества В. Быкова: Автореф. дисс. ... канд. филол. н. Мн., 1990.

Будзем садзіць сад...: Літ.-крытыч. арт. Мн., 1991 (Б-ка час. «Маладосць»).

Кто восходит на Голгофу? Мн., 1993.

1.3.

1985. Постижение Хатыни: [О кн. А. Адамовича «Каратели»] // Знамя юности. 7 мая. *М. П. Барташэвіч.*

БАГДАНАВА ГАЛІНА



Нарадзілася ў сям'і пісьменніка Б. Сачанкі. Маці, Тамара Андрэеўна, працавала навуковым супрацоўнікам у літаратурных музеях Янкі Купалы і Якуба Коласа. У 1978 Г. Багданава закончыла сярэднюю школу, у 1983 — факультэт журналістыкі БДУ. З 1982 працуе рэдактарам па народнаму мастацтву часопіса «Мастацтва» (да 1992 — «Мастацтва Беларусі»). У 1987 паступіла на завочнае аддзяленне мастацтвазнаўства Беларускай акадэміі мастацтваў.

Літаратурную працу пачала ў 1978. Друкавалася пад дзявочым прозвішчам Сачанка і псеўданімам Ланеўская (з 1989 па мужу Багданава). Рэцэнзіі, творчыя партрэты, артыкулы па праблемах літаратуры і мастацтва змяшчала на старонках «Звязды», «ЛіМа», «Чырвонай змены», «Маладосці», «Беларусі», «Мастацтва Беларусі» і інш. У 1981 за творчы партрэт Галіны Кухальскай «Паверыць у крылы» («Маладосць», 1981. № 9) адзначана прэміяй Саюза журналістаў. Як празаік дэбютавала ў 1988 на старонках «Маладосці». Апавяданні Г. Багданавай друкаваліся ў часопісах «Полымя», «Беларусь», «Работніца і сялянка». Аўтар зборнікаў прозы «Папяровыя замкі» (1990), «Чалавек без адраса» (1991), «Дом іхняе мары» (1994). Выступае як драматург (містычная феерыя «Містычнае падарожжа на той свет»). Піша вершы для дзяцей, перакладае. Паводле яе п'есы «Майстэрня Жучка-Баравічка» і апавядання «Супер-8» пастаўлены радыёспектаклі.

Жыве ў Мінску.

В. У. Смольская.

1.2.
Папяровыя замкі: Апавяданні. Мн., 1990 (Б-ка час. «Маладосць». № 1).
Чалавек без адраса. Мн., 1991.
Дом іхняе мары: Апавяданні, аповесці. Мн., 1994.
1.3.
1978. Святло дабраты: [Рэц. на кн.: В і т к а В. Вышыні святла. Мн., 1977] // Звязда. 18 мая; Калі змаўкаюць птушкі // Наст. газ. 25 сак.
1981. Паверыць у крылы // Маладосць. № 9; Калі аблятаюць каштаны... // Чырв. змена. 30 вер.
1982. Уваход у мару // ЛіМ. 10 снежня.
1983. Абы святлом кахання свяцілася душа: [Творчы партрэт] // Беларусь. № 12.
1984. Казачны пачатак: [Творчы партрэт] // Маладосць. № 10.
1985. П'еса, якой няма: [Творчы партрэт] // Маладосць. № 6 (Прэмія час. «Маладосць»).
1.6.
Н а б о к о в В. Король, дама, валет; Подвиг; Лолита: Раманы. Мн., 1992 / Скл. з Б. Сачанкам.
Прага чысціні // Мастацтва Бел. 1985. № 10 / Зап. *М. П. Барташэвіч.*

БАГДАНОВІЧ ЯНКА

агдановіч Янка [Іван
Антонавіч; псеўд
Я. Ваўштолс
нка
Ваўштолскі
крыпт. Я. Б.; 4(17).11
1906, в. Гібінята
Смянскага пав
Віленскай губ., цяпер
Заложынскі р-н
Мінскай вобл.—
07.1990, Вільнюс,
пахаваны на могілках
Саулес], празаік, паэт,
публіцыст, мемуарыст

Нарадзіўся ў сялянскай сям'і. У 1918 яго бацькі амаль адначасова памерлі. Дванаццацігадоваму Янку і яго малодшаму брату Віктару давялося жыць спачатку ў Барунскім, затым у Віленскім дзіцячых прытулках, арганізаваных беларускай інтэлігенцыяй на зыходзе 1-й сусветнай вайны. Скончыўшы Віленскую беларускую гімназію (1927), працаваў у друкарні імя Ф. Скарыны (1927—41). У 1930 Я. Багдановіч пачаў друкаваць у віленскіх газетах і часопісах свае вершы, артыкулы, допісы, уключыўся ў заходнебеларускі грамадска-культурны рух. Разам з Я. Шутовічам, М. Пецюкевічам, Я. Найдзюком выдаваў незалежны часопіс «Шлях моладзі» (1929—40), у якім друкаваў лірычныя замалёўкі, апавяданні, вершы, байкі. У гады вайны вучыўся ў Віленскай настаўніцкай семінарыі і адначасова працаваў у пачатковай школе № 50 (1941—43), настаўнічаў у Павільніскай пачатковай школе № 23, у 1945 стаў яе дырэктарам. Затым быў дырэктарам віленскай польскай школы № 22 (1945—46), якая пазней была далучана да школы № 16, дзе Я. Багдановіч таксама працаваў у 1946—52. Рэгулярна пісаў артыкулы ў польскую газету «Czerwony sztandar» («Чырвоны штандар»). У 1952 паступіў у Нова-Вільняйскі педагагічны інстытут. У жніўні 1952 быў беспадстаўна рэпрэсіраваны, высланы ў Варкуту, дзе жыў да верасня 1956. Пасля рэабілітацыі вярнуўся ў Вільнюс і зноў працаваў настаўнікам пачатковай школы № 16 (1956—67), васьмігадовай № 3 (1967—74). Завочна скончыў педінстытут.

Апрача вершаў, апавяданняў і артыкулаў Я. Багдановіч пісаў успаміны пра пісьменнікаў, настаўнікаў. Аўтар падрыхтаваных да друку мемуараў «На жыццёвым шляху», у якіх цікава паказаны жыццё і побыт віленскай беларускай інтэлігенцыі ў даваенны час. *А. С. Ліс.*

Бібліяграфія

1.2.
На жыццёвым шляху: Успаміны. Мн., 1992.

1.3.
1930. Моладзь: [Верш] // Шлях моладзі. № 2 / Пад крыпт. Я. Б.; Пачатак вясны: [Апавяданне] // Там жа. № 3 / Пад крыпт. Я. Б.; Першая пралесачка: [Замалёўка] // Там жа. № 4 / Пад крыпт. Я. Б.; Першая пралесачка: [Замалёўка] // Там жа. № 5 / Пад крыпт. Я. Б.; Вучоны сын: [Апавяданне] // Там жа. № 6 / Пад псеўд. Янка Ваўштолскі; Батрачае жыццё: [Апавяданне] // Там жа. № 10 / Пад псеўд. Янка Ваўштолскі; Восень: [Замалёўка] // Там жа. № 11 / Пад псеўд. Янка Ваўштолскі; Восень: [Апавяданне] // Там жа. № 12 / Пад псеўд. Янка Ваўштолскі; Ночка: [Апавяданне] // Там жа. № 13 / Пад псеўд. Янка Ваўштолскі.

1931. Удава: [Апавяданне] / Шлях моладзі. № 3 / Пад псеўд. Янка Ваўштолскі; З мінулых дзён: [Успаміны] // Там жа. № 5—11 / Пад псеўд. Янка Ваўштолскі; Вол — вучыцель: [Байка] // Там жа. № 12 / Пад крыпт. Я. Б.

1940. Мой успамін // Ксёндз Адам Станкевіч... Вільня. 1940.

В. М. Грышкевіч.

БАРАВІК МАРЫЯ

Баравік
Марыя Якаўлеўна
(н. 22.2.1946,
в. Прэабражэнка
Глыбоцкага р-на
Віцебскай вобл.),
паэтэса. Член СП
Беларусі з 1992.

Бацька, Баравік Якаў Іванавіч (1900—1965), да савецкага часу батрачыў на паноў. У гады Вялікай Айчыннай вайны накіраваны на работу ў г. Мурманск, дзе страціў зрок і камісаваны па непрацаздольнасці. Пісаў вершы, балады, меў добры музычны слых. Маці, Баравік Марыя Адамаўна (1908—1971), з дзесяці гадоў асірацела і працавала на панскай службе. Таксама страціла зрок. Сям'я жыла ў беднасці. У 1965 будучая паэтэса закончыла Падсвільскую (Глыбоцкі р-н) сярэднюю школу. Працавала мастацкім кіраўніком Падсвільскага Дома культуры (1965—67), літработнікам глыбоцкай раённай газеты «Шлях перамогі» (1967—70), з 1970 бібліятэкарам Падсвільскай дзіцячай бібліятэкі. У 1978 закончыла факультэт журналістыкі БДУ.

Першыя вершы з'явіліся ў раённай газеце «Шлях перамогі» ў 1965. У рэспубліканскім друку пастаянна друкуецца з 1967 («Дзень паэзіі», «Беларусь», «Маладосць», «Вясёлка», «Бярозка», «ЛіМ» і інш.). Піша вершы, казкі, замалёўкі для дзяцей. У 1985 выйшаў зборнік яе паэзіі «Поле долі». Вершы кранаюць даверлівай інтанацыяй і разнастайнасцю фарбаў, вызначаюцца арганічным зліццём душэўнай адкрытасці з дасканалым веданнем народнага жыцця. У іх цікава выкарыстоўваюцца эпітэты, параўнанні, метафары.

Жыве ў г. п. Падсвілле.

В. У. Смольская.

Бібліяграфія

1.2.
Поле долі: Вершы. Мн., 1985. (Першая кніга паэта). Рэц.: Дзялун М. «Сонца лезе... вешацца»; Жыгуноў А. «Кіну голас...» // ЛіМ. 1985. 6 снеж.; Рублеўскі С. «Душа расце — я адчуваю» // Віцеб. рабочы. 1985. 21 снеж.

1.3.
1966. Пробуждение: [Верш] // Віцеб. рабочы. 25 вер.; Песня бабьего лета; Осиновый дождь; Осень, моя осень...: [Вершы] // Там жа. 30 кастр.

1967. Гадзіннік; «Адчапіцеся — я занята...»: [Вершы] // Маладосць. № 7; Гадзіннік: [Верш] // Віцеб. рабочы.

30 мая; «Адчапіцеся — я занята...»: [Верш] // ЛіМ. 11 ліп.

1968. «Ты не крыўдуй, чалавек...»; «Восень мая, восень»; «Расказваеш мне пра вайну...»: [Вершы] // Маладосць. № 9; «Ты не крыўдуй, чалавек»; Усмешка: [Вершы] // Віцеб. рабочы. 13 крас.; Веру зямлі: [Верш] // Чырв. змена. 1 кастр.

1969. Неспакой: [Верш] // Віцеб. рабочы. 23 ліп.; Размова з клёнам: [Верш] // Там жа. 16 снеж.; «Я маці з-пад блакіту неба...»: [Верш] // ЛіМ. 18 ліст.; «Верыш, дружа, якое шчасце...»: [Верш] // Чырв. змена. 7 вер.; Шпак: [Верш] // Там жа. 23 ліст.

1970. «Верыш, дружа, якое шчасце...»; «Я маці з-пад блакіту неба...»; Яблынька — аблачынка; «Восень птушкам аб'яўляе провады...»; «Вазьму з сабой блакнот, аловак...»; «Я бываю, як рэчка горная...»: [Вершы] // Маладосць. № 12; Парай мне, лес: [Верш] // Віцеб. рабочы. 31 студз.

1971. Радзіма; Сіўка-бурка; «Іду сур'ёзная, іду дарослая...»; «У квадрат акна пазіраю...»; Сабака: [Вершы] // Віцеб. рабочы. 24 жн.

1972. Павяду цябе; «Іду сур'ёзная, іду дарослая...»: [Вершы] // Маладосць. № 3; Радзіма: [Верш] // Рабочая смена. № 5; «Радзіма», «Неба чэрвеньскае загрукала...»; «Верыш, дружа, якое шчасце...»; «Я на месцы гняздоўя роднага...»; Раненая качка; «Баюся зноў цярпенне страціць...»; «Чалавеку трэба быць паэтам...»; Настаўніку; «Святая шчырасць...»; «Адчапіцеся — я занята...»; Маці Леаніда Якубовіча; «Страшна мне...»; «Я бываю, як рэчка горная»; «Колькі думак у белыя ночы...»; «Няхай над прыазёрным лугам...»; «Пакладу пад шчаку далоні...»; Спатканне; «Пакаціўся светлы клубок...»: [Вершы] // Віцеб. рабочы. 22 лют.; Ліліт; Павяду цябе; «Як гарызонт — далёкі...»; «Ніколі я не спытаю...»: [Вершы] // Там жа. 26 жн.; Радзіма; «Я бываю, як рэчка горная...»: [Вершы] // Голас Радзімы. 15 мая; «Колькі думак у белыя ночы...»; Спатканне: [Вершы] // Знамя юности. 3 окт.; Радзіма; «Неба чэрвеньскае загрукатала...»; «Верыш, дружа, якое шчасце...»: [Вершы] // Чырв. змена. 15 сак.; «Неба чэрвеньскае загрукатала...»; Сіўка-бурка: [Вершы] // Там жа. 6 вер.; «Пакаціўся светлы клубок...»: [Верш] // Чырв. змена. 27 чэрв.

1974. Бабіна лета; «Прыбіла восень да долу лісце...»: [Вершы] // Маладосць. № 3; Салдату; «Заўтра мы — на ростанях...», «Не існавала на свеце зла...»: [Вершы] // Віцеб. рабочы. 1 ліст.

1975. Шмат за лёс я твой пратлела... [Верш] // Віцеб. рабочы. 7 чэрв.; Максіму Багдановічу; Залатая восень: [Вершы] // Там жа. 12 ліп.; Максіму Багдановічу: [Верш] // Знамя юности. 23 окт.; Пяшчота: [Верш] // Чырв. змена. 1 чэрв.

1976. Салдату не мінула дваццаць...; «Жыць можаш без мяне? — Жыві!..» [Вершы] // Віцеб. рабочы. 13 жн.

1977. «Як аблачынка, белым-белы сад...»; «І зноў віхурыцца застолле...»; Абнаўленне: [Вершы] // Маладосць. № 6; Максіму Багдановічу; Залатая восень: [Вершы] // Віцеб. рабочы. 12 ліп.; «Шмат за лёс я твой пратлела...»: [Верш] // Там жа. 7 чэрв.; Памяць; «Сон ці ява сілы немагчымай...»; Па грыбы; «У цёплым морыве на ўсходзе...»; Восень: [Вершы] // Віцеб. рабочы. 25 ліст.

1978. Памяць; «Роднае маё поле...»: [Вершы] // ЛіМ. 23 чэрв.

1979. На ўзлёце мары... (Памяці Л. Якубовіча): [Верш] // Якубовіч Л. Я з вамі, вёсны. Мн.; «Кар'ера...»; Крытык — «першапраходца»: [Вершы] // ЛіМ. 27 ліп.; «Зварухнула галіну...»; «Вясна у неба на прыкмеце...»: [Вершы] // Чырв. змена. 8 крас.

1982. Чалавечнасць: [Верш] // Віцеб. рабочы. 14 мая; Сын: [Верш] // Там жа. 23 ліп.; «Святло надзённай пазалоты...»; «Былі і сад і светлае аконца...»: [Вершы] // ЛіМ. 20 жн.

1983. Бабіна лета: [Верш] // Дзень паэзіі — 83. Мн.; Першы снег: [Верш] // Род. прырода. № 1; «Мы на даверлівай зямлі...»: [Верш] // Чырв. змена. 22 студз.

1984. «Ля палочка — дзве пячуркі, нары...»; [Верш] // Дзень паэзіі — 84. Мн.; Загадкі // Голас Радзімы. 9 жн.

1985. «Мір узыходзіў у зялёным лісці»: [Верш] // ЛіМ. 9 мая.

1.5.

На рускую мову. Часы: [Верш] / Пер. И. Василевский // Извечной песни голоса. Мн., 1980.

М. П. Барташэвіч.

БАРОЎСКІ АНАТОЛЬ

Бароўскі Анатоль Мікалаевіч (псеўд. Антон Крушня; н. 12.5.1942, в. Крушнікі Мазырскага р-на Гомельскай вобл.), празаік, нарысіст. Член СП Беларусі з 1990.

Нарадзіўся ў сям'і служачых. Спачатку вучыўся ў Тажылавіцкай СШ (Бабруйскі р-н), з 1958 працягваў вучобу ў Асавецкай СШ (Мазырскі р-н). Пасля заканчэння ў 1960 школы нядоўгі час працаваў у калгасе, на Мазырскім заводзе жалезабетонных вырабаў. Са студзеня па май 1961 настаўнік Турбінскай пачатковай школы (Мазырскі р-н). У 1961 паступіў на факультэт пачатковых класаў Мазырскага пединстытута, але праз год быў прызваны ў Савецкую Армію (служыў у Групе савецкіх войск у Германіі, 1962—64). Пасля дэмабілізацыі працягваў вучобу ў пединстытуце, перавёўшыся на завочнае аддзяленне (1964—67). Працаваў карэспандэнтам мазырскай раённай газеты «Камуніст Палесся» (1964—67), інспектарам арганізацыйнага аддзела Мазырскага гаркома КПБ (1967—68). З 1968, у сувязі з прызывам афіцэраў запасу, служыў у званні лейтэнанта начальнікам клуба ў г. Полацку. З 1970 адказны сакратар гарадской арганізацыі таварыства «Веды», з 1974 намеснік дырэктара па навучальна-выхаваўчай рабоце прамыслова-геалагічнага вучылішча № 84 г. Мазыра, з 1975 — уласны карэспандэнт газеты «Чырвоная змена» па Гомельскай вобл. Узнагароджаны медалём.

Першы верш А. Бароўскага з'явіўся ў армейскім друку ў 1963 (публікацыя не выяўлена). На старонках беларускага друку выступае з 1965 (газета «Чырвоная змена»). Першая аповесць «Тросніца» апублікавана ў 1979 (часопіс «Маладосць»). Аўтар кнігі прозы «Каліна пад акном». У сваіх творах уздымае маральна-этычныя праблемы, разважае аб месцы чалавека ў жыцці. Вядомы як нарысіст. Яго нарысы друкаваліся ў рэспубліканскіх газетах і часопісах, зборніках «Юнацтва», «Беларусь» («Двойчы расстраляны», «Крынічка мая — Зялёны мох...», «Мікалай пушкар» і інш.). Пісьменніку ўласцівы цікавасць да гісторыі сваёй зямлі, добрае веданне жыцця вёскі, любоў і павага да працаўніка.

Жыве ў Гомелі.

Г. М. Урупіна.

Бібліяграфія

1.2.
Каліна пад акном: Аповесці, апавяданні. Мн., 1987.

1.3.
1965. Салдаты: [Верш] // Чырв. змена. 19 снеж.
1968. Узаемнасць: Гумарэска // Вожык. № 2; Чырвоныя гваздзікі: Апавяданне // Гомел. праўда. 12 снеж.
1970. Статуэтка Бетховена: Рассказ // Во славу Родины. 1 февр.
1972. Зялёны гарошак: Гумарэска // Чырв. змена. 20 крас.
1976. Моц наша ў згодзе святой // Чырв. змена. 8 ліп.
1977. Таварыш капітан: Нарыс // Маладосць. № 7.
1978. Сіла ўнушэння: Гумарэска // Вожык. № 22; У жыцці настойлівым быць: [Рэц. на кн.: Кухараў С. Светлая пара. Мн., 1978] // Гомел. праўда. 29 ліст.
1979. Тросніца: Аповесць // Маладосць. № 2; Прыемная сустрэча: [Рэц. на кн.: Капыловіч І. Сонца садзіцца ў травы. Мн., 1978] // Гомел. праўда. 3 ліп.
1982. Тросніца // Знаёмства: Аповесці і апавяданні. Мн. Рэц.: Сердзюкоў М. Хлопцам пашчасціць // Гомел. праўда. 1983. 14 студз.; Чарота І. Карысць і радасць знаёмстваў // ЛіМ. 1983. 5 жн.
1984. Восень; Алеся: [Вершы] // Чырв. змена. 25 ліст.
1985. Радасць Уладзіміра Кашперкі: [Нарыс] // На пярэднім краі. Мн.; Суніцы; Накцюрн; «Ты гавары мне, гавары...»; Прыпяці: [Вершы] // Чырв. змена. 22 кастр.

1.5.
На рускую мову. Так завещал отец...: [Нарыс] / Пер. В. Касько // Письма с фронта. Мн., 1985.

2.3.
На беларускай мове. [Біяграфічная даведка] // Знаёмства. Мн., 1982.

М. П. Барташэвіч.

БАТОРЫН ФЕЛІКС

Баторын (сапр. Хаймовіч) Фелікс Барысавіч (н. 5.2.1948, Мінск), паэт, перакладчык. Член СП Беларусі 1992. Піша на беларускай і яўрэйскай (ідыш) мовах.

Нарадзіўся ў сям'і служачых. Бацька, Хаймовіч Барыс Паўлавіч, удзельнік партызанскага руху на Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны. У доме часта гасцявалі бацькавы сябры-аднапалчане. Разам з іх размовамі, апавяданнямі, успамінамі, жартамі і казкамі ў жыццё будучага паэта ўвайшла жывая беларуская мова з яе багатым і сакавітым дыялектным разнаквеццем, якая стала для яўрэйскага хлопчыка роднай. Вершы пачаў складаць рана. Закончыўшы з залатым медалём Мінскую СШ № 51, спрабаваў паступіць у Літаратурны інстытут імя М. Горкага ў Маскве, але няўдала. Паступіў у Мінскі медыцынскі інстытут. У час вучобы (1966—72) працягваў займацца літаратурай. З лёгкай рукі вядомага беларускага паэта М. Аўрамчыка, якога Ф. Баторын лічыць сваім чуйным і мудрым настаўнікам, у часопісе «Маладосць» (1968, № 6) былі ўпершыню надрукаваны вершы маладога аўтара. Пасля медінстытута Ф. Баторын працаваў урачом у Барысаве, затым у Мінску.

Ф. Баторын пастаянна друкуецца ў «Маладосці», «Полымі», «ЛіМе», «Знамени юности» і інш. Вершы на мове ідыш публікаваліся ў «Саветыш геймланд» («Савецкая радзіма», Масква), «Бірабіджанер штэрн» («Бірабіджанская зорка», Бірабіджан), «Ды ідышэ гас» («Яўрэйская вуліца», Масква), «Форвэртс» («Наперад», Нью-Йорк), «Ды пэн» («Пяро», Оксфард). Выйшлі кнігі яго вершаў «Раніца», «Зялёны тралейбус», «Я дрэва пасадзіў». Ф. Баторын — аўтар балад, паэм «Батлеечнік», «Мытнік», «Граф Тышкевіч», «Севярын Налівайка», «Пан Кошчыц», «Чумацкая балада», «Выгнаннік». У здабытку паэта санеты, лірычныя вершы, апавяданні. Перакладае паэзію і прозу з рускай, нямецкай і ідыш на беларускую мову.

Жыве ў Мінску.

Л. С. Савік.

Бібліяграфія

1.2.

Раніца: Вершы. Мн., 1981 (Першая кніга паэта). Рэц.: В е р а б ' ё ў П. Пра паэзію і дзіцячыя веласіпеды // ЛіМ. 1982. 12 лют.

Зялёны тралейбус: Вершы, балады, паэма. Мн., 1986.

Я дрэва пасадзіў: Вершы. Мн., 1991.

1.3.

1968. «Чаму сняцца мне гоні і хаты...»; «Сёння быццам я на голай крызе...»; «Лічу па вуліцах я крокі...»; Рэчка Проня: [Вершы] // Маладосць. № 6; Плошча Свабоды: [Вершы] // Там жа. № 12; Рэчка Проня: [Верш] // ЛіМ. 11 чэрв.

1970. Памяці Уладзіміра Маякоўскага; Поўня: [Вершы] // Маладосць. № 7.

1972. Восеньскае; «За вокнамі памалу сціхлі крокі...»; «Калі ў полі спалі ветры...»: [Вершы] // Маладосць. № 8.

1976. Санет; Ворыва; Напрадвесні: [Вершы] // Маладосць. № 11.

1978. Жывое слова; Роздых; «Мы з мацярынскім малаком...»; «Побліз лесу, дзе плынь прахалоды...»: [Вершы] // Маладосць. № 4; «Мы з мацярынскім малаком...»; «Побліз лесу, дзе плынь прахалоды...»: [Вершы] // Ніва. 28 мая.

1982. «Жнівень быў ласкавы, маляўнічы...»: [Верш] // Дзень паэзіі — 82. Мн.; «Ля ракі Нямігі ў Ніжнім горадзе...»; На выгане; Пейзаж; «У целе, што ты песціў звыкла...»; «У сутаргах салодкіх б'ецца цела...»; «Тапаліныя пуховыя завеі...»: [Вершы] // Маладосць. № 1;«Колькі звычаяў даўніх зусім пазнікала...»: [Верш] // Полымя. № 6; Родны кут: [Верш] // Там жа. № 10.

1983. «Дзень стаіць марозны і пагожы...»: [Верш] // Дзень паэзіі — 83. Мн.; Старое дрэва: [Верш] // Знамя юности. 8 апр.

1984. Палік; «Цяплом да болю роднага пагляду...»; Прызнанне: [Вершы] // Дзень паэзіі — 84. Мн.; «Я спытаў у самога сябе...»; Качкі; Спадарожнік; «У полі няўрымсліва сінія...»; «Навошта вы гэтак са мною?..»; «Кахаць, мой дружа, трэба ўмець...»: [Вершы] // Маладосць. № 6; Новонароджанаму; «Я выходжу ў сіні золак...»: [Вершы] // Полымя. № 10; «Цёплы вецер трэпле жартаўліва...»; «У далонях плача чалавек...»; «Не стамляюся травам і кветкам дзівіцца...»; Цыганскі дождж: [Вершы] // Знамя юности. 17 янв.; Зялёны тралейбус; Краіна пад назвай Душа; «Апошні трывожны прамень»; «Як дрэвы, што растуць»; Касцёл святога Роха; «Разгойдвае халодны вецер»; «Ты незаўважна ў сон мой увайшла»: [Вершы] // ЛіМ. 6 крас.

1985. [Біябібліяграфічная даведка пра Бергера У.] // Далягляды. Мн.; Палік: [Верш] // Партызаны, партызаны... Мн.

1.4.

1982. Г о н т а р А. «Як толькі след апошняй хмары згінуў...»: [Верш] / З яўр. // Братэрства. Мн.

1985. Б е р г е р У. Кэтэ Нідэркірхнер; Крокі; Мроі шляху: [Вершы] / З ням. // Далягляды. Мн.

М. П. Барташэвіч.

БРУЕВІЧ В.

Бруевіч В. (сапр. Рудніцкі Леанід Іванавіч; 1884—?), празаік

Атрымаў вышэйшую гісторыка-філалагічную адукацыю. З 1910 працаваў настаўнікам у гімназіях. У 1919—21 супрацоўнік беларускіх газет «Звон», «Беларусь» і «Вольны сцяг», у якіх публікаваў свае апавяданні. З 1920 выкладчык беларускай мовы, літаратуры і беларусазнаўства ў Мінскім політэхнічным інстытуце, у першай чыгуначнай школе і на агульнаадукацыйных курсах, са снежня 1923 выкладчык беларускай мовы ў БДУ. Далейшы лёс невядомы. У сваіх апавяданнях, звычайна невялікага памеру, В. Бруевіч узнімаў маральна-этычныя праблемы. Пранікаючы ва ўнутраны свет чалавека, тонка і па-мастацку выразна паказваў паводзіны людзей у складаных жыццёвых калізіях. Яго апавяданням уласцівы пластычнасць і зрокавая выразнасць малюнка, жывая натуральная мова.

В. У. Скалабан, Г. В. Якаўлева.

Бібліяграфія

1.3.

1919. Паруханае жыццё: Апавяданне // Беларусь. 4, 6 ліст.; Антонавае няшчасце: Апавяданне // Там жа. 13 ліст.; Дурны дырэктар: Апавяданне // Там жа. 30 ліст.; Стары будынак: Апавяданне // Звон. 24, 26, 29 вер.; Лук'ян: Апавяданне // Там жа. 13 кастр.

1920. Сябры: Апавяданне // Беларусь. 4 студз.; Цыгаркі: Абразок // Там жа. 31 студз.; Макар і Параска: Апавяданне // Там жа. 26 лют.; Чарніца Антонія: Апавяданне // Там жа. 27, 28 сак.; Пан у вёсцы: Апавяданне // Там жа. 7 траўня; Чорт: Апавяданне // Там жа. 9, 10, 11, 12 чэрв.; Пан Дроб у гатэлі: Апавяданне // Там жа. 4 ліп.

1921. На хаўтурах: Апавяданне // Вольны сцяг. 15 траўня.

1928. У старой хаце: Апавяданне // Чырв. сейбіт. № 9.

2.3.

На рускай мове. Карский Е. Белорусы. Пг., 1922. Т. III. С. 381; Наука и научные работники СССР. М., 1928. Ч. VI. С. 356.

В. У. Скалабан, Г. В. Якаўлева.

БЯРОЗКА АНАТОЛЬ



Бярозка Анатоль [сапр. Смаршчок Мацвей (Мітрафан), н. 19.2.1915, в. Падлессе Баранавіцкага пав. (цяпер Ляхавіцкі р-н Брэсцкай вобл.)], паэт. Заслужаны доктар медыцыны.

Вучыўся ў пачатковай школе ў роднай вёсцы і ў Ляхавічах. Затым скончыў гімназію і ліцэй у Баранавічах. У 1939 быў студэнтам медыцынскага факультэта Віленскага універсітэта, адначасова працаваў на гэтым факультэце як асістэнт. З першай ваеннай хваляй эміграцыі апынуўся ў ЗША. Вызначыўся там як выдатны спецыяліст-медык, імем якога названы адзін з карпусоў медыцынскага комплекса ў г. Мантысэла, штат Мінесота (В. Кіпель «Беларусы ў ЗША». Мн., 1993. С. 304).

Вядомая нам паэтычная спадчына А. Бярозкі параўнальна невялікая. Яго вершы канца 1920—30-х г. друкаваліся ў віленскіх перыядычных выданнях «Заранка», «Шлях моладзі», «Калоссе». У 1939 у беларускай хроніцы газ. «Крыніца» А. Бярозка называўся другім (пасля Н. Арсенневай) «выбітнейшым беларускім літаратарам, які астаўся ў Вільні». Пасля 1939 публікацыі А. Бярозкі ў беларускім друку зніклі. І толькі ў 1955 у нью-йоркскім беларускім часопісе «Конадні» з'явіўся верш А. Бярозкі «Ліст да маці: Пераклад з забытага», пад якім стаіць дата «кастрычнік 1949». У «Крыніцы» ў 1939 быў надрукаваны пераклад А. Бярозкам верша Здэнко Нажычкага «Пісьмо да маці», настальгічнай варыяцыяй якога стаў новы твор.

У 1989 у ЗША Мацвеем Рэпкавым-Смаршчком быў выдадзены невялікі зборнік вершаў А. Бярозкі «Адзінаццаць вершаў» з паралельным тэкстам на беларускай і англійскай мовах. Гэтую своеасаблівую містыфікацыю, калі выдавец і аўтар выступаюць у адной асобе, але пад рознымі імёнамі, відаць, можна вытлумачыць тым, што паэтычная творчасць А. Бярозкі ў асноўным ажыццявілася і вычарпалася ў 1930-я г. ў Вільні (усе вершы зборніка — той пары), а ў пазнейшы, эміграцыйны час доктар медыцыны Мацвей (Мітрафан) Смаршчок цалкам аддаўся лекарскай практыцы і, магчыма, вершаў больш не пісаў. У паэзіі А. Бярозкі чуюцца водгаласы адраджэнскай беларускай паэзіі. Ён знаходзіцца ў коле традыцыйных вобразаў: абуджальнай вясны, руні, нёманскіх хваляў, дубоў, што выстойваюць у буру, ліхіх хмараў («Шуміць Нёман», «На раскутай з-пад снежных пялёнаў землі...», «Пяі аб вясне!»). Але звыклыя матывы, дзе прысутнічаюць плач аб нядолі і мара аб далёкай светлай будучыні, паэт імкнецца эстэтызаваць, упрыгожыць, ускладніць фактуру верша тонкай лексічнай арнаментыкай. Некаторыя вершы напісаны пад адчувальным уплывам М. Багдановіча («Фрагмент»), А. Пушкіна («Зімовым вечарам»). У рэцэнзіі на выданне твораў А. Бярозкі 1989 г. Я. Запруднік адзначаў танальны мінор, якім афарбаваны вершы паэта, не як сведчанне кволасці душы, а як прыкмету яе чуласці

і спагадлівасці: «Аўтар жыве ў свеце восеньскім, вячорным і начным, калі ягоная душа найглыбей адчувае прыхаванае змрокам маўклівае людское гора, ці не адзінай дапамогай якому засталося толькі паэтава спачуванне» («Беларус», Нью-Йорк, 1989. № 64).

Жыве ў г. Мантысела, штат Мічыган (ЗША).

І. Э. Багдановіч.

Бібліяграфія

1.2.

Адзінаццаць вершаў; Eleven poems. Мантыселя (ЗША), 1989.

1.3.

1933. Хрыстос Ускрос: [Верш] // Шлях моладзі. № 4; Устань!: [Верш] // Там жа. № 5; «О, не пяі, сястрыца, сумнай песні!..»: [Верш] // Там жа. № 6; «О, восенькі віхор, ты мой друг, ты мой брат!..»: [Верш] // Там жа. № 9; Васеннім кветкам: [Верш] // Там жа. № 10; «Вітай, вітай, зіма, халодна наша маці!..»: [Верш] // Там жа. № 11, 12.

1934. «На ўслончыку засела над ваконцам...»: [Верш] // Шлях моладзі. № 2; «Ноч навісла над соннай зямлёй...»: [Верш] // Там жа. № 4; Жаўранак: Санет // Там жа. № 5; «Яна пяе...»: [Верш] // Там жа. № 7—8; «Бліснула зор чарада...»: [Верш] // Там жа. № 11; Восень: [Верш] // Там жа. № 12.

1935. «...Снягі... снягі... снягі... І шэры дзень зімовы...»; «Туман разаслаўся над соннай зямлёю...»: [Вершы] // Калоссе, № 1; Зімовым вечарам; «Заснула ноч. Павіслі ціха зоры...» (Грам. Машары на выезд у Гдыню прысвячаю); Фрагмент; «Шуміць Нёман...»: [Вершы] // Там жа. № 2; Ноч ідзе...; «На раскутай з-пад снежных пялёнаў зямлі...»; «Вось ізноў плачуць струны гітары тваёй...»: [Вершы] // Там жа. № 3; Перадавым; Адлёт жураўлёў; «Пяі аб вясне!..»: [Вершы] // Там жа. № 4; «Збудзіся, Крывіч, з паднявольнага сну...»: [Верш] // Шлях моладзі. № 1; «Бурляць і ймкнуцца няўпэўнныя думкі...»: [Верш] // Там жа. № 2; «Ціхутка траўнёвая ноч падышла...»: [Верш] // Там жа. № 6.

1936. «Адзінота»; Зіма: [Вершы] // Калоссе. № 1; «Тысячай воч палымяных, распаленых цемрай начною...»; «Поле, далёка — шырока поле... І неба над полем...»: [Вершы] // Там жа. № 2; «Парвалась струна...»: [Верш] // Шлях моладзі. № 4; «Над разорамі чорных палёў, разаслаўшыся хваляй шырокай...»: [Верш] // Там жа. № 10.

1937. «І сустрэнь мяне, о поле...»: [Верш] // Калоссе. № 1; «Не, я не скажу табе...»; «Ноч каля буды»: [Вершы] // Там жа. № 4; «Я люблю цябе, вечар, за цень перажытага дня...»: [Верш] // Шлях моладзі. № 1.

1938. «Зіма...»: [Верш] // Шлях моладзі. № 3.

1939. «Сягоння ты гэтак блізка...»: [Верш] // Калоссе. № 1; Credo in duos deos: [Верш] // Там жа. № 2.

1991. «Вядучы матыў»; «Сягоньня патухла тваё акно...»; «Ліст да маці»; «Верасьнёвае сонца гуляе»: [Вершы] // Полацак. № 6—7.

1992. Адлёт жураўлёў; «Сягоння патухла тваё акно...»; Поле, далёка — шырокае поле... І неба над полем...; «Тысячай воч палымяных, распаленых цемрай начною...»; «Абяздолены мой страшны шлях...»: [Вершы] // Туга па Радзіме. Мн.

1.4.

1938. Міцюта О. Не заступіце дарогі; Жукаўскас А. Паварот да вершаў: [Вершы] / З літ. // Калоссе. № 2.

1939. Нажычкі З. Пісьмо да маці: [Верш] / З пол. // Крыніца. 1 снеж.

1955. [Нажычкі З.] Ліст да маці (Пераклад з забытага) / З пол. // Конадні. № 4.

1992. [Нажычкі З.] Ліст да маці (Пераклад з забытага): [Верш] / З пол. // Туга па Радзіме. Мн.

2.3.

На беларускай мове. Вечар беларускай паэзіі і песні // Наша воля. 1936. № 5; Рэпкаў-Смаршчок М. «Абяздолены мой стромны шлях...» // Полацак. 1991. № 6—7; Я. Н. [Найдзюк Я.]. Вечар беларускай паэзіі і песні // Шлях моладзі. 1936. № 3.

На польскай мове. R. K. Na białoruskim Parnasie poetyckim w Wilnie // Środy Literackie. 1937. Nr. 7; [«Wieczór poezji i pieśni białoruskiej» w Wilnie 15.III.1936 r.] // Słowo, 1936. Nr 72.

3.1.

ЦБ АН Літвы, аддз. рукап., ф. 21, адз. зах. 44.

Т. М. Махнач.

ВАЛОШКА МАКСІМ

Валошка Максім (сапр. Бутэвіч Анатоль Іванавіч; інш. псеўд. А. Баярскі, Міша Алімпік; н. 15.6.1948, в. Баяры Нясвіжскага р-на Мінскай вобл.), перакладчык, дзіцячы пісьменнік, публіцыст, крытык. Член Саюза журналістаў з 1972. Член СП Беларусі з 1994.

З сялянскай сям'і. Бацька, Іван Іванавіч, і маці, Марыя Канстанцінаўна, усё жыццё працавалі на зямлі, цяпер на пенсіі. Маці добра спявае, ведае шмат народных песень, валодае вострым словам, пачуццём гумару. У 1963 А. Бутэвіч скончыў Веліпаліпскую 8-гадовую школу, у 1966 Сноўскую сярэднюю школу. У 1966—71 вучыўся на аддзяленні беларускай мовы і літаратуры філалагічнага факультэта БДУ. Пасля яго заканчэння працаваў рэдактарам Беларускага тэлеграфнага агенцтва (1971—73), інструктарам ЦК ЛКСМБ (1973—75), намеснікам рэдактара газеты «Чырвоная змена» (1975—80), загадчыкам аддзела прапаганды і культурна-масавай работы ЦК ЛКСМБ (1980), інструктарам сектара мастацкай літаратуры аддзела культуры ЦК КПБ (1980—86), дырэктарам выдавецтва «Мастацкая літаратура» (1986—87), загадчыкам сектара мастацкай літаратуры, намеснікам загадчыка ідэалагічнага аддзела ЦК КПБ (1987—90), старшынёй Дзяржаўнага камітэта Беларусі па друку (1990—92), міністрам інфармацыі Рэспублікі Беларусь (1992—94). З 1994 — міністр культуры і друку Рэспублікі Беларусь. Член Рады СП Беларусі.

Яшчэ ў школьныя гады друкаваўся ў нясвіжскай раённай газеце «Чырвоны сцяг», рэспубліканскім друку. Першая прыкметная публікацыя з'явілася ў часопісе «Беларусь» у 1969. Перакладае з польскай, рускай і ўкраінскай моў, а таксама на рускую мову. Першы пераклад з польскай мовы надрукаваны ў «ЛіМе» ў 1977, а першая падборка гумарэсак з польскай мовы змешчана ў калектыўным зборніку «Вясёлы калейдаскоп» (1979). У яго перакладах выйшлі кнігі «Крутые вёрсты» У. Ліпскага (Масква, 1981, Кемерава, 1982, 1989), «Солёная роса» А. Капусціна (Казань, 1984), «Прыгоды Піркса» С. Лема (1992), «Марсианское путешествие» В. Гіевіча (1992), «Салярыс» С. Лема (1994). Ён пераклаў на беларускую мову творы Шолам-Алейхема, Я. Асэнкі, Р. Маеўскага, А. Давыдава, У. Крупіна, А. Гудзяліса, Ю. Збанацкага, П. Панча, Д. Олдрыджа і многіх іншых рускіх, украінскіх, польскіх аўтараў, на рускую мову — творы А. Гарана, Я. Сіпакова, беларускі народны гумар. У перакладах добра перадае рэаліі, стыль пісьменніка, яго манеру пісьма. Ёсць свой выбар тэкстаў, дзе беларусамі засвойваюцца новыя пласты лексікі, свае строгія прынцыпы падыходу да арыгіналаў. Літаратурныя рэцэнзіі, публіцыстычныя творы напісаны прафесіянальна, з веданнем справы. П'есы, узноўленыя па-беларуску М. Валошкам, ідуць на беларускай сцэне. Выступае з апавяданнямі для дзяцей.

Жыве ў Мінску.

В. У. Смольская.

Бібліяграфія

1.3.

1969. Аб зернях хараства: [Рэц. на кн. Конан У. Развіццё эстэтычнай думкі ў Беларусі. Мн., 1968] // Беларусь. № 11 / Пад сваім прозв.

1970. Аб беларускай паэме: [Рэц. на кн.: Беларуская паэма ў другой палавіне XIX — пачатку XX ст. Мн., 1970] // Беларусь. № 11 / Пад сваім прозв.

1971. Нясвіжу патрэбны музей // ЛіМ. 22 студз.; Павучальны вопыт: [Рэц. на кн.: Урбановіч У. Шляхамі паэтаў і герояў. Мн., 1970] // Наст. газ. 11 вер. / Усё пад сваім прозв.

1972. Песні брацтва над Нёманам. Свята паэзіі ў Мікалаеўшчыне // Звязда. 19 вер.; ЛіМ. 22 вер. / Сааўт. А. Капусцін, І. Падаражанскі; З павагай да чалавека: [Рэц. на кн. Даніленка М. Запаветны акіян. Мн., 1972] // ЛіМ. 1 снеж.; Франциск Скорина — печатник и художник: [Рэц. на кн.: Баразна Л. Гравюры Францыска Скарыны. Мн., 1972] // Труд. 3 кастр.; Кніга пра мужнасць // Чырв. змена. 12 кастр. / Усё пад сваім прозв.

1973. Даследаванне пра творчасць К. Чорнага: [Рэц. на кн.: Адамовіч А. Маштабнасць прозы. Мн., 1972] // Беларусь. № 9; Попел Хатыні ў сэрцы: [Рэц. на кн.: Нагнібеда М. Званы Хатыні. Мн., 1973] // ЛіМ. 5 кастр.; [Рэц. на кн.: Барадулін Р. Вяртанне ў першы снег. Мн., 1972] // Наст. газ. 24 студз. / Усё пад сваім прозв.

1974. Девушка из Еремино: [Нарыс] // Комсомол Белоруссии в третьем решающем. Мн.; З далёкіх вандровак: [Рэц. на кн.: Хорсун В. З дарог далёкіх і блізкіх. Мн., 1973] // Беларусь. № 5; Юность, опаленная войной: [Нарыс] // Знамя юности. 7 мая; Факты і... схема: [Рэц. на кн.: Матрунёнак А. Псіхалагічны аналіз у сучасным беларускім рамане. Мн., 1972] // ЛіМ. 1 сак.; Па запаветах Ільіча: [Рэц. на кн.: Максимов Л. Заветы Ленина и молодежь. Мн., 1973] // Там жа. 14 крас. / Усё пад сваім прозв.

1975. Біяграфія пакаленняў: [Рэц. на кн.: Очерки истории Ленинского комсомола Белоруссии. Мн., 1975] // Маладосць. № 11 / Пад сваім прозв.; Пульс планеты: [Рэц. на кн.: Павлов С. Репортаж с борта Земли. Мн., 1975] // ЛіМ. 26 снеж.; Урокі этыкі: [Рэц. на кн.: Лапцёнак С. Этыку — моладзі. Мн., 1975] // Чырв. змена. 12 кастр. / Пад сваім прозв.

1976. Влияние литературы на формирование нравственных качеств молодежи (по произведениям И. Шамякина) // Актуальные проблемы идейно-нравственного воспитания молодежи. Мн.; Ёсць пяцігодка: [Нарыс] // На галоўных рубяжах. Мн.; Вызначана дакументальнасцю: [Рэц. на кн.: Капусцін А. Суд вырашыў. Мн., 1975] // Беларусь. № 5; Радок у летапіс: [Рэц. на кн.: Паўловіч У. Залацінка. Мн., 1976] // Маладосць. № 12; Там, дзе рэйкі ідуць праз тайгу: [Нарыс] // ЛіМ. 7 мая; Паэма пра мужнасць // Чырв. змена. 22 лют.; Дэсант у тайгу: беларускія будаўнікі БАМА: [Нарыс] // Там жа. 4—6, 25, 30 мая; 17—19 жн. / Усё пад сваім прозв.

1977. Пачыналася гэта так...: [Рэц. на кн.: Мележ І. Першая кніга. Дзённікі. Сшыткі. З запісных кніжак. Мн., 1977] // ЛіМ. 30 снеж.; Высокі крытэрый: [Рэц. на кн.: Гіль М. Таццянін чэрвень // Маладосць. 1976. № 12] // Чырв. змена. 23 студз.; Замір'е змагалася за мір: [Нарыс] // Там жа. 12 ліп. / Усё пад сваім прозв.

1978. Школа жизни: [Нарыс] // Молодая гвардия труда. Мн.; Увага да чалавека: [Рэц. на кн.: Капусцін А. Размова ў дарозе. Мн., 1977] // Беларусь. № 11; Зорная кніга касманаўта: [Рэц. на кн.: Клімук П. Зоры — побач. Мн., 1977] // Голас Радзімы. 1 чэрв.; [Рэц. на кн.: Жук А. Зоркі над палігонам. Мн., 1977] // Чырв. змена. 23 лют.; Вяртанне ў маладосць // Там жа. 30 ліст. / Усё пад сваім прозв.

1979. Споведзь шчырая і праўдзівая: [Рэц. на кн.: Бялевіч А. Споведзь сэрца. Мн., 1978] // ЛіМ. 5 студз.; Камсамольская вернасць: [Рэц. на кн.: Сэрцам табе прысягаю. Мн., 1978] // Там жа. 27 крас.; Бацькоў хлебаробскую славу дастойна працягвае моладзь: [Нарыс] // Чырв. змена. 31 сак.; Памяць стукае ў сэрца: [Нарыс] // Там жа. 6 мая; Пясняр баявога юнацтва // Там жа. 9 кастр. / Усё пад сваім прозв.

1980. Хлебаробская настойлівасць: [Нарыс] // Камсамол Беларусі ў дзесятай пяцігодцы. Мн.; Взлётная полоса: [Нарыс] // Знамя юности. 11 вер.; За чалавека на планеце людзей: [Рэц. на кн.: Адамовіч А. Літаратура, мы і час. Мн., 1979] // Чырв. змена. 15 сак.; / Усё пад сваім прозв.

1981. Будую свой горад: [Нарыс] // Камсамольскі гарніст. Мн. / Пад сваім прозв.

1983. Сонца-абаронца: [Казка] // Вясёлка. № 11.

1984. Лес на выжарыне: [Апавяданне] // Вясёлка. № 11; Хлеб і песня: [Нарыс] // Знамя юности. 13 снеж. / Пад псеўд. А. Боярский.

1985. Юность, опалённая войной: [Нарыс] // Пісьмы з фронту. Мн. / Пад сваім прозв.; Фоталетапіс жыцця паэта: [Рэц. на кн.: Максім Танк. Мн., 1985] // Чырв. змена. 1985. 31 ліп. / Пад псеўд. А. Баярскі; Апаленая кніга: [Апавяданне] // Вясёлка. № 9; Надзейка-Чарадзейка: [Казка] // Работніца і сялянка. № 9.

1.4.

Липский В. Крутые вёрсты / С бел. М., 1981 / Пер. пад сваім прозв.

Липский В. Крутые вёрсты / С бел. Кемерово, 1982; Кемерово, 1989 / Пер. пад сваім прозв.

Капустин А. Солёная роса: Повесть / С бел. Казань, 1984 / Пер. пад сваім прозв.

Гигевич В. Марсианское путешествие / С бел. Мн., 1992.

Лем С. Прыгоды Піркса / З пол. Мн., 1992.

Лем С. Салярыс / З пол. Мн., 1994 (Б-ка замежнай прозы).

1977. Маеўскі Р. Дзверы: [Гумарэска] /З пол. // ЛіМ. 16 снеж. / Пад сваім прозв.

1978. Маевский Р. Пятно: [Гумарэска] / З пол. // Знамя юности. 22 янв.; Яго ж. Белыя вароны: [Гумарэска] / З пол. // Чырв. змена. 26 лют.; Асэнка Я. Прыклад для пераймання: [Гумарэска] / З пол. // Там жа. 15 сак.; Фрэдман С. Прыходзіць дзівак да дзівака: [Гумарэска] / З пол. // Там жа. 9 крас.; Дарэцкі Ф. Пачатак і канец матарызацыі: [Гумарэска] / З пол. // Там жа. 10 чэрв.; Чубашак М. Адзін, як палец: [Гумар. апавяд.] / З пол. // Там жа. 20 жн.; Яго ж. Быццам і нічога асаблівага: [Гумарэска] / З пол. / Там жа. 10 вер. Маеўскі Р. Спрытнюга: [Гумарэска] / З пол. // Там жа. 4 ліст.; Яго ж. У поўдзень: [Гумарэска] / З пол. // Там жа. 12 ліст.; Асэнка Я. Выпадковасць: [Гумарэска] / З пол. // Там жа. 26 ліст.; / Пад сваім прозв.

1979. Маеўскі Р. Дзверы; Сапсаваны шлагбаум; Белыя вароны; Спрытнюга; Апоўдні: [Гумарэскі] / З пол. // Вясёлы калейдаскоп. Мн.; Липский В. Крутые вёрсты: [Аповесць] / З бел. // Знамя юности. 14—16 жн; Патэмкоўскі А. Памяць: [Гумарэска] / З пол. // ЛіМ. 6 крас.; Асэнка Я. Візіт: [Гумарэска] / З пол. // Там жа. 27 ліп.; Чубашак М. Як стаць шчаслівым: [Гумарэска] / З пол. // Чырв. змена. 7 студз.; Яго ж. І тое, што ёсць, і тое, чаго няма: [Гумарыст. апавяданне] / З пол. // Там жа. 28 студз.; Яго ж. Гэта перабольшанне, дарагі!: [Гумарэска] / З пол. / Там жа. 14 крас.; Вітлін Е. Бася расказвае казкі: [Гумарэска] / З пол. // Там жа. 5 мая; Асэнка Я. За сцяной: [Гумарэска] / З пол. // Там жа. 7 ліп.; Яго ж. Дыялог: [Гумарэска] / З пол. // Там жа. 14 ліп.; Яго ж. Недагляд: [Гумарэска] / З пол. // Там жа. 25 жн.; Яго ж. Акцыя «Зіма»: [Гумарэска] /З пол. // Там жа. 9 вер.; Патэмкоўскі А. На карысць грамадства: [Гумарэска] / З пол. // Там жа. 8 снеж. / Усё пад сваім прозв.

1980. Липский В. Мужество: [Аповесць] / З бел. // Молодая гвардия. № 5; Яго ж. Крутые вёрсты: [Аповесць] / З бел. // Комсомолец Кузбасса. № 69—72 / Дарэцкі Ф. Рэкардыстка: [Гумарэска] / З пол. // Чырв. змена. 6 студз.; Чапіга У. Кран: [Гумарэска] / З укр. // Там жа. 10 жн.; Мірашнічэнка А. Поўнае зацьменне месяца: [Апавяданні] // Там жа. 16 снеж. / Усё пад сваім прозв.

1981. Жыгілій У. Біклага: Апавяданне / З укр. // Бярозка. № 5; Раманіка М. Карабель «мама»: Апавяданне / З укр. // Вясёлка. № 3; Липский В. Крутые вёрсты: Аповесць / З бел. // Молодой коммунар. № 10—22 / Пад сваім прозв.

1982. Разумневіч У. Сустрэліся марак з лётчыкам: Апавяданне / З рус. // Вясёлка. № 2.

1984. Крывашапкін А. Апока: Апавяданне / З якуцк. // Вясёлка. № 4.; Капустин А. Минута молчания: Апавяданне / З бел. // Знамя юности. 10 лют. / Пад сваім прозв.

1985. Давыдаў А. Скарб: Апавяданне / З укр. // Бярозка. № 7; Сипаков Я. Кто-то смотрит в гнездо жаворонка; Росное утро: Апавяданні / С бел. // Нёман. № 4; Капустин А. Минута молчания: Апавяданне / С бел. // Советская молодежь. 28 сак.

М. П. Барташэвіч.

ВАСЮЧЭНКА ПЯТРО

Васючэнка Пятро Васілевіч (н. 15.2.1959, г. Полацк), празаік, крытык, літаратуразнавец. Кандыдат філалагічных навук (1985).

З сям'і інтэлігентаў. Бацька, Васіль Пятровіч, выкладчык у Полацкім лясным тэхнікуме, маці, Галіна Аляксееўна, бібліятэкар. Пасля заканчэння Полацкай СШ № 9 (1976) паступіў на факультэт журналістыкі БДУ, які скончыў у 1981. Вучыўся ў аспірантуры Інстытута літаратуры імя Я. Купалы АН БССР (1981—84). Абараніў кандыдацкую дысертацыю на тэму «Вайна і дзяцінства. Мастацкае асваенне праблемы ў беларускай прозе 60—70-х гадоў». З 1984 — малодшы, з 1991 — старшы навуковы супрацоўнік Інстытута літаратуры імя Я. Купалы АН Беларусі.

Друкавацца П. Васючэнка пачаў у 1979 на старонках газеты «Літаратура і мастацтва». Піша літаратурна-крытычныя артыкулы («Гэтае шматаблічнае «Рэтра», «Смех — гэта сур'ёзна», «Загадкавыя «Тутэйшыя», «Паміж кніжным і зямным», «Парадоксы ў «тутэйшым» стылі» і інш.). Некаторыя з іх змешчаны ў зборніках «Вобраз — 88», «Вобраз — 90». У 1991 выйшла яго манаграфія «Драматургія і час», у 1994 — даследаванне «Драматургічная спадчына Янкі Купалы». У літаратурна-крытычных артыкулах і манаграфіі П. Васючэнка звяртаецца да спадчыны класікаў беларускай літаратуры (Я. Купала, М. Гарэцкі, А. Мрый, В. Ластоўскі і інш.), творчасці сучасных празаікаў і драматургаў (В. Быкаў, А. Петрашкевіч, М. Дудараў, М. Матукоўскі, В. Казько, І. Пташнікаў, Л. Дранько-Майсюк, А. Глобус). Піша апавяданні і казкі («Печка-чарадзейка», «Палёт да млечнага шляху», «Жаба ў кампоце», «Прыгоды паноў Кубіцкага і Заблоцкага»). Празаічныя творы П. Васючэнкі друкаваліся ў часопісах «Вясёлка», «Бярозка», «Крыніца», штотыднёвіку «Літаратура і мастацтва», у калектыўных зборніках «Цвіце верас» (1987), «Тутэйшыя» (1989). У 1993 выйшаў зборнік яго прозы «Белы мурашнік». У яго прозе фантастычнае, загадкавае спалучаецца з прыземленай будзённасцю. Праз страхі і дзівосныя праявы праглядвае наш час — з арытміяй чалавечых настрояў, з пераломамі жыццёвых лёсаў. Смех мяжуе з тугою, шчырым чалавечым болем. Апавядальнай манеры П. Васючэнкі ўласцівы мяккі, часам парадаксальны гумар.

Жыве ў Мінску.

Л. С. Савік.

Бібліяграфія

1.2.

Война и детство: Художественное освоение проблемы в белорусской прозе 60—70-х годов: Автореф. дисс. ... канд. филол. н. Мн., 1985.

Драматургія і час. Мн., 1991.

Белы мурашнік: Аповеды, прыпавесці. Мн., 1993.

Драматургічная спадчына Янкі Купалы: Вопыт сучаснага прачытання. Мн., 1994.

1.3.

1979. Свет сустрэч і адкрыццяў: [Рэц. на кн.: Б я г а н с к а я Я. Нечаканая сустрэча. Мн., 1978] // ЛіМ. 25 мая.

1980. Вярнуўся...: Апавяданне // Бярозка. № 2; Счастливого плавания, «Ручнікі» // Неман. № 10.

1981. У адказе перад зямлёй і людзьмі: [Рэц. на кн.: Б л а к і т В. Шануй імя сваё // Маладосць. 1981. № 1] // ЛіМ. 6 сак.

1982. Па абкатаным шляху: [Рэц. на кн.: К а н а н о в і ч І. Белы чыгун. Мн., 1981] // ЛіМ. 5 лют.; Гэтае шматаблічнае «Рэтра»...»: Нататкі пра новыя кнігі А. Дзятлава, І. Капыловіча і М. Капыловіча // Там жа. 21 мая; Насустрач свайму караблю: [Рэц. на кн.: Ф і л і м о н а в а Л. Пад шолах ветразяў. Мн., 1981] // Там жа. 25 чэрв.

1983. Флірт без адрыву ад вытворчасці: [Рэц. на кн.: Н а в у м о в і ч У. Такое бывае аднойчы. Мн., 1982] // ЛіМ. 24 чэрв.; Парог вучнёўства: [Рэц. на кн.: Ц я ж к і А. Пара блакітных дажджоў. Мн., 1982] // Там жа. 7 ліст.; Сталей, крытычнае пяро! // Чырв. змена. 20 крас.

1985. Вачамі дзяцінства // Беларуская літаратура. Вып. 13. Мн., 1985; Вайна і дзяцінства ў творчасці В. Казько // Весці АН БССР. Сер. грамад. н. № 1; Детство помнит // Неман. № 6; Грані чалавечнасці: [Рэц. на кн.: Б у г а ё ў Дз. Чалавечнасць. Мн., 1984] // Звязда. 26 вер.; На перакаце: [Рэц. на кн.: І п а т а в а В. Перакат. Мн., 1984] // ЛіМ. 29 сак.; Смех — гэта сур'ёзна // Там жа. 12 ліп.; Зменлівыя берагі часу // Там жа. 15 ліст.; Вярнуўся: [Апавяданне] // Ніва. 7 ліст.

М. П. Барташэвіч.

ВЕРАБ'ЁЎ ПАВЕЛ

Вераб'ёў Павел Віктаравіч (н. 7.11.1958, в. Рабавічы Слаўгарадскага р-на Магілёўскай вобл.), паэт. Член СП Беларусі з 1991.

Нарадзіўся ў сям'і рабочага. Пасля заканчэння школы з 1976 да 1985 працаваў у слаўгарадскай раённай газеце карэспандэнтам, загадчыкам аддзела, намеснікам рэдактара. Адначасова ў 1977—83 завочна вучыўся на факультэце журналістыкі БДУ. У 1985—87 слухач Мінскай вышэйшай партыйнай школы. У 1987 рэдактар аддзела часопіса «Народная гаспадарка Беларусі», у 1987—89 загадчык сектара друку ЦК ЛКСМБ, у 1989—91 адказны сакратар газеты «Чырвоная змена», намеснік рэдактара газеты «Знамя юности», вядучы рэдактар выдавецтва «Юнацтва». У 1991—92 галоўны рэдактар газеты «Знамя юности», у 1992—94 намеснік галоўнага рэдактара газеты «Добры вечар», з канца 1994 аглядальнік газеты «Мінская праўда».

Літаратурную працу пачаў у 1976. Першыя вершы надрукаваў у слаўгарадскай раённай газеце. Публікаваўся ў магілёўскай абласной газеце, газетах «Чырвоная змена», «Сельская газета», штотыднёвіку «Літаратура і мастацтва», часопісе «Маладосць». У 1990 у выдавецтве «Мастацкая літаратура» выйшаў зборнік яго вершаў «Крытычная маса». П. Вераб'ёў — паэт з арыгінальнай манерай пісьма, сваім бачаннем свету, прыроджанай далікатнасцю. Піша пра родны край, яго людзей. Любоў да маці, роднай зямлі, вернасць запаветам продкаў — асноўныя матывы твораў. Лаўрэат прэміі імя М. Багдановіча выдавецтва «Мастацкая літаратура» (1992).

Жыве ў Мінску.

В. У. Смольская.

Бібліяграфія

1.2.

Крытычная маса: Вершы. Мн., 1990 (Першая кніга паэта).

1.3.

1977. Праводзіны; «Ціха ў ночы вербіны шапочуць...»; «Сасонкі зарою апалены»; «Звінелі жаваранкам росы...»: [Вершы] // Маг. праўда. 20 мая.

1978. Люблю цябе, зямля... [Вершы] // Маг. праўда. 12 вер.

1980. «Забыты богам, выкляты людзьмі...»; «Без стомы я дзіўлюся на людзей...»; «Пройдзе час і мы паспакайнеем...»: [Вершы] // Маладосць. № 2; З лірычнага сшытка: [Вершы] // Маг. праўда. 22 сак.; Пісьмо-загадка; Хлопчык і конюх; «З наіўнасцю дзіцячаю прасіла...»: [Вершы] // Там жа. 26 вер.

1982. Пра паэзію і дзіцячыя веласіпеды: [Рэц. на кн.: Б а т о р ы н Ф. Раніца. Мн., 1981] // ЛіМ. 12 лют.

1983. Вясёлка белага святла: [Рэц. на кн.: Я ф і м а ў Ф. Светлыя зімовыя ночы. Мн., 1982] // ЛіМ. 11 лют.; Чаму зазванілі званы? // Там жа. 15 ліп.; Шчырае пастаянства // Маг. праўда. 9 вер.

1984. Мы — з зямлі: [Рэц. на кн.: Р а к а ў В. І склон, і птах, і я... Мн., 1983] // ЛіМ. 23 сак.; «Чароўны сад блакітам агароджаны...»: [Верш] // Маг. праўда. 26 кастр.

1.6.

Ветразь...: Пісьменнікі народаў свету — дзецям: Вершы, апавяданні, казкі... Мн., 1985.— ... 1992 / Скл.

М. П. Барташэвіч.

ВЯРШЫНІН МІКОЛА

Вяршынін Мікалай Пятровіч (н. 20.05.1940, г. Чэрвень Мінскай вобл.), паэт-сатырык, гумарыст. Член СП Беларусі з 1993.

Бацькі М. Вяршыніна загінулі ў пачатку вайны пад бомбамі. Выхоўваўся спачатку ў цёткі, пасля ў дзіцячым доме. У 1954 паступіў у Мінскі аўтамеханічны тэхнікум (кавальска-штамповачная вытворчасць), які закончыў у 1958. З 1959 па 1962 служыў у пагранвойсках. Закончыў гістарычны факультэт БДУ (1970), а таксама аддзяленне сацыялогіі універсітэта марксізму-ленінізму (1972). Адначасова ў 1964—1965 працаваў інжынерам на электратэхнічным заводзе, у 1958—1967 — на падшыпнікавым заводзе, у 1967—1978 — старшым інжынерам на Мінскім трактарным заводзе. З 1978 працуе вядучым інжынерам навукова-вытворчага аб'яднання «Прагрэс».

Літаратурную дзейнасць пачаў у 1960 падчас вайсковай службы ў Эстоніі, на рускай мове. З 1964 піша па-беларуску. Выдаў зборнікі сатырычнай паэзіі «Без віны вінаватыя», «Не сышліся характарамі», «Дагуляўся», «Нашто мне жаніцца», «У чужым воку», «Свой чалавек», «Сваё месца». Піша таксама сатырычную прозу. Яго творы ўвайшлі ў 22 калектыўныя кніжкі сатырычнай паэзіі і прозы.

Сатырычныя вершы М. Вяршыніна трапныя і вострыя. Ён выкрывае падхалімаў, кар'ерыстаў, прыстасаванцаў, хапугаў, гультаёў, злодзеяў і інш. Паэт добра ведае народныя характары. Вострая і дасціпная сатыра М. Вяршыніна накіравана супраць заган, якія перашкаджаюць нармальнаму жыццю людзей. А як гумарыст ён весела ўсміхаецца, калі сустракаюцца смешныя сітуацыі.

М. Вяршынін шмат гадоў кіраваў літаб'яднаннямі пры Мінскім трактарным заводзе, пры рэдакцыях газет «Мінская праўда» і «Чырвоная змена». З'яўляецца літаратурным кансультантам некаторых газет.

Жыве ў Мінску.

В. У. Смольская.

Бібліяграфія

1.2.

Без віны вінаватыя. Мн., 1972. (Першая кніга паэта).

Не сышліся характарамі: Сатыра і гумар. Мн., 1977. Рэц.: Саенка В. // ЛіМ. 1977. 15 ліп.

Дагуляўся: Сатыр. вершы, байкі, мініяцюры. Мн., 1981. (Б-ка «Вожыка»).

Нашто мне жаніцца: Сатыра і гумар. Мн., 1982.

Свой чалавек: Байкі, фельетоны, гумарэскі, мініяцюры, каламбуры, эпіграмы. Мн., 1993.

1.3.

1960. Отчизна; Слава Армии Советской: [Вершы] // Пограничник. 10 мая; Герой; Солдатские письма: [Вершы] // Там жа. 27 нояб.

1962. Об этикетках и столбах; Дача на воде: [Вершы] // Советская Эстония. 19 сент.

1965. Я цэлы свет паклічу...: [Верш] // Узлёт. Мн.; Не вінаваты...: [Верш] // Вожык. № 9; Пераблытала: [Верш] // Там жа. № 15; «Дырэктар»: [Верш] // Мін. праўда. 16 чэрв.; «Аўтаматычная» хлусня: [Верш] // Там жа. 30 кастр.; Пра асабісты прыклад: [Верш] // Ніва. 12 снеж.; Кошт дружбы: (Байка) // Чырв. змена. 28 ліп.; Сабака і Казёл: Байка // Там жа. 17 кастр.

1966. «Правінаваціліся»: Байка // Вожык. № 1; Слон і дыплом: Байка // Там жа. № 14; Без віны вінаватыя: [Байка] // Голас Радзімы. № 50; ...Каб ён забыў: [Верш] // Звязда. 13 кастр.; «Дабрачынны»; Любі і саначкі вазіць: [Вершы] // Мін. праўда. 11 лют.; Пра ветлівасць: [Верш] // Там жа. 29 крас.; Калі б віхура загрымела...: [Верш] // Там жа. 28 кастр.; Таварыш Дужкін засмучон // Ніва. № 13; Кандуктар, трамвай і білеты: [Верш] // Чырв. змена. 5 крас.; Споведзь хлуса: Гумарэска // Там жа. 18 снеж.

1967. Не вераць людзям іншыя...; Пра ветлівасць: [Вершы] // Натхненне. Мн.; Пра ветлівасць: [Верш] // Вожык. № 1; Мараль злодзея; Замуж захацела: [Вершы] // ЛіМ. 8 снеж.; Адміністратар: [Верш] // Мін. праўда. 30 чэрв.; Кемлівасць: Байка // Там жа. 9 жн.; Пра дрэвы і кусты: [Верш] // Там жа. 30 вер.; Сабака і казёл: Байка // Там жа. 15 ліст.; Зайцава натура: Байка // Там жа. 1 снеж.; Закаханы шахматыст: [Верш] // Там жа. 3 снеж.; Пра новае і пра кіно: [Верш] // Чырв. змена. 22 студз.; Хто камендант?: Гумарэска // Там жа. 22 сак.;

Вераб'іны «ўклад»: [Байка] // Там жа. 10 снеж.

1968. Закаханы шахматыст: [Верш] // Вожык. № 4; Вінаватых няма: [Верш] // Вясёлка. № 5; «Ну, як дзяўчат мне зразумець...»: [Верш] // Вяч. Мінск. 24 лют.; Аб модзе: [Верш] // Мін. праўда. 17 сак.; «Чуллівы»: Сатыр. мініяцюра // Там жа. 30 сак.; Як след трымайся, халасцяк!: Гумарэска // Там жа. 7 ліп.; Пра суп бульбяны: [Верш] // Там жа. 2 кастр.; Перасалілі: Гумарэска // Там жа. 5 снеж.

1969. Аб модзе: [Верш] // Беларусь. № 3; Кемлівасць: Байка // Там жа. № 4; Салдацкая маці // Мін. праўда. 30 мая; Сатырычныя мініяцюры; Вялікая страта; Калі ў вачах дваіцца; Жарт // Там жа. 6 ліп.; Слон і дыплом: Байка // Там жа. 26 кастр.

1970. Муха на пагрузцы: Байка // Беларусь. № 12; Атэіст; Прынцып перастрахоўшчыка; Ну і дыягназ!; Сучешыў: Гумарэскі // ЛіМ. 5 чэрв.; Ветлівасць па-студэнцку; Хто важней?; Вялікая страта: Жарты // Там жа. 2 кастр.; Дачка ці сын?: [Верш] // Там жа. 27 ліст.; І так бывае: Байка // Мін. праўда. 6 кастр.; Сам сябе перахітрыў: [Верш] // Там жа. 15 ліст.; Тулягін на рабоце: (Байка) // Там жа. 20 снеж.; Зайцава натура: Байка // Піянер Бел. 24 снеж.

1971. Фінал: [Верш] // Беларусь. № 8; Пра асабісты прыклад: Фельетон // Там жа. № 11; Мініяцюры: Прызнанне; Застрахаваўся // Вожык. № 15; Суцешыў; Жарт: [Вершы] // ЛіМ. 15 студз.; Лісты маладым аўтарам ад некаторых літкансультантаў: Пародыі // Там жа. 12 лют.; Скараціўся: [Верш] // Там жа. 12 сак.; У «пачынаючых» і ў «класіках»: [Верш] // Там жа. 14 мая; 2=4: Пародыя // Там жа. 18 чэрв.; Размова з-за куста: Байка // Там жа. 9 ліп.; Звыш — падхалімаж: [Верш] // Там жа. 8 кастр.; Творчая няўдача; Хто важней?; Гультай; Ветлівасць: Мініяцюры // Там жа. 29 кастр.; Цытатчык: [Верш] // Там жа. 26 ліст.: Дача... на вадзе: [Верш] // Мін. праўда. 26 студз.; Што сніцца ў лесе ў Новы год: [Верш] // Піянер Бел. 7 студз.; Як важна ведаць меру: [Верш] // Чырв. змена. 20 ліп.

1972. На карысць; Не лішне і напомніць: [Верш] // Беларусь. № 7; Мыш пад венікам: Байка // Вожык. № 15; Мімаходзь: [Верш] // ЛіМ. 25 лют.; Прычына: [Верш] // Там жа. 26 мая; Паэт дзеліцца вопытам // Там жа. 11 жн.; Пра згоду і разводы; Хай сорамна будзе дзецям; Скарга злодзея; Мара выпівохі: [Вершы] // Мін. праўда. 26 студз.; Сатырычныя мініяцюры: «Спецыяліст»; «Чэмпіён»; Рашучы характар; Перастрахоўшчык // Там жа. 6 мая.

1973. Творчыя парады: [Верш] // Беларусь. № 5; Разумее Ната ўсё: [Верш] // Там жа. № 7; Два адказы: [Верш] // Там жа. № 9; Прынцыповы вартавы: [Верш] // Вожык. № 23; Прынцып творчасці; Канец цярпенню ёсць і ў жонкі: [Вершы] // ЛіМ. 5 студз.; Няправільны разлік; «Устойлівы»; Пустазвон; «Музыкант»: [Вершы] // Там жа. 19 студз.; Настаўнік, выхавай вучня!.. // Там жа. 16 сак.; Сатырычныя мініяцюры // Там жа. 29 чэрв.; Мыйце самі!; Выбрыкі моды: [Вершы] // Там жа. 20 ліп.; Сатырычныя мініяцюры // Там жа. 10 жн.; Як выйграць у спортлато?: Гумарэска // Там жа. 14 вер.; Каламбуры // Там жа. 28 вер.; Як дарыць падарункі: Гумарэска // Там жа. 21 снеж.; Аб дробязях і аб вялікім: [Верш] // Мін. праўда. 31 студз.; Мініяцюры: Перастараўся; Навука на службе ў дзяўчат; Маскіроўка гультая // Там жа. 18 ліп.; Аб наклейках і слупах: [Верш] // Там жа. 4 ліст.

1974. Размова з-за спіны: [Байка] // Дзень паэзіі. Мн.; Свой чалавек: [Верш] // Беларусь. № 9; Пра аматараў хмелю: [Вершы] // Там жа. № 12; Ліса і певень: [Байка] // Вяч. Мінск. 10 крас.; Службовая машына; Мода падвяла: Сатыр. мініяцюры // Там жа. 10 ліп.; Як стаць вядомым: Гумарэска // ЛіМ. 8 лют.; Закаханы сатырык: [Верш] // Там жа. 8 сак.; Вось дык падабенства: [Верш] // Там жа. 27 снеж.; «Вынаходнік»; Баявая жонка; Сімулянт; Не сышліся; Адзіны клопат: (Сатыр. мініяцюры) // Мін праўда. 3 ліст.; «Вынаходнік»; Кошт пакупкі; Лёс камандзіровачнага; Рабы звычкі: (Сатыр. мініяцюры) // Там жа. 30 ліст.; Скарга вучня; Сцэнка ў трамваі; Вырас...: (Сатыр. мініяцюры) // Піянер Бел. 23 мая; Участковы на вяселлі: [Верш] // Чырв. змена. 22 вер.

1975. Паспешлівы разлік; «Прабіўны» аўтар; Замкнёнае кола: Эпіграмы // Дзень паэзіі — 75. Мн.; «Чэмпіён»; Попельніца і сяброўка; Важная прыкмета; Расцягалі: [Мініяцюры] // Вяч. Мінск. 16 ліп.; Пародыі ў навуцы; Скарга лектара-вадалея; Прынцып творчасці: [Вершы] // ЛіМ. 4 крас.; Не старэюць душой ветэраны...; // Там жа. 18 крас.; Ад здачы да выдання: [Верш] // Там жа. 1 жн.; Як пішуцца рэцэнзіі: Гумарэска // Там жа. 17 кастр.; Сатырычныя мініяцюры: Звышзанятасць; Адзінае пажаданне; Гумарыст навыварат; Жонка вінавата // Мін. праўда. 9 лют.; Незвычайны юбілей: Байка // Там жа. 7 вер.

1976. Сон паэта; Прынцып творчасці; Скараціў... сам сябе: Эпіграмы // Дзень паэзіі — 76. Мн.; Адваротнае разуменне: Сатыр. эскіз // Беларусь. № 1; Штрыхі да партрэтаў: [Верш] // ЛіМ. 20 жн.; У нас на трактарным // Там жа. 31 снеж.; Рацыяналізацыя: [Верш] // Мін. праўда. 19 чэрв.; Аўтарытэт: Гумарэска // Там жа. 5 снеж.

1977. Пад воблакамі і на зямлі: [Рэц. на кн.: Я ў с е е ў Р. Верабей пад воблакам. Мн., 1976] // Беларусь. № 5; Праца і паэзія // Полымя. № 9; Тайны сервісу: Гумарэска // Служба быту Бел. № 3; Незвычайны юбілей: [Байка] // Вяч. Мінск. 12 лют.; Як я спраўляў навасель-ле: Апавяданне // Там жа. 7 вер.; Рацыяналізацыя: [Верш] // Звязда. 30 ліп.; Аўтару шматтомніка пра Дванаццацігаловага змея: [Верш] // ЛіМ. 3 чэрв.; Свой шлях у навуку: [Верш] // Там жа. 16 вер.; Асёл і навука: Байка; Прыгоды дачніка: Гумарэска // Мін. праўда. 16 сак.; Эскалацыя грубасці: Гумарыст. апавяданне // Там жа. 2 кастр.; Перагрузілі: Гумарэска // Чырв. змена. 27 лют.; Прыстасаваўся; Дакрытыкаваўся: [Байкі] // Там жа. 24 крас.; Добрая традыцыя // Там жа. 28 ліп.; Жыццё халасцяка: Гумарэска // Там жа. 11 вер.; Дасціпна, з гумарам: [Рэц. на кн.: Я ў с е е ў Р. Вялікая лыжка: Гумарэскі, фельетоны. Мн., 1977] // Там жа. 29 вер.; Сатырычныя мініяцюры: Пародыя на сучасныя байкі; Як кажуць; Жонка па разліку; Парада афіцыянткі; Вінаваты... вецер; Па сакрэту; Абы не змарыцца; Жыццёвы прынцып // Там жа. 13 снеж.

1978. «Прынцыповы» вартаўнік: [Верш] // Дзень паэзіі. Мн.; Першакрасавіцкія жарты: Гумарэска // Беларусь. № 4; Адміністратар: [Верш] // Вожык. № 4; Добры трактар і благая жонка; Жонка па разліку: [Мініяцюры] // Маладосць. № 1; Скнара: [Мініяцюра] // Политинформатор и агитатор. № 9; Перастрахоўшчык: [Мініяцюра] // Там жа. № 12; Добры трактар і благая жонка; Жанчыны ёсць жанчыны; Навошта лішні клопат: [Вершы] // Работніца і сялянка. № 5; Мыйце самі!; «Спецыяліст»: [Мініяцюры] // Служба быту Беларусі. № 2; Сатырычныя мініяцюры // Вяч. Мінск. 1 жн.; Як вершы пішуцца; Для сябе і па сабе: [Мініяцюры] // Там жа. 24 ліст.; Смехам — па агрэхах: [Рэц. на кн.: С у ш к о П. Восці напагатоў: фельетоны, вершы, байкі, мініяцюры. Мн., 1978] // Звязда. 1 кастр.; Вясельныя праблемы: [Верш] // ЛіМ. 31 сак.; «Творчыя» парады: [Верш] // Там жа. 5 мая; Шлях да сэрца; «Маскіроўка» гультая; Як зручней: Сатырыч. мініяцюры // Там жа. 14 ліп.; Скупы на паляванні: [Верш] // Там жа. 25 жн.; Як я аднойчы быў жанатым: [Верш] // Там жа. 17 ліст.; Бык ва ўладзе: Байка // Мін. праўда. 5 лют.; Лічба «трынаццаць» — шчаслівая: Гумарэска // Там жа. 9 крас.; Як сват быў вінават: Гумарэска // Там жа. 3 вер.; Калючы серпанцін: [Рэц. на кн.: С а к о в і ч П. Калючы серпанцін. Мн., 1978] // Там жа. 16 вер.; Мой горад — завод: [Вершы] // Там жа. 1 кастр. / Сааўт. І. Маркевіч; Участковы на вяселлі: [Верш] // Ніва. 1 кастр.; Адміністратар: [Верш] // Там жа. 8 кастр.; Як я аднойчы быў жанатым: [Верш] // Там жа. 24—31 снеж.; Сатырычныя мініяцюры: Хто важней; Абы не змарыцца; «Спецыяліст»; «Ветлівы» пасажыр; Прыемная сустрэча; Парада афіцыянткі; Мода падвяла // Чырв. змена. 28 лют.; Бык ва ўладзе: Байка // Там жа. 9 ліп.; Літаратурная энцыклапедыя: [Пародыі] // Там жа. 6 жн.; Як хадзіў я па грыбы: [Верш] // Там жа. 4 кастр.; Парада скупому; Заспакоіўся; Душ — не лазня: [Каламбуры] // Там жа. 5 ліст.; Салавей і груганы: Байка // Там жа. 26 ліст.

1979. Вясельныя праблемы: [Верш] // Беларускі каляндар 1979. Беласток; Пра ветлівасць: [Верш] // Вожык. № 2; Сімулянт; Пустослов: [Миниатюры] // Политинформатор и агитатор. № 4: Каханне і кошка: [Верш] // Работніца і сялянка. № 6; Галасы з-за акіяна: [Верш] // Звязда. 10 студз.; Сатырычныя мініяцюры:

Ветлівы; Дабрачынны; Уладнік; Прынцып хулігана; Хапуга // Там жа. 24 лют.; Пра суседак: [Верш] // Там жа. 4 ліст.; Парада: [Верш] // ЛіМ. 8 чэрв.; Конкурс: [Байка] // Там жа. 31 жн.; Ніва. 7 кастр.; Пасябравала муза з завадчанамі // ЛіМ. 30 ліст.; Цішком: Гумарэска // Там жа. 14 снеж.; Суботнік бюракрата; Надзейнае сховішча; У халодным клубе; Не той рост; Аблічча баязліўца: Сатыр. мініяцюры // Мін. праўда. 6 студз.; Як экзамен я здаваў: [Верш] // Настаўн. газ. 5 мая; «Шчасце маё - дзеці»: Нарыс // Там жа. 22 вер.; Скарга пацыента: Гумарэска // Чырв. змена. 31 студз.; Як я стаў рабкорам: Гумарэска // Там жа. 5 мая; Бракароб: [Верш] // Там жа. 9 вер.

1980. Пра верлібры; Дваякі падыход: [Вершы] // Дзень паэзіі — 80. Мн.; Як я аднойчы быў жанатым: [Верш] // Вожык. № 11; Хворая: [Верш] // Вясёлка. № 10; «Вынаходнік»; Замуж захацела; Прычыны суму: «Атэіст»: [Вершы-мініяцюры] // Политинформатор и агитатор. № 19; «Суцяшэнне»: [Верш] // Работніца і сялянка. № 1; Як пашылі мне пінжак: [Верш] // Служба быту Бел. № 6; Пошук прыносіць поспех // Вяч. Мінск. 24 ліп.; Сорак год: [Верш] // ЛіМ. 23 мая; Кошт сяброўства: [Верш] // Мін. праўда. 23 студз.; Салавей і Груганы: Байка // Там жа. 26 студз.; Як хадзіў я па грыбы: Гумарэска // Там жа. 26 ліп.; Устойлівы; Мараль злодзея; Не дарма; Адстала: [Мініяцюры] // Там жа. 13 кастр.; Эпіграмы: Два адказы; Для сябе і сабе // Там жа. 2 ліст.; Натхненне: [Верш] // Настаўн. газ. 19 ліп.; Беларусь мая: [Верш] // Там жа. 30 ліп.; Па законах дабраты: // Там жа. 6 верас.; Прыстасаваўся: [Верш] // Ніва. 29 чэрв.; Сорак год: [Верш] // Там жа. 10 жн.; Роздум гультая; Пустазвон; Зразумелі; Моцны ўласнік: Мініяцюры // Сел. газ. 13 сент.; Прыстасаванец: [Верш] // Чырв. змена. 3 лют.; Пра ганарыстага Хвядоса: [Верш] // Там жа. 17 лют.; Пра дрэвы і слупы: [Верш] // Там жа. 14 мая; Сатырычныя мініяцюры: Жаніх — «рыбак»; Як старому ажаніцца; Разява; Майстар перакладу; Дваякі падыход // Там жа. 25 мая.

1981. Не той рост: [Верш] // Дзень паэзіі — 81. Мн.; Шлях да сэрца; «Гаротны» лёс: [Мініяцюры] // Беларусь. № 4; Бракароб; Сіла звычкі: [Мініяцюры] // Вожык. № 8; «Прызнанне» крытыкі; Няўдача падхаліма; Мараль растратчыка; «Аматар» футбола; Выбрыкі моды: [Мініяцюры] // Там жа. № 21; Хворая: [Мініяцюра] // Вясёлка. № 10; Канец цытатчыка: [Мініяцюра] // Политинформатор и агитатор. № 16; Слабахарактарны; Абы не замарыцца: [Мініяцюры] // Там жа. № 22; Суцяшэнне: [Мініяцюра] // Работніца і сялянка. № 1; Вясёлая афіцыянтка; Мода падвяла: [Мініяцюры] // Там жа. № 4; Адэкалон і пыл: [Верш] // Служба быту Бел. № 2; Як пашылі мне пінжак: [Фельетон] // Там жа. № 6; «Цябе падводзіць памяць...»; «Бываюць яшчэ хуліганы...»; «Як браў — маўчаў...»; «Час ажаніцца нам, гляджу я...»: [Мініяцюры] // Звязда. 20 сак.; Спажывец; Ветлівы: [Мініяцюры] // Там жа. 29 ліп.; Не той рост; Звышпадхалімаж: [Мініяцюры] // ЛіМ. 21 жн.; Кошт сяброўства: [Верш] // Мін. праўда. 23 студз.; «Прызнанне» крытыкі; Жарт халасцяка; Рэклама; Працаўнік: Рашучы характар: [Мініяцюры] // Там жа. 24 сак.; Што бывае ў сорак год: [Верш] // Там жа. 14 крас.; Мара: [Мініяцюра] // Там жа. 20 чэрв.; Устойлівы; Мараль злодзея; Не дармаед; Адстала: [Мініяцюры] // Там жа. 13 кастр.; У аўтобусе; Парада таўстунам; Жыццёвы прынцып; Як зручней: [Мініяцюры] // Там жа. 20 снеж.

1982. Хітрун: [Мініяцюра] // Бярозка. № 1; Мы — мужчыны: [Верш] // Вожык. № 11; Мядзведзю; Вавёрцы; Зайцу: [Мініяцюры] // Вясёлка. № 8; Прычына звальнення; Заспакоіўся: [Каламбуры] // Политинформатор и агитатор. № 12; Свой чалавек: [Верш] // Звязда. 9 лют.; Кажуць, зручнасці ў машыне: Гумарэска // Мін. праўда. 3 сак.; Светафоры: [Верш] // Там жа. 24 жн.; Мараль растратчыка; Выбрыкі моды: [Мінівершы] // Ніва. 11 ліп.; Як я аднойчы быў жанатым: [Верш] // Там жа. 22 жн.; З'явы бытавыя: [Верш] // Там жа. 19 вер.; Чырв. змена. 24 ліп.; Тэлефон: [Верш] // Там жа. 24 кастр.; Мініяцюры: Звычка злодзея; Нерваваўся // Чырв. змена, . 23 студз.; Не сышлі-ся; Хто важней?: [Мініяцюры] // Там жа. 15 жн.; Вось дык уліп!: [Верш] // Там жа. 23 кастр.

1983. Тайны сервісу; Як выйграць у «Спортлато»; Шавец без ботаў; Дзень цудоўных падманаў; Як стаць вядомым; Як я стаў парашутыстам: [Апавяданні] // Крышталь ная душа. Мн.; «Раўнапраўе»; Палучка вінавата; «Нацярпеўшы»: [Мініяцюры] // Беларусь. № 8; Гультайскі лёс: [Верш] // Вожык. № 16; «Зарабіў»: [Верш] // Звязда. 25 сак.; Пра прэміі: [Верш] // Там жа. 15 крас.; Па заслугах: [Верш] // Звязда. 4 жн.; Мініяцюры // ЛіМ. 30 вер.; Веснавы дождж: [Верш] // Мін. праўда. 8 ліп.; Да пары жбан ваду носіць: [Байка] // Там жа. 29 вер.; Дакрытыкаваўся: [Верш] // Ніва. 1 мая; Салавей і Груганы: [Верш] // Там жа. 28 жн.; Дзявочыя вочы: [Верш] // Чырв. змена. 22 студз.; Святы Міхася Наліўкіна: Гумарэска // Там жа. 4 чэрв.

1984. Сатырычныя мініяцюры: Перастрахоўшчык; Гультай на сенакосе; Такі не прападзе; Жыццёвы прынцып; Вечны клопат; Зручнае выйсце; Нарваўся // Беларусь. № 12; Каму што сніцца ў лесе: [Вершы] // Вожык. № 8; Мядзведзь у камандыроўцы: Байка // Звязда. 6 студз.; На сваю галаву: [Верш] // Там жа. 23 ліст.; Галасы з-за акіяна: [Верш] // Мін. праўда. 7 сак.; «Кнігалюбы»: [Верш] // Там жа. 25 мая; Узнагароджан Зоркай Залатою: [Верш] // Там жа. 13 чэрв.

1985. Хмельны букет: [Гумарэска] // Вожык. № 12; Устойлівы: [Мініяцюра] // Там жа. № 16; Аматар футбола; Прычына; Адзінае сховішча: [Мініяцюры] // Там жа. № 21; Як сват быў вінаваты; Сучасны шлюб: [Вершы] // Работніца і сялянка. № 6; Гультай на сенакосе; Знаўца сельскага жыцця; Ёсць і такія гараджане. [Мініяцюры] // Родная прырода. № 5; Пра Сцяпана Шчыпака: [Верш] // Вяч. Мінск. 30 кастр.; Зарапартаваўся: [Верш] // Там жа. 27 снеж.; Заручыны: [Верш] // Там жа. 31 снеж.; «Свой» чалавек: [Верш] // Звязда. 25 чэрв.; Зязюля і дрозд: Байка // Чырв. змена. 12 студз.

1.4.

1975. Туманоўскі Р. Высокія патрабаванні: [Гумарэска] / З рус. // Мін. праўда. 25 мая.

1980. Зазуля Л. «Слаўны» палёт: [Верш] / З укр. // ЛіМ. 18 студз.

1983. Січавік І. Шчасце: [Верш] / З укр. // ЛіМ. 29 крас.

1.5.

На літоўскую мову. Kyšininku vargai // Šluota. 1972. Nr 3.

На рускую мову. В чужом глазу: [Сатыра і гумар] Мн., 1991.

Свое место: [Сатыра і гумар] Мн., 1994.

Проклятый столб: [Верш] / Пер. Е. Весенин, В. Корчагин // Молодой «Вожык». М., 1966; Слон и диплом: [Верш] // Узбекистан. 1967. № 6; Что труднее: [Мініяцюра] / Пер. автор // Неделя. М., 1978. № 4; Вежливый пассажир: [Мініяцюра] / Пер. В. Парыгин // Брянск. комсомолец. 1982. 22 дек.; Свое понимание; Не мелочник; Работничек: [Мініяцюры] / Пер. В. Парыгин // Брянский рабочий. 1982. 1 апр.; Трудяга; Несун: [Мініяцюры] // Нар. хоз. Бел. 1985. № 9; Воробьиный доклад: [Байка] / Пер. А. Терентьев // Там жа. 1985. № 10; Пустозвон, лодырь; Бракодел: [Мініяцюры] // Там жа. № 12; Принципиальный сторож: [Байка] / Пер. А. Терентьев // Сов. Бел. 1985. 23 марта; Мышь под веником: [Байка] / Пер. А. Терентьев // Сов. Бел. 1985. 23 окт.

На ўзбекскую мову. Фил ва диплом: [Байка] / Тарж. Л. Шабшай // Узбекистон. 1967. № 6.

На ўкраінскую мову. «Аматор» мистецтва; Скарга злодія; Мрія п'янички; Хапуга: [Мініяцюры ў вершах] / Пер. А. Гарматюк // Київ. правда. 1975. 21 черв.; Мораль розтратника: [Верш] / Пер. В. Грабоус // Черв. прапор. 1982. 31 берез.; Про машину: [Верш] / Пер. И. Немирович // Перець. 1982. № 21; Скупій на полюванні: [Верш] // Пер. И. Немирович. // Там жа. 1982. № 24; Скупій на полюванні; Про машину: [Вершы] / Пер. И. Немирович // Вид щирого серця. К., 1983.

2.3.

На беларускай мове. [Біяграф. даведка] // Вяршынін М. Без віны вінаватыя. Мн., 1972. *Т. М. Махнач.*

ГАВАРУШКА ЯФІМ

Гаварушка Яфім Максімавіч [15.10.1911, в. Востраў Рагачоўскага пав. Магілёўскай губ. (цяпер Рагачоўскі р-н Гомельскай вобл.) — 3.6.1992, г. Смалявічы, дзе і пахаваны], празаік, публіцыст.

З сялянскай сям'і. Рана страціўшы бацькоў, выхоўваўся ў дзіцячым доме № 5 г. Бабруйска. У 1935 скончыў Мінскі вышэйшы педагагічны інстытут. Выкладаў беларускую мову і літаратуру ў Смалявічах. Незаконна рэпрэсіраваны. Арыштаваны 9.12.1936, асуджаны 2.10.1937 на 6 гадоў пазбаўлення волі і 5 гадоў пазбаўлення грамадзянскіх правоў. Рэабілітаваны ў 1955. У зняволенні працаваў лесарубам, дзесятнікам, а пасля вызвалення — майстрам, інжынерам-таксатарам, настаўнікам, дырэктарам дзіцячага дома. Жыў у Смалявічах.

Апавяданні друкаваў у газетах «Піянер Беларусі», «Настаўніцкая газета», «Чырвоная змена», «Мінская праўда», у рускіх газетах «Лесная промышленность», «Северная правда» (г. Кастрама, публікацыі не выяўлены), часопісе «Советская Отчизна», калектыўным зборніку «Бацькаўшчына» (1992). Яго публіцыстычныя артыкулы змяшчаліся ў часопісах «Маладосць», «Беларусь», «Бярозка», «Неман», калектыўным зборніку «Праўда гісторыі. Памяць і боль» (1991). Пісаў пра рэпрэсіі, вясковае жыццё. Надрукаваў некалькі артыкулаў пра жыццё і творчасць акадэміка І. Замоціна. Укладальнік кнігі І. Замоціна «Творы» (1991). У апошнія гады жыцця працаваў над складаннем анталогіі паэзіі рэпрэсіраваных паэтаў «Песня падуладных».

Л. С. Савік.

Бібліяграфія

1.3.

1930. Калецтва: Апавяданне // Узвышша. № 6.

1934. Надзіна геройства: [Апавяданне] // Піянер Бел. 10 верас.

1936. [Пра аповесць Галавача «Носьбіты нянавісці»] // ЛіМ. 27 верас.

1958. Сентябрьской ночью: [Апавяданне] // Сев. правда. [Кастрама]. 23 окт.

1959. На дороге: [Апавяданне] // Сов. Отчизна. № 6; Доверие: Рассказ // Лесная пром-сть. 4 авг.

1961. Вымпел на мачте: [Апавяданне] // Лесная пром-сть. 6 апр.

1963. Наш Макаранка: Да 75-годдзя з дня нараджэння // Маладосць. № 3.

1964. Мы любілі яго. // ЛіМ. 14 студз.

1965. Сумленне: Апавяданне // Мін. праўда. 7 верас.

1969. Флаг на мачце: Апавяданне // Мін. праўда. 29 студз.; Песня глушцоў: Навела // Там жа. 16 лют.; Летапіс эпохі: [Рэц. на кн. Л ы н ь к о ў М. Летапіс эпохі. Мн., 1968] // Наст. газ. 25 студз.

1973. Ад роднае зямлі і гоману: [Рэц. на кн.: А л е к с а н д р о в і ч С. На шырокі прастор. Мн., 1972] // Наст. газ. 10 кастр.

1974. Зайчык: Быль // Мін. праўда. 14 снеж.

1977. Простае шчасце: [Нарыс] // Беларусь. № 10; Свет дзіцяці: [Рэц. на кн.: Ш а х о в і ч М. Падарунак. Мн., 1976] // Наст. газ. 6 жн.

1978. Радкі, згартаваныя працай: [Рэц. на кн.: Ш а в е л ь К. Музыка нівы. Мн., 1977] // Беларусь. № 8.

1979. Крыніца творчасці // Наст. газ. 20 чэрв.

1980. Аленчына радасць: Апавяданне // Бярозка. № 3; Казачнае і рэальнае: [Рэц. на кн.: Ш у ш к е в і ч С. Ліса з магнітафонам. Мн., 1979] // Звязда. 5 жн.; Вышыні скараць...: [Рэц. на кн.: П а ў л а ў У. Каласы радкоў: Вершы. Мн., 1979] // Наст. газ. 19 ліп.

1981. Аленчына радасць: Апавяданне // Чырв. змена. 23 жн.

1982. Колас і Замоцін // Маладосць. № 11; Поэзия времени // Гродн. правда. 5 мая; Клапатлівая маці: Навела // Мін. праўда. 10 ліп.; Веліч палымяных радкоў // Наст. газ. 7 жн.

1983. Па закліку сэрца: [Нарыс] // Бярозка. № 3; И ученый, и педагог // Неман. № 12; Крыгаход: [Апавяданне] // Мін. праўда. 8 ліп.; Гарошына: Апавяданне // Наст. газ. 20 жн.

1984. Кемлівы Русак: Замалёўка з натуры // Мін. праўда. 19 мая; Балкон: Апавяданне // Наст. газ. 9 мая; З любоўю да дзяцей: [Рэц. на кн.: Ш у ш к е в і ч С. Казачны церам. Мн., 1983] // Наст. газ. 23 чэрв.; Аленчына радасць: [Апавяданне] // Ніва. 1 крас.

1.6.

З а м о ц і н І. Творы: Літ.-крытыч. арт. Мн., 1991 / *У. М. Ларчанка.* Скл.

ГАЙДУК УЛАДЗІМІР

Гайдук Уладзімір (н. 7.9.1941, в. Полыме Беластоцкага ваяв., Польшча), паэт. Член Саюза польскіх пісьменнікаў. Піша на беларускай і польскай мовах.

З сялянскай сям'і. У 1955 скончыў пачатковую школу і 2 гады вучыўся ў беларускім ліцэі ў Бельску Падляскім. Каб не заняпала бацькоўская гаспадарка, мусіў пакінуць вучобу. У сярэдзіне 1960-х спрабаваў прадоўжыць адукацыю ў Беластоцкім завочным ліцэі, аднак цяжкія матэрыяльныя ўмовы зноў вымусілі адмовіцца ад задумы. Цяпер гаспадарыць на хутары.

У. Гайдук дэбютаваў у 1956 у «Ніве» вершамі «Захад сонца» і «Зіма ідзе». Аўтар кніг паэзіі «Ракіта» (1971) і «Блакітны вырай» (1990). Творчасць У. Гайдука мае традыцыйны характар, звязаны з фальклорам, пераважна прыродаапісальная.

Жыве на хутары Тарнопаль ля Гайнаўкі (Польшча).

Я. Чыквін.

Бібліяграфія

1.2.

Ракіта: Вершы. Беласток. 1971.

Блакітны вырай. Беласток, 1990.

1.3.

1956. Захад сонца; Зіма ідзе: [Вершы] // Ніва. 21 кастр.

1957. Заяснела; Захад сонца: [Вершы] // Беларускі каляндар на 1957 год. Беласток.

1958. Растлумачыла: (Гумарэска); Марыся: [Верш] // Ніва. 2 лют.; Буслы прыляцелі: [Верш] // Там жа. 20 ліп.

1959. Родная краіна; Дажынкі; Захад сонца; Зіма ідзе; Снег: [Вершы] // Рунь. Беласток.

1961. Роздум Антона: [Верш] // Ніва. 5 лют.; Рэха [Верш] // Там жа. 18 чэрв.

1962. Расінка: [Верш] // Ніва. 13 мая.

1963. Буслы вярнуліся на Радзіму; Ранкам; Расінка; Снег; Канікулы: [Вершы] // Мой родны кут. Беласток; Новы год: [Верш] // Ніва. 6 студз.

1964. Мая Краіна; Селянін; Кошык; Такая песня: [Вершы] // Ніва. 2 жн.

1965. Бацькаўшчына; Рэха; Апошняе неба; «Крылы не толькі даны арлу...»; Чаканне; Яшу Буршу; Кошык; Такая песня: [Вершы] //Белавежа. Беласток. № 1; Апошняе неба; «Крылы не толькі даны арлу...»: [Вершы] // Ніва. 7 сак.; Чаканне; Яшу Буршу: [Вершы] // Там жа. 4 крас.; Танга: [Верш] // Там жа. 6 чэрв.

1966. Кошык: [Верш] // ЛіМ. 1 лют.; Восень: [Верш] // Ніва. 6 лют.

1967. Дзівасіл // Ніва. 5 сак.; Думкі аратага // Там жа. 7 мая; У Белавежскай пушчы // Там жа. 4 чэрв.; Колас: [Верш] // Там жа. 3 верас.; «Такой хвіліне сэрца аддаю...»: [Верш] // Там жа. 1 кастр.

1968. Маці: [Верш] // Ніва. 7 крас.; «Ёсць дні, якіх нельга забыць...»: [Верш] // Там жа. 5 мая.

1969. Багаты вечар: [Верш] // Ніва. 5 студз.; «Для душы ёсць дом умоўны...»: [Верш] // Там жа. 6 крас.; Жаданні: [Верш] // Там жа. 4 мая; Ракіта: [Верш] // Там жа. 1 чэрв.; Слова: [Верш] // Там жа. 2 ліст.

1970. Пісьмо маці: [Верш] // Ніва. 1 лют.; Пра штучныя ўгнаенні: [Верш] // Там жа. 1 сак.; Вясна: [Верш] // Там жа. 7 чэрв.; Святая праўда; У вясенні вечар: [Вершы] // Там жа. 2 жн.; Павароты: [Верш] // Там жа. 4 кастр.; Асеннія лісты: [Верш] // Там жа. 1 ліст.; Сабака і воўк: (Вершаваная казка) // Там жа. 6 снеж.

1971. Колькі; Колас; Бунт душы; Сялянка; Селянін-мастак; «Ёсць дні, якіх нельга забыць...»; Ой, няма, як...: [Вершы] // Белавежа. Беласток. № 2; Маленькая Люда: [Верш] // Ніва. 6 чэрв.

1972. Думкі-валачобнікі: [Верш] // Ніва. 2 ліп.; Жняя: [Верш] // Там жа. 6 жн.; Прага: [Верш] // Там жа. 1 кастр.; Зноў чаромха ў квецені; Шуканне сэнсу: [Вершы] // Там жа. 5 ліст.; Максім Зарэчны: [Верш] // Там жа. 3 снеж.

1973. Вясна; Захад сонца; Дажынкі: [Вершы] // Літаратурная Беласточчына. Мн.; Прыгоды: [Верш] // Ніва. 1 крас.; Краскі: [Верш] // Там жа. 6 мая; Вясенні настрой: [Верш] // Там жа. 3 чэрв.; Вусны поўныя горачы: [Верш] // Там жа. 1 ліп.; Агонь: [Верш] // Там жа. 5 жн.; Гусі: [Верш] // Там жа. 2 вер.; Гнецца дрэў карагод: [Верш] // Там жа. 7 кастр.; Вецер: [Верш] // Там жа. 4 ліст.; Паварот: [Верш] // Там жа. 2 снеж.

1974. Каліна: (Памяці партызана): [Верш] // Ніва. 6 студз.

1979. Уваскрасанне: [Верш] // Ніва. 5 жн.

1980. «Дзякуючы паэзіі свет можна ўбачыць...»: Адга-

лоскі // Ніва. 2 сак.; Смерць маці; Кліч душы; «Ужо няма цябе...»; Начытаўшыся сучаснае паэзіі: [Вершы] // Там жа. 6 ліп.; «Як каханне ёсць паэзіяй...»: [Верш] // Там жа. 5 кастр.; «Хочуць чорнай цябе зрабіць...»: [Верш] // Там жа. 2 ліст.; «А ты лірычная такая...»: [Верш] // Там жа. 7 снеж.

1981. «Не перажыў, то і не напішаш...»; Сінія касачы; «Мой лёс — мой белы ангел...»: [Вершы] // Беларускі каляндар 1981. Беласток; «Жыццё мой белы анёл...»: [Верш] // Ніва. 1 лют.; Так жыве беларус: [Верш] // Там жа. 10 мая; Верасы: [Верш] // Там жа. 7 чэрв.

1985. «Сястра мая...»: [Верш] // Ніва. 1 вер.; Бяда з жытам: [Верш] // Там жа. 13 кастр.

1.5.

На польскую мову. Ostatnie niebo / Tł. J. Litwiniuk // Argumenty. 1969. Nr 27.

2.3.

На беларускай мове. [Біяграфічная даведка] // Рунь. Беласток, 1959; [Бібліяграфічная даведка] // Літаратурная Беласточчына. Мн., 1973; Жамойцін Я. «Белавежа», 1980 г. // Беларускі каляндар. 1982. Беласток, 1981; Хрысцінін В. Селянін-паэт // Ніва. 1985. 1 вер.; Шаховіч М. «Белавежа» // Беларускі каляндар на 1983 год. Беласток, 1982; Шведа В. Беларускі парнас у Народнай Польшчы // Беларускі каляндар. 1978. Беласток, 1978.

Т. М. Махнач.

ГАЛАВАЧ ВІТАЛІЙ

Галавач Віталій Цімафеевіч (29.4.1929, г. Запарожжа, Украіна), празаік. Член СП Беларусі з 1994

Нарадзіўся ў сям'і служачых. З першых дзён Вялікай Айчыннай вайны бацька будучага пісьменніка ўступіў у Бабруйскае падполле. Калі падполле было выкрыта фашыстамі ў 1942, уцёк у партызанскі атрад, дзе загінуў у баі ў 1943. Сям'ю, як партызанскую, фашысты адразу ж арыштавалі, але В. Галавач уцёк з турмы ў партызаны. Пасля вызвалення вучыўся ў Бабруйскім рамесным вучылішчы. У 1957—62 вучыўся на завочным аддзяленні факультэта журналістыкі БДУ. З 1962 працаваў настаўнікам рускай мовы і літаратуры ў Мінскай спецшколе-інтэрнаце № 13. У 1967—79 працаваў рэдактарам у выдавецтвах «Беларусь», «Мастацкая літаратура». Цяпер на пенсіі.

Сістэматычна друкавацца пачаў з 1956 у бабруйскай газеце «Камуніст» (байкі, вершы, апавяданні), быў членам літаратурнага аб'яднання пры гэтай газеце. В. Галавач — чалавек нялёгкага жыццёвага лёсу. Уражанні ад першых месяцаў вайны і акупацыі немцамі Бабруйска, а таксама многія эпізоды аўтабіяграфічнага характару леглі ў аснову яго прыгодніцкай аповесці «Васёк — матроская душа» (1973). У 1987 надрукавана яго аповесць «Заўтра настане», дзе шмат пазнавальнага матэрыялу, а ў 1991 — аповесць-дэтэктыў «Арыядніна ніць», у якой аўтар паказвае, як у цяжкі пасляваенны час органы міліцыі выкрывалі банду злачынцаў на адным з прадпрыемстваў. Кніга ўражвае веданнем чалавечай псіхалогіі. Асаблівасць яго стылю — уменне займальна будаваць сюжэт, раскрываць характары праз уважлівае стаўленне да дэталі.

Жыве ў Мінску.

В. У. Смольская.

Бібліяграфія

1.2.

Васек — матросская душа: Повесть. Мн., 1973.

Заўтра настане: Аповесць. Мн., 1987.

Арыядніна ніць: Аповесць. Мн., 1991.

1.3.

1959. Тэатр інсцэніруе раман // Калг. праўда. 11 лют. / Сааўт. І. Сухарукаў.

1967. Ах, Тамара, Тамара!: Гумарэска // Чырв. змена, 21 мая.

1968. Палын — зелле горкае: [Рэц. на кн.: Савіцкі А. Палын — зелле горкае. Мн., 1967] // Беларусь. № 4.

1971. Пароль вядомы: [Рэц. на кн.: Ваданосаў М. Пад чужым паролем. Мн., 1971] // Вяч. Мінск. 1 снеж.

1975. Зморыш: [Апавяданне] // Родины сыновья. Мн.

1978. Нелегкая победа: [Апавяданне] // Непримиримые ведут поиск. Мн.

1.4.

1975. Крыга А. Шесть апостолов и капрал: [Апавяданне] / С бел. // Родины сыновья. Мн.

1976. Ваганаў С. У цяні кола: [Нарыс] / З рус. // Дарогі вы, дарогі... Мн.; Крыга А. Шесть апостолов и капрал / С бел. // Мы — молодые: Альманах. Вып. 4. Мн.

1977. Шитик В. Левый рейс: [Апавяданне] / С бел. // Неман. № 9.

1978. Шитик В. Левый рейс: [Апавяданне] / С бел. // Непримиримые ведут поиск. Мн.

1.6.

Молчанов П. О том, что памятно, о тех, кто дорог: [Успаміны] // Неман. 1980. № 4 / Зап.

М. П. Барташэвіч.

ГВАЗДОЎ МІКОЛА

Гваздоў Мікола [Мікалай Васілевіч, крыпт. М. Г-ў, 1.6.1916, г. Полацк — 1937 (?), УхтпечЛАГ Комі АССР], паэт.

Нарадзіўся ў сям'і служачых. У 1933 паступіў на літаратурны факультэт Мінскага вышэйшага педінстытута. У 1935 перавёўся на завочнае аддзяленне і паехаў працаваць настаўнікам рускай мовы і літаратуры ў г. Чэрыкаў. У тым жа годзе звольнены з працы за «адступленне ад школьных праграм і методыкі выкладання літаратуры» (а па сутнасці за тое, што расказваў вучням пра творчасць рускіх і беларускіх пісьменнікаў, забароненых савецкімі ўладамі). Пераехаў у Мсціслаў, затым у Мінск. 13.3.1936 беспадстаўна арыштаваны на кватэры ў П. Хатулёва, дзе спыніўся на час сесіі. Разам з ім былі арыштаваны і яго сябры — аднакурснікі па педінстытуце, пачынаючыя беларускія паэты: Я. Ермаловіч, С. Знаёмы, Ф. Курбацкі, Т. Лебяда, С. Мурзо, М. Сяднёў, П. Хатулёў і інш. Як і ўсіх рэпрэсіраваных пісьменнікаў, іх абвінавацілі ў нацдэмаўшчыне, а пра М. Гваздова ў пратаколах НКУС запісана: «Будучы настаўнікам у школе ў г. Чэрыкаве ў 1935—36 г. сярод вучняў праводзіў контррэвалюцыйную нацдэмаўскую работу, выказваў у працэсе лекцыі контррэвалюцыйныя думкі, распаўсюджваючы сярод вучняў вершы контррэвалюцыйнага фашысцкага зместу і зневажаў у вачах вучняў правадыроў партыі і Савецкай улады. У апошні час, знаходзячыся ў Мінску, Гваздзёў выказваў контррэвалюцыйныя і тэрарыстычныя тэндэнцыі, а таму рашылі падвергнуць Гваздзёва М. В. вышуку і арышту і павесці следства...». У час арышту ў паэта былі забраны лісты, рукапісы, кнігі. М. Гваздоў быў засуджаны на 5 гадоў канцлагераў і ў 1937 высланы ў напрамку Варкуты — у Чыб'ю (УхтпечЛАГ). Далейшы лёс паэта невядомы. Найбольш верагодна, ён загінуў у канцлагеры, калі «ворагі народа» вынішчаліся фізічна. Рэабілітаваны ў 1989.

Пісаць вершы М. Гваздоў пачаў у 1929, калі жыў у Віцебску і знаходзіўся пад моцным уплывам С. Ясеніна, А. Блока, У. Маякоўскага. Першы верш «Рабочы-прызыўнік» апублікаваны ў газ. «Віцебскі пралетарый» (1932). Потым яго вершы пачынаюць рэгулярна з'яўляцца ў рэспубліканскай перыёдыцы — газетах «Звязда», «ЛіМ», часопісе «Работніца і калгасніца Беларусі». У вершах М. Гваздоў звяртаўся да сучаснай яму тэматыкі: пісаў пра грамадзянскую вайну, узнікненне нямецкага і італьянскага фашызму. У яго арсенале інтымна-лірычныя вершы. Стварыў цыкл вершаў, дзе выразна адчуваліся ясенінскія матывы незадаволенасці жыццём. Неапублікаваныя вершы гэтага цыкла былі «арыштаваны» разам з аўтарам і паслужылі на следстве «доказам» яго «ўпадніцкіх» настрояў і песімізму. Паводле сведчанняў М. Сяднёва і П. Шырокава, якія вучыліся разам з М. Гваздовым (М. Гваздоў пад сваім уласным імем з'яўляецца адным з герояў рамана М. Сяднёва «Раман Корзюк»), малады паэт быў надзвычай начытаным, эрудыраваным чалавекам, на памяць ведаў мноства твораў С. Ясеніна, многіх беларускіх паэтаў, пакутваў, што нельга пісаць на вольныя тэмы, выказваў «крамольныя» на той час думкі, што наша грамадства «не прагрэсіруе, а дэградуе», што сацыялізм будуецца толькі на словах, бо ў краіне не дыктатура пралетарыята, а адной партыі. Аднак і па вершах, напісаных да яго арышту на «дазволеныя» тэмы, можна меркаваць, што гэта быў арыгінальны беларускі паэт. Яго таленту не дала раскрыцца таталітарная сістэма.

Л. С. Савік.

Бібліяграфія

1.3.

1932. Рабочы-прызыўнік: [Верш] // Віцеб. пралетарый. 11 кастр.

1933. Сілуэт: [Верш] // Віцеб. пралетарый. 4 крас.

1934. Будзе жыць вялікі вобраз твой: [Верш] // Звязда. 9 снеж.; Кавалак Берлінскай ночы: [Верш] // ЛіМ. 12 сак.; Сустрэча: [Верш] // Там жа. 29 ліст.; Пад Кёльнскім небам [Верш] // Чырв. змена. 5 крас.

1935 Шчырасць: [Верш] // Полымя рэвалюцыі. № 5; Яблычка: [Верш] // Там жа. № 9; Вызваленне далёкіх рэк...: [Верш] // ЛіМ. 21 ліп.; Песня пра вялікі ўраджай: [Верш] // Там жа. 12 жн.; Песня Сталіну: [Верш] // Там жа. 7 ліст.; Майстрам крывавых спраў: [Верш] // Там жа. 17 снеж.

В. М. Грышкевіч.

ГРУБІЯН МАЦВЕЙ

Грубіян Мацвей Міхайлавіч [30.3(12.4).1909; мяст. Сакаліўка Кіеўскай губ., цяпер Кіеўская вобл., Украіна — 9.2.1972, Масква; пахаваны на Вострыкаўскіх могілках], паэт. Пісаў на яўрэйскай (ідыш), беларускай і рускай мовах.

Паходзіў з сям'і настаўніка. Пасля заканчэння школы працаваў падручным каваля, муляра. У 1930 сям'я пераехала ў Мінск. Тут М. Грубіян у 1934 паступіў на яўрэйскае аддзяленне літаратурнага факультэта Мінскага педінстытута, які скончыў у 1938. Працаваў на Беларускім радыё. Быў цесна звязаны з беларускай пісьменніцкай арганізацыяй. У пачатку Вялікай Айчыннай вайны добраахвотна пайшоў на фронт. У 1943 цяжка паранены і дэмабілізаваны. Застаўся жыць у Маскве. Працаваў рэдактарам у яўрэйскім Антыфашысцкім камітэце (1945—49). У 1949 быў рэпрэсіраваны. Рэабілітаваны ў 1954.

Друкавацца пачаў у 1930. Першыя яго вершы апублікаваны ў яўрэйскай дзіцячай газеце «Зай Грэмт» («Будзь гатовы!»), якая выдавалася на Украіне (публікацыі не выяўлены). З 1932 друкаваўся ў часопісе «Штэрн». Першы зборнік яго вершаў «З сутарэння на сонца» выдадзены ў 1935. Затым выйшлі зборнікі «Лірыка», «Слядамі вайны» (у перакладзе на беларускую мову). Вершы М. Грубіяна публікаваліся таксама ў газетах «Октобэр», «Літаратура і мастацтва», часопісе «Беларусь». Пасля вайны ў Маскве выйшлі зборнікі яго вершаў (у перакладзе з яўрэйскай на рускую мову) «Я кліканў цябе, жыццё», «Крыніцы», «Лодка і плынь», «Мой свет», на мове ідыш — кнігі «Неспакойны вецер», «Вечны агонь». Яго паэзія вызначаецца глыбокім лірызмам, арыгінальнасцю паэтычнага стылю, спалучэннем прыёмаў народнай творчасці і мастацкай літаратуры. Вершы М. Грубіяна перакладалі на беларускую мову А. Бялевіч, М. Калачынскі, Р. Барадулін.

Р. Л. Рэлес.

Бібліяграфія

1.2.

З сутарэння на сонца: Вершы. Мн., 1935 / Яўр. Рэц.: С я р э б р а н ы І. «З сутарэння на сонца» // ЛіМ. 1935. 6 кастр.

Лірыка. Мн., 1940 / Яўр.

Неспакойны вецер. М., 1970 / Яўр.

Вечны агонь. М., 1976 / Яўр.

1.3.

1932. «Восень, павеяў вецер, стала прахладней...»: [Верш] // Штэрн. № 12 / Яўр.

1934. «Маё мястэчка, я помню...»; Маёй маці; Я толькі зраблю глыток: [Вершы] // Штэрн. № 4—5 / Яўр.; «Мае вокны выходзяць у сад...»; «Калі я пайшоў у сад...»; «У доме майго дзядзькі...»; Паўднёвая песня: [Вершы] // Там жа. № 10 / Яўр.

1935. [Вершы] // Штэрн. № 9 / Яўр.

1936. [Верш] // Штэрн. № 4/ Яўр.; [Вершы] // Там жа. № 8 / Яўр.; Расце паэтычны маладняк: Слова ў абмеркаванні даклада аб бел. паэзіі А. Александровіча // ЛіМ. 6 лют.

1937. [Верш прысвечаны А. Пушкіну] // Штэрн. № 1 / Яўр.

1938. [Верш] // Штэрн. № 3 / Яўр.; «Санкі імчацца па марознаму гораду...»; «Шум у завулку...»: [Вершы] // Там жа. № 10 / Яўр.; Шчаслівая праца: Нарыс // ЛіМ. 31 снеж.

1939. Шолам Алейхем: [Верш] // Штэрн. № 3—4 / Яўр.; «Хто думаў пра лёс маладога...»: [Верш] // Там жа. № 6 / Яўр.

1940. [Вершы] // Штэрн. № 3 / Яўр.; [Вершы] // Там жа. № 10 / Яўр.; Вершы Р. Баумволь // ЛіМ. 24 жн.

1944. Боты: [Верш] // Беларусь. № 3.

1947. «Я каштаваў ваду з усіх тваіх рэк...»: [Верш] // Цвёрдым поступам. Мн. / Яўр.

1.4.

1936. А л е к с а н д р о в і ч А. Сярго Арджанікідзе: [Верш] / З бел. / Сааўт. пер. Х. Мальцінскі; К о л а с Я. Асадзі назад: [Верш] / З бел. // Штэрн. № 10 / Яўр.

1.5.

На беларускую мову. Слядамі вайны: [Вершы] / Пер. А. Бялевіч. Мн., 1947. Рэц.: П а н ч а н к а П. Хто варыць чарпаком вячэру? // ЛіМ. 1948. 17 студз.

Дванаццатага снежня: [Верш] / Пер. з яўр. М. Калачынскі // ЛіМ. 1937. 27 кастр.; Беларусі: [Верш] / Пер. з яўр. Р. Барадулін // ЛіМ. 1966. 25 кастр.

На рускую мову. Я звал тебя, жизнь!: Стихи / Пер. с евр. М., 1958.
Ключи: [Вершы] / Пер. с евр. М., 1962.
Лодка и течение: [Вершы] / Пер. с евр. М., 1967.
Мой мір: [Вершы] / Пер. с евр. М., 1979.
Однажды...; Вишневый цвет; «Острый свет блеснул белесо...»: [Вершы] / Пер. с евр. Г. Абрамов // Сов. Отчизна. 1956. № 3.

Т. М. Махнач.

ГРЫНКЕВІЧ СТАНІСЛАЎ

Грынкевіч Станіслаў Сымонавіч
2.2.1902, мяст. Новы Двор Сакольскага пав. Гродзенскай губ., цяпер Беластоцкае ваяв., Польшча — 1945, Магілёў),
лекар-псіханеўролаг, публіцыст, палітычны дзеяч. Доктар медыцыны.

Пачатковую адукацыю атрымаў у вясковага настаўніка, які рыхтаваў яго да паступлення ў гімназію. У 1912 залічаны ў 1-ы клас Гродзенскай дзяржаўнай мужчынскай гімназіі. На пачатку 1-й сусветнай вайны разам са сваім стрыечным дзядзькам выехаў у Смаленскую губ. Закончыўшы 7 класаў Дарагабужскай гімназіі, вярнуўся ў родную вёску. Паступіў на медыцынскі факультэт Віленскага універсітэта, адтуль перавёўся ў Познань, дзе і закончыў вучобу. Да 1935 працаваў у клініцы, пасля — у псіхіятрычнай бальніцы ў мяст. Харошчы каля Беластока. Займаючы пасаду ардынатара аддзела нервовых хвароб, вёў лабараторныя доследы і пісаў навуковыя працы. Адначасова займаўся перакладчыцкай дзейнасцю: перакладаў з іншых моў на беларускую медыцынскія працы і рэлігійныя тэксты. У 1936 выдаў брашуру «Асьвета», якую паліцыя канфіскавала, а яе аўтара аштрафавала і зняволіла на 2 тыдні за краты. У пачатку 1937 С. Грынкевіч з сям'ёй пераехаў у Вільню і працаваў у першай гарадской паліклініцы. Пісаў і дасылаў артыкулы ў беларускія выданні — «Студэнцкая думка», «Крыніца», «Заранка», «Калоссе» і інш. Любіў ездзіць па беларускіх вёсках, сустракацца з людзьмі, якім чытаў папулярныя лекцыі па гігіене, медыцыне і гісторыі. У 1937, пасля падарожжа па Украіне, напісаў і выдаў брашуру «У братоў украінцаў». Кола інтарэсаў усебакова адукаванага медыка Грынкевіча было надзвычай шырокае, што можна бачыць з пераліку назваў яго артыкулаў і кніг: «Аб тэатры», «Народ», «Капля вады» (усе 1927), «Царква. Помста. Вязніца» (1928), «Аб праве да бацькаўшчыны» (1936).

С. Грынкевіч вёў актыўную палітычную дзейнасць. У Вільні ён узначальваў Беларускае народнае аб'яднанне. У 1940 быў арыштаваны органамі НКУС, але ў час вывазу вязняў здолеў уцячы з цягніка. У гады фашысцкай акупацыі заставаўся ў Вільні, займаўся культурнай дзейнасцю, але ад супрацоўніцтва з немцамі ўстрымліваўся. Быў прыхільнікам кантактаў з польскім эмігранцкім урадам. Прымаў захады па арганізацыі на Навагрудчыне нацыянальных партызанскіх атрадаў, якія павінны былі змагацца і з немцамі, і з бальшавікамі. Адмовіўся ад прапанаванай яму Р. Астроўскім пасады раднага ў Беларускай Цэнтральнай Радзе (1944). У канцы 1944 ён зноў арыштаваны ў Вільні органамі НКУС і адпраўлены ў Мінск, а з Мінска — у Магілёў, дзе ў канцы 1945 расстраляны.

С. М. Чыгрын.

Бібліяграфія

1.2.
Ab teatry: Praktyčny padručnik dla amatarskich teatraŭ. Wilnia, 1927.
Arlanio. Wilnia, 1927.
Narod. Wilnia, 1927.
Žanimstva pa radyjo: Pjesa ŭ 3-ch abrazoch. Wilnia, 1927.
Carkwa, pomsta, wiaźnica: Apowieść. Wilnia, 1928.
Rady chworym i zdarowym. Častka I: Ab zaraznych i inšych chwarobach. Wilnia, 1935 / Saaŭt. Ja. Grynkevič.
Рады хворым і здаровым. Вільня, 1935 / Сааўт. Я. Грынкевіч.
Aswieta: (Ab Narodnym uniwiersitecie i inšych sposabach aswietnaje pracy). Wilnia, 1936.
У братоў украінцаў. Вільня, 1936.
Rady chworym i zdarowym. Častka 2. Wilnia, 1937 / Saaŭt. Ja. Grynkevič.
Народ. Вільня, 1937.
У братоў украінцаў. Вільня, 1937.
Алкагалізм. Вільня, 1938 / Сааўт. Я. Грынкевіч.
Умовы і загады, неабходныя для здароўя. Вільня, 1939 / Сааўт. Я. Грынкевіч.
1.3.
1923. Аб беларускай мове // Новае жыццё. 15 сак.
1926. Марсыльеза // Сялянск. ніва. 3 студз.
1927. Згукі бацькаўшчыны (Памяці М. Багдановіча на 10-я ўгодкі ягонае смерці): [Нарыс з падборкай вершаў з «Вянка» 1913 г.] // Бел. крыніца. 3, 10 чэрв.; Вязніца: Аповесць // Там жа. 28 кастр.; 4, 11, 11, 25 ліст.; 9, 16, 25 снеж.; Капля вады: [Казка] // Заранка. № 2, 3, 4, 5—6.
1928. Узгадаванне характару // Студ. думка. № 2; Аб прывычцы ў самаўзгадаванні // Там жа. № 3.
1935. Культура і загады нацыянальнае працы // Калоссе. № 1; З зацемак аб тэатры // Там жа. № 3.
1936. Аб праве да бацькаўшчыны // Калоссе. № 1; Псіхааналіз і праблемы літаратурныя і грамадскія // Там жа. № 3.
1937. Гігіена псіхічная, як праблема асноўных адносінаў да жыцця // Калоссе. № 3; З роднае Сакольшчыны // Там жа. № 4; З XXI процігарэлачнага Міжнароднага кангрэсу // Шлях моладзі. № 13.

1938. Учора і сёння // Калоссе. № 4.
1939. Трагічны крызіс // Калоссе. № 2.

1.4.

Kempijski Tamaš. Śledam za Chrystusam / Z łac. Wilnia, 1934.

1932. Кемпійскі Т. Следам за Хрыстосам / З лац. // Хрысціянск. думка. № 4, 5, 6, 7—8, 12; 1933. № 1—10.

2.2.

На беларускай мове. Малецкі Я. Пад знакам Пагоні. Таронта. 1976.

2.3.

На беларускай мове. Валтупскі А. Доктар Станіслаў Грынкевіч — перакладчык «Следам за Хрыстусам» Т. Кемпійскага // Źnič (Зніч). 1973. № 117 (травень—снежань).

У. М. Ларчанка.

ГРЫШКАВЕЦ ВАЛЕРЫЙ

Грышкавец Валерый Фёдаравіч (псеўд В. Баравы, н. 23.12.1953, г. Пінск), паэт. Член СП Беларусі з 1992. Піша на рускай мове.

З сям'і рабочых. Закончыўшы васьмігадовую школу ў Пінску, працаваў на заводзе, вінаградарам у Крыме, у Пінскім КБА (1969—73). Пасля службы ў ваенна-паветраных сілах (1973—75) працаваў электрыкам, карэспандэнтам газеты «Полесская правда» (1976—81), матросам Верхне-Дняпроўскага рачнога параходства. У 1981 паехаў у Іркуцкую вобл., дзе працаваў у Ніжнеілімскім геолага-разведачным атрадзе, мантажнікам «Брацкхімбуда», рабочым на будоўлях Буратіі. З 1985 жыў і рабіў у калгасах Усходняй Літвы. З 1989 — карэспандэнт, загадчык аддзела газеты «Полесская правда». Вучыўся на завочным аддзяленні факультэта журналістыкі БДУ. Скончыў Вышэйшыя літаратурныя курсы ў Маскве (1993—95).

Літаратурную дзейнасць пачаў у 1968. У абласным і рэспубліканскім друку публікуецца з 1970. Перакладае на рускую мову беларускую паэзію. Свае вершы і пераклады друкуе ў часопісах «Наш современник», «Нёман», «Рабочая смена», «Родник», альманаху «Дзень паэзіі», газетах «Литературная Россия», «Литературная газета», «Знамя юности», «Сельская газета», «Заря». Выдаў 2 зборнікі вершаў («Час адпраўлення» і «Кола буслінае») і аднаактовую камедыю «Праміргалі» (1985). Тэматыка яго вершаў — радасці і пакуты чалавека, яго падзенні і ўзлёты, дарогі і сустрэчы, роздум над уласнымі ўчынкамі і людскімі лёсамі. Вершы вылучаюцца натуральнасцю інтанацыі, сардэчнасцю і сур'ёзнасцю разважанняў, адметнай стылёвай манерай. Паступова рамантыка дарог саступае месца роздуму над лёсам роднай зямлі, пра асабістую адказнасць перад блізкімі людзьмі.

Жыве ў Пінску.

В. У. Смольская.

Бібліяграфія

1.2.

Проморгали. Мн., 1985.

Время отправления: Стихи. Мн., 1981 (Первая книга поэта).

Круг аистиный: Лирика. Мн., 1991.

1.3.

1970. Журавлиный крик: [Верш] // Сел. газ. 25 окт.

1971. «Здравствуй, юность!..»; Тишина; Август: [Вершы] // Нёман. № 10; Маки; К лесу: [Вершы] // Заря. 18 сент.; «Я знаю: крыши пахнут небом...»: [Верш] // Там жа. 23 окт.; Журавлиный крик; «Солнце бьётся жар-птицей в берёзах...»: [Вершы] // Знамя юности. 4 февр.; Улыбка матери: [Верш] // Сел. газ. 17 янв.; Станция «Любовь»: [Верш] // Там жа. 18 апр.; Трактористы: [Верш] // Там жа. 30 мая; Грибное лето: [Верш] // Там жа. 7 июля; Октябрь: [Верш] // Там жа. 17 окт.; Новый день: [Верш] // Там жа. 28 нояб.

1972. В Брестской крепости: [Верш] // Заря. 21 окт.; «Из края в край...»; «Поля... Полесье...»: [Вершы] // Знамя юности. 24 нояб.; Зимнее: [Верш] // Сел. газ. 16 февр.

1973. Моя тропа: [Вершы] // Нёман. № 9; «Прославленный гудками полустанок...»: [Верш] // Знамя юности. 27 февр.; На рассвете; «Я хочу написать о тепле...»: [Вер-

шы] // Сел. газ. 18 февр.; Журавлиная даль: [Верш] // Там жа. 12 янв.; Синий рассвет: [Верш] // Там жа. 24 апр.; Скворечник: [Верш] // Там жа. 15 мая.

1974. До встречи новой!: [Верш] // Заря. 26 дек.; Улыбка: [Верш] // Сел. газ. 10 февр.; На взлётной полосе: [Верш] // Там жа. 11 авг.

1975. «Полесские свадьбы...»: [Верш] // Заря. 20 сент.; Монтажник: [Верш] // Там жа. 27 сент.; «Мы вечно в долгу неоплатном...»: [Верш] // Там жа. 22 нояб.; Служба: [Верш] // Знамя юности. 27 февр.

1976. Солнце в ладонях: [Вершы] // Нёман. № 5; «Побереги меня от неудач...»; «Заречье. Заполье. Залесье...»; «Журавли с тоской — на юг далекий...»; «Опять в последних числах сентября...»: [Вершы] // Рабочая смена. № 9; Я в цех пришёл...: [Верш] // Заря. 14 февр.; «Кто-то собирается в дорогу...»; «Взмах весла,— и дальше уплываем...»: [Вершы] // Там жа. 28 февр.; У каждого своя есть песня: [Верш] // Там жа. 13 нояб.; По тревоге: [Верш] // Знамя юности. 26 нояб. ; «У каждого своя есть песня...»: [Верш] // Там жа. 17 дек.; Высокое счастье: [Рэц. на кн.: Гардзей В. Касавіца. Мн., 1975] // Сел. газ. 12 авг.; Земля родная: [Верш] // Там жа. 15 авг.; Маки; В долгу; На пароме: [Вершы] // Там жа. 12 сент.

1977. В родном краю; «Я лежал, упав с размаху в жито...»: [Вершы] // Нёман. № 4; После стрельб; «Заречье. Заполье. Залесье...»: [Вершы] // Заря. 4 февр.; «Юноша с фантазией богатой...»: [Верш] // Знамя юности. 22 июля; Жито: [Верш] // Сел. газ. 14 авг.

1978. Мое Полесье: [Верш] // Сел. хоз-во Белоруссии. № 9; «Мы вечно в долгу неоплатном...»: [Верш] // Заря. 10 февр.; «Пульсирует Ясельды исток...»: [Рэц. на кн.: Янішчыц Я. Ясельда. Мн., 1978] // Там жа. 19 сент.; Бегут меридианами дороги: [Верш] // Чырв. змена. 25 студз.

1979. У каждого своя есть песня...; Лоси: [Вершы] // Дзень паэзіі — 79. Мн.; «У каждого своя есть песня...»: [Верш] // Гомел. праўда. 31 ліп.; Огни: [Верш] // Заря. 6 янв.; Шукшину: [Верш] // Там жа. 9 июня; Жито: [Верш] // Там жа. 25 авг.; «Вновь дует с Финского залива...»: [Верш] // Там жа. 7 дек.; У могилы Неизвестного солдата: [Верш] // Там жа. 18 дек.; Стихи о звездах // Мін. праўда. 6 студз.

1980. Старый дом: [Верш] // Заря. 1 марта; «Звенят ручьи! И синий-синий...»: [Верш] // Там жа. 4 мая; И снова — август: [Верш] // Там жа. 23 авг.; Нити: [Верш] // Там жа. 13 сент.; Моя земля: [Верш] // Там жа. 30 окт.; Край родной: [Верш] // Сел. газ. 15 июня; «И берег Финского залива...»; Лоси: [Вершы] // Чырв. змена. 11 вер.

1981. «Выйду утром на станции Плёсное...»: [Верш] // Дзень паэзіі — 81. Мн.; «На пляжах осенних затишье...»: [Верш] // Заря. 9 окт.; «В природе смена декораций...»: [Верш] // Там жа. 3 дек.; Дорогой памяти; «Радость — последние астры...»: [Вершы] // Чырв. змена. 21 лют.

1982. «И снова — таёжная осень...»; «...И хлынет дождь...»: [Вершы] // Нёман. № 7.

1983. «Славен август последним теплом»: [Верш] // Заря. 25 авг.; «Увидеть родину в тумане...»: [Верш] // Чырв. змена. 2 крас.

1984. Дорога далека; «Звенит апрель! И синий-синий...»; Музыка колодца; «Я хорошо помню...»: [Вершы] // Рабочая смена. № 6; «Дреговичи, радимичи, поляне...»; «Городские дети кормят лошадь...»: [Вершы] // Заря. 19 июля.

1985. Свае крыніцы: [Рэц. на кн.: Рудкоўскі М. Засцярога. Мн., 1984] // Маладосць. № 10; «Адрес Весны...»: [Верш] // Знамя юности. 3 марта.

1.4.

1977. Рудковский М. Баллада о купальском солнце; Просьба; Триптих желаний: [Вершы] / З бел. // Рабочая смена. № 10.

2.3.

На рускай мове. Катаева Л. [Прадмова да вершаў] // Рабочая смена. 1976. № 9. *Т. М. Махнач.*

ГУБЛЕР НАВУМ

Гублер Навум Якаўлевіч (н. 27.7.1933, г. Рагачоў Гомельскай вобл.), празаік. Член СП Беларусі з 1992. Піша на рускай мове.

З сям'і служачых. У гады Вялікай Айчыннай вайны бацька пайшоў на фронт, а маці з сынам і дачкой апынуліся ў бежанцах у Пензенскай вобл. У 1945 сям'я вярнулася ў Мінск. Пасля заканчэння сямігодкі Н. Гублер з 1948 працаваў на Мінскім радыёзаводзе, пазней — рабочым у сектары геадэзічных здымкаў Белдзяржпраекта. Адначасова вучыўся ў вячэрняй школе рабочай моладзі. Пасля школы ў 1952 паступіў у лётнае вучылішча пілотаў грамадзянскай авіяцыі. У 1954—56 — пілот

самалёта ПО-2. Па стану здароўя адлічаны медкамісіяй з лётнай работы. Скончыўшы школу Вышэйшай лётнай падрыхтоўкі, з 1956 працаваў авіядыспетчарам у Мінскім аэрапорце, з 1975 — кіраўніком палётаў, начальнікам змены службы кіравання паветраным рухам Беларускага ўпраўлення грамадзянскай авіяцыі. Завочна скончыў філасофскае аддзяленне БДУ.

Першае апавяданне Н. Гублера «У імя Радзімы» апублікавана ў 1957 у газеце «Западная трасса». Друкаваўся ў часопісах «Нёман», «Беларусь», газеце «Знамя юности». Выдаў кнігі аповесцей і апавяданняў: «Вясенні рэйс», «Пры святле маланкі», «Палёт працягваецца». Свой вопыт пілота, прафесіі рамантычнай і складанай, Н. Гублер рэалізаваў у аповесці «Вясенні рэйс». Драматычныя сітуацыі, маральна-этычныя канфлікты, праблемы чалавечых узаемаадносін раскрыў у аповесці «Пры святле маланкі». Займаецца перакладамі, піша рэцэнзіі.

Жыве ў Мінску.

Л. С. Савік.

Бібліяграфія

1.2.

Весенний рейс: Повесть, рассказы. Мн., 1979 (Первая книга прозаика).

При вспышке молнии: Повести и рассказы. Мн., 1985. Рэц.: Вихрева И. Момент прозрения // Нёман. 1986. № 8.

Полет продолжается: Повести и рассказы. Мн., 1986.

Непролитая туча: Роман. Мн., 1993.

1.3.

1966. Весенний рейс: [Апавяданне] // Нёман. № 12.

1967. Трэці чалавек: [Апавяданне] // Чырв. змена. 24 вер.

1969. Человечье сердце; «Легка, стройна...»: [Вершы] // Вяч. Мінск. 25 вер.

1970. Возвращение: [Апавяданне] // Нёман. № 7.

1975. Лебядзінае возера: Навела // Вяч. Мінск. 6 лют.

1976. Аднойчы ўначы: Апавяданне // Вяч. Мінск. 20 жн.

1978. Ванечка: Апавяданне // Вяч. Мінск. 26 мая.

1979. На вечнай стаянцы: Урывак з аповесці // Вяч. Мінск. 18 снеж.

1980. Пазнаваць мудрасць жыцця...: [Рэц. на кн.: Паўлаў У. Каласы радкоў. Мн., 1979] // Вяч. Мінск. 11 чэрв.

1981. Непонятный человек: [Апавяданне] // Нёман. № 7; «Встрепенулась листами под ветром...»: [Верш] // Дзень паэзіі — 81. Мн.

1982. «...Деревня под Пензой. Война. Труд недетский...»: [Верш] // Дзень паэзіі — 82. Мн.; [Рэц. на кн.: Спрынчан В. Земля и звезды. Мн., 1981] // Нёман. № 10.

1983. Воспоминания о родном городке: [Верш] // Дзень паэзіі — 83. Мн., «Деревня под Пензой...»: [Верш] // Нёман. № 7.

1984. Ладушки: [Апавяданне] // Нёман. № 8.

1985. [Рэц. на кн.: Дранько-Майсюк Л. Вандроўкі. Мн., 1983] // Нёман. № 4.

1.4.

1978. Павлов В. Синее море: [Апавяданне] / З бел. // Знамя юности. 4 авг.

1.5.

На беларускую мову. Катапульта: Апавяданне / Пер. У. Паўлаў // Беларусь. 1977. № 3; «Прафесарша»: Навела / Пер. У. Паўлаў // Чырв. змена. 1977. 7 ліп.

М. П. Барташэвіч.

ГУМЯНЮК ЮРЫ

Гумянюк Юры Ігаравіч (н. 24.9.1969, г. Гродна), паэт, празаік. Сябра Таварыства вольных літаратараў Беларусі (з 1993).

Нарадзіўся ў сям'і служачых. У дзяцінстве захапляўся маляваннем, музыкай. Закончыўшы ў 1986 гродзенскую СШ № 16, працаваў на швейнай фабрыцы (1987—89). У гэты час актыўна ўдзельнічаў у пасяджэннях гісторыка-культурнага клуба «Паходня», суполкі імя М. Багдановіча. У 1989 паступіў на аддзяленне паланістыкі філфака Гродзенскага універсітэта. Быў укладаль-

нікам літаратурнага выпуску універсітэцкай шматтыражкі «Кола». У 1991 пачаў рыхтаваць абласны літаратурна-мастацкі радыёчасопіс «Кантэкст». Адзін з ініцыятараў стварэння Таварыства вольных літаратараў Беларусі (1993). Пасля заканчэння ў 1994 універсітэта выкладае ў ім польскую літаратуру. З'яўляецца рэдактарам аддзела нарыса і публіцыстыкі часопіса «Сьвіцязь».

Друкуецца Ю. Гумянюк з 1990 (у зборніку «Дзень паэзіі», альманаху «Ксэракс беларускі», часопісах «Зрок», «Маладосць», «Першацвет», газеце «Гродненская правда» і інш. выданнях). Яго творчасць вылучаецца эксперыментальнасцю, пошукам новых формаў як у прозе, так і ў паэзіі, захапленнем сімвалічным адлюстраваннем падсвядомасці герояў. Аўтар зборнікаў вершаў і эсэ «Водар цела», «Твар Тутанхамона».

Жыве ў Гродне.

С. Г. Адамовіч.

Бібліяграфія

1.2.

Водар цела (псіхадэлічнае мастацтва): Вершы. Полацак, 1992.

Твар Тутанхамона: [Вершы, эсэ]. Полацак, 1994.

С. Г. Адамовіч.

ГУРБАН ІВАН

Яго бацькі, сельскія працаўнікі, мелі ва ўласнасці 4 га зямлі. З 1929 І. Гурбан вучыўся ў мясцовай Юшавіцкай сямігадовай школе, у 1936—39 — на майстра-краўца ў суседняй вёсцы Ракавічы. З 1939 па 1944 у бацькавай хаце працаваў краўцом-прыватнікам. Восенню 1944 ён мабілізаваны райваенкаматам у Савецкую Армію. Вярнуўшыся з арміі, у 1947—49 быў паштальёнам. У 1953 скончыў Усесаюзныя завочныя ўліковыя курсы і працаваў рэвізорам, рахункаводам у калгасе, загадчыкам магазіна ў вёсцы, старшынёй Юшавіцкага сельсавета, у 1965—70 — мулярам у Нясвіжскім міжкалгасбудзе, у 1971—75 — меліяратарам, у 1975—80 — будаўніком у калгасе. Цяпер на пенсіі.

Літаратурную дзейнасць пачаў у 1950. У 1979 выдаў зборнік вершаў «Чубаценькі будзільнік», у 1985 — «Калі ветрык спачывае», у 1991 — «Пахі вясны». І. Гурбан нясе дзецям жывое беларускае слова, спрабуе ў звычайных з'явах і фактах убачыць незвычайнае: паэтычна абмаляваць дэталь, па-новаму зірнуць на навакольнае жыццё.

Жыве ў вёсцы Юшавічы Нясвіжскага р-на.

В. У. Смольская.

Бібліяграфія

1.2.

Чубаценькі будзільнік: Вершы. Мн., 1979. Рэц.: Жук К. Свет дзіцячай фантазіі // Чырв. змена. 1979. 31 кастр.

Калі ветрык спачывае. Мн., 1985.

Пахі вясны. Мн., 1991.

1.3.

1951. На калгасным полі: [Верш] // Полымя. № 4.

1954. Восень: [Верш] // Полымя. № 10.

1957. Паляўнічы: [Байка] // Давайце знаёміцца. Мн.

1960. Сыradой: [Верш] // Калг. праўда. 4 ліст.; Спадарожнае: [Верш] // Мін. праўда. 23 сак.; Лычастая

прызналася: [Байка] // Там жа. 10 ліп.; Кастрычнік: [Верш] // Там жа. 6 ліст.; Гадзіннік: [Верш] // Там жа. 18 ліст.

1961. Ручай; Дыханне вясны; Гадзіннік: [Вершы] // Калг. праўда. 12 крас.; Восень залатая: [Верш] // Там жа. 28 кастр.; Лямпа: [Верш] // Мін. праўда. 9 крас.; Кубінскі цукар: [Верш] // Там жа. 5 кастр.

1962. Плывуць абозы: [Верш] // Калг. праўда. 21 сак.

1963. Стрэмка: Байка // Мін. праўда. 9 жн.

1964. Партрэты: [Верш] // Вясёлка. № 5; Гадзіннік; Сцірка; Не ўсё зрабіла; Верхалаз: [Вершы] // Там жа. № 9; Снег; Вяснушкі: [Вершы] // Мін. праўда. 13 снеж.; Вяснушкі; Валіны гушкі; Рукавіцы: [Вершы] // Сел. газ. 22 нояб.

1965. Музыкант: [Верш] // Вясёлка. № 11; Кветкі зімовыя: [Верш] // Сел. газ. 14 янв.

1966. Жывы будзільнік; Сцірка: [Вершы] // Піянер Бел. 29 ліп.

1968. Гліна; Парад: [Вершы] // Вяч. Мінск. 10 снеж.; Знакі на сцяне: [Верш] // Звязда. 21 снеж.; Будаўнічы парад; Новыя гоні: [Вершы] // ЛіМ. 30 крас.; Курортныя сосны: [Верш] // Мін. праўда. 29 чэрв.

1970. Кастрычніку: [Верш] // Мін. праўда. 5 снеж.

1971. Будзільнік: [Верш] // Мін. праўда. 26 студз.

1972. Жаўрук: [Верш] // Мін. праўда. 9 крас.

1973. Будаўнічы парад: [Верш] // Мін. праўда. 18 ліп.; Героі; Паясы; Сталасць: [Вершы] // Чырв. змена. 8 крас.

1974. Прычыны: [Верш] // Бярозка. № 11; Прадаўшчыцы: [Верш] // Вясёлка. № 7; Прэмія; Кравец; Рабочыя рукавіцы: [Вершы] // Работніца і сялянка. № 8.

1975. У завею: [Верш] // Мін. праўда. 5 студз.

1976. Скарга: [Верш] // Бярозка. № 2; Экскурсія: [Верш] // Там жа. № 5; Скарга снегу: [Верш] // Мін. праўда. 21 студз.; Зорачкі-зоркі...: [Верш] // Там жа. 12 сак.; Цёплы снег: [Верш] // Сел. газ. 11 янв.

1977. Агародчык: [Верш] // Вясёлка. № 5; Старанная дзяўчынка: [Верш] // Работніца і сялянка. № 3; Песня балот; «Прыйшоў асілак-экскаватар...»; «Кіслі нашы прадзеды ў балоце...»; «Машыніст сігналіць для ўздагадкі...»: [Вершы] // Голас Радзімы. 22 вер.; Паляўнічая стрэльба: [Верш] // Мін. праўда. 13 крас.; Садоўнік; На горцы; Снегапад: [Вершы] // Піянер Бел. 24 лют.

1978. Добры лекар: [Верш] // Бярозка. № 7; Працаўніцы: [Верш] // Вясёлка. № 8; Снег: [Верш] // Мін. праўда. 7 студз.

1979. «Нібы ў бубен, гулка гром ударыў...»: [Верш] // Чырв. змена. 5 жн.

1980. Першыя жаўрукі: [Верш] // Бярозка. № 3; Электрапастух; Асака: [Вершы] // Вясёлка. № 8; Мая вёска: [Верш] // Мін. праўда. 26 студз.

1981. Зямля бацькоў: [Верш] // Мін. праўда. 16 кастр.; Росы-расінкі: [Верш] // Там жа. 27 ліст.

1982. З БАМа рукавіцы: [Верш] // Вясёлка. № 12.

1983. Калі ветрык спачывае: [Верш] // Вясёлка. № 8.

1984. Бамаўскія рукавіцы; Цень; Сын тату вязе; Электрапастух; Ранак; Дзіўны сон; Аб чым шэпча гай?; Плуг-аўтамат; Першыя жаўрукі; Звон пчалы; Восень; Чаечка; Асака; Ветрык; Кошык; Росы-расінкі; Прыходзь, зіма!: [Вершы] // Калі ветрык спачывае. Мн.; Разумны бурак: [Верш] // Вожык. № 18; Крынічка: [Верш] // Мін. праўда. 24 крас.; Лужыны: [Верш] // Там жа. 25 мая.

1985. Вясновы туман: [Верш] // Вясёлка. № 4; У роздуме сады...: [Верш] // Мін. праўда. 25 лют.; Пакрыўджаная бяроза: [Верш] // Там жа. 15 сак.

1.5.

На рускую мову. Охотник: [Байка] / Пер. Л. Мартынов // Белорусские басни. Л., 1959. *У. М. Ларчанка.*

ГУРЫНОВІЧ ХВЕДАР

Гурыновіч Хведар Хведаравіч (н. 14 1950, в. Крывічы Салігорскага р-на Мінскай вобл.), паэт. Член СП Беларусі з 1991

З сялянскай сям'і. Пасля заканчэння сярэдняй школы (1967) паступіў у Салігорскі горна-хімічны тэхнікум. У час службы ў войску (1969—71, г. Ламаносаў Ленінградскай вобл.) у гарадской газеце «Балтийский луч» надрукаваў свае першыя вершы. Пасля дэмабілізацыі працаваў на будоўлі, у Старобінскім БМУ (1971—72), на Мінскім электратэхнічным заводзе (1972—74), на Другім рудаўпраўленні Салігорска (1974—76), на Салігорскім рамонтна-механічным заводзе (1976—81), карэспандэнтам газеты «Калійшчык Салігорска». З 1983 — карэспандэнт сельгасадделу газеты «Шахцёр», дырэктар краязнаўчага музея Салігорскага гарвыканкома. З 1986 — адказны

сакратар газеты «Калійшчык Салігорска». У 1975 паступіў на завочнае аддзяленне факультэта журналістыкі БДУ, які скончыў у 1981. Як прапагандыст роднай мовы часта выступае на прадпрыемствах, у навучальных установах Салігорска. З'яўляецца членам рады гарадскога Таварыства беларускай мовы, адказным сакратаром таварыства «Кніга», членам прэзідыума таварыства паляўнічых і рыбаловаў.

Друкуецца з 1969. Першая публікацыя ў беларускім друку з'явілася ў 1972 у газеце «Знамя юности». Аўтар зборнікаў вершаў «Хлеб і соль» (1980), «Шматгалосая кветка» (1983), «Дачыненне» (1991), «Вішня цвіце» (1992), «Пасадзім па дрэўцу» (1993). Паэзія Х. Гурыновіча прыцягвае свежасцю ўспрыняцця жыцця, нестандартнасцю мыслення і падыходаў да раскрыцця тэмы. Яго вершы — пра хлебаробную і шахцёрскую Салігоршчыну, дзе аўтар жыве і працуе, родную прыроду. Як адказны сакратар салігорскай газеты шмат увагі аддае выхаванню маладой творчай змены.

Жыве ў Салігорску.

В. У. Смольская.

Бібліяграфія

1.2.

Хлеб і соль: Вершы. Мн., 1980 (Першая кніга паэта). Рэц.: Барсток М. Першая кніга паэта // Вяч. Мінск. 1980. 18 ліп.; Вярба В. Правы для першай кнігі // Беларусь. 1981. № 3; Макарэвіч В. Хлеб і соль // Чырв. змена. 1980. 2 ліст.; Трафімчук М. «...Каб была наперадзе нядзеля» // ЛіМ. 1980. 7 ліст.

Шматгалосая кветка: Вершы. Мн., 1983. Рэц.: Чарота І. Перад шматгалоссем жыцця // Маладосць. 1984. № 7; Шырын Л. Другі крок // Мін. праўда. 1983. 28 кастр.

Дачыненне: Вершы. Мн., 1991.

Вішня цвіце: Вершы. Мн., 1992.

Пасадзім па дрэўцу: Вершы. Мн., 1993.

1.3.

1972. Времена года: [Вершы] // Знамя юности. 23 июня.

1973. «Отпраздновал свое пророк Илья...»: [Вершы] / Вяч. Мінск. 15 жн.; Звезды над обелиском: [Верш] // Знамя юности. 3 янв.; Гармонист: [Верш] // Там жа. 11 янв.; Лось; В предчувствии весны: [Вершы] // Там жа. 27 февр.; Глухарь: [Верш] // Там жа. 23 марта; Слово; Поэты: [Вершы] // Там жа. 6 сент.; Ледоход; «Теплый снег с тополей...»; Речушка: [Вершы] // Там жа. 21 дек.

1974. Половодье: [Вершы]: «Река пошла...»; «Опять апрель взмахнул руками...»; Июль, жара; «Отпраздновал свое пророк Илья...» // Нёман. № 6.

1975. Праздник: [Верш] // Знамя юности. 4 июля; «Отрадный груз какой...»: [Верш] // Там жа. 30 окт.; Чараўніца: [Верш] // Там жа. 24 дек.; Паводка: [Верш] // Там жа. 31 дек.

1976. Будаўніцы; Паводка; Чараўніца; Успамін: [Вершы] // Маладосць. № 6; Восеньскі эцюд: [Верш] // Родная прырода. № 5; Мая хвароба: [Верш] // Там жа. № 6; Пра ёлку; Будаўніцы: [Вершы] // Знамя юности. 14 сент.; Три муравейника: Рассказ // Там жа. 19 нояб.; Вепр; Летняя замалёўка: [Вершы] // ЛіМ. 18 чэрв.; Будаўніцы: [Верш] // Чырв. змена. 22 чэрв.

1977. Салігорская соль; Свята; Уюны; «Адсвяткаваў сваё Ілля-прарок...»; «Ты любіш сіні колер, я — зялёны...»: [Вершы] // Маладосць. № 9; Дзед; Такавішча; Гусляр: [Вершы] // Полымя. № 12; «Чыгуначны вакзал паволі змоўк...»: [Верш] // Вяч. Мінск. 7 ліп.; Экскаватар: [Верш] // Знамя юности. 28 июля; Прыход восені: [Верш] // Мін. праўда. 29 ліп.; Сяброўцы; Уваходзіны; Журавы: [Вершы] // Чырв. змена. 7 ліп.

1978. «О зямля мая...»; Рэчка; «Буйной луской забыта пахне бераг...»; «Мы з табой ля веснічак стаім...»: [Вершы] // Дзень паэзіі — 78. Мн.; Палявая дарога; «Горад у школьную форму...»; Навагодняя ёлка: [Вершы] // Беларусь. № 1; «Спелыя ліўні шумелі ўволю...»: [Верш] // Знамя юности. 4 авг., Яблыкі: [Верш] // ЛіМ. 1 снеж.; Рэчка: [Верш] // Мін. праўда. 8 крас.; Свята ў Салігорску: [Верш] // Там жа. 1 кастр.; «Ідзе па зямлі немаўля...»; «Зорак высыпала ў плёсе...»: [Вершы] // Чырв. змена. 28 лют.

1979. Вяпрук; «Раскінуўшы рукі, упасці ў траву...»; «Ідзе па зямлі немаўля...»: [Вершы] // Дзень паэзіі — 79. Мн.; Мурашыны гай: [Апавяданне] // Бярозка. № 6; Радзіме; На нашай шахце; «Спелыя ліўні шумелі ўволю...»; Маліна; «На балоце летаваў кулік...»; «Лыжы лёгкія, быццам алені...»: [Вершы] // Маладосць. № 1; «Спелыя ліўні шумелі ўволю...»: [Верш] // Вяч. Мінск. 19 крас.

1980. «Трыумфальнай аркай над азерцам...»; Будаўніцы: [Вершы] // Дзень паэзіі — 80. Мн.; Рэчка: [Верш] // Мін. праўда. 6 вер.; На пабыўку: [Верш] // Там жа. 9 вер.

1981. Гракі; «У садзе зраселым, дзе вулей...»; Восень; Дождж: [Вершы] // Маладосць. № 6; Песня; Яшчэ раз пра рэчку: [Вершы] // ЛіМ. 2 кастр.

1982. Гон: [Верш] // Дзень паэзіі — 82. Мн.; Спадарожнік; Кветкі праталін: [Вершы] // Маладосць. № 5.

1983. Цёплых слоў не шкадуй: [Верш] // Мін. праўда. 19 мая.

1984. Спадарожнік; Шыпшынавы куст; Кветкі праталін; Васількі: [Вершы] // Маладосць. № 1.

1.5.

На рускую мову. Рассвет; «В росистом саду...»; Грачи; Дождь; «Ливни округу поили вволю...»; Рябина; «Жил мой друг...»; Барсук: [Вершы] / Пер. Ф. Ефимов // Нёман. 1984. № 1.

М. П. Барташэвіч.

ДАВІДОВІЧ СЯРГЕЙ

Давідовіч Сяргей Фёдаравіч (н. 20.7. 1942, в. Карпілаўка Лагойскага р-на Мінскай вобл.), паэт. Член СП Беларусі з 1994.

З сялянскай сям'і. Пасля заканчэння школы працаваў у саўгасе рабочым, загадчыкам Шапялёўскага сельскага клуба (1958—1962). Пасля вайсковай службы (1962—65) працаваў шафёрам у Мінску. У 1975—79 — памочнік дзяжурнага па аператыўных сродках сувязі, з 1987 — памочнік начальніка дзяжурнай часці Упраўлення ўнутраных спраў Мінаблвыканкома. Працуючы ў міліцыі, прайшоў шлях ад сяржанта да палкоўніка. Вышэйшую адукацыю атрымаў, спалучаючы вучобу з працай,— закончыў Мінскую вышэйшую школу МУС (1982). Дэпутат Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь дванаццатага склікання, Старшыня Камісіі Вярхоўнага Савета па пытаннях галоснасці, сродкаў масавай інфармацыі і правоў чалавека, член Прэзідыума Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь.

Літаратурную дзейнасць пачаў у 1990. Выйшлі наступныя зборнікі яго паэзіі: «Спасцігнуў я тайну» (1991), «Люстэрка лёсу» (1992, адна паэма) і «Люстэрка лёсу» (1993, шэсць паэм). Шмат якія з вершаў С. Давідовіча пакладзены на музыку беларускімі кампазітарамі. Па-сапраўднаму таленту яго раскрыўся ў жанры ліра-эпічнай паэмы. У жанравых і тэматычных адносінах паэмы розныя: тут і лірычная ўзнёсласць, і філасофскі роздум, і гумар, і сатыра, і гратэск, але ўсе творы аб'ядноўвае цэнтральны матыў — матыў болю, трывогі і адказнасці за родны край, за свой народ. Аўтару ўласціва маштабнасць абагульненняў, багатая моўная палітра, метафарычнасць, паэтызацыя родных мясцін. С. Давідовіч не толькі мастак слова, але і выдатны жывапісец.

Жыве ў Мінску.

В. У. Смольская.

Бібліяграфія

1.2.

Спасцігнуў я тайну: Вершы. Мн., 1991.
Люстэрка лёсу. Мн., 1992.
Люстэрка лёсу. Мн., 1993.

1.3.

1979. Голосую!: [Вершы] // Сов. Бел. 4 марта.
1981. Хлеб: [Вершы] // Мін. праўда. 31 ліп.

М. П. Барташэвіч.

ДАВЫДЗЕНКА ВАСІЛЬ

Давыдзенка Васіль Паўлавіч (3.6.1933, в. Нежыхаў Брагінскага р-на Гомельскай вобл.— 27.9.1987, в. Старое Сяло Мінскай вобл.; пахаваны там жа), празаік.

Нарадзіўся ў сялянскай сям'і. Вучыўся ў Радзінскай сямігодцы. Скончыўшы Мінскае медыцынскае вучылішча (1953), працаваў лабарантам на кафедры ядзернай фізікі БДУ. Вучыўся ў вячэрняй сярэдняй школе № 3. У 1955—57 служыў у Савецкай Арміі. У 1963 скончыў лячэбны факультэт Мінскага медыцынскага інстытута. Працаваў анколагам у клініцы № 1, у 1965—87 — у навукова-даследчым інстытуце анкалогіі і медыцынскай радыялогіі Міністэрства аховы здароўя БССР у Бараўлянах.

Друкавацца В. Давыдзенка пачаў у шматтыражцы ў час вучобы ў інстытуце. Яго вершы і апавяданні змяшчаліся ў штотыднёвіку «Літаратура і мастацтва», часопісах «Бярозка», «Работніца і сялянка» і інш. выданнях. Ён аўтар кніг аповесцей і апавяданняў «Жывыя струны», «Свае і чужыя дарогі». У апавяданнях і аповесцях пісьменнік расказаў пра ваенныя часы на беларускай зямлі. Ён па-мастацку выразна і тонка паказаў, як людзі па-рознаму рэагуюць на неспадзяваныя з'явы жыцця.

Г. В. Якаўлева.

Бібліяграфія

1.2.

Жывыя струны: Апавяданні, аповесці. Мн., 1978 (Першая кніга празаіка). Рэц.: Гардзіцкі А. Выверана жыццём // Вяч. Мінск. 1979. 30 мая; Кажамякін Ц. Высакароднасць // Гомел. праўда. 1979. 20 лют.; Марціновіч А. Струны душы чалавечай // Беларусь. 1979. № 3.

Свае і чужыя дарогі: Аповесці, апавяданні. Мн., 1983. Рэц.: Козіч В. Па сваіх слядах // ЛіМ. 1983. 2 снеж.

1.3.

1963. Лыжники: [Верш] // Физкультурник Бел. 18 янв.

1974. «Не кватэра — курыльня...»; «У чужым агародзе...»: [Вершы] // Знамя юности. 29 нояб.

1976. Рыжуля: Апавяданне // Бярозка. № 12; Будзь заўсёды са мною: Апавяданне // Работніца і сялянка. № 8; Буслы ляцяць з гнязда: (Навела) // Вяч. Мінск. 1 кастр.; Сямейная тайна: Апавяданне // ЛіМ. 9 крас.

1979. Крупінкі сонца; Сталявар: [Вершы] // Маладосць. № 2.

1981. Рыбакі: [Гумарэска] // Вожык. № 17; Паспяшаліся: [Гумарэска] // ЛіМ. 27 сак.; Ніва. 10 мая.

1982. Ці кожнаму бачыцца, чуецца...: [Верш] // ЛіМ. 8 кастр.

1983. Разам з бацькам: [Урывак з новай аповесці] // Бярозка. № 4; Нараджэнне пачуцця: Абразок // Работніца і сялянка. № 2.

1984. Апельсіны: [Апавяданне] // Вясёлка. № 3.

2.3.

На беларускай мове. Лаўшук С. А майстэрства прыйдзе // ЛіМ. 1978. 27 кастр.

М. П. Барташэвіч.

ДАСАЕВА ТАЦЦЯНА

Дасаева Таццяна Мікалаеўна (дзявочае прозвішча Жук; [illegible]), [illegible] Старцавічы (цяп[illegible] Знамя) Слуцкага р-на Мінскай вобл[illegible] літаратуразна[illegible] крытык. Кандыд[illegible] філалагічных [illegible] (1989).

Нарадзілася ў сям'і настаўнікаў-філолагаў Мікалая Андрэевіча Жука і Паліны Пятроўны Небасевай. Дзяцінства Т. Жук прайшло ў атмасферы духоўнасці, павагі да кнігі, роднага слова. Бацька, удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, ветэран педагагічнай працы, на працягу ўсяго жыцця займаецца літаратурнай творчасцю: піша вершы, паэмы, апавяданні, аповесці, літаратурныя партрэты. Друкуецца ў перыядычных выданнях з 1935 г. Жыве ў сям'і добрая памяць пра дзядзьку — Івана Пятровіча Небасева. У 1930-я гады ён выступаў на старонках часопіса «Полымя рэвалюцыі» як празаік. У 1937 г. за наведванне літаратурнага гуртка, якім кіраваў М. Аляхновіч, быў арыштаваны і кінуты за турэмныя краты. М. Жук аказаў вялікі ўплыў на фарміраванне светапогляду, жыццёвых прынцыпаў і выбар прафесіі дачкі. У 1958 яна пачала вучобу ў Старцавіцкай сярэдняй школе. Калі сям'я ў 1959 пераехала на жыхарства ў в. Мерашыно Слуцкага раёна, Таня працягвала там вучобу, а з 1962 па 1968 вучылася ў г. п. Урэчча Любанскага р-на Мінскай вобл. У 1973 яна скончыла філалагічны факультэт БДУ і працавала настаўніцай беларускай мовы і літаратуры ў Траскоўскай сярэдняй школе Мінскага р-на. У 1977 закончыла аспірантуру пры Інстытуце літаратуры АН Беларусі і працуе ў гэтым інстытуце старшым навуковым супрацоўнікам. У 1989 абараніла кандыдацкую дысертацыю на тэму «Станаўленне новага героя ў беларускай савецкай прозе 20-х гадоў».

З першай публікацыяй Т. Дасаева выступіла ў 1978 (пад прозвішчам Т. Жук). Даследуе беларускую прозу 1920—30-х г., займаецца вывучэннем жыцця і творчасці П. Галавача, Ц. Гартнага, М. Гарэцкага, М. Зарэцкага, Л. Калюгі, Б. Мікуліча, К. Чорнага. Яна аўтар манаграфій «Летапіс жыцця і творчасці Максіма Гарэцкага» і «Пошукі героя: З вопыту беларускай прозы 20-х гадоў», у якой па-новаму асэнсоўвае складаны перыяд развіцця нацыянальнай літаратуры. Выступае з артыкуламі і рэцэнзіямі па пытаннях сучаснага літаратурнага працэсу; укладальнік і аўтар тэксталагічнага каментарыя да 2-га і 7-га тамоў 10-томнага збору твораў І. Мележа, складальнік «Летапісу жыцця і творчасці Максіма Гарэцкага», змешчанага ў 4-м томе 4-томнага збору твораў М. Гарэцкага. Прымала ўдзел у падрыхтоўцы біябібліяграфічнага слоўніка «Беларускія пісьменнікі».

Жыве ў Мінску.

Т. С. Голуб.

1.2.

Становление нового героя в белорусской советской прозе 20-х годов: Автореф. дис. ... канд. филол. н. Мн., 1989.

Летапіс жыцця і творчасці Максіма Гарэцкага. Мн., 1993.

Пошукі героя: З вопыту беларускай прозы 20-х гадоў. Мн., 1993.

1.3.

1978. Як сонца і паветра... // ЛіМ. 31 сак. / Пад прозв. Т. Жук; Рытмы індустрыяльнага жыцця: Рабочая тэма ў творчасці Б. Мікуліча // Беларуская літаратура. Мн., Вып. 6 / Пад прозв. Т. Жук.

1979. Роля горкаўскіх эстэтычных прынцыпаў у развіцці сучаснай прозы аб рабочым класе // Асаблівасці развіцця літаратурнага працэсу ў Беларусі на сучасным этапе. Мн.

1980. [Каментарыі] // Мележ. І. Зб. тв.: У 10 т. Мн. Т. 2 / Пад прозв. Т. Жук.

1983. Летапіс жыцця і творчасці Максіма Гарэцкага // Маладосць. № 2; Светлы талент: Да 80-годдзя з дня нараджэння Платона Галавача // ЛіМ. 15 крас.; [Каментарыі] // Мележ І. Зб. тв.: У 10 т. Мн. Т. 7; Летапіс жыцця і творчасці // Гарэцкі М. Зб. тв.: У 4 т. Мн. Т. 4.

1985. Полесье и художественный опыт Коласа (На материале трилогии «На росстанях») // Региональные особенности восточно-славянских языков, литератур, фольклора и методы их изучения. Гомель. Ч. 2.

Т. С. Голуб.

ДЗЯШКЕВІЧ МІКОЛА

Дзяшкевіч Мікола (Мікалай Аляксандравіч, 11.5.1947, в. Пагор'е Карэліцкага р-на Гродзенскай вобл.— 1.8.1971, пахаваны на радзіме), крытык, літаратуразнавец.

Нарадзіўся ў сялянскай сям'і. Скончыўшы Астухоўскую сярэднюю школу (1965), паступіў на бібліятэчны факультэт Мінскага педагагічнага інстытута, дзе вучыўся ў 1965—69. З 1968 — навуковы супрацоўнік Літаратурнага музея Янкі Купалы. Адначасова працаваў у тэатральнай студыі.

Друкавацца М. Дзяшкевіч пачаў у рэспубліканскай прэсе ў 1969. Асноўнымі творчымі захапленнямі яго былі Я. Купала і тэатр. У газеце «Літаратура і мастацтва» з'явілася навуковае даследаванне «А надпіс падкажа: Янка Купала» (1970), у якім ён асвятляе новыя факты біяграфіі класіка беларускай літаратуры. Артыкулы, эсэ М. Дзяшкевіча друкаваліся ў газеце «Звязда», часопісе «Полымя» і інш. выданнях. Ён стварыў літаратурныя партрэты артыстаў беларускага тэатра (С. Станюты, Г. Аўсяннікава і інш.). Выйшла ў свет кніга яго літаратурна-крытычных артыкулаў «Ад вытокаў радаводных...» (1991). *Г. В. Якаўлева.*

Бібліяграфія

1.2.

Ад вытокаў радаводных...: Літ.-крытыч. арт., нарысы, успаміны аўтара. Мн., 1991.

1.3.

1969. Насустрач юбілею песняра: [Я. Купалы] // Голас Радзімы. № 21; Насустрач юбілею народнага песняра // ЛіМ. 27 мая; Светлая, праўдзівая фантазія: [Рэц. на кн.: Вітка В. Казкі. Мн., 1968] // Там жа. 12 вер.; Па загадзе сэрца: [Рэц. на кн.: Алешка А. Дарогі без слядоў. Мн., 1969] // Там жа. 19 снеж.

1970. Янка Купала і кніга // Маладосць. № 6; Сваё і чужое: [Рэц. на кн.: Аляхновіч У. Палескія навелы. Мн., 1970] // Там жа. № 12; Шчодрае сонца Ушачаў: [Рэц. на кн.: Барадулін Р. Лінія перамены дат. Мн., 1969] // Звязда. 3 лют.; Дзегцярэнкі: (Вобраз Я. Купалы ў творчасці нар. умельцаў Дзегцярэнкаў): [Нарыс] // Там жа. 16 жн.; Тры размовы са Стэфаніяй Станютай; Носьбіт народнай мудрасці // Там жа. 4 ліст.; Узнёсласць і натхненне // Там жа. 18 снеж.; Памяці цёці Уладзі // ЛіМ. 6 сак.; Запаветнае: [Рэц. на кн.: Скрыган Я. Кругі. Мн., 1969] // Там жа. 15 мая; «А надпіс падкажа: Янка Купала» // Там жа. 20 ліст.

1971. Першая спроба навуковай біяграфіі: [Рэц. на кн.: Шарахоўскі Я. Пясняр народных дум. Мн., 1970] // Полымя. № 4; Ад вытокаў радаводных... // Там жа. № 10; Калі глядзець з партрэта... // Звязда. 30 чэрв.; Паўстаў пракляццем катаваны...: (Сто гадоў назад Ажэн Пацье напісаў «Інтэрнацыянал») // ЛіМ. 4 чэрв.

1975. Носьбіт народнай мудрасці // Хрэстаматыя па гісторыі беларускага тэатра і драматургіі. Мн. Т. 2.

М. П. Барташэвіч.

ДРЭЙЗІН ЮЛЬЯН

Дрэйзін Юльян Мікалаевіч [псеўд.: Арыон, Орфэй, крыпт.: Ю. Д., Д — н Ю., Ж-я, Зат-ка; 10(22).6.1879, г. Екацярынаслаў, цяпер Днепрапятроўск — 28.3.1942, Масква], музыказнавец, літаратуразнавец, крытык, публіцыст, перакладчык.

Пра дзяцінства і юнацтва Ю. Дрэйзіна звесткі скупыя. Вучыўся на медыцынскім і гісторыка-філалагічным факультэтах Юр'еўскага (Тартускага) універсітэта (1900—03). Скончыў гісторыка-філалагічны факультэт Маскоўскага універсітэта (1908). Займаўся па класу скрыпкі ў Г. Дулавай і Б. Сібора. З 1908 да 1918 выкладаў грэчаскую і лацінскую мовы ў Магілёўскай мужчынскай гімназіі, тэарэтычныя прадметы — у музычнай школе. З 1925 жыў у Мінску. Выкладаў гісторыю музыкі ў Беларускім музычным тэхнікуме і Беларускай кансерваторыі, антычныя мовы — у Камвузе і БДУ, працаваў у АН Беларусі. У 1935 пераехаў у Маскву. Выкладаў грэчаскую мову ў Інстытуце тэатральнага мастацтва, літаратуру і гісторыю — у педінстытуце. З 1938 — дацэнт філалагічных факультэтаў Маскоўскага універсітэта і педінстытута.

Першая вядомая нам публікацыя Ю. Дрэйзіна датуецца 1925. Пісаў рэцэнзіі на тэатральныя спектаклі («Новая пастаноўка БДТ-2 — «Каля тэрасы» (па п'есе М. Грамыкі)», артыкулы пра творчасць беларускіх паэтаў («Антычныя матывы ў паэзіі М. Багдановіча»), а таксама вершы (некаторыя з іх паклаў на музыку М. Аладаў). Аўтар шматлікіх артыкулаў і навуковых прац па актуальных праблемах развіцця нацыянальнага музычнага мастацтва. Складальнік слоўніка «Музычныя тэрміны». Перакладаў з арыгіналаў на беларускую мову лібрэта класічных опер («Фаўст» Ш. Гуно, «Севільскі цырульнік» Д. Расіні, «Кармэн» Ж. Бізэ, «Русалка» А. Даргамыжскага, «Заслаты пеўнік» М. Рымскага-Корсакава і інш.), творы антычных аўтараў: урыўкі з «Іліяды» Гамера, трагедыю Сафокла «Антыгона», а таксама, як сведчыў Я. Барычэўскі, «Адысею» Гамера (разам з М. Грамыкам), трагедыі «Цар Эдып» Сафокла, «Вакханкі» Эўрыпіда, камедыю Арыстафана «Лісістрата», філасофскую паэму Лукрэцыя «Аб прыродзе рэчаў» (на жаль, большасць з перакладаў не былі ў свой час апублікаваны). Аўтар лібрэта оперы М. Аладава «Тарас на Парнасе». Пісаў нарысы пра творчасць беларускіх (А. Туранкова, Р. Пукста, М. Аладава, М. Чуркіна), а таксама рускіх і зарубежных кампазітараў. Спрыяў папулярызацыі беларускага нацыянальнага мастацтва, даследаваў сувязі беларускай, украінскай і рускай музычных культур. У артыкуле «Новыя плыні ў сучаснай музыцы» разважаў пра імпрэсіянізм і экспрэсіянізм, што дало падставу ў сярэдзіне 1930-х г. абвінаваціць аўтара ў прытупленні палітычнай пільнасці. На самой справе погляды Ю. Дрэйзіна на псіхалогію творчасці, прыроду творчага натхнення вызначаліся ўнутранай паслядоўнасцю, прынцыповым непрыняццем ідэалістычных трактовак мастацтва і паэтычнай творчасці. Ён закранаў пытанні, якія мелі агульнаэстэтычнае і метадалагічнае значэнне, адным з першых на Беларусі распрацоўваў праблемы навуковай музычнай тэрміналогіі, лічыў, што ў мастацтве новага часу галоўнае — усебаковае развіццё асобы. Таму працы Ю. Дрэйзіна не страцілі свайго значэння і ў наш час.

Л. С. Савік.

Бібліяграфія

1.3.

1925. Новыя плыні ў сучаснай музыцы // Полымя. № 3; Музыка ў творах беларускіх паэтаў // Там жа. № 4, 6; Музыка в БССР // Трыбуна мастацтва. № 1; Новые белорусские музыкальные произведения // Там жа. № 13.

1926. Музыка ў творах Якуба Коласа // Якуб Колас ў літаратурнай крытыцы. Мн.

1927. Як пішуцца часам «папулярныя» брашуры // Узвышша. № 6; Новая пастаноўка БДТ-2 — «Каля тэрасы» (па п'есе М. Грамыкі) // Звязда. 22 ліст.; Збіральнік беларускае песні А. А. Грыневіч // Сав. Беларусь. 22 мая; Папулярызатар беларускай песні У. В. Тэраўскі // Там жа. 28 жн.; Маскоўская мастацкая опера // Там жа. 30 жн.; Музыка і грамадзянства // Там жа. 11 вер.; Сімфонія і беларуская музыка // Там жа. 16 вер.; Музыка і тэхніка вырабу // Там жа. 18 вер.; Бетховен-грамадзянін // Там жа. 5 кастр.; Музыка ў «Апраметнай» // Там жа. 23 кастр.

1928. Музыка ў творах Янкі Купалы // Янка Купала ў літаратурнай крытыцы. Мн.; Антычныя матывы ў паэзіі М. Багдановіча // Узвышша. № 2.

1929. Франц Шубэрт: Да стагоддзя з дня смерці 19/XI — 1828 г.— 19/XI — 1928 г. // Узвышша. № 1.

1933. Н. Паганіні: Да 150-годдзя з дня нараджэння // Мастацтва і рэвалюцыя. № 1—2.

1934. Музыка і літаратура // ЛіМ. 18 чэрв.

1.4.

С а ф о к л. Антыгона / З старажытнагрэч. Мн. 1926.

1928. Г а м е р. Развітанне Гектара з Андрамахай: Урывак з «Іліады» / З старажытнагрэч. // Узвышша. № 3.

1.6.

М у з ы ч н ы я тэрміны. Мн., 1926 / Скл.

2.3.

На беларускай мове. Б а р ы ч э ў с к і А. Сучаснае ў мінулым // Узвышша. 1928. № 3; Д у н е ц Х. Нацфілаўскія адкравенні Дрэйзіна // Звязда. 1935. 30 студз.; К а л е с н і к У. Ветразі Адысея. Мн., 1977. С. 294—296; Літаратурная хроніка // Голас беларуса. 1926. 25 сак.; М у ш ы н с к і М. Беларуская крытыка і літаратуразнаўства (20—30-я гады). Мн., 1975. С. 33—35.

На рускай мове. Л а п и д у с Н. Античная классика в белорусских переводах // Лапидус Н. Зарубежная литература в белорусских изданиях и переводах. Мн., 1968. С. 27—29, 31—33, 36.

Т. М. Махнач.

ДУБАВЕЦ СЯРГЕЙ

Дубавец Сяргей Іванавіч (псеўд.: Алесь Кебік, Андрэй Корсак, Іван Мялешка, Сяргей Паўлоўскі, Адам Праціста, С. Пхоў, крыпт.: С. Д., С. П. і інш.; н. 17.9.1959, г. Мазыр), празаік, крытык, выдавец.

Нарадзіўся ў сям'і педагогаў Зоі Паўлавай і Івана Дубаўца. Належыць да старога палескага роду Дубаўцоў з котлішчам у в. Мялешкавічы (Мазырскі р-н). У дзяцінстве разам з бацькамі пераехаў у Мінск. Тут ён закончыў СШ № 4 (1976), працаваў слесарам на заводзе «Гарызонт», выпускаючым у газеце «На страже Октября». У час службы ў Савецкай Арміі выконваў абавязкі карэспандэнта дывізійных газет унутраных войск — спачатку ў Вільні (Мінскі полк), потым у Мінску (Белполк). У 1984 скончыў факультэт журналістыкі БДУ і працаваў малодшым рэдактарам рэдакцыі літаратуры БелСЭ. Пасля выехаў у Гомель, дзе працаваў у рэдакцыі абласной газеты «Гомельская праўда». З 1987, жывучы ў Маладзечне, працаваў у аддзеле крытыкі і мастацтва часопіса «Нёман». З 1990 жыве ў Вільні, працуе галоўным рэдактарам газеты «Наша ніва». Узнагароджаны медалём Літоўскай Рэспублікі «13 студзеня» за адвагу і самаахвярнасць, праяўленыя пры абароне незалежнасці Літвы.

Літаратурную дзейнасць пачаў з публікацый у «самвыдаце». У рэспубліканскім друку з артыкуламі і рэцэнзіямі выступае з 1982. Друкаваўся ў зборніках «Дзень паэзіі», «З гісторыяй на Вы», «Вобраз», часопісах «Полымя», «Нёман», «Крыніца», «Вильнюс», «Дружба народов», газетах «Наша ніва», «Свабода» (сталая калонка), «Литературная газета» і інш. Напісаў прадмовы да кніг «Мур» Ж.-П. Сартра (1991), «Адвечным шляхам» І. Абдзіраловіча (1993; гэты твор пераклаў на рускую мову для «Нёмана»). Аўтар кнігі «Практыкаванні: Проза, эсэ, крытыка» (1992). Адметныя рысы творчасці С. Дубаўца — апантанасць і бескампраміснасць у адстойванні ідэі нацыянальнай незалежнасці, публіцыстычнасць стылю.

Жыве ў Вільні.

А. В. Мальдзіс.

Бібліяграфія

1.2.

Практыкаванні: Проза, эсэ, крытыка. Мн., 1992.

1.3.

1982. «Людзі на балконе» // Голас Радзімы. 1 крас.; Глыбокае // Там жа. 28 кастр.; Творчасць песняроў і славянскі свет // ЛіМ. 29 кастр.; А прафесіяналізму хапае!.. // Там жа. 12 ліст.

1983. Бойцеся слова! // ЛіМ. 4 сак.; Так склалася, напісалася...: [Рэц. на кн.: Пісарык А. Белы май. Мн., 1983] // Там жа. 1 ліп.; Аповяд гаваркога дзядзькі: [Рэц. на: Дубінка В. Браты святой ночы // Маладосць. 1983. № 4] // Там жа. 29 ліп.; «Світае дрэва зеляніней»: [Рэц. на кн.: Каско А. Скразная лінія. Мн., 1983] // Там жа. 2 вер.; Права на будучыню: [Рэц. на кн.: Семашкевіч Р. Выпрабаванне любоўю. Мн., 1982] // Там жа. 30 вер.

1984. Для тых, хто бачыць, думае, разумее: [Інтэрв'ю з В. Быкавым] // Сучаснік. Мн.; На мяжы зместу і формы: [Рэц. на кн.: Дашкевіч В. Загадка Атлантыды. Мн., 1983] // Маладосць. № 6; [Адказы на анкету «Маладосці»] // Там жа. № 11; Зразумець сябе: [Інтэрв'ю з В. Быкавым] // Полымя. № 1; «Грэх ды бяда — на каго не жыве» // Гомел. праўда. 13 ліст.; На гомельскай сцэне — «Арыэль» // Там жа. 1 снеж.; Мастацкая ўмоўнасць і вынік працы // Чырв. змена. 21 чэрв.

1985. У старасховах і памяці сведкаў: [Рэц. на кн.: Каханоўскі Г. Адчыніся, таямніца часу. Мн., 1984] // Полымя. № 12; Пра «выхадцаў» і тых, хто застаўся // Гомел. праўда. 25 студз.; «Фізікі» без лірыкаў // Там жа. 3 жн.; П'еса пра драматурга // Там жа. 20 снеж.; Плён дваццаці гадоў: [Рэц. на кн.: Родчанка Р. Альгерд Абуховіч-Бандынэлі. Мн., 1984] // ЛіМ. 8 сак.; Што адгукнецца ў нашым слове?: [Інтэрв'ю] // Там жа. 18 кастр.

1.5.
На рускую мову. Понять себя...: [Інтэрв'ю] / Пер. Н. Ігрунова // Дружба народов. 1984. № 6.
1.6.
«Т у т э й ш ы я». Мн., 1989 / Скл.
В о б р а з — 90. Мн., 1990 / Скл.
2.3.
На беларускай мове. Я р а ц В. Справа не аднаго дня // Гомел. праўда. 1985. 1 мая. *М. П. Баргашэвіч.*

ДУДЗІЦКІ УЛАДЗІМІР

Дудзіцкі Уладзімір [сапр. Г у ц ь к а Уладзімір Ермалаевіч; 27.12. 1910 (8.1.1911), в. Дудзічы Ігуменскага пав. Мінскай губ. (цяпер Чэрвеньскі р-н) — ?], паэт, празаік, перакладчык, публіцыст, грамадска-палітычны і культурны дзеяч.

У сялянскай сям'і, дзе нарадзіўся і вырас У. Дудзіцкі, было 8 дзяцей. Для іх адпаведнага выхавання бацькі не мелі сродкаў. Хлопчык з маленства ўведаў цану хлебу. Дапамагаючы маці, старэйшым братам і сёстрам, шмат працаваў на гаспадарцы. Бацьку У. Дудзіцкі страціў, калі яму не споўнілася яшчэ і года. Калі хлопчыку было 7 гадоў, яго маці выйшла замуж другі раз. Матэрыяльнае становішча сям'і крыху палепшылася. Але паколькі пачалася першая сусветная вайна і двух старэйшых братоў У. Дудзіцкага прызвалі ў войска, цяжкасці ўзніклі зноў. Своечасова пайсці ў школу хлопчык не змог, бо займаўся гаспадаркай. У 1926, у 16-гадовым узросце, ён скончыў народную школу ў в. Дудзічы. У 1927 У. Дудзіцкі пераехаў у Мінск і паступіў у сямігадовую школу № 22, якую ў 1928 вымушаны быў кінуць з-за смерці брата. У 1930 з вялікімі перашкодамі скончыў сямігодку, 2-гадовыя настаўніцкія курсы (марыў стаць настаўнікам, выкладаць беларускую мову і літаратуру). У верасні 1930 ён паступіў у Мінскі педагагічны тэхнікум імя Ус. Ігнатоўскага, адкуль яго, аднак, выключылі як «нацдэма». Пасля доўгага напаўгалоднага бадзяння У. Дудзіцкаму з дапамогай беларускіх пісьменнікаў Л. Калюгі, У. Хадыкі і інш. удалося ўладкавацца на працу — стылістам у рэдакцыю газеты «Савецкая Беларусь». Пазней працаваў стыльрэдактарам у Навукова-тэхнічным выдавецтве Акадэміі навук БССР, адначасова вучыўся на падрыхтоўчых курсах для паступлення ў вышэйшыя навучальныя ўстановы пры БДУ (скончыў іх датэрмінова) і пераведзены на 1-ы курс літаратурна-лінгвістычнага факультэта Мінскага вышэйшага педагагічнага інстытута. Там пасябраваў з маладымі беларускімі паэтамі, спрабаваў сам пісаць па-беларуску, за што быў выключаны і з інстытута. 23 лютага 1933 органамі НКУС г. Мінска У. Дудзіцкі быў арыштаваны і зняволены ў Мінскай турме, потым — у «амерыканцы»... Згодна з пастановай Калегіі НКУС СССР пасля 9 месяцаў допыту ён быў высланы ў папраўча-працоўныя (канцэнтрацыйныя) лагеры Сібіры тэрмінам на тры гады. У 1934—35 адбываў пакаранне ў Новасібірску, Марыінску. Пасля атрымаў год ссылкі ў Сярэднюю Азію (Ташкент), дзе прытулкам паэта, па яго словах, былі «сады і узбекская чайхана». Атрымаў часовую працу літаратурнага работніка ў газеце «Физкультурник Узбекистана». Захварэўшы на малярыю, праз год У. Дудзіцкі дамогся звароту на Беларусь. Паводле загаду Мінскага НКУС ён павінен быў асесці ў Віцебску. Жывучы там, экстэрнам здаў экзамены за Вышэйшы педагагічны інстытут. Пэўны час працаваў выкладчыкам беларускай мовы і літаратуры ў сярэдніх школах (№ 6, № 10, № 22, № 23, № 28, № 35, № 44), на медыцынскім рабфаку, у Віцебскім педагагічным інстытуце, пазней — стылістам у рэдакцыі газеты «Віцебскі пралетарый». У 1939 у адпаведнасці з загадам Віцебскага абкома КП(б)Б У. Дудзіцкага звольнілі з настаўніцкай працы за тое, што ён «не патрапіў забяспечыць партыйнасці пры выкладанні беларускай мовы і літаратуры». Пад пагрозай арышту паэт быў вымушаны пакінуць Віцебск, а потым і Беларусь. Некаторы час жыў у Расіі. Пасля вярнуўся на Бацькаўшчыну, дзе хаваўся ў самых розных мясцінах. Напярэдадні Вялікай Айчыннай вайны ўладкаваўся выкладчыкам беларускай мо-

вы і літаратуры ў в. Курасоўшчына пад Мінскам. У гады акупацыі У. Дудзіцкі жыў у Мінску, Барысаве. У 1941—42 ён займаў пасаду загадчыка аддзела культуры Мінскай гарадской управы, у 1942 — аналагічную пасаду ў гарадской управе Барысава і ўзначальваў «Беларускую народную самапомач». У 1943 пераехаў у Мінск. Увайшоўшы ў склад створанай акупантамі Беларускай цэнтральнай рады (БЦР), узначаліў аддзел прапаганды вайсковага фарміравання Беларускай краявой абароны. З'яўляўся сябрам Цэнтральнага ўрада Беларускага культурнага згуртавання (арганізацыя зарэгістравана 6.2.1944 А. Калубовічам). У красавіку 1944 У. Дудзіцкага абралі кіраўніком аддзела прапаганды беларускай культуры Беларускага культурнага згуртавання. Ён актыўна супрацоўнічаў з беларускамоўнымі выданнямі, утворанымі пры падтрымцы акупацыйных улад. У 1944 У. Дудзіцкі выехаў у Германію. Напачатку жыў у Берліне і па-ранейшаму працаваў у БЦР. Закончыў курсы нямецкіх прапагандыстаў у м. Добендорф. У лістападзе 1944 выйшаў са складу БЦР і ўзначаліў ва ўласаўскіх войсках т. зв. беларускую групу пры аддзеле прапаганды. Напрыканцы Вялікай Айчыннай вайны ён служыў у прапагандысцкім органе «Вінета» пры ўсходнім аддзеле Міністэрства прапаганды Германіі. Калі вайна скончылася, нейкі час жыў у лагерах для перамешчаных асоб у амерыканскай акупацыйнай зоне. Потым перасяліўся ў Венесуэлу. Атрымаўшы запрашэнне працаваць у беларускай рэдакцыі радыёстанцыі «Свабода», пераехаў у Мюнхен. У 1950 — пачатку 1960 У. Дудзіцкі быў галоўным рэдактарам беларускай рэдакцыі радыё «Свабода». Прыблізна ў 1961 эміграваў у ЗША. Уладкаваўся на працу ва універсітэт г. Блумінгтана (штат Індыяна) у якасці выкладчыка рускай мовы. Неўзабаве вярнуўся ў Венесуэлу. Паводле звестак жонкі У. Дудзіцкага, Веры Уладзіміраўны, у 1970-я г. наведаў Савецкі Саюз і там знік (называўся лагер у Мардовіі). Аднак меркаванне пра

зварот У. Дудзіцкага ў СССР спрэчнае. Дакладнай інфармацыі пра месца і дату яго магчымай смерці пакуль няма. Па крымінальнай справе за 1933 У. Дудзіцкі рэабілітаваны ў 1956.

Цікавасць да мастацкага слова ва У. Дудзіцкага абудзілася ў дзяцінстве і асабліва развілася за гады вучобы ў сярэдняй школе. Немалую ролю ў фарміраванні творчай асобы паэта адыграў выкладчык беларускай мовы і літаратуры сямігадовай школы Ігнат Зянько, якога У. Дудзіцкі ўспамінаў з вялікай удзячнасцю. Друкавацца пачаў у 1937. У час нямецкай акупацыі Беларусі выступаў з вершамі, паэмамі, артыкуламі ў газетах «Новая дарога», «Голас вёскі», «Беларуская газета», «Беларускі работнік», часопісах «Новы шлях», «Раніца». Апынуўшыся за межамі Бацькаўшчыны, друкаваўся ў беларускіх эміграцыйных газетах «Беларус», «Бацькаўшчына», часопісах «Божым шляхам», «Пагоня», «Шыпшына», «Моладзь», «Кохам», «Нашадні», у альманаху беларускіх эміграцыйных паэтаў і пісьменнікаў «Ля чужых берагоў» (Мюнхен, 1955). У літаратурных колах беларускай эміграцыі на Захадзе набыў вядомасць як аўтар цыклаў вершаў і паэм, як перакладчык. Яго багатая творчая спадчына прадстаўлена і іншымі жанрамі літаратуры — фельетонамі, апавяданнямі, успамінамі і інш. Тонкі пранікнёны лірык, ён быў паэтам пераважна сумна-настальгічнага гучання. У глыбока нацыянальнай форме ён выказваў пачуцці смутку па Бацькаўшчыне, трывогі за лёс Беларусі. У яго творах адлюстраваны трагічны, складаны, пакручасты жыццёвы шлях паэта. Акалічнасці біяграфіі У. Дудзіцкага, неверагодна жорсткія, бязлітасныя ў дачыненні да асобы паэта, не згасілі веру ў высокае прызначэнне Радзімы. Вобраз Беларусі азораны святлом натхнёнай любові да роднага краю. Развітая моўная культура дазволіла яму добра выявіць сваю мастацкую індывідуальнасць.

С. Б. Сачанка.

Бібліяграфія

1.2.
Напярэймы жаданьням. Нью-Йорк. 1994.

1.3.
1942. Напярэймы жаданьням: [Верш] // Бел. газета. 13 снеж.

1943. Не зракуся: [Верш] // Новы шлях. № 16; Крокі і вёрсты; На парозе турмы; А ратунку не было й няма; Пакуль песня яшчэ не спета; «Падыйшла і сказала: «Ларыса...»: [Вершы] // Там жа. № 20; Хай пеніцца віно: [Верш] // Там жа. № 23; Я з песняй упоруч пайду: [Верш] // Бел. газета. 7 студз.; Пела мне маці: [Верш] // Там жа. 10 лют.; Не шкадую яго і не плачу: [Верш] // Там жа. 8 крас.; Хутчэй, хутчэй...: [Верш] // Там жа. 20 крас.; Не прадам я ніколі вясны...: [Верш] // Там жа. 24 ліп.; Кідаў я сеці ў глыб рачную: [Верш] // Там жа. 7 жн.; Ізноў я тут: [Верш] // Там жа. 14 жн.; Кляцьве духу ня зрадзім ані: [Верш] // Там жа. 18 вер.; Калі жыццё пастаўлена на карту: [Верш] // Там жа. 27 ліст.; Былое трупам мусіць пасьці: [Верш] // Там жа. 1 снеж.

1944. «Дагарэла сонечнае лета...»: [Верш] // Бел. работнік. № 37; Балючым накіпам свае крыві; Жывое, праўдзівае слова: [Вершы]; «Даруй, што я плачу» (замест успамінаў) // Там жа. № 39; Была восень: [Верш] // Новы шлях. № 3; Нараджаецца свет неапеты: [Верш] // Раніца. № 38.

1945. Апошняя малітва: [Верш]; Сон Зьнябыціча: Апавяданне // Пагоня. № 1.

1946. Маліцца хочам на радзіме: (Урывак з паэмы «Прысяга») // Пагоня. № 2; Ізноў я тут. Блізкі і такі знаёмы; Балючым накіпам свае крыві; Я з песняй упоруч пайду: [Вершы] // Там жа. № 3; З паэмы «Звер двуногі» // Там жа. № 4; Маем сілу і край свой: [Верш] // Шыпшына. № 1.

1947. Ад сына твайго, Беларусь: [Верш]; Для несьмяротнай Беларусі: (З паэмы «Маіх уяў ружовых ранкі»); Апошняя малітва: [Верш] // Божым шляхам. № 1; Сон Зьнябыціча: Апавяданне // Там жа. № 2; Ізноў я тут. А я — наадварот: [Верш] // Шыпшына. № 4; І мала слоў...; «Дарэмна прамяняў я сон начы...»; «Ня першы раз і не апошні, мусіць...»: [Вершы] // Там жа. № 5.

1949. Прыдзі: Санет // Божым шляхам. № 3; На скрыжаваньні: [Верш] // Там жа. № 4; Цьмяная пляма; Дымяцца хмары: [Вершы] // Там жа. № 9—10; Каб хоць раз усьміхнулася шчасьце: [Верш] // Моладзь. № 12; Моладзі; З цыклю «Цені сьмерці; «Ня сыходзяцца горы з горамі...»: [Вершы] // Там жа. № 15.

1950. Цьмяныя плямы: [Верш] // Божым шляхам. № 2—3; Дымяцца хмары; «Каля вакна равеснік клён...»: [Вершы] // Шыпшына. № 8; Адменная ода; Здрада: [Вершы] // Там жа. № 9.

1953. Вязанка новых вершаў: Даты і іксы; Спрытныя жарты; Ні маністаў, ні зораў; «Я — ж адзін ля вакна...»; Каб хоць раз усьміхнулася шчасьце; Пякельны дар; Ня сыходзяцца горы з горамі; Прыдзі // Бацькаўшчына. № 21—22.

1954. Вязанка вершаў: «Ня першы раз і не апошні, мусіць...»; Дымяцца хмары; Цьмяныя плямы; Адменная

ода; Думка; І мала слоў...; На скрыжаваньні // Бацькаўшчына. № 32—33; Для несьмяротнай Беларусі: (З паэмы «Маіх уяў ружовых рашкі») // Там жа. № 36—37.

1955. «Ня першы раз і не апошні, мусіць...»; Дымяцца хмары; Цьмяныя плямы; Адменная ода; Думка; І мала слоў; Даты і іксы (Юрку Віцьбічу); Спрытныя жарты; Ні маністаў, ні зораў; Каб хоць раз усьміхнулася шчасьце; Пякельны дар; Ня сыходзяцца горы з горамі; Прыдзі: [Вершы]; З цыклю «Журботныя струны»: [Вершы] // Ля чужых берагоў. Мюнхэн; Журботныя струны; Сьвітанак; Вусны і песьні; Вялікія шэльмы; Жалоба; Жыцьцё; Далей і далей; Неспадзявана: [Вершы] // Бацькаўшчына. № 12—13; Няпослуху дзівацкага сакрэт; Вузкі строй дугі; Сябрам; Жылачка; На ганьбішчы славы: [Вершы] // Там жа. № 15—16; Цьмяныя плямы; Жыву і ня жыву; Навальніца; Напярэймы жаданьням; Жывое, праўдзівае слова; І мала слоў; Не памагу я; Хутчэй, хутчэй; Ля роднай бацькоўскай мяжы; Не зракуся: [Вершы] // Там жа. № 40—41; Выбраныя вершы: Маем сілу і край свой; Наадварот; Пела мне маці (песьня); Дымяцца хмары; З паэмы «Ружовы ганак»; Пціч // Там жа. № 47—48; Чорная карта; Я не ведаю, дзе ты...; Зь ліра-паэмы «Сьцені»: [Вершы] // Конадні. № 3; Глухія шчасьця крокі; Кавалачак неба; Шчасьце; Грахі; Пракалоліся вочы жалю; Шляхі: [Вершы] // Там жа. № 4.

1956. Успаміны // Бацькаўшчына. № 23—30, 32, 34, 37; Падбітыя рытмы: Васільковыя гады; Маладзіца; Не прабуджае сонца раньне; Сябры; Ня было і няма...; Мама; Песьня; Жоўтагрывістыя хмары; На станцыі начы; Мой сьвет: [Вершы] // Там жа. № 28—29.

1957. Птушцы — крылы, чалавеку — свабода: [Фельетон] // Бацькаўшчына. № 6; Піраміда клясавых супярэчнасьцяў: [Фельетон] // Там жа. № 9; Пачатак канца: (Адрыўны савецкі каляндар!..) // Там жа. № 10; Дваццаць' пяты: [Верш] // Там жа. № 11—12; Сіла духовага супраціву // Там жа. № 15—16; Я з песьняй упоруч пайду: [Верш]; Падумайце самі...: Фельетон // Там жа. № 19; Максіму Багдановічу: [Цыкл вершаў] // Там жа. № 23; «...Нашы думкі...»; «...Сьціскаюць хвалі...»; Дзьве дарогі: Прыйшлі і вернемся...: [Вершы]; Урывак з паэмы «Гранітныя абвалы»; Чорная курыца: Апавяданне // Там жа. № 35—36; Гераізм і «гэраізм» // Там жа. № 39; Сэрца Паўла Буро: Апавяданне // Там жа. № 42—43.

1958. Прысяга: Паэма // Бацькаўшчына. № 1—2; Апошні ліст календара: [Верш] // Там жа. № 4; «Ёсць такія на свеце людзі...»; «І чуваць здалёку...»; «Ёсць у нашай малітве словы...»: [Вершы] // Там жа. № 41—42; Станіславу Станкевічу: [Верш] // Там жа. № 43; Андрэй Сякера: Навела // Там жа. № 45—46; Куды вочы глядзяць: Апавяданне; Манэкену; Ня ведаю...; Званы: [Вершы] // Там жа. № 49—50; З цыкла «Венесуэла»: Сіла рэчы; Помнікі і абеліскі: [Вершы] // Конадні. № 5—6.

1959. Куды вочы глядзяць...: [Апавяданне] // Бацькаўшчына. № 1—2.

1.4.

1953. Шаўчэнка Т. Запавет: [Верш] / З укр. // Бацькаўшчына. № 12—13.

1.5.

На польскую мову. Oda / Tł. J. Łobodowski // Kultura. 1951. № 7—8; Конадні. 1954. № 2.

2.3.

На беларускай мове. [Біябібліяграфічная нататка] // Ля чужых берагоў. Мюнхэн, 1955. С. 55; Сачанка Б. З малавядомага і забытага // ЛіМ. 1991. 28 чэрв.

Т. М. Махнач.

ДУКТАЎ УЛАДЗІМІР

Дуктаў Уладзімір Уладзіміравіч (н. 28.12. 1953, г. Крычаў Магілёўскай вобл.), празаік. Член СП Беларусі з 1994.

Нарадзіўся ў сям'і служачых. Пасля заканчэння школы займаўся на факультэце журналістыкі БДУ (1971—76). У 1986—87 вучыўся ў ВПШ. З 1976 працаваў карэспандэнтам клімавіцкай раённай газеты «Новае жыццё». З 1977 — лектар, з 1979 — намеснік загадчыка аддзела, з 1980 — загадчык аддзела Магілёўскага абкома камсамола. З 1982 — загадчык аддзела Кастрычніцкага райкома партыі г. Магілёва, з 1984 — інструктар Магілёўскага абкома партыі. З 1987 — рэдактар магілёўскай раённай газеты «Прыдняпроўская ніва». У 1994 абраны сакратаром Магілёўскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі.

З 1986 выступае ў друку і па радыё. Аўтар кнігі прозы «Дзякуй і даруй» (1993). Друкаваўся

ў калектыўных зборніках «Галасы Прыдняпроўя», «Дняпроўскія хвалі», «Краіні», у рэспубліканскай перыёдыцы. Шмат робіць на Магілёўшчыне для адраджэння роднай мовы, нацыянальнай свядомасці. У У. Дуктава свой стыль, свая манера апавядання. Умее цікава апісаць факт, падаць характары герояў.

Жыве ў Магілёве.

В. У. Смольская.

Бібліяграфія

1.2.
Дзякуй і даруй. Мн., 1993 (Б-ка час. «Маладосць»).

М. П. Барташэвіч.

ДЭБІШ АНАТОЛЬ

Дэбіш Анатоль Іосіфавіч (н. 22.7. 1962, в. Шамятоўка Свіслацкага р-на Гродзенскай вобл.), паэт. Член СП Беларусі з 1993.

У 1979 закончыў Мсцібаўскую сярэднюю школу. Працаваў шафёрам у саўгасе «Гнезна» на Гродзеншчыне (1979—80). Пасля службы ў войску (1980—82, г. Кушка, Туркменія) паступіў у Мінскі інстытут культуры, які скончыў у 1987. З гэтага часу працуе ў Брэсце дырэктарам Дома культуры «Хімік». Брат паэта В. Дэбіша.

Літаратурную дзейнасць пачаў у 1983. Друкаваўся ў часопісах «Маладосць», «Крыніца», «Полымя», «Беларусь», штотыднёвіку «Літаратура і мастацтва», альманаху «Дзень паэзіі». У 1992 выйшаў зборнік яго вершаў «Калядная вячэра». Ужо першыя вершы А. Дэбіша вылучаліся ў маладой вершаванай плыні сваёй арыгінальнасцю, тэматыкай і вобразным ладам. Пра што б ён ні пісаў — далёкія паганскія часы ці трагедыю Курапатаў, пра сваё маленства ці каханне — за кожным радком паўстае жывая душа, не па ўзросту спакутаваная. А. Дэбіш схільны да паяднання гісторыі з сучаснасцю. Шчымлівым болем, гневам і надзеяй прасякнута яго паэма «Курапаты — 37».

Жыве ў Брэсце.

В. У. Смольская.

Бібліяграфія

1.2.
Калядная вячэра. Мн., 1992 (Б-ка час. «Маладосць»).

1.3.
1983. «Траншеями изрезанные пашни...»: [Вершы] // Нёман. № 8.

1984. «Сябрукоў галасы...»; «Сляпы каваль каня куе...»; «Зноў шугавея плаціну размыла...»; «Туман над дэсанню рані...»: [Вершы] // Маладосць. № 10; «Траншэямі парэзаныя пожні»: [Верш] // ЛіМ. 21 снеж.

1985. «Пішы пра тое — кажуць мне...»; Радзіме; «У бабкі Ганны рукі баляць...»; Жанчыны; «Траншэямі парэзаныя пожні...»; «Восень. Ціша. Ні гуку...»; «Мне, можа, гэты свет...»; «О, колькі зор на небе...»: [Вершы] // ЛіМ. 1 лют.

М. П. Барташэвіч.

ДЭБІШ ВАСІЛЬ

Дэбіш Васіль Іосіфавіч (н. 22.7. 1962, в. Шамятоўка Свіслацкага р-на Гродзенскай вобл.), паэт. Член СП Беларусі з 1993.

Закончыўшы ў 1979 Мсцібаўскую сярэднюю школу, працаваў манцёрам на чыгунцы, шафёрам у саўгасе «Гнезна» Ваўкавыскага р-на. Пасля службы ў войску (1980—82) вучыўся ў Мінскім інстытуце культуры. Пасля яго заканчэння (1987) працуе выхавацелем у ПТВ № 229 г. Брэста. Брат паэта А. Дэбіша.

Упершыню вершы В. Дэбіша надрукаваны ў 1987 у часопісе «Маладосць». Друкаваўся ў штотыднёвіку «Літаратура і мастацтва», часопісе «Беларусь», альманаху «Дзень паэзіі», зборніках «Матчына слова», «Берасцейскія карані», «Паўлюк Багрым». У 1992 выйшаў зборнік яго вершаў «Белыя птахі». В. Дэбіш — тонкі і пранікнёны лірык. У яго вершах — пачуццёва-рамантычны свет чалавека, які сумуе па чулых, далікатных, шляхетных адносінах паміж людзьмі, асэнсаванне зямнога побыту і духоўных крыніц жыцця, боль за панявечаную памяць. Звяртаецца ён і да міфалогіі.

Жыве ў Брэсце.

В. У. Смольская.

Бібліяграфія

1.2.

Белыя птахі. Мн., 1992 (Б-ка час. «Маладосць»).

М. П. Барташэвіч.

ЕЗАВІТАЎ КАСТУСЬ

Езавітаў Кастусь [Канстанцін] Барысавіч [псеўд.: Кастусёнак; крыпт.: К-нак, К. Е., К. Ез.; 5.11.1893 г. Дзвінск (цяпер Даўгаўпілс, Латвія) — 23.5.1946, Мінск], паэт, публіцыст, гісторык, дзеяч беларускага нацыянальнага адраджэння.

Нарадзіўся ў сям'і капітана царскай арміі. У 1916 скончыў Віцебскі настаўніцкі інстытут і Паўлаўскае вайсковае вучылішча ў Пецярбургу. У чыне паручніка ўдзельнічаў у 1-й сусветнай вайне. У 1917 арганізаваў у сваім пяхотным палку беларускую групу. Ад яе быў выбраны дэлегатам на з'езд беларусаў-вайскоўцаў у Віцебску, затым — на I Усебеларускі кангрэс, дзе стаў намеснікам старшыні Цэнтральнай Вайсковай Рады. У лютым 1918 К. Езавітаў камендант Мінска, узначаліў беларускі полк. Маючы талент арганізатара, шмат часу аддаваў стварэнню беларускіх вайсковых фарміраванняў. У сакавіку 1918 увайшоў у Раду Беларускай Народнай Рэспублікі, удзельнічаў у абвяшчэнні дзяржаўнай незалежнасці Беларусі. У першым урадзе БНР быў міністрам вайсковых спраў, атрымаў званне палкоўніка. Разам з Радай БНР эміграваў у Літву. У 1919 эміграцыйны ўрад БНР у Коўна накіраваў К. Езавітава ў Латвію і Эстонію з вайскова-дыпламатычнай місіяй. У 1920 той жа ўрад прысвоіў яму званне генерал-маёра. У 1921 К. Езавітаў прыняў латвійскае грамадзянства, распачаў арганізацыйную і культурна-асветніцкую працу сярод этнічных беларусаў Латвіі. Заснаваў у Дзвінску культурна-асветнае таварыства «Бацькаўшчына». Працаваў дырэктарам беларускай гімназіі ў Дзвінску, потым у Люцыне. У хуткім часе яго намаганнямі былі адкрыты ў Латвіі дзесяткі беларускіх школ і настаўніцкія курсы, а пры Міністэрстве асветы створаны Беларускі аддзел. Аднак у 1923 у Латвіі пачаўся ўціск беларускай нацыянальнай меншасці, школы зачыняліся, а вясной 1924 была сфабрыкавана справа аб тым, нібыта беларусы жадаюць далучыць частку латышскіх зямель да Беларусі. Сярод беларускіх дзеячаў пачаліся арышты. К. Езавітаў быў зняволены на 11 месяцаў у турме да суда, бо не здолеў выплаціць вялікага залогу. У красавіку 1925 адбыўся суд, які апраўдаў усіх абвінавачаных. К. Езавітаў зноў стаў займацца грамадскай і культурна-асветніцкай працай: рыхтаваў і выдаваў падручнікі для школ, ладзіў беларускамоўную прэсу («Голас беларуса», «Беларуская школа ў Латвіі»), арганізоўваў таварыствы («Беларуская хата», «Прасвета», «Рунь» і інш.). У 1930-я г. ён старшыня Беларускага нацыянальнага аб'яднання ў Латвіі, настаўнік. Эмігранцкі пісьменнік К. Акула прыгадвае ў аповесці «Змагарныя дарогі»: «вучні беларускіх школ у Латвіі ўспамінаюць Езавітава не толькі як выдатнага настаўніка. Для іх ён быў перш за ўсё... нацыянальным бацькам». Арганізацыяй беларускіх школ у Латвіі К. Езавітаў займаўся да чэрвеня 1944, да таго, як быў адкліканы Беларускай Цэнтральнай Радай у Мінск для ўдзелу ў II Усебеларускім кангрэсе. На кангрэсе ён быў выбраны членам Рады, рэферэнтам па вайсковых справах. Вярнуўся ў Рыгу. У жніўні 1944 выехаў у Берлін. У рангу генерала займаўся мабілізацыяй беларусаў у Беларускую Краёвую Абарону і пяхотную дывізію «Беларусь». 15 красавіка 1945 яму зрабілі аперацыю ў гарадскім шпіталі г. Фінстэрвальдэ. Пры наступленні савецкіх войскаў 26 красавіка 1945 К. Езавітаў быў арыштаваны контрразведкай «Смерш» I-га Украінскага фронту, перавезены ў Маскву на Лубянку, а ў кастрычніку 1945 па патрабаванні Цанавы — у Мінск. Памёр у час следства ў шпіталі гарадской турмы МУС БССР (як адзначалася ў даведцы, «ад туберкулёзу лёгкіх пры дыстрафіі 3-й ступені»).

Творчая спадчына К. Езавітава досыць разнастайная: гісторыка-папулярныя нарысы, публіцыстыка, вершы, успаміны. Упершыню выступіў у друку ў 1918 у часопісе «Варта» з гістарычнымі нататкамі «Вызваленне Мінска: запіскі каменданта». Валодаючы літаратурным талентам, ён імкнуўся дакументальна зафіксаваць развіццё нацыянальна-адраджэнцкай справы сярод беларусаў у Латвіі і Літве («Беларуская школа ў Латвіі», «Беларускае культурна-асветнае таварыства «Бацькаўшчына» ў Латвіі», «Да арганізацыі беларускае нацыянальнае меншасці ў сучаснай Літве» і інш.),

папулярызаваў сярод беларускага настаўніцтва гісторыю Беларусі («Беларусь у мінулым і сучасным»), на факталагічнай аснове ўзнаўляў гістарычныя адносіны паміж беларусамі і палякамі («Беларусы і палякі»). Адным з першых К. Езавітаў заняўся вывучэннем беларускай дыяспары («Беларусы ў Сібіры і на Далёкім Усходзе», «Беларусы ў Літве», «Беларусы ў Латвіі»). Пазней сталі вядомыя яго дакументальна абгрунтаваныя ўспаміны пра І Усебеларускі кангрэс, іншыя ўзоры мемуарнага жанру. У перыяд турэмнага зняволення ярка раскрыўся паэтычны дар К. Езавітава. Яго вершы арганічна ўліваліся ў плынь адраджэнскай літаратуры сваёй тэматыкай і пафасам. Беларусь, родная краіна, якая паўстае з паняволенага стану да свайго адраджэння, становіцца адзіным прадметам паэтычнага абагаўлення і служэння. Бачачы і перажываючы цяжкае становішча, у якое трапіла Бацькаўшчына, паэт, як і ўсе адраджэнцы, верыў у шчаслівую будучыню роднага краю, разлічваў на волю, якая прынясе «жывую ваду», каб загаіць раны на целе краіны. У 1925—26, калі напісана большасць вершаў К. Езавітава, ён шчыра спадзяваўся, што аб'яднанне Беларусі ў адзіны шчаслівы дом будзе ісці з «цэнтральнай» (савецкай) Беларусі. У вершы «Беларусу-эмігранту» ён заклікаў вяртацца туды сыноў Бацькаўшчыны, што апынуліся ў эміграцыі, а таксама звяртаўся да заходняга беларуса з заклікам: «Не хілісь прад нядоляю злой,— на Усход накіруй цьвёрды шлях». Сам К. Езавітаў, аднак, устрымаўся ад вяртання ў Савецкую Беларусь. А ў пазнейшы час, бачачы рэпрэсіі, што ў 30-я гады абрынуліся на беларускіх дзеячаў, зусім пазбавіўся ілюзій пра адраджэнне Бацькаўшчыны ў тых умовах. К. Езавітаў перакладаў з латышскай мовы творы Я. Райніса, А. Упіта, А. Курці і інш., пісаў пра іх у беларускім друку («Полымя»).

І. Э. Багдановіч.

Бібліяграфія

1.2.

Становішча беларускае школы ў Латвіі. Вільна, 1923.

Беларуская школа: Першая пасьля лемантара кніга для чытаньня ў беларускай асноўнай школе ў Латвіі. Рыга, 1926; 3-е выд. Рыга, 1943.

Беларуская школа: Трэцяя пасьля лемантара кніга для чытаньня ў беларускай асноўнай школе ў Латвіі. Рыга, 1926.

Беларусы ў Латвіі. Рыга, 1927. Рэц.: F r. H r.[yškěvič] // Slovanský přehled. 1931. T. 23.

Беларускае культурна-асветнае т-ва «Бацькаўшчына» ў Латвіі. Рыга, 1932.

Беларусы ў Літве. Рыга, 1932.

1.3.

1918. Освобождение Минска: Записки коменданта // Варта. № 1.

1923. Становішча беларускай школы ў Латвіі // Новае жыццё. 10, 15 сак.

1924. Беларусы ў Латвіі // Сын беларуса. 22, 25 мая; 8, 26, 28 чэрв. / Пад псеўд. Кастусёнак.

1925. Адгукі: [Верш] // Голас беларуса. 10 ліст. / Пад псеўд. Кастусёнак; Беларусы і Крывія // Там жа. 20 ліст.; Малітва Пяруну: [Верш] // Крывіч. № 9.

1926. Брату; Марш Адраджэнца; Малітва Пяруну; Ня ный! — Ня плач!; Уладзіміру Жылцы; Сонцу ў нядзелю; Вясной ў турме; У куце больш ня маю бажніц!; Заходняму беларусу; Беларусу-эмігранту; На лясных складах у Рызе; Даўгая-Даўгава: [Вершы] // Першы крок. Рыга; Заходняму беларусу: [Верш]; Дзесяцігоддзе Беларускай Нацыянальнай школы // Голас Беларуса. 25 сак; «Уяўленне! Уяўленне...» (Уладзіміру Жылцы): [Верш]; Да працы, моладзь!: (Заклік да моладзі) // Там жа. 20 крас.; Да беларускіх настаўнікаў, артыстаў, пісьменнікаў, мастакоў і фатографаў у Латвіі; Да арганізацыі беларускае нацыянальнае меншасці ў межах сучаснае Літоўскае Рэспублікі // Там жа. 1 мая; На лясной паляны: [Верш] // Пад псеўд. Кастусёнак; На лясных складах у Рызе: [Верш]; Да арганізацыі беларускае нацыянальнае меншасці ў сучаснай Літве // Там жа. 20 мая; Беларусу-эмігранту: [Верш]; Бярыцеся ўсе за навукова-даследчую працу; Віленскае пытанне // Там жа. 1 чэрв.; Сонцу ў нядзелю: [Верш]; Ратуйце, беларусы, сваю моладзь! // Там жа. 10 чэрв.; Жыве наша мова!: [Верш] // Там жа. 1 ліп.; У летні дождж: [Верш] // Там жа. 7 ліп.; Беларусы, моцна трымайцеся адзін аднаго! // Там жа. 21 ліп.; Кракадзілавы слёзы / Пад псеўд. Кастусёнак; Беларусы, час ужо ўзяцца за эканамічную працу! // Там жа. 18 жн.; Дзьве неадкладныя задачы Беларускага аддзелу // Там жа. 25 жн.

1927. Благаславенне на бойку: [Верш]; Беларусы ў Сібіры і на Далёкім Усходзе // Голас Беларуса. 23 лют.; Чарговы шарлатанскі абман // Там жа. 16 сак.; «На акне маім чорныя тоўстыя краты...»: [Верш] // Там жа. 10 чэрв.; Беларусь у мінулым і сучасным // Там жа. 13 ліп.

1928. Беларускі народны тэатр у Рызе // Беларуская школа ў Латвіі (Рыга). № 8 / Пад псеўд. Кастусёнак; Латвійскі пясняр змагання, сонца, кахання // Полымя. № 8.

1929. Чатыры буйнейшыя пісьменьнікі сучаснае Латвіі // Полымя. № 4; Аб зборніку вершаў Пятра Сакола «На світанні» / Пад псеўд. Кастусёнак; Ад мора да мора: [Верш] / Пад крыпт. К-нак; Пясняр змагання, сонца і кахання // Голас беларуса. 29 крас.; Буйнейшыя пісьменнікі Латвіі // Там жа. 22 ліп.

1930. Беларусь у мінулым і сучасным // Vseslavenski zbornik. Spomenica o tisućgodišnjici hrvatskoga kraljevstva. Zagreb.

1932. Віктар Бенэдыктавіч Вальтар // Вальтар В. Ляснікова сена. Рыга; Вялікага беларускага паэта і барацьбіта за лепшую долю працоўных, грамадзяніна Янку Купалу вітаемо з 50-тымі ўгодкамі: [Нарыс] // Беларуская школа ў Латвіі (Рыга). № 2; Вялікага беларускага пісьменніка і працаўніка на ніве беларускай школы, грамадзяніна Якуба Коласа вітаемо з 50-тымі ўгодкамі: [Нарыс] // Там жа. № 5; Выдатнага беларускага драматурга і артыста, грамадзяніна Уладзіслава Галубка вітаемо з 50-тымі ўгодкамі: [Нарыс] // Там жа. № 6; Віктар Бенэдыктавіч Вальтар: [Нарыс] // Там жа. № 7.

1933. [Прадмова] // Упіт А. Фраксец Кілон. Рыга; Акадэміку Браніславу Тарашкевічу, беларускаму вучонаму і змагару-адраджэнцу, выказваем наша сяброўскае спачуванне! // Беларуская школа ў Латвіі. № 1; Да гісторыі збірання і гарманізацыі беларускай народнай песьні // Там жа. № 2, 4, 6; Беларускія школы ў Латвіі ў 1933—34 навуч. годзе // Там жа. № 7.

1934. Беларусы ў Рызе // Сіцько С. Дзесяцігоддзе І-ае Рыскае Беларускае аснаўное школы. Рыга.

1942. Беларуская нацыянальная вопратка // Новы шлях. № 2; Беларускі мастак — Пётра Мірановіч // Там жа. № 3; Напярэдадні 100-годдзя беларускага паэта // Там жа. № 9; Сяргей Палуян і ягоная пара // Раніца. № 25; Беларуская газэта. 19—20, 22 жн.

1943. Свята Купалы // Новы шлях. № 11; «Тарас на Парнасе» // Там жа. № 19 / Пад крыпт. К. Е.; Вацлаў Ластоўскі // Там жа. № 20; Беларускія прыпеўкі // Там жа. № 21; Каляды ў Дзвінску сорак год таму // Пад крыпт. К. Ез.; Вітаю цябе, Навагрудская моладзь! // Там жа. № 24; Памяці Вольгі Сахаравай // Раніца. № 14; Гарманізацыі беларускай народнай песні ў XIX стагоддзі // Там жа. № 15; Купалле // Там жа. № 26—27; Памяці Вольгі Сахаравай // Беларус. голас. 2 крас.; Паэма «Тарас на Парнасе» // Там жа. 19 ліст.; Вацлаў Ластоўскі // Там жа. 26 ліст.

1944. Ненадрукаваныя вершы Максіма Багдановіча; Сяргей Сахараў // Новы шлях. № 1; Мастацкае рука-

дзелле беларускіх жанчынаў // Там жа. № 3 / Пад крыт. К. Ез.; 25 год грамадскай працы // Там жа. № 4; Францішак Алекна-Аляхновіч // Там жа. № 6.

1946. Беларуская нацыянальная вопратка; Беларускія прыпеўкі // Беларуская народная культура. Ватэншгэт.

1948. Не ный; Малітва Пяруну ва ўрыўках: [Вершы] // Шыпшына. № 6.

1992. Аўтабіяграфія Канстантына Барысавіча Езавітава // Полацак. № 5.

1.4.

Упіт А. Фраксец Кілон: Апавяданне / З лат. Рыга, 1933.

1927. Лайцэн Л. Хлеб і плечы: [Верш] / З лат. // Голас беларуса. 25 мая.

1928. Курці [Куршынскі] А. Пракурор Нат: Апавяданне / З лат. // Полымя. № 9; Лайцэн Л. Жах штандару: Апавяданне / З лат. // Там жа. № 10.

1929. Упіт А. Фраксец Кілон: Апавяданне / З лат. // Полымя. № 3; Дзэльзыт К. Вечны вандроўнік: Апавяданне / З лат. // Там жа. № 4.

1.5.

На рускую мову. Белорусы и поляки: Документы и факты из истории оккупации Белоруссии поляками в 1918 и 1919 г. / Пер. с бел. Ковна, 1919.

1.6.

Пажытноў К. Папулярныя вочаркі па тэорыі капэрацыі. Рыга, 1927 / Рэд.

Лёсік Я. Наша крыніца. Чытаньне для беларускіх школ у Латвіі. 3 выд. Рыга, 1927.

2.3.

На беларускай мове. Ажгірэй З. Які няўклюдак зможа зракчыся яе? // Шыпшына. 1948. № 6; Брылеўскі У. Незабыўны дзень у маім жыцці // Беларус. 1977. № 242; Генерал К. Езавітаў // Раніца. 1945. № 9; Міранавіч П. Канстанцін Езавітаў // Беларус. 1971. № 166; Прывітанні канферэнцыі // Чырв. змена. 1926. 26 ліст.

На мовах б. Югаславіі. Dren I. O Belorusih in beloruskem slovstvu // Luč. 1933. № 9; Pregled novejšega beloruskega slovstva // Dom in svet. [Б. М.]. 1928.

3.1.

ЦНБ АН Беларусі, ф. 5, воп. 1, адз. зах. 1.

Т. М. Махнач.

ЖДАН АЛЕГ

Ждан Алег (сапр. Пушкін Алег Аляксеевіч; н. 5.1.1938, г. Смаленск), празаік. Член СП Беларусі з 1983. Піша на рускай мове.

Нарадзіўся ў сям'і настаўнікаў. Жыў і вучыўся ў г. Мсціслаўлі. Скончыўшы дзесяцігодку (1955), паступіў на гісторыка-геаграфічны факультэт Магілёўскага педінстытута. Пасля яго заканчэння (1960) працаваў слесарам, інжынерам-дыспетчарам на будаўніцтве Карагандзінскага металургічнага камбіната (1960—61), на Брацкім лесапрамысловым комплексе (1961—63). Там пачаў пісаць апавяданні. Першае з іх («Санька, Туся і брыгадзір») было апублікавана ў 1963 у штотыднёвіку «Литературная Россия». З 1963 жыве ў Мінску. Працаваў на Мінскім трактарным заводзе (1963—72), старшым рэдактарам Беларускага тэлебачання (1972—73), рэдактарам кінастудыі «Беларусьфільм» (1973—76). Завочна скончыў Літаратурны інстытут імя М. Горкага (1969), сцэнарнае аддзяленне Вышэйшых двухгадовых курсаў сцэнарыстаў і рэжысёраў у Маскве (1978). З 1978 на творчай працы.

Першая кніга прозы А. Ждана «У час развітання» выйшла ў 1975. Друкуецца ў часопісах «Нёман», «Новый мир», «Знамя», «Дружба народов», «Юность». Аўтар кніг прозы «У гасцях і дома», «Знаёмы», «Рысы і абліччы», «Па абодва бакі прахадной», «Самастойнае жыццё», сцэнарыяў фільмаў «Сумленны, разумны, нежанаты» («Масфільм») і «Хочаце любіце, хочаце не» («Беларусьфільм», сумесна з В. Чарных). Перакладае на рускую мову творы беларускіх пісьменнікаў. У сваёй творчасці распрацоўвае дзве тэмы: жыццё рабочага, гараджаніна ў першым пакаленні, які працуе на вялікім заводзе, і побыт людзей правінцыйных гарадоў Беларусі («Па абодва бакі прахадной», «Вандроўнік», «У прыцемках», шэраг апавяданняў). У 1993 годзе Беларускі тэатр імя Я. Коласа (Віцебск) паставіў п'есу «Салгалі Богу, салгалі» («Полымя». 1933. № 4).

Жыве ў Мінску.

Л. С. Савік.

1.2.
Во время прощания: Повесть и рассказы. Мн., 1975. Рэц.: Арцёменка У. Трэба меру знаць // ЛіМ. 1975. 14 ліст.; Богданов Ю. Высокое напряжение // Нёман. 1977. № 2; Мартинович А. Входя в открытый мир // Рабочая смена. 1976. № 1.

В гостях и дома: Повесть и рассказы. М., 1977. Рэц.: Козько В. Знакомые // Дружба народов. 1978. № 12; Тарас В. Дела житейские, осмысление жизни // Нёман. 1978. № 9.

Знакомый: Повести. Мн., 1977. Рэц.: Козько В. // Дружба народов. 1978. № 12; Тарас В. Дела житейские, осмысление жизни // Нёман. 1978. № 9.

Черты и лица: Повести. М., 1985.

По обе стороны проходной: Повести о необычных и обычных людях. М., 1987.

Самостоятельная жизнь: Повести о необычных и обычных людях. Мн., 1990.

1.3.
1968. Тишок: [Апавяданне] // Нёман. № 11.
1969. Европа — Азия: [Апавяданне] // Нёман. № 9.
1970. Все деньги с кошельком: [Апавяданне] // Нёман. № 12; Заботы: [Апавяданне] // Сибирские огни. № 12.
1971. Во время прощания: [Аповесць] // Юность. № 3.
1972. От Могилева до Минска: [Апавяданне] // Нёман. № 4.
1973. В гостях и дома: [Аповесць] // Дружба народов. № 12; Фигурки в начале улицы; Отражение в стекле: [Апавяданні] // Нёман. № 2.
1976. Девицы-красавицы: [Аповесць] // Нёман. № 6.
1981. Странник: [Аповесць] // Нёман. № 10.
1983. Зинаида Неглядова: [Аповесць] // Дружба народов. № 8.
1984. Зимогор; Конец недели: [Апавяданні] // Новый мир. № 1.
1985. По обе стороны проходной: Рассказы // Знамя. № 6.
1.4.
1969. Мисько П. Омела на березе: [Апавяданне] / С бел. // Нёман. № 10.
1980. Радкевич Е. Сказка про Белого Арапа: [Апавяданне] / С бел. // Нёман. № 5.
1.5.
На нямецкую мову. Das Wochenende/Übers. J. Warkentin. Berlin, 1986.
2.3.
На рускай мове. Кавторин В. По обе стороны проходной / Лит. Россия. 1985. 9 авг.; Каштанов А. Человек производства и литературы // Нёман. 1981. № 4; Круговых Н. [Прадмова] // Во время прощания. Мн., 1975.

В. М. Грышкевіч.

ЖУК АНАТОЛЬ

Жук Анатоль Аляксандравіч (н. 20.5.1949, в. Ярэмічы Карэліцкага р-на Гродзенскай вобл.), празаік, кінасцэнарыст, акцёр. Член СП Беларусі з 1993. Лаўрэат прэміі Ленінскага камсамола Беларусі (1980, за выкананне ролі Важака ў спектаклі «Бэмбі» паводле Ф. Зальтана).

З сялянскай сям'і. Пасля заканчэння ў 1966 Ярэміцкай сярэдняй школы паступіў на акцёрскае аддзяленне Беларускага тэатральна-мастацкага інстытута. У 1970—75 працаваў у Магілёўскім абласным тэатры драмы і камедыі (г. Бабруйск), дзе сыграў ролі Несцеркі («Несцерка» В. Вольскага), Бранябойнага («Злыдзень» А. Петрашкевіча) і інш. З 1975 — у Беларускім рэспубліканскім тэатры юнага гледача. Сярод выкананых роляў Міканор («Подых навальніцы» паводле І. Мележа), Віктар («Экзамен на восень» І. Шамякіна), чалавек у чорным («Выбар» А. Дударамова), Канстанцін Заслонаў («Паядынак» М. Матукоўскага) і шэраг інш. Зняўся ў двухсерыйным мастацкім тэлефільме «Новая зямля» паводле Я. Коласа (роля Міхала), а таксама ў фільмах «Пушча», «Маці ўрагану», «Душа мая Марыя».

Літаратурнай творчасцю займаецца з 1985. Першае апавяданне «Пажар» надрукавана ў часопісе «Беларусь». Аповесці, апавяданні А. Жука змяшчаліся таксама ў газеце «Чырвоная змена», часопісах «Полымя», «Крыніца», «Маладосць». Першая

яго кніга «Помста матылькоў» (1991). У 1993 выдаў зборнік аповесцей і апавяданняў «Пагаварыць трэба». Перавагу аддае адлюстраванню сялянскага жыцця, чалавека ў надзвычайных абставінах. Характэрная рыса яго творчасці — дынамічнасць сюжэта, арганічнасць і насычанасць дыялогу. Аўтар кінасцэнарыя «Зязюльчыны дзеці» (1990), пастаўленага на кінастудыі «Беларусьфільм».

Жыве ў Мінску.

Г. М. Кісліцына.

Бібліяграфія

1.2.
Помста матылькоў. Мн., 1991.
Пагаварыць трэба: Аповесці, апавяданні. Мн., 1993.
1.3.
1967. Радзіма: [Верш] // Бярозка. № 3; «Я буду вечна цябе кахаць...»: [Верш] // Чырв. змена. 11 лют.
1985. Пажар: Апавяданне // Беларусь. № 12; Лівень: [Апавяданне] // Чырв. змена. 18 чэрв.
1.4.
Булгакаў М. Майстар і Маргарыта: Раман / З рус. Мн., 1994 (Скарбы сусветнай літаратуры).
2.4.
Мороз А. Урокі белорусского: Режиссер. сценарий. Мн., 1986.

У. М. Ларчанка.

ЖУК ІГАР

Жук Ігар Васілевіч (н. 13.6.1957, в. Зані Мядзельскага р-на Мінскай вобл.), крытык, літаратуразнавец. Член СП Беларусі з 1991. Кандыдат філалагічных навук (1986).

Нарадзіўся ў сям'і настаўнікаў. Пасля заканчэння Будслаўскай дзесяцігодкі (1974) паступіў на філфак БДУ, які скончыў у 1979. Вучыўся ў аспірантуры пры кафедры беларускай літаратуры БДУ (1979—82). Працуе ў Гродзенскім універсітэце: з 1982 — асістэнт кафедры беларускай літаратуры, з 1990 — дацэнт, з 1991 — дэкан філалагічнага факультэта. Кіраваў літаратурным аб'яднаннем «Наднёманскія галасы». Член Гродзенскай гарадской рады ТБМ імя Ф. Скарыны.

Першая публікацыя І. Жука — рэцэнзія на кнігу «Такі ён быў» (1976). Займаецца даследаваннем сучаснай беларускай прозы, аналізуе творчасць Я. Брыля, А. Карпюка, А. Жука, В. Казько, Л. Калодзежнага, В. Гігевіча, Г. Далідовіча і інш. беларускіх празаікаў.

Жыве ў Гродне.

Л. С. Савік.

Бібліяграфія

1.2.
Гражданственность молодой белорусской прозы (70-е годы): Автореф. дисс. ... канд. филол. н. Мн., 1986.
1.3.
1976. Воблік незабыўнага Купалы: [Рэц. на кн.: Такі ён быў: Успаміны пра Янку Купалу. Мн., 1975] // ЛіМ. 7 мая.
1979. Роздум пра чалавека: [Рэц. на кн.: Гігевіч В. Калі ласка, скажы. Мн., 1979] // Маладосць. № 5.
1981. Дажынкі ці пачатак сяўбы: [Рэц. на кн.: Тычына М. Дажынкі. Мн., 1979] // Маладосць. № 5; Кніга прынесла радасць: [Рэц. на кн.: Сіпакоў Я. Жанчына сярод мужчын. Мн., 1980] // Полымя. № 12; Пераемнасць жыцця: [Рэц. на кн.: Далідовіч Г. На новы парог // Полымя. 1980. № 12]. // ЛіМ. 22 мая.
1982. Калі вяртаемся да сябе // Маладосць. № 10; Логіка жыцця і воля аўтара: [Рэц. на кн.: Калодзежны Л. Бярозы ў жыце. Мн., 1981] // ЛіМ. 11 чэрв.

1983. Да пытання аб суаднесенасці катэгорый партыйнасці і грамадзянскасці ў літаратуры // Веснік БДУ. Сер. 4. № 2.

1984. Час і род: [Рэц. на кн.: Казько В. Неруш. Мн., 1983] // Маладосць. № 3; Ответственность памяти: [Рэц. на кн.: Карпюк А. Партрэт. Мн., 1983] // Гродн. правда. 28 марта; «Вынясенне за дужкі» і гармонія твора: [Рэц. на кн.: Кірылаў Г. Падлетак. Мн., 1983] // ЛіМ. 20 студз.

1985. Вітраж памяці // ЛіМ. 30 жн. *Т. М. Махнач.*

ЗАБАЛОЦКАЯ ЛЮДМІЛА

Забалоцкая Людміла Васілеўна (н. 27.12. 1949, г. Крычаў Магілёўскай вобл.), паэтэса. Член СП Беларусі з 1990.

Нарадзілася ў сям'і служачых. З 1957 вучылася ў Крычаўскай сярэдняй школе. У 1965 паступіла ў Крычаўскае медыцынскае вучылішча, якое скончыла ў 1968. Працавала літаратурным супрацоўнікам раённай газеты «Іскра» (г. Чавусы Магілёўскай вобл.). У 1969—74 вучылася на аддзяленні беларускай мовы і літаратуры БДУ. У 1974—1984 — навуковы рэдактар выдавецтва «Беларуская энцыклапедыя», у 1984—85 — рэдактар на Беларускім тэлебачанні, у 1985—91 — педагог у яслях-садзе № 428 г. Мінска, з 1991 — намеснік галоўнага рэдактара часопіса «Пралеска».

Пачатак літаратурнай творчасці — 1967. Выйшлі зборнікі яе вершаў: «Сакавік» (1974), «Радаводны васілёк» (1981), «Святло палыну» (1989). У Л. Забалоцкай сваё кола тэм, свой творчы почырк, але тэма жаночай долі, бадай што, асноўная. Тут і слёзы, і радасць, і роспач маці над ложкам хворага дзіцяці, тут каханне і пошукі жыццёвай гармоніі. Паэтэса чулая да мастацкага слова, настойлівая ў пошуку сродкаў узбагачэння сваёй тэматыкі.

Жыве ў Мінску.

В. У. Смольская.

Бібліяграфія

1.2.

Сакавік: Вершы. Мн., 1974. (Першая кніга паэта). Рэц.: Гамолка М. «З цэлым народам гутарку вясці ...» // Звязда. 1974. 26 верас.

Радаводны васілёк: Вершы. Мн., 1981. Рэц.: Рудкоўскі М. «Нараджаецца новая поўня...» // Маг. праўда. 1981. 15 ліп.; Цвірка К. У пошуках «першароднага» слова // Полымя. 1982. № 5.

Святло палыну: Вершы. Мн., 1989 (Б-ка часоп. «Маладосць»).

Струны памяці: Вершы. Мн., 1991.

1.3.

1967. «Восень, восень...»; «Цябе куст чаромхі ціха просіць...»; «У восеньскім сінім тумане...»; «Сіні верас, прасіць...»; «У восеньскім сінім тумане...»; «Сіні верас, зялёныя нівы...»; «Жыццё імклівае ляціць...»; «Рабіны — вогнішчам у лесе...»; «Я чакаю, што будзе са мной...»: [Вершы] // Маг. праўда. 15 снеж.

1968. «Дыготкая пяшчотная рабіна...»; «Жыццё імклівае ляціць...»; «Я чакаю, што будзе са мной...»: [Вершы] // Маладосць. № 5; Сакавіцкае: [Верш] // ЛіМ. 7 чэрв.; «На сэрцы - даўняя трывога...»: [Верш] // Маг. праўда. 25 студз.; Веснавое: «Рассыпаў дождж танканогі...»; «Расплыліся туману аблокі...»; «Кранаю траву ў захапленні...»: [Вершы] // Там жа. 25 мая; «Сінявы асколак неўгамонны...»: [Верш] // Там жа. 2 жн.; Суніцамі выспелі словы; «Іскрынкі ціхага агню...»; «Чаромха ў рубінавых зорах...»; «Суніцамі выспелі словы...»; «Крылы стужкі сонечнай лаўлю...»; «Касцёр успыхваў знічкай у тумане...»: [Вершы] // Там жа. 25 кастр.

1969. «Рабіны ў восеньскія ночы...»; «Я - мора...»; «Крылы стужкі сонечнай лаўлю...»: [Вершы] // Маладосць. № 3; «Рассыпле дождж танканогі...»; «Просінь, верас залацісты...»; «Крыніца серабрыстая...»; «Вяснушкі — кроплі майскія...»; «Кляновы ліст, кляновы ліст...»: [Вершы] // Работніца і сялянка. № 3; «Рабіны ў восеньскія ночы...»: [Верш] // ЛіМ. 11 сак.; Роднасць: «Сняжынкі крыштальныя бэзу...»; «Сцяжынкай — караблік у моры...»; «Сцяжынкаю — майская вішня...»: [Вершы] //

Маг. праўда. 14 студз.; «Цвіце зіма. Шчырэе ранне...»: [Верш] // Там жа. 4 сак.; Юнацтва маё, камсамол: [Верш] // Там жа. 24 мая; «О мой трывожны ўспамін...»; «Люблю, люблю!...»; «Звінелі кроплі...»; «На снезе — сакавіцкія люстэркі...»: [Вершы] // Там жа. 20 снеж.; Мая планета: [Верш] // Настаўн. газ. 5 ліст.; Сакавік; Як сонечнае ранне; Кружылася снежнае мора: [Вершы] // Там жа. 17 снеж.; Веснавое: [Верш] // Сел. газ. 9 июля; Сакавік: [Верш] // Чырв. змена. 9 лют.; Крыніца: [Верш] // Там жа. 22 мая; Цыкл «Палессе»: «Касцёр успыхваў знічкай у тумане...»; «Чайка ў імклівай сінечы...»; «Сняжынкай белай — маладзік...»; «На сэрцы — даўняя трывога»: [Вершы] // Там жа. 23 жн.

1970. «Суніцамі выспелі словы...»; «Крылы стужкі сонечнай лаўлю...»: [Вершы] // Голас Радзімы. № 20; «Сакавік выгравае праталкі...»: [Верш] // Маг. праўда. 6 чэрв.; Умение захапіць // Настаўн. газ. 4 лют.; «На далоні снег...»: [Верш] // Чырв. змена. 15 студз.; «Мама, мама!..»: [Верш] // Там жа. 21 ліп.; «Цвілі шляхі і сонца лета...»: [Верш] // Там жа. 17 верас.

1971. «Дрыготкая, пяшчотная рабіна...»: [Верш] // Дзень паэзіі — 71. Мн.; «Крылы стужкі сонечнай...»: [Верш] // Універсітэт паэтычны. Мн.; Развітанне з жураўлямі; «І паштоўкі белыя кружылі...»; «Вераснёвых вогнішчаў стамлёнасць...»; «Ліўні залатыя цуруболяць...»: [Вершы] // Маладосць. № 8; «Крыніца серабрыстая...»: [Верш] // ЛіМ. 5 сак.; «Жар-птушка сіняя не злоўлена...»: [Верш] // Чырв. змена. 28 верас.

1972. «Іскрыстая праталіна...»: [Верш] // Дзень паэзіі — 72. Мн.; «Ліст сіні-сіні, нібы восень...»; «Холад шыбы мальцамі гаючымі...»; «Сіняй птушцы, як мары, верыла...»: [Вершы] // Чырв. змена. 8 сак.

1973. «Вопыту нам часам нестае...»; «Дзе прычал? У сіне-жоўты бераг...»; «Пакінь свой след на сонечнай зямлі...»; «Іскрынкі ціхага агню...»: [Вершы] // Маладосць. № 9; «Сінеюць шыбы ў злыя маразы...»; «Сакавік — асмужанае мора...»: [Вершы] // Работніца і сялянка. № 10; «Легенду пра Асоль і алы парус...»: [Верш] // Знамя юности. 12 апр.; «Не жахаюць ні рэкі, ні скалы...»: [Верш] // Там жа. 14 дек.; «З ледавікоў, каля халодных гор...»: [Верш] // Маг. праўда. 31 жн.; Коласава крыніца: [Верш] // Мін. праўда. 25 крас.; «Не паўтараць сябе ні ў чым...»; «Суніцамі выспелі словы...»; «Вяснушкі — кроплі майскія...»: [Вершы] // Чырв. змена. 4 сак.

1975. «Над белым светам...»; «Каліна стукне ў шыбу золкай раніцай...»; «Люстэркі восені — прагалы між галін...»; «Грыбасей у жніўні тупатаў»: [Вершы] // Маладосць. № 10; Гравюра; «Гэтак кароткі вельмі век...»: [Вершы] // ЛіМ. 14 ліст.; Настрой; «Галінка салаўіная...»; «Тонкі лёд. І як па ім прайсці...»; «Разышліся туману аблокі...»; «Час-скульптар вытачыць маршчыны...»; «Разлюбіш мяне — воля твая...»: [Вершы] // Маг. праўда. 16 верас.

1976. Трыпціх: [Верш] // Маладосць. № 2; Марыя: Урыўкі з паэмы // ЛіМ. 12 сак.; «Матор мільённы высек гукі...»: Вершаваны рэпартаж // Там жа. 28 мая; Прага чалавечнасці: [Рэц. на кн.: В я р ц і н с к і А. З'яўленне. Мн., 1975] // Мін. праўда. 17 студз.; «Не жахаюць ні рэкі, ні скалы...»: [Верш] // Там жа. 8 мая.

1977. О сумнае бабіна лета...: [Верш] // Дзень добры мама. Мн.; «Алёнушка, капытца затапчы...»: [Верш] // Мін. праўда. 4 студз.; «Чужынцы...»; «Любілі людзі і людзей любілі...»; Гравюра; «Любоў не выдумляюць...»: [Вершы] // Чырв. змена. 29 мая.

1978. Хлеб: [Верш] // Работніца і сялянка. № 8.

1979. «Людзі, помнім Трасцянец і Лідзіцэ...»; «Марал рагаты шмакаў сена...»; Цьмяны сум; Заданае: [Вершы] // Маладосць. № 5.

1980. «Людзі, помнім Саласпілс і Лідзіцэ...»: [Верш] // Дзень паэзіі — 80. Мн.

1981. «Жаўцее сонца высмяглы сланечнік...»; «Сінічы кліч ачахне ў цішыні...»; «Клічу спозненую раніцу трыпутніка...»: [Вершы] // Голас Радзімы. 4 чэрв.

1982. Янку Купалу: [Верш] // Беларусь. № 7.

1984. Трыпціх трывогі; «Асмужліва-журлівы сцішны ветах...»; «Калючы жніўнік учарнеў...»; «Тонкі лёд. І як па ім прайсці...»: [Вершы] // Полымя. № 2; Трыпціх: [Верш] // ЛіМ. 1 чэрв.

1985. Жывы покліч сучасніка: [Рэц. на кн.: Д а л і д о в і ч Г. Станаўленне. Мн., 1985] // Чырв. змена. 10 кастр. 1.5.

На польскую мову. Czeremcha — rumieni się... / Tł. M. Kononowicz // Życie i Myśl. 1970. № 4. 2.3.

На беларускай мове. Ч а б а н Т. Радаводная повязь // ЛіМ. 1981. 2 кастр.

На польскай мове. L u d m i ł a Zabałocka // Wiersze białoruskie. Łódź, 1971.

У. М. Ларчанка.

ЗАЙЦАЎ ВЯЧАСЛАЎ



Зайцаў Вячаслаў Кандратавіч (18.9.1917, с. Ахлябініна Уфімскага р-на, Башкірыя — 19.4.1992, г. Уладзімір, Расія; пахаваны там жа на могілках Улыбашава), літаратуразнавец-славіст, перакладчык. Кандыдат філалагічных навук (1954). Пісаў на рускай мове.

Нарадзіўся ў рабочай сям'і. Тры класы пачатковай школы закончыў у в. Харкаўская Нурымановскага р-на (Башкірыя); сямігодку сялянскай моладзі — на ст. Улу-Целяк Уфімскай чыгункі ў 1931. У 1931—35 вучыўся ў Уфімскім механічным тэхнікуме. З 1935 ён тэхнік-канструктар і перакладчык з англійскай мовы на нафтаперагонным заводзе трэста «Башнафта». З 1939 — палітработнік у пагранвойсках Прыморскай акругі. Пасля дэмабілізацыі ў 1947 паступіў у Ленінградскі універсітэт. З 1951 — асістэнт, старшы выкладчык, дацэнт кафедры славянскай філалогіі гэтага ж універсітэта. З 1964 — старшы навуковы супрацоўнік Інстытута літаратуры імя Я. Купалы АН Беларусі. У 1975 па палітычных меркаваннях выйшаў з КПСС і адразу ж вызвалены ад пасады. За публічныя эсхаталагічныя выступленні ў 1978 ён быў зняволены амаль на 4 гады. У 1983 вярнуўся ў Мінск. Касмалагічныя заняткі (ідэі прышэльцаў з космасу), у якіх расчараваўся, прывялі В. Зайцава да духоўна-хрысціянскіх пошукаў.

Першыя часопісныя публікацыі В. Зайцава на праблемах харвацкай і сербскай літаратур з'явіліся ў сярэдзіне 1950-х г. у Ленінградзе. На Беларусі друкаваўся з 1966. У Мінску пабачыў свет яго пераклад з сербахарвацкай на рускую мову паэмы «Асман» І. Гундуліча. Гэты твор — шэдэўр позняга Рэнесансу пра жыццё і барацьбу паўднёвых славян супраць турэцкага прыгнёту. Ён перакладзены В. Зайцавым з мовы арыгінала з улікам стылёвых асаблівасцей, што высока ацэнена славістамі Харватыі (А. Флакер). Адначасова выйшла манаграфія «Паміж Львом і Драконам» — змястоўнае даследаванне-каментарый да паэмы Гундуліча ў кантэксце Дубровніцкага культурнага працэсу. В. Зайцаў даследаваў таксама перадумовы гуманізму ў беларускай літаратуры, творчасць Ф. Скарыны, падрыхтаваў па гэтай праблематыцы доктарскую дысертацыю; быў паглыблены і ў філасофска-тэалагічныя праблемы. *Г. П. Твараповіч.*

Бібліяграфія

1.2.

Эпическая поэма Ивана Гундулича «Осман»: Автореф. дисс... канд. филол. н. Л., 1954.

Богомильское движение и общественная жизнь Северной Италии эпохи Дученто. Мн., 1967.

Между Львом и Драконом: Дубровницкое Возрождение и эпическая поэма И. Гундулича «Осман». Мн., 1969.

Рэц.: Прашковіч М. Аб трагедыі і мужнасці народнай // ЛіМ. 1969. 30 вер.

Франциск Скорина и гуманистическая мысль в Белоруссии XV—XVI вв.: Автореф. дисс. ... д-ра филол. н. Мн., 1970.

1.3.

1955. Сербские и хорватские поэты XIX века // Поэзия западных и южных славян. Л.

1956. Выдающийся сербский драматург // Вестник ЛГУ. № 20; Йован Стерия Попович // Театр. № 1.

1957. О IV Международном съезде славистов // Вестник ЛГУ. № 2; Светозар Маркович // Там жа. № 14; Историческая основа и идейное содержание поэмы «Осман» Гундулича // Литература славянских народов. М., Вып. 2; О литографированном курсе лекций В. Ламанского об Адаме Мицкевиче; Поэма Ивана Гундулича «Осман» в оценке польского литературоведения первой половины XIX в. // Уч. зап. ЛГУ. № 231.

1958. Гундулич в России; Творчество Петра Кочича и революционный подъём на Балканах в начале XX века // Славянские литературы. Л.; К вопросу о славенско-русских литературных связях; Об отношении драматургии Марина Држича к итальянскому театру; О «славянофильстве» и «католицизме» И. Гундулича // Труды IV съезда славистов. М.; К вопросу о народности эпической поэмы И. Гундулича «Осман» // Вестник ЛГУ. № 8; Комедии Косты Трифковича // Там жа. № 14; IV съезд славистов // Там жа. № 20; Запорізькі козаки в «Османі» Гундулича // Рад. літ-знавство. № 4.

1959. Новица Шаулич // Славянский фольклор. М., Т. 4.

1960. Поэма Гундулича «Осман» в сербохорватской литературе // Вестник ЛГУ. № 20.

1962. [Даведкі] о Гундуличе и поэме «Осман»; отрывки из III, IV, VIII песен поэмы «Осман» // Хрестоматия по зарубежной литературе, эпоха Возрождения. М. Т. II; М. Старицкий и балканские события 70-х гг. XIX в. // Рад. літ-знавство. № 6.

1963. Каково место богомильства в идеологической системе европейского средневековья // Славянска филология. София. Т. II; Начальный период сербской драматургии // Вестник ЛГУ. № 8.

1964. Богомильское движение и общественная жизнь Северной Италии эпохи Дученто // Тези доповідей VI Української славістичної конференції. Чернівці; Голос с берегов Адриатики // Всесвіт. № 2; Певец славянских судеб // Звезда. № 1; Голоса далёких тысячелетий // Нёман. № 12.

1967. Человек на все времена // Знамя юности. 15 авг.

1968. Перадумовы гуманізму на Беларусі; Францыск Скарына // Гісторыя беларускай дакастрычніцкай літаратуры. Мн. У 2 т. Т. 1; Перадумовы гуманізму на Беларусі; Ф. Скарына і еўрапейская Рэфармацыя // 450 год беларускага кнігадрукавання. Мн.; Ф. Скарына ў Падуі // Весці АН БССР. Сер. грамад. н. № 4; О мировоззренческой ориентации Франциска Скорины // Нёман. № 10.

1969. Судьбы белорусского литературного языка после Скорины // Вопросы истории. Мн.; Эпическая поэма Ивана Гундулича «Осман» // Гундулич И. Осман. Мн.

1970. Адказ гісторыку // ЛіМ. 3 сак. / Сааўт. В. Барысенка і інш.

1971. Идейный комплекс «гуманизм — реформация — контрреформация» в его единстве и противоречиях: (По материалам Чехии, Польши и Белоруссии) // Научная конференция «Сравнительное изучение славянских литератур»; М.

1.4.

Добричанин Д. Три соловья / С сербохорв. Л., 1957 / Пер. у сааўт.

Нушич Б. Опечаленная семья / С сербохорв. Л., 1958 / Пер. у сааўт.

Стерия-Попович И. Скупец; Враль и подвирало; Патриоты; Странная болезнь / С сербохорв. Л., 1960 / Пер. у сааўт.

Гундулич И. Осман / С сербохорв. Мн., 1969.

1955. Стихи / С сербохорв. // Поэзия западных и южных славян. Л.

1959. Сербские плачи / С сербохорв. // Русский фольклор. Л. Т. IV.

1.6.

Поэзия западных и южных славян. Л., 1955 / Скл.

Стерия-Попович И. Комедии. Л., 1960. / Скл.

2.4.

На беларускай мове. Караткевіч У. Калі паміраюць...: [Верш-прысвячэнне] // Караткевіч У. Мая Іліяда. Мн., 1969.

М. П. Барташэвіч.

ЗАЙЦАЎ МАР'ЯН

Зайцаў Мар'ян Міхайлавіч (псеўд. Мар'ян Віж, н. 23.2. 1949, г. Мінск), празаік, гісторык, публіцыст. Член СП Беларусі з 1994.

Яго бацька, Міхаіл Фёдаравіч, быў са старавераў, што ў 18 ст. збеглі з Расіі і заснавалі каля Мінска вёску Калядзічы, памёр. Маці, Галіна Пятроўна, увесь час хварэла, таму выхаваннем будучага пісьменніка займалася бабуля Марыя Фамінічна Хоміч, якая паходзіла з Лагойшчыны і мела добрую адукацыю. Ад яе М. Зайцаў пачуў жывое беларускае слова. Скончыўшы ў 1966 мінскую 46-ю сярэднюю школу, паступіў на гістарычны факультэт БДУ, які скончыў у 1971. Пасля службы ў войску (1971—73) працаваў адказным сакратаром прэзідыума Беларускага таварыства аховы помнікаў, з 1974 — загадчыкам аддзела аховы помнікаў Гістарычнага музея Украіны, з 1976 — рэдактарам рэдакцыі гісторыі Беларусі БелСЭ. Выкладаў гісторыю Беларусі ў Мінскім інстытуце культуры, грамадскія дысцыпліны ў прафтэхвучылішчы № 107, быў лектарам Мінскага абласнога бюро прапаганды ведаў аб помніках гісторыі і культуры, супрацоўнікам аддзела тэхнічных сродкаў навучання Мінскага медыцынскага інстытута. З 1992 — загадчык аддзела штотыднёвіка ТБМ імя Ф. Скарыны «Наша слова».

Першую нататку надрукаваў у 1974 у газеце «Знамя юности». Праца ў Беларускай энцыклапедыі спрыяла прафесійнаму станаўленню М. Зайцава. Усё часцей сталі з'яўляцца яго навуковыя і навукова-папулярныя публікацыі. У 1984 пачаў пісаць гістарычную аповесць «Лабірынт», дзе выявіліся багатая фактура, цікавыя героі, неадназначная філасофія жыцця. Твор выйшаў у свет у 1991. У 1984 напісаў аповесць «Гарадскія кветкі» пра трагічны жыццёвы шлях адзінокай жанчыны. Уражваюць цеплыня, спагада аўтарскай інтанацыі, уменне валодаць словам. Кніжка гісторыка-публіцыстычных нарысаў «Чары даўніны», прысвечаная беларускім мястэчкам, выйшла ў 1989. Піша гісторыка-прыгодніцкі раман «Міраж», пралог якога друкаваў у часопісе «Беларусь». Як гісторык, знаўца мінулага сваёй бацькаўшчыны М. Зайцаў ужо два дзесяцігоддзі выступае ў друку з цікавымі публікацыямі, якія садзейнічаюць абуджэнню ў народзе павагі да ўласнай гісторыі.

Жыве ў Мінску. *В. У. Смольская.*

Бібліяграфія

1.2.

Чары даўніны: Нарысы. Мн., 1989.

Лабірынт. Мн., 1991.

1.3.

1977. За светлую долю // Помнікі гіст. і культ. Бел. № 2.

1980. Сялянскія хваляванні на Іўеўшчыне // Помнікі гіст. і культ. Бел. № 2.

1981. Сялянскі рух у сярэдзіне XIX стагоддзя // Помнікі гіст. і культ. Бел. № 1.

1982. Сялянскае пытанне ў «Мужыцкай праўдзе» // Помнікі гіст. і культ. Бел. № 4.

1984. Попытки учреждения неофициальной периодики в Белоруссии в годы первой революционной ситуации // История книги, источниковедение и библиотечное дело. Мн.; С голубой печатью «Земли и воли» // Нёман. № 10; Червень // Там жа. № 11; Гістарычныя замалёўкі вiцябчаніна // Помнікі гіст. і культ. Бел. № 3; Барацьба беларускага сялянства супраць вінных водкупаў напярэдадні рэформы 1861 г. // Весці АН БССР, сер. грамад. навук. № 3.

1.4.

Шыбека З., Шыбека С. Мінск: Старонкі жыцця дарэв. горада / З рус. Мн., 1994. *М. П. Барташэвіч.*

ЗАПОЛЬСКІ МІХАЛ

Запольскі Міхал Мікалаевіч (крыпт.: М. З., М. Z.; 21.1.1893, в. Калядзічы каля Мінска — 10.10.1956, Мінск; пахаваны на Усходніх могілках), паэт, празаік, драматург, публіцыст, перакладчык. Пісаў на беларускай, рускай, сербахарвацкай і балгарскай мовах.

Звесткі пра паходжанне, сям'ю і адукацыю не выяўлены. Вядома толькі, што з канца 1919 у эміграцыі. З 1920 да 1950 жыў у Каралеўстве сербаў, харватаў і славенцаў (пазней — Югаславія), дзе служыў на чыгунцы. Падтрымліваў сувязі з культурнымі арганізацыямі Зах. Беларусі. У выніку ўскладнення палітычнай сітуацыі і арышту сына вымушаны быў перабрацца ў Балгарыю, дзе таксама працаваў на чыгунцы. У 1955 апынуўся ў Расіі, працаваў кладаўшчыком цаліннага саўгаса Новаузенскага р-на Саратаўскай вобл. У 1956 вярнуўся на Беларусь, працаваў лабарантам у Інстытуце харчовай прамысловасці ў Мінску.

Пісаць пачаў у 1913 па-руску. 1918—19 г.— перыяд актыўнай творчасці на беларускай мове. Жывучы ў Сербіі, у 1920—30 г. дасылаў свае допісы, вершы і апавяданні ў заходнебеларускі друк. Супрацоўнічаў таксама з югаслаўскімі газетамі і часопісамі «Железнички венац», «Земља», «Ошишани јеж». Паводле некаторых звестак, пісаў п'есы для Бялградскага дзіцячага тэатра, якія там ставіліся. У 1955—56-я г., пазбаўлены магчымасці выступаць у друку, тым не менш апублікаваў шэраг матэрыялаў за подпісам сваёй нявесткі — Марыйкі Шуплевай-Запольскай (у асноўным — інфармацыі, нататкі пра жыццё тагачаснай Балгарыі). Аўтар некалькіх кніжак на беларускай, рускай і сербскай мовах. Падрыхтаваў да выдання зборнікі вершаў «З настрою на чужыне» і «Песьні». У ЦБ АН Літвы захоўваюцца рукапісы твораў М. Запольскага, а таксама зборнік на шапірографе «Жменя песняў», у сямейным архіве М. Шуплевай-Запольскай — кнігі на рускай мове («И петь и плакать», «Мечтатель») без выхадных звестак і тытульных лістоў, паэма «Рагнеда», п'есы «Мана кахання», «Жыцьцё і каханьне» і інш.

І. А. Чарота.

Бібліяграфія

1.2.

На железничким шинама: Кратке приповетке о малим људиме. Београд, 1939.

1.3.

1918. Беларусу: [Верш] // Бел. шлях. 25 мая; Без шчасця: [Верш] // Вольная Беларусь. 12 мая; Нашым паэтам: [Верш] // Там жа. 26 мая; І нудна...: [Верш] // Там жа. 9 чэрв.

1922. У Сербіі: [Верш] // Бел. вед. 9 студз.; Песня начою: [Верш] // Там жа. 15 студз.: Малітва: [Верш] // Бел. звон. 12 крас.; Пісьмы з Сербіі // Наша будучына. 25 снеж.

1923. Маладое жыццё: [Верш] // Маладое жыццё. № 1; «Сэрца б'ецца ад слёз...»: [Верш] // Наша будучына. 6 студз.; Пісьмы з Сербіі // Там жа. 13 студз.; Пісьмы з Сербіі // Новае жыццё. 3, 15 сак.; Пакінь разважаць: [Верш] // Там жа. 24 сак.; Пісьмы з Сербіі; Досіцей Обрадовіч // Там жа. 6 мая.

1924. Маладое жыццё; Ціха ў небе; Пакінь разважаць: [Вершы] // Беларускі дэкламатар. Мн.; Пад спеў каша-вы: (Пісьмо з Сербіі) // Каляда. 24 снеж.; Новагоднік. 31 снеж.; Пісьмы з Сербіі: (Ад нашага карэспандэнта) // Сын беларуса. 27 жн.; Дзіцячыя клубы // Сялянская праўда. 7, 10 снеж.; Маладое жыццё; Пакінь разважаць: [Вершы] // Чырвоны дудар. Мн.

1925. На чужыне: [Верш] // Правасл. Бел. № 2; Божая кара: [Апавяданне]; «Хай гора, нядоля і шчэнт...»: [Верш] // Там жа. № 6; Брату: [Верш]; Захаваны скарб: [Апавяданне] // Там жа. № 7; Хто ж другі заплача...: [Верш] // Там жа. № 8; Маці: [Апавяданне] // Там жа. № 9; Влада Нядобры: [Апавяданне] // Там жа. № 13—14; Скрозь маліся: [Верш] // Там жа. № 15—16.

1926. «Во неяк раз, як гнала я карову...»: [Верш] // Наша справа. 8 снеж.; У вастрозе: [Верш] // Там жа. 10 снеж.; Грамада: [Верш] // Там жа. 18 снеж.; На чужыне: [Верш] // Сялян. ніва. 25 жн.

1927. Пісьмы з Сербіі; Эмігрантка // Наш голас. 28 лют.; Сон: [Верш] // Наша праўда. 6, 7 крас.; На чужыне: [Верш] // Там жа. 3 вер.

1933. Глава госпоћа: Фельтон // Железнички венац. № 15.

М. П. Барташэвіч.

ЗАПРУДНІК ЯНКА

Запруднік Янка (інш. псеўд.: А. Будзіч, Янка З., Рыгор Ліцьвін, А. Загорны, Алесь Загорны, Арсень Загорны, Сяргей Ясень, крыпт.: Я. З.; З., А. З., А. Б.; сапр. Вільчыцкі Сяргей Мікалаевіч; н. 9.8.1926, мяст. Мір Стаўбцоўскага пав. Навагрудскага ваяв., цяпер г. п. Мір Карэліцкага р-на), вучоны-гісторык, палітолаг, публіцыст, паэт, крытык, грамадска-палітычны дзеяч. Доктар гістарычных навук (1969). Піша на беларускай і англійскай мовах.

З сям'і настаўнікаў Веры і Мікалая Вільчыцкіх, якія вымушаны былі займацца сельскай гаспадаркай. У Міры скончыў пачатковую школу. У час Вялікай Айчыннай вайны, каб пазбегнуць прымусовай службы ў паліцыі і вывазу ў Германію, паступіў у Баранавіцкую прагімназію, якую скончыў у 1943. Пасля вучыўся на 3-м курсе гандлёвай школы ў Баранавічах. Належаў да Саюза беларускай моладзі. З 1944 у эміграцыі. Жыў у Германіі: спачатку ў Рэгенсбургу (лагер для перамешчаных асоб), потым у Міхельсдорфе. Вучыўся ў заснаванай у Германіі Беларускай гімназіі імя Я. Купалы. Быў беларускім скаўтам, пасля — год скаўт-майстрам. Разам з групай сяброў, якія пасля сталі вядомыя як «Дванаццатка», на пачатку 1948 выехаў у Вялікабрытанію на працу ў шахты. Каб падтрымліваць сувязі з сябрамі, што засталіся ў Міхельсдорфе, дапамагаў ім выдаваць бюлетэнь, які пазней перарос у часопіс «Наперад» (выйшла 26 нумароў). Неўзабаве пра «Дванаццатку» дазналіся ў беларускім студэнцкім асяродку ў Бельгіі. Адтуль яму прапанавалі прыехаць на вучобу ў каталіцкі універсітэт у Лювене (Бельгія). У 1954 Я. Запруднік скончыў гістарычны факультэт Лювенскага універсітэта і пераехаў у Мюнхен на працу на радыёстанцыі «Вызваленне» (пасля «Свабода»). 37 гадоў быў супрацоўнікам беларускай рэдакцыі гэтай радыёстанцыі, каментатарам савецкай і міжнароднай палітыкі. З 1957 жыве ў ЗША. У 1969 абараніў у Нью-Йоркскім універсітэце доктарскую дысертацыю па тэме «Палітычнае змаганне за Беларусь у Дзяржаўнай Думе 1906—1917 гг.». У 1970—75, працягваючы працаваць на радыёстанцыі «Свабода», быў асістэнтам прафесара — выкладаў рускую і савецкую гісторыю ў Куінскім каледжы гарадскога універсітэта Нью-Йорка, адным з лектараў па курсе «Спадчына» пры Нью-Йоркскім гарадскім універсітэце, сябрам управы Беларускага інстытута навукі і мастацтва ў Нью-Йорку, Беларуска-амерыканскага задзіночання. Уваходзіў у арганізацыйную групу Беларуска-амерыканскага камітэта палітычных дзеянняў, заснаванага ў Нью-Йорку ў 1976. Быў сябрам арганізацыйных камітэтаў Беларускіх фестываляў у штаце Нью-Джэрсі.

Літаратурную дзейнасць пачаў у 1947. Супрацоўнічаў з часопісамі «Наперад», «Беларуская моладзь», «Беларускі агляд», удзельнічаў у выданні манаграфій і гадавікоў «Запісы Беларускага інстытута навукі і мастацтва», рэдагаваў газету «Беларус». Напісаў раздзелы, артыкулы для шэрагу навуковых прац па праблемах камунізму, нацыянальнага пытання, нацыянальнай палітыкі ў краінах былога СССР, Усходняй Еўропы, а таксама па беларускай літаратуры. Аўтар працы «Беларусь на гістарычным скрыжаванні» (1993), у якой дадзены агульны агляд гісторыі, палітыкі, эканомікі і інш. аспектаў жыцця Беларусі. Пад псеўданімам Сяргей Ясень друкаваў вершы — пераважна патрыятычную лірыку. У навуковых працах, літаратуразнаўчых, крытычных, публіцыстычных артыкулах, паэтычных творах, вусных прамовах Я. Запруднік выступае як патрыёт Бацькаўшчыны, паслядоўны абаронца нацыянальных інтарэсаў, правоў беларускага народа.

Жыве ў Нью-Йорку (ЗША). *С. Б. Сачанка.*

Бібліяграфія

1.2.

Спадчына бацькоў: «Агледзіны»: Да 100-годдзя з дня нараджэння Я. Купалы і Я. Коласа. Нью-Ёрк, 1982.

Belarus: At a Crossroads in History. Boulder; San Francisko; Oxford, 1993.

1.3.

1947. Гады бягуць; Мая Беларусь; Ты; Асеньнім днём: [Вершы] // У выраі. № 1 / Пад псеўд. Сяргей Ясень.

1948. Каляды: [Замалёўкі] // Бацькаўшчына. № 41 / Пад крыпт. З.; Разьвітаньне: [Верш] // Наперад. № 1

/ Пад псеўд. С. Ясень; Ноччу праз Галяндыю; Раманс: [Вершы] // Там жа. № 4. / Пад псеўд. С. Ясень; Наперад!: (Марш); Трыялет: [Верш] // Там жа. № 5 / Пад псеўд. С. Ясень; Ночкай цёмнаю; Трыялет: [Вершы] // Там жа. № 6 / Пад псеўд. С. Ясень; Сарві ружу; Санэт: [Вершы] // Там жа. № 8. / Пад псеўд. С. Ясень; Санэт: [Верш] // Там жа. № 9; І трэба-ж было здарыцца тады...: [Верш] / Пад псеўд. С. Ясень; Чаго зажурыўся?: [Верш] / Пад псеўд. А. Будзіч // Там жа. № 10; Чыгунная песня: [Верш] // Там жа. № 11 / Пад псеўд. С. Ясень; Восем радкоў; Цябе; З кнігі жыцьця: [Вершы] // Там жа. № 12 / Пад псеўд. С. Ясень; Ты «Nocturno» замяніў на «Golden Ecarrings» / Пад псеўд. С. Ясень; Гімн змаганьню / Пад псеўд. А. Будзіч: [Вершы] // Там жа. № 13; Недажаты загон: (Паэма) // Там жа. № 14 / Пад псеўд. С. Ясень; «У мокры лістапад, у вечары віхурныя...»: [Верш]; Недажаты загон: (Паэма) (працяг) // Там жа. № 15 / Пад псеўд. С. Ясень.

1949. Насустрач новаму: [Верш] // Наперад! № 16 / Пад псеўд. С. Ясень; Як сняжынка; Лютаўская: [Вершы] // Там жа. № 17 / Пад псеўд. С. Ясень; Пэрлы; «Мо не адзін у твані дзён...»: [Вершы] // Там жа. № 18 / Пад псеўд. С. Ясень; «Цябе кахаю над усё на сьвеце...»: [Верш] // Там жа. № 19 / Пад псеўд. С. Ясень; Музыка; На ростань: [Вершы] // Там жа. № 20 / Пад псеўд. С. Ясень; На грывах дзён: [Верш] // Там жа. № 21 / Пад псеўд. С. Ясень; Мроі; Зь дзёньніка: [Вершы] // Там жа. № 22 / Пад псеўд. С. Ясень.

1952. Да Цэнтру, ці ад Цэнтру? // Зніч. № 19 / Пад крыпт. Я. З.

1953. Гымн змаганьню; Мроі; «...У бой, за волю Беларусі...»; Лютаўская; Пэрлы; Яшчэ адно; Як сьняжынка; Хрыстос Уваскрос!; «...Цябе кахаю...»: [Вершы] // Бацькаўшчына. № 46—47 / Пад псеўд. С. Ясень; Музыка; Вуглякопы; «І трэба ж было...»; «Заскрыпелі галодна калёсы...»; Насустрач новаму; Зяленіць вясна...; На ростань; «Каханая, ня плач па шчасці...»; «З апошняй зоркай ночка дагарае...» (З паэмы «Недажаты загон»); «З залацістаблакітнае нівы...»; Чарнабрывенькі вечар; «Шчэ не адзін у твані дзён...»: [Вершы] // Там жа. № 50—51 / Пад псеўд. С. Ясень; Ідэя; На Куцьцю; Праездам праз Two Gates; Думкі на рэйках; Добры — вечар...: [Вершы] // Наперад! № 24 / Пад псеўд. А. Будзіч; Заміж Вянка: На магілу Дарагога М. Равенскага; Вечаровая; Сустрэча: [Вершы] / Пад псеўд. С. Ясень; Будучыня й мы // Там жа. № 25 / Пад псеўд. А. Будзіч; Тут і недзе...; «Падае лісьце...»; «Etoile des neiges, mon coeur amoareux...»: [Вершы]; Нараджэньне ідэі: (Хросьніку Вітаўту і усім тым, што Беларусі ня зналі) / Пад псеўд. С. Ясень; Адказ: [Верш] / Пад псеўд. А. Будзіч // Там жа. № 26.

1954. Актывізаваць навуковую працу // Бацькаўшчына. № 85 / Пад крыпт. Я. З.; Вывучайма дакладней жыцьцё на Бацькаўшчыне; «Навука» на падмогу акупацыі // Там жа. № 36—37 / Пад крыпт. Я. З.; Трэці Зьезд Беларускіх Савецкіх Пісьменьнікаў // Пад псеўд. С. Ясень; Каб не памерлі ў сваіх нашчадках... / Там жа. № 39—40; Трэці Зьезд Беларускіх Савецкіх Пісьменьнікаў (працяг) // Там жа. № 41—45 / Пад псеўд. С. Ясень; Кузьма Чорны супраць русіфікацыі / Пад псеўд. С. Ясень; Слуцкія ўгодкі ў Мюнхэне // Там жа. № 46; У паняволенай Беларусі: (Не да парасят, калі сьвінню смаляць) // Там жа. № 47—48 / Пад псеўд. С. Ясень.

1955. Гымн змаганьню; Яшчэ адно; «З апошняй зоркай ночка дагарае...»; Музыка; Вуглякопы; І трэба-ж было...; Зеляніць вясна...; Тут й недзе; Восеньская песьня; З Парыскіх кантактаў: [Вершы] // Ля чужых берагоў. Мюнхэн / Пад псеўд. С. Ясень; Злачынства і кара / Пад псеўд. С. Ясень; Кампартыя ў пошуках пэрпэтуум мобіле // Бацькаўшчына. № 1—2; «Дывэрсанты» ў беларускім лесе // Там жа. № 6 / Пад псеўд. С. Ясень; Яшчэ адзін «навуковы» фальсыфікат // Там жа. № 7 / Пад псеўд. С. Ясень; Гаворым адно, а пішам другое // Там жа. № 9 // Пад псеўд. С. Ясень; Беларускае пытаньне ў Польшчы // Там жа. № 12—13 / Пад крыпт. А. Б.; 250 // Там жа. № 20; Расейска-бальшавіцкая гістарыяграфія і Беларусь // Там жа. № 21 / Пад псеўд. Янка З.; Занядбоўваньне Багушэвічавае спадчыны / Пад псеўд. С. Ясень; «Палесьсе» літаратурна-мастацкі часопіс. № 1 (1955): (Азнаямленьне) // Там жа. № 30—31; Яшчэ адзін анэкдот пра Пушкіна або: Аляксандр Сяргеевіч — беларускі незалежнік // Там жа. № 32 / Пад псеўд. Янка З.; Якуб Колас у супраціве савецызацыі: (Азнаямленьне) // Там жа. № 33 / Пад псеўд. С. Ясень; «Беларускі народны арнамэнт. Менск, 1953»: (Азнаямленьне) // Там жа. № 34 / Пад псеўд. Янка З.; Дзе дзеўся «Беларускі Леманар»?: (Ліст да беларускага грамадства ў ЗША) // Там жа. № 37; Вызваленне старой Буслiхі: Апавяданне // Там жа. № 40—41 / Пад псеўд. С. Ясень; «...Што наша ад вякоў» // Там жа. № 43; Галоўная загана школьных чытанак // Там жа. № 44; 1945—1955 // Там жа. № 45.

1956. Забаронена любіць Беларусь: (На дзень нараджэння Канстанцыі Буйлы) // Бацькаўшчына. № 1—2 / Пад псеўд. С. Ясень; Навуковая праца й псэўданімы // Там жа. № 3; Транскрыпцыя беларускіх назоваў і прозьвішчаў // Там жа. № 8; «Не пакідайце-ж мовы нашай беларускай, каб ня ўмерлі» // Там жа. № 12—13; Сіла ў зямлі // Там жа. № 15 / Пад псеўд. Янка З.; Аб савецкіх падручніках беларускае мовы // Там жа. № 23 / Пад крыпт. Я. З.; Якуб Колас: (Некралог) // Там жа. № 33. / Пад псеўд. Сяргей Ясень; «Наша справа — справа праўдзівая...» // Там жа. № 47—48; Нацыянальная літаратура і вугорская рэвалюцыя // Там жа. № 50; Рэгабілітацыя // Там жа. № 51—52.

1957. Маўклівасць // Бацькаўшчына. № 5; Забурэньні ў Беларусі // Там жа. № 8; Цымбалы // Там жа. № 9 / Пад псеўд. Янка З.; Аб студыях і студэнтах // Там жа. № 19; «Вехі беларускае літаратуры»: (Выстава беларускага пісьменства ў Ньюёрскай Публічнай Бібліятэцы) // Там жа. № 34; Беларуская ці грашовая інтэлігенцыя? / Там жа. № 37; На дзесяцігодзьдзе «Бацькаўшчыны» // Там жа. № 42—43; Рэлігія ў БССР // Беларус. № 61; У «адбудаванай» сталіцы // Там жа. № 62 / Пад крыпт. Я. З.

1958. Ходзяць па сьвеце калядоўшчыкі... // Бацькаўшчына. № 1—2; Мэдыкі // Там жа. № 4; «Мангольскі праект»: (Калі яшчэ «Грамады» ня было...) // Там жа. № 11—13 / Пад крыпт. Я. З.; Беларускі студэнт // Там жа. № 27; У мутнай вадзе бальшавікі плаваюць... // Беларус. № 64 / Пад псеўд. Рыгор Ліцьвін; Менскі журналісты пра Нью Ёрк // Беларус. № 64 / Пад крыпт. З.; Як жывецца на Беларусі // Зніч. № 45—46 / Пад крыпт. Я. З.

1959. Інтэрвію з а. Робэртам на радыёвай праграме ў Нью Ёрку // Бацькаўшчына. № 7—8; Парад ляяльнасці ў Нью Ёрку // Там жа. № 20—21; Яшчэ аб VIII кангрэсе БАЗА // Там жа. № 25—26; Савецкая выстаўка ў Нью Ёрку // Там жа. № 31; Моладзь з ЗБМА на фэстывалі... // Там жа. № 33; Беларусь у Задзіночаных Нацыях; Смаленскі Архіў // Там жа. № 38—39.

1960. У Беларускім Інстытуце Навукі й Мастацтва; Ньюёркаўскія вечарыны // Бацькаўшчына. № 9; Праўда й няпраўда пра БНР // Там жа. № 12—13; У чужой вопратцы // Там жа. № 17; Кніжная паліца // Там жа. № 31—32. Для каго рабіліся дэманстрацыі // Там жа. № 40—41; Кніжная паліца // Там жа. № 50—51.

1961. Зьезд беларускіх вэтэранаў Нью Ёрку; «Вянок» Максіма Багдановіча // Бацькаўшчына. № 1—2; Яўхім Карскі (1861—1961): (Выстаўка ў Публічнай Бібліятэцы Нью-Йорку з нагоды 100-годдзя з дня нараджэння) // Там жа. № 7; «Беларуская Моладзь». № 8 // Там жа. № 8; Праект «Моўныя рэсурсы Амэрыкі» // Там жа. № 10; Яшчэ ў справе «Голасу Амэрыкі» // Там жа. № 11; Беларускія вэтэраны ў Нью Ёрку // Там жа. № 14—15; Дзень Незалежнасьці Беларусі ў Нью Ёрку // Там жа. № 16; Тарас Шаўчэнка і Беларусь // Там жа. № 18; IX-ы Зьезд БАЗА // Там жа. № 24—25; У Беларускім Інстытуце Навукі і Мастацтва // Там жа. № 26; Выстаўка савецкай дзіцячай кнігі ў Нью Ёрку // Там жа. № 27; Жыды бядуюць не адны // Там жа. № 37 / Пад псеўд. А. Будзіч; Да пытаньня нашага нацыянальнага назову паангельску // Там жа. № 41.

1962. Дзень герояў у Нью Ёрку // Бацькаўшчына. № 1—2; Юбілей Купалы і Коласа ў Нью Ёрку // Там жа. № 15 / Пад крыпт. Я. З.

1963. Да Першага Усебеларускага Зьезду 1917 году: (Дакумэнты й матэрыялы) // Запісы. Кн. 2; Беларуская моладзь не здаецца /// Бацькаўшчына. № 1 / Пад крыпт. Я. З.

1964. Да Першага Усебеларускага Зьезду 1917: (Дакумэнты й матэрыялы) // Запісы. Кн. 3.

1965. Да пытаньня беларускага нацыяналізму // Беларус. № 103.

1966. Alojza Ciotka (1876—1916) // Беларус. моладзь. № 24. Спрэва аўтаноміі Беларусі ў Першай Думе і «Наша ніва»; Да Першага Усебеларускага Зьезду 1917 г.: (Дакумэнты й матэрыялы) // Запісы. Кн. 4; Навуковыя кадры БССР: колькасць і якасць (Паводле арт. Ф. Капуцкага й А. Кандыбы ў часопісе «Коммунист Белоруссии», № 10, 1955, бб. 61—66) // Беларус. № 106; Сакавіковыя ўгодкі ў Нью-Джэрзі // Там жа. № 108—109; «Цені з таго сьвету»: (Адкуль бярэцца праблема «бебурнацаў»?) // Там жа. № 110; Тыдзень паняволеных народаў / Пад крыпт. Я. З.; «Наша Ніва» й Навуковы метад // Там жа. № 111—112; Ці-ж ніхто й нічога не забыты? // Там жа. № 114 / Пад крыпт. Я. З.; Ці ж «роўная паміж роўных»? // Там жа. № 116 / Пад крыпт. Я. З.

1967. Год 1966 у Беларусі // Беларус. № 117 / Пад крыпт. Я. З.; Якой была смерць Купалы // Там жа. № 118 / Пад крыпт. Я. З.; Хаваюць нашу мінуўшчыну // Там жа. № 119 / Пад крыпт. Я. З.; Эканамічная няроўнасць у СССР // Там жа. № 12 / Пад крыпт. Я. З.; Савецкі дзень на ЭКСПО — 67 // Там жа. № 125 // Пад крыпт. Я. З.; На 50-я ўгодкі Усебеларускага Кангрэсу Там жа. № 128.

1968. Эканоміка Беларусі ў 1967 годзе // Беларус. № 129; Савецкая «Дактрына інтэрвенцыі» / Там жа. № 138 / Пад крыпт. Я. З.; Жыхарства сьвету й амерыканская сям'я // Там жа. № 133 / Пад крыпт. Я. З.

1969. Беларуская праблема на навуковай канфэрэнцыі ў Чыкага // Беларус. № 141 / Пад крыпт. З.; Ленін і беларуская дзяржаўнасьць // Там жа. № 142; Беларускія календары // Там жа. № 143 / Пад крыпт. А. Б.; Ленін і Беларусь // Там жа. № 145; Юбілейны Кангрэс БАЗА / Пад крыпт. Я. З.; Гісторыя ў «Беларускай Савецкай Энцыклапедыі» // Там жа. № 146; Праф. Л. Абэцэдарскі пра «неабвержныя факты» // Там жа. № 147—148; ЦК КПБ і нацыянальная мінуўшчына // Там жа. № 149; Ленін пра ўсходнюю мяжу Беларусі Там жа. № 150 / Пад крыпт. Я. З.; «Узьяднаньне» Заходняе Беларусі; Слуцкія падзеі 1920 г. // Там жа. № 151; «Журнал беларусаведы» № 3 // Там жа. № 152 Пад крыпт. Я. З.

1970. Браты Луцкевічы й мы // Беларус. № 153—155; Ленін ці Сталін стварыў БССР // Там жа. № 154; Сакавіковыя ўгодкі ў Нью Ёрку // Там жа. № 156 / Пад крыпт. А. Б.; БНР паміж варожымі Расіяй і Нямеччынай. 1. «Известия»: «Беларускую Раду немцы разагналі з 8 кулямётамі» // Там жа. № 157, 158; Пісьменнасьць дарэвалюцыйнае Беларусі й нацыянальная сьвядомасць; Дэхвальсыфікаваная гісторыя БНР — крыніца маральнае сілы // Там жа. № 159; Манархісты П. Струвэ й моўная палітыка ў БССР // Там жа. № 162.

1971. Рыскі трактат і Беларусь // Беларус. № 167; Андрэй Булат // Там жа. № 169; Генэрал Убарэвіч // Там жа. № 170; Адзінаццатая Сэсія Рады БНР / Пад крыпт. Я. З.; На 30-я ўгодкі нямецка-савецкай вайны // Там жа. № 171; Маркі БНР у афіцыйным ужытку ў Ангельшчыне // Там жа. № 172 / Пад крыпт. Я. З.; Хрушчоў-Беларусь-Гісторыя // Там жа. № 174; Гулкае рэха дзейнасьці Беларускае Моладзі / Пад крыпт. Я. З.; Да гісторыі Беларускага студэнцтва // Там жа. № 175; Нацыянальная мінуўшчына й маладое пакаленьне // Там жа. № 176.

1972. 1772—1992—1972: (Да ўгодкаў расейскага захопніцтва й русіфікацыі) // Беларус. № 177; Аўтаномія культурная й тэрытарыяльная // Там жа. № 179; 25 Сакавіка ў Нью Ёрку / Пад крыпт. Я. З.; Сьвятой памяці Юрка Харытончык былы Слуцкі паўстанец // Там жа. № 180; «Гоман» 1884 году й сучаснасць // Там жа. № 183; БНР у беларускай савецкай гістарыяграфіі // Там жа. № 185; Пытаньне беларускае дзяржавы й БелСЭ; «Вольная Беларусь» і Язэп Лёсік // Там жа. № 186; «Дэклярацыя правоў народаў Расіі» — заслона для русіфікацыі // Там жа. № 188; «У сьвятле гістарычных фактаў» // Там жа. № 192.

1973. Хвальшуюць Кастуся Каліноўскага // Беларус. № 190; «У сьвятле гістарычных фактаў» // Там жа. № 192; Нацыянальная самасьвядомасць // Там жа. № 197; Новы прыход БАПЦ // Там жа. № 198 / Пад крыпт. Я. З.; Яе Менск стаўся «Мінскам» // Там жа. № 199; Каталіцкая царква на Беларусі й беларуская мова // Божым шляхам. № 1.

1974. [Рэц. на кн.: Бібліяграфія па гісторыі Беларусі. Феадалізм і капіталізм. Мн., 1989] // Запісы. № 12; «Архіпелаг ГУЛаг» Аляксандра Салжаніцына // Беларус. № 202; КПЗБ і асэнсаваньне мінуўшчыны; Калечаньне моладзі: Да 30-годзьдзя «вызваленьня» Беларусі // Там жа. № 203; Сакавіковыя ўгодкі ў Вольным Сьвеце / Пад крыпт. Я. З.; БНР: дакументы й факты (Дачыненні з бальшавіцкімі й нямецкімі акупантамі) // Там жа. № 204; Факты гісторыі і ўзгадаваньне моладзі: (Да 80-годзьдзя ад нараджэньня Мікалая Галадзеда) // Там жа. № 205; Русыфікацыя народных хораў БССР / Пад крыпт. Я. З.; Пэкін пра савецкую нацыянальную палітыку // Там жа. № 206; Прэзыдэнт Ніксан наведаў Беларусь // Там жа. № 207; «Беларусь» у амерыканскім пашпарце // Там жа. № 208; «Дарогі» Рыгора Крушыны // Там жа. № 209; БССР: П'янства, раскраданьне й этыка // Там жа. № 210; Чаму няма 8-га тому БелСЭ // Там жа. № 211; Ці будуць існаваць савецкія рэспублікі? // Там жа. № 212 / Пад крыпт. Я. З.

1975. Byelorussia's Representatives in the Second State Duma (20 Feb.— 2 June, 1907) // The Journal of Byelorussian Studies (London). Vol. 3. N 3; Беларусь у пару Дзяржаўных Думаў Расеі; Дыпламатычны пашпарт Ураду Беларускае Народнае Рэспублікі; Устаўныя граматы Беларускае Народнае Рэспублікі // Запісы. № 13; «Лекцыю лічыць непажаданай...»; БНР і Бэрлінская канферэнцыя (1925—1975) // Беларус. № 215; «Ле Монд» пра Васіля Быкава / Пад крыпт. Я. З.; Сааўт. А. А. [Адамовіч]; У БІНіМ пра Аляксандра Салжаніцына // Там жа. № 216; Угодкі незалежнасьці Беларусі ў Нью Ёрку // Там жа. № 217 / Пад крыпт. Я. З.; Парахвіяльнае сьвята ў Брукліне // Там жа. № 218 / Пад крыпт. Я. З.; Памяці Архіяпіскапа Васіля; Дні беларусаведных студыяў у Атаве // Там жа. № 219 / Пад крыпт. Я. З.; Юбілей Беларускай Маладзёжнай Арганізацыі / Пад крыпт. Я. З.; Адкрыты ліст д-ра Янкі Запрудніка // Там жа. № 220.

1976. «Мужыцкая праўда» — набат паўстаньня 1863 году // Запісы. Т. 14; Усебеларускае сьвята ў ЗША // Беларус. № 225; Нацыяналізм ад сацыялізму; Энцыклапэдыя Брытаніка пра Беларусь. // Там жа. № 226—227; У амэрыканскім друку пра выстаўку ў Менску / Пад крыпт. Я. З.; Цэнтр мастацтваў — цудоўная мясьціна! // Там жа. № 228; Савецкая канстытуцыя й «вялікі тэрор» // Там жа. № 234; 70-годдзе «Нашай нівы»; «Інтэрнацыянал» Янкі Купалы // Там жа. № 235; «Песьняры» ў Амэрыцы: Другі Беларускі Фэстываль // Там жа. № 236 / Пад крыпт. Я. З.; Калядная бяседа // Там жа. № 237 / Пад крыпт. Я. З.

1977. Дзяржаўнасць Беларусі ў дасавецкую пару // Запісы. Т. 15; Дзень герояў Беларусі ў Нью Ёрку // Беларус. № 237 / Пад крыпт. Я. З.: Юбілейная канфэрэнцыя Беларускага інстытута навукі й мастацтва // Там жа. № 238 / Пад крыпт. Я. З.; Юбілейная бяседа ў гонар доктара Станіслава Станкевіча; Амэрыканскія газэты пра «Песьняроў» // Там жа. № 239 / Пад крыпт. Я. З.; У змаганьні за правы народу (Прамова д-ра Я. З. на сьвяткав. сакавіковых угодкаў у Нью Ёрку) // Там жа. № 240; Выстаўка «Забытыя культуры СССР» // Там жа. № 242 / Пад крыпт. Я. З.; Культура й «руховыя статыстычныя рэляцыі» / Пад псеўд. А. Загорны; Паэты й тэорыя пра аднамоўе // Там жа. № 247; Статыстыка пра русыфікацыю гарадоў Беларусі / Пад псеўд. А. Загорны; У Беларускім Інстытуце навукі й мастацтва / Пад крыпт. Я. З. // Там жа. № 248.

1978. 75-годзьдзе мастака І. Мірановіча / Пад крыпт. Я. З.; Русыфікацыя беларускіх гарадоў // Беларус. № 249; Кастусь Каліноўскі: (Да 140-годдзя нараджэння) // Там жа. № 250; Юбілей д-ра В. Жук-Грышкевіча / Пад крыпт. Я. З.; «Современник»; Да 75-годзьдзя БСГ (Бел. Сацыял. Грамады) // Там жа. № 251; Канфэрэнцыя ў дзяржаўным дэпартаманьце // Там жа. № 252 / Пад крыпт. Я. З.; «Растрата мазгоў» // Там жа. № 254 / Пад псеўд. А. Загорны; Як прафэсар Лойка «цытуе» Каліноўскага / Пад псеўд. А. Загорны; Апошняя трыбуна Толі Сербантовіча // Там жа. № 255—256; Няпісьменнасьць ад асьветы; Пра рэалізм Талстога і сацрэалізм Шамякіна / Пад псеўд. А. Загорны; Прафесар Дынглі пра беларусаведу / Пад крыпт. Я. З. // Там жа. № 258;

Інтэрв'ю з старшынёй этнічнае Рады ў Нью Джэрзі д-рам Вітаўтам Кіпелем // Там жа. № 259—260.

1979. К. Мазураў выведзены з Палітбюро; Вечар Івана Чыгрынава / Пад псеўд. А. Загорны; Дэкалянізацыя Савецкага Саюзу / Сааўт. В. Кіпель, А. Шукелойць // Беларус. № 261; Беларусы ў космасе й на зямлі; Спадчына й трутні // Там жа. № 262 / Пад псеўд. А. Загорны; Разьвітаньне з Рыгорам Крушынам // Там жа. № 264; Або свая песьня, або ярмо // Там жа. № 265 / Пад псеўд. А. Загорны; Юбілей Натальлі Арсеньевай / Пад крыпт. Я. З.; Трэйці Беларускі Фэстываль у Амэрыцы // Там жа. № 266; Лісты сэнатара Робэрта Доўла ў справе Міхала Кукабакі / Пад крыпт. Я. З.; Напярэймы сотым угодкам Янкі Купалы // Там жа. № 267; VIII Канґрэс Беларуска-Амэрыканскага задзіночаньня; 450-годдзе першага Статуту ВКЛ // Там жа. № 270; Беларускія дажынкі ў Нью-Ёрку / Пад крыпт. Я. З.; Гай дэ Пікарда ў Нью-Ёрку // Там жа. № 271—272.

1980. Юбілейны рэфэрат Антона Адамовіча; Літаратурны вечар Веры Рыч // Беларус. № 273 / Пад крыпт. Я. З.; «Зьвязда», ТАСС і мова Ф. Скарыны // Там жа. № 274 / Пад псеўд. А. Загорны; Памяці братоў Луцкевічаў; Нарада ў Белым Доме // Там жа. № 257; «Скарына і наш (зрусіфікаваны) час» // Там жа. № 276 / Пад псеўд. Арсень Загорны; Жаданьне жыхароў Менску што да свае мовы / Пад псеўд. А. Загорны; Канфэрэнцыя аб этнічных праблемах ЗША // Там жа. № 278; Памяць: (На 10-я ўгодкі сьмерці Міколы Абрамчыка) // Там жа. № 279; Гальяш Леўчык (На 100-годдзе ад ягонага нараджэння) / Пад псеўд. А. Загорны; Што кажацца пра статуты ВКЛ у БССР? (На аснове дакладу на канфэрэнцыі БІНІМ пры Кліўлендскім універсітэце) // Там жа. № 280—281; Мэмарандум пра дэкалянізацыю СССР / Пад псеўд. А. Загорны; Віктар Швэд у Лёндане / Пад крыпт. А. З.; «Рэгабілітацыя» тэмы БНР; Паховіны Д-ра Станіслава Станкевіча // Там жа. № 283—284.

1981. Дзьве паштоўкі зь Беларусі // Беларус. № 285 / Пад крыпт. Я. З.; Спадчына бацькоў: «агледзіны» (Да 100-годдзя з дня нараджэння Я. Купалы і Я. Коласа) // Там жа. № 286, 287; Незалежнасць: Акт і Акцыя // Там жа. № 287 / Пад крыпт. Я. З.; Выстаўка беларускае кнігі / Пад крыпт. Я. З.; Літаратурны вечар Веры Рыч / Пад крыпт. З. // Там жа. № 289; «Пан бог разумее па-беларуску»; Урачыстасьць заканчэньня помніка // Там жа. № 293 / Пад крыпт. Я. З.; Янка Купала й «Наша Ніва» // Там жа. № 294—295 / Пад псеўд. Алесь Загорны.

1982. Варшаўская газета пра беларусаў // Беларус. № 296. / Пад крыпт. Я. З.; 15-я сустрэча беларусаў Паўночнае Амэрыкі (4—6 верасня 1982 г.) // Там жа. № 303—304 / Пад крыпт. Я. З.; Беларускае аб'яднаньне студэнтаў у Польшчы // Там жа. № 306—307 / Пад крыпт. Я. З.

1983. Soviet Documentation of Bylorussia's History. (1902—1919) // Запісы. № 17; Ларыса Геніюш / Пад псеўд. Арсень Загорны; У Нью Ёрку (ЗША) / Пад крыпт. З.; У Чыкага (ЗША) / Пад крыпт. А. Б.; Пра дакументацыю падзеяў вайны // Беларус. № 310; Непрапарцыянальная роля КПБ; 10-годзьдзе айца Аляксандра // Там жа. № 312 / Пад крыпт. Я. З.; Пра «Пекла» Сяргея Грахоўскага; Вацлаў Ластоўскі: (Да 100-годдзя нараджэння — 20.X.1883 г. і 45-ых угодкаў гібелі — 1938 г.) // Там жа. № 313 / Пад псеўд. Арсень Загорны.

1984. А. Луцкевіч і Ленін пра лік беларусаў / Пад псеўд. Арсень Загорны; Сустрэча зь пісьменьнікам з БССР / Пад крыпт. Я. З.; Антон Луцкевіч: (На 100-годдзе ад нараджэння) // Беларус. № 315; Да гісторыі праваслаўя на Беларусі // Там жа. № 316 / Пад крыпт. Я. З.; Як Хведар сьвятара «перавыхоўваў» // Там жа. № 319 / Пад крыпт. Я. З.; «Мёртвым не баліць» В. Быкава // Там жа. № 321; Вечар Рыгора Барадуліна // Там жа. № 323 / Пад крыпт. Я. З.; Куды йдзе «Работніца й сялянка»?; Пра беларускую рок-музыку / Пад псеўд. Арсень Загорны; Стан рэлігіі на Беларусі // Там жа. № 324.

1985. Зярняты: (Матар'ялы да слоўніка выказваньняў, крылатых словаў і афарызмаў пра Беларусь) // Беларусь. № 325; «Беларуская папка» на тэлеэкране // Там жа. № 326; Пра вершы Пушкіна й Купалы // Там жа. № 327 / Пад псеўд. А. Загорны.

1.4.

1984. Курылёва С. Як Хведар сьвятара «перавыхоўваў» / З рус. // Беларус. № 319 / Пер. пад крыпт. Я. З.

1.6.

Паўстанне на Беларусі 1863 году: «Мужыцкая праўда» і «Лісты з-пад шыбеніцы». Нью Ёрк, 1980 / Камент. з Т. Бэрдам.

2.3.

На беларускай мове. [Біябібліяграфічная нататка] // Ля чужых берагоў. Мюнхэн, 1955. С. 149; Госьць з Бэльгіі ў Торонто // Бел. эмігрант. 1953. № 5; С. Б. Балцкія «пярэпалахі» партыі // Беларус. 1976. № 232.

2.4.

На беларускай мове. Сыч П. Рэзыгнацыя (С. Ясеню із словамі дружбы і для навукі): [Верш] // Ля чужых берагоў. Мюнхэн, 1955.

Т. М. Махнач.

ЗАРЭЧНЫ ЦІМОХ

Зарэчны Цімох [сапр. Рублёў, 1910, Случчына (?) — 1944 (?)], празаік.

Біяграфічных матэрыялаў пра Ц. Зарэчнага адшукаць не ўдалося. Вядома толькі, што ён вучыўся ў пединстытуце. Паводле звестак, атрыманых ад былога дырэктара Нясвіжскай настаўніцкай семінарыі С. Тулейкі, які цяпер жыве ў ЗША, Ц. Зарэчны ў час вайны працаваў настаўнікам беларускай мовы і літаратуры ў гэтай семінарыі, жыў у Нясвіжы з жонкай і дачкой да 1944. У 1944 падаўся ў Польшчу, змяніўшы сваё прозвішча на жончына — Лукашэвіч. Адна з версій — загінуў у 1944 каля Гарадзеі.

Друкавацца пачаў у 1928. Першы нарыс «Праз восем год» апублікаваны ў газеце «Савецкая Беларусь». Акрамя нарысаў («Адноўленая Кругляншчына», «На новай зямлі — новыя людзі», «Людзі зямлі», «Дзесяць пераможных», «Новая зямля» і інш.) пісаў фельетоны («Быўшыя людзі арудуюць», «Цыркавы табар», «Бабе разанскай не месца ў райвыканкоме», «Журба на сэрцы, журба...», «Сіўка-Бурка і хамэльёны на тарантасе» і інш.). Выдаў зборнікі: «Сустрэчы», «Узбунтаваная зямля», «Паэма пра геройства» (у сааўтарстве са Сцяпанам Ліхадзіеўскім), «Пажары». Нарысы прысвечаны пераважна будаўніцтву новых фабрык, заводаў, вясковым праблемам, у фельетонах выкрываў і асуджаў негатыўныя з'явы тагачаснай рэчаіснасці. З 1929 паступова адышоў ад журналістыкі, пачаў пісаць мастацкія творы. Першае апавяданне «Неразгаданая маладосць» надрукавана ў 1929 у газеце «Савецкая Беларусь». Потым

яны рэгулярна з'яўляліся ў рэспубліканскай перыёдыцы. Выйшлі асобныя зборнікі яго прозы «Маладосць» (навелы і апавяданні), «Рудняскі пастушок». Пісаў аповесці («Эльбрусы чалавечага шчасця», «Зямля ў вятрах», «Маці і сын», «Андрэй Блажко»), раман «Белы камень», урыўкі з якога друкаваліся ў газеце «Чырвоная Беларусь». У творах паказаў цяжкасці жыцця беларускага сялянства, побыт і праблемы беларускіх мастэчак, імкнуўся да шматграннага адлюстравання чалавечых характараў. Пісаў крытычныя артыкулы, перакладаў на беларускую мову творы С. Новікава-Прыбоя, Г. Уэлса, М. Сервантэса, Я. Бранеўскай і інш.

Л. С. Савік.

Бібліяграфія

1.2.

Сустрэчы: Нарысы і фельетоны. Мн., 1930.

Узбунтаваная зямля: Нарысы. Мн., 1930.

Маладосць: Навелы і апавяданні. Мн., 1931. Рэц.: Я. Ш. [Шарахоўскі Я.] // Чырв. Бел. 1932. № 1.

Паэма пра геройства: [Нарыс]. Мн., 1932.

Пажары: Нарысы і фельетоны. Мн., 1933.

Руднянскі пастушок: [Апавяданне]. Мн., 1941.

1.3.

1928. Праз восем год...: [Нарыс] // Сав. Бел. 11 ліп.; На новай зямлі — новыя людзі // Там жа. 13 ліп.; Пад шумлівым клёнам: [Нарыс] // Там жа. 25 ліп.; Быўшыя людзі арудуюць: [Фельетон] // Там жа. 31 ліп.; Адноўленая Кругляншчына: [Нарыс] // Там жа. 6 вер.; Зерне новага на камяністай глебе: [Нарыс] // Там жа. 21 вер.; Камуна «Шлях селяніна»: (Да конкурсу на лепшы ўраджай): [Нарыс] // Там жа. 22 вер.; Перад і пасля сяўбы: (З блакноту падарожніка) // Там жа. 30 вер.; Людзі зямлі: [Нарыс] // Там жа. 20 кастр.; Мы ўсходзім на сацыялістычныя рэйкі: [Нарыс] // Там жа. 28 кастр.; Легендарны журавінны: (З блакноту падарожжа на Асінстрой) // Там жа. 7 ліст.; Адкрыты наступ класавага ворага // Там жа. 14 ліст.; «Цыркавы табар»: (Фельетон) // Там жа. 22 ліст.; На перадвыбарчых ухабах: (Ліст з Воршы) // Там жа. 27 ліст.; «Бабе разанскай не месца ў райвыканкоме»: (Фельетон) // Там жа. 6 снеж.; Па-за рэчкай, на другім беразе...: (З дарожных нататак) // Там жа. 11 снеж.; Барацьба за саветы: (Ліст з Воршы) // Там жа. 12 снеж.; Па ціхіх хвалях (Адна з сумных гісторый): [Фельетон] // Там жа. 14 снеж.; Нервовыя прафесары: (Маленькі прадвыбарчы фельетон) // Там жа. 15 снеж.

1929. Дзесяць пераможных...: [Нарыс] // Сав. Бел. 3 студз.; Эскіз да партрэту: [Фельетон] // Там жа. 6 студз.; Конкурсныя экспанаты: [Фельетон] // Там жа. 11 студз.; Агонь па антысемітах!: [Фельетон] // Там жа. 19 студз.; У контррэвалюцыйным коле: [Фельетон] // Там жа. 25 студз.; Законы і праўда жыцця: [Фельетон] // Там жа. 26 студз.; Гуляюць у пасеўкампанію: [Фельетон] // Там жа. 7 лют.; Дэзертыры з пасеўнага фронту // Там жа. 15 лют.; Падлеткі-бунтары // Там жа. 12 сак.; Журба на сэрцы, журба...: [Фельетон] // Там жа. 23 сак.; Герой нашага часу: [Фельетон] // Там жа. 29 сак.; Дагестан на Беларусі: [Фельетон] // Там жа. 9 крас.; Фабрыка святых анекдотаў: [Фельетон] // Там жа. 17 крас.; Абуджаны лёс // Там жа. 27 крас.; Лударвай у Макрадцы: [Фельетон] // Там жа. 9 мая; Галерэя лішніх людзей: [Фельетон] // Там жа. 18 мая; Горад навукі ў горадзе працы // Там жа. 29 мая; Трэба палепшыць эканамічнае становішча станцыі // Там жа. 30 ліп.; Кітайская сцяна: [Фельетон] // Там жа. 1 чэрв.; Неразгаданая маладосць: [Апавяданне] // Там жа. 4, 7 жн.; Прыязджай да мяне, дружа: [Фельетон] // Там жа. 11 жн.; Палахлівыя ваякі: [Фельетон] // Там жа. 13 жн.; Раман у 28 раздзелах: (Прадукцыя літгрупы «???Кручкатвор???»): [Фельетон] // Там жа. 23 жн.; Новая зямля: [Нарыс] // Там жа. 10 вер.; Пад пераможным сцягам: (Нарыс) // Там жа. 12 вер.; Трактарам узнятая цаліна: [Нарыс] // Там жа. 14 вер.; Слабадская гара: [Нататкі з дарогі] // Там жа. 28 вер.; Два з паловай крыжыкі: (Эскіз) // Там жа. 29 вер.; Трэскі на хвалях: [Фельетон] // Там жа. 17 кастр.; Гомель у Кіеве: [Фельетон] // Там жа. 3 ліст.; Сустрэчы: [Апавяданне] // Там жа. 24 ліст.; Снегавы крыж: [Фельетон] // Там жа. 21 снеж.

1930. Узбунтаваная зямля: [Фельетон] // Чырв. Бел. № 1; Вазіць — не перавазіць, насіць — не перанасіць: [Фельетон] // Сав. Бел. 24 студз.; Залатая гара і суровыя вывады: [Фельетон] // Там жа. 31 студз.; На абломках «Царскіх врат»: (Фельетон) // Там жа. 8 лют.; Сіўка-Бурка і хамэльёны на тарантасе: [Фельетон] // Там жа. 1 сак.

1931. Маладосць: Апавяданне // Маладняк. № 3; Сосны: Апавяданне // Там жа. № 6—7; Эльбрусы чалавечага шчасця: Аповесць // Там жа. № 9—12; 1932. № 1; Паэма пра геройства: Нарыс // Там жа. № 11 / Сааўт. С. Ліхадзіеўскі; Зямля ў вятрах: Урывак з аповесці // Полымя. № 4; Думы: Апавяданне // Там жа. № 6—7; Трывога: Апавяданне // Чырв. Бел. № 6; Вынаходца: Апавяданне // Там жа. № 9; У чыстым полі: Апавяданне // Там жа. № 10; Пятро Савіч: Паэма пра геройства // Звязда. 29 кастр. / Сааўт. С. Ліхадзіеўскі.

1932. Мастэчка: Апавяданне // Беларусь калгасная. № 5; Слаўная армія: Апавяданне // Чырв. Бел. № 3; Сонечная будучыня: Урывак з рамана «Белы Камень» // Там жа. № 22; Паказаць героіку камсамола: Нататкі пісьменніка пра творчыя планы // ЛіМ. 21 крас.; Стахван Багмут: [Урывак з рамана] // Там жа. 27 чэрв.; Маэстра ў ясным гарнітуры: [Памфлет] // Там жа. 10 ліп.; Вітаем народнага паэта рэспублікі: (Я. Купале — 50 год) // Чырв. змена. 10 вер. / У сааўт.

1933. Белы афіцэр: Апавяданне // Іскры Ільіча. № 10; Бабіна лета: Апавяданне // Полымя рэвалюцыі. № 8—9; Пісьменнікі і крытыкі ў 1933 г. // ЛіМ. 28 студз.

1934. Цёплыя воды: [Апавяданне] // Работніца і калгасніца Бел. № 3; Дзяўчына з ускраіны: (Навела) // Там жа. № 8.

1935. Апавяданне партызана // Калгаснік Бел. 20 мая; Маці і сын: Урывак з аповесці // Там жа. 23 чэрв.; Гадзюка: Апавяданне // ЛіМ. 2 лют.

1936. Голуб: [Апавяданне] // Іскры Ільіча. № 3; Паўстанне праваслаўных: Фельетон // Чырв. Бел. № 3; Пераклады на невядомым «нарэччы» // ЛіМ. 26 крас.

1939. Апошняя ноч: (Урывак з апавядання) // Вызваленым братам. Мн.; На рацэ Нёман: Апавяданне // Чырв. змена. 30 кастр.

1940. Цёзкі; Арцём з Чырвонай Горкі: Апавяданні // Полымя рэвалюцыі. № 8; У госці; З перасветам; Мяжа; Чуры: [Апавяданні] // Там жа. № 12; Андрэй Блажко: Урывак з аповесці // Звязда. 11 ліп.; Учора і сёння: [Нарыс] // Там жа. 6 кастр.; Марыя Нікалаеўна Чэрнік: [Нарыс] // Чырв. звязда. 28 лют.; Рафаіл сяржант: [Нарыс] // Там жа. 3 сак.; Арынка: [Апавяданне] // Там жа. 14 вер.

1941. Буслянё; Кухта: Апавяданні // Полымя. № 2; Шчасце; Людзі як людзі: Апавяданні // Там жа. № 3; Родная зямля: [Апавяданне] // Звязда. 1 мая; Старыя ліпы: Апавяданне // ЛіМ. 10 мая.

1.4.

Беразоўскі Ф. Бабскія сцежкі: Раман / З рус. Мн., 1931.

Уэльс Г. Першыя людзі на месяцы: [Раман] / З англ. Мн., 1931.

Новікаў-Прыбой А. Жанчына ў моры: Аповесць / З рус. Мн., 1936.

Сервантэс М. Дон Кіхот Ламанчскі / З ісп. Мн., 1936.

Фінк В. Іншакраінны легіён: [Аповесць] / З рус. Мн., 1936.

1934. Сендэр Р. Х. Вецер у астрозе: (Урывак з рамана «Г. П.») // ЛіМ. 6 ліст.

1940. Бранеўская Я. Прачка: [Апавяданне] / З пол. // Звязда. 17 ліст. / Сааўт. пер. Р. Казак.

1.5.

На польскую мову. Zbudzony kraj / Tł. K. Anselm // Szt. Wolności. 1940. 9 paźdź.

На рускую мову. Тезки: (Рассказ) / Пер. Е. Мозольков // Тридцать дней. 1941. № 1.

2.3.

Горскі Э. Аб нарысах Цім. Зарэчнага // ЛіМ. 1933. 13 чэрв.; Дакутовіч Г. За дыялектычна-матэрыяліс-тычны нарыс // Маладняк. 1932. № 2—3; Знаёмы С. Крыху пра нарыс // Там жа. 1931. № 6—7; Кучар А., Куляшоў А. Супраць кулацкіх тэндэнцый у літарату-ры // ЛіМ. 1935. 20 крас.; Плашчынскі І. Апавяданні Цімоха Зарэчнага // Звязда. 1941. 6 чэрв.

М. П. Барташэвіч.

ЗМАГАР АЛЕСЬ

Змагар Алесь (інш. псеўд. Валошка Алесь; сапр. Яцэвіч Аляксандр Хведаравіч; н. 1.10.1903, в. Цароўцы Слуцкага пав. Мінскай губ., цяпер у межах г. Слуцка), паэт, празаік, драматург, перакладчык, публіцыст.

Нарадзіўся ў сям'і валаснога фельчара. Талент апавядальніка, майстра расказваць байкі меў дзед па маці А. Змагара — яго часта збіралася паслухаць уся вёска. Дзед будучага пісьменніка па бацьку паходзіў з запарожскіх казакоў, любіў і добра ўмеў ездзіць на кані. Бацька А. Змагара вызначаўся незвычайнай фізічнай сілай. Усе гэтыя рысы перадаліся ў спадчыну хлопчыку. Яго выхоўвалі бабуля і дзед, бо ў бацькоў часта не хапала часу для таго, каб займацца дзіцем. Схільнасць да мастацтваў у хлопчыка выявілася з маленства. Пасля заканчэння народнай школы ў 1914 А. Змагара аддалі вучыцца ў Слуцкую класічную гімназію, дзе настаўнікі заўважылі яго паэтычныя зацікаўленні. З вершамі ён выступаў у гімназічным часопісе «Прамень». У лістападзе 1920 разам з бацькам удзельнічаў у антыбальшавіцкім Слуцкім паўстанні, за што бацька быў расстраляны, а самога А. Змагара прысудзілі да двух гадоў зняволення. Да заканчэння тэрміну пакарання ён уцёк, прыехаў у Мінск. Дзякуючы дапамозе пісьменніка Р. Мурашкі А. Змагару ўдалося ўцалець ад праследаванняў улад і пазбегнуць арышту органамі НКУС. У 1925 ён паступіў у Вышэйшы педагагічны інстытут на літаратурна-лінгвістычнае аддзяленне. Паспяхова закончыўшы яго ў 1930, атрымаў пасаду настаўніка ў мяст. Радашковічы каля Мінска. У гады Вялікай Айчыннай вайны быў у Мінску: ратуючы жыццё, паводле парады таго ж Р. Мурашкі, пайшоў працаваць журналістам у рэдакцыю акупацыйнай «Беларускай газэты». Пасля быў настаўнікам, інспектарам беларускіх народных школ у Радашковіцкім, Лідскім, Шчучынскім павятах. Прымаў удзел у 2-м Усебеларускім кангрэсе, які адбыўся 27 чэрвеня 1944 у Мінску. У 1944 выехаў за межы Беларусі. Жыў у Аўстрыі, дапамог адкрыць там 5 беларускіх пачатковых школ. З 1949 — у Францыі, узначальваў розныя эмігранцкія арганізацыі (Беларускі вызвольны рух, «Баявая ўскалось» і інш.), дапамагаў рэдагаваць часопісы «Баявая ўскалось» і «За волю». У 1956 эміграваў у ЗША, пасяліўся ў Кліўлендзе, дзе рэдагаваў газету «Незалежная Беларусь», быў старшынёй Галоўнай управы Беларускага вызвольнага руху. Цяпер жыве ў штаце Фларыда (г. Ст. Пецярбург). Родны брат (па маці) пісьменніка Янкі Золака (А. Даніловіча). Як аўтар А. Змагар даволі плённы ў розных жанрах. Вершы ён пачаў пісаць у дзяцінстве. У час фашысцкай акупацыі Беларусі як паэт і публіцыст актыўна публікаваў свае творы ў беларускамоўных газетах і часопісах. У эміграцыі яго творы друкаваліся ў часопісах «Беларуская моладзь» (ЗША), «Баявая ўскалось» (Канада), у літаратурна-мастацкім альманаху «Пражэктар» (ЗША, Кліўленд, 1967) і інш. Выехаўшы з Беларусі, ён выдаў шмат кніг: апавяданне «Случчакі» (Зальцбург, 1947), вершаваны казачны абразок «Рэпка» (Лінц, 1946), паэтычны зборнік «Да згоды» (Кліўленд, 1962), «рэфераты ці мантажы» «Вызвольныя шляхі» (Кліўленд, 1965), апавяданні «Лесавікі» (Кліўленд, 1973), раман «Случчына ў вагні» (Фларыда, 1986). Падрыхтаваў да друку, але не выдаў кнігі «Мае ўспаміны», «Дзённік» (працу над імі працягвае), зборнік вершаў «Жыве Беларусь» (1941), апавяданні «На крывых каляінах» (1943), «вершы кахання»

«Пад чаромхай» (1917—1985), раман «Ганебная пляма» (1942), драматычныя творы «Дыяменты шчасця» (1960), вершы для дзяцей «Школка» (1959). Творчую манеру А. Змагара вызначае сплаў інтымнасці, задушэўнасці, лірызму і адначасова грамадзянскага напалу, ідэалагічнай завостранасці. Важнае месца займае тэма гістарычнага мінулага. Сваю патрыятычную пазіцыю вернасці Радзіме пісьменнік выказаў словамі: «Беларусь з'яўляецца для мяне Бацькаўшчынай, дзе я радзіўся і для якой жыву». Стыль А. Змагара характарызуецца блізкасцю да выяўленчых традыцый беларускага фальклору. Прыгожая мова яго твораў мае народна-дыялектную аснову. Пісьменнік карыстаецца граматыкай Б. Тарашкевіча, лічачы заганным сучасны правапіс. *С. Б. Сачанка.*

Бібліяграфія

1.2.

Рэпка: Казачны абразок. Лінц, 1946.
Случчакі: Апавяданне. Зальцбург, 1947.
Да згоды: Вершы. Кліўленд, 1962.
Вызвольныя шляхі: Артыкулы. Кліўленд, 1965.
Лесавікі: Апавяданні. Клевэланд, 1973.
Случчына ў вагні. Фларыда, 1986.

1.3.

1944. У бітву рвуцца сьмела слуцкія палкі: [Верш] // Раніца. № 49.

1945. Я маю толькі шлях адзін: [Верш] // Раніца. № 10.

1948. У бітву рвуцца сьмела слуцкія палкі: [Верш] // Моладзь. № 5; Сон пад Новы Год: [Апавяданне] // Там жа. № 6.

1949. Галасы ўдзельнікаў Слуцкага паўстаньня. Цыганкоў зьнішчаны: (Урывак з III часткі раману «Случчына ў вагні») // Бацькаўшчына. № 47—48; 25 Сакавіка: [Верш] // Там жа. № 8(52); Юначка: [Верш] // Моладзь. № 7 / Лац.; Дзень 25 сакавіка: [Верш] // Там жа. № 9; Я з табою поплеч...: [Верш] // Там жа. № 12; Жыве Беларусь! Жыве воля!; Сьмерць слуцкага паўстанца-юнака: [Вершы]; Лепш сьмерць, чым няволя: (Урывак з III часткі рамана «Случчына ў вагні») // Там жа. № 14: Каляды; Завіруха: [Вершы]; Каляды: [Урывак з I часткі рамана «Случчына ў вагні) // Там жа. № 15.

1950. Каляды; Вер!: [Вершы] // Божым шляхам. № 12; Вясна: [Верш]; (Урывак з II часткі раману «Случчына ў вагні); 25 сакавіка — сымбаль незалежнасьці Беларусі // Моладзь. № 17; Хадзем!: [Апавяданне] // Там жа. № 18; Хутка надыйдзе пара!: [Верш] // Там жа. № 19; За маці-Беларусь: [Верш] // Там жа. № 20 / Лац.

1951. Юнаку: [Верш] // Моладзь. № 21; Бацьку: [Верш]; Урыўкі з рамана «Случчына ў вагні» // Там жа. № 25.

1952. Цыганкоў зьнішчаны: (Урывак з III часткі раману «Случчына ў вагні») // Бацькаўшчына. № 47—48; Успаміны пра Я. Пушчу: (На лекцыі беларускае літаратуры ў БДУ у 1929 г.) // Моладзь. № 27.

1953. Хто хутчэй: (Урывак з рамана «Случчына ў вагні») // Беларус. № 21; Да згоды: [Верш] // Беларускі голас. 25 сак.

1960. Ты будзеш жыць: [Верш] // Бел. думка. № 1; Лесавікі: Апавяданне // Там жа. № 1; 1961. № 2.

1961. Дарагая, не плач; І гады мінаюць за гадамі: [Вершы] // Бел. думка. № 2; То быў дваццаты слаўны год: [Верш] // Там жа. № 3.

1962. А ці помніш той край; Князёўна дум маіх: [Вершы] // Баявая ўскалось. № 7; Смуткам плешчуць хвалі: [Верш]; Благаславі, матуля!: Апавяданне // Бел. думка. № 4.

1963. Папугай: Байка // Бел. думка. № 5.

1964. Над магілай: [Верш] // Бел. думка. № 6.

1965. Дзе ты?; Жар у грудзёх не згасіць: [Вершы] // Бел. думка. № 7; Песьня: [Верш] // Там жа. № 8.

1967. Вершы // Пражэктар: Літаратурна-мастацкі альманах. Кліўленд, 1967.

1967—1968. Харватка: [Верш] // Бел. думка. № 10—11.

1969. Ты ўсміхнулася мне: [Верщ] // Баявая ўскалось. № 8.

1970. Алесь Змагар: (Кароткая аўтабіяграфія) // Баявая ўскалось. № 9.

1979. 25 Сакавіка; Нам паміраць шчэ зарана; Янг Пун: [Вершы] // Бел. думка. № 23.

1984. Беларусь: [Верш] // Бел. думка. № 29.

1985. Сьцежкі-дарогі майго жыцьця: (заканчэньне): [Успаміны] // Летапіс. Ліпень. *В. М. Грышкевіч.*

ЗОЛАК ЯНКА

Золак Янка [інш. псеўд.: Антось Вірок, Антось Пясьняр; сапр. Данілавіч Антон Міхайлавіч; н. 1(14).11.1912, в. Лучнікі Слуцкага пав. Мінскай губ., цяпер Слуцкі р-н Мінскай вобл.], паэт, празаік, журналіст, выдавец.

Нарадзіўся ў сялянскай сям'і. Дзяцінства яго прыпала на першую сусветную і грамадзянскую войны. З шасці гадоў (2 зімы) вучыўся ў «дарэктара». Скончыў Лучнікоўскую сямігодку (1928), дырэктарам якой быў Р. Пацэвіч — выпускнік Лёсікаўскіх курсаў беларусаведаў. Вучыўся па кнігах М. Грамыкі, Я. Лёсіка, С. Некрашэвіча, А. Смоліча, творах Ф. Багушэвіча, В. Дуніна-Марцінкевіча, Я. Коласа, Цёткі, Ц. Гартнага, М. Гарэцкага, М. Чарота, шмат чытаў рускай класікі. У сямігодцы выдаваліся рукапісны літаратурны часопіс «Прамень» і насценныя газеты, дзе Я. Золак змяшчаў свае першыя вершы і допісы. Скончыўшы аднагадовыя настаўніцкія курсы ў Рагачове (1930), працаваў настаўнікам у пачатковых школах Бабруйскага раёна. У 1930—35 завочна вучыўся ў Мінскім педтэхнікуме. З 1935 — настаўнік беларускай мовы і літаратуры ў сярэдніх школах Бабруйскага р-на. Адначасова вучыўся на літаратурна-лінгвістычным факультэце Аршанскага настаўніцкага інстытута. На гэты час прыпадаюць сустрэчы з П. Галавачом, Я. Коласам, знаёмства

з В. Віткам, Р. Лыньковым (з апошнім працаваў у бабруйскай раённай газеце «Камуніст»). На пачатку Айчыннай вайны вярнуўся ў родную вёску, выкладаў у Лучнікаўскай сямігодцы, прымаў актыўны ўдзел у беларускім нацыянальна-грамадскім жыцці, працаваў у акруговым аддзеле самапомачы і ў рэдакцыі «Газэты Случчыны» (разам з У. Клішэвічам, Р. Крушынам, Л. Случанінам). Там друкаваў на «Літаратурных старонках» свае творы, якія потым увайшлі ў калектыўны зборнік «Песьняры Случчыны» (Слуцк, 1943). У 1943 Слуцкі драматычны тэатр ставіў у перакладзе Я. Золака на беларускую мову п'есу Лопэ дэ Вэга «Сабака на сене». З адступленнем немцаў у 1944 выехаў у Германію, дзе працаваў у «баўэраў». У 1945 пераехаў у Рэгенсбург, дзе быў заснаваны першы беларускі лагер для «перамешчаных асоб». Напачатку працаваў у адміністрацыі лагера, потым у пачатковых школах Рэгенсбурга, Віндышбергердорфа, у гімназіі імя Я. Купалы ў Міхельсдорфе і Бакнангу. Адначасова ўдзельнічаў у выданні беларускіх часопісаў «Зьвіняць званы Сьвятой Сафіі», «Зважай», «Шыпшына», рэдагаваў часопіс «Вызваленне» і лісток сатыры і гумару «Дзіда», супрацоўнічаў з рэдакцыяй газеты «Беларускае слова». У 1952 пераехаў у ЗША, дзе, зарабляючы на пражыццё, не спыняў і грамадскай працы. Набыў невялікую друкарню, у якой выдаваў календары, часопіс «Прыйсце». У 1972 набыў сапраўдную друкарню ў Саўт-Рывэры і некаторы час быў галоўным рэдактарам часопіса «Беларуская думка». Брат па маці паэта А. Змагара.

Пісаць Я. Золак пачаў у школьныя гады. Першы верш («На былым балоце») надрукаваны ў 1930 у часопісе «Вясна». Друкаваўся ў газетах «Камуніст», «Камунар Магілёўшчыны». У вершах аддаў даніну часу. Тагачасная рэчаіснасць — калектывізацыя, рэпрэсіі (родны дзядзька высланы ў Сібір, а бацька не выбіваўся з «цвёрдых заданняў», пакуль не ўступіў у калгас) — не спрыяла паэтычнаму натхненню. Да вайны Я. Золак напісаў каля дзесятка вершаў. У час вайны яго творы друкаваліся ў беларускіх газетах і часопісах «Голас вёскі», «Беларуская газэта», «Беларус на варце» (Мінск), «Газэта Случчыны», «Слонімская газэта», «Баранавіцкая газэта» (пазней перайменавана ў «Пагоню»), «Новая Дарога». Па-за межамі бацькаўшчыны яго творы публікаваліся ў газетах «Раніца» і «Беларускі работнік» (Берлін), «Новы шлях» (Рыга), «За незалежнасць» (Гіршау, Германія), «Зьвіняць званы Сьвятой Сафіі» (Рэгенсбург), «Шыпшына» (Рэгенсбург; Саўт-Рывэр); «Крывіцкі Сьветач» (Мюнхен), «Напагатове» (Міхельсдорф), «Беларускае Слова» (Бакнанг), «Божым шляхам» (Парыж), «Аб'яднаньне» (Лондан), «Беларус у Амэрыцы» і «Царкоўны Сьветач» (Саўт-Рывэр), «Баявая ўскалось» (Таронта). З 1960 друкаваўся ў газетах «Беларускае слова», «Беларус», часопісах «Грунвальд», «Літаратурна-мастацкі альманах», «Беларуская думка». Ён з'яўляецца сябрам літаратурнага згуртавання «Шыпшына». Выйшлі 2 тамы «Твораў» Я. Золака, зборнік вершаў «Агонь душы», зборнік гумарэсак «За чужы грэх» і інш. Любоў да роднай Беларусі, нацыянальныя і агульначалавечыя матывы («Беларусь для мяне — мая родная маці») — галоўнае ў яго творчасці. Вершы выгнання, суму па страчанай Беларусі і маладосці, вершы, прысвечаныя каханню, прыгажосці прыроды, грамадзянская лірыка, вершы роздуму, метафарычныя, гумарыстычныя, сатырычныя — такі шырокі абсяг паэзіі Я. Золака. Некаторыя з іх пакладзены на музыку кампазітарам М. Равенскім («Малітва за Беларусь»). Пісаў празаічныя гумарэскі, абразкі (раздзел «Асот» у часопісе «Беларуская думка»), успаміны («Мая сустрэча з Я. Коласам у 30-я гады», артыкулы («Жыццё і творчасць Масея Сяднёва — на пяцідзесятыя ўгодкі паэта»; «Жыццёвы і творчы шлях М. Кавыля — да пяцідзесяцігоддзя з дня нарадзінаў»; «Чытаючы «Далячынь» і «Васіль Каліна» У. Клішэвіча»). Аўтар аповесцей «Т. Д. Ч.» і «Ціхі Стаў», якія друкаваліся ў часопісе «Беларуская думка» ў 1987—91.

Жыве ў г. Мільтаўн (ЗША). *Л. С. Савік.*

Бібліяграфія

1.1.
Творы. Т 1. [Б. м.], 1979. Т. 2. [Б. м.], 1981.

1.2.
Песьняры Случчыны. Слуцк, 1943 / У сааўт.
За чужы грэх: Гумарэскі. [Б. м.], 1958.
Агонь душы: Вершы. [Б. м.], 1979.

1.3.
1930. На былым балоце: [Верш] // Вясна. № 3 / Пад псеўд. Антось Вірок.
1939. Галя: [Верш] // Камунар Магілёўшчыны. 12 жн. / Пад сваім прозв.
1943. Гады прамінаюць: [Верш] // Новы шлях. № 13.
1944. Краіне; «Прылятае з вясной лёгкакрылай...»: [Вершы] // Бел. работнік. № 9; «Грамадою шчыльнай, дружнай...»: [Верш] // Раніца. № 57—58.
1945. Я не паддамся трывогам: [Верш] // Раніца. № 7.
1946. Сонцу; Сум па радзіме; Бога прашу я...; Васьнянкі: [Вершы] // Зьвіняць званы Сьвятой Сафіі. № 2; Я пасею песьні: [Верш] // Там жа. № 3; Жыццё — мора: [Верш] // Там жа. № 4; Малітва // Там жа. № 5; Званы Сьвятой Сафіі: [Верш] // Там жа. № 6; 1863 год: [Верш] // Крывіцкі светач. № 1; Сэрцу: [Верш] // Там жа. № 2—3; З народнага; Ня пытай: [Вершы] // Шыпшына. № 1.
1947. У дзень маіх нарадзінаў: [Верш] // Шыпшына. № 4; Прызнаньне: [Верш] // Там жа. № 5.
1948. Сонца ў зеніце; Венцер з крыві: [Вершы] // Шыпшына. № 6; Васількі; [Верш] // Там жа. № 7.
1949. Што й калісьці: [Верш] // Божым шляхам. № 5(20).
1950. Хрыстос Уваскрос: [Верш]; Песьні ўзыходжаньня: [Псалмы] // Божым шляхам. № 4—5 (31—32). Песьні ўзыходжаньня: [Вольны пераклад] // Там жа. № 10—11; На чаўне шчаслівых дум: [Верш] // Шыпшына. № 8; Псальм 126. Саламонаў: [Вольны пераклад] // Там жа. № 9.
1954. «Кій» ці «палка»?: // Беларус. патрыёт. № 12; Жыцьцё і творчасьць Масея Сяднёва // Палесьсе (Монтр.-Тар.). № 2.
1955. Не дарую; Крылатае сэрца: [Вершы] // Беларус. слова. № 5—6.
1961. Вятрыска з радзімай краіны: [Верш] // Бел. думка. № 3.
1963. Дваццаць пяты дзень сакавіка: [Верш] // Бел. думка. № 5.
1965. Жыцьцё і творчасьць Масея Сяднёва: (На пяцідзесятыя ўгодкі паэта); Жыцьцёвы і творчы шлях Мідзесятыя ўгодкі паэта); Жыцьцёвы і творчы шлях Міхася Кавыля: (Да пяцідзесяцігодзьдзя з дня нарадзінаў); Чытаючы «Далячынь» і «Васіль Каліна» Ул. Клішэвіча // Бел. думка. № 8.
1967. Газэла; Ня быў для іншых; Мне часам... здаецца; У цяжкай кашмарнай дрымоце; Ты сьпявала: [Вершы] // Пражэктар. Клевяланд.
1967—1968. Мой час; «Гадаваў, спяліў я... з афарызмаў»: [Вершы] // Бел. думка. № 10—11.
1969—1970. Каламбуры // Бел. думка. № 12—13.

У час Вялікай Айчыннай вайны Святлана разам з двума старэйшымі братамі і малодшай сястрой знаходзілася ў партызанскім атрадзе Мінскага аб'яднання «Мсціўец», дзе маці, Каробкіна Надзея Іванаўна, была сувязной і разведчыцай; бацька, Тарас Міронавіч, у гэты час ваяваў на фронце. Пасля вайны вучылася ў Самахвалавіцкай сярэдняй школе (1946—56). Працоўную дзейнасць пачала вучаніцай Самахвалавіцкага сельпо (1957—59). Потым працавала прадаўцом у Мінскім гастраноме, справаводам у народным судзе, машыністкай у Статыстычным упраўленні, прадаўцом у райхарчгандлі, цэнтральнай кнігарні, сакратаром-машыністкай Мінскага вагоннага ўчастка Беларускай чыгункі і сакратаром-машыністкай літаратурнага музея П. Броўкі. Атрымаўшы ў 1984 інваліднасць 2-й групы, ва ўстановах не працавала, але творчую дзейнасць працягвае.

Літаратурную дзейнасць пачала ў 1968. Першы верш «Лес чакае, калі ўзыйдзе сонца...» надрукаваны ў газеце «Мінская праўда». Яе вершы друкаваліся ў часопісах «Маладосць», «Беларусь», «Полымя», «Родная прырода», газетах «Мінская праўда», «Чырвоная змена», у альманаху «Дзень паэзіі» (1971—89), «Вдохновение» (Масква), балгарскім зборніку «Молодежь» (Сафія, 1981) і інш. Выйшлі паэтычныя зборнікі — «Колер дабра» (1978) і «Арабескі восені зялёнай» (1990). Ужо першыя вершы С. Каробкінай краналі шчырасцю, непасрэднасцю і глыбокім лірызмам у адлюстраванні ўнутранага свету чалавека, яго імкненняў і перажыванняў. Яе вершам характэрна навізна паэтычнай думкі, глыбокае пачуццё ў выражэнні любові да бацькоўскай зямлі, свайго краю, роднай мовы. Яны шчырыя, кранаюць душу, бо ідуць ад суб'ектыўнага, ад асабіста перажытага.

Жыве ў Алушце (Крым). *В. У. Смольская.*

Бібліяграфія

1.2.

Колер дабра: Вершы. Мн., 1978 (Першая кніга паэта). Рэц.: Гарадніцкі Я. Каб цвілі сады // Маладосць. 1979. № 2; Парэмскі Л. «У дом нясу я песню звонкую...» // Мін. праўда. 1979. 20 лют.

Арабескі восені зялёнай: Вершы. Мн., 1990.

Вячорніца: Вершы. Мн., 1995.

1.3.

1968. «Лес чакае, калі ўзыйдзе сонца...»: [Верш] // Мін. праўда. 5 снеж.

1969. Вада маёй зямлі: [Верш] // Мін. праўда. 8 сак.; Зямля цвіце: [Вершы] // Там жа. 21 мая; Ты прыйдзеш...: [Верш] // Там жа. 14 чэрв.; «Ад дыхання растаюць узоры...»: [Верш] // Там жа. 31 снеж.

1970. Мой край: [Верш] // Вяч. Мінск. 1 кастр.; Партызанскія сцежкі: [Верш] // Мін. праўда. 28 студз.; «Вёскі быццам пялёсткі...»: [Верш] // Там жа. 25 лют.; «Беларусь з Палесся пачынаецца...»; «Дачка дарогі — сцяжынка...»: [Вершы] // Там жа. 5 жн.; «Чырванагрудым снегіром...»: [Верш] // Там жа. 5 снеж.

1971. «Колькі на дрэвах бялюткіх хусцінак...»; «Вечар лёг туманам над ракою...»; Хай пахне борам і чаборам...: [Вершы] // Дзень паэзіі — 71. Мн.; «Чаромха ноч да долу нахілялася...»; «Прыйдзе ліпень...»: [Вершы] // Вяч. Мінск. 24 чэрв.; Хай пачакае: [Верш] // Мін. праўда. 15 студз.; На памяць: [Верш] // Там жа. 26 студз.; «Зацвілі верасы на палянах...»; «Карункі на вокнах тчэ дбайна зіма...»: [Вершы] // Там жа. 26 сак.

1972. Мой край: [Верш] // Вяч. Мінск. 29 жн.

1973. «Заціхлі белакрылыя мяцеліцы...»: [Верш] // Дзень паэзіі — 73. Мн.; «Стрэхі дамоў, нібы ў белых хусцінах...»: [Верш] // Вяч. Мінск. 10 студз.; Мне б неба хусцінах...»: [Верш] // Там жа. 6 сак.; Хачу сячыстага кусочак...»: [Верш] // Там жа. 6 сак.; Хачу сягоння дзён вясновых; «Я не толькі зерне хлеба...»: [Вершы] // Мін. праўда. 31 студз.; Раздае вясна абновы: [Верш] // Там жа. 23 крас.; Добрай раніцы: [Верш] // Там жа. 24 кастр.; Зямля цвіце; «Дачка дарогі — сцяжынка...»; «Прыйдзе ліпень...»; «Беларусь з Палесся пачынаецца...»; «Выспелі ў зямных турботах...»: [Вершы] // Чырв. змена. 27 лют.; «Не заўсёды ад гора горка...»: [Верш] // Там жа. 28 ліст.; Добрай раніцы: [Верш] // Там жа. 22 снеж.

1974. «Тры бярозкі ў Хатыні...»; «Світае, за вокнамі

шэрань знікае...»: [Вершы] // Вяч. Мінск. 10 крас.; Мой лёс: [Верш] // Там жа. 10 ліп.; «Я па зямлі святой...»; «Як мне не выпіць шчасце гэта...»; «Я папараць кветку шукаць...»: [Вершы] // Там жа. 15 жн.; Сустрэну хлебам-соллю: [Верш] // Мін. праўда. 29 сак.; «Зноўку я вясной не надзіўлюся...»: [Верш] // Там жа. 21 вер.; «Выспелі ў зямных турботах...»; «На далоні зярнятка...»: [Вершы] // Там жа. 14 снеж.; «Зіма жартуе, як і ты...»; «Падлічваю страты...»; «Калі цябе я пакахаю...»; «Табе, зіма, мяне не запужаць...»; «Край здабыткаў маіх і сустрэч...»; Мой лёс: [Вершы] // Чырв. змена. 3 сак.; «Прыязджай, сустрэну хлебам-соллю...»; «Зноў аб радзіме сум у маім сэрцы... »; «Літва, Літва! — мая малітва...»; «За табою — след у след...»: [Вершы] // Там жа. 11 мая; «Ягады чырвоныя шыпшыны...»: [Верш] // Там жа. 2 чэрв.; Вяртанне; «Апошнія рамонкі адцвітаюць...»; «Як мне не выпіць шчасце гэта...»; «Зацвілі верасы на палянах...»; «Тваё цудоўнае імя...»; «Вёскі, быццам пялёсткі...»: [Вершы] // Там жа. 2 ліст.

1975. «Тры бярэзінкі ў Хатыні»; «Калі асядзе шэры снег...»; [Вершы] // Дзень паэзіі — 75. Мн.; «Тры бярозкі ў Хатыні...»: «Прыйшла вясна чаканая...»; «Дачка дарогі — сцяжынка...»: [Вершы] // Полымя. № 6; «Хачу не міражу, а золата жывога...»: [Верш] // Вяч. Мінск. 16 крас.; Памяць; Ранак; Вернасць:: [Вершы] // Звязда. 24 жн.; «Заўжды прасторы прагну і святла...»; «Каханы кажа...»; «Я з вёскай неразлучная...»; «Мне не хапае кожны раз чагосьці...»; «Звіні, рака...»; «Малюся небу і зямлі...»: [Вершы] // ЛіМ. 4 студз.; Зацвілі верасы на паляне...: [Верш] // Мін. праўда. 1 лют.; «Мяне зіма прылашчыць холадам...»: [Верш] // Там жа. 8 сак.; «Я папараць-кветку...»: [Верш] // Там жа. 29 крас.; Нікога мне не дакараць: [Верш] // Там жа. 27 чэрв.; «Я, як вішанька. Гляне сонца...»; «Маё не адкалошана...»: [Вершы] //Там жа. 29 жн.; «Капяжы — вясны цымбалы...»; «А мне з табой не нагаварыцца...»; «І ільдзінка часам здарыцца графітам...»; «Вясна прыходзіць сіняй, сіняй...»; «Ні з кім цябе не параўнаць...»; «Красавік-чараўнік...»: [Вершы] // Чырв. змена. 16 сак.; Лірычнае: [Вершы] // Там жа. 25 мая.

1976. «Дайце хлеба...»; «Я з вёскай неразлучная, як з маці...»: [Вершы] // Дзень паэзіі — 76. Мн.; «Ад тых дзён Купалля да сягонняшніх»; «Люцік — гэта казялец...»; «Снег выпадзе не белы і не чорны...»; «І зноў я зморанаю птушкай...»; «Каля школы выспелі рабіны...»: [Вершы] // Рабочая смена. № 3; Палессе; Вясна; «Ты глыбіні душы маёй не зведаў...»; «Успамінаць не хочацца пра тое...»; «Саромеюцца людзі слоў прызнання...»: [Вершы] // Звязда. 6 чэрв.; «О, непаўторнасць харастава...»: [Верш] // Мін. праўда. 12 сак.; «На змярканні ці то ўранні...»: [Верш] // Чырв. змена. 1 студз.; «Люцік — гэта казялец...»; «Жураўлінае вясло»: [Вершы] // Там жа. 16 сак.; «Гэта дзіва нейкае дзівоснае...»: [Верш] // Там жа. 11 мая; «Кветка-сон, прачынайся хутчэй...»: [Верш] // Там жа. 22 чэрв.

1977. «Свавольны лёс мой — ведаю сама...»: [Верш] // Дзень паэзіі — 77. Мн.; Лірыка; «У чаканні прыгожага...»; «Зарадуе сэрца звычайная зёлка...»; «Заінела за вокнамі...»: [Вершы] // Полымя. № 9; «А мо і добра, што цябе няма...»: [Верш] // Вяч. Мінск. 7 ліп.; «Пазбавімся размоў нікчэмных...»; «Збіраецца на зімку восень...»; «Пчала, згубіўшы джала...»; «А мо і добра...»: [Вершы] // ЛіМ. 29 ліп.; «Ціха-ціха, гучна-гучна...»; «Тваё каханне нада мною...»; «Да нечага кожны імкнецца...»: [Вершы] // Чырв. змена. 8 сак.; «Як у вясны спакусы многа...»; «У чаканні прыгожага...»: [Вершы] // Там жа. 17 жн.

1978. Надзея: [Верш] // Звязда. 17 кастр.; «Бывае, ускрыкне патрэба пяшчоты...»: [Верш] // Чырв. змена. 22 студз.; «Твары, душа мая, твары...»: [Верш] // Там жа. 2 крас.

1979. «Нясцерпна жыць, калі ты не пазнаны...»; «Быць добраю вучуся у людзей...»; Светлай памяці Еўдакіі Лось; «Маё не адкалошана...»: [Вершы] // Работніца і сялянка. № 7; «Тры бярэзінкі ў Хатыні...»: [Верш] // Чырв. змена. 9 мая.

1980. «Мне вечар прыносіць трывогу...»; «Думак чужых не красці...»: [Верш] // Чырв. змена. 1 чэрв.

1981. «Прад ведамі зямлі...»; «Рабіна горкая, але...»; «З'ехала з дому...»; «Такая пустата была...»: [Вершы] // Род. прырода. № 6; «Колькі на дрэвах бялюткіх хусцінак...»: [Верш] // Голас Радзімы. 31 снеж.

1983. «Зноў думаю аб тым...»; «Клубок чырвоны — сонейка маё...»: [Вершы] // Чырв. змена. 2 крас.

1984. «Нам, адзінокім, не сустрэцца — грэх...»; «Сняжок цячэ, сняжок цячэ...»: [Вершы] // Дзень паэзіі — 84. Мн.

1985. «Садзіцца сонца за будынак»; «Зіма пакрые белым футрам»; «Мову зімы зразумець гэтак проста»; «Замёўшы белы свет»; «Пасля сустрэчы гэтакай»; «Юначыя гады»: [Вершы] // ЛіМ. 20 вер.; «На зямлі толькі зоркі і я...»: [Верш] // Мін. праўда. 23 жн.; «Надзеліць восень сілаю мяне...»: [Верш] // Там жа. 6 ліст.; «Данясе нехта песню...»: [Верш] // Чырв. змена. 11 вер.

1.5.

На рускую мову. «Как с матерью...»; «Согреют вдруг душу...»: [Вершы] // Пер. И. Бурсов // Вдохновение. М., 1979.

2.3.

На беларускай мове. М а р ц і н о в і ч А. «Колер дабра» // Работніца і сялянка. 1979. № 7.

М. П. Барташэвіч.

КАРПЕЧАНКА ВАСІЛЬ



Карпечанка Васіль Васілевіч (н. 7.1.1925, в. Будзішча Чачэрскага р-на Гомельскай вобл.), паэт. Член СП Беларусі з 1990.

Нарадзіўся ў сялянскай сям'і. З 1932 вучыўся ў Будзішчанскай няпоўнай сярэдняй школе. У 1939 паступіў у Нова-Беліцкі лесатэхнічны тэхнікум, у якім правучыўся да 1941. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. У баях з нямецкімі фашыстамі тройчы паранены. Інвалід вайны 2-й групы. За гераізм адзначаны ўрадавымі ордэнамі і медалямі. З 1946 працаваў настаўнікам пачатковых класаў Сідаравіцкай, потым Роўкавіцкай школ Чачэрскага раёна. У 1952 закончыў Гомельскае педагагічнае вучылішча, у 1957 — беларускае аддзяленне філалагічнага факультэта Магілёўскага педагагічнага інстытута. Працаваў загадчыкам аддзела пісьмаў, адказным сакратаром у рэдакцыі магілёўскай раённай газеты «За камуністычную працу». З 1959 каля 30 гадоў працаваў у Рэчкаўскай сярэдняй школе Магілёўскага раёна на пасадах дырэктара, намесніка дырэктара па ваенна-патрыятычным выхаванні, выкладчыка беларускай мовы і літаратуры. З 1987 — пазаштатны карэспандэнт-арганізатар Бюро прапаганды мастацкай літаратуры СП Беларусі па Магілёўскай вобласці.

Літаратурнай працай В. Карпечанка пачаў займацца ў 1956. Яго вершы друкаваліся ў калектыўных зборніках «Дняпро» (1957), «Прыдняпроўе» (1959), «Калі ветрык спачывае» (1984), «Асцюкі за каўняром» (1989). Падборкі вершаў і баек змяшчаліся ў часопісах «Бярозка», «Вясёлка», «Беларусь», «Вожык», «Полымя», у газетах «Літаратура і мастацтва», «Піянер Беларусі», «Магілёўская праўда» і інш. У 1961 выдаў зборнік вершаў для дзяцей. Як настаўнік, Васіль Карпечанка добра ведае свет дзіцячых захапленняў, валодае назіральнасцю, дасціпнасцю, піша сцісла, вобразна; кожны верш — жывы малюнак. Акрамя вершаў для дзяцей апублікаваў шмат вершаў, баек, гумарэсак для дарослых. У 1994 выйшлі зборнікі выбранага «Споведзь збалелай душы», вершаў «Я родам з Будзішча», кніжка для дзяцей «Сандалікі-скакалікі».

Жыве ў Магілёве.

В. У. Смольская.

Бібліяграфія

1.1.

Споведзь збалелай душы: Выбранае. Магілёў, 1994.

1.2.

Сонейка ўзышло: Вершы. Мн., 1961. Рэц.: Васільеў А. Падарунак дзецям // Маг. праўда. 1962. 3 студз.

Я родам з Будзішча: Вершы. Магілёў, 1994.

Сандалікі-скакалікі. Магілёў, 1994.

1.3.

1956. Клён; Пчолкі; Па грыбы; Сад; Сама: [Вершы] // Бярозка. № 5; Вяртанне: [Верш] // За Радзіму. 1 ліп.; Вавёрка: [Верш] // Маг. праўда. 16 снеж.

1957. Сама; Рукі мамы; Клён; Пчолкі: [Вершы] // Дняпро. Магілёў; Сама; Рукі мамы; Клён; Пчолкі: [Вершы] // Маг. праўда. 3 лют.

1958. Жаўрук; Самалёт; Школа; Рыбак; Аўсейка; Я рад; Вавёрка: [Вершы] // Прыдняпроўе. Магілёў; Звон: [Байка] // Маг. праўда. 14 чэрв.

1959. Мая РТС: [Верш] // Мы спяваем. Мн.; Груша; Суніцы: [Вершы] // Бярозка. № 5; Дзед і ўнук: [Верш] // ЛіМ. 23 снеж.; Груша: [Верш] // Маг. праўда. 14 сак.; Вясна: [Верш] // Там жа. 14 сак.; Падабенства: [Верш] // Там жа. 17 мая; Сонейка ўзышло: [Верш] // Там жа. 1 жн.; Суніцы: [Верш] // Там жа. 19 жн.; Магілёў: [Верш] // Там жа. 22 вер.

1960. Рыбак: [Верш] // Бярозка. № 6; Назаўсёды: [Верш] // Маг. праўда. 23 сак.; Я рад: [Верш] // Чырв. змена. 14 жн. Ветрык: [Верш] // ЛіМ. 16 крас.

1961. У нас свята; Гусі; Зіма: [Вершы] // Маг. праўда. 27 снеж.

1962. Мая мама: [Верш] // Вясёлка. № 3; Вясна: [Верш] // ЛіМ. 26 чэрв.; Груша: [Верш] // Ніва. 29 ліп.

1963. Радасць Наты; Вясна; Гыля, гусі: [Вершы] // Работніца і сялянка. № 4; Радасць Наты:: [Верш] // Ніва. 9 чэрв.

1964. Вясна: [Верш] // Бярозка. № 5; Сняжынкі; Каб злавіць я вецер мог: [Вершы] // Маг. праўда. 7 лют.; Назаўсёды; Імкненне: [Вершы] // Наст. газ. 17 чэрв.; Вясна: [Верш] // Ніва. 26 крас.

1966. Мост: [Верш] // Беларусь. № 10; Камар: Байка // Вожык. № 9; Мы са Стасем; Майстры: [Вершы] // Маг. праўда. 23 ліст.; Цагліна: Байка // Там жа. 29 ліст.;

Кліча лета; Школьны сад; Шчаслівы парог; Майстры; Мой тата: [Вершы] // Наст. газ. 18 чэрв.

1967. Сярэбраны масток; Шчаслівы парог; Саначкі; Вясна; Сандалікі-скакалікі; Боты; Гыля, гусі!; Просіць мама Янку: [Вершы] // Маг. праўда. 14 мая; Сярэбраны масток; Саначкі: [Вершы] // Наст. газ. 4 сак.; Сук-авантурыст: [Байка] // Маг. праўда. 13 чэрв.

1968. На варце міру: [Верш] // Наст. газ. 24 лют.; Крот: [Байка] // Там жа. 2 сак.; Крук; Піла: [Міні-байкі] // Маг. праўда. 14 чэрв.; Крот: [Байка] // Там жа. 24 снеж.

1969. Рука: [Байка] // Маг. праўда. 29 кастр.

1971. Пень; «Віна»-віна: Байкі-каратайкі // Маг. праўда. 25 мая.

1972. Казёл; Муха; Калода: Міні-байкі // ЛіМ. 25 лют.

1973. Рыбакі-дружбакі: [Верш] // Бярозка. № 6; Грозны верабей; Камары: [Вершы] // Работніца і сялянка. № 7; Высокая дружба: [Верш] // ЛіМ. 20 крас.; Дакор: [Міні-байка] // Вожык. № 13.

1974. Зайка: [Верш] // Маг. праўда. 11 студз.; Самы блізкі: [Верш] // Там жа. 22 ліст.

1975. Мілы сэрцу майму: [Верш] // Маг. праўда. 25 студз.; Камар; Начны ліхтар: [Вершы] // Там жа. 25 лют.; Мужнасць: [Вершы] // Там жа. 30 крас.; Высокае сяброўства: [Міні-байкі] // Там жа. 10 чэрв.; Камары: [Верш] // Вясёлка. № 11.

1976. Галава — не булава: [Верш] // Маг. праўда. 17 лют.; «Якая прыгажосць і ціш!..»; «Ёсць перад боем цішыня...»; Ідуць салдаты вуліцай; І тухнуць і падаюць зоркі: [Вершы] // Там жа. 30 сак.; Памяці сябра: [Верш] // Там жа. 10 вер.; Зведай свет прыгожага // Наст. газ. 12 мая.

1977. Бедны заяц: [Байка] // Маг. праўда. 24 жн.

1979. Сягоння, заўтра і заўжды: [Вершаваны рэпартаж] // Маг. праўда. 4 студз.; Я з векам выйшаў на спатканне: [Верш] // Там жа. 7 ліп.; «Усім нам хочацца дабра...»: [Верш] // Там жа. 19 кастр.

1980. Брыгадзір: [Верш] // Сел. хоз-во Бел. № 3.

1982. Споведзь веку: [Верш] // Маг. праўда. 22 мая; Волат слова: [Верш] // Там жа. 7 ліп.; Пень; Павук; Памідор: [Вершы] // Ніва. 14 ліст.; Шчупак; Пень; Павук; Піла; Памідор: [Мініяцюры] // Вожык. № 9.

1983. На поўны голас: [Вершаваны рэпартаж] // Маг. праўда. 24 чэрв.; Тады я толькі чалавек: [Верш] // Там жа. 30 жн.; Ідзе спрадвечнае жыццё; «Ёсць перад боем цішыня...»: [Вершы] // Там жа. 22 ліст.

1984. Сандалікі-скакалікі; Дуб; Певень; Аўсейка; Я вып'ю раку; Каб мог; Ясь і Аленка; Рыбакі-дружбакі; Яршы; Зайка; Камары; Сонейка пакліч у хату; Сарока; Боты: [Вершы] // Калі ветрык спачывае. Мн.; Хляўчук: [Верш] // Вожык. № 20; Янка Купала; Перад атакай; Пасля бою: [Вершы] // Полымя. № 7; «Над намі неба ў чыстых зорах»; «Па-мойму, жыць,— калі любіць»; «Бывае, паласуюць неба»: [Вершы] // ЛіМ. 23 ліст.; Слухае Зямля: [Верш] // Маг. праўда. 4 студз.; У шпіталі інвалідаў вайны: [Верш] // Там жа. 29 ліст.

1985. Спрадвечнае жыццё: [Верш] // Гом. праўда. 1 мая; Перад атакай: [Верш] // Там жа. 3 ліп.; У шпіталі інвалідаў вайны: [Верш] // Там жа. 20 вер.; Куранты: [Верш] // Маг. праўда. 1 студз.; Назаўсёды; Вяртанне; Перад атакай; Пасля бою; У шпіталі інвалідаў вайны; «Сыплецца, кружыцца роем...»; Павук; Рыбакі-дружбакі; Дуб; Зайка: [Вершы] // Там жа. 17 студз.; Цвітуць яго верасы: Да 70-годдзя з дня нараджэння В. Матэвушава // Там жа. 6 сак.

2.3.

На беларускай мове. Аношкін І. [Прадмова] // Маг. праўда. 1985. 17 студз.

М. П. Барташэвіч.

КІПЕЛЬ ВІТАЎТ



Кіпель Вітаўт Яўхімавіч (псеўд. В. Зубкоўскі, крыпт. В. К.; н. 30.5.1927, Мінск), вучоны-геолаг, гісторык, літаратуразнавец, бібліёграф, публіцыст, грамадска-палітычны і культурны дзеяч. Доктар геалогіі (1955).

Нарадзіўся ў сям'і вядомага культурнага і грамадска-палітычнага дзеяча Яўхіма Кіпеля, які ў той час працаваў у Інбелкульце, быў дацэнтам Беларускага дзяржаўнага універсітэта, выконваў абавязкі старшыні Хаўрусу беларускай моладзі, і настаўніцы Марыі Зубкоўскай. У 1930, калі бацьку арыштавалі і выслалі з Беларусі, сям'я жыла на выпадковыя заробкі маці. У канцы 1932 маці з сынам выехала на месца ссылкі Я. Кіпеля (г. Налінск Вяцкай вобл., потым г. Вятка). У 1935, калі тэрмін зняволення бацькі закончыўся, сям'я перасялілася ў Арол, дзе М. Зубкоўская ўладкавалася на працу настаўніцай. У снежні 1935 Я. Кіпеля зноў арыштавалі. Пяцігадовы тэрмін пакарання ён адбываў на Далёкім Усходзе, у Байкала-Амурскіх канцлагерах. В. Кіпель і яго маці па-ранейшаму жылі ў Арле. М. Зубкоўскай прапанавалі запісацца ў пашпарце рускай, ад чаго яна

адмовілася. У 1938 дзеда В. Кіпеля на маці, да якога хлопчык увесь гэты час прыязджаў у Мінск на канікулы, як цесця «ворага народа» выкінулі з уласнай хаты, хату адабралі, і ён вымушаны быў таксама перабрацца ў Арол. У снежні 1940 Я. Кіпеля вызвалілі, але вярнуцца да сям'і не дазволілі, бо Арол тады стаў абласным цэнтрам. Пасяліўся ён у Бранскай вобл. Уз'яднанне сям'і адбылося толькі ў 1942, калі гэтыя тэрыторыі былі захоплены нямецкімі фашыстамі. У чэрвені 1942 Кіпелі вярнуліся ў Мінск, дзе маці працавала ў выдавецтве. У 1944 сям'я выехала на эміграцыю. Жылі спачатку ў Берліне, дзе маці арганізавала дзіцячы садок, пасля ў Міхельсдорфе і Бакнангу, дзе яна працавала настаўніцай. Жывучы ў Рэгенсбургу і Міхельсдорфе, В. Кіпель арганізоўваў беларускі скаўтынг і быў кіраўніком скаўтаў у Міхельсдорфе, а пазней — у амерыканскай акупацыйнай зоне. Закончыўшы Беларускую гімназію імя Я. Купалы, у 1948 ён паступіў у Цюбінгенскі універсітэт. Пасля двух семестраў вучобы пераехаў у Бельгію, дзе ў 1949 стаў студэнтам Лювенскага універсітэта. У 1953 скончыў яго геалагічны факультэт з кандыдацкай дысертацыяй. У 1955 абараніў доктарскую дысертацыю ў галіне мінералогіі і геахіміі. У Бельгіі ўвесь час актыўна ўдзельнічаў у студэнцкіх арганізацыях і Саюзе беларусаў Бельгіі, 4 гады займаў пасаду намесніка кіраўніка. У канцы 1955 эміграваў у ЗША. Некалькі гадоў працаваў геолагам. Закончыўшы бібліятэчны факультэт Ратгерскага універсітэта (штат Нью-Джэрсі), 27 гадоў працаваў у Нью-Йоркскай публічнай бібліятэцы на розных пасадах, у тым ліку загадчыкам навуковага аддзела і рэдактарам месячнага бюлетэня «Новыя тэхнічныя кнігі». З 1982 дырэктар Беларускага інстытута навукі і мастацтва ў Нью-Йорку. Быў скаўтмайстрам у амерыканскім скаўтынгу і кіраваў беларускай скаўцкай арганізацыяй, заснаванай у 1972 у Саўт-Рыверы пры царкве Святой Ефрасінні Полацкай. Уваходзіў у арганізацыйную групу Беларуска-амерыканскага камітэта Палітычных дзеянняў (пазней Беларускі камітэт Палітычных дзеянняў), заснаванага у Нью-Йорку. Узначальваў Федэрацыю беларускіх рэспубліканскіх клубаў, заснаваную ў 1972. Займаў пасаду віцэ-прэзідэнта Нацыянальнай канфедэрацыі амерыканскіх этнічных груп. У 1978—82 узначальваў Этнічную дарадчую раду пры губернатары штата Нью-Джэрсі, быў лектарам Нью-Йоркскага Беларускага універсітэта (чытаў там курс «Беларуская спадчына»), старшынёй арганізацыйных камітэтаў некалькіх беларускіх фестываляў у штаце Нью-Джэрсі. Ён адзін з выдаўцоў часопіса «Запісы», сталы супрацоўнік газеты «Беларус».

Як даследчык-беларусазнавец уваходзіць у склад інтэлектуальнага ядра свядомай беларускай эміграцыі ў ЗША. У сферы яго зацікаўленняў пытанні гісторыі, палітычнага і грамадскага жыцця Беларусі, а таксама гісторыі ЗША, эміграцыі ў гэтую краіну, жыцця эмігрантаў, іх грамадскай, палітычнай, культурнай актыўнасці. Разам з жонкаю (З. Кіпель) склаў бібліяграфію «Янка Купала і Якуб Колас на Захадзе» (1985) і хрэстаматыю «Беларуская дзяржаўнасць» (1988). Ён аўтар грунтоўнага даследавання пра гісторыю і сучасны стан беларускай эміграцыі «Беларусы ў ЗША» (1993), а таксама працы «Беларусы ў Кліўлендзе» (1982), «Беларусы ў Нью Джэрсі» (1977), «Беларусы ў Нью-Ёрку» (1994). Займаецца кнігавыдавецкай дзейнасцю. Выступае з артыкуламі ў беларускім і англамоўным друку.

Жыве ў Рутэрфордзе (штат Нью-Джэрсі, ЗША).

С. Б. Сачанка.

Бібліяграфія

1.2.

Byelorussian Americans and Their Communitics of Cleveland. Cleveland. 1982.

1.3.

1947. Бамбардзіроўка: [Верш] // Шляхам жыцця. № 8 (20) / Пад крыпт. В. К.

1953. Безнадзейнасць: (Праўдзівае здарэньне) // Беларус. № 13 (37) / Пад крыпт. В. К.

1956. Нафта ў сьвеце // Бацькаўшчына. № 45 (327) / Пад псеўд. В. Зубкоўскі.

1959. Мэтэарыты на Беларусі // Бацькаўшчына. № 1—2 (437—438) / Пад псеўд. В. Зубкоўскі; Аб пошуках зялезнае руды на Беларусі // Там жа. № 22 (458) / Пад псеўд. В. Зубкоўскі.

1960. Беларускія вучоныя ў мінулым // Бацькаўшчына. № 18.

1961. Праца навукоўцаў-беларусаў па-за межамі Бацькаўшчыны // Бацькаўшчына. № 34.

1962. [Рэц. на кн.: Атлас Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі. Мн.; М. 1958] // Запісы. Кн. I.

1963. Калгасы і саўгасы Беларусі ператвараюцца ў жывёлагадоўчыя гаспадаркі // Бацькаўшчына. № 3 (603) / Пад крыпт. В. К.

1965. Гулыня з «балваном»: Фельетон // Зніч. № 82—83 / Пад крыпт. В. К.

1969. Змаганьне БНР: Слуцкі фронт // Беларус. № 141 / Пад крыпт. В. К.; Беларуская краёвая абарона: (Да 49-х угодкаў Слуцкага паўстаньня й 25-ых угодкаў утварэння БКА) // Там жа. № 152.

1970. About the Byelorussian - Soviet Socialist Republic // Republican Heritage Groups Federation of New Jersey, Convention Yearbook. 1970. Elizabeth, New Jersey.

1972. Да гісторыі Беларускае эміграцыі ў ЗША / Пад псеўд. В. Зубкоўскі; Дзіцячыя лагеры ў Бэлер-Менску // Беларус. № 185; Спатканьне з Прэзыдэнтам Ніксанам // Там жа. № 186 / Пад псеўд. В. Зубкоўскі; «Беларусы за Ніксана — Агню». Справаздача аб дзейнасці руху // Там жа. № 188; Byelorussians in New Jersey; Byelorussian youth hold First Annual Talent Show // Heritage Review V. 2 (3).; Byelorussia's seat at the UN; Kupala's life and death: suicide or murder? // Heritage Review. V. 2(4).

1973. З Прэзыдэнтам Ніксанам у Белым Доме // Беларус. № 189; Стагодзьдзе Пасэйку // Там жа. № 193; 1776—1976: двухсотгодзьдзе ЗША // Там жа. № 194; Сьцяг 225: (Амэрыканец Скаўцкае Арганізацыі) // Там жа. № 195; Помнік Янку Купалу пад «Яблычка» // Там жа. № 196 / Пад псеўд. В. Зубкоўскі; Амэрыканскія беларусы й Вотэргэйт // Там жа. № 197 / Пад псеўд. В. Зубкоўскі; Ікона Сьв. Еўфрасіньні Полацкае Пола Вінцэ // Там жа. № 198 / Пад псеўд. В. Зубкоўскі; Мадзярскі дзень: (Уражаньні із спатканьня з Кардыналам Мідцэнты) // Там жа. № 198; Даклад пра Беларусь сяньня // Там жа. № 199 / Пад псеўд. В. Зубкоўскі; Achievements of Byelorussian-American community in South River; Beginning of Byelorussian Immigration to the U. S.; Byelorussian-Americans: 1972 campaign report; Byelorussian cultural Heritage: Bards of Byelorussian Literature: Kupala-Kolas; Heritage Bookshelf: Byelorussia, Latwia; Euphrosinia — Patron Saint of Byelorussia — 800th Anniversary; New Jersey Byelorussian-American Veterans celebrate the Anniversary of Sluck Fighting; U. S. Consulate in Byelorussia: Why Not? // Heritage Review. V. 3(1); The Voice of America and broadcasts in Byelorussian; A case of living discrimination // Heritage Review. V. 3(2) Clearing confusion about

Byelorussia... // Heritage Review. V. 3(3); New Byelorussian Autocephalic Orthodox Church in South Jersey; New Jersey Heritage Groups support Sandman // Heritage Review. V. 3(4).

1974. Спатканьні, гутаркі, высновы... // Беларус. № 201 / Пад псеўд. В. Зубкоўскі; Двухсоты нумар «Беларуса» // Там жа. № 202 / Пад псеўд. В. Зубкоўскі; Тыдзень паняволеных народаў у Нью-Ёрку // Там жа. № 208 / Пад псеўд. В. Зубкоўскі; Дваццаць пяць гадоў працы... // Там жа. № 210 / Пад псеўд. В. Зубкоўскі; Беларуская спадчына ў Амерыцы: Гаваі // Беларус. № 210, 211; Byelorussian Institute of Arts and Sciences, cultural heritage; Heritage Review 1974; The road to Byelorussian Independence... // Heritage Review. V. 4(1); Byelorussia... KATYN...and KHATYN... tragic memoirs // Heritage Review. V. 4(2).

1975. Беларуская спадчына ў ЗША: Мэрылэнд // Беларус. № 215; Айцец Франьцішак Дзеружынскі; Падручнік бел. мовы ў небеларускай мове // Там жа. № 216; Расьце дзейнасць нашае моладзі // Там жа. № 218; Беларуская спадчына ў Амэрыцы. І. Пачаткі; Канвэнцыя Рэспубліканскай Рады Нацыянальнасьцяў // Там жа. № 219; Справа вывучэньня спадчыны ў школах ЗША // Там жа. № 221; Даследаваньні падзеяў на Случчыне // Там жа. № 223—224 / Пад псеўд. В. Зубкоўскі; Beginning of Byelorussian Immigration to the United States // Ethnic American News. Pittsburgh; New Jersey Heritage Groups: Congressional Campaign-1974 / Сааўт. Лескіў; The New York Times and Byelorussia // Heritage Review. V. 5(1).

1976. Да дня Беларускае культуры // Беларус. № 225; Якасць праграмы, колькасць гледачоў // Там жа. № 226—227; Леанід Плюшч пра Беларусь // Там жа. № 228 / Пад псеўд. В. Зубкоўскі; Сустрэча ў Вашынгтоне з прэзідэнтам ЗША // Там жа. № 228; Канфэрэнцыя ў Вашынгтоне // Там жа. № 229 / Пад псеўд. В. Зубкоўскі; Чаму расейцы не пратэстуюць? // Там жа. № 230—231 / Пад псеўд. В. Зубкоўскі; Месяц з моладзяй // Там жа. № 232 / Пад псеўд. В. Зубкоўскі; Узнагарода беларусу // Там жа. № 233 / Пад крыпт. В. К.; Мой голас за рэспубліканцаў // Там жа. № 234; [Рэц. на кн.: Иоськo М. Николай Судзиловский-Руссель. Мн., 1976] // Запісы. Т. 16. С. 151—154; Editorial; Vitaut Kipel, State Chairman // Heritage Review. 1976. V. 5(2); Editorial // Heritage Review. 1976. V. 5(3); Byelorussians in the United States // New Jersey Garden State Arts Center, Programs.

1977. Як Масква абкрадае Беларускі Жлобін // Беларус. № 237 / Пад псеўд. В. Зубкоўскі; Беларусы ў 10-ёх вырашальных днёх; Слуцкі фронт БНР 1920 году // Там жа. № 237; Угодкавая беларусаведная канфэрэнцыя Беларускага Інстытуту Навукі й Мастацтва // Запісы. № 15.

1978. Трэйці Беларускі фэстываль адкладзены // Беларус. № 257; Дзень незалежнасьці Беларусі ў Кліўленьдзе // Там жа. № 252 / Пад крыпт. В. К.; Узнагарода старшыні БІНІМ // Там жа. № 253; Восьмая гадавая канфэрэнцыя Рэспублік Рады Нацыянальнасцяў // Там жа. № 254; Пра нацыянальную праблему ў СССР // Там жа. № 255—256 / Пад псеўд. В. Зубкоўскі; Посьпехі беларускай мастачкі сп. Тамары // Там жа. № 257 / Пад крыпт. В. К.; Амэрыканская асацыяцыя падтрымоўваньня славянаведы // Там жа. № 259—260; Беларускія выстаўкі 1978 г.; Удзел беларускіх навукоўцаў у навуковых канфэрэнцыях 1978 г. // Запісы. № 16.

1979. Дэкалянізацыя Савецкага Саюзу // Беларус. № 261 / Сааўт. Я. Запруднік, А. Шукелайць; Канфэрэнцыя ў Белым Доме // Там жа. № 261; Канфэрэнцыя ў Балтыморы // Там жа. № 262; Брашуркі пра БССР // Там жа. № 263 / Пад псеўд. В. Зубкоўскі; Фэстываль: вызначэньне й укараненьне спадчыны; Цяглая праца // Там жа. № 265; Беларусь навонкі; Нерасейскія народы супраць маскоўскага імпэрыялізму // Там жа. № 268 / Пад псеўд. В. Зубкоўскі; Вусная гісторыя — новы мэтад вывучэньня нацыянальных культураў Амэрыкі // Там жа. № 270 / Пад псеўд. В. Зубкоўскі; Радовішчы соляў і нафты на Беларусі ды іхны ўплыў на эканоміку рэспублікі // Там жа. № 271—272 / Пад псеўд. В. Зубкоўскі.

1980. Дзесятая Канфэрэнцыя Рэспубліканск. Нацыян. Арганізацыяў // Беларус. № 278 / Пад псеўд. В. Зубкоўскі; «Віхор» рэпрэзэнтуе беларускую музыку // Там жа. № 280—281 / Пад псеўд. В. Зубкоўскі; Агульнаславянская канфэрэнцыя ў Балтыморы // Там жа. № 280—281.

1981. Праф. Леў Акіншэвіч (1898—1980) // Беларус. № 286; Рэспубліканская канфэрэнцыя ў Вашынгтоне // Там жа. № 290—291; Лекцыі праф. А. Баршчэўскага // Там жа. № 292 / Пад псеўд. В. Зубкоўскі.

1983. Улік спадчыны Коласа й Купалы; (З рэфэрату др. В. Кіпеля ў Нью Ёрку 4 красавіка 1983 г.) На сакавіковыя ўгодкі // Беларус. № 310; 20-годзьдзе Бэлер-Менску // Там жа. № 311; Ю. Андропаў і беларусы // Там жа. № 312. Opening remarks; The Early Byelorussian Presence in America; Зь Беларускае навукова-культурнае хронікі 1979 году // Запісы. № 17.

1984. Эміграцыя — недаследаваная тэма // Беларус. № 315 / Пад псеўд. В. Зубкоўскі; Найбольш і найменш папулярны: (Пра В. Быкава й А. Адамовіча) // Там жа. № 319 / Пад псеўд. В. Зубкоўскі.

1985. Замоўчванне дасягненняў беларускае культуры // Беларус. № 327 / Пад псеўд. В. Зубкоўскі; Пра энцыклапедычныя выданьні (Заўвагі да інтэрвію зь Іванам Шамякіным) / Пад псеўд. В. Зубкоўскі; Беларускі ўдзел у Сусветным Кангрэсе; Слоўнікі выдадзеныя і нявыдадзеныя // Беларус. № 327.

1.5.

Беларусы ў ЗША / Пер. з анг. С. Шупа. Мн. , 1993.

2.3.

На беларускай мове. Бэрд Т. // Запісы [1978]. Кн. 16; Запруднік Я. Інтэрвю із старшынём этнічнае Рады ў Нью Джэрзі д-рам Вітаўтам Кіпелям // Беларус. 1978. № 259—260; Максімовіч Р. Гісторыя пісаная і пяром і чынам // Беларус. 1977. № 243—244.

В. М. Грышкевіч.

КІПЕЛЬ ЗОРА

Кіпель (дзявочае Савёнак) Зора Лявонаўна (н. 1.7. 1927, Мінск), вучоны-хімік, літаратуразнавец, перакладчык, публіцыст, бібліятэказнавец, грамадска-палітычны і культурны дзеяч. Кандыдат навук: бібліятэказнаўства (1966), літаратуразнаўства (1986).

Нарадзілася ў сям'і журналіста і пісьменніка Лявона Савёнка і настаўніцы Апалоніі Савёнак (дзявочае Раткевіч), аўтара шматлікіх школьных падручнікаў. Першыя гады жыцця З. Кіпель прайшлі ў Мінску. Бацькі яе былі нацыянальна свядомымі беларусамі, актыўна ўдзельнічалі ў культурным будаўніцтве 1920-х г. Маці падтрымлівала сяброўскія адносіны з жонкай Я. Купалы У. Луцэвіч. Разам з маці Зора часта бывала ў іх дома. У 1933 Зорынага бацьку арыштавалі як «нацдэма». Ратуючыся ад магчымых рэпрэсій, А. Савёнак звольнілася з працы і выехала з дачкой у Крычаў, дзе жыла да канца 1930-х г., сутыкаючыся са шматлікімі непрыемнасцямі з-за ярлыка сям'і «ворага народа». У 1939 тэрмін высылкі Л. Савёнка скончыўся. Зора з бацькамі вярнулася ў Мінск, вучылася ў школе, 6 класаў якой паспела скончыць да вайны. Працягвала вучыцца і ў вайну. У 1944 разам з бацькамі пакінула Беларусь. У Германіі (Рэгенсбург) у 1945 пачала вучыцца ў беларускай гімназіі імя Я. Купалы, закончыла яе ў 1948 у Міхельсдорфе. Тады ж паступіла на медыцынскі факультэт Цюбінгенскага універсітэта (Германія, французская акупацыйная зона). У 1949 пераехала ў Бельгію, дзе стала вучыцца на хімічным факультэце Лювенскага каталіцкага універсітэта. Са званнем магістра арганічнай хіміі закончыла яго ў 1955 і эмігравала ў ЗША. У 1956 выйшла замуж за В. Кіпеля. Маюць двух дзяцей — Алесю і Юрку. У 1956—58 як хімік працавала ў навуковай лабараторыі універсітэта Джона Хопкіна, дзе займалася даследаваннямі па крышталаграфіі. Поспехі ў галіне хіміі стрымліваліся сямейнымі абставінамі, і Зора вырашыла памяняць спецыяльнасць. У 1966 закончыла бібліятэчны факультэт Ратгерскага дзяржаўнага універсітэта (штат Нью-Джэрсі) і стала працаваць у Нью-Йоркскай публічнай бібліятэцы (з 1966 каталагізатар навуковай літаратуры, у 1981—91 намеснік загадчыка славянскага аддзела). Зацікавілася літаратуразнаўствам, зноў паступіла ў Ратгерскі універсітэт — на гэты раз на факультэт параўнальнага літаратуразнаўства, які закончыла ў 1988.

Працуючы ў Нью-Йоркскай бібліятэцы, З. Кіпель удзельнічала ў канферэнцыях бібліятэкараў ЗША. Значна пашырыла калекцыю беларускіх выданняў Нью-Йоркскай публічнай бібліятэкі, арганізоўвала там выставы на беларускія тэмы. Не спыняе грамадска-палітычнай, навуковай, культурнай дзейнасці і пасля выхаду на пенсію (1991). З маскоўскай даследчыцай І. Паздзеевай закончыла апісанне і каталагізацыю старадрукаў, што знаходзяцца ў Нью-Йоркскай бібліятэцы; апрацавала сама і з В. Кіпелем некалькі бібліяграфій па грамадазнаўстве, гісторыі, літаратуры; падрыхтавала «Даведнік пра этнічныя групы штата Нью-Джэрсі» (Нью-Йорк, 1978, на англійскай мове); уклала бібліяграфіі ў кнігах «Між берагамі» Н. Арсенневай (Нью-Йорк, 1979), «Нятускная краса» А. Салаўя (Нью-Йорк, 1982), «Міжагнёўе» М. Кавыля (Нью-Йорк, 1990). Яна сааўтар (з В. Кіпелем) і рэдактар кніг «Янка Купала і Якуб Колас на Захадзе» (Нью-Йорк, 1985), «Беларуская дзяржаўнасць» (Нью-Йорк, 1988, на англійскай мове). Апрача стварэння даведачнай літаратуры займаецца публіцыстыкай. Яе артыкулы па бібліятэчнай справе, асвеце, літаратуразнаўстве, нацыянальнай культуры беларусаў (пра этнічную спадчыну, мастацкія выставы і г. д.) друкаваліся ў беларускатацкія і англамоўных перыядычных выданнях: часопісах «Беларускі сьвет», «Запісы Беларускага інстытута навукі і мастацтва», газеце «Беларус» і інш. Рэдактар газеты «Беларус» (ліпень 1991 — верасень 1992 і з 1994). У літаратуразнаўстве яе інтарэсы засяроджаны на вывучэнні сярэдневяковай літаратуры, асабліва рукапіснай беларускай літаратуры 16 ст., перакладной «Аповесці пра Трышчана». З. Кіпель пераклала старабеларускую версію гэтага твора на англійскую мову, зрабіла да яго навуковы каментарый, выдала асобнай кнігай у «Гарландскай серыі сярэдневяковай літаратуры» (Гарланд, 1988), напісала даследаванне «Этнічныя элементы ў беларускім Трыстане XVI ст.» Цяпер

працуе над кнігай «Беларуская літаратура XV—XVII стст.», у цэнтры якой будзе перакладная літаратура Беларусі 16 ст. Удзельнічала ў шматлікіх міжнародных навуковых канферэнцыях: Міжнародным кангрэсе сярэдневяковых даследаванняў (Каламазу, Мічыган, 1987), Міжнародных кангрэсах беларусістаў (Мінск, 1991, 1995) і інш. Член Амерыканскай асацыяцыі славянскіх даследаванняў, сябра ўправы Беларускага інстытута навукі і мастацтва ў Нью-Йорку.

Жыве ў Рутэрфордзе, ЗША. *С. Б. Сачанка.*

Бібліяграфія

1.3.

1977. Голас у вабароне «Песьняроў» // Беларус. № 239; Беларускія выстаўкі 1977 году // Запісы. № 15.

1978. Посьпехі беларускіх жанчынаў // Беларус. № 254; Капітан Джон Сміт на Беларусі // Запісы. Т. 16. С. 119—128.

1979. «Роля этнічных групаў у штаце й краіне» // Беларус. № 261; Дзейнасць на пляцы // Там жа. № 266; Бэлейр-Менск сяньня // Там жа. № 268.

1980. Беларускія калядоўшчыкі ля статуі Свабоды // Беларус. № 274; Мастацкая выстаўка ў Саўт Рывэры // Там жа. № 277; Чатырнаццатая Сустрэча беларусаў Паўночнае Амэрыкі: Агульныя ўражаньні // Там жа. № 282.

1981. Слуцкія паясы на славянскай выстаўцы // Беларус. № 287; Нарады 19-га кангрэсу БАЗА; Фэстываль у Парку Свабоды // Там жа. № 293.

1983. Фэстываль у парку Свабоды // Беларус. № 312; Канферэнцыя амерыканскіх славянаведаў // Там жа. № 314.

1984. Галасы сустрэчы: [Інтэрв'ю з удзельнікамі 16-е сустрэчы беларусаў у ЗША] // Беларус. № 322.

1985. Камп'ютар і беларуская кніга: [Інтэрв'ю] // Беларус. № 326.

1.4.

The Byelorussian Tristan / Trans. Z. Kipel. New York; London, 1988. *В. М. Грышкевіч.*

КІПРЫЯН

Кіпрыян (каля 1330, ?—16.9.1406, Масква), рэлігійны, культурны і дзяржаўны дзеяч Вялікага княства Літоўскага і Маскоўскай Русі, мітрапаліт Кіеўскі і ўсяе Русі, пісьменнік, перакладчык. Пісаў на царкоўнаславянскай мове. Пахаваны ў Маскве (Успенскі сабор). У 1472 абвешчаны святым.

Рускія, балгарскія і некаторыя заходнееўрапейскія даследчыкі сцвярджаюць, што Кіпрыян паходзіў з Балгарыі. Але «Поўны праваслаўны багаслоўскі энцыклапедычны слоўнік» пісаў пра яго «літоўскі» радавод. Тое ж сцвярджаў В. Ластоўскі ў «Гісторыі беларускай (крыўскай) кнігі» (Коўна, 1926. С. 136). Гэтую ж думку пацвярджаюць некаторыя моўныя асаблівасці яго твораў, устойлівыя сімпатыі да тагачаснай «Літвы». Разам з тым у мінулыя стагоддзі некаторыя аўтары называлі яго сербам. Таму пытанне пра паходжанне Кіпрыяна канчаткова не вырашана.

Кіпрыян неаднаразова пераязджаў з месца на месца. Жыў у Візантыі, а таксама на святой гары Афон. «Слоўнік кніжнікаў і кніжнасці Старажытнай Русі» паведамляе пра яго: «Каля 1373 г. ён быў пасланы патрыярхам у Літву і на Русь для прымірэння літоўскіх і цверскага князёў з мітрапалітам Аляксеем. Кіпрыян сваю задачу выканаў. 9 сакавіка 1374 г. ён прысутнічаў у Цверы на пасвячэнні цверскага епіскапа Яўфімія [...]. У тым самым 1374 г. ён прадпрыняў перанясенне з Вільні ў Канстанцінопаль мошчаў і праслаўленне там літоўскіх мучанікаў-хрысціян — Кругляца-Антонія, Няжыль-Івана і Кумца-Яўстафія, забітых у 1347 г. па загадзе язычніцкага князя Альгерда. У 1375 г., калі ўзнавілася варожасць Літвы і Масквы, літоўскія князі накіравалі Кіпрыяна з граматай да патрыярха, просячы пасвяціць Кіпрыяна на мітрапаліта літоўскага. Патрыярх Філафей 2 снежня 1375 г. пасвяціў яго на мітрапаліта «кіеўскага, рускага і літоўскага» з тым, каб пасля смерці мітрапаліта Аляксея ён аб'яднаў абедзве часткі мітраполіі, стаўшы мітрапалітам Кіеўскім і ўсяе Русі» («Словарь книжников и книжности Древней Руси», 1988. Вып. 2 / 2-я палова 16 ст. Ч. 1. С. 465). У канцы 14 — пачатку 15 ст. Кіпрыян разгарнуў актыўную дзейнасць — і рэлігійную, і палітычную, і культурную — у Вільні, Наваградку (які ён называў «Новы гарадок літоўскі»), Кіеве, Маскве, Візантыі. У чэрвені 1376 ён пасяліўся ў Кіеве, а летам 1378, пасля смерці мітрапаліта Аляксея, паехаў у Маскву, каб узначаліць мітраполію, але па загадзе князя Дзмітрыя Іванавіча (Данскога) там яго схапілі, заключылі ў цямніцу, а потым выставілі за межы Маскоўскай дзяржавы. У маі 1381 князь Дзмітрый Іванавіч усё ж запрасіў Кіпрыяна ў Маскву, але ўжо восенню 1382 зноў выгнаў адтуль — бо князь маскоўскі сам падбіраў мітрапалітаў, прызначаючы то Міцяя, то Пімена, то Кіпрыяна, то зноў Пімена. Мяркуючы па ўсім, яму патрэбен быў дастаткова пакорлівы мітрапаліт. На лёс Кіпрыяна аказала ўплыў барацьба паміж царкоўнай і свецкай уладамі не толькі за панаванне над душамі вернікаў і падданых, але і за ролю ў дзяржаўным, палітычным і духоўным жыцці. Справа ўскладнялася і вайной з татарамі. У жніўні 1382 хан Тахтамыш напаў на Маскву. Князь Дзмітрый Іванавіч тады ўцёк са сталіцы, а Кіпрыян быў зняважаны

і абрабаваны. Ён быў вымушаны пакінуць Маскву і звязаць свой лёс з Вялікім княствам Літоўскім і Канстанцінопалем. У лютым 1389 канстанцінопальскі патрыярх Антоній абвясціў Кіпрыяна мітрапалітам Кіеўскім і ўсяе Русі. У сакавіку 1390 Кіпрыян прыбыў у Маскву, дзе пасля смерці Дзмітрыя Данскога княжыў яго сын Васіль I. У 1391 мітрапаліт вянчаў маскоўскага князя з Соф'яй, дачкой вялікага князя літоўскага. У 1404 Кіпрыян ездзіў з Масквы ў Вільню, дзе быў прыняты князем Вітаўтам, і Кіеў. У 1405 ён прысутнічаў у Мілалюбне на сустрэчы Вітаўта з польскім каралём Ягайлам. Перад смерцю прадыктаваў духоўную грамату.

Паведамляючы пра літаратурную дзейнасць Кіпрыяна, «Слоўнік кніжнікаў...» называе такія яго творы: «Житие Петра митрополита» (1381), «Канон ко Господу нашему Иисусу Христу и ко Пречистой Богородице...», «Молитва разрешити царя и князя и всякого христианина...», «Последование провождению над умершим младенцем». Адносна «Жития Петра митрополита» гэты «Слоўнік...» робіць істотнае ўдакладненне: «Гэтая рэдакцыя ўвайшла ў якасці састаўной часткі ў напісаную Кіпрыянам Службу мітрапаліту Пятру, што складаецца акрамя Жыція са сціхіраў, чытанняў з біблейскіх кніг, двух канонаў і (пасля шостай песні канонаў) кандака» (С. 466). Пра літаратурную дзейнасць Кіпрыяна піша і «Поўны праваслаўны багаслоўскі энцыклапедычны слоўнік»: «Кіпрыян вядомы як знаўца літаратуры і пісьменнік; яму прыпісваюць шмат твораў [...]: «Летопись от начала земли русской», «Житие св. митрополита Петра», «Сводная кормчея» і шмат іншых. З упэўненасцю можна назваць наступныя творы Кіпрыяна: 1) 8 грамат, 2) 4 пасланні св. Сергію Раданежскаму і прап. Феагносту і Ігумену Афанасію [...], пасланне ігуменам, і папам, і да мніхаў, і да ўсіх праваслаўных хрысціян, 4) развітальная грамата, дзе ён дае пастырскія духоўныя настаўленні, 5) малітва дазволіць цара і князя і ўсякага хрысціяніна і шмат перакладаў, лістоў пераважна царкоўна-богаслужбовага характару». Ва ўсёй літаратурнай, рэлігійнай і палітычнай дзейнасці Кіпрыяна відаць арыентацыя на збліжэнне Вялікага княства Літоўскага і Масквы. Акадэмік Д. Ліхачоў сцвярджае: «У 1404 г. ў Маскве быў складзены вялікі агульнарускі (летапісны.— У. К.) звод, які паказаў рускую гісторыю з пункту гледжання адзінства Рускай зямлі. Ініцыятыва складання гэтага зводу належала выдатнаму пісьменніку таго часу — мітрапаліту Кіпрыяну, але закончаны гэты звод ужо быў пасля яго смерці [...]». «У звод Кіпрыяна ўпершыню былі ўключаны звесткі па гісторыі Літвы». «Шляхам ускосных намёкаў і гістарычных прыкладаў летапісец усяляк павучае сучасных яму маскоўскіх уладароў. Так, напрыклад, дзеля павучання ў склад летапісу была ўключана пахвала розуму і ваенным талентам літоўскага князя Альгерда. Летапісец асабліва здзіўляецца яго ўменню захоўваць ваенную тайну і неспадзявана нападаць на ворагаў. «Не так сілаю, як розумам ваяваў» — гаворыць пра яго летапісец, які імкнуўся паставіць сябе над маскоўска-літоўскай барацьбой» (История всемирной литературы. М., 1985. Т. 3. С. 473—474).

У гісторыі трох народаў, беларускага, рускага і ўкраінскага, асоба мітрапаліта Кіпрыяна займае аднолькава ганаровае месца. Ён быў адным з апошніх дзеячаў таго перыяду, калі старыя міжусобныя канфлікты і размежаванні паміж княствамі і землямі саступалі месца новым гістарычным працэсам, што прывялі да якасна новых палітычных падзелаў на нашых землях, да ўтварэння дзяржаўных арганізмаў, якія, развіваючыся па сваіх законах, абумоўленых унутранымі і знешнімі фактарамі, усё больш адмяжоўваліся. Кіпрыян уяўляецца адным з найбольш буйных пісьменнікаў той пары.

У. М. Казбярук.

Бібліяграфія

1.3.

1860. [Граматы, лісты, пасланні] // Православный собеседник. Казань. Ч. 2. С. 75—106.

1861. Грамота прощальная митрополита Киприана // Буслаев Ф. Историческая хрестоматия церковнославянского и древнерусского языка. М. Сл. 788—792.

1908. [Граматы, лісты, пасланні] // Памятники древнерусского канонического права. Изд. второе. (Русская истор. библиотека. т. VI). Спб. Ч. 1. (Памятники XI — XV в.). Сл. 173—186, 229—270; Дадаткі. Сл. 165—184, 189—228, 261—264, 303—316.

1983. Похвално слово за митрополит Петр от Киприан // Русев П. Естетика и мастерство на писателите от Евтимиевата книжовна школа. София. [Царкоўнаславянскі тэкст і пераклад на балгарскую мову].

2.2.

На балгарскай мове. Дончева-Панайотова Н. Киприан — старобългарски и староруски книжовник. София, 1981.

На рускай мове. Мансветов И. Митрополит Киприан в его литургической деятельности. М., 1881.

2.3.

На балгарскай мове. Ангелов Б. Житие на митрополит Петр от Киприан // Из старата българска, руска и сръбска литература. София, 1958; Дончева-Панайотова Н. Киприановото «Похвално слово за Петър» в българска и руската панегирична традиция // Език и литература. София, 1977. Кн. 2; Я е ж. Неизвестно «Похвално слово за Петър» от Киприан // Литературна мисъл. 1975. Кн. 1; Я е ж. Цикл произведения за митрополит Петър от Киприан // Търновска книжовна школа: Ученици и последователи на Евтимий Търновски. София, 1980. Т. 2; Иванов Й. Българско книжовно влияние в Росия при митрополит Киприан (1375—1406) // Известия на Института за българска литература, 1958. Кн. 6; Киселков В. Проуки и очерти по старобългарска литература. София, 1956. С. 213—230.

На рускай мове. Амфилохий, арх. Что внес Киприан... из своего родного наречия и из переводов его времени в наши богослужебные книги // Труды III археологич. съезда в России. К., 1878. Т. 2; Бетин Л. Митрополит Киприан и Феофан Грек // Etudes Balkaniques Sofia. 1977. Т. 1; Болховитинов Е. Словарь исторический о бывших в России писателях духовного чина греко-российской церкви. Спб., 1827. Т. 1. Изд. 2; Борисов Н. Социально-политическое содержание литературной деятельности митрополита Киприана // Вестник МГУ. 1975. № 6; Глубоковский Н. Св. Киприан, митрополит всея России (1374—1406), как писатель // Чтения ОЛДП. М., 1892. Отд. 1; Голубинский Е. История русской церкви. Период второй, московский. От нашествия монголов до митрополита Макария включительно. М., 1900. Т. 2. Первая половина. С. 210—260, 297—356; Горский А. Св. Киприан, митрополит Киевский и всея Руси // Прибавления к творениям святых отец. Спб., 1848; Дмитриев Л. Литературно-книжная деятельность митрополита Киприана и традиции Великотырновской книжной школы // Търновска книжовна школа: Ученици и последователи на Евтимий Търновски. София, 1980. Т. 2; Я го ж. Роль и значение митрополита

Киприана в истории древнерусской литературы: (К русско-болгарским литературным связям XIV — XV вв.) // ТОДРЛ. 1962. Т. XVIII; Дробленкова Н., Прохоров Г., Киприан // ТОДРЛ. 1985. Т. XXXIX; Иконников В. Опыт русской историографии. К., 1908. Т. 2. Кн. 2. С. 1308—1349; Калайдович К. Об ученых трудах митрополита Киприана... // Вестник Европы. 1813. Ч. 72; Леонид [Кавелин], арх. Киприан до восшествия на московскую митрополию // Чтения ОИДР. 1867. Кн. 2; Макарий. История русской церкви. Спб., 1886. Т. 5. История русской церкви в период монгольский. Кн. 2. С. 186—197; Мейендорф И. О византийском исихазме и его роли в культурном и историческом развитии Восточной Европы в XIV веке // Труды ОДРЛ. 1974. Т. XXIX; Михайлов Е. Митрополит Киприан // Бележити българи. София, 1967. Т. 1; [Муравьев А.] Житие святителя Киприана, митрополита всея Руси // Жития святых российской церкви... Месяц сентябрь. Спб., 1859; О трудах митрополита Киприана по части богослужения // Прибавления к Творениям святых отец. М., 1885. Кн. 1. Ч. 1; Кн. 2; Кн. 3; Православная богословская энциклопедия. Спб., 1909. Т. X. Сл. 41—60; Прохоров Г. Древнейшая рукопись с произведениями митрополита Киприана // Памятники культуры: Новые открытия. Ежегодник за 1978 г. Л., 1979; Ягож. Летописная повесть о Митяе // Труды ОДРЛ. 1976. Т. XXX; Ягож. Поэтическое приложение к Духовной грамоте митрополита Киприана и другие ритмизованные тексты // Армянская и русская средневековые литературы. Ереван, 1986; Русский биографический словарь. «Ибак — Ключарев». Спб., 1897. С. 636—644; Снегаров И. К истории культурных связей между Болгарией и Россией в конце XIV — начале XV в. // Международные связи России до XVII в. М., 1961; Филарет. Обзор русской духовной литературы. 862—1863. Изд. 3. Спб., 1884. Кн. 1 и 2. С. 86—93. *У. М. Ларчанка.*

КІРЭЙЧЫК ІВАН

Кірэйчык Іван Аляксандравіч (н. 19.3.1935, в. Гута Ганцевіцкага р-на Брэсцкай вобл.), паэт, празаік, нарысіст. Член СП Беларусі з 1991.

Нарадзіўся ў сялянскай сям'і. Рана застаўшыся без бацькі, які загінуў на фронце, пры хворай маці яму самому прыйшлося зарабляць на пражытак і на школьныя падручнікі. У 1955 закончыў Гуцянскую сярэднюю школу. Працаваў у калгасе, у 1955—58 служыў на Балтыйскім флоце. Дэмабілізаваўшыся, працаваў літсупрацоўнікам, потым загадчыкам аддзела ганцавіцкай раённай газеты «Сялянская праўда». Адначасова вучыўся на завочным аддзяленні факультэта журналістыкі БДУ, які закончыў у 1965. З 1962 працаваў адказным сакратаром ляхавіцкай газеты «Будаўнік камунізма», карэспандэнтам рэспубліканскага радыё ў г. Пінску, літсупрацоўнікам, карэспандэнтам газеты «Чырвоная змена» па Гомельскай вобласці, уласным карэспандэнтам газеты «Дняпровец». З 1966 працаваў загадчыкам аддзела пісьмаў газеты «Перамога Кастрычніка» (г. Ветка), рэдактарам гомельскай студыі тэлебачання, намеснікам адказнага сакратара газеты «Гомельская праўда».

Літаратурную дзейнасць пачаў у 1955. Друкаваўся ў ганцавіцкай «раёнцы» і газеце «Страж Балтики» (частка тых «флоцкіх» вершаў увайшла ў калектыўны зборнік паэтаў-балтыйцаў «Песня, рожденная морем», выдадзены Калінінградскім кніжным выдавецтвам). Пад уздзеяннем В. Праскурава захапіўся нарысам. Выйшлі яго кніжкі «Багацце душы — людзям» (1966), «Пялёсткавы бераг» (1969), «Каласам хіліцца долу» (1970). Друкаваўся ў калектыўных зборніках «Вернутае шчасце», «Люблю будзённы дзень», рэспубліканскіх газетах і часопісах. Гомельскі перыяд пазначаны зборнікамі вершаў «Аснова» (1977), «З маіх крыніц» (1994), кнігай нарысаў «Калінавая квецень» (1984), а таксама выданнем дакументальнай аповесці М. Качана «Апалены ранак» і ўспамінаў Р. Лазабаева «Ляcныя пабрацімы» (літаратурны запіс І. Кірэйчыка).

Сталым майстэрствам вызначаюцца яго вершы, апавяданні, нарысы. Пранаш трывожны і няпросты час ён піша грунтоўна і з добрым веданнем жыцця. Яго творы прасякнуты спагадай і чалавекалюбствам, у іх гучаць сялянскі гумар і сатыра.

Жыве ў Гомелі. *В. У. Смольская.*

1.2.

Багацце душы — людзям. [Я. Ц. Германовіч]. Мн., 1966.

Пялёсткавы бераг: Апавяданні; Нарысы. Мн., 1969. Рэц.: Г а л ь м а к о ў Д. Былі палескага краю // Беларусь. 1970. № 1; Д а н і л е н к а М. // Чырв. змена. 1970. 11 сак.; П а н а с ю к М. Пра час і сучаснікаў // ЛіМ. 1969. 16 вер.

Каласам хіліцца долу. Мн., 1969.

Аснова. Вершы. Мн., 1977.

Друкавацца пачаў у 1932. Яго вершы публікаваліся ў часопісах і газетах «Полымя рэвалюцыі», «Беларусь калгасная», «Чырвоная Беларусь», «Звязда», у альманахах «Аднагодкі» (верш «Пагранічнік»), «Заклік», «Ударнікі». Вершы В. Леанідава — своеасаблівая даніна рыторыцы, патрабаванням савецкай ідэалогіі 1930-х г. *Л. С. Савік.*

Бібліяграфія

1.3.

1932. Лясны камбінат: [Верш] // Бел. калг. № 6—7.

1933. Вечар у такарным: [Верш] // Заклік. № 3; На прарыве: [Верш] // Полымя рэвалюцыі. № 10; Машыніст каткоў: [Верш] // Чырв. Бел. № 1; Вясна: Азначэнне старой вясны; Азначэнне новай вясны; Мы рыхтуем насенне к сяўбе; Штурм палёў: [Вершы] // Там жа. № 7; Па першаму закліку пойдзем у бой: [Верш] // Чырвонаарм. праўда. 26 снеж.

1934. Два апавяданні: [Верш] // Ударнікі. Альманах 3-ці.

1935. Пагранічнік: [Верш] // Аднагодкі. Мн.; Полымя рэвалюцыі. № 5.

1936. Балада пра вестаўога: [Верш] // Полымя рэвалюцыі. № 2.

1937. У гарах Гвадарамы: [Верш] // Звязда. 6 кастр.; Кніга, якая выкрывае твар фашызма: [Рэц. на кн.: Брэдэль В. Испытание. М., 1936] // ЛіМ. 1 мая; «Народу звычай у люстры ясным ён чытаў...» // Там жа. 18 жн.

1.4.

1931. Тынаў Т. Даём — заём!: [Верш] / З рус. // Камунар Магілёўшчыны. 27 чэрв. / Пер. пад прозв. Багамольцаў; Сааўт. пер. Волкаў. *В. М. Грышкевіч.*

ЛЕБЯДА ТОДАР

Тодар Лебяда (сапр. Шырокаў або Шыракоў Пётр Фёдаравіч; інш. псеўд. Клім Каліна; 6.1.1914, Віцебск — 1970; пахаваны ў пасёлку Воршава Пуцяцінскага р-на Разанскай вобл.), драматург, паэт, празаік, публіцыст.

З сям'і рабочага. З маленства хлопчык спазнаў галечу і няшчымніцу: бацька рана памёр, маці — Настасся Паедава — працавала прадзіцай на чыгунцы і атрымлівала вельмі мала. У Віцебску ён скончыў сямігодку і чыгуначнае рамеснае вучылішча, а ў 1933 паступіў у Мінскі педагагічны інстытут. У гэты час спрабуе пісаць нарысы і вершы, якія змяшчае ў газетах «Віцебскі рабочы», «Савецкая Беларусь», «Піянер Беларусі». У 1936 ён і яшчэ адзінаццаць студэнтаў інстытута былі беспадстаўна абвінавачаны ў «буржуазным нацыяналізме» і арыштаваны. Вярхоўны суд БССР асудзіў яго на 5 гадоў. Тэрмін адбываў у Новасібірскай вобласці. У 1940 па хадайніцтву жонкі Б. Цыпінай Тодара Лебяду прывезлі ў Мінск «для перагляду справы». З Мінска адправілі ў г.Чэрвень, дзе і застала яго вайна. У час акупацыі жыў з сям'ёй у Віцебску. У 1943—44 рэдактар газеты «Беларускае слова». Пісаў вершы, апавяданні, драматычныя творы. Тут напі-

сана яго п'еса «Загубленае жыццё» — першы антыбальшавіцкі твор у беларускай драматургіі. У 1943 рэжысёр В. Селях-Качанскі ажыццявіў пастаноўку гэтай п'есы на сцэне Мінскага гарадскога тэатра, а ў 1952 яна выйшла ў Канадзе асобным выданнем. У 1944 у Мінску з'явіўся і першы паэтычны зборнік паэта «Песьні выгнаньня». У яго ўвайшлі вершы, напісаныя Т. Лебядой у сталінскіх лагерах. У маі 1947 Ваенны Трыбунал войск МУС Мінскай вобласці зноў асудзіў Тодара Лебяду, на гэты раз на 25 гадоў. У якіх раёнах Сібіры адбываў ён свой тэрмін, невядома. Вядома толькі, што 30 жніўня 1956 ён быў вызвалены з-пад варты, а ў 1960 прыехаў у Слонім, дзе працаваў рэзчыкам паперы на кардоннай фабрыцы «Альбярцін». Тут напісаў п'есу ў трох актах «У нас, на Гродзеншчыне», прысвечаную вясковаму жыццю. Пісаў і апавяданні. Асабліва яму ўдаваліся гумарыстычныя апавяданні і абразкі на маральна-этычныя тэмы. У студзені 1962 ён пераехаў у г. Чэрвень і працаваў у чэрвеньскай райгазеце. У канцы 1962 назаўсёды пакінуў Беларусь. У апошнія гады яго непакоіла сэрца. Ён перанёс два інфаркты і памёр на пачатку 1970 года.

С. М. Чыгрын.

Бібліяграфія

1.2.

Песьні выгнаньня. Мн., 1944; Выд. 2, факсім. Мн., 1991 / Пад псеўд. Тодар Лебяда.

Загубленае жыццё: Драма ў 3 дз. Монтрэаль, 1952 / Пад псеўд. Тодар Лебяда.

1.3.

1931. Будні цэху: [Верш] // Штурм. № 1; Чорная каса: [Верш] // Віцеб. пралетарый. 12 снеж.; Ударнік у літаратуры: [Верш] // Там жа. 29 снеж.

1932. Вынаходца: [Верш] // Віцеб. пралетарый. 7 сак.; Чырвоныя абозы: [Верш] // Там жа. 9 вер.

1933. Другое жыццё: [Нарыс] // Віцеб. пралетарый. 11 сак.; Першае ворыва: [Нарыс] // Там жа. 9 мая.

1934. Каханне: Апавяданне // ЛіМ. 1934, 15 ліст.; За вамі геройства і слава: [Верш] // Піянер Бел. 14 лют.

1935. Агей: Апавяданне // ЛіМ. 16 вер.

2.3.

На беларускай мове. Ушакоў А. За вучобу, за штодзённую творчую работу: Пра творчасць Шыракова // Віцеб. пралетарый. 1932. 21 ліп.; Адамовіч І. «Мне лёсам вызначаны гэтакі прымус...» // Голас Радзімы. 1994. 24 лют.

В. М. Грышкевіч.

ЛІЎШЫЦ УЛАДЗІМІР

Ліўшыц Уладзімір Маісеевіч (псеўд. У. Уладзіміраў, В. Краснакуцкі; н. 1.2.1946, г. Красны Кут Саратаўскай вобл.), літаратуразнавец, публіцыст, педагог, гісторык, этнограф. Кандыдат філасофскіх навук (1980), дацэнт (1981). Піша на беларускай і рускай мовах.

Нарадзіўся ў сям'і служачых. Бацька, Маісей Хаймавіч, родам з Лепельскага раёна, у гады Вялікай Айчыннай вайны абараняў Ленінград, маці, Соф'я Давыдаўна, родам з Рагачова, у 1941 з дзецьмі эвакуіравалася ў г. Красны Кут Саратаўскай вобл. У сакавіку 1946 сям'я вярнулася на Беларусь, у г. Горкі. У 1964 У. Ліўшыц скончыў Горацкую СШ № 2, працаваў вучнем майстра па рамонце гадзіннікаў у раённым камбінаце бытавога абслугоўвання. З 1965 ён вучыўся на гістарычным факультэце Магілёўскага педагагічнага інстытута, скончыўшы які, у 1969 накіраваны настаўнікам гісторыі Панкратаўскай СШ Горацкага раёна. Пасля вайсковай службы (1971—72) працаваў інспектарам Горацкага райаддзела народнай адукацыі. З 1972 асістэнт, старшы выкладчык, дацэнт кафедры філасофіі і паліталогіі Беларускай сельскагаспадарчай акадэміі. З 1989 дырэктар Горацкага раённага гістарычна-этнаграфічнага музея.

Першыя публікацыі У. Ліўшыца з'явіліся ў 1968. Яго дакументальныя нарысы, літаратуразнаўчыя

артыкулы змяшчаліся у газетах «Літаратура і мастацтва», «Звязда», «Чырвоная змена», «Знамя юности», «Магілёўская праўда», «Магілёўскія ведамасці», часопісах «Нёман», «Беларусь», «Маладосць», «Рабочая смена», «Сельское хозяйство Белоруссии», навуковых зборніках. На аснове архіўных матэрыялаў у публікацыях У. Ліўшыца даследуюцца пытанні стварэння паэмы «Тарас на Парнасе», сувязі беларускай літаратуры з рускай і ўкраінскай літаратурамі, даследуецца жыццё і творчасць Я. Купалы, Я. Коласа, М. Гарэцкага, Л. Чарняўскай, В. Каваля, Т. Шаўчэнкі, Л. Талстога, М. Чарнышэўскага, І. Тургенева, іх сувязь з Магілёўшчынай. Многія яго артыкулы прысвечаны дзеячам вызваленчага і рэвалюцыйнага руху, гістарычным падзеям на Магілёўшчыне. Аўтар гістарычна-эканамічных нарысаў «Горкі» (1984, 1990), «Горкі і наваколле» (1993), літаратурных нарысаў «Раскопкі вакол горацкага Парнаса» (1992). Адзін з аўтараў кніг «Беларуская сельскагаспадарчая акадэмія» (1986), «Максім Гарэцкі — жыццё і творчасць» (1993) і інш., рэдактар «Гарэцкіх чытанняў» (1992, 1993, 1994).

Жыве ў Горках.

М. М. Студнёва.

Бібліяграфія

1.2.

Горки: Историко-экономический очерк. Мн., 1984.

Белорусская сельскохозяйственная академия. Мн., 1986 / Сааўт. М. Дабралюбаў.

Горки: Набор открыток. М., 1986 / Аўт. тэкста.

Горки: Историко-экономический очерк. Мн., 1989.

Белорусская сельскохозяйственная академия: Памятники и памятные места. Мн., 1990 / Сааўт. М. Дабралюбаў.

Белорусская сельскохозяйственная академия: 150 лет. Краткий очерк истории и деятельности. Мн., 1990 / Сааўт. І. Нямыкіна, М. Дзюбакова і інш.

Белорусская сельскохозяйственная академия — первое в России высшее сельскохозяйственное учебное заведение: Материал в помощь лектору. К 150-летию со дня открытия. Мн., 1990 / Сааўт. М. Дабралюбаў.

Белорусская сельскохозяйственная академия: Иллюстрированный буклет. Мн., 1990 / Аўт. тэкста. Сааўт. М. Дабралюбаў.

Читайте, слушайте, говорите: Методические разработки и задания по русскому языку для студентов-иностранцев. Горки. 1990 / Сааўт. В. Зяньковіч, Л. Камко.

Горацкі гістарычна-этнаграфічны музей: Даведнік. Мн., 1991.

Горкі: Фотаальбом. Мн., 1991 / Аўт. тэкста.

Раскопкі вакол горацкага Парнаса: Метадычны матэрыял і парады ў дапамогу прапагандыстам кнігі. Магілёў. 1992.

Горки и окрестности: Справочник-путеводитель. Орша. 1993.

Максім Гарэцкі — жыццё і творчасць: Метадычны матэрыял і парады ў дапамогу прапагандыстам кнігі. Магілёў, 1993 / Сааўт. В. Зяньковіч, Т. Скікевіч. М. Студнёва.

Горацкай зямлі адважныя сыны. Горкі. 1994.

Ішло ў бяссмерце горацкае гета... Горкі, 1995.

Летапіс горада Горкі. Горкі, 1995.

Беларуская сельскагаспадарчая акадэмія. Мн., 1995 / Сааўт. А. Р. Цыганаў.

1.3.

1968. Салдат рэвалюцыі // Маг. праўда. 1 ліст.

1969. Верный сын белорусского народа // Железнодорожник Бел. 16 февр.

1970. Вуліца Бруцара-Ерафееўская // Маладосць. № 4.

1972. Вуліца Бруцара-Ерафееўская // Звязда. 15 вер. Млава: Вуліца Чэрнікава // Маг. праўда. 24 кастр.

1973. Памяць сэрца // Маг. праўда. 11 кастр.; Якуб Колас // Там жа. 3 ліст.

1974. Варта было паказацца смельчаку // Маг. праўда. 9 крас.

1975. Отречемся от старого мира // Знамя юности. 26 февр.; Першая палітычная // Маг. праўда. 20 вер.; Было тое слова // Там жа. 14 ліст.

1976. Оценку дает коллектив // Сель. хоз-во Бел. № 11; Салдат рэвалюцыі // Чырв. змена, 21 сак.

1977. Чалавек з легенды // Маладосць. № 11; Заряжая револьвер, клянемся // Раб. смена. № 11; Расцвет совхоза будет обеспечен // Сел. хоз-во Бел. № 4.

1978. Жизнь, которая стала легендой // Раб. смена. № 11; Салдат рэвалюцыі // Маг. праўда. 7 студз.; Чырвонагвардзеец // Там жа. 22 лют; Харчатрадаўцы // Там жа. 16 жн.; Камісар Фабрыстаў // Там жа. 5 вер. Памяць аб чырвоным сцягу // Чырв. змена. 19 снеж.

1979. Якуб Колас у Горках // Маг. праўда. 13 чэрв.; Горкі: [Гісторыя нашых гарадоў] // Там жа. 20 ліп.

1980. Весткі з Млавы // Маг. праўда. 16 крас.

1981. Жизнь, ставшая легендой // Сел. газ. 4 авг.

1982. Прататып Рахметава // ЛіМ. 22 кастр.

1983. Талантливый сын Могилевщины // Нёман. № 7.

1984. Впечатляющие достижения // Сел. хоз-во Бел. № 10 / Сааўт. Ф. Прыходзька, М. Цішчанка; Рэвалюцыяй мабілізаваны // Маг. праўда. 27 вер.

1985. Пад чырвоным сцягам // Маг. праўда. 11 студз.; М. Гарэцкі ў Горках // Там жа. 24 вер.

1.6.

Белорусская сельскохозяйственная академия: история, проблемы развития науки и образования: Тезисы докладов и сообщений научно-практической конференции, посвященной 150-летию БСХА. Горки, 1991 / Адказ. сакр.

Першыя Гарэцкія чытанні. Горкі, 1992 / Рэд.

Гарэцкія чытанні: Тэзісы дакладаў і паведамленняў. Горкі, 1993 / Рэд.

Ковалева Н. Напиток певчих птиц: Стихи. Горки, 1993 / Рэд.

Проблемы гуманитаризации высшего сельскохозяйственного образования: Сборник статей. Горки, 1993 / Рэдкал.

Психолого-педагогические основы активизации познавательной деятельности и развития творческого мышления студентов в учебном процессе: Тезисы докладов и сообщений научно-методической конференции. Горки, 1993 / Рэдкал.

Социологические и социально-психологические проблемы сельскохозяйственного образования: Тематический сборник материалов межвузовской научно-практической конференции. Горки, 1993. Ч. I, II / Рэдкал.

Бацькаўшчына: Матэрыялы раённай краязнаўчай канферэнцыі. Горкі, 1993 / Рэд.

Гарэцкія чытанні: Матэрыялы дакладаў і паведамленняў. Мн., 1994 / Рэд.

Галасы з горацкага Парнаса. Горкі, 1995 / Скл.

2.1.

Ліўшыц Уладзімір Маісеевіч: 30 год у краязнаўстве і літаратуразнаўстве: Біябібліягр. паказальнік. Горкі, 1994 / Скл. М. Студнёва.

М. М. Студнёва.

ЛУЖКОЎСКІ ВІКТАР

Лужкоўскі Віктар Іванавіч (н. 2.3.1942, в. Комсенічы Круглянскага р-на Магілёўскай вобл.), паэт. Член СП Беларусі з 1994.

З сялянскай сям'і. У 1958 скончыў Комсеніцкую сярэднюю школу і паступіў у Магілёўскае чыгуначнае вучылішча. Пасля заканчэння яго (1960) накіраваны на працу ў Мінск. У 1975 паступіў на будаўніча-тэхналагічны факультэт Беларускага політэхнічнага інстытута, які закончыў у 1981. Працаваў на будоўлях Мінска, быў начальнікам участка ВА «Мінгаз», вядучым інжынерам Мінскага мотавелазавода. З 1990 працуе дырэктарам Дома літаратара ў Саюзе пісьменнікаў Беларусі.

Выступае ў друку з 1985 (першая падборка вершаў надрукавана ў газеце «Чырвоная змена»). Першую кніжку вершаў «Смага» выдаў у 1991, зборнік «Лістапад у Траецкім прадмесці» — у 1993. Адметныя рысы яго таленту — шчырасць, вобразнасць, дакладнасць слова і радка. Добра ведае жыццё рабочага. Валодае жывым народным словам, умее пісаць каларытна, вобразна, знаходзіць свае фарбы, метафары. В. Лужкоўскі — аўтар слоў да многіх песень.

Жыве ў Мінску.

В. У. Смольская.

Бібліяграфія

1.2.

Смага: Вершы. Мн., 1991 (Б-ка час. «Маладосць»). Лістапад у Траецкім прадмесці: Вершы. Мн., 1993. У кратэры вулкана: Вершы. Мн., 1995.

1.3.

1985. Вырай: [Верш] // Вясёлка. № 9; Хада; «З пушчанскіх сцежак таямнічых...»: [Вершы] // Чырв. змена. 11 вер.

М. П. Барташэвіч.

ЛУК'ЯНАЎ МІКОЛА

Лук'янаў Мікола (Мікалай Піліпавіч, н. 20.7.1924, в. Лешчанка Кіраўскага р-на Магілёўскай вобл.), празаік. Член СП Беларусі з 1990. Заслужаны работнік сацыяльнага забеспячэння РБ.

Нарадзіўся ў сялянскай сям'і. Бацька, удзельнік грамадзянскай вайны, пасля дэмабілізацыі з Чырвонай Арміі працаваў сакратаром мясцовага сельскага Савета. У 1929 сям'я пераехала на жыхарства ў вёску Баравіца Кіраўскага р-на. Тут у 1931 М. Лук'янаў паступіў у першы клас пачатковай школы. З 1935 сям'я жыла у мяст. Кіраўск, дзе ў 1941 М. Лук'янаў закончыў сярэднюю школу. У час Вялікай Айчыннай вайны ўдзельнічаў у партызанскім руху (партызанскі полк № 537 імя Кірава). У час адной з аперацый паранены. Пасля злучэння з Савецкай арміяй прымаў удзел у баях на фронце. У ліпені 1944 на беластоцкім напрамку быў цяжка паранены і страціў зрок. У 1944 на фронце загінуў бацька. У 1948—68 працаваў настаўнікам вячэрняй школы на Бабруйскім прадпрыемстве Таварыства сляпых. У 1968—89 старшыня Магілёўскага абласнога праўлення таварыства сляпых. Цяпер на пенсіі.

Друкавацца М. Лук'янаў пачаў у газеце «Камуніст» (Бабруйск). Пазней друкаваўся ў «Магілёўскай праўдзе», «Звяздзе», часопісе «Маладосць» і інш. Аповесць «І цемра адступіла» надрукавана ў 1987 у «Маладосці», у 1988 — у зборніку «Дым родных каміноў». У гэтым творы аўтар глыбока пранікае ў свет чалавечых пачуццяў. Апублікаваў аповесці «Яго боль» («Маладосць», 1992) і «Цяжкія дарогі» («Акно», 1993). У творчасці М. Лук'янава — сталасць мыслення, погляду на свет, праўдзівасць жыццёвых рэалій і ў той жа час — шматколерны жывапіс, пластыка.

Жыве ў Магілёве.

В. У. Смольская.

Бібліяграфія

1.3.

1981. Пякучы снег: Апавяданне // Маг. праўда. 4 вер.

1983. Цыпачкін: Гумарыст. апавяданне // Маг. праўда. 26 ліп.

1984. Апошні бой: [Урывак з аповесці «І цемра адступіла»] // Маг. праўда. 28 вер.

2.3.

На беларускай мове. А н о ш к і н А. І цемра адступіла... // Маг. праўда. 1990. 15 жн.

Т. М. Махнач.

МАЛЕЦ ЯНУСЬ

Малец Янусь (Іван Вільгельмавіч; н. 8.2.1951, в. Хрыстова Пастаўскага р-на Віцебскай вобл.), паэт. Член СП Беларусі з 1994.

Нарадзіўся ў сям'і сялян. Пасля заканчэння васьмігодкі вучыўся ў Полацкім ГПТВ-66. Атрымаўшы спецыяльнасць слесара-бляхара па вентыляцыі, працаваў на Віцебскім заводзе сантэхзагатовак. Потым паступіў вучыцца на машыніста ў Находкінскую марскую школу тэхнічнага флоту. Пасля вайсковай службы (1970—74) завочна скончыў БДУ (1983). Працаваў на чыгуначнай станцыі Мінск-Таварны счэпшчыкам вагонаў, на цагельным заводзе сартыроўшчыкам цэглы, на Мінскім маторным заводзе фрэзероўшчыкам, механікам па абслугоўванні тэлеабсталявання, у гарадской ЖЭС № 81, на станцыі Мінск-Пасажырскі. З 1993 рэдактар літаратурнага аддзела часопіса «Вожык».

Літаратурнай працай Я. Малец займаецца з 1974. У беларускім рэспубліканскім друку выступае з 1984. У 1992 выйшла кніга яго гумарыстычных вершаў і пародый «Бедны конь», а ў 1994 — кніга гумару і сатыры «Трава ў вушах». Адзін з аўтараў калектыўных зборнікаў «Трусцой на Парнас» («Библиотека «Крокодила», 1989), «Лагодны прамень раніцы» (1988), «Асцюкі за каўняром» (1989). Працуе ў жанры гумару і сатыры. Яго вершы лаканічныя, звязаныя з роднай зямлёй, вёскай. Па-грамадзянску страсна гучаць яны, калі сатырык піша пра сумленне, справядлівасць, праўду.

Жыве ў Мінску.

В. У. Смольская.

Бібліяграфія

1.2.

Бедны конь: Гумарыст., сатыр. і іраніч. вершы. Літ. пародыі. Мн., 1992 (Б-ка час. «Маладосць»).

Трава ў вушах: Вершы. Мн., 1994 (Б-ка «Вожыка»).

1.3.

1979. Папрок; Вялікі грэшнік; Хваробы-натхняльнікі: [Пародыі] // ЛіМ. 14 вер.

1980. Разумнае выйсце: [Пародыя] // ЛіМ. 25 студз.; Метэарытныя сустрэчы: [Пародыя] // Там жа. 15 лют.; Таннае транжырства: [Пародыя] // Там жа. 23 мая; Ты і крыху з «Ойча наш»: [Пародыя] // Там жа. 6 чэрв.; Былыя грахі; Усемагутны: [Пародыі] // Там жа. 12 вер.; Фантастычнае каханне: [Пародыя] // Там жа. 26 вер.; Пародыі: Згаджайцеся; Няўлоўнае слова // Там жа. 3 кастр.

1981. Туманнае здарэнне: [Пародыя] // Беларусь. № 7; Згубленая Нарач: [Пародыя] // Чырв. змена. 15 лют.; Думкі дзеда-вартаўніка: [Пародыя] // Там жа. 11 ліп.

1982. Мілы косю...: З-пад капыта Пегаса // Беларусь. № 5; Пасля чатырох тостаў: [Гумарэска] // ЛіМ. 31 снеж.

1983. Як пішуцца вершы?: [Верш] // ЛіМ. 23 вер.

1984. Працавітая тройка: [Верш] // Вожык. № 20.

1985. «Я на 1-й Пасялковай...»; У вясковай лазні; Ля мора; Імгненні; Кантрасты: [Вершы] // Чырв. змена. 30 чэрв.; «На грошы змалку небагаты...»; Восень: «Дзяўчынка з чырвонымі ружамі...»: [Вершы] // Там жа. 12 ліп.; Зімовая замалёўка; «Усплывае самотны твой вобраз...»; «Як сёння дыхаецца лёгка!..»; Вясковае вяселле; Кветкі бэзу; У тралейбусе: [Вершы] // Там жа. 22 снеж.

М. П. Барташэвіч.

МАРОЗАЎ ЗМІТРОК

Марозаў Змітрок Змітравіч (н. 2.1.1954, пас. Язбы Крупскага р-на Мінскай вобл.), паэт, празаік, публіцыст, член СП Беларусі з 1992. Лаўрэат прэміі Ленінскага камсамола Беларусі (1988, за кнігу вершаў «Хлебны верасень»).

Нарадзіўся ў сялянскай сям'і. Пасля заканчэння Язбоўскай СШ (1970) паступіў на аграномічны факультэт Беларускай сельскагаспадарчай акадэміі ў Горках. Закончыўшы акадэмію (1975), працаваў старшым аграномам калгаса «Рэвалюцыя» Быхаўскага раёна Магілёўскай вобл., старшым аграномам Упраўлення сельскай гаспадаркі Магілёўскага аблвыканкома, галоўным аграномам калгаса імя Энгельса Бялыніцкага раёна (1977—79), другім сакратаром Бялыніцкага райкома ЛКСМБ (1979—84), лектарам ЦК ЛКСМ Беларусі (1984—86). З 1986 працуе ў Дзяржагрупроме Беларусі. З 1986 памочнік міністра сельскай гаспадаркі і харчавання Рэспублікі Беларусь.

Першы верш З. Марозава надрукаваны ў быхаўскай раённай газеце «Маяк Прыдняпроўя» ў 1977. Выдаў паэтычныя зборнікі «Пад небам бусліным», «Агонь і жыта», «Хлеб і памяць», «Хлебны верасень», «Прадчуванне», «Апакаліпсіс душы», «Залатая кніга беднага», «Ачышчэнне сяўбой», «Сын чалавечы». Піша апавяданні для дзяцей («Азбука агранома Валошкі»), публіцыстычныя нарысы пра беларускую вёску, мінулую вайну. Выдаў кнігу публіцыстыкі «І скажуць унукі». У вершах З. Марозава любоў да роднай зямлі, глыбокая пашана да сялянскай працы. Душа паэта напаўняецца сумам і пачуццём адказнасці, бо ён адчувае сябе вечным даўжніком працавітых вясковых людзей. Большасць яго вершаў адрасавана працаўніку зямлі, вёсцы, хлебу, сейбітам вечнага. Яны моцныя эмацыянальным і філасофскім пачаткам, заземленасцю і адначасна акрыленасцю пачуцця.

За кнігі «Ачышчэнне сяўбой» і «Сын чалавечы» прэмія Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі 1995.

Жыве ў Мінску.

Л. С. Савік.

Бібліяграфія

1.2.

Пад небам бусліным: Вершы. Мн., 1982 (Першая кніга паэта). Рэц.: Грамадчанка Т. Каб змог узняцца колас // Чырв. змена. 1983. 16 ліп.; Кандрусевіч А. Праўда поля і баразны // Маг. праўда. 1982. 26 лют.; Мароз У. Час, калі крылам дужэць: Па старонках трох першых кніг паэзіі // ЛіМ. 1982. 2 жн.

Хлеб і памяць: Вершы. Мн., 1988.

Хлебны верасень: Вершы, паэмы. Мн., 1988.

Азбука агранома Валошкі. Мн., 1989 (Б-ка навук.-паазнав. літ.).

Апакаліпсіс душы: Вянок вянкоў санетаў. Мн., 1991.

Прадчуванне: Вершы, вянок санетаў. Мн., 1991.

Ачышчэнне сяўбой: Вершы, паэмы, вянкі санетаў. Мн., 1992.

Сын чалавечы: Вершы, вянок вянкоў санетаў. Мн., 1993.

Залатая кніга беднага: Вершы, вянкі санетаў. Мн., 1994.

І скажуць унукі: Нарысы. Мн., 1994.

Пра гарох і буракі, бульбу, жыта, агуркі. Мн., 1995.

1.3.

1977. «У рэках бачу еднасць ручаёў...»; «Майго жыцця ў жытнёвым полі...»; Паплавы; «Краплісты дождж, як першае каханне...»: [Вершы] // Чырв. змена. 17 жн.

1978. «Мы гаворым пра іх — ветэраны...»; «Не ўшчувайце мяне...»; «Пахмурны дзень...»; «Бусліны досвітак...»; Калыска: [Вершы] // Беларусь. № 11; «Зямлі прастор. Палёў маіх цяпло...»; «Абеліск. Імёны на граніце...»; «Землякоў пазнаю па мове...»; «Камбайны выходзяць у ранне...»; «Пасля сяўбы хвалююся заўсёды»; «Захмарана хмурынамі ўсё неба...»: [Вершы] // Маладосць. № 10; Сын зямлі; Ліпень; «Чужога шчасця мне не трэба...»: [Вершы] // Сел. х-во Бел. № 3; «Жыты даспелымі валкамі...»; «Ралля вясною прагне цеплыні...».; «Тваёй рукой спавітае дзіця...»; «Зіма. Мароз. Снягі. Завеі...»; «Пакуль што сярод галасоў...»: [Вершы] // ЛіМ. 22 вер.; «У бацькоўскім садзе зоры даспяваюць...»; «Мне даражэй усяго на свеце...»; «У марозным небе рэактыўны...»; «Гісторыі застаўся сорак першы...»; «Балада пра партызан»; «Я лічу за вялікі гонар...»; «Палёў разлегласць — вокам не акінуць...»; «Дзень

жыцця — гэта многа...»: [Вершы] // Маг. праўда. 1 ліп.; Калыханка; «Люблю я ноч яблыкападу»; «Зноў наліліся каласы»; «Кут першароднай цішыні...»; «Лісточкам рабіны упала...»; «Прайшла залева мерным крокам...»; «Калі гляджу я на дзяцей вясковых...»; «Гляджу на заранкі палоску...»; «Бары не развіталіся з вайною...»; «Лясы не просяць літасці ў людзей...»: [Вершы] // Там жа. 29 жн.; «Прарваўшы ночы вязкі змрок...»; «Сняцца дзецям казкі ў калысках...»; «Ля Быхава летам вясёлкі...»; «Сады у квецені ружовай...»; «І зноў з зямлі прабіліся зярняты...»; «Веру людзям, веру зверу...»; «Спусціліся над садам густыя цені...»; «Святло і цені. Цемра і святло»; «Знаёмства, першае спатканне...»; «Зерне да зерня — колас...»: [Вершы] // Там жа. 3 кастр.; «Планеце зычаць сонечны спакой...»; «Не ўшчувайце мяне»; «Партрэты на куце ў хаце...»; «Сурова неба хмурыць бровы...»; «Дзяўчынка корміць галубоў...»; «Певень у хляве спрасоння...»; «Аляксандры, Марылі, Домны...»; «Патыхнула жалобай газета...»: [Вершы] // Там жа. 18 кастр.; Каваль; «Калі паміраюць сябры...»; «Сосны — чуйныя нервы зямлі...»; «Лета бабіна — удовам суцяшэнне...»; «У Пальмы забралі дзяцей...»; «Ты не стой на шашы...»; «Ніколі не зайздрошчу салаўю...»: [Вершы] // Там жа. 4 ліст.; Паклон: [Верш] // Мін. праўда. 8 крас.; Землякоў пазнаю па мове: [Верш] // Ніва. 26 ліст.; «Я лічу за вялікі гонар...»; «Палёў разлеглась...»; «Якая ноч! І цішыня!..»; «Як многа пражыта!..»; «Не хлебам адзіным багата зямля...»; «Жывым камячком з блакіту...»; «Пахне бор суніцамі і хвояй...»: [Вершы] // Чырв. змена. 4 кастр.

1979. «Дзяўчынка корміць галубоў...»: [Верш] // Работніца і сялянка. № 3; Першы каласок; «А кажуць, быў у вёсцы першым...»; «Ах ты поўня, мая поўня...»; «Ёсць ля Быхава роў...»; «Над ліпай, дзе спіць цішыня...»: [Вершы] // ЛіМ. 20 ліп.; «Над полем узнялася аблачынка...»: [Верш] // Маг. праўда. 3 крас.; Хлеб: Паэма // Там жа. 4 крас.; Гром; «Над вёскай поўнач...»: [Вершы] // Там жа. 12 мая; «Над старэнькай адрынай...»; «Заціхлі грому першага фанфары...»; На радзіме; «Накасіўшыся ўволю...»; «Неба дым вечаровы...»: [Вершы] // Там жа. 7 ліп.; Памяць: Паэма; Я ў адказе за лёс планеты; «Над садам белыя аблокі...»; «Хвалі лодку люляюць...»: [Вершы] // Там жа. 8 жн.; «Я адчуваю прыцягненне зямных народаў і плямён...»: [Вершы] // Там жа. 3 кастр.

1980. Калі чытаю Куляшова...; «Часам родную вёску прыпомню...»; «Жывым камячком з блакіту...»: [Вершы] // Дзень паэзіі — 80. Мн.; Вечар прылёг на верасе...: [Верш] // Беларусь. № 1; Начное жніво; «Зямля былыя гоіць раны...» [Вершы] // Там жа. № 5. «Накасіўшыся ўволю...»; Бабулі Домне; «Аддаю ўсяго сябе дарогам...»; «Жыццё парой без жалю нас трасе...»; «Начная змена адгула...»; «Калі накрые вёску надвячорак...»; «Пасёлак. Пяць старых хацін...»; «Заскрыгатаў лямеш сталёвы...»; «Над садам белыя аблокі...»: [Вершы] // Маладосць. № 5; «Над садам белыя аблокі...»: [Верш] // Род. прырода. № 5; Вёска: [Верш] // Сел. х-во Бел. № 1; Перад сяўбой: [Верш] // Там жа. № 3; Удзячнасць; «На мёрзлы дол сягоння зранку...»: [Вершы] // Голас Радзімы. 7 лют.; «Луг дзяцінства!..»; «Шэпт старога бацькоўскага саду...»: [Вершы] // ЛіМ. 19 вер.; «Трэція пеўні прапелі...»; «Высокія антэны...»; «Ліст атрымаў здаля...»: [Вершы] // Маг. праўда. 3 студз.; Калі чытаю Куляшова...; Сустрэча; Марозіха; «Ападае бярозавы май...»; Коні дзяцінства; Жаданне; Расставанне з полем: [Вершы] // Там жа. 4 сак.; «Спеў ранні жаўранка ў палях...»; «Як хораша жыць»: [Вершы] // Там жа. 11 крас.; Песня: [Вершы] // Там жа. 10 чэрв.; «Гляджу на заранкі палоску...»; «На фестывалі роднай песні...»; «Праз раку заранічнай сцяжынкаю...»: [Вершы] // Там жа. 19 жн.; «Ужо сахі не стрэцім дапатопнай...»; «Не выходзяць думкі з галавы...»; «Не прэтэндуючы на лаўры...»; «У вокны сельскага райкома...»; «Не кахаю...»; «Голас твой...»; «Голас загінуўшага салдата...»; «З баразны пачынаецца поле...»; На руінах былога манастыра: [Вершы] // Там жа. 17 кастр.; «Праз раку мясцовай сцяжынкаю...»; Начное жніво: [Вершы] // Чырв. змена. 12 кастр.

1981. «Дзе жыта звоніць коласам даспелым...»; «Калі нараджаюцца дочкі...»: [Вершы] // Дзень паэзіі — 81. Мн.; «Над старэнькай адрынай...»; Купальскія кастры; «Спеў ранні жаўранка ў палях...»; «Курган. Яліна вакавая»: [Вершы] // Маладосць. № 10; Ідуць дажджы: [Вершы] // Род. прырода. № 3; На світанку; Птахі; Раніцай; Вечарам: [Вершы] // Там жа. № 5; «У спеве птушак, шэпце траў...»; «Прастор Айчыны — вокам не акінуць...»; «Сасна з вятрамі гаманіла...»: [Вершы] // ЛіМ. 21 жн.; «На вышыні ля Лудчыц...»; «У небе азябла сузор'і мігнуць...»; «Над зямлёю жаўранкам ўзаўюся...»; «Вёска прачынаецца з дасвеццем...»; «Сціраюцца грані і межы...»: [Вершы] // Маг. праўда. 4 лют.; Песні маці; «На Дняпры — паводка...»; «На суглінку, дзе ў пакаленнях рос...»; «Не будзіце аратага, жаўрукі...»; «Бывай, унук!» — жыццём стамлёны...»: [Вершы] // Там жа. 19 жн.; Мацярынскае поле; Здрада; «Добрыя людзі не б'юць сябе ў грудзі...»: [Вершы] // Там жа. 2 снеж.; «З залатога каля хаты клёна...»: [Верш] // Наст. газ. 2 снеж.; У вянок маці: [Вершы] // Чырв. змена. 10 студз.; Радзіме; «Родны бераг. Вербы. Чараты...»; «Араў мой прадзед веснюю аблогу...»; «На чаўне заранкавым світанне...»; «Што сказала пра цябе каханая?..»: [Вершы] // Там жа. 13 чэрв.; Мама: [Верш] // Там жа. 14 ліст.; «З баразны пачынаецца поле...»; «Туга па воіну памершым...»: [Вершы] // Там жа. 19 снеж.

1982. «Зямля астыла і трава завяла...»; «Разлілася весняя паводка...»: [Вершы] // Беларусь. № 2; «Жывуць у вёсках жанчыны...»; «На Дняпры — паводка...»; «Гай расквеціўся фарбамі восені...»; «Светла напрадвесні...»: [Вершы] // Маладосць. № 6; Марозіха; Жыццё; Чары вясны; Дома: [Вершы] // Полымя. № 5. «Над старэнькай адрынай...»; «Спеў ранні жаўранка ў палях»: [Вершы] // Голас Радзімы. 26 жн.; «Змяркання час. Плывуць па небе хмары...»: [Верш] // Звязда. 31 ліп.; «На суглінку, дзе спрадвеку рос...»; Рэквіем; «Адсеем фальшывыя словы...»; Мацярынскае поле; «Яблыням — як маці — пяцьдзесят...»; «Халадок таполяў белых...»; «Хлебны верасень крочыць па...»; «Наведаў я бацькоў магілы...»; «Люблю паслухаць землякоў...»; «Сталасці парог пераступаю...»: [Вершы] // ЛіМ. 21 мая; Мая лясная старана; «Гады наплываюць як хвалі...»: [Вершы] // Маг. праўда. 10 ліп.; Тост; «З сінявы лісты ляцяць...»; «Дзень, як свечка, патух...»; «Паўдзённы, цёплы, лёгкі...»; Давер; «Як плуг у баразне вясной...»; «Людзі добрыя, гляньце...»; «Я не шукаю прымірэння...»; Сэрца; «Адсеем фальшывыя словы...»: [Вершы] // Там жа. 7 снеж.; Рукі; «Бывай, унук!» — жыццём стамлёны...»; «На суглінку, дзе ў пакаленнях рос...»: [Вершы] // Чырв. змена 24 ліп.

1983. Аматар прыроды: [Сатыр. верш] // Вожык. № 11; Беларусы; «Мая калыска з той сасны»; «У цёмным чэраве зямлянкі»; «Воблакі, вандроўнікі блакіту»; «Бунтуе хларафіл у жылах лета»; «Адсеем фальшывыя словы»; «Дзівак, навошта ты спяшаешся»; «Начныя ветры патушылі зоры»; Маці; «Колас пад ветрам гнецца»; «Навошта ластаўка крыляе»; «Дзядзькаў сад. Пчаліны гарадок»: [Вершы] // ЛіМ. 3 чэрв.; Рэквіем: [Верш] // Маг. праўда. 30 вер.; Хлеб; Песня маці: [Вершы] // Сел. газ. 17 июля; Вышыня: [Паэма] // Там жа. 30 нояб. «Жолуд дубочак узняў да святла...»; «Была тут вёска. Сад здзічэлы...»: [Вершы] // Чырв. змена. 17 крас.; Пасля працы; «Жураўліныя плёсы...»: [Вершы] // Там жа. 2 мая; «Хвалюйся, жытні акіян...»; «Вечар. Золкае вока поўні...»: [Вершы] // Там жа. 28 жн.

1984. Вышыня: [Паэма] // Маладосць. № 8. [Адказы на анкету «Маладосці»] // Там жа. № 11; «Мае маленькія дачушкі...»: [Верш] // Полымя. № 10; Партызанскі бор: [Верш] // Род. прырода. № 6; Ля тэлеэкрана; Залежнасць: [Вершы] // Звязда. 5 жн.; Тані; «Верасы, верасы, верасы...»; Даўгі; «Сягоння ўранні вішня зацвіла...»; «Волкім туманам спавіты пагоркі...»: [Вершы] // Знамя юности. 13 мая; «Шэпт каласоў каля дарогі»; «На святло вераснёўскай бярозы»; Дзядзьку Хведару; «У тую ноч не спалі землякі»; «Як многа навокал прасторы»: [Вершы] // ЛіМ. 6 крас.; «Давайце, людзі, хваляваца»; «Дачушка просіць казачку пра джына»; «Я б змог да нараджэння быць забітым»; «Хлебасольная вёсачка Востраў»: [Вершы] // Там жа. 8 чэрв.; «Дзіця згусцела маці...»: [Верш] // Маг. праўда. 26 студз.; Паэма першага жніва // Там жа. 4 вер.; У ціхай вёсцы; «Калі прысядзе сонейка за хаты...»; Акрылі свой радок; Не маланка спаліла...: [Вершы] // Мін. праўда. 24 крас.; Вокны без фіранак; «Лётае ластаўка чорнай стралою...»: [Вершы] // Там жа. 25 мая; «Як падрос ты, сынку!» —

кажа маці...»: [Верш] // Там жа. 13 чэрв.; Працоўны дзень: [Верш] // Там жа. 28 снеж.; «Калі прысядзе сонейка за хаты...»: [Верш] // Чырв. змена. 4 жн.; Роздум сейбіта; Кашуля; Сустрэча; Скарб; Колас: [Вершы] // Сел. газ. 30 окт.

1985. «Гракі з вясной вярнуліся...»; «Растала ноч, і месячык рагаты...»; «Сонца скацілася ў травы бязмоўныя...»: [Вершы] // Беларусь. № 4; Трактарыст; Роздум сейбіта: [Вершы] // Бярозка. № 4; «Цемра ночы, дня святло...»; «Вячэрні час. Плывуць па небу хмары...»; «З агню і жыта выйшаў я...»; «Лістападаўскі сіні бярэзнік...»; «Адсеем фальшывыя словы...»: [Вершы] // Змена юности. 20 окт.; Роздум аб хлебе. «Запавет забыты»; «Спусціліся на сад густыя цені»; «Віхурыцца кляновая завея»; «Салдат, падобны на мяне»: [Вершы] // ЛіМ. 16 жн.; Сейбіты: [Верш] // Мін. праўда. 25 лют.; Аматар прыроды: [Гумарыст. верш] // Ніва. 27 кастр.; Пятмяці А. В. Пысіна; Слова: [Вершы] // Чырв. змена. 5 сак.; «Перастаў давяраць я прыкметам...»; «Ёсць пад Бялынічамі бор...»; «Сустракае вёска цёплым хлебам...»; «...І ўпаў салдат каля граніцы...»; «Быў май. Квітнеў ля хаты бэз...»; «Ноччу чэрці жаніліся ў полі...»; «Давай, матуля, пагамонім...»; «Вялікае не церпіць мітусні...»; «Дзень за днём імклівай чарадою...»: [Вершы] // Там жа. 7 снеж.

1.4.

1984. Юбузаеў Ж. «Калі раптам патухне сонца...»; «Калі па дарозе да мяне...»; «Добра і дрэнна — не ўсё роўна...»: [Вершы] // Чырв. змена. 31 кастр.

1.5.

На рускую мову. Огонь и жито: Стихи. М., 1983. «У Днепра, где смерть солдат косила...», Белорусы; «Храп коней тревожный...»; Проня; «Метели беззвучное эхо...»; «Яблоням — как маме — пятьдесят...» / Пер. Г. Калашников // Поэзия. 1983. № 36; «Из века в век в цепи судеб...»; «Вижу всюду башенные краны...»; «Паводок днепровский...»; Наследство: [Вершы] / Пер. А. Вершинский // Лит. газ. 1983. 23 марта; Материнское поле; Песня комбайнера; «Дочурки мячик...»: [Вершы] / Пер. А. Вершинский // Мол. гвардия. 1984. № 10; Песня комбайнера: [Верш] / Пер. А. Вершинский // Я твой поэт, моя страна. М., 1985; «У Днепра, где смерть солдат косила...»; Белорусы: [Вершы] / Пер. Г. Калашников // Шел отец... М., 1985.

На ўкраінскую мову. «Коли чітаю Кулешова...»: [Верш] / Пер. М. Пшеничній // Дніпро. 1981. № 2; Батьківщина; Нема солдатів безіменних; Про солов'їв; Дід відплив... [Вершы] / Пер. М. Пшеничній // Молодь України. 1982. 2 вер.; Батьківщина; Рідне слово: [Вершы] / Пер. М. Пшеничній // Зміна. 1985. 19 вер.

М. П. Барташэвіч.

МАЦВЕЕНКА УЛАДЗІМІР

Мацвеенка Уладзімір Іванавіч (н. 17.8.1928, Мінск), паэт. Член СП Беларусі з 1992.

Нарадзіўся ў рабочай сям'і. У 1936 паступіў у Мінскую СШ № 11, дзе да вайны паспеў скончыць 5 класаў. У час вайны заставаўся з сям'ёй (маці, брат і сястра, бацька памёр у 1941) у акупіраванай сталіцы. У 1946 скончыў сямігодку і стаў студэнтам Мінскага палітэхнікума. У 1948—51 служыў у войску. Вярнуўшыся, працаваў рэтушорам-травільшчыкам, потым старшым інжынерам аддзела камплектацыі на Мінскім прыладабудаўнічым заводзе. Адначасова вучыўся на вячэрнім аддзяленні Мінскага медвучылішча, якое скончыў у 1956, атрымаўшы прафесію зубнога тэхніка. З 1958 працаваў зубным тэхнікам у Мінскай стаматалагічнай паліклініцы № 3, з 1963 — тэхнікам-артадонтам у Мінскай абласной стаматалагічнай паліклініцы.

Літаратурнай працай займаецца з 1973. Пачынаў як лірык. Аднак на пэўны час перапыніў творчую дзейнасць і вярнуўся да яе ўжо ў сталым узросце як дзіцячы пісьменнік, сатырык. Яго вершы для дзяцей, эпіграмы, сатырычныя творы друкаваліся ў «Вожыку», «Бярозцы», «Вясёлцы», «Пралесцы», «Работніцы і сялянцы», «Беларусі», увайшлі ў такія папулярныя зборнікі твораў для дзяцей і юнацтва, як «Заранка» (1987), «Цвіце верас» (1987), сатырычны зборнік «Асцюкі за каўняром» (1989) і інш. Асабліва плённа супрацоўнічае з часопісам «Вожык», у біблія-

тэчцы якога выйшлі яго кнігі «Лекі без аптэкі» (1987), «Азбука ў загадках» (1992), «Загаданачка» (1993). Кніжка для дзяцей «Сябрынка» не толькі змяшчае займальныя загадкі, метаграмы, шарады, лічылкі, але і дае парады маленькім чытачам, як іх стварыць самім. Творы У. Мацвеенкі вылучаюцца тонкім і добрым гумарам, забаўляльнасцю, вынаходлівасцю.

Жыве ў Мінску.

Г. М. Кісліцына.

Бібліяграфія

1.2.

Лекі без аптэкі: Вершы, байкі, карацелькі. Мн., 1987.
Загадкі Зайкі-загадайкі: Вершы. Мн., 1990.
Азбука ў загадках. Мн., 1992 (Б-ка «Вожыка»).
Загаданачка. Мн., 1993.
Сябрынка. Мн., 1995.

1.3.

1973. Распарадчык: [Верш] // Вожык. № 19.

1974. Хамячок: Байка / Вожык. № 2; Дапякае: [Сатыр. верш] // Там жа. № 19; Закаханы; Прагаварыўся; Цуд: [Байкі] // Там жа. № 22.

1975. «Снайпер»: [Верш] // Бярозка. № 10; Спец; Гукаў лоўніца; «Прычыны»: [Сатыр. вершы] // Мін. праўда. 24 жн.; Мядзведзь-лайдак: [Байка] // Там жа. 16 ліст.

1976. «Турнэ»: [Верш] // Беларусь. № 11; Падзякаваў; Знайшоўся; Супакоіў: Мініяцюры // Вожык. № 6; Хто вінаваты?: Гумарэска // Работніца і сялянка. № 4; Пралічыўся; Важкі аргумент: [Гумарыст. вершы] // Вяч. Мінск. 20 жн.; Перастараўся; Перасеў: [Вершы] // ЛіМ. 13 лют.; Жаба і жабяня: Байка // Мін. праўда. 28 сак.; Ліс і барсук; [Байка] // Там жа. 25 крас.; Нахлебнік: [Сатыр. верш]; Кот і кошка: [Байка] // Там жа. 25 ліп.

1977. Сіла волі; І больш нічога: [Жарты] // Беларусь. № 5; Добранькі бабёр: [Жарт] // Там жа. № 8; Маладыя бацькі; Дапамог: [Вершы] // Работніца і сялянка. № 10; Пачатковец: [Верш] // ЛіМ. 18 сак.; Лісты ад сыноў; Падхалім; Вырас; І... больш нічога: [Сатыр. вершы] // Мін. праўда. 11 вер.

1978. Сакрэт; Зноў гора; Бо рэдкая: [Вершы] // ЛіМ. 1 вер.; Пакрытыкаваў: [Верш] // Там жа. 27 кастр.

1979. Не той колер: [Верш] // Беларусь. № 2; Не забілі; Такая арыфметыка: [Гумарыст. вершы] // Там жа. № 3; Вылечыў: [Гумарыст. верш] // Вожык. № 3; Добрае сэрца; «Пакараў»; Бо рэдкая: [Сатыр. вершы] // Там жа. № 13; Хто каго баіцца: [Верш] // Там жа. № 24; Хто галоўны?: [Верш] // Работніца і сялянка. № 11; Складаная сітуацыя; Дыяш: Вершы // ЛіМ. 1 чэрв.; Ашукалі: [Верш] // Там жа. 28 вер.; Не той колер; Радыкуліт падвёў; Нездагадлівы: [Сатыр. вершы] // Мін. праўда. 4 лют.

1980. Валерка і люстэрка: [Гумарыст. верш] // Вожык. № 5; З гарантыяй; Пралічыўся: Байкі // Там жа. № 13; Анатомія падвяла: [Гумарыст. верш] // Там жа. № 16; Варатар: [Верш] // Вясёлка. № 5; Запрашэнне: [Верш] // ЛіМ. 25 ліп.; Апраўданне прадаўца; Размова; «Меламан»: [Вершы] // Там жа. 1 жн.; Запытанне ў адказ; Без лішніх слоў: [Вершы] // Там жа. 26 вер.

1981. Хто зялёнымі вачамі...; [Загадка] // Вясёлка. Мн.; Саўка-будаўнік; Мурзілка; Гімнастка; Юныя фігурысты; Джаз; Прадбачлівы; Спявачка: [Вершы] // Бярозка. № 3:, Мой сябар Тузік: [Вершы] // Вожык. № 9; Жучка і Свіння; Вось яно што: [Байкі] // Там жа. № 21; Аматар: [Верш] // ЛіМ. 8 лют.

1984. Аплявуха; Сакрэт пяшчотнасці: [Сатыр. вершы] // Вожык. № 7; Пакараў: [Верш] // Ніва. 6 мая.

1985. Нясун: [Верш-гумарэска] // Беларусь. № 3; Вожык. № 5; «Мядзведзі»: [Верш] // Голас Радзімы. 19 снеж.; Віндсерфінг: [Верш] // Бярозка. № 9; Аплявуха: [Верш] // Ніва. 14 ліп.; Хаўроння на лекцыі: [Байка] // Там жа. 21 ліп.; Усё проста: [Міні-верш] // Там жа. 20 кастр.; Сакрэт пяшчотнасці: [Гумарыстычны верш] // Там жа. 3 ліст.

1.5.

На ўкраінскую мову. Сюрпрыз: [Сатыр. верш] / Пер. І. Немирович // Літ. Україна. 1976. 21 трав.: З свідком та без: [Гумарыст. верш] / Пер. І. Немирович // Молода гвардія. 1977. 20 лют.; З дружиною — свідком і без неї: [Жарт. верш] / Пер. В. Косяченко // Рад. Буковина. 1979. 25 лют.

М. П. Барташэвіч.

МІНСКЕВІЧ СЯРГЕЙ

Мінскевіч Сяргей Леанідавіч (псеўд. Г. Катрынка; н. 12.2.1969, Мінск), паэт, празаік. Сябра Таварыства вольных літаратараў Беларусі з 1993.

Нарадзіўся ў сям'і вучоных (бацька — батанік, маці — хімік). У 1986 С. Мінскевіч скончыў фізіка-матэматычную СШ № 50 у Мінску. Працаваў аператарам электронна-вылічальных машын у Праектна-тэхналагічным інстытуце аўтаматызацыі сістэм «Ніва». Пасля службы ў войску быў лабарантам у Інстытуце гісторыі АН Беларусі, удзельнічаў у археалагічных экспедыцыях. У 1989 паступіў на філалагічны факультэт БДУ. Супрацоўнічае з «Вольнай сцэнай». Акцёр народнага тэатра «Жывая планета».

Першыя вершы С. Мінскевіча з'явіліся ў 1990 у літаратурнай падборцы «Крыніцы» газеты «Чырвоная змена». Друкаваўся ў газетах «Чырвоная змена», «Беларускі універсітэт», штотыднёвіку «Літаратура і мастацтва», часопісе «Маладосць», у літаратурных альманахах «Кола», «Ксэракс беларускі», зборніках «Дзень паэзіі». У выдавецтве «Полацкае ляда» пабачыла свет кніга яго вершаў «Праз Галерэю». Пераклаў 4-ю частку паэмы «Дзяды» А. Міцкевіча, фрагменты якой уключаны ў яго п'есу «І здасца мне, што не прайшлі вякі», напісаную для паэтычнага тэатра аднаго акцёра «Зьніч». Як празаік, гумарыст-сатырык, фантаст друкаваўся на старонках газет «Студэнцкая думка», «Прыкольная газета», «Оска», «Чырвоная змена», часопісаў «Зрок», «Маладосць», «Першацвет». Па радыё гучалі яго радыёпастаноўкі фантастычных і гумарыстычных апавяданняў. Выступае як даследчык мастацкалітаратурнага метаду — транслагізму. Аўтар артыкула-маніфеста «У глыбіню праз далягляд (Што такое транслёгізм?)». Адзін з аўтараў калектыўных зборнікаў прозы на рускай мове (перакład з беларускай) «Пастка» (Мн., 1993), «Заўдавелы імператар» (Слуцк, 1994), Аўтар кнігі кароткіх апавяданняў «Абсурдэлькі (Збор І)» (Мінск, 1994), дзе іранічна выпісаны неверагодныя, непадуладныя элементарнай логіцы, а таму абсурдныя здарэнні, якія адбываюцца ў грамадстве ў час пераходу ад таталітарнага да посттаталітарнага ладу жыцця.

Жыве ў Мінску.

С. Г. Адамовіч.

Бібліяграфія

1.2.

Ловушка. Мн., 1993 / У сааўт. Пад псеўд. Г. Катрынко.

Абсурдэлькі (Збор І): Кароткія апавяданні. Мн., 1994.

Вдовствующий император. Слуцк, 1994 / У сааўт. Пад псеўд. Г. Катрынко.

С. Г. Адамовіч.

МІНЧАНКА МІКОЛА

Мінчанка Мікола (Мікалай Нікіфаравіч, н. 10.3.1942, в. Кавалёўка Клімавіцкага р-на Магілёўскай вобл.), паэт, празаік, публіцыст. Член СП Беларусі з 1993.

Нарадзіўся ў сялянскай сям'і. Гадавала яго маці (бацька загінуў на фронце). Вучыўся ў пачатковай школе в. Кавалёўка, у Звянчацкай сямігодцы, скончыў Міласлаўіцкую СШ (1959). Працаваў загадчыкам Кавалёўскага сельскага клуба, служыў у войску. У 1964—68 студэнт Жытомірскага педагагічнага інстытута. З 1969 працаваў фотакарэспандэнтам, літработнікам, загадчыкам аддзела пісем у Клімавіцкай газеце «Новае жыццё». З 1971 карэспандэнт-арганізатар, з 1979 дыктар Клімавіцкага радыёвяшчання. Завочна вучыўся ў Мінскай Вышэйшай партыйнай школе. У 1981 вярнуўся адказным сакратаром у Клімавіцкую райгазету, з 1988 галоўны рэдактар гэтай газеты. Шмат працуе з моладдзю, доўгія гады ўзначальвае літаб'яднанне «Зарніцы»

пры газеце. Лаўрэат прэміі Ленінскага камсамола Магілёўшчыны за 1977.

Літаратурнай працай займаецца з 1956. У абласным і рэспубліканскім друку змяшчае вершы з 1967. Яго вершы ўвайшлі ў калектыўныя зборнікі «Галасы Прыдняпроўя», «Адданасць», «Дняпроўскія хвалі» і інш. Аўтар паэтычных кніг «Зялёны звон» (1971), «Давер» (1980), «Ліпацвет» (1993). Для вершаваных твораў М. Мінчанкі характэрны народная напеўнасць, чысціня гучання. Працоўныя будні сучасніка, харство айчыннага краю, прыгажосць душэўных памкненняў чалавека — асноўныя матывы яго паэзіі. Рэалістычная канкрэтнасць назіранняў у ёй гарманічна спалучаецца з лірыка-спавядальнай інтанацыяй. Яго вершы перакладаліся на ўкраінскую мову.

Жыве ў г. Клімавічы. *Г. М. Кісліцына.*

Бібліяграфія

1.2.

Зялёны звон: Вершы. Мн., 1971 (Першая кніга паэта). Рэц.: Гречаникова А. Крылья крепнут в полёте // Неман. 1972. № 2; Звонак А. Да вяршынь паэзіі // Полымя. 1972. № 7; Пысін А. І добра ўсё-такі, што ёсць каваль, пярун, зямля і неба // Маг. праўда. 1972. 29 студз.; Раков В. // Сел. газ. 1972. 19 янв.

Давер: Вершы, гумар. Мн., 1980. Рэц.: Дабранскі І. Танаж даверу // Маг. праўда. 1981. 15 крас.; Прудніка ў П. [«Кнігапіс»] // ЛіМ. 1981. 7 жн.

Ліпацвет: Вершы. Мн., 1993.

1.3.

1967. Сутнасць: [Верш] // Маг. праўда. 5 сак.

1968. Зямлі; «У жыцця мажорныя акорды...»: [Вершы] // Сел. газ. 3 дек.; Жар-птушка: [Верш] // Чырв. змена. 18 жн.

1969. Хата пад вязамі: [Верш] // Маг. праўда. 14 студз.; Порах трымаць сухім: [Верш] // Сел. газ. 14 марта; Дождж: [Верш] // Там жа. 17 авг.; Непаўторнае ранне; Падковы шчасця; Човен; Вяртанне: [Вершы] // Чырв. змена. 30 студз.

1970. Спадчына; Хата мая пад вязамі; Родны край: [Вершы] // Звязда. 28 чэрв.; Маё пакаленне; Эцюд; Магія: [Вершы] // Маг. праўда. 25 ліп.; Шчасце: [Верш] // Сел. газ. 15 нояб.; Шафёры; «А ці добрыя, цётка, вішні...»: [Вершы] // Чырв. змена. 17 вер.

1971. Атлант; «Новы сум і боль таксама новы...»: [Вершы] // Маладосць. № 4; Спадчына; На такавішчы; Дзядзька: [Вершы] // Голас Радзімы. № 38; «Паміралі родныя пад дуламі...»: [Верш] // Звязда. 21 кастр.; Спадчына: [Верш] // ЛіМ. 23 крас.; Атлант: [Верш] // Маг. праўда. 16 студз.; Шафёры; Крылы: [Вершы] // Сел. газ. 17 янв.; Хата мая пад вязамі...: [Верш] // Там жа, 14 марта; Эцюд: [Верш] // Там жа. 18 апр.; Радуемся шчыра: [Верш] // Там жа. 29 авг.; «Я цябе парою дакараю...»; «Зараслі травой акопы...»; «Сасоннік...»: [Вершы] // Чырв. змена. 20 ліп.; «Дажынаюць лета конікі...»: [Верш] // Там жа. 19 вер.

1972. Каб не забыць; Колер вачэй; «На дасвецці з сасновага бору...»: [Вершы] // Маг. праўда. 16 чэрв.; Рукі маці: [Верш] // Чырв. змена. 22 кастр.

1973. Экзамены: [Верш] // Дзень паэзіі — 73. Мн.; Звязда. 4 сак.; Хадзіў хлопец да дзяўчыны: [Верш]. З народнага // Маг. праўда. 3 сак.; Родныя напевы; Лес; Узлёт: [Вершы] // Там жа. 27 лют.; Выстаім!: [Верш] // Там жа. 6 ліст.; Узлёт: [Верш] // Сел. газ. 8 апр.; «Дваццаты век, і ты шчэ не салодкі...»: [Верш] // Чырв. змена. 14 студз.

1974. Абеліскі: [Верш] // Чырв. змена. 17 вер.

1975. Крылы: [Верш] // Беларусь. № 8; Ранне: [Верш] // Маг. праўда. 19 ліп.; Буслава вяселле: [Верш] // Там жа. 28 жн.

1976. Бабры: [Верш] // Вясёлка. № 4; На новабудоўлі; Радзіны; Сяброўства; Зоркі: [Вершы] // Звязда. 7 студз.; Вечны агонь; Жытнёвае мора; «Прад вачыма зноў усё мінулае...»: [Вершы] // Там жа. 29 ліп.; Вышэйшае права; «Дзетак радасны смех...»; «Столькі гора мною перажыта...»; На талацэ; «Ручайком імклівым зноўку мкне...»; «Навальніца лютуе. Змок я ўвесь...»; «Хацеў бы ты ці не хацеў...»: [Вершы] // Маг. праўда. 29 студз.; «Вечны агонь...»; «Кожная думка, якую ты вычытаў...»; «Сонца грае, выглядае...»: [Вершы] // Там жа. 24 ліп.; На будоўлі; Хатынь; «У свет прасторны прыходзяць дзеткі...»: [Вершы] // Там жа. 10 вер.; Мой род; «Гляджу на свет — не надзіўлюся...»; «Адным усё даецца лёгка ў жыцці...»; «Я хачу, каб ты быў смелы...»; «Першая сустрэча...»: [Вершы] // Там жа. 30 кастр.; Дуб: [Верш] // Там жа. 8 снеж.; Зоркі: [Верш] // Сел. газ. 11 апр.; Снегапад: [Верш] // Чырв. змена. 31 кастр.

1977. Варатар, не плач!: [Верш] // Бярозка. № 9; Чырвоныя коннікі: [Верш] // Там жа. № 11; Атлант; Асенні эстамп; Сляды: [Вершы] // Полымя. № 12; Калыханка: [Верш] // Работніца і сялянка. № 2; Дняпро: [Верш] // ЛіМ. 17 чэрв.; Расце Масік: Гумарэска // Там жа. 2 вер.; «Ударылі ўвосень маразы...»; «Нарэшце ісціну прызнаў Максім...»; «Нарэшце, узяўся Клім за справу...»; «Са мной паасцярожней, кажа дым...»; «Зязюля лічыць нам гады...»; «Хваліў сабак сваіх Раман...»: [Мініяцюры] // Маг. праўда. 2 крас.; Кліча сонца; «Ты мне хацела расказаць...»; «Сінее чысты далягляд...»; Сыну: [Вершы] // Там жа. 20 жн.; Адведзіны: [Верш] // Там жа. 12 ліп.; «Радзіма любая! Ты столькі бедавала...»; «Пасля дарог, пасля разлук...»; «У імгненні кожным нешта ёсць...»: [Вершы] // Там жа. 29 ліст.; Мой род: [Верш] // Чырв. змена. 27 лют.

1978. Экзамены: [Верш] // Адданасць. Мн.; «Ты паглядзі, на ўзлессі верасы...»; Мой род: [Вершы] // Дзень паэзіі — 78. Мн.; Чырвоная конніца: [Верш] // Полымя. № 2; Мне маці казала; «Ты мне хацела расказаць...»; Плачуць зоры: [Вершы] // Маладосць. № 6; Як я ваякаў напалохаў: Гумарэска // ЛіМ. 17 лют.; Выручае бобік: Гумарэска // Там жа. 24 лют.; Радзіма: [Верш] // Там жа. 27 кастр.; «Жыццё з вачэй пачынаецца...»; «Снег блакітны — у вачах шчаслівых...»; «Дагараюць зоры, дагараюць...»; «Я рада, сынок: так хутка сталееш...»: [Вершы] // Маг. праўда. 6 крас.; Васількі: Паэма // Там жа. 18 кастр.; Дым; Кароткае імя; Цыбуля; Прамаўчала; Праўда пчалы: Кароткія байкі // Чырв. змена. 25 студз.; «Мой род — ад веку праўдалюбы...»: [Верш] // Там жа. 28 лют.; Роднае: [Верш] // Там жа. 5 ліст.

1979. Была вайна...: [Верш] // Звязда. 13 студз.; Цішыня: [Верш] // Там жа. 31 сак.

1980. «Наш карабель — надзея маладая...»; «Не трымайце птушак у няволі...»; «Калі злуюць на моры хвалі...»; «Вядома, што трава расце з зямлі...»; «Не ўсе пакошаны лугі...»; «Ад бяссоння зоры зябнуць...»; «Дзень, як птушка з белымі крыламі...»; «Рой камароў над табой...»; «А твой увесь тавар...»; «Такая музыка ў тваіх вачах...»: [Вершы] // Маладосць. № 1; «У шчасця тонкае крыло...»: [Верш] // ЛіМ. 2 мая; Падарожжы паэта: [Рэц. на кн.: Прудніка ў П. Прысады Мн., 1979] // Маг. праўда. 3 студз.

1981. «Балюе восень разоў восем...»; Вольхі; «Адгуляла ў полі сцюжа-замець...»; Вяселле: [Вершы] // Маладосць. № 10; Дамоў; Сон; Два берагі; «Ноч. Паўстанак. І цягнік...»; «Пасля дарог, пасля разлук...»: [Вершы] // Полымя. № 7; «Не змяніў я вёску на сталіцу...»; Размова з калінай; Каляровыя сны: [Вершы] // ЛіМ. 4 вер., Вольхі: [Верш] // Маг. праўда. 25 сак.; Магілёў; «Дзе ты, восень з жоўтымі маністамі?..; «Учора — сонца залатое...»; Роздум: [Вершы] // Там жа. 23 мая; Салаўіны голас: [Верш] // Там жа. 4 вер; Працяг; Абнаўленне: [Вершы] // Там жа, 16 кастр.; Дзед; «Я па горадзе хадзіла...»: [Вершы] // Там жа. 2 снеж.; «У шчасця — тонкае крыло...»: [Верш] // Чырв. змена. 10 студз.

1982. Начны дождж; «Калі ляцяць у вырай жураўлі...»: [Вершы] // Маг. праўда. 3 лют.; Купала; Дзень юнацтва; Назаўжды: [Вершы] // Там жа. 24 мая; Узаемасувязь; Як была малодзенькай; Заўсёды да людзей: [Вершы] // Там жа. 26 чэрв.; Украіне; Дружба; Рэчка:

[Вершы] // Там жа. 10 ліп.; Зямное прыцягненне: [Вершы] // Там жа. 31 жн.

1983. Мы с Сярожам: [Верш] // Бярозка. № 8; Няўжо?; Рак раку; Прынцып Агаты; Певень і курыца: Мі

Бібліяграфія

1.2.

Мужчынскія сакрэты: Апавяданні і гумарэскі. Мн., 1981 (Б-ка «Вожыка»).

1984. У Мірскім замку; Сыну: [Вершы] // Дзень паэзіі — 84. Мн.; З франтавых дарог: [Рэц. на кн.: П р ы х о д з ь к а П. Парог памяці. Мн., 1983] // ЛіМ. 29 чэрв.; «Зноў няхай разбудзіць бусел»; «Закаласіцца жыта»; «Ёсць у цябе трывога»; «Я прыйду дамоў»; «Хутка восень. Сум і прыгажосць»; «Што стала песняй і дарогай»: [Вершы] // Там жа. 23 ліст.; Шанаваць жывых і помніць пра мёртвых // Там жа. 7 снеж.; Каменная балада: [Верш] // Чырв. змена. 4 жн.

1985. Не з месяца звалiліся: Рэпартаж з незвычайнага музея // Беларусь. № 2; Душа на словы адзавецца: [Рэц. на кн.: Г а л у б о в і ч Л. Таемнасць агню. Мн., 1984] // Маладосць. № 6; Шчыры дар душы: [Рэц. на кн.: М а л я ў к а М. Дар. Мн., 1985] // ЛіМ. 9 жн.

2.3.

На беларускай мове. М а р ц і н о в і ч А. На мяжы пошукаў і адкрыцця // Звязда. 1985. 19 ліп.

М. П. Барташэвіч.

РУБЛЕЎСКАЯ ЛЮДМІЛА

Рублеўская Людміла Іванаўна (н. 5.7.1965, Мінск), паэтэса. Член СП Беларусі з 1990.

Нарадзілася ў сям'і служачых. Яе бацька, Іван Іванавіч, інжынер-электрык, маці, Галіна Мікалаеўна, працавала медыцынскай сястрой, выхавацельніцай, пісала вершы. Пасля заканчэння 8 класаў 16 сярэдняй школы г. Мінска Л. Рублеўская паступіла ў Мінскі архітэктурна-будаўнічы тэхнікум, пасля заканчэння якога (1984) працавала па спецыяльнасці ў праектна-канструктарскім бюро ВА «Гарызонт». У 1986 паступіла на аддзяленне паэзіі Літаратурнага інстытута імя М. Горкага, праз год перавялася на беларускае аддзяленне філфака БДУ (скончыла ў 1994). Працавала літкансультантам у «Народнай газеце», з 1993 рэдактар аддзела крытыкі часопіса «Першацвет».

Першы верш надрукавала на рускай мове ў 1983 у газеце «Знамя юности». Друкавалася ў газетах «Чырвоная змена», «Літаратура і мастацтва», часопісах «Маладосць», «Беларусь», «Полымя», «Работніца і сялянка», «Першацвет», альманаху «Дзень паэзіі». У 1990 выйшлі зборнікі яе вершаў «Крокі па старых лесвіцах» і «Адукацыя», у 1992 — «Замак месячнага сяйва». Аўтар драматычных паэм «Пасля Цэзара», «Першы запавет», п'есы для дзяцей «Янук, рыцар Мятлушкі», цыкла казак «Прыгоды мышкі Пон-Пік». Адну з сваіх творчых задач паэтэса бачыць у рамантызацыі мінулага нацыі — ад Ефрасінні Полацкай да Валянціна Таўлая. Інтэлектуалізацыя паэзіі, вера ў яе сакральную ролю, філасофскае асэнсаванне быцця, максімальная шчырасць, спроба вырашыць праблему самаідэнтыфікацыі нацыі праз стварэнне беларускага нацыянальнага міфа — характэрныя рысы творчасці паэтэсы. Выступае ў друку і на радыё з артыкуламі і рэцэнзіямі па пытаннях сучаснага літаратурнага працэсу.

Жыве ў Мінску.

В. У. Смольская.

Бібліяграфія

1.2.

Адукацыя: Вершы. Мн., 1990.

Крокі па старых лесвіцах: Вершы. Мн., 1990 (Б-ка час. «Маладосць»).

Замак месячнага сяйва: Вершы. Мн., 1992.

1.3.

1983. Воспоминания о море: [Вершы] // Знамя юности. 10 нояб.

1984. Про то, как я была взрослой: [Вершы] // Знамя юности. 21 окт.

1985. День рождения; «Чтобы чувствами мы спаслись...»; «Жди теперь! И я молчу и жду...»; «Мир называет меня...»; «Жизнь права. Она всегда права...»; «От нас зависит...»: [Вершы] // Знамя юности. 5 июля.

М. П. Барташэвіч.

САВЕРЧАНКА ІВАН

Саверчанка Іван Васілевіч (н. 2.4.1962, в. Маліноўка Касцюковіцкага р-на Магілёўскай вобл.), літаратуразнавец, гісторык. Кандыдат філалагічных навук (1989).

З сялянскай сям'і. Бацька, Васіль Емяльянавіч, і маці, Ксенія Міхайлаўна, змалку прывучалі ўсіх пецярых дзяцей да цяжкай сялянскай працы. Выхаваннем займаліся таксама дзед, Емяльян Навумавіч, і бабуля, Акуліна Несцераўна, якія далучалі ўнукаў да паэтычных скарбаў жывога беларускага слова. Пачатковую школу І. Саверчанка скончыў у в. Боні, дзесяцігодку — у в. Бялынкавічы (1979). Школьнікам пачаў пісаць вершы. Пасля заканчэння ў 1983 філалагічнага факультэта Магілёўскага педінстытута паступіў у аспірантуру пры Інстытуце літаратуры імя Я. Купалы АН Беларусі. Пасля службы ў войску (1984—85) працягваў навучанне ў аспірантуры. З 1988 навуковы супрацоўнік Інстытута літаратуры, дзе даследуе старажытную беларускую літаратуру эпохі Адраджэння і барока. Апублікаваў грунтоўныя навуковыя манаграфіі пра старажытную паэзію Беларусі 16—1-й паловы 17 ст., пра Сымона Буднага. Вынікам вывучэння культурнага ўзаемадзеяння славянскіх народаў з'явіўся раздзел «На сумежжы культур: Рэнесанс, Рэфармацыя і ранняе барока» ў калектыўных «Нарысах па гісторыі беларуска-рускіх літаратурных узаемасувязей» (1993, т. 1). Аўтар навукова-папулярных кніг і артыкулаў пра Францішка Скарыну, Льва Сапегу, Астафея Валовіча, Іпація Пацея, Іосіфа Вельяміна-Руцкага, Андрэя Рымшу і інш., а таксама альтэрнатыўнай праграмы па старажытнай беларускай літаратуры для сярэдніх школ. Актыўна выступае ў друку як папулярызатар пісьмовай спадчыны беларускага народа. Перакладае з старабеларускай і старапольскай моў.

Жыве ў Мінску. *В. А. Чамярыцкі.*

Бібліяграфія

1.2.

Астафей Валовіч (каля 1520—1587): [Гіст.-біягр. нарыс]. Мн., 1992 (Б-ка газ. «Голас Радзімы»).

Астафей Валовіч: Гістарычна-біяграфічны нарыс. Мн., 1992.

Канцлер Вялікага Княства: Леў Сапега. Мн., 1992.

Старажытная паэзія Беларусі: XVI — першая палова XVII ст. Мн., 1992.

Сымон Будны — гуманіст і рэфарматар. Мн., 1993.

Апостал яднання і веры: Язэп Руцкі. Мн., 1994.

1.3.

1984. Для гісторыкаў культуры: [Рэц. на кн.: Беларусь у друку XIX — пачатку XX стагоддзя. Мн., 1983] // ЛіМ. 18 мая.

1.6.

Гарэцкі М. Гісторыя беларускае літаратуры. Мн., 1992 / Камент.

Анталогія беларускай паэзіі. Мн., 1993. Т. 1 / Камент. і скл. з інш. *М. П. Барташэвіч.*

САКОВІЧ АЛЯКСАНДРА

Саковіч Аляксандра [сапр. Іна Рытар, па мужу Каханоўская, Іна Рытар-Каханоўская; псеўд. А. Саковіч, Б. Еўтух; н. 14(27).12.1906, г. Адэса], празаік.

Нарадзілася ў сям'і беларусаў, якія паходзілі з мяст. Ярэмічы на Навагрудчыне. Бацька служыў на адэскай чыгунцы, маці выхоўвала дзяцей (трох дачок і сына). Кожнае лета маці з дзецьмі праводзіла ў Ярэмічах. Замілаваннем і любоўю да роднага кута надзяліла яна і сваіх дзяцей, таксама як і любоўю да кніг (у доме была даволі багатая бібліятэка). З 6 гадоў Іна вучылася ў Адэскай жаночай гімназіі. У сувязі з цяжкім матэрыяльным становішчам (1-я сусветная вайна, рэвалюцыя, грамадзянская вайна) старэйшая сястра Ліда ў 1921 забрала Іну да сябе ў Мінск. Тут яна скончыла педтэхнікум, у 1925 паступіла ў Беларускі дзяржаўны універсітэт, пасля заканчэння якога працавала ў 1929—30 выкладчыцай на рабфаку пры БДУ. У 1930 выйшла замуж і пераехала ў Маскву, дзе працаваў муж. Неўзабаве ён быў арыштаваны і ў 1937 высланы на Калыму, пакінуўшы жонку з двухгадовай дачкой. Баючыся арышту, А. Саковіч вярнулася на Беларусь, настаўнічала ў Ярэмічах (1939—42), працавала ў Навагрудскай настаўніцкай семінарыі (1942—44). У 1944 выехала ў Германію, дзе жыла ў лагеры перамешчаных асобаў (1944—50). Пасля смерці дачкі выехала ў ЗША. Працавала на фабрыцы ў Нью-Йорку (1950—55), вучылася, удзельнічала ў жыцці беларускага зямляцтва. Выйшаўшы замуж за А. Каханоўскага, пераехала з ім у Кліўленд (1955), дзе заснавалася беларуская калонія (культурны цэнтр «Полацак») і дзе актыўна ўключылася ў эмігранцкі беларускі рух і творчую працу.

Літаратурную дзейнасць А. Саковіч пачала з успамінаў і артыкулаў. Першыя публікацыі («Менск у 1930—1931 гадах» і інш.) з'явіліся ў газеце «Раніца», 1944). Яна аўтар шматлікіх апавяданняў, аповесцяў «Браты», «Паміж Сцылай і Харыбдай». У 1986 выйшаў аднатомнік апавяданняў і аповесцяў А. Саковіч «У пошуках праўды». Асноўная тэматыка яе мастацкіх твораў — жыццё Беларусі ў цяжкі перыяд сталінскіх рэпрэсій, другой сусветнай вайны. Яны ўражваюць уменнем дакладна перадаць тагачасную грамадскую атмасферу праз унутраную сутнасць герояў, іх пачуцці, трывогу.

Жыве ў Кліўлендзе (ЗША). *Л. С. Савік.*

Бібліяграфія

1.2.
Браты: Аповесць. Саўт Рывер, 1973.
У пошуках праўды. Ню-Ёрк; Кліўленд, 1986.

1.3.
1952. Беларусы ў Адэсе // Веда. № 5; Прафесар Мітрафан Доўнар-Запольскі // Там жа. № 7.
1953. Прафесар Пётра Бузук // Беларус. № 3.
1954. Да гісторыі Беларускага дзяржаўнага універсітэта // Запісы. № 1.
1957. Мы з аднэй сям'і: Апавяданне // Бацькаўшчына. № 51—52.
1958. Лістападаўцы: З успамінаў // Бацькаўшчына. № 29—30; У няведам'е: Апавяданне // Конадні. № 5—6.
1959. Шчасце: Апавяданне // Бацькаўшчына. № 11—12.
1961. Асірочаныя: Апавяданне // Бацькаўшчына. № 12—13.
1963. На суд гісторыі // Конадні. № 7 / Пад прозв. І. Рытар.
1965. Язэп Лёсік // Бел. думка. № 8.
1966. Петрыкаў тата: Апавяданне // Бел. думка. № 9.
1967—1968. Браты: Аповесць: // Бел. думка. № 10—11.
1969—1972. Браты: Аповесць // Бел. думка. 1969—1970. № 12—13; 1971—1972. № 14.
1973—1974. Вяселле: Апавяданне // Бел. думка. № 16—17.
1976. Міхайла Грамыка: Успаміны // Беларус. № 115 / Пад прозв. І. Рытар; На захад: Апавяданне // Там жа. № 229.
1977. Кожнаму сваё: Апавяданне // Беларус. № 239, 240; Паміж Сцылай і Харыбдай: Аповесць // Бел. думка. № 21—22.
1978. Воўчае вока: Апавяданне // Беларус. № 253.

1979. Паміж Сцылай і Харыбдай: (Працяг) // Бел. думка. № 23; 1980. № 24.

1982. [Успаміны] // Янка Купала і Якуб Колас. 1882—1982. Вянок успамінаў пра іх. Гранд Рапідс; Паміж Сцылай і Харыбдай: (Працяг) // Бел. думка. № 25—26.

1983. З беларускім сэрцам, думай... // Беларус. № 311, 312, 313 / Пад прозв. І. Рытар-Каханоўская; Паміж Сцылай і Харыбдай: (Працяг) // Бел. думка. № 27—28; 1985. № 30.

1.5.

На рускую мову. На суд истории / С бел. // Неман. 1992. № 7 /Пад прозв. І. Рытар; Якуб Колас: [Успаміны] // Там жа. 1992. № 10 / Пад прозв. І. Рытар.

Т. М. Махнач.

САЎЛІЧ УЛАДЗІМІР

Саўліч Уладзімір Уладзіміравіч (н. 1.9.1951, в. Мацясы Глыбоцкага р-на Віцебскай вобл.), драматург. Член СП Беларусі з 1994.

Нарадзіўся ў сям'і калгаснікаў. У 1968 скончыў сярэднюю школу і паступіў на беларускае аддзяленне БДУ (скончыў у 1973). З 1973 працаваў настаўнікам беларускай мовы і літаратуры ў Азярцах Глыбоцкага р-на, з 1976 карэспандэнтам абласной газеты «Віцебскі рабочы».

Першае апавяданне У. Саўліча «Горкі яблык» надрукавана ў раённай газеце ў 1968. Аўтар п'ес «Халімон камандуе парадам» (1986, паст. Слонімскім народным тэатрам), «Адзін Гаўрыла ў Полацку» (1990), «Сабака з залатым зубам» (1992, паст. Беларускім тэатрам імя Янкі Купалы).

Жыве ў г. Глыбокае.

В. У. Смольская.

Бібліяграфія

1.2.

Халімон камандуе парадам: П'есы. Мн.; 1994.

1.3.

1982. Халімон на тэлебачанні: Гумарыст. апавяданне // Віцеб. рабочы. 19 сак.; Халімон у пастцы: Гумарыст. апавяданне // Чырв. змена. 11 снеж.

1984. Ударное звено; Белорусская Ангелина: [Нарысы] // Знаменосцы Трудовой славы. Мн., Халімон у пастцы: Гумарэска // Маладосць. № 7.

М. П. Барташэвіч.

САЧКО ЗОСЯ

Сачко Зося (н. 18.7.1955, в. Волька Беластоцкага ваяв., Польшча), паэтэса. Член Саюза польскіх пісьменнікаў з 1992. Піша на беларускай, украінскай і польскай мовах, на бельскай гаворцы, пераходнай паміж беларускай і ўкраінскай мовамі.

З сялянскай сям'і. Закончыла агульнаадукацыйны ліцэй імя Т. Касцюшкі ў Бельску-Падляскім і аддзяленне рускай філалогіі Люблінскага універсітэта. Працавала настаўніцай на Беласточчыне і ў Варшаве. З 1981 зноў на Беласточчыне.

Дэбютавала вершам «Падарунак», змешчаным у 1970 у беластоцкай «Ніве». Потым пачала пісаць па-польску (вершы ў часопісе «Радар»). Урэшце ў 1972 звярнулася да гаворкі, пашыранай на радзіме, у ваколіцах мястэчка Орля. У 1982 выдала зборнік вершаў «Пошукі». Вершы З. Сачко на ўкраінскай мове з 1984 друкуюцца ў часопісах «Наш голос», «Наше слово», «Всесвіт», «Світо-вид», «Над Бугом і Нарвою». Яны змешчаны ў «Антології української модерної поезії в діяспорі» (Кіеў, Таронта, 1993). У паэзіі З. Сачко раскрываецца інтымны свет сучаснай жанчыны, адчуваецца турбота за лёс чалавека.

Жыве ў Бельску-Падляскім.

Я. А. Чыквін.

Бібліяграфія

1.2.

Пошукі. Беласток, 1982. Рэц.: Шаховіч М. «Хачу быць блізкай людзям — не вялікай» // Ніва. 1982. 2 мая.

Над днём похіляна. Беласток, 1991.

1.3.

1970. Падарунак: [Верш] // Ніва. № 9.

1973. Поле ў першы дзень зімы: [Верш] // Ніва. 4 сак.; Вясна: [Верш] // Там жа. 5 жн.; Эве: [Верш] // Там жа. 2 вер.; У суботні вечар з маей дзяўчынай: [Верш] // Там жа. 4 ліст.

1974. Калысачка: [Верш] // Ніва. 6 кастр.

1975. Вэчур капусты; Экзістэнцыялізм: [Вершы] // Бел. каляндар 1975, Беласток.

1976. Маналог мамы в сіэм часуов вэчэра 18 ліпца 1974 року // Бел. каляндар 1976, Беласток.

1980. Калі нават; Пытанне пра паэзію: [Вершы] // Белавежа. Беласток; «В ржавуом гноёві на вілках...»: (Паэма на бельской гаворцы) // Ніва. 6 студз.; «Говору о свободі...»: [Верш] // Там жа. 1 чэрв.; «Як комэд'янт выходіт...»: [Верш] // Там жа. 7 вер.; Піэсенька про надіэю: [Верш] // Там жа. 2 ліст.

1981. «З мого одіночэства...»: [Верш] // Ніва. 1 сак.

1982. Мінулося; «Рука стала буольш тэрпэліва...»: [Вершы] // Ніва. 7 сак.

1983. «Данэ тобіэ дітя...»; «Шкода як одыходіт нэпокуой...»; «У порану кажну...»: [Вершы] // Ніва. 4 снеж.

1984. Мой партрэт малюю; «Шкода як одыходіт нэпокуой...»; «Говору о свободі...»; «У порану кажну...»: [Вершы] // Бел. каляндар 84. Беласток.

1985. «Нод вінкамі сліэдым дорогу пшчолы...»: [Верш] // Ніва. 3 лют.; «Як нэсмэртэльны замогаем прыкоснутіcь тайны...»: [Верш] // Там жа. 3 сак.; «Стану сэбэ хваліті...»: [Верш] // Там жа. 3 ліст.; «Шчэ спіш і кажда думка грызе долоню муцніэй...»: [Верш] // Там жа. 1 снеж.

2.3.

На беларускай мове. Леаньчук Я. // Ніва. 1977. № 28; Шаховіч М. «Белавежа» // Бел. каляндар на 1983 год. Беласток.

М. П. Барташэвіч.

СВЭН ЛЕАНІД

Свэн Леанід (сапр. Савёнак Лявон; інш. псеўд.: Л. Крывічанін; 26.6.1897, в. Вялец каля г. Глыбокае Віленскай губ., цяпер Віцебскай вобл.— 21.2.1974, Памон, ЗША, пахаваны ў Іст Брансвіку, штат Нью-Джэрсі, ЗША), празаік, журналіст.

Нарадзіўся ў настаўніцкай сям'і. Пачатковую адукацыю атрымаў у Глыбокім. Скончыў у 1914 Маладзечанскую настаўніцкую семінарыю. У адзін час з ім у семінарыі вучыліся будучыя грамадскія дзеячы С. Рак-Міхайлоўскі, П. Мятла, Ф. Валынец, паэт М. Чарот. У 1920 Л. Свэн прыехаў з групай глыбоцкіх настаўнікаў у Мінск, дзе пазнаёміўся з настаўніцай Апалёніяй Радкевіч, сваёй будучай жонкай. Працаваў настаўнікам. Неўзабаве У. Ігнатоўскі прапанаваў яму стаць рэпарцёрам у газ. «Савецкая Беларусь». Шмат ездзіў па Беларусі, пісаў рэпартажы, фельетоны. Першая публікацыя — фельетон «З новым годам», апублікаваны ў газ. «Савецкая Беларусь» (1 студзеня 1927). Пісаў нарысы, фельетоны, апавяданні. У 1929 выдаў асноўны зборнік фельетонаў «Чароўная іголка». У 1920—30-я г. друкаваўся ў газетах «Савецкая Беларусь», «Сялянская ніва». У 1930, калі пачаўся наступ русіфікацыі, Л. Свэн, як «нацдэм», быў звольнены па справе т. зв. Беларускага Нацыянальнага цэнтра. Без суда яго выслалі ў Сібір, потым у Комі АССР. Пасля адбыцця высылкі (1939) вярнуўся на Беларусь і працаваў настаўнікам каля Крычава (1939—41). У час другой сусветнай вайны супрацоўнік рэдакцыі «Беларускай газэты» (Мінск). Яго фельетоны ваеннага перыяду друкаваліся пад псеўданімам Л. Крывічанін і насілі агульную назву «Дзённік Чужанінава». У 1944 выехаў у Германію, працаваў дырэктарам беларускай гімназіі ў лагеры перамешчаных асобаў у Остэргофэн, кіраваў самаадукацыйнымі курсамі. Прымаў актыўны ўдзел у працы Рады БНР, супрацоўнічаў у газ. «Бацькаўшчына», літаратурным часопісе «Сакавік», іншых эміграцыйных выданнях. Шмат часу прысвяціў арганізацыі Беларускай Аўтакефальнай Праваслаўнай царквы, браў удзел у Саборы БАПЦ, што адбыўся ў 1949 у Канстанцы. У 1950 пераехаў з сям'ёй у ЗША. Удзельнічаў у дзейнасці беларускіх эміграцыйных арганізацый, газ. «Беларус». У літаратурным жыцці эміграцыі прымала актыўны ўдзел таксама жонка Л. Свэна — Апалёнія (у 1946 выдала «Беларускі лемантар»). Актыўна працуе ў літаратуразнаўстве іх дачка Зора Кіпель.

Л. С. Савік.

Бібліяграфія

1.2.

Чароўная іголка: Фельетоны. Мн., 1929. Рэц.: Мікуліч Б. // Сав. Бел. 1929. 4 жн.

1.3.

1927. «З Новым годам!»: [Фельетон] // Сав. Бел. 1 студз.; Харчы на дарозе: [Фельетон] // Там жа. 11 студз.; «Освободители»: (Трагедыя чыноўніцкай душы): [Фельетон] // Там жа. 27 сак.; Кругавая пошта: (Жарт у 12-ці дзеях і на 5-ці лістох): [Фельетон] // Там жа. 5 лют.; «Рассуждения о белоруссизации»: (З запісной кніжкі «спэца»): [Фельетон] // Там жа. 25 лют.; Люты ў творчасці беларускіх пісьменнікаў: Як бы гэта выглядала, каб беларускія пісьменнікі пісалі аб лютаўскай рэвалюцыі: [Пародыі] // Там жа. 12 сак. / Сааўт. Алёша; Юбілеі: (З запісной кніжкі супрацоўніка «СБ»): [Фельетон] // Там жа. 15 мая; Чароўная іголка: [Фельетон] // Там жа. 22 мая; Зосіны аліменты: [Апавяданне] // Там жа. 24 вер.; Як я арганізаваўся: (Апавяданне маладога паэта, які падае надзеі): [Фельетон] // Там жа. 16 кастр.; Таварышы наркамземаўцы, дазвольце падыскутаваць: [Фельетон] // Там жа. 28 кастр.; Сялянская ніва. 28 снеж.

1928. І розы белыя завялі...: Апавяданне // Літ. дадатак да газ. «Сав. Бел.». 20 сак.; Як жа, урэшце, самакрытыкавацца: [Фельетон] // Сав. Бел. 20 мая; На Полаччыне: (Уражанні): [Нарыс] // Там жа. 27, 29 вер.; 4 кастр.; Новая песня пад старымі ліпамі: [Нарыс] // Там жа. 16 кастр.; За новую зямлю: [Нарыс] // Там жа. 17 кастр.; Гісторыя свежай цыбуліны: [Фельетон] // Там жа. 2 ліст.

1974. Крыжоваю дарогаю (на 40-я ўгодкі справы БНЦ) // Беларус. № 207 / Пад прозв. Л. Савёнак.

Т. М. Махнач.

СЕРДЗЮКОЎ МІКОЛА

Сердзюкоў Мікалай Мікалаевіч (н. 1.10.1948, в. Харошаўка Чачэрскага р-на Гомельскай вобл.), празаік, публіцыст. Член Саюза журналістаў Беларусі з 1979, СП Беларусі з 1993. Піша на беларускай і рускай мовах.

Нарадзіўся ў сялянскай сям'і. Дзяцінства прайшло ў вёсцы. Пасля пераезду ў Гомель бацька, Мікалай Кузьміч, працаваў інжынерам на суднабудаўнічым заводзе, член Саюза журналістаў; маці, Лідзія Фёдараўна,— адміністратарам у гасцініцы. У Гомелі М. Сердзюкоў закончыў сярэднюю школу № 19 і Беларускі інстытут інжынераў чыгуначнага транспарту (1971), Вышэйшую партыйную школу пры ЦК КПБ (1985). Служыў у войску, працаваў інжынерам-канструктарам, карэспандэнтам абласной газеты «Гомельская праўда». З 1985 загадчык аддзела нарыса і публіцыстыкі часопіса «Нёман».

Першую аповесць, «Пачынаецца з мяне», М. Сердзюкоў надрукаваў у 1976. У 1983 выйшаў зборнік яго прозы пад той жа назвай, дзе ён засведчыў, што аўтару блізкія і будучыня маладога рабочага, і лёс пажылога чалавека, які нарабіў многа памылак, а змяніць ужо нічога не можа. Кніга нарысаў «Пры сканчэнні лаяльнасці» апублікавана ў 1990. У 1993 — зборнік аповесцей «Страчаны рай», куды ўвайшлі аднайменная аповесць і «Радыяцыя». Два пласты часу — гады рэпрэсій і гады ачышчэння грамадства ад таталітарнай спадчыны — сутыкаюцца ў вострасюжэтнай аповесці «Страчаны рай». Яе герой, рэжысёр і драматург Павел Лугавец, асэнсоўвае пакутлівы лёс свайго народа, свой асабісты шлях у мастацтва і да каханага чалавека. У аповесці «Радыяцыя» паказаны зламаны лёс дзяўчыны, якой давялося ўцякаць ад чарнобыльскай бяды.

Жыве ў Мінску.

В. У. Смольская.

Бібліяграфія

1.2.

Начинается с меня: Повести, Мн., 1983. Рэц.: К а ж а м я к і н Ц. Твой характар — твой лёс // Гомел. праўда. 1983. 4 чэрв.

На излёте лояльности: Публицистика. Мн., 1990.

Страчаны рай: Аповесці. Мн., 1993.

1.3.

1976. Начинается с меня: [Аповесць] // Неман. № 8.

1977. Два бессмертия: [Аповесць] // Неман. № 1.

1981. Будни и праздники «Гомсельмаша»: [Нарыс] // Неман. № 6.

1982. Лёс сям'і Уінгфілдаў // Гомел. праўда. 23 чэрв.; Здабытак нялёгкіх шляхоў // Там жа. 12 ліст.; «Прымакі» на гомельскай сцэне // ЛіМ. 18 чэрв.

1983. Хлопцам пашчасціць // Гомел. праўда. 14 студз.; Незвычайнае — за паваротам // Там жа. 2 жн.

1.4.

1978. Д у б р о в с к и й И. Гомонит Полесье: [Нарыс] / С бел. // Неман. № 1.

1980. Д у б р о в с к и й И. Тяжелеть колосу: [Нарыс] / С бел. // Неман. № 8.

1981. Г о р е л и к о в а Т. Совка; Клад: [Апавяданні] / С бел. // Неман. № 12.

М. П. Барташэвіч.

СІДАРУК ІГАР

Сідарук Ігар Хведаравіч (н. 23.7.1964, г. Кобрын Брэсцкай вобл.), паэт, драматург. Сябра Таварыства вольных літаратараў Беларусі з 1993.

З сям'і служачых. У 1986 скончыў філалагічны факультэт БДУ. Працаваў у газетах «Кобрынскі веснік», «Брестский курьер» (1988—92). З 1993 загадчык літчасткі Брэсцкага абласнога тэатра лялек.

Выступае ў драматургіі і паэзіі, піша для дзяцей. Аўтар кнігі вершаў «Чарнабел», дзіцячай п'есы «Кветкі пад ліўнем» (у калектыўным зборніку «Драўляны рыцар», 1992). На сцэне дэбютаваў п'есай «Галава» (пастаўлена ў 1992 на «Вольнай сцэне» ў Мінску). У тэатрах лялек Беларусі пастаўлены яго «Меч Анёла» (1993), «Янка-зух і нячысты дух» (1993), «Завадныя парасяткі» (1994), «Збавіцель» (1994), «Штукары» (1994). У альманаху «Ксэракс беларускі» (1993, № 4) апублікавана п'еса І. Сідарука «Торба», у зборніку «Казкі для сцэны» (1992) — п'еса для дзяцей «Прагнасць — не ў радасць». Аўтар кнігі для дзяцей «Павучальныя гісторыі дзядзечкі Сіда Рука».

Жыве ў Кобрыне.

С. Г. Адамовіч.

Бібліяграфія

1.2.
Чарнабел: Вершы. Кобрын, 1991.

Павучальныя гісторыі дзядзечкі Сіда Рука. Брэст, 1994.
С. Г. Адамовіч.

СІЎКО ФРАНЦ

Сіўко Франц Іванавіч (псеўд. Францішак Анашка; н. 3.5.1953, в. Вята Міёрскага р-на Віцебскай вобл.), празаік, дзіцячы пісьменнік. Член СП Беларусі з 1993.

Нарадзіўся ў сялянскай сям'і. Пасля заканчэння ў 1970 Павяцкай сярэдняй школы паступіў на беларускае аддзяленне філфака БДУ (скончыў у 1975). З 1975 настаўнічаў у сярэдняй школе № 2 г. Верхнядзвінска Віцебскай вобл. У 1980 пераехаў на сталае жыхарства ў г. Віцебск, дзе выкладаў у школах беларускую, рускую мову і літаратуру, этыку. У 1986 перайшоў працаваць у бюро прапаганды мастацкай літаратуры Саюза пісьменнікаў Беларусі. З 1991 перакладчык абласной газеты «Віцебскі рабочы».

Літаратурнай працай займаецца з 1983. Акрамя абласных газет апавяданні Ф. Сіўко друкаваліся ў часопісах «Маладосць», «Беларусь», калектыўных зборніках «Карані», «Дзвіна», што выйшлі ў 1992, і інш. перыёдыцы.

Першая кніга празаіка «З чым прыйдзеш...» выйшла ў 1991. У цэнтры яе маральна-этычныя праблемы, аўтар імкнецца прасачыць станаўленне чалавечай асобы ва ўмовах урбанізацыі, негатыўных з'яў грамадскага жыцця канца сямідзесятых — пачатку васьмідзесятых гадоў.

Жыве ў Віцебску.

В. У. Смольская.

Бібліяграфія

1.2.
З чым прыйдзеш...: Аповесць, апавяданні, Мн., 1991 (Першая кніга паэта).

М. П. Барташэвіч.

СЛУЧАНСКІ УЛАДЗІМІР

Случанскі Уладзімір (сапр. Шнэк Уладзімір Сцяпанавіч, 23.3.1927, Мінск — 3.2.1995, Карынгтон, Аўстралія), празаік, мастак, дзеяч беларускай эміграцыі ў Аўстраліі.

Нарадзіўся ў сям'і вайскоўца. Бацькі, Сцяпан Міронавіч Шнэк і Аўгенія Сямёнаўна Даўгалевіч, жылі ў Пецярбургу (1933—36), дзе бацька вучыўся ў Вайскова-палітычнай акадэміі. Тут У. Шнэк пайшоў у першы клас. Пасля заканчэння акадэміі бацьку прызначылі ў Чыту Забайкальскай вайсковай акругі, але ў 1938 выключылі з партыі і звольнілі з войска. Сям'я вярнулася на Беларусь, у Слуцк. Бацька ўладкаваўся настаўнікам у 5 сярэднюю школу, дзе пачалі вучыцца і дзеці: Уладзімір і Алег. Калі пачалася вайна, сям'я Шнэкаў апынулася на акупіраванай тэрыторыі. Скончыўшы 7 класаў, Уладзімір пайшоў вучыцца ў рамесніцкую школу на сталяра, стаў сябрам саюза беларускай моладзі. Прэзідэнт БЦР Р. Астроўскі прызначыў бацьку начальнікам Беларускай краёвай абароны па Слуцкай акрузе. Немцы, незадаволеныя яго актыўным удзелам у нацыянальным адраджэнні, арганізацыі беларускага войска, арыштавалі сям'ю Шнэкаў, пратрымалі яе ў слуцкай турме некалькі месяцаў. Пасля вызвалення з турмы сям'я перабралася ў Мінск, дзе У. Шнэк быў залічаны ў афіцэрскую школу Беларускай краёвай абароны. У 1944 эмігрыравалі ў Германію. Брыгада «Беларусь», у якой служыў У. Шнэк, прабілася праз нямецкі фронт і здалася амерыканцам. Аднак нягледзячы на пагадненне аб нявыдачы, беларускіх вайскоўцаў перадалі уладам і павезлі ў Савецкі Саюз. У Берліне У. Шнэку ўдалося ўцячы і трапіць у англійскую зону перамешчаных асоб у Ватэнштэце. Тут сабралася ўся сям'я Шнэкаў. Уладзімір скончыў беларускую гімназію, дзе беларускую мову і літаратуру выкладаў паэт Х. Ільяшэвіч. Пад яго кіраўніцтвам і апекай У. Шнэк пачаў пісаць апавяданні. У 1948 Уладзімір з братам Алегам выехалі ў Францыю, аднак хутка вымушаны былі зноў вярнуцца ў Германію, у г. Бакнанг, дзе жылі беларусы-эмігранты. У. Шнэк арганізаваў дружыну

марскіх скаўтаў, пачаў выдаваць часопіс «Нашы ветразі». У 1950 выехаў у Аўстралію. Працаваў спачатку ў Банэгіла на фермерскай гаспадарцы, потым перабраўся ў Мельбурн. Прымаў актыўны ўдзел у грамадскім жыцці Беларускага аб'яднання Аўстраліі, узначаліў скаўтынг беларускай моладзі імя Усяслава Чарадзея. У 1956 выбраны старшынёй аддзела Беларускага аб'яднання ў Вікторыі, а ў 1957 прызначаны кіраўніком аддзела прэсы і інфармацыі Беларускага вызвольнага фронту (БВФ). З 1958 пачаў выдаваць часопіс «На варце» як орган краёвага БВФ. Пазней стаў выходзіць гумарыстычны дадатак да яго («Ерш»). У часопісе друкавалася паэма Л. Случаніна «Рагнеда». У. Шнэк завочна скончыў курс камерцыйнага мастацтва Мастацкага інстытута ў Мельбурне (1966). Уступіў у згуртаванне мастакоў Вікторыі і мастацкую групу Гленрой. Скончыў Каралеўскі інстытут тэхналогіі ў Мельбурне (1972). У 1982 абраны начальнікам краёвага штаба БВФ. Стварыў юбілейны альбом «Уніформа і адзнакі БКА» (1984). У 1986 прызначаны намеснікам начальніка Галоўнага штаба БВФ. З 1989 на пенсіі, але працягваў грамадскую працу. У 1990 быў абраны ва Управу цэнтральнага камітэта беларускіх арганізацый штата Вікторыя. Падтрымліваў сувязі з Бацькаўшчынай: дапамагаў у арганізацыі музея ў Слуцку, наладжваў у Аўстраліі адпачынак дзяцей з Чарнобыльскай зоны Беларусі. У. Шнэк быў удзельнікам Першага з'езду беларусаў свету (1993), выступіў з прамовай.

Літаратурнай творчасцю пачаў займацца з 1946. Першае апавяданне «У агні» было надрукавана ў лагерным часопісе (выдаваўся ў Ватэнштэце) пад псеўданімам Уладзімір Случанскі, які прыдумаў яму Х. Ільяшэвіч. Затым друкуюцца апавяданні «Пад сцягам бел-чырвона-белым», «Не прапусцім», «Пётр Фёдаравіч не верыць». Асноўны твор У. Случанскага — гістарычны раман «Драбы», выдадзены ў 1958 у Мельбурне. Ён прысвечаны Вітаўту, які са сваім войскам выратаваў краіны Заходняй Еўропы ад татарскага нашэсця, хоць і пацярпеў паражэнне на рацэ Ворскле. У. Случанскім напісаны гістарычная аповесць «Братчына» (1961), у якой апавядаецца пра полацкага князя Расціслава, і паэма «Аброк Кіеву» (сказ аб Рацібору, тысяцкім з Іскраценя; 1966). Некалькі паасобнікаў гэтых твораў выдадзена ў выдавецтве «На варце» (Мельбурн, 1991). Пісаў артыкулы («Другі ўсебеларускі кангрэс», «Беларуская краёвая абарона», «Аўтабіяграфічныя нататкі» і інш.).

Л. С. Савік.

Бібліяграфія

1.2.

Драбы: Гістарычная аповесць. Мельбурн, 1958. Рэц.: Кавыль М. «Драбы» У. Случанскага (Гістарычная аповесць з часоў Вітаўта) // Бел. думка. [1964]. № 6.

1.3.

1947. У вагні: Апавяданне з часоў Слуцкага змагання // Шляхам жыцця. № 9—10.

Т. М. Махнач.

СТАНКЕВІЧ СТАНІСЛАЎ

Станкевіч Станіслаў (псеўд.: Дзівасіл, С. Крушыніч, Ст. Крушыніч, Алесь Крыга, А. Скіба, Андрэй Скіба, Раман Шарупіч; крыпт. Ст. Ст., Др. Ст. Ст.; 23.2.1907, в. Арляняты Ашмянскага пав. Віленскай губ., цяпер Ашмянскі р-н Гродзенскай вобл.— 6.11.1980, Нью-Йорк), паэт, літаратурны крытык, публіцыст, вучоны-філолаг, грамадска-палітычны і культурны дзеяч. Доктар філалогіі (1936).

Нарадзіўся ў сялянскай сям'і. Малодшы брат Янкі Станкевіча. Вучыўся ў Віленскай гімназіі. Закончыў гуманістычны факультэт Віленскага універсітэта (1933). Жыў у Заходняй Беларусі, пасля прыходу Чырвонай Арміі (1939) уладкаваўся на працу ў Навагрудскае педагагічнае вучылішча, дзе выкладаў літаратуру, кіраваў літаратурным гуртком, рэдагаваў насценную газету. У пачатку Вялікай Айчыннай вайны прызначаны акупацыйнай адміністрацыяй бургамістрам Барысава і Барысаў-

скага р-на, потым Баранавічаў. Актыўна супрацоўнічаў з нямецка-фашысцкімі ўладамі, быў адным з арганізатараў і ўдзельнікаў 2-га Усебеларускага кангрэса (1944). Уваходзіў у склад урада Беларускай Цэнтральнай Рады (БЦР). З нашадыходам савецкіх войск адступіў разам з фашыстамі. Спачатку жыў у Германіі, у пачатку 1950-х г. пераехаў у ЗША (Нью-Йорк). На эміграцыі займаўся палітычнай, навуковай, выдавецкай дзейнасцю. Атрымаў пасаду міністра асветы ва ўрадзе Беларускай Народнай Рэспублікі (БНР). Працаваў у беларускай рэдакцыі радыёстанцыі «Свабода». Нейкі час быў старшынёй навуковай рады беларускай секцыі ў Мюнхенскім філіяле Інстытута даследавання гісторыі і культуры СССР (адчыніўся ў 1953). Заснавальнік, член рэдкалегіі, адміністратар газеты «Бацькаўшчына» (з 1958 адказны рэдактар). Рэдактар газеты «Беларус» (з 1964), часопіса «Запісы». Удзельнічаў у 4-й і 5-й сустрэчах беларусаў Паўночнай Амерыкі (1960, Кліўленд; 1962, Таронта).

Літаратурную дзейнасць С. Станкевіч пачаў у 1920-я г. У маладосці пісаў вершы. У Вільні выйшлі зборнікі яго вершаў: «Смех не грэх» (1926), «З майго ваконца» (1928). У 1936 была выдадзена навуковая праца С. Станкевіча «Беларускія элементы ў польскай рамантычнай паэзіі». У 1920—30-я г. часта выступаў у перыядычным друку Заходняй Беларусі. Эмігрыйны перыяд творчасці вельмі плённы. С. Станкевіч займаўся літаратурнай творчасцю, працаваў у галіне мовазнаўства, у розных жанрах крытыкі, публіцыстыкі. Цікавіўся лёсамі, творчай спадчынай К. Каліноўскага, І. Луцкевіча, В. Ластоўскага і інш. Друкаваў крытычныя артыкулы, рэцэнзіі, прысвечаныя літаратурным творам Я. Купалы, Я. Коласа, М. Гарэцкага, Я. Пушчы, М. Клімковіча, У. Жылкі, У. Дубоўкі, Л. Геніюш, В. Быкава, І. Мележа, У. Караткевіча. Як крытык звяртаў увагу літаральна на ўсе праявы творчага жыцця пісьменнікаў і паэтаў тагачаснай савецкай Беларусі. Пісаў таксама пра грамадска-палітычных, культурных дзеячаў беларускай эміграцыі. Чула адгукаўся на падзеі палітычнага, культурнага жыцця, якія адбываліся ў савецкай Беларусі, эмігранцкіх асяродках Германіі, ЗША. Выдаў кнігу «Беларуская падсавецкая літаратура першай паловы 60-х гадоў» (Нью-Йорк, Мюнхен, 1967). Адмоўна ставіўся да працэсаў саветызацыі беларускай літаратуры, русіфікацыі беларускай мовы ў СССР.

С. Б. Сачанка.

Бібліяграфія

1.2.

Śmiech nia hrech: Humarystyčnyja wieršy. Wilnia, 1926. Рэц.: Светазар Я. Сярод кніжак // Бел. голас. 1927. 29 чэрв.

Z majho wakonca: (Zbornik wieršaŭ). Wilnia, 1928.

Pierwiastki białoruskie w polskiej poezji romantycznej. Wilno, 1936. Рэц. Погодин // Slavia. 1939—40. R. XVII; Zgorzelski Cz. // Środy Literackie. 1937. Nr 6.

Янка Купала: На 100-ыя ўгодкі ад нараджэння. Нью Ёрк, 1982.

1.3.

1919. Крыніца: [Верш] // Крыніца. 9 ліст.

1920. Крыніца: [Верш] // Каляндар «Крыніца на 1921 год». Вільня; Новы год.: [Верш] // Крыніца. 1 студз.

1922. «З Новым годам! Край наш родны...»: [Верш] // Беларускі каляндар на 1923 год. Вільня / Пад крыпт. Ст. Ст.

1923. «З Новым годам! Край наш родны...»: [Верш] // Беларускі каляндар. Вільня / Пад крыпт. Ст. Ст.

1924. З Новым годам: [Верш] // Навагоднік. 31 снеж. / Пад крыпт. Ст. Ст.

1925. Бацькаўшчыне-Беларусі на новы год: [Верш] // Беларускі гаспадарскі каляндар на 1926 год. Вільня / Пад крыпт. Ст. Ст.

1926. Памяці К. Сваяка: [Верш] // Бел. крыніца. 30 мая; Годзі нам...: [Верш] // Сялянская ніва. 18 ліп.

1927. Не пакінем; «Уюцца думкі...»; «Калі...»; Сонца: (З М. Канапніцкай); Пры каміне: (З расейскага); «Да...»: [Вершы] // Досвіткі. № 1; Малы Алесь: [Верш] // Заранка. № 1; Што ты робіш?..: [Верш] // Там жа. № 2.

1928. Не пакінем...; Да Беларусі: [Вершы] // Беларускі дэкламатар. Вільня; Даволі: [Верш] // Бел. крыніца. 5 студз.

1929. Іван Луцкевіч: У дзесятыя ўгодкі сьмерці яго (1919—1929 г.) // Студэнцкая думка. № 1.

1930. «С.І.Е.» і ўдзел у ім беларускага студэнства; Шануйма народныя вартасці! // Студэнцкая думка. № 2.

1932. Манаграфія аб В. Дуніну-Марцінкевічу: [Рэц. на кн.: Gołabek J. Wincenty Dunin-Marcinkiewicz — poeta polsko-białoruski. Wilno, 1932] // Неман. № 3; Аб беларускай літаратурнай сучаснасці ў Заходняй Беларусі // Там жа. № 5.

1935. Творы Цёткі Алоізы Пашкевіч: [Рэц. на кн.: Цётка. Творы. Мн., 1934] / Пад крыпт. Ст. Ст.; [Рэц на кн.: Машара М. На сонечны бераг. Вільня, 1934; Смерць Кастуся Каліноўскага. Вільня, 1934] // Калоссе. № 1. Уладзімір Жылка: [Некралог] // Пад крыпт. Ст. Ст.; [Рэц. на кн.: Лыньковў М. На чырвоных лядах. Мн., 1934] // Там жа. № 2; Беларускія філамацкія вершы Яна Чачота // Там жа. № 3.

1936. На шляхах новай беларускай паэзіі // Маладая Беларусь. Кн. 1.

1949. Благі звычай. Супраць псэўдонімаманіі / Пад крыпт. Ст. Ст.; Керэнскі выступіў // Бацькаўшчына. № 10; У новых краёх — новыя заданьні // Там жа. № 13.

1950. Памажыце патрабуючым! // Бацькаўшчына. № 63 / Пад крыпт. Ст. Ст.

1951. Шануйма Родную Мову // Бацькаўшчына. № 66 / Пад крыпт. Др. Ст. Ст.; Русыфікацыя шалее // Там жа. № 67 / Пад крыпт. Ст. Ст.; Паход супраць мовы // Там жа. № 68, 69 / Пад крыпт. Др. Ст. Ст.; Ці напярэдадні новае чысткі? // Там жа. № 70 / Пад псеўд. С. Крушыніч; Сны «аб вясне прыгожай і далёкай»: Канстанцыя Буйла — новая ахвяра бальшавіцкай крытыкі // Там жа. № 73 / Пад крыпт. Ст. Ст.; Паэты й пісьменнікі, ўзварухнецеся!; Беларуская літаратура за 5 год // Там жа. № 74 / Пад крыпт. Др. Ст. Ст.; Пагоня за далярам або яшчэ раз аб «тараканах у саладусе» // Там жа. № 75 / Пад псеўд. С. Крушыніч.

1952. Ня выкараніць беларускасьці з душы нашага народу // Бацькаўшчына. № 9 / Пад псеўд. С. Крушыніч; У ўзбуйненых калгасах Беларусі // Там жа. № 11—12 / Пад псеўд. С. Крушыніч; Катастрафальны стан савецкай гаспадаркі ў БССР // Там жа. № 17 / Пад псеўд. С. Крушыніч; Свабода праломіць граніцы // Там жа. № 18 / Пад крыпт. Ст. Ст.; У вабароне роднае мовы // Там жа. № 25—26 / Пад крыпт. Др. Ст. Ст.; Праўда аб савецкіх партызанах // Там жа. № 28 / Пад псеўд. С. Крушыніч; Блізарукая «далёказоркасьць» // Там жа. № 42 / Пад псеўд. С. Крушыніч; Руіна сельскае гаспадаркі ў БССР // Там жа. № 44 / Пад псеўд. С. Крушыніч; Дзе каня куюць, там жаба нагу падстаўляе // Там жа. № 50 / Пад крыпт. Ст. Ст.

1953. Скаваны талент // Бацькаўшчына. № 3 / Пад псеўд. Ст. Крушыніч; Перапіска із сп. Г. А. Такаевым // Там жа. № 4; Літаратурнае ўбоства ў БССР / Пад псеўд. Ст. Крушыніч; Перапіска із сп. Г. А. Такаевым; У вечным горадзе Рыме // Там жа. № 5—6; Часопіс, якому трэба памагчы // Там жа. № 9; Не закрывайма вачэй на благое! // Там жа. № 17 / Пад псеўд. С. Крушыніч.

1955. Аб беларускай літаратуры на эміграцыі // Ля

чужых берагоў. Мюнхен; Янка Купала. Жыццёвы і творчы шлях паэта // Спадчына. Нью-Йорк; Мюнхен; Памёр Міхась Клімковіч // Бацькаўшчына. № 4—5 / Пад крыпт. Ст. Ст.; «Конадні». Літар.-маст. часопіс. № 2. Нью Ёрк, 1954. С. 88. // Там жа. № 9 / Пад крыпт. Ст. Ст.; «Сьвятая Эванэлія і Апостальскія Дзеі» // Там жа. № 25 / Пад крыпт. Ст. Ст.; Мае заўвагі да «Кутка мовы» // Там жа. № 37; Аб беларускай літаратуры на эміграцыі; Адам Міцкевіч — вялікі сын зямлі беларускай: Да 100-ай гадавіны з дня сьмерці паэта // Там жа. № 47—48.

1956. Трэба ачышчаць мову ад русыцызмаў // Бацькаўшчына. № 6—7; Янка Купала і бальшавізм // Там жа. № 25—26; Якуб Колас // Там жа. № 35—36; 50-ая гадавіна «Нашай нівы» і нашаніўства // Там жа. № 47—48.

1957. У 40-ую гадавіну сьмерці Максіма Багдановіча // Бацькаўшчына. № 20—21; Прарок нацыянальнага адраджэньня і духовы правадыр беларускага народу: Да пятнаццатай гадавіны сьмерці Янкі Купалы // Там жа. № 27—28; Дзесяцігадовы шлях «Бацькаўшчыны» // Там жа. № 42—43.

1958. Максім Багдановіч // Бацькаўшчына. № 21—23; У 16-ую гадавіну сьмерці Янкі Купалы // Там жа. № 24—25.

1959. [Уступны артыкул] // Кулакоўскі А. Дабрасельцы. Мюнхен; У гадавіну сьмерці Багдановіча // Бацькаўшчына. № 20—21; У 17-ую гадавіну сьмерці Янкі Купалы; Апошнія праявы нацыянальнага супраціву ў БССР // Там жа. № 25—26; Антон Адамовіч: У 50-ую гадавіну Ягонага жыцця // Там жа. № 30; Вечар у чэсьць праф. Ант. Адамовіча // Там жа. № 33 / Пад крыпт. Ст. Ст.; Новая аповесць А. Кулакоўскага // Там жа. № 47—48.

1960. [Уступны артыкул] // Багдановіч М. Вянок паэтычнай спадчыны. Мюнхен; Інстытут для вывучэньня СССР і беларусы // Бацькаўшчына. № 26; На сьвята акадэмічнае моладзі // Там жа. № 44; На вернай службе ідэі // Там жа. № 50—51; На магілу с. п. Купаліce // Зніч. № 56.

1961. У 75-ую гадавіну нараджэньня Юльяны Дубяйкоўскай // Бацькаўшчына. № 47.

1962. «Змагарныя дарогі» К. Акулы // Акула К. Змагарныя дарогі. Таронта; Мюнхен; Бацькаўшчына. № 1—2; Да 80-гадовага юбілею Якуба Коласа; «Новая зямля» Я. Коласа — найвызначнейшы твор беларускае літаратуры // Бацькаўшчына. № 16 / Пад крыпт. Ст. Ст.; Русыфікацыя беларускае мовы ў БССР і супраціў русыфікацыйнаму працэсу // Запісы. № 1.

1963. «Сымон Музыка» Якуба Коласа // Бацькаўшчына. № 1 / Пад крыпт. Ст. Ст.; Новая беларуская кніга пра савецкія лягеры // Там жа. № 7; Беларускае селішча адпачынку // Там жа. № 9 / Пад крыпт. Ст. Ст.; [Рэц. на кн.: Беларуска-рускі слоўнік. М., 1962] // Запісы. № 2; Агляд кнігі Я. Германовіча «Кітай — Сібір — Масква» // Зніч. № 73.

1964. Парэгабілітацыйнае выданьне твораў Максіма Гарэцкага // Бацькаўшчына. № 3—4 / Пад крыпт. Ст. Ст.; Два варыянты беларускае мовы ў БССР / Пад крыпт. Ст. Ст.; З паэтычнай нівы: [Рэц. на кн.: Крушына Р. Вячорная лірыка. Нью Ёрк; Мюнхен, 1963] // Там жа. № 8 / Пад крыпт. Ст. Ст.; Новая паэма Вінцука Адважнага; Памёр Пётра Сыч // Беларус. № 88; На ўгодкі сьмерці Аляксандра Орсы // Там жа. № 92—93 / Пад крыпт. Ст. Ст.; Савецкае асуджэньне «Нашай нівы» і спробы ейнае рэгабілітацыі // Запісы. № 3.

1965. Бацька беларускага адраджэньня: На 125 угодкі ад нараджэньня й 65-ыя ад сьмерці Франьціпка Багушэвіча // Беларус. № 98 / Пад крыпт. Ст. Ст.; У кіпцюрах дзярлівае птушкі: [Рэц. на кн.: Акула К. Гаравата. Таронта, 1965] // Там жа. № 99; Да пытаньня наступнае сустрэчы // Там жа. № 104—105.

1966. Наш адказ // Бацькаўшчына. № 4 / У саазўт.; Беларуская падсавецкая літаратура 1965 году // Беларус. № 106; Вакол літаратурных прэміяў // Там жа. № 10; Сьвяткаваньне ў Нью Ёрку // Беларус. № 108—109; Над труной нябожчыка // Там жа. № 110; Пара пачынаць; Пяты з'езд пісьменнікаў Беларусі // Там жа. № 111—112; Літаратурны альманах «Белавежа» // Там жа. № 113; Аўгеня Янішчыц: Узыходзячая зорка беларускай паэзіі // Там жа. № 114; 60-ыя ўгодкі «Нашай нівы» й нашаніўства // Там жа. № 115; Новая літаратурная змена // Там жа. № 116; Беларуская падсавецкая літаратура першай палавіны 60-ых гадоў // Запісы. № 4.

1967. Змены ў пісьменьніцкай арганізацыі // Беларус. № 117; Здзек з беларускіх пісьменьнікаў // Там жа. № 118; Веліч Сакавіковага акту; Васіль Быкаў // Там жа. № 119; Сакавіковымі ўгодкамі ў Нью Ёрку // Там жа. № 120; Існасьць беларускага нацыяналізму // Там жа. № 121; Вытокі беларускага нацыяналізму; Дванаццаты Кангрэс БАЗА // Там жа. № 122; Купала і сучаснасць: На 25-ыя ўгодкі ад сьмерці і 85-я ўгодкі ад нараджэньня / Пад крыпт. Ст. Ст.; Беларускі нацыяналізм і родная мова; Паэтычныя ўсходы Палесся // Там жа. № 123—124; Агульны зьезд ЗБМА, Пад крыпт. Ст. Ст.; Беларускі нацыяналізм і гістарычная мінуўшчына // Там жа. № 125; Цені і блескі скарынаўскага юбілею ў БССР // Там жа. № 126; Напярэдадні нацыянальнай рэвалюцыі: Да 50-х угодкаў БНР // Там жа. № 127; Абапіраючыся на народ: Да 50-х угодкаў БНР; Ня было чым хьаліцца! // Там жа. № 128.

1968. З літаратурнай нівы Беласточчыны; Культурнае жыццё БССР у 1967 годзе; Гэнэза савецкай улады ў Беларусі: Да 50-х угодкаў БНР // Беларус. № 129; Справа беларускіх календароў у БССР; БССР — рэакцыя на БНР: Да 50-х угодкаў БНР // Там жа. № 130; Максім Гарэцкі: (На 75-ыя ўгодкі ад нараджэньня пісьменніка); Пятнаццаць год пасьля Сталіна // Там жа. № 131; Слова пра ньюбрансьвікцаў // Там жа. № 133; Адказ пісьменніку Івану Пташнікаву // Там жа. № 134; Восьмая Сустрэча Беларусаў Паўночнае Амэрыкі / Пад крыпт. Ст. Ст.; Сілы свабоды няпераможныя; Мой адказ ЦК КПБ // Там жа. № 137; Васіль Быкаў зноў пад абстрэлам; А ўсё ж БССР — рэакцыя на БНР // Там жа. № 138; Кніжка, што прыносіць радасць; Моўная русыфікацыя БССР // Там жа. № 139; Вацлаў Ластоўскі: (На 85-ыя ўгодкі ягонага нараджэньня) / Пад крыпт. Ст. Ст.; Наступ супраць беларускай літаратуры // Там жа. № 140.

1969. Канстанцыя Буйла: (На 70-я ўгодкі ад нараджэньня паэткі); З нагоды 50-х угодкаў абвешчаньня БССР // Беларус. № 141; У падарку на юбілей БССР: русыфікацыя // Там жа. № 142; Легэнда пра ідэялягічную дывэрсію Захаду // Там жа. № 144; Праблема нацыянальнага ў сучаснай беларускай літаратуры; Савецкадзяржаўніцкі патрыятызм у БССР // Там жа. №145; Сяньняшні курс нацыянальнае палітыкі ў БССР; Беларуская паэзія 1968 году // Там жа. № 146; Браты Іван і Антон Луцкевічы: (На ўгодкі іхнае сьмерці) / Пад крыпт. Ст. Ст.; Ізноў супраць В. Быкава; Мастацкая проза 1968 года // Там жа. № 147—148; На 5-ыя ўгодкі сьмерці Язэпа Пушчы // Там жа. № 149; Работа, якую трэба падтрымаць; Заміж паэты — загаварыў робат // Там жа. № 150; Першая Канфэрэнцыя Нацыянальнасьцяў США / Пад крыпт. Ст. Ст.; 40 год літаратурнай дзейнасці Юркі Віцьбіча // Там жа. № 151.

1970. Новы бальшавіцкі наступ у БССР: Першае слова сказала партыя; Сказаць наступнае слова — змусілі пісьменьнікаў // Беларус. № 153; Рэгабілітацыя Сталіна й сталінізму; Партыйны наступ працягваецца // Там жа. № 154; Франьціпак Багушэвіч: (На 130-ыя ўгодкі ягонага нараджэньня і 70-ыя ўгодкі сьмерці); Беларуская паэзія 1969 году // Там жа. № 155; На шляху да незалежнасьці: 1. Абрабаваны із свае мінуўшчыны; 2. Змаганьне за сваю мінуўшчыну // Там жа. № 156; Ленінскі юбілей і Беларусь // Там жа. № 157; На шляху да незалежнасці: 3. Змаганьне за родную мову; 4. Верым у будучыню; Беларуская мастацкая проза 1969 году // Там жа. № 158; Ларыса Геніюш: (На 60-я ўгодкі ад нараджэньня паэткі) // Там жа. № 159; Уцякаюць з калгаснага раю // Там жа. № 160; «Беларуская Савецкая Энцыклапедыя» // Там жа. № 161; «Беларуская Савецкая Энцыклапедыя»: (Артыкул другі) // Там жа. № 162; Нацыянальныя помнікі ў Беларусі // Там жа. № 163; Клопаты з творчай інтэлігенцыяй // Там жа. № 164.

1971. Піянерская роля Беларусі на ўсходзе Эўропы: (На матэрыяле 1-га тому «Гісторыі беларускай дакастрычніцкай літаратуры»); Рэферат Д-ра Станіслава Станкевіча // Беларус. № 165; Новая аповесць Васіля Быкава // Беларус. № 166; 14 Кангрэс БАЗА / Пад крыпт. Ст. Ст.; Падвойны юбілей пралата Пятра Татарыновіча; Рэс-

публіканская Рада Нацыянальнасцяў // Там жа. № 170.

1972. Нямецкая анталёгія беларускага апавяданьня // Беларус. № 178 Пад крыпт. Ст. Ст.; Зацемкі з падарожжа // Там жа. № 180; Янка Купала: На 90-ыя ўгодкі ягонага нараджэньня 7 ліпеня 1882 году й 30-ыя ўгодкі трагічнай сьмерці 28 чэрвеня 1942 // Там жа. № 183; Сьвяткаванне Купалавага юбілею ў БССР // Там жа. № 184; Англамоўная праца пра Беларусь // Там жа. № 185, 187; Якуб Колас: (На 90-ыя ўгодкі ад нараджэньня); Сьвяткаванне Коласавых угодкаў у БССР; Паэтычная моладзь і сучасная рэчаіснасць // Там жа. № 188.

1973. Вярнуць загрубленае!; Пісьменьніцкае папаўненне ў БССР // Беларус. № 190; Кніга – зброя русыфікацыі або: няхай гавораць факты // Там жа. № 191; На шляху да незалежнасьці: (Паводле дакладу на сьвяткаванні 55-х угодкаў Акту 25 сакавіка ў Нью Ёрку) // Там жа. № 192; Вэтэранская ўрачыстасць у Нью Джэрзі / Пад крыпт. Ст. Ст.; На 50-ыя ўгодкі ўрадавай беларусізацыі ў БССР; Нью-Ёркаўская публічная бібліятэка; На 90-ыя ўгодкі Янкі Купалы і Якуба Коласа // Там жа. № 193; Мова школьнага навучаньня ў БССР // Там жа. № 194; Дзесяцігодзьдзе хору «Каліна» // Там жа. № 195 / Пад крыпт. Ст. Ст.; На 40-ыя ўгодкі дэбеларусізацыі // Там жа. № 196; Сёлетнія Купалавы ўгодкі й «Сьвята паэзіі» // Там жа. № 197; Беларусы й беларусіка на Міжнародным кангрэсе славістаў у Варшаве; Уладыслаў Сыракомля: На 150-ыя ўгодкі ад ягонага нараджэньня // Там жа. № 198; Сярод суродзічаў у Эўропе // Там жа. № 199, 200.

1974. Памёр Янка Шутовіч / Пад крыпт. Ст. Ст.; Адам Міцкевіч: На 175-я ўгодкі ад нараджэньня // Беларус. № 201; Памёр Язэп Жыновіч // Там жа. № 202 / Пад крыпт. Ст. Ст.; Не, не «забыты Богам край!» Раман пра беларускую нафту: [Верш]; Кастусь Каліноўскі: На 110-я ўгодкі ад сьмерці // Там жа. № 203; «Закрываўленае сонца»: Раман Кастуся Акулы // Там жа. № 204; Дарэвалюцыйны Купала ізноў працэнзураваны; У беларусаў Кліўленду й Чыкага // Там жа. № 205; 30-я ўгодкі 2-га Ўсебеларускага Кангрэсу // Там жа. № 206; На 50-я ўгодкі Васіля Быкава; Янка Купала: На 92-я ўгодкі ад нараджэньня // Там жа. № 207; Ні ўгодкаў Купалы, ні сьвята паэзіі; Пісьменьніцкі профіль Васіля Быкава // Там жа. № 208; Язэп Пушча: (На 10-я ўгодкі ад сьмерці) // Там жа. № 209; Беларусы ў Сібіры й Казахстане / Пад крыпт. Ст. Ст.; Дні лятувіскай культуры на Беларусі — прыклад і навука для беларусаў // Там жа. № 210; Пытаньне ролі Вільні ў культурным працэсе Беларусі; Адна з формаў нацыянальнага супраціву // Там жа. № 211; [Рэц. на кн.: Андраюк С. Жыццё — літаратура — героі. Мн., 1973] // Запісы. № 12.

1975. «Шматпакутныя творы» Максіма Гарэцкага // Гарэцкі М. Выбр. тв. Нью Ёрк. Т. 3; Слуцкія ўгодкі ў Нью Ёрку / Пад крыпт. Ст. Ст.; Зварот Рады Бел. Нар. Рэспублікі да беларускага грамадзтва: (Прыняты на 13-й Сэсіі рады БНР у Нью Ёрку 30 лістапада 1974 г.); 50 год беларускага кінамастацтва // Беларус. № 213, 215, 216; «Песьняры» / Пад крыпт. Ст. Ст.; Новая аповесць Васіля Быкава «Воўчая зграя»; Няведамы раздзел у біяграфіі Міхася Клімковіча // Там жа. № 215, 216; Беларуска-лятувіскае культурнае збліжэньне; Выстаўка беларускага мастацтва ў Саўт Рывэры // Там жа. № 217; Доля й нядоля спадчыны Уладзімера Жылкі; Уладзімер Жылка: На 75-я ўгодкі ад ягонага нараджэньня // Там жа. № 218; Барыс Шчорс; Трэйці том «Выбраных твораў» Максіма Гарэцкага // Там жа. № 219; Матушка Філямэна Войтанка // Там жа. № 221; Із зычлівай патрабавальнасьцяй і як найбольшай дапамогай // Там жа. № 222; Паэма Анатоля Вярцінскага «Заазер'е» ў перакладзе Леаніда Палтавы на ўкраінскую мову (Нью-Йорк, 1975); «Дзьве душы» Максіма Гарэцкага у 3-ім томе ягоных «Выбраных твораў» // Там жа. № 222; 75-я ўгодкі Уладзімера Дубоўкі і іхны палітычны аспект // Там жа. № 223—224.

1976. Двухсотгодзьдзе ЗША й 58-я ўгодкі акту 25 сакавіка ў Нью Ёрку / Пад крыпт. Ст. Ст.; На сьмерць Уладзімера Дубоўкі // Там жа. № 228; Літаратурная анкета часопісу «Маладосць» // Там жа. № 230—231; Памёр Іван Мележ; Вельмі патрэбная й карысная кніга; Колькі словаў разьвітаньня й удзячнасці: (На сьмерць доктара Янкі Станкевіча) // Там жа. № 232; На ўзвышшах пісьменьніцкае славы: (У сувязі із сьмерцяй Івана Мележа) // Там жа. № 233; «Песьняры» на новым узвышшы / Пад крыпт. Ст. Ст.; Праблемы беларускай кінаматаграфіі; Апошні раман Івана Мележа «Завеі, снежань» // Там жа. № 234; Беларускі касманаўт Пётр Клімук; Несамавітая гісторыя зь беларускім тлумачальным слоўнікам // Там жа. № 235; Джымі Картэр — новы прэзыдэнт ЗША; На службе роднай песьні; Праблема нацыянальнае спадчыны // Там жа. № 236.

1977. Давер мусім апраўдаць // Беларус. № 237; Рыгор Шырма; На 85-я ўгодкі ад нараджэньня; Змаганьне за душу творчае моладзі // Там жа. № 238; Новы беларускі пісьменьнік Віктар Казько / Пад крыпт. Ст. Ст.; Беларуская мастацкая выстаўка ў Саўт Рывэры; Сакавік, а не кастрычнік // Там жа. № 239; Угодкі 25 сакавіка ў Нью Ёрку; Чым змушаныя займацца беларускія пісьменьнікі / Пад крыпт. Ст. Ст.; Справа беларускага этнаграфічнага музэю пад адкрытым небам // Там жа. № 240; Вобраз г. зв. нацдэма й праблема нацдэмаўшчыны ў беларускай літаратуры; Памяці чалавека й беларуса // Там жа. № 241; «Кніга аднаго палёту» Пятра Клімука «Зоры побач»; На 75-я ўгодкі ад нараджэньня Язэпа Пушчы; У вабароне беларускага мастацтва; Падвойныя ўгодкі Янкі Купалы // Там жа. № 242; Забаронены Купала: (Тэкст дакладу, прачытанага ў Нью Ёрку 6 сакавіка 1977) // Там жа. № 242, 243—244; У суродзічаў Чыкага; Вялікае Сьвята беларускае культуры // Там жа. № 243—244; Напярэдадні вялікіх юбілеяў // Там жа. № 245; Вэтэранская сустрэча; Маладыя паэты гораду й хвабрычнае працы; Заміж кветак на сьвежую магілу // Там жа. № 246; Мэтро ў Менску // Там жа. № 247; На мяжы абодвух гадоў // Там жа. № 248.

1978. Яшчэ пра Рыгора Шырму // Беларус. № 249; Перад трэцім Беларускім Фэстывалем // Там жа. № 250; Русыфікацыя ў галіне школьніцтва // Там жа. № 251; 60-ыя ўгодкі незалежнасьці Беларусі ў Нью Ёрку; Новы беларускі савецкі пэрыёдык / Пад крыпт. Ст. Ст.; «Расейцы — за скасаваньне імпэрыі»; Бальшавікі пра ўгодкі БНР у кангрэсе ЗША; Памёр Рыгор Шырма // Там жа. № 252; Новы беларускі пісьменьнік Віктар Казько // Там жа. № 253; На ўгодкі гэнэрала Франьціška Кушаля / Пад крыпт. Ст. Ст.; Максім Танк лаўрэатам Ленінскай прэміі 1978 году // Там жа. № 254; Сёлетняе сьвята беларускай паэзіі // Там жа. № 255—256; Да 100-годзьдзя Янкі Купалы; Пра трэці ўнівэрсітэт на Беларусі / Пад крыпт. Ст. Ст.; На 60-я ўгодкі Фёдара Янкоўскага; На чвэрць стагодзьдзя «Расейска-беларускага слоўніка»; Сьв. пам. Пётра Татарыновіч // Там жа. № 258.

1979. На шэсьцьдзесятыя ўгодкі БССР; Уладзімер Бортнік у ЗША // Беларус. № 261; На 100-я ўгодкі Уладзімера Самойлы // Там жа. № 262; Памерлі Алесь Якімовіч і Юрка Гаўрук / Пад крыпт. Ст. Ст.; Творы беларускае мастацкае прозы, узнагароджаныя Дзяржаўнымі прэміямі БССР 1978 году; Дзяржаўныя прэміі БССР 1978 году ў галіне літаратуры й мастацтва // Там жа. № 263; Пытаньне Беларускага Этнаграфічнага музэю пад адкрытым небам; У дапамогу русыфікацыі Беларусі // Там жа. № 265; Прэміі імя Івана Мележа й Аркадзя Куляшова // Там жа. № 266 / Пад крыпт. Ст. Ст.; Янка Купала: На 97-я ўгодкі. 1882—7 ліпеня — 1979 // Там жа. № 267; Уладзімер Караткевіч і ягоны культ Кастуся Каліноўскага // Там жа. № 268; На 60-я ўгодкі ад сьмерці Івана Луцкевіча // Там жа. № 269; На 60-ыя ўгодкі Алеся Асіпенкі // Там жа. № 271—272.

1980. На 70-годзьдзе Антона Адамовіча // Беларус. № 273; Не рэгабілітацыя, а асуджэньні... // Там жа. № 274; Пад дзяржаўніцкім сьцягам БНР // Там жа. № 275; Памёр Пятрусь Броўка; Угодкі 25 сакавіка ў Нью Ёрку // Там жа. № 276; У Інстытуце літаратуры імя Янкі Купалы Акадэміі Навукаў БССР / Пад крыпт. Ст. Ст.; Франьцішак Багушэвіч: На 140-я ўгодкі ад нараджэньня, 80-я ўгодкі ад сьмерці; На 60-я ўгодкі Аляксея Пысіна // Там жа. № 277; Рэвэляцыя пра Сьцяпана Некрашэвіча; На 50-я ўгодкі бальшавіцкіх пагромаў // Там жа. № 278; На трыццатыя ўгодкі газэты «Беларус»; Уладзімер Караткевіч у вабароне нацыянальнай годнасьці Кастуся Каліноўскага // Там жа.

№ 280—281; Васіль Быкаў народным пісьменьнікам БССР // Там жа. № 283—284.

1981. Ніл Гілевіч і Генадзь Бураўкін // Беларус. № 287.

1982. Янка Купала й кастрычніцкая рэвалюцыя // Беларус. № 301—302.

1983. Kupala's prohibited works // Запісы. № 17.

1.6.

Беларускі дэкламатар. Вільня, 1928 / Скл. пад крыпт. С. С.

2.3.

На беларускай мове. Акула К. Адышоў ад нас выдатны чалавек // Беларус. 1980. № 283—284; Вечар беларускай паэзіі і песні // Наша воля. 1936. № 5; Запруднік Я. Паховіны Д-ра Станіслава Станкевіча // Беларус. 1980. № 283—284; Качан А. Ст. Станкевіч у Дзісьне: (Успамін пра настаўніка) // Беларус. 1981. № 286; Кушаль Ф. «Змагарныя дарогі» // Бацькаўшчына. 1962. № 9; Мікалаеня В. Аб мітах // Веча. 1972. № 2; Нямiга Г. Аб «Пагоні за далярам...» (Адказ сп. Ст. Крушынічу) // Бацькаўшчына. 1952. № 7—8; Падвойны юбілей доктара Ст. Станкевіча // Там жа. 1957. № 8; Прокша Л. Спадар Станкевіч стараецца // ЛіМ. 1971. 15 студз.; Школьны калега. Па што такое баламуцтва // Наша воля. 1936. 12 крас.; Шукелайць А. Др. Станіслаў Станкевіч // Беларус. 1980. № 283—284; Я. З. [Запруднік Я.]. У памяць др. Станіслава Станкевіча // Там жа. 1981. № 285; Яго ж. Юбілейная бяседа ў гонар доктара Станіслава Станкевіча // Там жа. 1977. № 299.

На польскай мове. Krzyżanowski J. Nowa odmiana starej metody literackiej // Pion. 1936. Nr 42; Smreczyński K. Twórczość poetycka Białorusinów wileńskich // Słowo. 1931. Nr 220; Wieczór literacki współczesnych poetów Zachodniej Białorusi // Słowo. 1933. Nr 122; Wieczór poezji i pieśni białoruskiej // Poprostu. 1936. Nr 16.

2.4.

На беларускай мове. Дудзіцкі У. Станіслаў Станкевіч. [Верш] // Бацькаўшчына. 1958. № 43; Жолуд-Мяцельскі А. Эпіграмы // Голас Радзімы. 1973. № 26.

Т. М. Махнач.

СТАНКЕВІЧ ЮРЫ

Станкевіч Юры (сапр. Харытановіч Георгій Васільевіч; н. 21.1.1945, Барысаў), празаік. Член СП Беларусі з 1992.

Бацька Ю. Станкевіча, Харытановіч Васіль Канстанцінавіч, працаваў аграномам. У сталінскі час рэпрэсіраваны. Далейшы яго лёс невядомы. Маці, Станкевіч Раіса Антонаўна,— рабочая, цяпер пенсіянерка. З пятнаццаці гадоў Ю. Станкевіч працаваў на Барысаўскай фабрыцы піяніна, вучыўся ў вячэрняй школе рабочай моладзі. Пасля паступіў на журфак БДУ, які скончыў у 1969. З 1970 працаваў у барысаўскай раённай газеце «Камуністычная праца». У 1970-я г. пачаў друкавацца ў рэспубліканскім друку — часопісах «Маладосць», «Бярозка», газеце «Літаратура і мастацтва», калектыўных зборніках. Піша апавяданні, вершы, публіцыстычныя артыкулы. У 1989 прыняты на работу ў аддзел публіцыстыкі часопіса «Маладосць», цяпер загадвае аддзелам крытыкі і мастацтва.

У 1989 выйшла кніжка прозы Ю. Станкевіча «Луп», у 1993 — «Анёлы на бальшаку». У іх аўтар даследуе духоўны свет нашага сучасніка, які раздумвае пра сацыяльныя праблемы. На першы погляд, яны нязначныя, але нечакана вырастаюць у глабальныя, уплываюць на ўсё жывое на зямлі.

Жыве ў Мінску.

В. У. Смольская.

Бібліяграфія

1.2.

Луп: Аповесць, апавяданні. Мн., 1989 (Б-ка час. «Маладосць»).

Анёлы на бальшаку: Аповесць і апавяданні. Мн., 1993.

Т. М. Махнач.

СТАНКЕВІЧ ЯНКА

Станкевіч Янка (псеўд.: Брачыслаў Скарыніч, Бр. Скарыніч, Б. Скарыніч, Я. Янучонак, І. Янучонак, Янучонак; крыпт.: Бр. Ск...іч, Бр. Ск., С. Я., Я. Ст., Я. С., Я. Ст-ч, І. S., J. St — č; 26.11.1891, в. Арляняты Ашмянскага пав. Віленскай губ., цяпер Ашмянскага р-на Гродзенскай вобл.— 16.7.1976, Хэўтгопн, пахаваны ў Саўт-Рыверы, штат Нью-Джэрсі, ЗША), мовазнавец, перакладчык, грамадска-палітычны і культурны дзеяч. Доктар славянскага мовазнаўства і гісторыі (1926).

Нарадзіўся ў сялянскай сям'і. Закончыў «саматужную школу ў в. Чатыркі. У юнацкія гады, калі вучыўся ў Ашмянскім гарадскім вучылішчы, далучыўся да ідэі беларускага адраджэння. Ва ўзросце 16 гадоў распаўсюджваў на Ашмяншчыне газету «Наша ніва», пазней супрацоўнічаў з рэдакцыяй газеты як карэспандэнт. Пасля заканчэння Ашмянскага гарадскога вучылішча (1909) арганізоўваў беларускае школьніцтва ў Ашмянскім і Вілейскім паветах. Вучыўся ў Віленскай каталіцкай духоўнай семінарыі. У 1914, пазнаёміўшыся з В. Ластоўскім, А. і І. Луцкевічамі, М. Гарэцкім, Я. Купалам, працаваў у газеце «Наша ніва». У 1914, з пачаткам першай сусветнай вайны, прызваны ў войска. У час службы вёў актыўную беларускую агітацыю. Трапіў у Мінск, пасля ў Пецярбург, дзе пазнаёміўся з Б. Эпімах-Шыпілам. У 1917, знаходзячыся на Румынскім фронце, трапіў у аўстрыйскі палон. Вярнуўшыся ў Вільню, стаў сябрам Беларускай Віленскай Рады, быў адным з заснавальнікаў Беларускага навуковага таварыства (БНТ, 1918). У 1918 пераехаў у Мінск, дзе прымаў удзел у пасяджэннях рады БНР. У час польска-савецкай вайны арганізаваў беларускія настаўніцкія курсы ў Слуцку (1920). У 1921 адкрыў больш за 200 пачатковых і сярэдніх школ у Ашмянскім, Маладзечанскім, Валожынскім, Вілейскім, Лідскім паветах. Па парадзе А. Луцкевіча, М. Гарэцкага і інш. вырашыў атрымаць вышэйшую адукацыю. Закончыў у Вільні Беларускую гімназію (1921) і Карлаў універсітэт у Празе (1926). У 1926 вярнуўся ў Беларусь. Жыў у Вільні, выкладаў беларускую мову ў Віленскай беларускай гімназіі, Праваслаўнай духоўнай семінарыі, Віленскім універсітэце імя С. Баторыя. Удзельнічаў у дзейнасці Беларускага навуковага таварыства. Пасол польскага сейма ад Лідскай акругі (1928). Займаўся навуковай працай пры Інстытуце нацыянальных спраў, выкладаў у духоўнай праваслаўнай акадэміі пры Варшаўскім і ў Віленскім універсітэтах, удзельнічаў у працы Таварыства прыяцеляў беларусаведаў, Беларускага студэнцкага саюза, супрацоўнічаў з віленскім БНТ. У 1930—31 выдаваў у Вільні першы беларускі мовазнаўчы часопіс «Родная мова». У 1939 быў арыштаваны польскімі ўладамі і трапіў у турму Лукішкі, адкуль вызвалены перад прыходам савецкіх войскаў. З 1941, калі пачалася фашысцкая акупацыя, жыў у Мінску, а таксама ў Вільні, Варшаве і Празе. Займаўся выдавецкай дзейнасцю. Выехаў з Беларусі ў 1944. Жыў у Германіі, удзельнік Беларускага нацыянальнага камітэта ў Рэгенсбургу, заснавальнік Крывіцкага (Беларускага) таварыства Пранціша Скарыны. Прафесар Украінскага Вольнага універсітэта ў Мюнхене. Пераехаўшы ў Нью-Йорк (1949), удзельнічаў у працы Беларуска-амерыканскага задзіночання (БАЗА). Заснавальнік Вялікалітоўскага фонду імя Л. Сапегі.

Навукова-літаратурную дзейнасць пачаў у 1918 з супрацоўніцтва з М. Гарэцкім пры падрыхтоўцы «Невялічкага беларуска-маскоўскага слоўніка» (1919). Расшыфраваў і транслітарыраваў Аль-Кітаб, кнігу беларускіх мусульман 17 ст., напісаную на беларускай мове арабскім пісьмом. Навуковыя працы, артыкулы друкаваў у часопісах «Родная мова», «Гоман» і інш. Аўтар шматлікіх падручнікаў, дапаможнікаў, слоўнікаў беларускай мовы. На эміграцыі выдаў шэраг кніг і папулярных брашур па мовазнаўстве і гісторыі (на беларускай і англійскай мовах), супрацоўнічаў з навуковым часопісам «Запісы», газетай «Бацькаўшчына», часопісам «Сяўбіт». Падрыхтаваў «Беларуска-расійскі (Вялікалітоўска-расійскі) слоўнік» (1991). У сааўтарстве пераклаў на беларускую мову Біблію — «Новы Закон» (1970), «Стары і Новы Закон» (1937). Выступаў супраць русіфікатарскіх тэндэнцый у мовазнаўстве і гістарычнай навуцы. Папулярызаваў найменні Крывіч, Крывія, Вялікаліцвін, Вялікалітва. *С. Б. Сачанка.*

1.2.
Biełaruski prawapis. Wilnia, 1918 / Сааўт. А. Луцкевіч. Рэц.: В. // Беларускі шлях. 1918. 6 ліп.; Я. Л. [Лёсік Я.] // Вольная Беларусь. 1918. № 26.
Новы лемантар беларускі. Вільня, 1918.
Што было й што мае быць. Пётра з Арлянят (мянушка). Вільня, 1919.
Беларуская правапісь з практыкаваньнямі. Вільня, 1921. Кн. 1.
Правапіс чужых словаў. Вільня, 1921.
Месца беларускага языка сярод іншых славянскіх языкоў і час яго ўзьніку. Вільня, 1930.
Нашто і як зьбіраць геаграфічныя і асабовыя назовы? Па сканфіскаванню. 2 выд. Вільня, 1931 / Пад псеўд. Брачыслаў Скарыніч.
Беларускія мусульмане і беларуская літаратура арабскім пісьмом. Вільня, 1933; 3 выд. Мн., 1991.
Зьмена практычнае граматыкі беларускага языка ў БССР. Вільня, 1934.
Апытальнік да збіраньня дыялектычных і некаторых агульных асаблівасцяў беларускага (крывіцкага) языка. Вільня, 1935.
Зьмена граматыкі беларускага языка ў БССР. Вільня, 1936. 2 выд. [Рэпрынт.]. Мн., 1991.
Повесці й апавяданні крывіцкіх (беларускіх) летапісцаў. Вільня, 1937.
Як правільна гаварыць і пісаць па-беларуску. Вільня, 1937. Сш. 1 / У сааўт.
Вонкашняя гісторыя крывіцкае мовы. Вільня, 1938.
Лемантар пераходны з лацініцы на кірыліцу. Мн., 1941.
Крыўя — Беларусь у мінуласці. Мн., 1942.
Кніжка вучыцца чытаць і пісаць лацініцаю з укладаньнямі. Мн., 1943.
Падручнік крывіцкае (беларускае) мовы: Граматыка, правапіс, укладанні, прытарнаваныя вучыцца ў школе й дома. Ч. 1—3. Рэгенсбург, 1947.
Некаторыя праўніцкія тэрміны беларускія. Нью Ёрк, 1953.
Этнаграфічныя й гістарычныя тэрыторыі й граніцы Беларусі, з мапай. Нью Ёрк, 1953.
Ethnographical and Historical Territories and Boundaries of Whiteruthenia (Kryvia, Byelorussia). New York, 1953.
Доля мовы беларускае (яе навонная гісторыя) ў розных пэрыядах гісторыі Беларусі. З ангельскім рэзюмэ. Нью Ёрк, 1954.
Mowa rukapisu Al-Kitab Kryvickaha Muzeju Ivana Łuckieviča. New York, 1954.
Савецкае хвальшаваньне гісторыі Беларусі. Мюнхэн, 1956.
З гісторыі Беларусі. Мюнхэн, 1958.
З гісторыі русыфікацыі Вялікалітвы. Нью Ёрк, 1967.
Ратуйма скарбы свайго народу. Нью Ёрк, 1968.
Друкары Іван Хведаровіч Рагаза і Пётра Мсьціславец. Нью Ёрк, 1969.
З украінскіх дачыненьняў да Вялікалітвы — Беларусі. Нью Ёрк, 1970.
Аканьне — балцкая рыса ў мове вялікалітоўскай: (Украінскі Вольны Універсытэт). Мюнхэн, 1971.
Нарысы зь гісторыі Вялікалітвы-Беларусі. Нью Джэрзі, 1978.
Гісторыя беларускага языка. Вільня, 1939; 2 выд. [Рэпрынт.]. Мн., 1992.
1.3.
1917. Беларусы ўцекачы ў Расеі // Гоман. 12 кастр.; З жыцця ў Расеі: Украінцы // Там жа. 23, 26 кастр. / Пад псеўд. Янучонак; Не тымі рукамі: (Ліст у рэдакцыю) // Там жа. 23 ліст. / Пад псеўд. Янучонак.
1918. Правапіс і граматыка // Гоман. 12, 16, 26, 30 крас.; Свая школа: (З гутаркі з вучыцелькай) // Там жа. 14 мая / Пад псеўд. Янучонак; Аб беларускім слоўніку // Там жа. 17 мая; Беларуская мова ў касцёле // Там жа. 23 ліп. / Пад псеўд. Я. Янучонак; Ратуйце ўцекачоў! // Там жа. 20 вер.; [Рэц. на кн.: П р ы п е ў к і. Вільня, 1918] / Пад крыпт. Я. Ст-ч; Будзьце актыўнымі! // Там жа. 24 вер.; З Сакольшчыны // Там жа. 1 ліст. / Пад псеўд. Янучонак; Пскоўская Беларуская Рада // Там жа. 12 ліст. / Пад псеўд. І. Янучонак.
1921. Беларускі тэатр // Беларускі каляндар на 1922 год. Вільня / Пад крыпт. Бр. Ск...іч.
1922. Нашы прозвішчы // Бел. сцяг. № 4.
1923. Нацыянальны назоў беларусаў // Беларускі студэнт (Прага). № 2—3.
1924. Праф. Карскі і яго «Белоруссы»; Адрывак з Ай Кітабу; [Рэц. на кн.: В е р а с З. Беларуска-польска-расейска-лацінскі батанічны слоўнік. Вільня, 1924] // Крывіч. № 2.
1925. Апавяданне з «Аль-Кітабу» // Крывіч. № 9 / Сааўт. М. Тауэрава; Балада «Свіцязь» А. Міцкевіча // Студэнц. думка. № 3 / Пад крыпт. Я. С.
1928. Дыспаляталізацыя «ль» у беларускай мове // Працы клясы філёлёгіі. № 1; Dialekty języka białoruskiego // Sprawy Narodościowe. Warszawa.
1930. Да беларускага перакладу «Слова аб палку Ігаравым»; Да вымовы і правапісу чужых словаў; Разпадабненьне шыпячых у беларускай мове; Беларускія плямёны і іхняе рассяленне // Родная мова. № 1—2; Пратэтычныя гукі ў беларускай мове; Прыстаўное «в» у беларускай мове; «І» памеж «а, о, е, і» і зубных у беларускай мове; Беларускія плямёны і іхняе рассяленне: (Працяг) // Там жа. № 3—4.
1931. Асыміляцыя й дысыміляцыя гукаў у беларускай мове; Беларуская вымова царкоўна-славянскага пісьма // Родная мова. № 6.
1932. Збіранне народных скарбаў / Пад крыпт. Я. С.; Адказ маім «крытыкам» // Нёман. № 4.
1933. Беларускія музульмане і беларуская літаратура арабскім пісьмом // Гадавік Бел. Навук. Таварыства. (Вільня). Кн. 1; Prispěvky k dějinam běloruského jazyka na Základě rukopisu «Al-Kitab» // Slavia. (1933/34). T. 12. Seš. N 3—4.
1934. Reforma gramatyki języka białoruskiego w BSSR // Sprawy Narodowościowe (Warszawa). N 1—2.
1935. Асабовыя назовы па бацьку ў беларусаў // Калосьсе. № 2.
1936. Stan badań nad klasyfikacją dialektów białoruskich; Stang, Chr.: Die Westrussische Kanzlei-sprache des Grossfürstentums Litauen. Oslo: (recenzija) // Baltoslavica II. Wilno.
1938. Мова ліста Рыскае Рады 1271—1280 г. // Запісы Бел. Навук. Таварыства (Вільня). Кн. 1.
1939. Мова крывіцкага (беларускага) рукапісу XVI ст. «Аль Кітаб» // Калосьсе. № 1—3.
1943. Выдатны маскоўскі вучоны (П. Бяссонаў) аб беларусах // Бел. газэта. 24 лют.
1949. «Літоўская» плынь у нацыянальным адраджэньні беларускага народу // Бацькаўшчына. № 11 / Пад псеўд. Б. Скарыніч.
1951. Крывіччына ў «Толковом словаре живаго великорусскаго языка» В. Даля // Веда. № 1; Кароткі начырк гісторыі Крывіч-Беларусі // Там жа. № 2—5.
1952. Некаторыя групы словаў беларускае мовы // Бацькаўшчына. № 34—39 / Сааўт. Ант. Адамовіч; Мова рукапісу «Аль Кітаб» Крывіцкага музею Івана Луцкевіча ў Вільні // Веда. № 1—3, 5, 8. 11—12; Некаторыя праўніцкія тэрміны беларускія // Там жа. № 2, 4—12; Беларускія плямёны // Там жа. № 6—10; Хто напісаў верш «Да што гэта за паўстала?» / Пад крыпт. Я. Ст.; Беларусы Пуцівельскага павету б. Курскае губерні // Там жа. № 8; Этнаграфічныя і гістарычныя тэрыторыі і граніцы Беларусі // Там жа. № 9—10.
1953. Цэзары й цэзары-макулінкі // Бацькаўшчына. № 21—22 / Пад крыпт. Я. Ст.; Трэба ведаць і шырыць праўду // Там жа. № 41—42; Колькі зацемкаў: Аб артыкуле Масея Сяднёва // Там жа. № 44; The Law of Grand Duchy of Lithuania: Background and Bibliography by Leo Okinshevich. (Research Program on the USSR. New York, 1953) // Там жа. № 46—47 / Пад псеўд. Бр. Скарыніч; Вячаслаў (!) Ластоўскі // Там жа. № 48; Мова рукапісу «Аль Кітаб» Крывіцкага музею Івана Луцкевіча ў Вільні: (Працяг); Беларускія плямёны: (Працяг) // Веда. № 1; Беларускія плямёны: (Працяг) // Там жа. № 2; Мова рукапісу «Аль-Кітаб» Крывіцкага музею Івана Луцкевіча: (Працяг) // Там жа. № 4—6.

1954. Беларусь на конадні першае сьветнае вайны // Бацькаўшчына. № 30—31, 32—33, 34, 36—37 / Пад псеўд. Бр. Скарыніч; Доля мовы беларускае (яе вонкашняя гісторыя) у розныя перыяды гісторыі Беларусі // Веда. № 1; З гісторыі Палесься: (Працяг) // Палесьсе. № 1, 2.

1955. Своеасаблівая мовaведа п. Сідарука // Бацькаўшчына. № 8; Беларускія творы на мовах народаў сьвету / Пад крыпт. С. Я.; Не шануйма русыфікацыі / Пад крыпт. Я. Ст. // Там жа. № 10; Захоўвайма хорму сваіх назоваў! // Там жа. № 14 / Пад крыпт. Я. Ст.; Аб некаторых словах і хормах нашае мовы // Там жа. № 20; Аб Літоўскім Статуце: [Рэц. на: Барысёнак С. Нацыянальны характар Літоўскага Статуту 1529 года // Полымя. 1927. № 6—7] // Там жа. № 21, 22; Аб некаторых словах і хормах (І) // Там жа. № 26—29, 32—35, 37, 38; Куток мовы: Некалькі слоў выясьненьняў // Там жа. № 36; Адказ сп. Мікалаені: (Куток мовы) // Там жа. № 44; Моўная палітыка бальшавікоў у Беларускай ССР // Беларускі зборнік (Мюнхэн). № 2; Нашаніўства й бальшавізм // Там жа. № 7; Дзе Палесьсе? // Палесьсе. № 1 / Пад крыпт. Бр. Ск.; The language policy of the Bolsheviks in Belorussian SSR // Belorussian Review. Nr 1.

1956. Куток мовы: Пра некаторыя сумляваньні // Бацькаўшчына. № 19; Куток мовы: Да правапісу чужых словаў // Там жа. № 20; Адказы на Купалаўскую анкету // Там жа. № 25—26; Аб некаторых словах і хормах // Там жа. № 28, 29, 33; Пра Беларускую Сялянска-Работніцкую Грамаду // Там жа. № 31.

1957. Беларускае нацыянальнае адраджэньне (1902—1915). Нашаніўцы, людзі і плыні // Бацькаўшчына. № 6, 7, 9,10; Да «Імсьціслаў» і пад. // Там жа. № 13; Беларускія гаспадары (вялікія князі), што не хацелі гаспадарстваваць у чужых // Там жа. № 27—30; Вонкавая гісторыя беларускага права ў розных порах гісторыі Беларусі // Там жа. № 31—32; Да 10-ых угодкаў выхаду «Бацькаўшчыны» // Там жа. № 42—43; Some new changes: in the Belorussian language, as used in the Belorussian SSR: (a review); Ruska-Bialaruska Sloŭnik: (a review) Belorussian Review. Nr 5.

1958. «Узыходзіла сонца незалежнае Беларусі» // Бацькаўшчына. № 11—13; Імсьціслаў Харобы і Імсьціслаў Удалы // Там жа. № 14—15; На бакох «Успамінаў» В. Рагулі // Там жа. № 18—20; Гісторыя Беларусі і расейская чорная сотня; Яшчэ да віцьця вянка // Там жа. № 24—25; Гісторыя Беларусі і расейская чорная сотня // Там жа. № 26—30.

1959. Куток мовы. Ганна ці Анна? // Бацькаўшчына. № 42 / Пад крыпт. Я. Ст.

1960. Беларускія прыказкі, прымаўкі й загадкі: [Рэц. на кн.: Беларускія прыказкі, прымаўкі й загадкі. Мн., 1958] // Беларускі зборнік. Кн. 12; З гісторыі русыфікацыі Беларусі // Бацькаўшчына. № 3—7.

1962. Які мае быць парадак літараў беларускае абэцады // Бацькаўшчына. № 8; Пскоўскі дыялект // Запісы. Кн. 1.

1963. Хрышчоныя імёны вялікалітоўскія (беларускія); Прыстаўное «в» у мове беларускай // Запісы. Кн. 2.

1964. Да ажваўленьня грамадзкай дзейнасці // Беларус. № 87.

1965. Шчырасьць і дзейнасць // Беларус. № 95; Бязьдзейнасць, яе прычыны й лекі // Там жа. № 99; Абавязак нацыянальнае працы // Там жа. № 100; Дачыненьні між нас // Там жа. № 101—102; Рома, Экклезія, Іконы // Божым шляхам. № 5.

1966. Справа неадвалочная // Беларус. № 113.

1969. Прозьвішча на -скі, -цкі — беларускія // Беларус. № 152.

1970. Надзвычайная патрэба // Беларус. № 160; За беларускую моладзеж! // Веча. № 5.

1971. З роднае мовы: (Працяг) // Веча. № 2; За родную мову й праўдзівы назоў: (Адказ на ліст В. Качанскага) // Там жа. № 3; Адказ на зацем праз мову вялікалітоўскага (беларускага) перакладу // Там жа. № 4.

1972. Канфэрэнцыя этнічных групаў Антарыё // Беларус. № 184 / Пад крыпт. Я. С.; Адказ на зацем праз мову вялікалітоўскага (беларускага) перакладу біблії: (Працяг із № 4) // Веча. № 2.

1974. «Гаспадар» і «гаспадарства» // Беларус. № 212.

1.4.

Баршчэўскі Я. Беларускія легенды / З пол. Вільня, 1917. Кн. 1, 2.

Новы закон / З гэбр., грэч. Нью Ёрк, 1970 / Сааўт. пер. М. Гітлін.

Сьвятая Біблія: Кнігі сьвятога пісьма Старога і Новага закону / З гэбр., грэч. Нью Ёрк, 1973 / Сааўт. пер. М. Гітлін.

1953. Тургеневў І. Пяюны; Тхор з Каліныч: Апавяданні / З рус. // Веда. № 4—6.

1.6.

Bielaruskija kazki. Wilnia, 1919 / Скл. / Пад крыпт. І. St — іč.

Гарэцкі М. Невялічкі беларуска-маскоўскі слоўнік. Вільня, 1919; 2 выд. Вільня, 1921 / Рэд.

Bielaruskija (kryvickija) narodnyja pieśni i kazki. Vilnia, 1939. Kn. II / Рэд.

Маленькі маскоўска-беларускі (крывіцкі) слоўнічак фразэолёгічны і прыказкаў ды прывітаньні, зычэньні і інш. Мн., 1944 / Сааўт. Ант. Адамовіч; 2 выд. Нью Ёрк, 1953 / Сааўт. Ант. Адамовіч; 3 выд. Мн., 1992 / Сааўт. Ант. Адамовіч / Скл.

Новы песеньнік крывіцкі (беларускі) для школаў. Рэгенсбург, 1946 / Пад псеўд. Брачыслаў Скарыніч / Скл.

Белорусско-русский (Великолитовско-русский) словарь — Беларуска-расійскі (Вялікалітоўска-расійскі) слоўнік. Нью Ёрк. [1991] / Скл.

Маленькі маскоўска-беларускі слоўнічак фразеалагічны і прыказкаў // Веды. 1952. № 1 / Скл.

2.3.

На беларускай мове. Бруд // Слова працы. 1928. 5 кастр.; Брылеўскі У. Мае сустрэчы з доктарам Янкам Станкевічам (на трэція ўгодкі ягонае смерці) // Беларус. 1979. № 267; Верасок. Маладзечанскі пав[ет] // Слова працы. 1928. 20 кастр.; Галадзед Н. Сутнасць рэформы беларускага правапіса: [З прамовы] // Звязда. 1934. 10 студз.; Галяк Л. Аб праўніцкіх тэрмінах // Запісы. 1952. № 2; Да апошніх падзеяў у Віленскай Беларускай Гімназіі // Слова працы. 1928. 27 кастр.; Дзве лекцыі // Там жа. 1928. 20 кастр.; Мужык. Пад класавым штандарам: (Колькі словаў аб палітычных кірунках і «скулах» беларускага жыцця) // Слова працы. 1928. 24 кастр.; Олесіюк Т. Адкрыты адказ Др-у Я. Станкевічу // Бацькаўшчына. 1956. № 35—36; Прокша Л. З неапублікаваных твораў доктара Станкевіча // Голас Радзімы. 1963. № 80; Стагановіч А. Мой адказ Я. Станкевічу // Бацькаўшчына. 1958. № 47; Станкевіч В. Бацькава Адысея // Скарыніч. Мн., 1993; Вып. 2. С. 164—178; Станкевіч С. Колькі словаў разьвітаньня й удзячнасці: (На сьмерць доктара Янкі Станкевіча) // Беларус. 1976. № 232.

3.1.

ЦБ АН Літвы, ф. 21, адз. зах. 574—576, 585.

Т. М. Махнач.

СТОМА ВЯЧАСЛАЎ

Стома Вячаслаў Іосіфавіч (н. 5.11.1949, в. Несуцічы Навагрудскага р-на Гродзенскай вобл.), празаік, паэт. Член СП Беларусі з 1993.

Нарадзіўся ў сялянскай сям'і Іосіфа Андрэевіча і Марыі Іванаўны Стомаў. Сярэднюю адукацыю атрымаў у Куравіцкай СШ (1967). Затым паступіў на біялагічны факультэт БДУ, які скончыў у 1972. Працоўны шлях пачаў намеснікам дырэктара Тураўскай васьмігадовай школы Карэліцкага р-на Гродзенскай вобл. Пазней пераехаў у Мінск і працаваў на розных пасадах у органах рыбнай гаспадаркі (1972—83). Цяпер старшы інжынер, загадчык аддзела навукова-вытворчага аб'яднання «Белрыбгас» Міністэрства сельскай гаспадаркі Беларусі.

Друкавацца В. Стома пачаў з 1974. Яго вершы і замалёўкі з'яўляліся ў розных зборніках і перыядычных выданнях Беларусі: «Дзень паэзіі — 91», «Маладосць», «Чырвоная змена», «Звязда», «Літаратура і мастацтва», «Сельская газета», «Голас Радзімы» і інш.; друкаваліся ў газетах і часопісах Англіі, Германіі, Латвіі, Літвы, Украіны. У 1989—92 выйшлі асобнымі выданнямі яго зборнікі публіцыстыкі, прозы, навукова-папулярныя творы, творы для дзяцей («Тайна жывёльнага свету», «На воўчых сцежках», «Гаспадар таямнічых віроў» і інш.). Навуковец-даследчык, аматар і знаўца прыроды, В. Стома выступае як абаронца ўсяго жывога на зямлі.

Жыве ў Мінску.

Л. А. Бялевіч.

Бібліяграфія

1.2.

Тайна жывёльнага свету. Мн., 1989.

На воўчых сцежках: Запіскі паляўнічага і даследчыка. Мн., 1991 (Б-ка час. «Маладосць»).

У глыбінках адвечнага бору. Мн., 1991.

Гаспадар таямнічых віроў: Апавяданні, замалёўкі. Мн., 1992.

1.3.

1974. Маляр: [Верш] // Гомел. праўда. 9 кастр.

М. П. Барташэвіч.

УДАКЛАДНЕННІ І ЗМЕНЫ, ЯКІЯ ДАТЫЧАЦЬ ПЕРСАНАЛІІ Ў т. 1—6

1 том

С. 34

АДАМОВІЧ АЛЕСЬ

Памёр 26.1.1994, Масква; пахаваны ў в. Глуша Бабруйскага р-на Магілёўскай вобл. Прэмію яго імя ўстанавілі беларускі ПЭН-цэнтр і Мас-медыя цэнтр (1995).

С. 95

АРЛОЎ УЛАДЗІМІР

Лаўрэат прэміі імя У. Караткевіча выдавецтва «Мастацкая літаратура» (1993, за кнігі «Рандэву на манеўрах», «Еўфрасіння Полацкая»). Узнагароджаны медалём Ф. Скарыны.

С. 107

АСІПЕНКА АЛЕСЬ

Памёр 6.8.1994, Мінск, пахаваны на Чыжоўскіх могілках.

С. 157

БАГДАНОВІЧ МАКСІМ

Прэміі яго імя ўстанавілі выдавецтва «Мастацкая літаратура» (1992) і Беларускае культурнае таварыства ў Крыме (1991). Імем яго названа вуліца ў Мінску, на якой ён нарадзіўся (1991). Установлены помнік у Ярославлі (1994).

С. 178

БАГРЫМ ПАЎЛЮК

Яго імя ў 1993 прысвоена Крошынскай СШ, на будынку якой установлена мемарыяльная дошка; яшчэ адна дошка адкрыта на будынку, які стаіць на месцы яго кузні. У цэнтры Крошына пастаўлены мемарыяльны знак.

С. 203

БАРАВІКОВА РАІСА

Лаўрэат прэміі імя М. Багдановіча выдавецтва «Мастацкая літаратура» (1993) і Дзяржаўнай прэміі імя Я. Купалы (1994, абедзве за кнігу паэзіі «Люстэрка для самотнай»).

С. 210

БАРАДУЛІН РЫГОР

Народны паэт Беларусі (1992). Ганаровы грамадзянін г. Ушачы (1992). Лаўрэат міжнароднай прэміі армянскай дыяспары імя Ф. Нансена (1994, за цыкл вершаў пра Арменію і пераклад кнігі Г. Нарэкацы).

С. 243

БАРСТОК МАРЫНА

Памерла ў чэрвені 1994, Мінск, пахавана на Паўночных могілках.

С. 246

БАРШЧЭЎСКІ АЛЯКСАНДР

Ганаровы доктар Беларускага дзяржаўнага універсітэта (1993). Акадэмік Міжнароднай акадэміі навук Еўразіі ў Мінску (1994). Узнагароджаны медалём Ф. Скарыны.

С. 252

БАРШЧЭЎСКІ ЯН

Паводле новых звестак, нарадзіўся 16.12.1799.

С. 258

БАРЫЧЭЎСКІ ЯЎГЕН

Паводле паведамлення яго дачкі, Яўнікі Барычэўскай, рэпрэсіраваны не быў.

С. 278

БІРАЛА (БУЛЬБЯНІК) ЗАХАР

Памёр 14.9.1993, Мар'іна Горка, пахаваны ў Пухавічах.

С. 281

БІТЭЛЬ ПЯТРО

Памёр 18.10.1991, в. Вішнева Валожынскага р-на, пахаваны там жа.

С. 351

БРЫЛЬ ЯНКА

Ганаровы акадэмік АН Беларусі (1994). Узнагароджаны медалём Ф. Скарыны. Паводле ўдакладнення Я. Брыля, у верасні 1939 удзельнічаў у баях супраць гітлераўскіх агрэсараў не «на паўвостраве Вестэрплятэ», а ў абароне Гдыні.

С. 426

БЫКАЎ ВАСІЛЬ

Абвешчаны «чалавекам года» ў Кембрыджы (Англія, 1992). Узнагароджаны медалём Ф. Скарыны. Лаўрэат міжнароднай прэміі армянскай дыяспары імя Ф. Нансена (1994, за абарону грамадзянскіх правоў дзеячаў армянскага народа і нататкі «Аб Арменіі»).

С. 448

БЯГАНСКАЯ ЯДВІГА

Памерла 3.4.1992, Мінск, пахавана на Паўночных могілках.

С. 523

ВАСІЛЕЎСКІ ІОСІФ

Памёр 20.4.1994, Мінск, пахаваны ў Івангорадзе Ленінградскай вобл., Расія.

С. 13

ВІТАЛІН ЗМІТРО*

З. Віталін (сапр. Сергіевіч Зміцер Рыгоравіч) н. 8.8.1912, в. Сухое Пінскага пав. Мінскай губ., цяпер Іванаўскі р-н Брэсцкай вобл.), пісьменнік. З сялянскай сям'і. У 1915 бацькі эвакуіраваліся ў г. Бранск, потым Мелекес. Летам 1919 вярнуліся ў Беларусь — у Калінкавічы, дзе ў 1928 З. Віталін закончыў васьмігодку. З 1929 у Мінску. У 1933 рэпрэсіраваны. У канцы 1935 вярнуўся ў Калінкавічы. Адбыўшы вайсковую службу, працаваў на фанернай фабрыцы ў Мазыры, у нарыхтоўчай канторы Лельчыцкага р-на, быў карэспандэнтам газеты «Бальшавік Палесся». У Вялікую Айчынную вайну ваяваў на Ленінградскім, Волхаўскім, 3-м Прыбалтыйскім, 3-м Беларускім і 1-м Украінскім франтах. З канца 1943 карэспандэнт дывізіённай газеты «Вперёд за Родину». З часткамі дывізіі дайшоў да Прагі. З чэрвеня 1945 у рэдакцыі газеты «За честь Родины», якая дыслацыравалася ў Вене. У 1950 пераведзены ў адэскую акруговую газету «Защитник Родины». У 1956 па баявой трывозе быў скіраваны ў Будапешт, дзе працаваў у рэдакцыі газеты групы войск «Ленинское знамя». Дэмабілізаваны ў 1961 у чыне маёра, вярнуўся ў Адэсу. З 1961 на творчай працы. Узнагароджаны ордэнамі Айчыннай вайны I і II ступені, двума ордэнамі Чырвонай Зоркі, медалямі.

Працуючы ў армейскім друку і пражываючы ў Адэсе, З. Віталін пісаў на рускай мове. Пад уласным прозвішчам ён выдаў кнігі «На блакітным Дунаі» (Адэса, 1955), «Першы бой» (Адэса, 1957), «Мы служым Радзіме» (М., 1962), «Прывітанне з юнацтва» (Адэса, 1964), «Пачатак легенды» (М., 1966), «Трывожная восень» (Адэса, 1966), «Дзесяць дзён адпачынку» (М., 1967), «Высокі востраў» (Адэса, 1969), «Маршавая рота» (Адэса, 1971), «Таварышы вогненных гадоў» (М., 1972), «Навальніца на світанні» (Адэса, 1973), «Сосны пасярод поля» (Адэса, 1975), «Добрыя прыкметы» (Адэса, 1978), «Няма апошніх рубяжоў» (Адэса, 1982), «Асабістая вайна» (К., 1983). Уключаныя ў іх раманы, аповесці, апавяданні і нарысы (пераважна на ваенную тэматыку), шырока рэцэнзаваліся ў друку.

С. 15

ВІТКА ВАСІЛЬ

Узнагароджаны медалём Ф. Скарыны.

С. 56

ВЯЛЮГІН АНАТОЛЬ

Памёр 24.10.1994, Мінск, пахаваны на Паўночных могілках.

С. 97

ГАЛУБОК УЛАДЗІСЛАЎ

Беларускі фонд культуры ўстанавіў стыпендыю яго імя (1992).

С. 103

ГАМОЛКА МІКОЛА

Памёр 3.5.1992, Мінск, пахаваны ў в. Астрошыцы Мінскага р-на.

---

* У час падрыхтоўкі тома ў беларускіх літаратуразнаўцаў не было дакладных біяграфічных звестак пра З. Віталіна. Выказвалася меркаванне, што ён загінуў або ў лагеры, або на фронце ў час Вялікай Айчыннай вайны. На самай справе З. Віталін жыве і цяпер. З Адэсы ён прыслаў у рэдакцыю «БелЭн» ліст з папраўкамі і ўдакладненнямі.

С. 120

ГАРДЗЕЙ ВІКТАР

Лаўрэат Літаратурнай прэміі імя І. Мележа (1993, за кнігу прозы «Уратуй ад нячыстага»).

С. 125

ГАРДЗЯЛКОЎСКАЯ ТЭРЭЗА

Паводле новых звестак, нарадзілася ў 1854 і памерла ў 1933 пад Варшавай.

С. 148

ГАРЭЦКІ МАКСІМ

Прэмія яго імя ўстаноўлена выдавецтвам «Мастацкая літаратура» (1992). На будынку Інбелкульта, дзе ён працаваў, установлена мемарыяльная дошка (1993).

С. 245

ГРАХОЎСКІ СЯРГЕЙ

Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі імя Я. Коласа (1992, за кнігу «Споведзь»).

С. 258

ГРАЧАНІКАЎ АНАТОЛЬ

Яго імя носіць літаратурнае аб'яднанне ў Гомелі (з 1992). На доме № 9 па вул. Казлова, дзе ён жыў з 1969 да 1991, адкрыта мемарыяльная дошка (1993).

С. 317

ДАМАШЭВІЧ УЛАДЗІМІР

Заслужаны работнік культуры Беларусі (1992). Лаўрэат Літаратурнай прэміі імя І. Мележа (1992, за аповесць «Кожны чацвёрты»).

С. 327

ДАРАШКЕВІЧ ВІКТАР

Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі 1994, за цыкл работ «Ф. Скарына і беларуская культура».

С. 345

ДЗЮБАЙЛА ПАВЕЛ

Памёр 24.1.1995, Мінск; пахаваны на радзіме ў в. Кукарава Бярэзінскага р-на Мінскай вобл.

С. 370

ДРАЗДОВІЧ ЯЗЭП

Яго імя носяць Дзяржаўны музей мастацтва і этнаграфіі ў м. Германавічы Шаркоўшчынскага р-на (1992), вуліца ў Маладзечне.

С. 425

ЕРМАЛОВІЧ МІКОЛА

Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі імя К. Каліноўскага (1992, за гістарычна-публіцыстычную кнігу «Старажытная Беларусь. Полацкі і новагародскі перыяды»). Лаўрэат прэміі імя У. Караткевіча выдавецтва «Мастацкая літаратура» (1992).

С. 444

ЖУК АЛЕСЬ

Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі імя Якуба Коласа (1992, за кнігу «Праклятая любоў»).

С. 482

ЗАКОННІКАЎ СЯРГЕЙ

Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі імя Янкі Купалы (1992, за кнігу паэзіі «Заклінанне»).

С. 509

ЗВОНАК АЛЕСЬ

Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі імя Янкі Купалы (1992, за кнігу паэзіі «Святлацені»).

3 том

С. 105

КАЛЕСНІК УЛАДЗІМІР

Лаўрэат Літаратурнай прэміі імя І. Мележа (1994, за кнігу «Усё чалавечае»). Памёр 15.12.1994, Брэст, пахаваны там жа.

С. 109

КАЛІНА КЛАЎДЗІЯ

Памерла 25.6.1994, Мінск, пахавана на Паўночных могілках.

С. 130

КАМЕНСКІ АДАМ

Гл. новы арт. пра яго ў «Дадатку» (т. 6).

С. 159

КАРАТКЕВІЧ УЛАДЗІМІР

Фонд яго імя створаны ў Оршы (1993), адкрыты помнікі у Віцебску (1994) і Оршы.

С. 207

КАСКО АЛЕСЬ

Лаўрэат Літаратурнай прэміі імя А. Куляшова (1995, за кнігу «Час прысутнасці»).

С. 222

КЕЙЗАРАЎ АЛЯКСЕЙ

Памёр 22.11.1994, Мінск, пахаваны на Паўночных могілках.

С. 229

КІРЫЛА ТУРАЎСКІ

Створана Таварыства яго імя ў Гомелі (1993).

С. 296

КОЛАС ГЕОРГІЙ

Памёр 18.12.1994, Мінск, пахаваны на Паўночных могілках.

С. 372

КОНАН УЛАДЗІМІР

Член-карэспандэнт Міжнароднай акадэміі навук Еўразіі ў Мінску (1994).

С. 380

КОРЗУН МІКОЛА

Памёр 22.2.1995, Мінск, пахаваны ў Калодзішчах Мінскага р-на.

С. 423

КРУГАВЫХ МІКАЛАЙ

Памёр 10.2.1994, Мінск, пахаваны на Паўночных могілках.

С. 433

КРЫГА АЛЕСЬ

Не адпавядаюць сапраўднасці звесткі пра тое, што ў 1987 А. Крыга быў асуджаны ў сувязі з трагічным выпадкам у доме творчасці «Ісlач». Па гэтай справе ён праходзіў толькі сведкам.

С. 483

КУЛЯШОЎ ФЁДАР

Памёр 29.12.1993, Мінск, пахаваны на Паўночных могілках.

4 том

С. 14

ЛАСКОЎ ІВАН

Памёр 2.7.1994, Якуцк, пахаваны там жа.

С. 43

ЛІПСКІ УЛАДЗІМІР

Лаўрэат Літаратурнай прэміі імя Я. Маўра (1993, за кнігу «Вясёлая азбука»).

С. 93

ЛУКША ВАЛЯНЦІН

Лаўрэат прэмій імя П. Броўкі выдавецтва «Юнацтва» (1994, за кнігу паэзіі «Батлейка»).

С. 102

ЛУФЕРАЎ МІКОЛА

Памёр 28.10.1994, Магілёў, пахаваны там жа.

С. 175

МАКАЛЬ ПЯТРУСЬ

Заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі (1994).

С. 185

МАКАРЭВІЧ ВАСІЛЬ

Лаўрэат Літаратурнай прэміі імя А. Куляшова (1994, за кнігу паэзіі «Везувій»).

С. 194

МАЛЬДЗІС АДАМ

Акадэмік Міжнароднай акадэміі навук Еўразіі ў Мінску (1994).

С. 204

МАЛЯЎКА МІКОЛА

Лаўрэат Літаратурнай прэміі імя А. Куляшова (1992, за зб. «Зімні дождж»).

С. 265

МАЦЯШ НІНА

Заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі (1994).

С. 302

МІКУЛІЧ БАРЫС

У в. Цераховічы Лагойскага р-на на хаце, дзе Б. Мікуліч жыў у пасляваенныя гады, адкрыта мемарыяльная дошка (1993).

С. 317

МІСЬКО ПАВЕЛ

Лаўрэат прэміі імя М. Лынькова выдавецтва «Юнацтва» (1994, за аповесць-казку «Прыйдзі, дзень-залацень»).

С. 321

МІХАЛЬЧУК СЯРГЕЙ

Памёр 19.7.1995, Мінск, пахаваны на радзіме.

С. 368

НАВУМЕНКА ІВАН

Народны пісьменнік Беларусі (1995).

С. 397

НОВІК-ПЯЮН СЯРГЕЙ

Памёр 26.8.1994, Мінск, пахаваны ў в. Лявонавічы Нясвіжскага р-на Мінскай вобл.

С. 404

СТАВЕР АЛЕСЬ

Памёр 23.7.1995, Мінск, пахаваны ў Калодзішчах Мінскага р-на.

С. 449

ПАНІЗНІК СЯРГЕЙ

Лаўрэат конкурса ЮНЕСКО «Сустрэча двух сусветаў» (1993).

С. 455

ПАНЧАНКА ПІМЕН

Ганаровы акадэмік АН Беларусі (1994). Узнагароджаны медалём Ф. Скарыны. Памёр 2.4.1995, Мінск, пахаваны на Усходніх могілках.

С. 476

ПАПОЎ ГЕОРГІЙ

Памёр 9.8.1995, Мінск, пахаваны ў Калодзішчах Мінскага р-на.

5 том

С. 52

ПРОКША ЛЕАНІД

Памёр 9.12.1994, Мінск, пахаваны на Паўночных могілках.

С. 112

РАБКЕВІЧ ВАЛЯНЦІН

Памёр 6.2.1995, Мінск, пахаваны на радзіме.

С. 117

РАГОЙША ВЯЧАСЛАЎ

Акадэмік Міжнароднай акадэміі навук Еўраазіі ў Мінску (1994).

6 том

С. 8

ТАНК МАКСІМ

Памёр 7.8.1995, Мінск, пахаваны на радзіме.

с. 264

САЧАНКА БАРЫС

Памёр 5.7.1995, Мінск, пахаваны на Усходніх могілках.

С. 364

СКРЫГАН ЯН

Яго імем названа вуліца ў Капылі (1993).

С. 431

СТРУМЕНЬ ВАСІЛЬ

Памёр 25.10.1992, г. Сарны Ровенскай вобл., Украіна, пахаваны там жа.

ЗМЕНЫ Ў СТАТУСЕ І НАЗВА

Цэнтральны дзяржаўны гістарычны архіў БССР у Мінску (ЦДГА БССР у Мінску) і Цэнтральны партыйны архіў КПБ	—	Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь
Цэнтральны дзяржаўны архіў Кастрычніцкай рэвалюцыі і сацыялістычнага будаўніцтва БССР (ЦДАКР БССР)	—	Беларускі дзяржаўны архіў
Цэнтральны дзяржаўны архіў кінафотафонадакументаў БССР	—	Беларускі дзяржаўны архіў кінафотафонадакументаў
Цэнтральны дзяржаўны гістарычны архіў БССР у Гродне (ЦДГА БССР у Гродне)	—	Беларускі дзяржаўны гістарычны архіў
Цэнтральны дзяржаўны архіў-музей літаратуры і мастацтва БССР (ЦДАМЛіМ БССР)	—	Беларускі дзяржаўны архіў-музей літаратуры і мастацтва
Цэнтральны дзяржаўны архіў старажытных актаў СССР (ЦДАСА СССР)	—	Расійскі дзяржаўны архіў старажытных актаў
Цэнтральны дзяржаўны гістарычны архіў СССР (ЦДГА СССР)	—	Расійскі дзяржаўны гістарычны архіў
Цэнтральны дзяржаўны ваенна-гістарычны архіў СССР (ЦДВГА СССР)	—	Расійскі дзяржаўны ваенна-гістарычны архіў
Цэнтральны дзяржаўны архіў літаратуры і мастацтва СССР (ЦДАЛМ СССР)	—	Расійскі дзяржаўны архіў літаратуры і мастацтва
Цэнтральны дзяржаўны архіў Кастрычніцкай рэвалюцыі, вышэйшых органаў дзяржаўнай улады і органаў дзяржаўнага кіравання СССР (ЦДАКР СССР)	—	Дзяржаўны архіў Расійскай Федэрацыі
Цэнтральны дзяржаўны архіў народнай гаспадаркі СССР (ЦДАНГ СССР)	—	Расійскі дзяржаўны архіў эканомікі
Цэнтральны дзяржаўны архіў Савецкай Арміі СССР (ЦДАСА СССР)	—	Расійскі дзяржаўны ваенны архіў
Цэнтральны дзяржаўны архіў кінафотадакументаў СССР (ЦДАКФД СССР)	—	Расійскі дзяржаўны архіў кінафотадакументаў
Цэнтральны партыйны архіў Інстытута марксізму-ленінізму	—	Расійскі цэнтр захоўвання і вывучэння дакументаў навейшай гісторыі
Дзяржаўны гістарычны архіў Ленінградскай вобл.	—	Дзяржаўны гістарычны архіў Ленінградскай вобл.
Ленінградскі дзяржаўны гістарычны архіў	—	Цэнтральны дзяржаўны гістарычны архіў г. Санкт-Пецярбурга
Цэнтральны дзяржаўны гістарычны архіў Літоўскай ССР (ЦДГА ЛітССР)	—	Дзяржаўны гістарычны архіў Літвы

Дзяржаўная бібліятэка БССР імя У. І. Леніна	—	Нацыянальная бібліятэка Беларусі
Урадавая бібліятэка імя М. Горкага	—	Прэзідэнцкая бібліятэка Рэспублікі Беларусь
Дзяржаўная бібліятэка СССР імя У. І. Леніна	—	Расійская дзяржаўная бібліятэка
Дзяржаўная публічная бібліятэка імя. М. Я. Салтыкова-Шчадрына	—	Расійская нацыянальная бібліятэка
Бібліятэка Акадэміі навук СССР	—	Бібліятэка Расійскай Акадэміі навук

СУПРАЦОЎНІКІ ВЫДАВЕЦТВА «БЕЛАРУСКАЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ» ІМЯ ПЕТРУСЯ БРОЎКІ, ЯКІЯ ЎДЗЕЛЬНІЧАЛІ Ў ПАДРЫХТОЎЦЫ І ВЫДАННІ ГЭТАГА ТОМА

Загадчыкі рэдакцый — А. А. Дылейка, І. Д. Сіпакоў, вядучы навуковы рэдактар І. У. Саламевіч, рэдактары першай катэгорыі — І. С. Александровіч, Т. А. Меляшкевіч, Л. А. Суднік, Г. А. Фатыхава, рэдактары другой катэгорыі — А. А. Грачанікава, Т. Я. Жэбіт.

У томе змешчаны фотаздымкі У. А. Крука, а таксама фотаздымкі архіва БелЭн, з Нацыянальнага навукова-асветнага цэнтра імя Ф. Скарыны.

Даведачнае выданне

БЕЛАРУСКІЯ ПІСЬМЕННІКІ

Біябібліяграфічны слоўнік у 6 тамах

Том 6

Адказны за выпуск *А. А. Дылейка*
Макет выдання *Г. І. Емец*
Афармленне і мастацкае рэдагаванне *В. Г. Загародняга*
Тэхнічныя рэдактары: *М. І. Грыневіч, І. І. Цыцаня, Н. М. Шэвель*
Карэктары: *В. І. Багдановіч, Л. С. Зіза, Г. Дз. Навіцкая, З. К. Надумовіч, А. В. Семенчукова, Л. У. Сідарава, Л. В. Суцягіна, А. А. Федасеева*

Здадзена ў набор 20.01.94. Падпісана да друку 23.05.95. Фармат 70×100¹/₁₆. Папера афсетная. Друк афсетны. Гарнітура Таймс. Ум. друк. арк. 55,9. Ум. фарб.-адб. 111,8 Ул.-выд. арк. 98,13. Заказ 711. Тыраж 5600 экз.

Выдавецтва «Беларуская Энцыклапедыя» імя Петруся Броўкі Міністэрства культуры і друку Рэспублікі Беларусь. Ліцэнзія ЛВ № 10. Рэспубліка Беларусь, 220072, Мінск, вул. Ф. Скарыны, 15а.

Мінская фабрыка каляровага друку. Рэспубліка Беларусь. 220072, Мінск, вул. Каржанеўскага, 20.

Беларускія пісьменнікі: Біябібліягр. слоўн. У 6 т.
Б 43 Т. 6. Талалай — Яфімаў/Дадатак Ін-т літ. імя Я. Купалы АН Беларусі; Беларус. Энцыкл.; Нацыянальны навукова-асветны цэнтр імя Ф. Скарыны. Пад рэд. А. В. Мальдзіса; Рэдкал.: І. Э. Багдановіч і інш.— Мн.: БелЭн, 1995.— 684 с.: іл.
ISBN 985-11-0022-6

Гэта выданне — настольны даведнік для ўсіх, хто займаецца і цікавіцца беларускай культурай. У ім змешчана больш за 1100 артыкулаў з поўнымі, усебаковымі і сістэматызаванымі звесткамі пра жыццё і дзейнасць усіх прадстаўнікоў беларускай літаратуры, якія пісалі на старажытнабеларускай, беларускай, рускай, лацінскай, польскай і іншых мовах Беларусі. У бібліяграфіях прадстаўлена звыш 600 тысяч розных публікацый.

Б 0160000000—015 / М 318(03)—95 — 05—95

ББК 91.9+ 83.3(4Беи)

У адпаведнасці з Пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь № 565 ад 19 жніўня 1993 г. выдавецтва «Беларуская Энцыклапедыя» прыступіла да падрыхтоўкі універсальнай 18-томнай «Беларускай Энцыклапедыі». Аб'ём выдання да 2000 улікова-выдавецкіх аркушаў. У ім будзе змешчана каля 80 тысяч артыкулаў. Выданне багата ілюстравана каляровымі і чорна-белымі здымкамі, картамі, схемамі, чарцяжамі.

Шматтомная «Беларуская Энцыклапедыя» — гэта ўсё пра Беларусь і ўвесь свет па-беларуску, гэта самы поўны даведнік па ўсіх галінах ведаў, асветленых з сучасных пазіцый. «Беларуская Энцыклапедыя» — першая нацыянальная энцыклапедыя незалежнай дзяржавы Рэспублікі Беларусь.

Выдавецтва «Беларуская Энцыклапедыя» рыхтуе аднатомную энцыклапедыю «БЕЛАРУСЬ». Яе аб'ём 120 улікова-выдавецкіх аркушаў. У выданні будзе змешчана больш за 5 тысяч артыкулаў, у тым ліку больш за тысячу біяграфічных. Кніга багата ілюстравана каляровымі і чорна-белымі здымкамі, малюнкамі, картамі.

Энцыклапедыя «БЕЛАРУСЬ» — гэта ўсебаковы, дакладны даведнік пра гісторыю, эканоміку, культуру, літаратуру, мастацтва, навуку, адукацыю і іншыя бакі жыцця сучаснай незалежнай Беларусі.